# Эдгар По



# МАСКА ЧЫРВОНАЕ СМЕРЦІ

Эдгар По

# Маска Чырвонае Смерці

*Выбраныя навелы, вершы, эсэ*

Мінск
«Кнігазбор»
2011

УДК 821.161.3-3
ББК 84(4Беи=Англ)
П41

*Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў*
*«Кнігарня пісьменніка»*

*Бібліятэка часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum»*

Укладанне Андрэя Хадановіча
Прадмова Нарынэ Шахназаран

У кнізе выкарыстаныя ілюстрацыі *Гары Кларка.*

**По, Э.**

**П41** Маска Чырвонае Смерці : выбраныя навелы, вершы, эсэ / Эдгар По ; уклад. А. Хадановіч ; прадм. Н. Шахназаран. — Мінск : Кнігазбор, 2011. — 472 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; Бібліятэка часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum».)

ISBN 978-985-7007-03-5.

У зборнік Эдгара По «Маска Чырвонае Смерці» ўключаныя не толькі шырока вядомыя дэтэктывы — адны з першых узораў гэтага жанру ў сусветнай літаратуры — і жахлівыя апавяданні («арабескі»), але і значна менш вядомыя гратэскі пісьменніка — творы, што паказваюць «бацьку дэтэктыву» зусім з іншага, іранічнага, боку. У кнігу таксама ўвайшлі вершы і два самыя вядомыя эсэ Эдгара По — «Паэтычны прынцып» і «Філасофія кампазіцыі». Абсалютная большасць змешчаных у зборніку перакладаў друкуецца ўпершыню.

**УДК 821.161.3-3**
**ББК 84(4Беи=Англ)**

**ISBN 978-985-7007-03-5**

© Арцёмаў А., Баршчэўскі Л., Бушлякоў Ю., Дзергачова М., Дубоўская К., Клабанава Н., Мартысевіч М., Маціеўская К., Мінкін А., Пятровіч А., Рыжкоў В., Сідарэнка В., Хадановіч А., Цімафеева Ю., Шадзько Ю., Шупа С., Шчасны У., Шчур М., Янкута Г., пераклад на беларускую мову, 2011
© Шахназаран Н., прадмова, 2011
© Маціеўская К., Янкута Г., каментар, 2011
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2011

# ЭДГАР ПО
# (1809–1849)

На небасхіле сусветнай літаратуры зорка Эдгара Алана По — адна з найярчэйшых і найзагадкавых. Паэт, навеліст, журналіст, філосаф, літаратурны крытык, Эдгар По — прыклад самаадданага служэння мастацтву, найвялікшай сілы духу мастака, які перамог трагедыю жыцця чарадзейнасцю творчай энергіі. Літаратурная спадчына Эдгара По — унікальная, хаця і невялікая па аб'ёме. Цяжка назваць тую сферу мастацтва слова, у якой ён не здзейсніў адкрыццяў, што натхнялі некалькі пакаленняў еўрапейскіх пісьменнікаў (сімвалізм у паэзіі, дэтэктыўны, навукова-фантастычны, псіхалагічны жанры ў навелістыцы, тэорыя «чыстага мастацтва» ў літаратурнай крытыцы).

Эдгар По нарадзіўся 19 студзеня 1809 года ў Бостане ў артыстычнай сям'і. Ягоная маці Элізабэт Арналд стала акторкай у 11 гадоў, грала ролі дзяцей, эльфаў, казачных духаў. Яна была вельмі таленавітая, прыгожая, мела нязменны сцэнічны поспех, але занадта рана пайшла з жыцця — ва ўзросце 24 гадоў, пакінуўшы траіх дзяцей. Амаль адначасова з ёй памёр і бацька будучага паэта Дэвід По. Двухгадовага Эдгара ўзяла на выхаванне багатая бяздзетная пара Аланаў, кіруючыся тагачаснай модай на дабрачыннасць. Надзелены тонкай і чулай душой, Эдгар пастаянна адчуваў сваю адзіноту ў чужым доме, дзе яму далі прытулак адно з міласэрнасці. З шасці да адзінаццаці гадоў (1815–1820) По жыве ў Англіі, навучаючыся спачатку ў прыватнай школе — пансіёне Дзюбура (Лондан), а потым у прыгараднай школе Мэнар-хаўз. Прыёмныя бацькі не наведвалі яго, што ўпершыню выклікала пачуццё адчужанасці ў асяроддзі аднагодкаў, да якіх рэгулярна прыязджалі родныя. Хлопчыка ратавала паэтычнае светаўспрыманне, уяўленне, якое малявала ідэалізаваны вобраз прыўкраснай місіс Алан, добрай і чулай. Свядомасць будучага паэта пачынала раздвойвацца паміж светамі фантазіі й суворай рэчаіснасці.

Вяртанне ў Амерыку, у Рычманд, пазначыла сабою пачатак кароткага шчаслівага перыяду ў жыцці По. Выключныя здольнасці падлетка праяўляюцца ў гарманічным спалучэнні выдатных поспехаў у засваенні моваў — грэцкай, лаціны, французскай, у спорце — плаванні, стральбе, боксе, у захапленні матэматыкай. Спалучэнне логікі і ўяўлення ў паэтычным мысленні Эдгара По зробіцца адной з выключных і надзвычайных рысаў ягонай творчасці.

У 17 гадоў По паступае ва ўніверсітэт Вірджыніі, адкрыты за год да таго адным з заснавальнікаў амерыканскай дэмакратыі — Томасам Джэферсанам. По не скончыў універсітэта з некалькіх прычынаў, галоўнай з якіх была дасквапнасць айчыма, што не пажадаў аплачваць занадта дарагое навучанне. По не правучыўся там і года, але за гэты кароткі час паспеў прачытаць велізарную колькасць кніг, удасканаліць сваё веданне моваў, матэматыкі і, галоўнае, напісаць мноства вершаў, якія пазней увайшлі ў ягоны першы паэтычны зборнік «"Тамерлан" ды іншыя вершы» (1827). Выключэнне з універсітэта стала цяжкім выпрабаваннем для амбіцыяў юнака, трагічным пераломам у ягоным лёсе. По сыходзіць з дому ў пошуках свайго месца ў жыцці без надзеі на чыю-кольвек дапамогу ці падтрымку. Ад таго часу пастаяннымі спадарожнікамі ягонага жыцця будуць цяжкая праца прафесійнага журналіста, не згоднага на кампрамісы з кан'юнктурнымі густамі чытацкай публікі, непраглядная галеча, страта самых блізкіх людзей, горкая самота і адчай.

Пазычыўшы крыху грошай, По выправіўся ў Бостан — як найдалей ад Вірджыніі й Рычманда. Надзеі палепшыць матэрыяльнае становішча публікацыяй вершаў не спраўдзіліся. Адчай змусіў юнака завербавацца ў войска пад імем Эдгара А. Пэры, 22 гадоў (насамрэч яму было толькі 18), ураджэнца Бостана. По, які з вялікай адказнасцю ставіўся да выканання вайсковых абавязкаў, даслужыўся да звання сяржант-маёра, найвышэйшага для малодшых камандзіраў, але ён пакутаваў ад немагчымасці праз недахоп часу аддацца свайму галоўнаму пакліканню — паэзіі.

28 лютага 1829 года Эдгар страчвае сваю прыёмную маці Фрэнсіс Алан. На нейкі час ён прыязджае ў Рычманд, каб праводзіць яе ў апошнюю дарогу і ўспомніць пра свой адзіны «бацькоўскі» дом. Памірыцца з айчымам не атрымалася. По з'язджае ў Балтымар.

Цягам году, пасля сыходу з войска і да паступлення ў новую акадэмію (1830), ён інтэнсіўна чытае, рыхтуючыся да новых паэтычных здзяйсненняў. У полі ягонай увагі — ангельскія й нямецкія рамантыкі. Сваю паэму «Аль-Арааф» пра таямнічую зорку, якая сімвалізуе ісціну і прыгажосць, По аддаў на суд Уільяма Ўэрта — свайго выкладчыка права ў Вірджынскім універсітэце. Ўэрт пазнаёміў яго з самымі вядомымі літаратарамі Філадэльфіі — Робертам Ўолшам, рэдактарам «Амерыканскага штоквартальнага агляду», і Джозэфам Хопкінсам. Новы зборнік Эдгара По «"Аль-Арааф", "Тамерлан" і малыя вершы» быў прыняты ў 1829 годзе выдавецтвам «Хатч і Данінг» з умоваю выплаты ганарару ў выпадку прыбытку. У адным з папулярных часопісаў «Янкі і бостанская літаратурная газета» з'яўляецца прыхільны водгук на кнігу, напісаны Джонам Нілам, сябрам По. Настрой маладога паэта светлы і радасны, нягледзячы на цяжкія жыццёвыя абставіны.

Пасля паступлення ў вайсковую акадэмію Вест-Пойнт паўтараецца тая ж гісторыя, што і ў арміі. Страта часу, занятага вайсковай муштрою, асэнсоўваецца Эдгарам По як злачынства ў дачыненні да паклікання. Мэтаскіраванае парушэнне дысцыпліны было адзіным спосабам дабіцца выключэння з акадэміі законным чынам — паводле рашэння вайсковага трыбунала, — што і адбываецца. По з'язджае ў Нью-Ёрк, дзе друкуе свой трэці зборнік вершаў. Жыццё ў Нью-Ёрку выявілася занадта дарагім, таму По вяртаецца ў Балтымар да сваёй цёткі Марыі Клэм. Праз чатыры гады, набыўшы новы жыццёвы й літаратурны досвед, По з'язджае з Балтымара, каб узяць актыўны ўдзел у станаўленні амерыканскай нацыянальнай літаратуры.

За час жыцця ў Балтымары (да 1835 года) ён двойчы ўдзельнічаў у конкурсах на найлепшае апавяданне. Такія

конкурсы ладзіліся, каб заахвочваць маладыя таленты і спрыяць развіццю нацыянальнай літаратуры. Апавяданне По «Рукапіс, знойдзены ў бутэльцы» было адзначанае першай прэміяй на конкурсе 1833 года.

У літаратурных спробах гэтага перыяду (навелы «Берэніка», «Марэла», «Падзенне ў Мальстрэм») Эдгар По дасягае сталасці мастацкага мыслення, віртуознай тэхнікі пісьма, філасофска-эстэтычнай глыбіні. З 1835 года пачынаецца актыўная праца пісьменніка ў якасці рэдактара рычмандскага «Паўднёвага літаратурнага весніка». Дзякуючы ягонаму выключнаму таленту і працаздольнасці часопіс ператварыўся са стратнага і малавядомага ў літаратурных колах у прыбытковы і вельмі аўтарытэтны.

Увосень 1835 года ў Рычманд пераязджаюць сваякі По — цётка Марыя Клэм і яе дачка Вірджынія. Праз год глыбокае ўзаемнае каханне Эдгара й Вірджыніі прыводзіць іх да сапраўды рамантычнага шлюбу. Вірджынія робіцца добрым анёлам паэта, гераіняй шэдэўраў ягонай позняй лірыкі і многіх навелаў. Яна дапамагала мужу ва ўсіх няшчасцях, была побач у блуканнях, падтрымлівала ягоныя духоўныя сілы, прыносячы ў жыццё сэнс, спакой і шчасце.

З'ехаўшы з Рычманда, Эдгар По пастаянна мяняў месца жыхарства: Нью-Ёрк (1837–1838), Філадэльфія (1838–1844), зноў Нью-Ёрк (1844–1846). Апошні ягоны прытулак — уласны дом у Фордэме паблізу Нью-Ёрка (1846–1849). Ён працуе на мяжы фізічных і душэўных магчымасцяў чалавека. Адзін за адным пабачылі свет зборнікі апавяданняў, што прынеслі яму сапраўдную літаратурную вядомасць. У студзені 1845 года быў надрукаваны верш «Крумкач», які імгненна стаў сенсацыяй і праславіў імя По як геніяльнага паэта. Мары пра прызнанне і славу пачыналі ажыццяўляцца, шмат што чакала ўвасаблення на вяршыні мастацтва, дасягнутай По за кошт неймаверных высілкаў, але лёс вырашыў па-іншаму. Новая катастрофа — пакутлівая хвароба (сухоты) і ранняя смерць Вірджыніі — сталася апошняй кропляй, што перапоўніла чашу пакутаў разбітага адчаем Эдгара По. «Кожны раз я перажываў агонію яе смерці і з кожным новым

прыступам кахаў яе мацней і чапляўся за яе жыццё з упартасцю роспачы». Адчуванне сэнсу ў жыцці саступіла страху перад вар'яцтвам і самотаю. У пошуках жыццёвай падтрымкі По кідаўся з горада ў горад, як параненая птушка ў апошнім парыве, але сілаў больш не было. «Я мушу памерці, у мяне не засталося жадання жыць пасля таго, як я скончыў "Эўрыку". Я ўжо нічога больш не здолею стварыць», — піша По ў адным з апошніх лістоў да Марыі Клэм. Абставіны сыходу з жыцця вялікага амерыканскага пісьменніка ахутаныя таямніцай. Гэта здарылася ў Балтымары 7 кастрычніка 1849 года. Але жыццё ягоных несмяротных твораў працягваецца, залучаючы ў сваё магічнае кола ўсё новыя пакаленні чытачоў і вучняў непаўторнага генія.

Асаблівай заслугай Эдгара По лічыцца стварэнне жанру рамантычнага апавядання, увасабленне прынцыпаў рамантычнае эстэтыкі ў прозе. Для ажыццяўлення такой задачы трэба было мець адначасова дар натхнёнай інтуіцыі і дакладнага матэматычнага мыслення. «У По калі і ёсць фантастычнасць, то нейкая матэрыяльная», — адзначаў Ф. Дастаеўскі, аўтар першых перакладаў на рускую мову апавяданняў «Чорны кот» і «Сэрца выкрывае». По — непераўзыдзены майстар рэалістычнай фантастыкі і звышнатуральнага псіхалагізму. Калі можна прыняць такі парадаксальны панятак — «рацыянальнае чарадзейства», то менавіта ім прасякнутыя творы пісьменніка. Крыніцаю гэтых адкрыццяў была ягоная паэзія. Агульнае для прозы і паэзіі По — гэта сімвал, дакладней, сістэма сімвалаў. Шматзначнасць, няпэўнасць вобраза-сімвала найбольш відавочныя ў «псіхалагічных» навелах По (ён даў сваё азначэнне гэтаму жанру — «арабескі»), што раскрываюць фатальныя супярэчнасці чалавечае прыроды, барацьбу розуму і пачуццяў, дабра і зла на мяжы вар'яцтва (вершы «Закляты замак» і «Чарвяк-пераможца», навелы «Падзенне Дому Ашэраў», «Маска Чырвонае Смерці» і інш.). Ролю сімвалу граюць знакі (расколіна ўздоўж сцяны дому Ашэраў), з'явы (цёмныя цені на вадзе ў апавяданні «Выспа Феі»), адчуванні (пачуццё жаху ў навеле «Сфінкс»), гукі («Падзенне ў Мальстрэм»), фарбы («Авальны партрэт»), але

найперш сімвалічны характар мае сама тэма апавяданняў. Найбольш узнёслай і прыгожай тэмай у мастацтве По лічыў гісторыю кахання і смерці прыўкраснай каханай. Безумоўна, факты біяграфіі пісьменніка маглі стаць падставай для такога выбару сюжэта, але ў навелах По гэтая тэма набывае складаны філасофска-эстэтычны сэнс. По паходзіў са штата Вірджынія, цытадэлі амерыканскай культуры, і хваравіта перажываў заняпад духоўных традыцыяў пад уціскам камерцыйнага «прагрэсу». З іншага боку, як паэт, што ўспрыняў ідэі нямецкіх ідэалістаў (Ё. Фіхтэ, Ф. Шэлінга), По ўсведамляў асуджанасць прыгажосці і гармоніі, гэтых водбліскаў вечнасці, у бездухоўным свеце разліку і карыслівасці і адчуваў спрадвечную тугу паэта па страчаным, скрадзеным ідэале.

Славу заснавальніка дэтэктыўнага жанру прынеслі Эдгару По чатыры знакамітыя апавяданні: «Забойствы на вуліцы Морг» (1841), «Таямніца Мары Ражэ» (1842), «Залаты жук» (1843) і «Скрадзены ліст» (1844). Сам аўтар называў іх «лагічнымі» апавяданнямі («рацыяцынацыямі»), а асноўную задачу гэтых твораў бачыў у вывучэнні «працэсу дакладнага мыслення», камбінацыі дэдуктыўнага і індуктыўнага метадаў лагічнага мыслення. Галоўныя героі, дэтэктывы Дзюпэн і Легран, расследуюць злачынствы, дэманструючы выключныя здольнасці свайго інтэлекту і ўяўлення. На думку рамантыкаў, менавіта ўяўленне здольнае прадбачыць ісціну з дапамогай інтуітыўнага азарэння. Дзюпэн і Легран не пазбаўленыя рамантычнай загадкавасці, якая знайшла адлюстраванне ў іх ладзе жыцця, манерах, таемных прыхільнасцях. У той жа час яны не бягуць ад рэчаіснасці, паглыбляючыся ў самыя будзённыя бакі чалавечага жыцця. Рамантычны герой, не страчваючы выключных рысаў, набывае ў По рацыянальна ўраўнаважанае і жыццёва пераканаўчае аблічча.

Уменне Эдгара По спалучаць логіку матэматычна дакладнага аналізу з самымі неймавернымі прыхамацямі фантазіі заслужыла прызнанне ягоных сучаснікаў. Сапраўдны апафеоз палёту чалавечай фантазіі, думкі, скіраванай у неспазнанае, стварае пісьменнік у навеле «Незвычайная прыгода нейкага

Ганса Пфааля» (1835). Дэтальнае апісанне падарожжа на Месяц межавала з літаратурнай містыфікацыяй. Форма паслання на Зямлю ўдзельніка палёту, пра які расказвае аўтар (прыём «апавядання ў апавяданні»), была такой праўдападобнай, што пасланне гэтае здавалася насамрэч праўдзівым.

Так званыя навукова-фантастычныя апавяданні По часта маюць сатырычную скіраванасць — супраць філістарскіх выдумак, невуцтва і неразумнасці натоўпу. Асабліва высмейвае Эдгар По культ утылітарных каштоўнасцяў сучаснага яму буржуазнага грамадства (навела «Дзялок»).

Нягледзячы на велізарнае значэнне навелістыкі По, прызнанай пры жыцці пісьменніка, ён дасягнуў несувымерна больш вялікіх адкрыццяў як паэт. Зямное жыццё паэта абарвалася, калі геніяльнасць ягоных вершаў толькі пачала адкрывацца сучаснікам.

Свае погляды на канцэпцыю паэтычнай творчасці ў цэлым По выразіў на старонках шэрагу бліскучых тэарэтычных працаў, што сталіся маніфестамі амерыканскага рамантызму. Да іх належаць перадусім «Філасофія кампазіцыі» (1846) з аўтакаментаром да легендарнага верша «Крумкач» і «Паэтычны прынцып» (1848–1849), які ўяўляе сабой найбольш разгорнуты аналіз прыроды паэтычнага мастацтва. Знаходзячыся ў цеснай сувязі з эстэтыкай еўрапейскага рамантызму («Літаратурная біяграфія» С. Т. Колрыджа, «Абарона паэзіі» П. Б. Шэлі, працы нямецкіх рамантыкаў), По выказвае шэраг новых ідэяў, актуальнасць якіх была ўсвядомленая толькі пакаленнем сімвалістаў (Ш. Бадлер, П. Валеры, В. Брусаў, К. Бальмонт).

Перш за ўсё найвышэйшай і адзінай мэтай Паэзіі По называе Прыгажосць: «Толькі ў сузіранні прыўкраснага мы здольныя адчуць узвышанае задавальненне ці ўзрушэнне душы, якое мы называем паэтычным пачуццём і якое вельмі лёгка адрозніць ад ісціны, што прыносіць задавальненне розуму, ці ад жарсці, што хвалюе сэрца»[1]. Варта адзначыць, што

---

[1] Тут і далей эсэ «Паэтычны прынцып» і «Філасофія кампазіцыі» цытуюцца ў перакладзе Ганны Янкута.

пад словам «праўда» ў сваім артыкуле По разумее перадусім разумовыя догмы, дзеля дасягнення якіх «мы мусім быць халоднымі, спакойнымі, бязжарснымі. Адным словам, мы мусім быць у тым стане, які як мага больш процілеглы паэтычнаму». Такім чынам, выказванне По не супярэчыць рамантычнаму тэзісу пра тоеснасць красы і праўды (Дж. Кітс), але ўдакладняе яго з пазіцыяў амерыканскае рэчаіснасці, якая звязвае панятак праўды з догмамі маралі. Раздзяляючы «свет розуму» (the world of mind) на тры складнікі — чысты інтэлект (Pure Intellect), густ (Taste) і маральнае пачуццё (Moral Sense), По змяшчае густ пасярэдзіне: «розум мае дачыненне да ісціны, <...> густ паведамляе нам пра прыгожае, а маральнасць клапоціцца пра абавязак».

Як рамантык По не зводзіць уяўленне пра Прыгажосць да прыгожых формаў, што выключае саму магчымасць суаднясення ягонае паэзіі з фармалісцкімі тэндэнцыямі ў сімвалізме або эстэтызме. «Як лілея адбіваецца ў возеры, а вочы Амарыліс — у люстэрку, так і вуснае ці пісьмовае ўзнаўленне гэтых формаў, гукаў, колераў, пахаў і адчуванняў падвойвае крыніцу асалоды. Аднак, — дадае По, — такое паўтарэнне не ёсць яшчэ паэзіяй».

«Той, хто проста спявае, хай сабе з палкай захопленасцю ці жывой праўдападобнасцю ўзнаўлення, пра вобразы, гукі, водары і пачуцці, дасягальныя для яго, як і любога іншага чалавека, не даказвае свайго права на боскае званне. У далечыні ўсё яшчэ засталося нешта, чаго ён не здолеў дасягнуць». Гэтым «чымсьці» По называе скіраванасць да вечнасці. Гэта «імкненне матылька да зораў. Гэта не проста спасціжэнне прыгажосці наўкола нас, гэта і адчайная спроба дасягнуць прыгажосці вышняй». Асноўнай якасцю сапраўднага паэтычнага пачуцця, прысутнасць якога можна заўважыць не толькі ў слоўнай творчасці, але і ў разнастайных іншых мастацтвах — жывапісе, скульптуры, архітэктуры, танцы, музыцы, садова-паркавым мастацтве, — По лічыць любоў да ўзвышана прыўкрасных з'яваў: «Жаданне спасцігнуць незямную прыгажосць, гэтае жаданне душаў адмысловага складу, і дало свету ўсё тое, што ён мог адразу і зразумець, і назваць паэтычным».

Канцэпцыя паэтычнага і прыўкраснага ў По прапануе ў якасці ідэальнай тэмы верша тугу па страчанай каханай, чыё з'яўленне толькі на імгненне асвятляе жыццё паэта радасцю далучэння да вечнасці.

Разважаючы пра форму верша, По прапануе правілы арганізацыі паэтычнага тэксту, абумоўленыя неабходнасцю выклікаць у чытача цэласнае ўражанне ад верша. У сувязі з гэтым ідэальны верш не павінен быць занадта доўгім, каб не парушаць адзінства ўражання, але ў той самы час ён не мусіць быць і занадта кароткім, бо не паспее выклікаць глыбокага і трывалага перажывання. Ілюструючы свае развагі, По разглядае «Страчаны рай» Дж. Мілтана як «шэраг невялікіх вершаў». Апроч таго, По падвяргае далікатнаму і вытанчанаму аналізу верш «Блукалец» Г. Лангфэла, у якім адзначае сілу выразнасці, лёгкасць тону і натуральнасць, творы Дж. Г. Байрана, А. Тэнісана і інш.

Адзінства ўражання ў паэзіі По дасягаецца з дапамогаю сугестыўных і сінестэтычных прыёмаў стварэння музычна-жывапіснай тканіны верша. Пры гэтым тропа-сінтаксічныя (сімвалы, інверсіі, паўторы) і гукавыя (асанансы, алітэрацыі) сродкі выразнасці, паводле По, мусяць не толькі апісаць з'яву, але і паказаць працэс руху, абуджэння, нарастання і дасягнення памежнай, часам гратэскавай ступені праяўлення якасці. По захапляе чытача, прымушае яго перажыць напружанне думак і пачуццяў і даводзіць да стану на мяжы быцця і небыцця, рацыянальнага і ірацыянальнага.

У артыкуле «Ліст да Б.» (*Letter to B–*) По адзначае: «На маю думку, верш адрозніваецца ад навуковага твора тым, што яго непасрэднаю мэтай з'яўляецца асалода, ад рамана — тым, што тут прыносяць асалоду няпэўныя месцы замест пэўных, і толькі пры гэтай умове твор можа лічыцца вершам, бо ў рамане прысутнічаюць бачныя вобразы, што выклікаюць ясныя пачуцці, вершы ж выклікаюць пачуцці няясныя і абавязкова маюць патрэбу ў музыцы, бо ўспрыняцце гарманічных гукаў ёсць самым няясным з усіх нашых адчуванняў. Музыка ў спалучэнні з прыемнай думкай — гэта і ёсць паэзія, музыка без думкі — гэта проста му-

зыка, а думка без музыкі — гэта проза менавіта праз сваю канкрэтнасць».

Музычнасць паэзіі По нараджаюць не асобныя рытмічныя, метрычныя прыёмы, але і плынь гукаў. Паводле По, музыка нараджае паэзію. Музыка і паэзія аб'ядноўваюцца ў песні. Гэта тлумачыць абмежаванасць пастаянных рыфмаў і іх паўтаральнасць — паэт нібы дае варыяцыі адной тэмы, дасягаючы гэтага з дапамогай паўтораў, паралельных канструкцыяў, аднолькавых рыфмаў. Паэзію По яднае з музыкай і іншая якасць: пры ўсёй сваёй «няпэўнасці» музыка ёсць самым дакладным і ўпарадкаваным відам мастацтва. Аднак музыка ў ягоных вершах нясе сэнсавую нагрузку, ніколі не робячыся самамэтай.

Каб уцягнуць чытача ў творчы працэс, неабходнае эмацыйна-псіхалагічнае ўздзеянне верша. У словах, вобразах, кампазіцыі, дынаміцы гукавых спалучэнняў, руху рытму ўтрымліваецца не толькі тое, што выражана іх значэннем, але і яшчэ нешта — намёк на нявыказанае, магчымасць асацыяцыі, эмацыйных і сэнсавых абертонаў, якія не паддаюцца лагічнай расшыфроўцы.

По належыць некалькі зборнікаў вершаў: «"Тамерлан" і іншыя вершы бостанца» (1827), «"Аль-Арааф", "Тамерлан" і малыя вершы» (1829), «Вершы» (1831), «"Крумкач" і іншыя вершы» (1840).

Паэзія По абапіраецца на цэласную сістэму сімвалаў на ўсіх узроўнях паэтычнага тэксту — ад тэмы, кампазіцыі, вобразнага ладу да гукапісу.

Сімвалы як рухомая тоеснасць паміж ідэальным і літаральным значэннем вобраза вызначаюцца полісеміяй і сугестыяй, але ў лірыцы По, якая мудрагеліста яднае ўяўнае і бачнае аблічча рэчаў, сімвалы падлягаюць умоўнай класіфікацыі паводле формы ўвасаблення сімвалічнага сэнсу ў канкрэтным вобразе.

Так, закляты замак або Калізей у аднайменных вершах По сімвалізуюць смерць Прыгажосці і Розуму, асуджанасць прыгожага ў ашалелым свеце бездухоўнасці, жоўты альбатрос з «Краіны феяў» — «сімвал музыкі сфераў», кволай і без-

абароннай прыгажосці свету. Уласцівасці сімвала ў вершах По маюць нават няясныя адчуванні (да прыкладу, узрушэнне героя ў «Стансах»). З пазіцыі рамантычнага двухсвецця, суадносінаў рэальнага і ідэальнага тлумачыць По сімвалічны сэнс мары («Мары»), цішыні («Цішыня»).

У вершы «Духі мёртвых» (1827) узнікае вобраз-сімвал вечнасці, што адлюстроўвае далучанасць чалавечага духу да «таямніцы таямніцаў»:

І вецер — Божы ўздых — сцішэў,
Туман сярод замшэлых дрэў
Плыве, плыве, жахлівы, вадкі,
Ён — сімвал, ён — твае здагадкі
(Ім тут, у цішыні, клубіцца)
Пра таямніцу таямніцаў[1].

У ранніх вершах По назіраецца аднаразовая змена памеру разам са зменай агульнай танальнасці думкі. Твор падзяляецца на дзве часткі, сугучныя адна адной, як варыяцыі аднае тэмы. Так пабудаваныя вершы «Сон у сне», «Да ракі», «Да Хэлен», «Шчаслівы дзень». Гэты прынцып развіты ў «Горадзе ў моры», «Краіне сноў» і дасягае найвышэйшага ўвасаблення ў позніх вершах — «Улялюм», «Званы».

Верш «Званы» быў надрукаваны пасля смерці паэта — 27 кастрычніка 1849 года ў нью-ёркскім часопісе *Union Magazine*. У 1848 годзе По наведаў М.-Л. Ш'ю і паскардзіўся на тое, што кепска пачуваецца, сказаўшы, што нават гук званоў яго раздражняе. Тады Марыя-Луіза ўзяла аркуш і, пераймаючы почырк По, вывела загаловак: «The Bells. By E. A. Poe», а потым і першы радок: «The Bells. The little silver bells». Паэт хутка скончыў страфу. Марыя-Луіза прапанавала яму пачатак другой страфы: «The heavy iron bells», якую По неадкладна працягнуў. Спачатку ў верш увайшло 18 радкоў, у канчатковым варыянце іх 113. Тэма верша пераклікаецца з апавяданнямі «Чорт на званіцы», «Маска Чырвонае Смерці».

---

[1] Пераклад Ганны Янкута.

У першай частцы апісваецца нараджэнне чалавека і ягонае дзяцінства, стан шчаслівага сну, і срэбныя званочкі гавораць аб прадчуванні духоўнага нараджэння. Няцотная колькасць аднаскладовых словаў, якія ўвесь час паўтараюцца (tinkle, time, bells) і яднаюць гук і сэнс (bells / foretells / wells / cells / swells / dwells / impels / tells / compels / yells / knells; twinkle / oversprinkle; time / rhyme).

У другой частцы гучыць гімн «залатому веку» чалавечага жыцця. Карціна дынамічная, спеў званоў разлятаецца феерверкам. Гэта дасягаецца за кошт змены колькасці стопаў у радку, алітэрацыі санорных і звонкіх зычных пры мінімуме глухіх выбухных, паўтору слова *bells* 10 разоў запар, што скіроўвае думкі й пачуцці да стану экстатычнага шчасця.

Калі ў першых дзвюх частках сімвалы-гукі ствараюцца з дапамогаю асанансаў вузкага (i) і адкрытых (o, a) галосных гукаў, то ў трэцяй і чацвертай частках прадчуванне і надыход катастрофы перадае алітэрацыя санорных зычных (r).

Эмблемай і квінтэсенцыяй паэзіі По ёсць легендарны верш «Крумкач». Загадкавы вобраз чорнай птушкі, што сядзіць на белым мармуровым бюсце Палады, не падлягае вычарпальнаму вытлумачэнню, нягледзячы на велізарную колькасць каментароў і перш за ўсё — падрабязнае тлумачэнне задумы і яе ўвасаблення самім аўтарам. У 1846 годзе ў працы «Філасофія кампазіцыі» ён піша, што «ў стварэнні гэтага твора не ўдзельнічалі ні выпадковасць, ні інтуіцыя, што праца крок за крокам рухалася да завяршэння з усёй дакладнасцю і жорсткай паслядоўнасцю — як рашэнне матэматычнай задачы».

У вершы «Крумкач» узнікае трагічнае напружанне ад сутыкнення розуму героя, які асэнсоўвае немагчымасць сустрэчы з каханаю па той бок зямнога быцця, і душою, што прагне гэтай сустрэчы. Тэма неадольнай мяжы паміж жыццём і смерцю, часам і вечнасцю, надзеяй і сумневам, верай і адчайным скепсісам выказаная ў двайным дыялогу — унутраным (героя і ягонай свядомасці) і вонкавым (героя і птушкі). Вытрымка, якую дае цвярозы розум, і іранічнае стаўленне да «дурной» птушкі, што паўтарае адно і тое ж сло-

ва, змяняюцца пачуццём трывогі, адчаю, бязмежным болем безнадзейнасці. «Я вырашыў унесці варыяцыі і такім чынам значна пашырыць уражанне, захоўваючы збольшага аднастайнасць гучання, аднак увесь час змяняючы сэнс: інакш кажучы, я вырашыў увесь час ствараць новыя ўражанні, *пазнаму* выкарыстоўваючы рэфрэн, пры гэтым пакідаючы яго ў большасці выпадкаў без зменаў». Нарастанне трывогі адбываецца дзякуючы на першы погляд выпадковаму, а насамрэч заканамернаму перасячэнню логікі ўнутранага маналога героя, які тужыць па прыўкраснай Лінор, з асэнсаваным адказам крумкача. У выніку слова *nevermore* набывае супрацьлеглы сэнс і пачынае абазначаць пакуту няпэўнага існавання на мяжы надзеі й безнадзейнасці.

Самабытнасць і супярэчлівасць несмяротных твораў Эдгара По шмат у чым абумовіў дзіўны сплаў амерыканскай і еўрапейскай культураў у перыяд фармавання нацыянальнай літаратуры ЗША. З імем Э. По звязанае станаўленне амерыканскага рамантызму, які адлюстраваў працэс набыцця нацыянальнай самасвядомасці (рух натывізму) пасля перамогі ў вайне за незалежнасць ад Брытаніі. У спалучэнні жанравых формаў еўрапейскага рамантызму і культурна-гістарычных рэаліяў амерыканскага жыцця нараджаўся новы мацярык на мапе сусветнай літаратуры: «галандскія» навелы Вашынгтона Ірвінга, гістарычныя раманы Фенімора Купера, псіхалагічная проза Натаніэла Готарна, «марскі» раман Генры Мэлвіла.

Аднак менавіта з По пачалася сусветная слава амерыканскай літаратуры, якая не толькі пераадолела стадыю вучнёўства і зраўнялася з літаратурай еўрапейскай, але і змагла яе апярэдзіць. Эдгар По сваімі мастацкімі здзяйсненнямі ў паэзіі і навелістыцы здолеў выйсці за межы актуальных задачаў нацыянальнай літаратуры і пракласці дарогу новым кірункам і жанравым формам у развіцці еўрапейскай і сусветнай літаратуры.

*Нарынэ Шахназаран*

# Марэла

**Αὐτὸ καθ' αὐτὸ μεθ' αὐτοῦ, μονοειδὲζ ἀει ὂν.**
*Сабой, толькі сабой, у сваім вечным адзінстве.*
Платон. «Бяседа»

З глыбокай, але дзіўнай прыязнасцю згадваю я сваю сяброўку Марэлу. Выпадак звёў нас шмат гадоў таму, і з самае першае сустрэчы душа мая загарэлася нязнаным ёй датуль полымем. Але запаліў яго не Эрот, і горка-пакутна думаў я, што ніяк не магу зразумець яго незвычайны сэнс ці кіраваць яго цьмянай сілай. Але мы сустрэліся, і лёс прывёў нас да алтара, і ніколі я не казаў пра жарсць і не думаў пра каханне. Яна пазбягала людзей і, прысвяціўшы ўсю сябе мне аднаму, зрабіла мяне шчаслівым, бо шчасце — у марах, шчасце — у здагадках.

Вучонасць Марэлы была надзвычайнай. Клянуся сваім жыццём, таленты яе былі не тымі, якімі хваляцца звыклыя людзі, — моц яе розуму была тытанічнай. Я адчуваў гэта і стаў яе вучнем — ва ўсіх сэнсах. Хутка я заўважыў, што яна — магчыма, з прычыны свае Прэсбургскае* адукацыі — давала мне містычныя творы, якія звычайна лічаць проста адкідамі ранняе нямецкае літаратуры. Я не мог зразумець прычыны таго, але яны былі ўлюбёным і заўсёдным прадметам яе вывучэння, а з часам сталі і маім, што можна патлумачыць простым, але ўладным уплывам звычкі і прыкладу.

Ва ўсім гэтым, наколькі я ведаю, розум мой не браў ніякага ўдзелу. Мае перакананні — ці я забываюся? — ніяк не закраналіся ідэальным, і ніякае адценне містыцызму, пра які я чытаў, — ці я памыляюся? — не афарбоўвала маіх думак і ўчынкаў. Упэўнены ў гэтым, я цалкам аддаўся кіраўніцтву свае жонкі і з непахіснаю рашучасцю рушыў у лабірынт яе заняткаў. А потым — потым, калі, схіляючыся над забароненымі старонкамі, я адчуваў, як забаронены дух абуджаецца ўва мне, — Марэла клала сваю халодную руку на маю і наварушвала ў попеле мёртвае філасофіі некалькі прыглушаных, дзіўных словаў, чыё цьмянае значэнне выпаленае

ў маёй памяці. А потым, гадзіну за гадзінай, я ўсё сядзеў ля яе і цалкам аддаваўся музыцы яе голасу, пакуль урэшце ў мелодыю не закрадаўся страх, і падаў цень на маю душу, і я бляднеў, і дрыжаў унутры ад гэтых звышнатуральных гукаў. Так радасць раптам зрыналася ў жах, і найчароўнейшае рабілася найагіднейшым, як Гіном стаў Геенай*.

Няма неабходнасці падрабязна апісваць гэтыя даследаванні, якія, пачаўшыся са згаданых мной трактатаў, сталі адзінай нашай — маёй і Марэлы — тэмай для размовы. Хто вывучаў тое, што можна назваць тэалагічнай этыкай, лёгка ўявіць іх сабе, хто не вывучаў — наўрад ці іх зразумее. Неўтаймаваны пантэізм Фіхтэ, Παλιγγενεσια[1] піфагарэйцаў і асабліва вучэнне Шэлінга пра *тоеснасць** былі найбольш прывабнымі тэмамі для багатага ўяўлення Марэлы. Тоеснасць, якая называецца асабістай, містэр Лок* слушна, на мой погляд, вызначае як нармальнасць разумнае істоты. І калі пад асобай мы разумеем істоту, якая мысліць, і калі свядомасць заўсёды ідзе з мысленнем поруч, гэта і ёсць тым, што робіць нас «самімі сабой», тым, што аддзяляе нас ад іншых існаванняў, якія таксама мысляць, і надае нам асабістую тоеснасць. Але *principium individuationis*[2], ідэя гэтае тоеснасці, якая пасля смерці страчваецца ці захоўваецца навечна, заўжды выклікаў ува мне нястрымную цікавасць, хутчэй нават не праз свае дзіўныя наступствы, а праз усхваляванасць, з якою Марэла згадвала пра гэта.

Але прыйшоў час, калі таямніца мае жонкі пачала прыгнятаць мяне, бы ліхі заклён. Я не мог больш трываць дотыкаў яе бледных пальцаў, ціхае музычнасці яе мовы, бляску яе сумных вачэй. Яна заўважала гэта, але не дакарала: яна нібы ведала пра маю слабасць ці маю неразумнасць і, усміхаючыся, называла гэта лёсам. Яна ведала, мабыць, і невядомую мне прычыну майго паступовага адчужэння, але ніколі нават не намякала мне на яе сутнасць. Усё ж яна была жанчынай і чэзла з кожным днём. Прыйшоў час, калі чырвань заліла яе шчокі і блакітныя жылкі выступілі на бледным ілбе. І тады мяне

[1] Перасяленне душы* (грэцк.).
[2] Індывідуальны пачатак (лац.).

ўсяго на момант ахапіла шкадаванне, але тут жа я сустрэў яе шматзначны позірк, і зноў дух мой саслабеў і галава закружылася, нібы я зазірнуў у змрочную недасяжную бездань.

Ці трэба казаць, што я неадступна і палка прагнуў смерці Марэлы? Я прагнуў, але кволы дух чапляўся за зямную абалонку шмат дзён, шмат тыдняў і надакучлівых месяцаў, пакуль мае скатаваныя нервы не адолелі розум. Мяне ятрыла гэтая затрымка, і злым сваім сэрцам я пракляў горкія дні, гадзіны і імгненні, якія ўсё расцягваліся, як цень пры канцы дня, пакуль слабела яе пяшчотнае жыццё.

Але адным восеньскім вечарам, калі вятры сціхлі ў нябёсах, Марэла паклікала мяне да свайго ложка. Над усёй зямлёй была слабая смуга, і гэткая ж над вадою, і вясёлка ўпала з небасхілу ў лісце кастрычніцкага лесу.

— Гэта дзень між дзён, — сказала яна, калі я наблізіўся, — дзень між дзён, калі прыходзіць жыццё альбо смерць. Гэта дзень сыноў зямлі і жыцця — і таксама дзень дачок нябёсаў і смерці!

Я пацалаваў яе лоб, і яна працягвала:

— Я паміраю, але ўсё ж буду жыць.

— Марэла!

— Не было дня, калі ты любіў мяне, — але калі ты жахаешся жывой, то памерлай будзеш захапляцца.

— Марэла!

— Кажу яшчэ раз, я паміраю. Але ўва мне спее плод тае прыязнасці — такой малой! — якую ты адчуваў да мяне, Марэлы. І калі адыдзе мая душа, дзіця будзе жыць — тваё дзіця і маё, дзіця Марэлы. Але твае дні будуць днямі смутку — смутку, які доўжыцца даўжэй за ўсе пачуцці, як кіпарыс жыве даўжэй за ўсе дрэвы. Гадзіны твайго шчасця злічаныя, а радасць не прыходзіць у жыццё двойчы, як ружы Пестума* квітнеюць двойчы на год. Ты больш не будзеш, як тэосец*, радавацца гадам, што мінаюць, але, забыўшыся на мірт і віно, будзеш несці свой саван па жыцці, як мусульмане ў Мецы.

— Марэла! — усклікнуў я. — Марэла! Адкуль табе ведаць гэта? — але яна адвярнулася ў падушку, і лёгкая дрыготка прабегла па яе целе. Так яна памерла, і больш не чуў я яе голасу.

Як яна і прадбачыла, яе дзіця, якому яна дала жыццё сваёй смерцю, дзіця, якое пачало дыхаць, калі яна дыхаць перастала, — яе дачка жыла. І яна дзіўна развівалася целам і розумам і была цудоўным падабенствам той, што пакінула гэты свет. І я любіў яе любоўю больш палкай, чым тая, якую можна адчуць да любога чалавека на зямлі.

Але неўзабаве яснае неба гэтае прыязнасці пацямнела ад аблокаў, змрок, жах і гора ахапілі мяне. Дзіўна, дзіўна развівалася яна целам і розумам. Дзіўным, насамрэч дзіўным быў незвычайны рост яе цела, але жахлівымі, о, якімі жахлівымі былі неспакойныя думкі, якія апаноўвалі мяне, калі я думаў пра развіццё яе розуму! Ці магло быць іначай, калі я штодня бачыў у словах дзіцяці мысленне і здольнасці дарослае жанчыны, калі ўрокі дасведчанасці зыходзілі з вуснаў малое? Калі мудрасць і памкненні дарослай я чуў штогадзіну, дрыжучы ад яе позіркаў, у якіх свяцілася глыбіня розуму? Калі ўсё гэта стала відавочным для маіх агаломшаных пачуццяў, калі я не мог больш хаваць гэта ад свае душы і выкінуць гэта са сваіх думак, здагадкі, страшныя здагадкі з'явіліся ўва мне, і я ўспомніў неверагодныя аповеды і вар'яцкія тэорыі памерлае Марэлы. Я схаваў ад свету істоту, якую лёс прымусіў мяне любіць, і падарыў ёй строгую адзіноту свайго дому,назіраючы з пакутлівым неспакоем за ўсім, што датычыла яе.

Міналі гады, і дзень пры дні ўглядаўся я ў яе нявінны, спакойны твар, які так шмат казаў мне, і яе дарослае цела, дзень пры дні бачыў новыя рысы падабенства дзіцяці з яе памерлай маці, бачыў скруху і смерць. З кожнай гадзінай згушчаліся гэтыя цені падабенства, рабіліся ўсё больш рэзкімі, выразнымі, складанымі і жахлівымі. Усмешка рабілася падобнай да матчынай — я мог гэта вытрываць, але дрыжаў ад такое дасканалае тоеснасці; вочы былі падобныя да вачэй Марэлы — я мог гэта цярпець, але яны так часта зазіралі ў глыбіні мае душы з незразумелай уладнасцю. І абрысы высокага ілба, і пасмы ядвабных валасоў, і бледныя пальцы, якія іх перабіралі, і сумная меладычнасць словаў, і асабліва — о, асабліва словы мёртвай на вуснах любай і жывой хвалявалі і жахалі мяне, і тачылі, як чарвяк, які ніколі не памрэ.

Так мінула дзесяць гадоў, а мая дачка ўсё яшчэ не мела імя на гэтай зямлі. «Маё дзіця» і «мая любоў» — так называла яе бацькава пяшчота, а поўная самота яе існавання выключала ўсялякія дачыненні з іншымі. Імя Марэлы памерла разам з ёй. Я ніколі не размаўляў з дачкой пра маці, гэта было немагчыма. За кароткае сваё жыццё яна не мела ніякіх уражанняў ад вонкавага свету, апроч тых, якія дазвалялі вузкія межы яе адасобленага існавання. Але ўрэшце я згадаў пра хрышчэнне як пра магчымасць вызвалення ад жахаў, на якія асудзіў мяне кон. І нават ля купелі я вагаўся, не ведаючы, якое імя абраць. Мноства імёнаў — сімвалаў мудрасці і прыгажосці, імёнаў старажытных і нашых часоў, імёнаў маёй і чужых краінаў амаль сарвалася з маіх вуснаў разам з імёнамі — сімваламі высакароднасці, шчасця і дабрыні. Што прымусіла мяне патрывожыць памяць пахаванай? Які дэман змусіў мяне выдыхнуць гэтае слова, гук якога пагнаў маю кроў ад скроняў да сэрца? Якая пачвара прамаўляла з глыбіняў мае душы, калі ў цішыні ночы сярод крыжоў я прашаптаў святару «Марэла»? Хто ж, калі не сам д'ябал, сказіў рысы тварыка майго дзіцяці, надаўшы яму адценне смерці? Пачуўшы гэтыя гукі, яна ўзняла свае шкляныя вочы з зямлі ў неба і, апусціўшыся бязвольна на чорныя пліты нашага фамільнага склепа, адказала: «Я тут!»

З выразнасцю — халоднай, спакойнай выразнасцю зляцелі гэтыя простыя гукі з яе вуснаў — і нібы расплаўлены свінец з шыпеннем пацёк у маю галаву. Гады — гады могуць мінуць, але памяць пра гэта не знікне ніколі. Я не толькі забыўся на кветкі і віно, але цыкута і кіпарыс кідалі цень на дні мае і ночы. Я не мераў ні прасторы, ні часу, і зоры майго лёсу падалі з неба, і змрок накрыў зямлю, і хуткімі ценямі праходзілі міма мяне яе вобразы, сярод якіх я бачыў толькі адзін — Марэлу. Вятры шапталі мне адно слова, якое я мог чуць, і хвалі на моры мармыталі толькі адно — «Марэла»... Але яна памерла, і я сам аднёс яе ў склеп — і доўга горка смяяўся, не знайшоўшы ні следу першай там, куды паклаў другую — Марэлу.

*Пераклала Марына Дзергачова*



*...і змрок накрыў зямлю, і хуткімі ценямі праходзілі міма мяне яе вобразы, сярод якіх я бачыў толькі адзін — Марэлу.*

# Падзенне Дому Ашэраў

Son coeur est un luth suspendu;
Sitôt qu'on le touche il résonne.
De Béranger[1]

Увесь гэты маркотны, цьмяны, глухі дзень на зыходзе года, калі хмары гнятліва навісалі над зямлёй, я ехаў на кані праз цалкам бязрадасную мясцовасць, і калі спусцілася цемра, апынуўся перад змрочным Домам Ашэраў. Не ведаю, чаму, але першы ж погляд на будынак напоўніў маю душу нясцерпнай тугой. Я сказаў «нясцерпнай», бо ў ёй не было той палёгкі, якую прыносіць амаль прыемнае — бо паэтычнае — пачуццё, што мы перажываем, сузіраючы нават пейзажы, поўныя журбы або жаху. Я паглядзеў на дом і немудрагелісты краявід, на панурыя сцены, на вокны, падобныя да пустых вачніцаў, на рэдкую асаку, на белыя камлі гнілых дрэваў — і адчуў поўную прыгнечанасць духу, якую з усіх зямных адчуванняў можна параўнаць хіба што з абуджэннем курца опіюму — горкім вяртаннем да рэчаіснасці, жахлівым зрываннем завесы. Гэта была слабасць, скамянеласць, знямогласць сэрца, непераадольная кволасць думкі, якую ніякая сіла ўяўлення не магла абудзіць да чагосьці ўзнёслага. «Што ж гэта, — задумаўся я, — што ж так прыгнятае мяне, калі я гляджу на Дом Ашэраў?» Загадку немагчыма было развязаць; не мог я даць рады і няпэўным фантазіям, якія апанавалі мяне падчас маіх развагаў. Мне давялося прыйсці да той непераканаўчай высновы, што хаця гэта, без сумневаў, усяго толькі спалучэнне цалкам звычайных рэчаў, здольных так на нас уплываць, усё ж прырода гэтай з'явы — па-за межамі нашага разумення. «Магчыма, — разважаў я, — будзе дастаткова штосьці змяніць у краявідзе, па-іншаму спалучыць элементы пейзажу — і скрушнасць уражання зменшыцца, а можа, і зусім знікне».

---

[1] Як лютня, сэрца у яго:
Кранi — і адзавецца гукам. *Беранжэ** (фр.).

І, падумаўшы так, я скіраваў каня да стромага берага злавеснага чорнага возера, што застыла ў бляску і нерухомасці недалёка ад будынка, і пільна ўгледзеўся, чамусьці з яшчэ большым трымценнем, у перакуленыя і скажоныя адлюстраванні шэрай асакі, прывідных камлёў і пустых вокнаў-вачніцаў.

Тым не менш у гэтым валадарстве змроку я збіраўся спыніцца на некалькі тыдняў. З гаспадаром дому Родэрыкам Ашэрам мы былі блізкімі сябрамі ў дзяцінстве, але з нашай апошняй сустрэчы прайшло шмат гадоў. Нягледзячы на гэта, ліст ад яго дагнаў мяне днямі ў аддаленай частцы краіны, ліст усхваляваны і настойлівы, які не дапускаў ніякага адказу, апроч сустрэчы. Пасланне гэтае сведчыла пра нервовае ўзбуджэнне. Аўтар яго пісаў пра цялесную нядужасць, пра разумовы разлад, які яго прыгнятае, пра гарачае жаданне бачыць мяне, свайго найлепшага, больш за тое — адзінага блізкага сябра; пра спадзяванне, што мая жыццярадаснасць і маё таварыства прымусяць ягоную хваробу адступіць. І тон, у якім усё гэта і многае іншае было сказана, і відавочная палымянасць ягонай просьбы не пакідалі месца для ваганняў — і я прыняў запрашэнне, якое ўсё яшчэ лічыў вельмі дзіўным.

Нягледзячы на тое, што нашыя стасункі ў дзяцінстве можна было нават назваць блізкімі, я няшмат ведаў пра свайго сябра. Ён заўсёды быў надзвычай замкнёны. Тым не менш мне даводзілася чуць, што прадстаўнікі ягонага старажытнага роду здаўна вылучаліся празмернай чуллівасцю тэмпераменту, які цягам стагоддзяў знаходзіў увасабленне ў творах высокага мастацтва, а з некаторага часу выяўляўся ў пастаяннай і шчодрай, але ненавязлівай дабрачыннасці, як, дарэчы, і ў гарачай прыхільнасці не столькі да звыклай і лёгкапазнавальнай, колькі да вышукана прыгожай музыкі. Калісьці я даведаўся таксама пра той цікавы факт, што генеалагічнае дрэва асвечанага стагоддзямі роду Ашэраў ніколі не давала моцных галінаў; іншымі словамі, род працягваўся толькі па асноўнай лініі, і так было, за выняткам некалькіх нязначных і недаўгавечных адхіленняў, заўжды. Магчыма, гэты дэфект, разважаў я, думаючы пра незвычайную адпаведнасць выгляду маёнтка ўсім вядомаму характару яго гаспадароў і дапускаючы магчымасць

уплыву, які цягам доўгіх стагоддзяў першы мог зрабіць на другі, — гэты дэфект, гэтая адсутнасць пабочных галінаў роду і, як вынік, пераход спадчыны, разам з імем, ад бацькі да сына па наўпростай лініі, нарэшце настолькі зблізіў уладароў і ўладанні, што імя і назва зліліся ў дзіўным і двухсэнсоўным найменні «Дом Ашэраў», найменні, якое ва ўяўленні сялянаў, што жылі тут, аб'ядноўвала род і родавае гняздо.

Я ўжо сказаў, што адзіным вынікам майго ўнечым дзіцячага эксперымента, калі я разглядаў адлюстраванні ў возеры, было тое, што першае неадназначнае ўражанне толькі ўзмацнілася. Без сумневаў, усведамленне таго, што мая забабоннасць (чаму б мне не назваць гэта так?) імкліва ўзрастае, толькі спрыяла гэтаму росту. Такім ёсць, як я даўно ўжо ведаў, парадаксальны закон усіх пачуццяў, што грунтуюцца на страху. І, пэўна, толькі з гэтай прычыны ў момант, калі я чарговым разам падняў позірк з адбітку дому ў стаўку на сам дом, нарадзілася ў маёй свядомасці ілюзія настолькі дзіўная і недарэчная, і нават больш за тое, што я згадваю яе толькі, каб даць уяўленне пра незвычайную сілу адчуванняў, якія апанавалі мяне. Мая фантазія настолькі разгулялася, што я насамрэч паверыў, быццам маёнтак ахінае атмасфера, уласцівая толькі яму і ваколіцам, — атмасфера, якая не мела нічога агульнага з паветрам і небам, паўстаўшы з выпарэнняў ад гнілых дрэваў, ад шэрых сценаў, ад маўклівага возера, згубная і таямнічая, бязрадасная, чэзлая, ледзь заўважная, свінцовага колеру.

Адагнаўшы думку, якая *не магла* не быць насланнём, я пачаў больш уважліва вывучаць фасад будынка, які існаваў наяве. Без сумневаў, ён быў надзвычай старажытны. Стагоддзі доўга сціралі яго колеры. Плесня пакрывала ўсю знадворную частку дому, тонкай заблытанай павуцінай звісаючы з дахавых скатаў. Але хоць якога значнага разбурэння не было заўважна. Каменная кладка не абвалілася, і дзіўна было назіраць скрайнюю неадпаведнасць паміж усё яшчэ бездакорнымі прапорцыямі пабудовы і станам асобных, амаль раскрышаных, камянёў. Усё гэта нагадала мне падманную цэласць старое драўніны, што доўгія гады гніла ў якім-небудзь закінутым сутарэнні, куды ні разу не ўварваўся

звонку подых ветру. Зрэшты, апроч гэтага знаку павольнага заняпаду, матэрыял не выглядаў нетрывалым. Магчыма, уважлівае вока і ўгледзела б амаль незаўважную расколіну, што пачыналася ўверсе фасада, зігзагам спускалася па сцяне і гублялася ў змрочных водах возера.

Звярнуўшы ўвагу на ўсё гэта, я кароткай паркавай сцежкай пад'ехаў да дому. Служка прыняў майго каня, і я прайшоў пад гатычнымі скляпеннямі хола. Нячутна ступаючы, лёкай у поўным маўчанні правёў мяне праз шматлікія цёмныя і заблытаныя калідоры ў кабінет свайго гаспадара. Шмат з таго, што я бачыў, пакуль мы ішлі, усё больш нагнятала тыя няясныя адчуванні, пра якія я ўжо казаў. І хаця ўсё, што атачала мяне, — разьблёны арнамент столі, цёмныя габелены на сценах, гладкая чорная падлога, фантасмагарычная трафейная зброя, якая бразгатала, калі я праходзіў міма, — усё было (ці здавалася мне) знаёмым з дзяцінства, я, усведамляючы яго звычайнасць, са здзіўленнем адзначаў, якія неверагодныя фантазіі могуць абудзіць самыя звыклыя прадметы. На адной з лесвіцаў я сустрэў сямейнага доктара. На твары ягоным, як мне здалося, агідная хітрасць змешвалася з разгубленасцю. Ён усхвалявана прывітаў мяне і пайшоў далей. Лёкай тым часам расчыніў дзверы і абвесціў мой прыход.

Пакой, у якім я апынуўся, быў вельмі прасторны і высокі. Доўгія і вузкія спічастыя вокны былі так высока ад дубовай падлогі, што да іх немагчыма было дацягнуцца. Слабых чырванаватых промняў, што праходзілі праз закратаваныя вокны, было дастаткова, каб разгледзець найбольш буйныя прадметы, але позірк марна спрабаваў сягнуць аддаленых кутоў пакоя або паглыбленняў у скляпеністай, пакрытай разьбой столі. Цёмныя парцьеры завешвалі сцены. Старажытная мэбля была нязручнай і абшарпанай. Паўсюль ляжалі кнігі і музычныя інструменты, але яны не рабілі абстаноўку хоць на каліва больш жывою. Я адчуў, як мяне паглынае атмасфера скрухі. Усё поўніла і над усім панавала гнятлівая, глыбокая, несуцішная туга.

Калі я ўвайшоў, Ашэр падняўся з канапы, дзе да гэтага ляжаў расцягнуўшыся, і прывітаў мяне з той гарачай сардэч-

насцю, у якой, як мне спачатку падалося, было шмат ад празмернай ветлівасці, змушаных высілкаў знуджанага сплінам свецкага чалавека. Але адзін позірк на Ашэра ўпэўніў мяне ў яго непадробнай шчырасці. Мы селі. Некалькі імгненняў, пакуль ён маўчаў, я глядзеў на яго са змяшаным пачуццём жалю і страху. Несумненна, ні адзін чалавек за такі кароткі час не мяняўся так жахліва, як Родэрык Ашэр! Цяжка было паверыць, што чалавек, які сядзіць перада мной, — сябар майго дзяцінства. І ўсё ж рысы ягоныя былі адметнымі і тады, і цяпер. Змярцвела-бледны твар; вялікія, ясныя, сваім бляскам ні з чым не параўнальныя вочы; вусны даволі тонкія і практычна бяскроўныя, але незвычайна прыгожых абрысаў; тонкі габрэйскі нос, але з зашырокімі для такой формы ноздрамі; цудоўна вылепленае падбароддзе недастаткова выступае наперад, што сведчыць пра недахоп душэўных сілаў; валасы, мякчэйшыя і танчэйшыя за павуціну, — гэтыя рысы ў спалучэнні з празмерна высокім ілбом нялёгка было забыць. А цяпер яны акрэсліліся так рэзка, застыўшы ў выразе, які часта прымалі, што непазнавальна змянілі гэты твар, і я нават засумняваўся, што за чалавек перада мной. Цяперашнія мёртвая бледнасць скуры і неверагодны бляск вачэй здзівілі — і нават спалохалі — мяне найбольш. Далікатныя, бы шоўк, зблытаныя валасы, здавалася, жылі асобным жыццём і, як павуціна, быццам не абрамоўвалі твар, а луналі вакол яго, і я не мог, як ні намагаўся, спалучыць гэты фантастычны вобраз з уяўленнем пра зямную істоту.

У паводзінах майго сябра мяне адразу ўразіла нейкая непаслядоўнасць, супярэчлівасць. Хутка я зразумеў, што прычынай яе былі шматлікія марныя спробы змагчы пастаянную дрыготку, моцнае нервовае ўзбуджэнне. Да чагосьці такога я быў падрыхтаваны і ягоным лістом, і некаторымі дзіцячымі ўспамінамі, і высновамі, якія я зрабіў, назіраючы за яго фізічнымі асаблівасцямі і праявамі яго незвычайнага тэмпераменту. Ён то ажыўляўся, то зноў рабіўся прыгнечаным. Ягоны голас то няўпэўнена дрыжаў (калі бадзёрасць знікала дащэнту), то раптам пераходзіў да энергічнае важкасці, да таго адрывістага, цяжкога, павольнага і гулкага вымаўлення, якое,

са сваёй няспешнасцю, ураўнаважанасцю і бездакорнымі мадуляцыямі, уласцівае безнадзейным п'яніцам або невылечным опіяманам падчас іх найвышэйшае ўзбуджанасці.

Вось такім чынам ён гаварыў пра мэту майго візіту, пра гарачае жаданне бачыць мяне і пра суцяшэнне, якога ён чакаў ад майго прыезду. Ён доўга расказваў мне пра тое, што лічыў прычынаю свае хваробы. Гэта была, казаў ён, прыроджаная спадчынная немач, сродак супраць якой ён зняверыўся знайсці. Звычайнае нервовае расстройства, — тут жа дадаў ён, — якое, без сумневаў, хутка пройдзе. Праяўлялася яно ў шматлікіх ненатуральных адчуваннях. Некаторыя з іх пасля ягонага апісання зацікавілі і збянтэжылі мяне, зрэшты, магчыма, на мяне паўплывалі асобныя яго словы і яго манера гаварыць увогуле. Ён неймаверна пакутаваў ад хваравітае абвостранасці ўсіх пачуццяў. Ён насіў адзенне толькі з пэўнае тканіны, мог трываць толькі ежу зусім без смаку, пах любых кветак быў для яго невыносны, ягоныя вочы не цярпелі нават цьмянага святла, і толькі асобныя гукі струнных інструментаў не поўнілі яго жахам.

Я зразумеў, што ім завалодаў нейкі ненармальны страх. «Я загіну, — казаў ён, — я *мушу* загінуць ад гэтага неперагоднага вар'яцтва. Такі, менавіта такі, і ніякі іншы, канец мяне чакае. Я так баюся тых здарэнняў, што хутка адбудуцца... не, не іх саміх, а таго, што яны за сабою пацягнуць. Я скаланаюся ад думкі пра любы, нават самы банальны, выпадак, здольны паўплываць на гэтую невыносную душэўную ўзбуджанасць. Мне агідная не небяспека, а яе скрайняя праява — жах. Вось так, пазбаўлены мужнасці, у вартым жалю стане, я прадчуваю, што рана ці позна надыдзе імгненне, калі я страчу ўвадначас і жыццё, і розум у барацьбе са злавесным прывідам — *страхам*».

З часам я з ягоных бязладных і няясных намёкаў даведаўся пра яшчэ адну асаблівасць ягонага душэўнага стану. Ім валодалі забабонныя ўяўленні што да ягонага дому, адкуль ён многія гады нікуды не выязджаў, — пра нібыта моцны ўплыў (аб чым ён паведаміў такімі цьмянымі выразамі, што я не ў стане іх узнавіць), які пэўнымі асаблівасцямі архітэктуры і матэрыялу і з прычыны шматгадовае звычкі

зрабіў на ягоную душу ягоны фамільны замак: выгляд шэрых сценаў і вежаў, цёмнае возера, у якое яны глядзеліся, — усё гэта адбілася на *духоўным* боку ягонага жыцця.

Аднак ён прызнаўся, хоць і не адразу: надзвычайная прыгнечанасць, якая апанавала яго, была выкліканая прычынаю больш натуральнаю і нашмат больш значнаю — цяжкой і доўгай хваробаю, а дакладней, відавочна блізкай смерцю пяшчотна любімай сястры, яго адзінага сябра на працягу доўгіх гадоў, апошняй на свеце з іхнай сям'і. Яе скон, казаў ён з горыччу, якой я не магу забыць, пакіне яго (яго, роспачнага, кволага) апошнім са старажытнага роду Ашэраў. Пакуль ён гаварыў, лэдзі Мадэліна (менавіта так яе звалі) прайшла міма праз аддаленыя дзверы пакоя і, не заўважыўшы мяне, знікла. Я глядзеў на яе, неймаверна ўражаны і не без трымцення, не ў стане ўсё ж вытлумачыць гэтыя адчуванні. Я дранцвеў, сочачы за тым, як яна паступова знікала з вачэй. Калі ўрэшце за ёю зачыніліся дзверы, я інстынктыўна і нецярпліва павярнуўся да яе брата, але ён закрыў твар рукамі, і я заўважыў толькі, як яшчэ большая бледнасць разлілася па ягоных худых пальцах, скрозь якія няспынна цяклі гарачыя слёзы.

Хвароба лэдзі Мадэліны доўгі час бянтэжыла яе дактароў. Пастаянная апатыя, усё большая знясіленасць і шматлікія, хаця і непрацяглыя, прыпадкі, падобныя да каталептычных, складаліся ў незвычайны дыягназ. Да гэтага яна мужна змагалася з абвастрэннямі хваробы і не дазваляла сабе злегчы. Але ўвечары таго дня, калі я прыехаў, яна — як з невымоўнай усхваляванасцю паведаміў мне яе брат — саступіла спусташальнай сіле разбуральніцы, і я зразумеў, што той вокамгненны позірк, кінуты мною на яе, можа стаць апошнім і што я не ўбачу яе болей — прынамсі, жывою.

Некалькі дзён ні я, ні Ашэр не згадвалі яе імя. Цягам гэтага часу я рабіў усё, каб развеяць тугу майго сябра. Мы малявалі або чыталі разам, а часам я, нібы ў сне, слухаў шалёныя імправізацыі ягонай гітары, якая быццам валодала дарам гаварыць. Па меры таго як расла і расла нашая блізкасць, адкрываючы мне доступ да таямніцаў ягонага сэрца, я з усё большай горыччу ўпэўніваўся ў марнасці сваіх высілкаў су-

цешыць душу, з якой змрок, нібы неад'емная і абавязковая яе частка, выліваўся на ўсё духоўнае і матэрыяльнае, беспerapынна выпраменьваючы тугу.

Памяць пра шматлікія змрочныя гадзіны, праведзеныя мною сам-насам з уладаром Дому Ашэраў, ніколі не пакіне мяне. Але мне б ніколі не ўдалося хаця б даць уяўленне пра тое, чым былі заняткі, да якіх ён залучаў мяне, у якіх ён кіраваў мною. Хісткая і зменлівая, нерэальная атмасфера кідала на ўсё вакол пякельны водбліск. Ягоныя доўгія імправізаваныя пахавальныя плачы заўсёды будуць гучаць у мяне ўвушшу. Сярод іншага болем адгукаецца ўва мне ўспамін пра нейкую дзіўна вычварную варыяцыю на тэму шалёнай мелодыі апошняга вальсу фон Вэбера*. З карцінаў, якія нараджала ягоная буйная фантазія, якім кожны мазок дадаваў няяснасці і якія напаўнялі мяне трымценнем — тым большым, што я не ведаў яго прычыны, — з гэтых карцінаў, што і цяпер стаяць перад вачыма, толькі маленькая частка падлягала слоўнаму апісанню. Строгая прастата ліній, выразны, без прыхарошвання, малюнак — усё забірала ўвагу і завалодвала гледачом даастатку. Калі якісьці смяротны і мог маляваць ідэю, то гэтым смяротным быў Родэрык Ашэр. Прынамсі, мне, у тых абставінах і ў тым атачэнні, бачылася, як з чыстых абстракцыяў, якія пад рукою майго сябра-іпахондрыка ўвасабляліся на палатне, нараджалася найглыбейшая і невыносная жуда, ні ценю якое я ніколі не адчуваў, сузіраючы безумоўна бліскучыя, але ўсё ж занадта канкрэтныя відзежы Фюзелі*.

Адзін з фантасмагарычных твораў майго сябра, не такі немагчыма абстрактны, як іншыя, можна, хоць і ў невялікай ступені, пераказаць словамі. Маленькая карціна выяўляла неймаверна доўгі прастакутны склеп або калідор, нізкі, з гладкімі белымі сценамі без аніякага ўзору або няроўнасці. Некаторыя дэталі малюнка давалі адчуць, што гэты склеп ляжыць вельмі глыбока пад зямлёю. Ніводнага выхаду не было відаць на ўсёй неагляднай яго прасторы, не было ніводнай паходні ці яшчэ якой-кольвек штучнай крыніцы святла. Тым не менш мноства яркіх прамянёў залівала ўвесь склеп, поўнячы яго дзіўным жудасным зззяннем.

Я толькі што згадваў пра хваравітасць слыхавога нерва, якая любую музыку рабіла для пакутніка невыноснай, за выняткам гучання некаторых струнных інструментаў. Магчыма, вузкая сфера, якою ён абмежаваў сябе, — гітара — у значнай ступені абумовіла фантастычнасць ягонага грання. Але нечуваную лёгкасць яго імправізацыяў гэтым патлумачыць немагчыма. Неўтаймоўныя фантазіі, выказаныя і ў гуках, і ў словах (зрэдку ён суправаджаў музыку вершаванымі экспромтамі), мусілі быць — і былі — вынікам напружанай разумовай засяроджанасці, якую, як я ўжо казаў, можна было назіраць толькі ў асаблівыя моманты найвышэйшай, штучна выкліканай экзальтацыі. Словы адной з такіх рапсодыяў я лёгка запомніў. Магчыма, яе выкананне так моцна ўразіла мяне, бо акурат тады я, зразумеўшы яе найглыбейшы схаваны сэнс, упершыню выразна адчуў: Ашэр цалкам усведамляе, што трон яго высокага розуму пахіснуўся. Верш, які называўся «Закляты замак», гучаў прыблізна, а магчыма, і дакладна так:

У даліне, дзе ўрачысты
Хваласпеў-харал гучаў,
Маляўнічы й прамяністы
Замак велічна паўстаў.
Розуму была там воля
Над усім,
І не асланяў ніколі
Лепшых земляў серафім.

Гордых вымпелаў палотны
Замкавы вянчалі дах
(Дзень згубіўся той зіхотны
У вяках).
Там ветрык лёгкі над мурамі
Шукаў забаў —
Сабе, гуляючы сцягамі,
Няўлоўны водар забіраў.

Хто ішоў праз дол спагадны,
Бачыў — там агонь не цьмеў —

Духаў танец пад суладны,
Меладычны лютняў спеў.
Там, у велічнай паставе,
Сын каралёў,
На троне ў асляпляльнай славе
Сядзеў уладца тых краёў.

Рубіны й перлы сноп праменняў
Слалі з замкавых дзвярэй,
З іх струменіў і струменіў,
І іскрыўся ўсё мацней
Хор галасоў; дзівоснай сілы
Яны былі,
Іх песня караля хваліла —
Не будзе лепшай на зямлі.

Ды змрочны дэман, скруха злая
Яго пазбавіла стальца.
О, плачце, бо яго адчаю
Ужо не прычакаць канца,
І слава болей не паўстане —
Бліскучы шчыт;
Яна — няяснае паданне,
Што адышло ў нябыт.

І хто пабачыць у трымценні
Чырвонае святло ў акне,
Дзе так бязладна скачуць цені, —
Той спешна замак абміне.
Імкнецца вонкі жах суцэльны —
Пачвараў плынь жывая.
Там можна рогат чуць пякельны,
А ўсмешак — не бывае.

Я добра памятаю, што гэтая балада выклікала ў нас шэраг разважанняў, што рабілі яснай адну думку Ашэра, якую я згадваю тут не таму, што яна такая ўжо новая (бо так думалі і іншыя[1]),

[1] Уотсан*, доктар Персіваль*, Спаланцані* і асабліва біскуп Ландаф — гл. «Нарысы па хіміі», том V (*заўв. Эдгара По*).

а праз настойлівасць, з якою ён яе трымаўся. У агульным гэтая думка зводзілася да таго, што ўсё жывое здольнае адчуваць. Але ў ягоным хваравітым уяўленні гэтая думка змянілася ў больш дзёрзкую, якая ў пэўных аспектах урывалася ў царства нежывой прыроды. Мне бракуе словаў, каб выразіць, як аддана ён трымаўся гэтай думкі і наколькі быў у ёй упэўнены. Гэтае ўяўленне, аднак, было звязанае (як я намякаў раней) з шэрымі камянямі замка ягоных продкаў. На ягоную думку, здольнасць гэтага дому адчуваць была абумоўленая спосабам злучэння камянёў і іх размяшчэннем, гэтаксама як і плесняю, што апляітала дом, і гнілымі дрэвамі, што яго атачалі, а перш за ўсё — доўгаю, бестрывожнаю непарушнасцю ўсяго навокал і яго падваеннем у застылых водах возера. Доказам існавання гэтае адчувальнасці, казаў ён (і я ўздрыгнуў, калі ён гэта сказаў), ёсць паступовае, але бясспрэчнае згушчэнне адмысловае атмасферы вакол возера й дому. А наступствы гэтага, дадаў ён, бачныя ў тым невідочным, але неаслабным і жудасным уплыве, які стагоддзямі вылепліваў лёсы ягонага роду і яго самога зрабіў такім, якім я яго бачу цяпер, тым, кім ён ёсць. Такія меркаванні не патрабуюць каментароў, і я ад іх устрымаюся.

Нашыя кнігі — кнігі, што доўгія гады былі важнаю часткай разумовага жыцця хворага, — як і варта было чакаць, цалкам адпавядалі ягоным незвычайным уяўленням. Мы ўважліва вывучалі такія творы, як «Вэр-Вэр» і «Манастыр» Грэсэ*, «Бельфагор» Мак'явэлі*, «Нябёсы і пекла» Сведэнборга*, «Падземнае падарожжа Нікаласа Кліма» Хольберга*, «Хірамантыю» Роберта Флада*, Жана д'Эндажынэ* і Дэляшамбра*, «Падарожжа ў блакітную далеч» Ціка* і «Горад Сонца» Кампанэлы*. Улюбёнаю кнігаю Ашэра была выдадзеная *in octavo* «Directorium Inquisitorum»[1] дамініканскага манаха Эймерыка дэ Жырона*, а над некаторымі ўрыўкамі з працаў Пампонія Мэлы* — пра старажытных афрыканскіх сатыраў і эгіпанаў — ён гадзінамі праседжваў у мроях. Але найбольшую асалоду ён знаходзіў ва ўважлівым вывучэнні надзвычай рэдкага тома *in quarto*, надрукаванага гатычным

[1] «Настаўленні ў інквізіцыі» (лац.).

шрыфтам, настаўлення нейкае забытае царквы, — «Vigiliæ Mortuorum secundum Chorum Ecclesiæ Maguntinæ»[1].

Я не мог не падумаць пра дзіўныя абрады, апісаныя ў гэтай кнізе, і іх магчымы ўплыў на хворага, калі аднаго вечара, каротка паведаміўшы мне, што лэдзі Мадэліны больш няма, ён сказаў пра свой намер на два тыдні (да канчатковага пахавання) пакласці яе цела ў адзін са шматлікіх склепаў пад цэнтральнаю часткай будынка. Аднак прычына, якою ён патлумачыў мне свой незвычайны ўчынак, была такая, што я не наважыўся спрачацца. Зрабіць гэта ён вырашыў зважаючы (так ён мне сказаў) на незвычайную яе хваробу, некаторыя настойлівыя і неадчэпныя роспыты яе дактароў, а таксама на тое, што сямейныя могілкі былі далёка і ў адкрытым месцы. Не буду адмаўляць: згадаўшы змрочны выгляд доктара, якога я сустрэў на лесвіцы ў дзень прыезду, я не захацеў пярэчыць намеру, што падаўся мне, зрэшты, бяскрыўднай і цалкам натуральнай абачлівасцю.

Па просьбе Ашэра я сам дапамагаў яму ў падрыхтоўцы часовага пахавання. Мы ўдвух паклалі цела ў труну і аднеслі яе ў склеп, маленькі, сыры, які не прапускаў ніякага святла. Яго так доўга не адчынялі, што нашыя паходні, напалову згаслыя ў цяжкім паветры, не далі нам шмат разгледзець. Ён ляжаў глыбока пад зямлёю, акурат пад той часткай будынка, дзе была мая спачывальня. Відавочна, у далёкую феадальную эпоху ён выконваў найнепрывабнейшую ролю турмы ў данжоне, а пазней — сховішча, куды складалі порах або іншыя лёгказагаральныя рэчывы, бо частка падлогі і ўвесь скляпеністы калідор, па якім мы прайшлі, былі старанна абабітыя меддзю. Цяжкія жалезныя дзверы былі ўмацаваныя гэткім жа чынам. Праз сваю неймаверную вагу яны жахліва скрыгаталі, паварочваючыся на завесах.

Паклаўшы нашую сумную ношу на драўляны насціл у гэтым жытле жаху, мы крыху адсунулі яшчэ не замацаванае века труны і паглядзелі на твар той, што ў ёй ляжала. Надзвычайнае падабенства брата й сястры тады ўпершыню

[1] Парадак службаў па памерлых для хору магунцкай царквы (лац.).

забрала маю ўвагу, і Ашэр, адгадаўшы, мабыць, мае думкі, прамармытаў некалькі словаў, з якіх я зразумеў, што яны са спачылаю блізняты і што паміж імі заўсёды існавала амаль неспасцігальная сувязь. Зрэшты, нашыя позіркі ненадоўга спыніліся на мёртвай, бо глядзець на яе без трымцення мы не маглі. Немач, што звяла яе ў магілу ў росквіце гадоў, пакінула, як звычайна бывае пры каталепсіі, слабое падабенства румянцу на яе твары й грудзях і тую дзіўна застылую ўсмешку на вуснах, што так жахае ў нябожчыках. Мы прыкруцілі века і, замкнуўшы жалезныя дзверы, з цяжкасцю пакрочылі ў ненашмат менш змрочныя пакоі наверсе.

А праз некалькі дзён, поўных глыбокае скрухі, характар разумовага расстройства майго сябра заўважна змяніўся. Ягоная звычайная манера паводзіцца знікла. Штодзённыя заняткі былі закінутыя і забытыя. Ён бязмэтна блукаў з пакоя ў пакой, то тут, то там былі чуваць ягоныя хуткія, няроўныя крокі. Бледнасць ягонага твару зрабілася, калі гэта магчыма, яшчэ жахлівейшаю, аднак бляск ягоных вачэй згас цалкам. Калісьці ягоны голас гучаў глуха, але не цяпер. Што б ён ні казаў, ва ўсім чулася неймавернае трымценне, быццам народжанае найглыбейшым жахам. Часам мне здавалася, што ягоны заўжды ўсхваляваны розум увесь час змагаецца з нейкай гнятлівай таямніцаю, і ён спрабуе набрацца мужнасці, каб пра яе расказаць. А часам я мусіў лічыць усё гэта папросту невытлумачальнымі выбрыкамі вар'яцтва, назіраючы, як ён гадзінамі сядзіць, з незвычайна пільнай увагаю ўглядаючыся ў пустату і нібы прыслухоўваючыся да ўяўных гукаў. Не дзіва, што ягоны стан жахаў і заражаў мяне. Я адчуваў, што мною марудна, але няўмольна завалодваюць ягоныя фантастычныя неадступныя кашмары.

Я цалкам адчуў на сабе ўладу гэтых пачуццяў, кладучыся ў ложак на сёмы ці восьмы вечар пасля таго, як мы паклалі лэдзі Мадэліну ў склеп. Сон не йшоў да мяне, гадзіна праходзіла за гадзінаю. Розумам я спрабаваў адагнаць неспакой, што ахапіў мяне. Я намагаўся ўпэўніць сябе, што многае, калі не ўсё, з таго, што я адчуваю, народжанае дзіўным уплывам змрочнае абстаноўкі пакоя — падранымі цёмнымі парцьерамі,

якія пад подыхам блізкае буры парывіста гайдаліся з боку ў бок і трывожна шаргацелі ля балдахіна ложка. Але спробы мае былі марныя. Неадольнае трымценне паступова працяла мяне ўсяго, і цяжар беспрычыннага страху лёг мне на сэрца. Задыхаючыся, з неймавернымі высілкамі адганяючы гэты кашмар, я сеў на ложку і пільна ўгледзеўся ў непраглядны змрок пакоя. Прыслухаўшыся — не ведаю, чаму, мабыць, інстынктыўна, — я пачуў ціхія няясныя гукі, якія зрэдку, незразумела адкуль, даносіліся сюды, калі бура сціхала. Апанаваны ўсеўладным жахам, невыносным і невытлумачальным, я паспешліва апрануўся — бо адчуваў, што гэтаю ноччу мне ўжо не заснуць, — і паспрабаваў скінуць насланнё, хутка ходзячы туды-сюды па пакоі.

Я змераў пакой такім чынам некалькі разоў, калі маю ўвагу забралі лёгкія крокі на лесвіцы побач. Я пазнаў хаду Ашэра. Праз імгненне ён ціха пастукаўся і ўвайшоў з лямпаю ў руках. Ён быў, як заўсёды, змярцвела бледны, але ў вачах свяцілася нейкая вар'яцкая весялосць — па ягоных паводзінах было бачна, што ён ледзь стрымлівае істэрыю. Я жахнуўся ягонага выгляду, але цяпер быў рады ўсяму, што пазбаўляла мяне доўгай невыноснай адзіноты, і ўспрыняў ягоны прыход як палёгку.

— Вы што, не бачылі? — адрывіста запытаў ён пасля некалькіх імгненняў, цягам якіх ён маўчаў, утаропіўшыся ў нешта акурат перад сабою, — не бачылі? Але пачакайце, яшчэ ўбачыце! — ён асцярожна прыкрыў лямпу, падбег да аднаго з вокнаў і рэзка расчыніў яго насустрач буры.

Імклівая ярасць віхуры ледзьве не збіла нас з ног. Так, гэта была бурная, але сувора прыўкрасная ноч, непаўторная ў сваім жахлівым шаленстве і харастве. Відавочна, дзесьці паблізу пачаўся ўраган, бо кірунак ветру часта і рэзка мяняўся, а надзвычайная гушчыня хмараў, якія віселі так нізка, што ціснулі на вежы замка, не перашкаджала нам бачыць, як яны, нібы жывыя, несліся насустрач адна адной, сутыкаліся, але не разыходзіліся далёка. Я сказаў, што іх надзвычайная гушчыня не перашкаджала нам гэта бачыць, хаця не свяцілі ні зоры, ні месяц, і маланка не бліскала. Але пад вялізнымі ўздыбленымі

клубамі туману, як і паўсюль навокал нас, ззяла ненатуральнае святло, народжанае выпарэннямі газу, які ахутваў дом.

— Не варта, не трэба вам на гэта глядзець! — дрыжучы, сказаў я Ашэру і з мяккай настойлівасцю пасадзіў яго на крэсла, далей ад акна. — Тое, што ўсхвалявала вас, — не больш як звычайныя электрычныя з'явы. А можа, іх спарадзілі агідныя міязмы возера... Давайце зачынім акно, такі вецер шкодны для вашага здароўя. Вось адзін з вашых улюбёных рыцарскіх раманаў. Я пачытаю, а вы паслухайце — і мы разам дачакаемся канца гэтае жахлівае ночы.

Старажытны том, узяты мною, быў сачыненнем сэра Ланселота Кенінга «Небяспечнае спатканне»*, але я назваў яго ўлюбёным раманам Ашэра хутчэй нявесела жартуючы, чым усур'ёз, бо, шчыра кажучы, ва ўсім гэтым нязграбным і пазбаўленым фантазіі шматслоўі мой сябар, чыя ўзвышаная душа сягала ідэальнага, наўрад ці знайшоў бы хоць штосьці для сябе цікавае. Аднак гэта была адзіная кніга пад рукою, і я меў слабую надзею, што ўсхваляванасць, якая ахапіла яго, зменшыцца менавіта ад скрайняй бязглуздасці таго, што я збіраўся чытаць (бо хворыя на разумовыя расстройствы часта вылучаюцца такой непаслядоўнасцю). Прынамсі, калі б я меркаваў па ажыўленай напружанасці, з якою ён слухаў (ці рабіў выгляд, што слухае) аповед, я мог бы павіншаваць сябе з поспехам мае задумы.

Я дайшоў да добра вядомага ўрыўка, дзе Этэльрэд — галоўны герой рамана — пасля марных спробаў мірна ўвайсці ў жытло пустэльніка наважваецца ўварвацца туды сілаю. Тут, калі памятаеце, гаворыцца:

«І Этэльрэд, ад прыроды надзелены мужнасцю, а цяпер яшчэ больш адважны ад віна, ім выпітага, не стаў больш весці размоваў з пустэльнікам, які, праўду сказаць, быў натураю ўпартай і зламыснай, адчуваючы, што набліжаецца дождж і баючыся буры, тут жа падняў сваю булаву і, цяжка дыхаючы, хутка праламаў драўляныя дзверы, а ў адтуліну прасунуў руку ў жалезнай рукавіцы, потым ірвануў іх на сябе, паламаў і разбіў на часткі, і грукат і трэск разбітае сухое драўніны пакаціўся па ўсім лесе».

Дачытаўшы гэты сказ, я ўздрыгнуў і на імгненне спыніўся, бо мне здалося (хаця я тут жа падумаў, што мая ўсхваляваная фантазія мяне падманвае), што з аддаленай часткі будынка да мяне данеслася тое, што, паводле дакладнага свайго падабенства да рэха, мусіла быць менавіта рэхам, што праўда, глухім і слабым, акурат таго грукату й трэску, які так падрабязна апісаў сэр Ланселот. Бясспрэчна, я заўважыў гэта толькі праз супадзенне, бо сярод дрыжання аконных шыбаў і звычайнага змяшанага шуму блізкай навальніцы не было нічога, што само па сабе магло б зацікавіць ці ўзрушыць мяне. Я працягнуў:

— «Але слаўны рыцар Этэльрэд, увайшоўшы ў дзверы, быў да глыбіні душы здзіўлены і разгневаны, не ўбачыўшы ні следу зламыснага пустэльніка. Замест яго там сядзеў жахлівы дракон, пакрыты лускою і з вогненным языком, вартуючы залаты палац са срэбнай падлогаю, а на сцяне вісеў шчыт з бліскучае медзі з такім надпісам:

Хто ўвойдзе сюды, той у бітвах вёў рэй,
Хто знішчыць дракона, той шчыт забярэ.

І Этэльрэд падняў булаву і ўдарыў дракона па галаве, і той упаў перад ім, выпусціўшы свой чумны дух, з віскам такім жахлівым і агідным і да таго ж такім пранізлівым, што Этэльрэду давялося закрыць сабе вушы далонямі, каб абараніцца ад жудаснага гуку, ніколі ім дагэтуль не чутага».

І тут я зноў змоўк, цяпер ад неймавернага здзіўлення, бо ўжо нельга было сумнявацца, што я насамрэч пачуў (хаця і немагчыма было зразумець, адкуль) ціхі і вельмі далёкі, але рэзкі і доўгі ці то віск, ці то скрыгат — дакладна такім я ўяўляў неверагодны крык дракона, апісаны ў кнізе.

Хаця пасля гэтага, яшчэ больш незвычайнага, супадзення мяне ахапілі шматлікія супярэчлівыя пачуцці, сярод якіх пераважалі здзіўленне і найглыбейшы жах, я захаваў дастатковую прысутнасць духу, каб ні словам не патрывожыць расстроеныя нервы майго сябра. Я быў зусім не ўпэўнены, што ён пачуў гэтыя гукі, але паводзіны ягоныя за апошнія некалькі хвілінаў дзіўным чынам змяніліся. Седзячы спачатку насу-

праць мяне, ён паступова паварочваў сваё крэсла так, каб быць тварам да дзвярэй, таму цяпер я не бачыў ягонага твару цалкам, заўважыў толькі, што вусны ягоныя варушыліся, нібы ён нячутна штосьці шаптаў. Ён апусціў галаву на грудзі, але я ведаў, што ён не спіць, бо вочы ягоныя былі шырока раскрытыя і нерухома глядзелі ў адну кропку. Рухі ягонага цела таксама супярэчылі гэтай думцы: ён пагойдваўся з боку ў бок, плаўна, але пастаянна і аднастайна. Хутка адцеміўшы ўсё гэта, я працягнуў чытаць твор сэра Ланселота:

— «І тады рыцар, унікнуўшы лютай ярасці дракона, успомніў пра медны шчыт, з якога былі знятыя чары, адсунуў з дарогі труп пачвары і мужнай хадою скіраваўся па срэбнай падлозе палаца да сцяны, дзе вісеў шчыт. А шчыт не стаў чакаць, пакуль ён наблізіцца, і ўпаў да ягоных ног з аглушальным і жахліва гучным ляскатам».

Не паспелі гэтыя словы сарвацца з маіх вуснаў, як тут жа, нібыта той медны шчыт сапраўды цяжка абрынуўся на срэбную падлогу, я пачуў далёкі, гулкі, відавочна прыглушаны ляскат. Цалкам страціўшы прысутнасць духу, я ўскочыў на ногі, але Ашэр па-ранейшаму пагойдваўся з боку ў бок. Я кінуўся да ягонага крэсла. Ён гэтак жа глядзеў перад сабою, а ягоны твар застыў у каменнай нерухомасці. Але калі я паклаў руку яму на плячо, ён увесь здрыгануўся, слабая ўсмешка затрымцела на ягоных вуснах, і я ўбачыў, што ён ціха, хутка і невыразна нешта шэпча, нібыта не разумее, што я тут. Нізка нахіліўшыся да яго, я ўрэшце зразумеў жахлівы сэнс ягоных словаў:

— Не чую? — не, чую і чуў! Даўно, даўно, даўно, шмат хвілінаў, шмат гадзінаў, шмат дзён я гэта чуў — і ўсё ж не мог — о, злітуйцеся нада мною, няшчасным, — не мог, не мог сказаць пра гэта! Мы паклалі яе ў магілу жывою! Ці ж не казаў я, што пачуцці мае абвостраныя? Кажу вам, я чуў яе першыя слабыя рухі ў схове труны! Я чуў іх — шмат, шмат дзён таму я іх пачуў, але не мог, не мог сказаць! А цяпер — сёння — Этэльрэд, ха-ха! — разбітыя дзверы пустэльніка, перадсмяротны крык дракона, ляскат шчыта — а дакладней — зламаная труна, грукат жалезных дзвярэй яе вязніцы,



*...там, за імі, сапраўды ўзвышалася захутаная ў саван постаць лэдзі Мадэліны Ашэр.*

яе крокі пад меднымі скляпеннямі падзямелля! О, куды ж мне бегчы?! Ці ж не прыйдзе яна зараз сюды? Ці ж не крочыць яна сюды, каб папракнуць мяне ў паспешлівасці? Ці ж не пазнаў я яе хады на лесвіцы? Ці ж не чую цяжкога, вусцішнага біцця яе сэрца? Вар'ят! — тут ён рэзка ўскочыў на ногі і пранізліва закрычаў, быццам выяргаючы з сябе душу: — Вар'ят! Кажу ж вам, яна цяпер за дзвярыма!

І адразу ж, нібыта нечалавечая энергія ягоных словаў мела сілу заклёну, вялізныя старажытныя дзверы, на якія ён паказваў, пачалі павольна адчыняцца, раскрываючы сваю жудасную эбенавую пашчу. Гэта зрабіў моцны парыў ветру, але там, за імі, *сапраўды* ўзвышалася захутаная ў саван постаць лэдзі Мадэліны Ашэр. Кроў запляміла яе белае ўбранне, на басхуднелым целе паўсюль былі бачныя сляды адчайнае барацьбы. На імгненне яна затрымалася на парозе, дрыжучы і хістаючыся, а потым з ціхім стогнам упала на грудзі брата і ў яраснай — цяпер перадсмяротнай — агоніі пацягнула ўніз ягонае ўжо мёртвае цела, ахвяру тых жудасцяў, якія ён прадбачыў.

Ахоплены жахам, я бег з гэтага пакоя, з гэтага дому. Навальніца яшчэ бушавала з усёй ярасцю, калі я апынуўся на паркавай сцежцы. Раптам усё вакол працяло жудасным святлом, і я азірнуўся, не разумеючы, адкуль яно, бо за мною быў толькі вялізны дом, агорнуты ценямі. Ззянне йшло ад крывава-чырвонай поўні, якая ўжо садзілася, высвечваючы тую ледзь заўважную расколіну, што зігзагам ішла ад даху дому да фундамента. Пакуль я ўглядаўся туды, расколіна вельмі хутка павялічылася, наляцела лютая віхура, перада мною паўстаў, засцілаючы вочы, дыск поўні, і я змярцвеў, калі ўбачыў, як разлятаюцца на аскепкі моцныя сцены. Пачуўся страшны, аглушальны гук, падобны да голасу тысячаў водных плыняў, і глыбокае цёмнае возера ля маіх ног абыякава і маўкліва пахавала руіны Дому Ашэраў.

*Пераклала Кацярына Маціеўская*

# Авальны партрэт

Замак, у які мой слуга наважыўся праламіцца гвалтам, каб не дазволіць мне ў маім безнадзейна немачным стане прабавіць ноч пад голым небам, уяўляў сабою адну з тых напышлівых і панурых каменных крушняў, што здавён змрочна высіліся сярод апенінскіх схілаў, нібы спароджаныя фантазіямі місіс Рэдкліф*. Па ўсім было відаць, што ягоныя насельнікі часова і зусім нядаўна яго пакінулі. Мы размясціліся ў адным з найменшых і найсціплей абстаўленых пакояў, які ляжаў у невялічкай вежы наўскрай будынка. Ён быў багата аздоблены габеленамі і завешаны шматлікімі і разнастайнымі геральдычнымі шчытамі, разам з незвычайна высокай колькасцю вельмі жывых сучасных карцінаў у рамах з залачонымі арабескамі. Гэтыя карціны, якія віселі не толькі на саміх сценах, але ў шматлікіх угінах і сховах, якія непазбежна ўтвараліся дзівоснаю архітэктураю замка, неяк дзіўна мяне зацікавілі, мабыць, таму, што я ўжо пачынаў трызніць; і я папрасіў Пэдра зачыніць цяжкія аканіцы — бо за вокнамі ўжо стаяла ноч, — запаліць свечкі ў высокім кандэлябры, што стаяў у галовах майго ложка, і адхінуць заслоны з чорнага аксаміту, якія закрывалі сам ложак. Усё гэта я загадаў зрабіць дзеля таго, каб аддацца калі не сну, дык прынамсі паперамennаму сузіранню гэтых карцінаў і гартанню невялікай кнігі, якую я знайшоў каля падушкі і якая змяшчала іх агляд і апісанне.

Я доўга-доўга чытаў і пільна-пільна ўглядаўся. Гадзіны праляталі хутка і ўрачыста, пакуль не настала глыбокая поўнач. Мне не спадабалася, як стаіць кандэлябр, і, з цяжкасцю працягнуўшы руку, каб толькі не будзіць прыснулага слугу, я пераставіў яго так, каб полымя паўней асвятляла кнігу.

Аднак гэтае дзеянне мела зусім неспадзяваны вынік. Промні ад свечак (а іх было некалькі) цяпер асвятлялі нішу, якая дагэтуль патанала ў глыбокай цемры каля адной з апораў ложка. І я пабачыў у зыркім святле незаўважную дагэтуль карціну. Гэта быў партрэт дзяўчыны, у якой толькі па-

чала выспяваць жаноцкасць. Я паспешліва зірнуў на карціну і заплюшчыў вочы. Чаму я гэтак зрабіў — мне й самому адразу было незразумела. Але пакуль павекі заставаліся апушчаныя, я ў думках пашукаў прычыну — чаму я заплюшчыў вочы. Гэта быў міжвольны рух, каб заашчадзіць хвілінку на роздум — каб упэўніцца, што мой зрок мяне не падмануў, — каб супакоіцца і падпарадкаваць уяўленне цвярозаму і пэўнаму роздуму. Праз некалькі імгненняў я зноў пільна ўзіраўся ў карціну.

Што мне не прымроілася — у тым не было аніякага сумневу; бо першы водбліск полымя на палатне, як здалося, развеяў мройнае здранцвенне, якое апанавала мае пачуцці, і ўмомант абудзіў мяне да жыцця.

Гэта быў, як я ўжо казаў, партрэт дзяўчыны. Звычайны партрэт, калі ўжыць тэхнічны тэрмін, у манеры віньеткі; вельмі падобны стылем да партрэтаў Салі*. Рукі, грудзі і нават кончыкі прамяністых валасоў незаўважна зліваліся з няясным і глыбокім ценем, які ўтвараў тло карціны. Рама была авальная, пакрытая багатым залачэннем і маўрытанскімі філігранямі. Як твор мастацтва сама карціна была дасканалая. Аднак наўрад ці самое выкананне ці несмяротная прыгажосць твару маглі так раптоўна і моцна мяне ўразіць. І ўжо зусім не магло быць, каб маё ўяўленне, абуджанае ад паўсну, магло зблытаць партрэт з жывым абліччам. Я адразу пабачыў, што асаблівасці ўзору, стылю і рамы мусілі б адразу развеяць гэткую думку — мусілі б не даць ёй узнікнуць нават на імгненне. Паважна думаючы над гэтымі пытаннямі, я нейкую гадзіну сядзеў у ложку, не зводзячы вачэй з партрэта. Нарэшце, задаволены сапраўднай таямніцай ягонага ўздзеяння, я зноў лёг. Чары карціны, на маю думку, палягалі ў абсалютнай жыццепадобнасці выразу твару, які спачатку здзівіў, а пасля збянтэжыў, скарыў і спалохаў мяне. З глыбокім і багавейным страхам я паставіў кандэлябр на старое месца. Калі прычына майго глыбокага хвалявання схавалася ад вачэй, я пачаў прагна гартаць кнігу, дзе апісваліся карціны ды іхныя гісторыі. Знайшоўшы нумар, якім быў пазначаны авальны партрэт, я прачытаў гэткія няясныя й дзівосныя словы:

«Яна была панна незраўнанае прыгажосці, і весялосць яе не саступала ейнай красе. І ў ліхую гадзіну пабачыла яна, пакахала і ўзяла шлюбам мастака. Ён быў апантаны, заўзяты, няшчадны і ўжо меў за нявесту сваё Мастацтва; яна ж была панна незраўнанае прыгажосці, і весялосць яе не саступала ейнай красе; яна ззяла і ўсміхалася і скакала, як маладая лань; любіла й песціла ўсё, што бачыла навокал; ненавідзела толькі мастацтва — сваю злую суперніцу; баялася толькі палеты і пэндзляў ды іншых нясцерпных снадзіваў, якія забіралі ў яе каханага. Таму страшна было пачуць гэтай панне, што мастак жадае намаляваць партрэт сваёй нявесты. Аднак яна была пакорлівая й паслухмяная і аддана сядзела доўгімі тыднямі ў цьмяным пакоі ў вежы, дзе на бледнае палатно аднекуль высока згары падала рэдкае святло. Аднак ён, мастак, упіваўся славаю ад свае працы, якая цягнулася гадзінамі, дзень пры дні. Гэта быў апантаны, дзікі й наравісты чалавек, які згубіўся ў сваіх мроях; так што ён і не заўважыў, як прывіднае святло ў самотнай вежы пачало губіць здароўе і сілу ягонай нявесты, чыё павольнае звяданне заўважалі ўсе, апрача яго. Але яна й надалей усміхалася і не наракала, бо бачыла, што мастак (які меў немалую славу) адчуваў ад сваёй працы пякучую асалоду, ён працаваў дзень і ноч, каб намаляваць тую, што так яго кахала і што няможала й слабла з кожным днём. І сапраўды, усе, хто глядзеў на партрэт, шэптам гаварылі пра падабенства як пра вялікі цуд, як пра доказ не толькі вялікага майстэрства мастака, але й яго бязмежнага кахання да той, каго ён так незраўнана апісаў на карціне. Аднак урэшце, калі праца ўжо набліжалася да завяршэння, у вежу перасталі пускаць старонніх людзей; мастак зусім здзічэў у запале сваёй працы і рэдка зводзіў вочы ад палатна, нават каб паглядзець на жончын твар. Таму ён і не заўважаў, што адценні, якія ён наносіў на палатно, браліся з шчокаў той, што сядзела побач з ім. І калі мінула яшчэ некалькі тыдняў і засталося зрабіць зусім мала, правесці пэндзлем па вуснах і дадаць адцення вачам, душа панны ўскалыхнулася, як полымя лямпы перад згасаннем. І тады фарба легла на вусны і адценне дадалося вачам; і мастак на хвіліну застыў, зачараваны сваім творам;

аднак праз імгненне, яшчэ не адвёўшы вачэй ад партрэта, ён задрыжаў і смяротна збялеў, і ў жаху закрычаўшы немым голасам: «Дык гэта ж самое жыццё!», павярнуўся да сваёй каханай: — *Яна была нежывая!*»

*Пераклаў Сяргей Шупа*

# Лігея

> І ў гэтым — воля, што не ведае смерці. Хто ведае таямніцы волі ва ўсёй моцы яе? Таму што Бог ёсць не чым іншым, як вялікай воляй, што прасякае ўсё самой прыродай задумы свае. Не аддае сябе чалавек ні анёлам, ні смерці цалкам, толькі праз бяссілле слабое свае волі.
>
> Джозэф Глэнвіл*

Нават дзеля ўратавання душы не змог бы я згадаць абставінаў, часу і нават дакладнага месца свайго знаёмства з лэдзі Лігеяй. Мінула шмат гадоў з таго часу, а памяць мая саслабла ад пакутаў. А можа, я не магу згадаць таго, бо, сапраўды, характар маёй каханай, яе рэдкая вучонасць, яе выключная спакойная прыгажосць і хвалюючая чароўная красамоўнасць яе нізкага музычнага маўлення знайшлі дарогу да майго сэрца так павольна і паступова, што заставаліся незаўважнымі і нязнанымі. Тым не менш мне здаецца, што я сустрэўся з ёй і бачыўся з ёй найчасцей у адным буйным старым горадзе ля Рэйна, што павольна прыходзіў у заняпад. Яе сям'я... я пэўны, яна расказвала пра яе. Род гэты, без сумневаў, быў надзвычай старажытны. Лігея! Лігея! Аддаючыся заняткам, якія як нішто іншае паслабляюць повязь з вонкавым светам, адно гэтым любым словам — Лігея — уваскрашаю я вобраз тае, якое ўжо няма. І цяпер, пішучы гэта, я раптам згадаў, што *ніколі не ведаў* родавага імя той, што была маім сябрам і нявестай, той, што стала ўдзельніцай маіх заняткаў і ўрэшце — маёй каханай жонкаю. Ці быў гэта гарэзлівы выклік з боку мае Лігеі? Альбо выпрабаванне мае прыязнасці, мае здольнасці ўстрымацца ад роспытаў пра гэта? Ці, можа, мая ўласная прыхамаць — вар'яцкая рамантычная ахвяра на алтар мае самай жарснай адданасці? Але й гэта я згадваю цьмяна — чаго ж здзіўляцца таму, што я цалкам забыўся на ўсе абставіны, якія спарадзілі гэта і гэтаму спадарожнічалі? І сапраўды, калі дух, што завецца Закаханасцю, калі яна, бледная і туманнакрылая

Аштафет* паганскага Егіпта, напраўду, як кажуць паданні, прарочыла гора якому-небудзь вяселлю, то, без сумневаў, і майму таксама.

Ёсць, зрэшты, адно дарагое мне, што памяць мая захавала, — гэта аблічча Лігеі. Была яна высокая, крыху танклявая, а ў апошнія свае дні — нават змарнелая. Ніколі б не здолеў я перадаць велічнасць і спакойную нязмушанасць яе паводзінаў або неспасцігальную лёгкасць і грацыю яе рухаў. Яны з'яўлялася і знікала, быццам цень. Пра яе прыход у мой зацішны кабінет я даведваўся толькі дзякуючы мілай музыцы яе ціхага, пяшчотнага голасу, калі мармуровыя пальцы апускаліся на маё плячо. Ніводная дзяўчына ніколі б не зраўналася з ёй прыгажосцю твару. Гэтае ззянне опіюмнай мары — паветраная відзежа палёту душы, больш казачная за фантазіі мройных душаў дачок Дэласа*. Аднак у гэтых рысах не было тае правільнасці, якую класічныя паганскія працы змусілі нас лічыць дасканаласцю. «Няма вытанчанае прыгажосці, — справядліва заўважае Бэкан, лорд Веруламскі*, пішучы пра формы і *genera*[1] *прыгажосці, — без нейкай незвычайнасці* прапорцый». Усё ж, хаця я бачыў, што ў рысах Лігеі няма класічнае правільнасці, хаця я заўважаў, што яе хараство насамрэч было «вытанчаным», і адчуваў ягоную «незвычайнасць», усё ж марнымі былі ўсе спробы знайсці няправільнасць, якая выклікала ўва мне пачуццё гэтай незвычайнасці. Я ўглядаўся ў абрысы высокага бледнага ілба — ён быў бездакорны. Бездакорны — якое халоднае слова ў дачыненні да такое боскае велічы! З яго белізной было не зраўнацца і найчысцейшай слановай косці, на ім панавалі спакой і гармонія... Гэтыя лёгкія выступы на скронях і чорныя, бы крумкачовае крыло, бліскучыя, раскошныя і ад прыроды кучаравыя пасмы, што адразу выклікалі ў памяці гамэраўскі эпітэт «гіяцынтавыя»! Я разглядаў далікатныя лініі носа — нідзе больш я не бачыў гэткай жа дасканаласці, апрача вытанчаных габрэйскіх медальёнаў. Такая ж раскошная роўнасць, такая ж ледзь бачная гарбінка, такія ж плаўна

[1] Роды (лац.).

выразаныя ноздры гаварылі пра вольны дух. Я глядзеў на чароўныя вусны. У іх быў сапраўдны трыюмф нябеснасці: найпрывабнейшы выгін кароткай верхняй губы, мяккая, пачуццёвая нерухомасць ніжняй, вясёлыя ямачкі, насычаны колер; зубы, якія з амаль немагчымым ззяннем адлюстроўвалі кожны прамень дабраславёнага святла, што падала на іх, калі яна ўсміхалася — ясна, спакойна і ўсё ж так асляпляльна! Я вывучаў форму яе падбароддзя — і там знаходзіў мяккую шырыню і веліч, пяшчоту і адухоўленасць грэкаў — абрысы, якія Апалон толькі ў сне паказаў Клеамену*, сыну афінца. І тады я ўглядаўся ў вялізныя вочы Лігеі.

Ідэалу вачэй антычнасць нам не пакінула. Можа, менавіта ў вачох маёй каханай і хаваўся той сакрэт, пра які казаў лорд Веруламскі. Яны былі, я ўпэўнены, нашмат большыя за звычайныя чалавечыя вочы. Яны былі дасканалейшыя нават за газеліныя вочы племені з даліны Нурджахаду*. Аднак вельмі рэдка — толькі ў часы глыбокага хвалявання — гэтая асаблівасць Лігеі рабілася злёгку заўважнай. І ў такія моманты яе прыгажосць — ці так падавалася майму палкаму ўяўленню? — была прыгажосцю істотаў, што жывуць над зямлёй ці па-за зямлёй, — прыгажосцю казачных мусульманскіх гурыяў. Вочы яе мелі самае бліскучага адценне чорнага, і іх аблямоўвалі смаляныя вейкі неверагоднай даўжыні. Бровы, крыху няправільна выгнутыя, мелі той самы колер. «Дзіўнасць», якую я заўважаў у яе вачах, не была абумоўленая, аднак, ні памерам іх, ні колерам, ні бляскам — яна была ў *выразе*. О гэтае няўцямнае слова! За яго неасяжнай пустэчай мы хаваем сваё поўнае няведанне духоўнага. Выраз вачэй Лігеі! Колькі доўгіх гадзінаў я думаў пра яго! Марна спрабаваў я спасцігнуць яго глыбіні адну цэлую летнюю ноч. Што хавалася ў зрэнках маёй каханай — глыбейшае за калодзеж Дэмакрыта*? Што? Я быў апанаваны жаданнем знайсці адказ. Гэтыя вочы! Вялікія, бліскучыя, боскія вочы! Яны сталі маімі двайнымі зорамі Леды*, а я — найадданейшым з астролагаў.

Сярод усіх неспасцігальных анамалій, якія вывучае навука пра розум, няма больш узрушальнай за пачуццё — на

яго, пэўна, і не зважаюць навукоўцы, — якое ўзнікае, калі мы спрабуем згадаць нешта даўно забытае і, здаецца, ужо набліжаемся да адказу — але ўрэшце нічога не згадваем. І часта, углядаючыся ў вочы Лігеі, я адчуваў, што вось-вось разгадаю таямніцу іх выразу, я набліжаўся да яе — і выпускаў з рук! І (дзіўная, якая дзіўная таямніца!) у самых звычайных рэчах я знаходзіў выразы, падобныя да гэтага. Я маю на ўвазе, што з таго часу, як прыгажосць Лігеі ўвайшла ў маё сэрца і знайшла там свой храм, я часта адчуваў тое ж, што выклікалі ўва мне яе вялізныя бліскучыя вочы, калі бачыў іншыя, матэрыяльныя рэчы. І тым не менш я не мог акрэсліць гэтае пачуццё, не мог яго прааналізаваць ці нават уважліва вывучыць. Яно прыходзіла, паўтараю, калі я разглядаў доўгую лазу ці любаваўся матыльком, хрызалідай, хуткаплыннай ракой. Ува мне яго абуджалі акіян і падзенне метэора. Яно было ў поглядах людзей, што дажылі да незвычайна глыбокай старасці. І ёсць дзве-тры зоркі ў небе (асабліва адна, зорка шостае велічыні, двайная і пераменная, побач з буйной зоркай у сузор'і Ліры*), якія выклікалі гэтае пачуццё, калі я глядзеў на іх у тэлескоп. Яно перапаўняла мяне ад некаторых гукаў струнных інструментаў і нярэдка — падчас чытання некаторых месцаў у кнігах. Сярод іншых незлічоных прыкладаў мне асабліва запомніўся выраз з тома Джозэфа Глэнвіла, які (магчыма, сваёй мудрагелістасцю — хто ведае?) абуджаў гэтае пачуццё заўсёды: «І ў гэтым — воля, што не ведае смерці. Хто ведае таямніцы волі ва ўсёй моцы яе? Таму што Бог ёсць не чым іншым, як вялікай воляй, што прасякае ўсё самой прыродай задумы свае. Не аддае сябе чалавек ні анёлам, ні смерці цалкам, толькі праз бяссілле слабое свае волі».

Доўгія гады і наступныя разважанні дазволілі мне знайсці аддаленую сувязь гэтага выслоўя ангельскага маралістá з некаторымі рысамі характару Лігеі. *Сіла* ў думках, учынках і размовах Лігеі магла быць вынікам — ці, прынамсі, сведчаннем — яе тытанічнае волі, якая за доўгі час нашае блізкасці больш не з'яўляла ніякіх знакаў свайго існавання. З усіх жанчынаў, якіх я калі-небудзь ведаў, яна — вонкава спакойная, заўсёды ціхамірная Лігея — зрабілася найбольш



*У опіюмных мроях я выкрыкваў яе імя...*

бездапаможнай здабычай дзікіх грыфаў бязлітаснае жарсці. І сілы гэтай жарсці я не змог бы ўявіць, калі б толькі вочы яе не раскрываліся так чароўна, што захапляла і палохала мяне; калі б не амаль магічная меладычнасць і выразнасць яе нізкага спакойнага голасу і шалёная энергія (тым больш дзіўная ў параўнанні з яе звычайнай манерай гаварыць) шалёных словаў, што пастаянна зрываліся з яе вуснаў.

Я згадваў вучонасць Лігеі — яна была бязмежнай; такой я не сустракаў ні ў адной жанчыны. У класічных мовах яна была глыбока дасведчаная, і не было ніводнай вядомай мне сучаснай еўрапейскай гаворкі, на якой яна не размаўляла б бездакорна. Дый ці існавала галіна ведаў, найбольш модная — проста таму, што найбольш заблытаная, — з тых, якімі ганарыцца акадэмічная эрудыцыя, у якой яна б чагосьці не ведала? І як незвычайна і непаўторна гэтая рыса маёй жонкі толькі ў апошні перыяд завалодала маёй увагаю! Я казаў, што такой вучонасці не сустракаў ні ў аднае жанчыны, — але ці знойдзецца мужчына, які б спасціг — і спасціг паспяхова — *усе* неасяжныя галіны гуманітарных, фізічных і матэматычных навук? Тады я не бачыў так ясна, як цяпер, што веды Лігеі былі незвычайнымі, неабдымнымі. Аднак я ўжо адчуваў яе перавагу і з дзіцячым даверам падпарадкаваўся яе кіраўніцтву ў хаатычным свеце метафізічных даследаў, якім я прысвяціў першыя гады нашага шлюбу. З якім бязмерным гонарам, з якім жывым захапленнем, з якой вялікай мераю ўсяго, што ёсць зямнога ў надзеі, *адчуў я*, калі яна была са мною падчас маіх заняткаў (але мала шукаў — і яшчэ менш усведамляў), тую неверагодную перспектыву, што павольна адкрывалася перада мной, чые доўгія чароўныя няходжаныя сцежкі вялі да мудрасці надта боскай і каштоўнай, каб не быць забароненай.

І якім жа невымерным тады мусіла быць маё гора, калі праз некалькі гадоў я ўбачыў, як мае справядлівыя спадзяванні адляцелі ад мяне на крылах! Без Лігеі я быў як дзіця, заблукалае ў цемры. Адзіна яе прысутнасць, яе чытанні кідалі яркае святло на шматлікія трансцэндэнтальныя таямніцы, у якія мы паглыбляліся. Без прамяністага бляску яе ва-

чэй іскрыстыя залатыя пісьмёны рабіліся цямнейшымі за сатурнавы свінец*. А цяпер гэтыя вочы ўсё радзей і радзей асвятлялі старонкі, над якімі я схіляўся. Лігея захварэла. Шалёныя вочы ззялі занадта, занадта асляпляльнымі прамянямі; бледныя пальцы пачалі прасвечвацца васковай магільнай празрыстасцю, а блакітныя жылкі на высокім ілбе набухалі і спадалі ад самага лёгкага хвалявання. Я бачыў, што яна павінная памерці, — і душа мая адчайна змагалася са змрочным Азраілам*. А мая палкая жонка, на маё здзіўленне, змагалася яшчэ больш горача, чым я. Мяркуючы па яе стрыманым характары, я думаў, што смерць прыйдзе да яе без звычайных сваіх жахаў, але я памыляўся. Словы няздольныя даць хоць якое ўяўленне аб тым, як шалёна і ўпарта змагалася яна з Ценем. Я стагнаў ад пакуты, назіраючы гэтае тужлівае відовішча. Я суцяшаў яе, спрабуючы паклікаць на дапамогу яе розум, — але для яе нястрымнае прагі жыцця, жыцця, *толькі* жыцця і суцяшэнні, і разважанні былі б недарэчнымі. І ўсё ж амаль да самага канца, у самых лютых канвульсіях, якія скаланалі яе душу, яна не страчвала вонкавага спакою. Голас яе стаў мякчэйшы і ніжэйшы, аднак мне не хацелася б спыняцца на дзікім значэнні словаў, якія яна так спакойна прамаўляла. Я ледзь не вар'яцеў, калі зачаравана слухаў мелодыю больш чым смяротную, калі разумеў здагадкі і намеры, невядомыя раней смяротным.

У яе каханні да мяне я ніколі не сумняваўся і лёгка мог бы зразумець, што ў такім сэрцы, як ейнае, каханне не можа быць пасрэдным пачуццём. Але толькі перад яе смерцю я цалкам спасціг глыбіню яе жарсці. Шмат гадзінаў, трымаючы мяне за руку, яна раскрывала мне таямніцы сэрца, чыя палкая любоў дасягала ступені абагаўлення. Чым заслужыў я дабрадаць такіх прызнанняў? Чым заслужыў я праклён расстання з каханай у час, калі іх пачуў? Але я больш не магу гаварыць пра гэта. Дазвольце мне толькі сказаць, што ў каханні Лігеі, што пераўзыходзіла жаночае каханне, — у каханні, на жаль, незаслужаным, каханні, якога я быў зусім не варты, — я ўрэшце пазнаў яе нястрымную прагу жыцця, якое так хутка яе пакідала. Гэтае дзікае прагі, гэтага наймацнейшага

жадання жыцця — *толькі* жыцця — я не маю сілаў апісаць, няздольны выказаць.

Апоўначы, перад самаю сваёю смерцю, яна ўладным жэстам паклікала мяне да сябе і загадала прачытаць верш, напісаны ёю колькі дзён таму. Я падпарадкаваўся. Вось гэты верш:

Глядзі! Растала ўшчэнт нуда
Пасля гадоў паныльх,
Сядзіць анёлаў грамада
Прыўкрасных і двухкрылых,
Бо ставяць сённяшняй парой
Спектакль мрой, хімераў —
Вось залунаў над залай рой
Мелодый вышніх сфераў.

Акторы церпяць ад навал,
Хоць маюць вобраз Божы, —
Марыянетак карнавал —
Ды хто ім дапаможа,
Калі ў руках таемных сіл
Масткі, кулісы, хоры?
З іх чорных кондаравых крыл
Злятае гора.

О, варта драму нам пачаць,
Вам не сысці нікуды!
Усе за прывідам імчаць,
А ён — падман, аблуда.
Імчыш, самлелы і глухі,
А вынік — той жа самы,
Вар'яцтва, вусціш і грахі —
Сюжэт спрадвечнай драмы.

Але зірні! Вось з-за куліс
Паўзе пачварны вораг!
Яго бясформенны абрыс

Палохае бадзёрых.
І не спыніць яго нічым —
Глытае ўсіх без меры,
І плача кожны серафім,
І румзае ў партэры.

Святло знікае і масткі,
Акторы, маскі, сцены.
Завесу — саван свой цяжкі —
Здымай хутчэй са сцэны!
Анёльскі голас, быццам здзек,
Абвесціць п'есу тую:
На сцэне — драма «Чалавек»,
Чарвяк там трыюмфуе[1]*.

— Божа! — усклікнула Лігея, сутаргава прыпадняўшыся і ўзняўшы рукі ў нябёсы, калі я скончыў чытаць. — Божа! Ойча нябесны! Няўжо гэта непазбежна? Няўжо Пераможцу ніколі не быць пераможаным? Ці ж мы — не частка Твая? Хто — хто ведае таямніцы волі ва ўсёй моцы яе? Таму што Бог ёсць не чым іншым, як вялікай воляй, што прасякае ўсё самой прыродай задумы свае. Не аддае сябе чалавек ні анёлам, ні смерці цалкам, толькі праз бяссілле слабое свае волі.

Белыя рукі яе ўпалі, і, нібы дашчэнту знясіленая гэтым парывам, яна ўрачыста апусцілася на ложак смерці. З апошнім выдыхам з яе вуснаў зляцеў ледзь чутны шэпт. Я нахіліўся да іх і зноў пачуў тыя ж заключныя словы з урыўку Глэнвіла: не аддае сябе чалавек ні анёлам, ні смерці цалкам, толькі праз бяссілле слабое свае волі.

Яна памерла. А я, зрынуты ў прах скрухаю, больш не мог трываць адзіноты свайго жытла ў смузе старога горада ля Рэйна, што павольна прыходзіў у заняпад. Таго, што свет называе багаццем, у мяне было ўдосталь. Лігея прынесла мне больш, нашмат больш, чым звычайна выпадае на долю смяротнага. І праз некалькі месяцаў бязрадасных і бязмэт-

[1] Пераклад Ганны Янкута.

ных тулянняў я купіў і ў пэўнай ступені наноў аздобіў адно абацтва — не буду яго называць — у адным з самых дзікіх і закінутых месцаў прыўкраснай Англіі. Змрочная і панурая ўрачыстасць будынка, амаль поўнае запусценне маёнтка, безліч сумных звязаных з імі пракаветных паданняў надзвычай гарманічна спалучаліся з пачуццём скрайняй закінутасці, якое прывяло мяне ў гэты далёкі і ўсімі забыты край. Але хаця абвітыя зялёнаю плесняю сцены абацтва я і пакінуў без значных зменаў, унутры, паддаўшыся дзіцячаму капрызу і, можа быць, з цьмянай надзеяй суцішыць свой боль, я абставіў усё з больш чым каралеўскай раскошаю. Да такіх дзівацтваў я меў схільнасць яшчэ ў дзяцінстве, а цяпер яны вярнуліся, быццам я здзяцінеў ад гора. На жаль, я адчуваю, колькі прыкметаў разумовае хваробы, што паступова нараджалася ўва мне, можна было заўважыць у раскошных і фантастычных драпіроўках, ва ўрачыстай егіпецкай разьбе, у вар'яцкіх карнізах і мэблі, ва ўзорах дываноў з залатымі махрамі. Я зрабіўся пакорлівым рабом опіюму, і мая праца і распараджэнні набылі адценне маіх відзежаў. Але досыць пра гэтыя бязглуздзіцы. Я раскажу толькі пра адзін пакой — пракляты назаўжды! Туды я ў момант нейкай запамарокі прывёў ад алтара як сваю жонку, як пераемніцу незабытай Лігеі, светлавалосую і блакітнавокую лэдзі Равэну Трэвэньён з Трэмэйна.

Няма такой архітэктурнай дэталі і аздобы шлюбнага пакоя, якая не стаяла б цяпер у мяне перад вачыма. Дзе былі пыхлівыя душы родных маёй нявесты, калі, прагнучы золата, яны дазволілі дзеве, дачцэ, настолькі любімай, пераступіць парог пакоя, аздобленага такім чынам? Я сказаў, што дакладна памятаю ўсе дробязі пакоя — але недаравальна забыўся на больш важнае; а ў той мудрагелістасці не было ні парадку, ні сістэмы, якія б маглі замацавацца ў памяці. Гэты вялізны пяцікутны пакой месціўся ў высокай вежы падобнага да замку абацтва. Увесь паўднёвы бок пяцікутніка займала акно — вялізнае венецыянскае цэльнае шкло свінцовага адцення, і ўсе сонечныя ці месяцовыя прамяні, праходзячы скрозь яго, надавалі пакою магільнае ззянне. Над верхняй часткаю гэтага вялізнага акна размяшчаліся краты, абвітыя старой лазою,

што ўзбіралася ўверх па сценах масіўнае вежы. Змрочная дубовая скляпеністая столь, надзвычай высокая, была пакрытая найдзічэйшымі гратэскавымі ўзорамі напаўгатычнага, напаўдруідычнага арнамента. У самым цэнтры гэтых змрочных скляпенняў на залатым даўгазвённым ланцугу вісела вялізная жырандоля, таксама залатая, сарацынскага ўзору. У ёй было шмат хітра размешчаных адтулін, з якіх, нібы надзеленыя змяінай гнуткасцю, бесперапынна выслізгвалі рознакаляровыя агні.

Некалькі атаманак і залатых усходніх кандэлябраў стаялі ў беспарадку. Было там і ложа, шлюбнае ложа ў індыйскім стылі, нізкае, з чорнага дрэва, з балдахінам, падобным да пахавальнага покрыва. У кожным з пяці кутоў стаялі старчма саркафагі з чорнага граніту, прывезеныя з царскіх грабніцаў Луксору*, чые вечкі былі аздобленыя старажытнымі барэльефамі. Але найфантастычнейшымі — на жаль! — былі драпіроўкі. Вялізнымі складкамі цяжкія, масіўныя габелены з той самай тканіны, што й дыван на падлозе, закрывалі ненармальна высокія, нават непрапарцыйныя сцены. З той самай тканіны былі і покрыўкі на атаманках і чорным ложку, і балдахін над ім, і раскошныя парцьеры, што часткова засянялі акно. Гэтай тканінаю была найдаражэйшая залатая парча. Яна была хаатычна расшытая найчарнейшымі арабескамі, кожная каля фута ў дыяметры. Але гэтыя фігуры набывалі абрысы арабесак толькі тады, калі на іх глядзелі з пэўнага пункту. Дзякуючы звыкламу цяпер спосабу, які сягае каранямі ў глыбокую старажытнасць, яны маглі мяняць выгляд. Тым, хто ўваходзіў у пакой, яны падаваліся проста пачварнымі, але з кожным наступным крокам гэтае ўражанне паступова знікала, і, прасоўваючыся наперад, госць бачыў вакол сябе бясконцую працэсію змрочных стварэнняў, народжаных нарманскімі прымхамі або паўсталыя ў грэшных сненнях манаха. Фантасмагорыя бясконца ўзмацнялася ад штучна створаных пастаянных паветраных патокаў за драпіроўкамі, якія надавалі ўсяму вакол неспакойны і страшны рух.

У такіх уладаннях — у такім шлюбным пакоі — бавіў я з лэдзі Равэнай грэшныя гадзіны ў першы месяц пасля нашага

вяселля, бавіў без асаблівых трывог. Я бачыў, што жонка мая баіцца маёй лютасці і змрочнасці, пазбягае мяне і не палае гарачым каханнем, але гэта мне хутчэй падабалася, чым наадварот. Я адчуваў да яе нянавісць, уласцівую хутчэй дэману, а не чалавеку. Памяць мая вярталася (о, з якім шкадаваннем!) да Лігеі, каханай, велічнай, прыўкраснай, пахаванай. Я жыў згадкамі пра яе чысціню, мудрасць, высокую, незямную натуру, жарснае каханне, што межавала з абагаўленнем. І тады душу маю цалкам, наўсуцэль ахоплівалі агні, яшчэ гарачэйшыя за ўсе агні яе душы. У опіюмных мроях (а я не вызваляўся з кайданаў гэтага зелля) я выкрыкваў яе імя — у начной цішы і ў дзённым цені далін, нібы сваёй дзікай прагай, змрочнай жарсцю і ўсёпаглынальным сумам па памерлай я мог вярнуць яе на зямныя сцежкі, якія яна пакінула — о, няўжо назаўжды?..

Калі ішоў другі месяц нашага шлюбу, лэдзі Равэна раптоўна захварэла і ачуньвала вельмі павольна. Ліхаманка не давала ёй спаць начамі, і ў трывожнай дрымоце яна казала пра гукі і рухі ў вежы, у пакоі і над ім, але я палічыў, што яны выкліканыя толькі яе расстроеным уяўленнем або фантасмагарычным уплывам самога пакоя. Урэшце ёй палепшала, і яна зусім ачуняла. Аднак мінула зусім мала часу, калі другая, яшчэ цяжэйшая хвароба зноў кінула яе на ложак пакутаў. І ад гэтай хваробы яна, і да таго слабая, так і не акрыяла. З таго часу яе хваробы рабіліся ўсё больш страшнымі, а найстрашнейшым было іх пастаяннае вяртанне, і ўсе веды і высілкі дактароў не маглі ёй дапамагчы. З узмацненнем хваробы, якая займела над ёй столькі ўлады, што выратаваць яе было па-за межамі чалавечых сілаў, я не мог не заўважыць і ўзмацнення нервовага разладу і яе здольнасці хвалявацца з самай нязначнай нагоды. Яна ўсё часцей і настолівей казала пра гукі, ледзь чутныя гукі і незвычайныя рухі ў драпіроўках, што здаваліся ёй і раней.

Аднае ночы, у канцы верасня, яна загаварыла пра гэтыя жахлівыя сненні з большай настойлівасцю, чым звычайна, спрабуючы звярнуць на гэта маю ўвагу. Тады яна толькі што абудзілася ад неспакойнага сну, і я са змяшаным пачуццём нецярпення і няяснага страху сачыў за зменамі выразаў яе тва-

ру. Я сядзеў у галавах эбенавага ложка на адной з індыйскіх атаманак. Яна прыўзнялася і загаварыла ледзь чутным шэптам пра гукі, якія *тады* чула яна, але не я; пра рухі, якія *тады* бачыла яна, але не я. Вецер моцна калыхаў драпіроўкі, і я хацеў паказаць ёй (чаму, прызнацца, *не да канца* верыў), што менавіта ад ветру ўзнікаюць тыя невыразныя ўздыхі і ледзь заўважныя рухі арабесак. Але змярцвелая бледнасць яе твару сказала мне пра марнасць маіх высілкаў разупэўніць яе. Здавалася, яна зараз страціць прытомнасць, а служкі былі далёка і не пачулі б майго голасу. Я згадаў, дзе стаіць графін з лёгкім вінам, прапісаным ёй дактарамі, і паспяшаўся прынесці яго з іншага канца пакоя. Але калі я ступіў у асветленае жырандоляю месца, маю ўвагу забралі дзве рэчы: я адчуў, як нехта нябачны, але рэальны, праслізнуў побач са мной, і ўбачыў на залатым дыване, якраз там, дзе прамяні асвятлялі яго найярчэй, цень — лёгкі, няпэўны цень, чые абрысы былі падобныя да абрысаў анёла — яго можна было палічыць ценем ценю. Але я быў узбуджаны празмернай дозай опіюму і таму не надаў гэтаму значэння і нічога не сказаў Равэне. Я знайшоў віно, вярнуўся да яе, наліў келіх і паднёс да вуснаў напаўпрытомнае жонкі. Ёй ужо зрабілася лепш, і яна сама ўзяла келіх, а я сеў на атаманку, не зводзячы вачэй з хворае. І вось тады я выразна пачуў лёгкія крокі па дыване і ля ложка, і калі Равэна паднесла віно да вуснаў, я ўбачыў — ці мне прымроілася? — як некалькі бліскучых кропляў рубінавага колеру, нібы з нейкай нябачнай крыніцы, упалі ў келіх. Калі я гэта і ўбачыў, то Равэна — не. Яна спакойна выпіла віно, і я не стаў казаць ёй пра тое, што, урэшце, магло быць і плёнам майго неспакойнага ўяўлення, на якое хваравіта падзейнічалі опіюм, страхі жонкі і ноч.

Тым не менш я не магу хаваць ад самога сябе тое, што адразу пасля падзення рубінавых кропляў стан маёй жонкі рэзка пагоршыўся. І на трэцюю пасля гэтае ноч рукі служак убралі яе для магілы, а на чацвертую я сядзеў адзін каля яе цела, спавітага саванам, у тым фантастычным пакоі, у які калісьці прывёў Равэну як сваю маладую жонку. Вар'яцкія опіюмныя відзежы ценямі мільгалі ў мяне перад вачыма.

Я неспакойна глядзеў на саркафагі ў кутах, на разнастайныя ўзоры драпіровак, на звівы каляровых агнёў у жырандолі над галавой. Згадаўшы нядаўнюю ноч, я кінуў погляд на кола, утворанае зззяннем жырандолі, дзе пабачыў няясны цень. Але яго там больш не было, і я ўздыхнуў з палёгкай і перавёў позірк на бледнае і нерухомае цела на ложку. І тады мяне апанавалі тысячы ўспамінаў пра Лігею, і тады маё сэрца зноў з нястрымнасцю бурнае плыні напоўніла неперадавальная пакута, з якой я глядзеў на *яе*, спавітую саванам. Ноч заканчвалася; а я, усё яшчэ поўны горкіх думак пра тую адзіную, якую бясконца кахаў, глядзеў, не адводзячы позірку, на цела Равэны.

Пэўна, апоўначы, а можа, раней ці пазней — я не сачыў за часам, — нізкае, ціхае, але вельмі выразнае рыданне вырвала мяне са здранцвення. Мне падалося, што яно прагучала з эбенавага ложка — ложка смерці. Я прыслухаўся, нямеючы ад прымхлівага жаху, але гук не паўтарыўся. Я ўглядаўся ў цела, спрабуючы заўважыць хоць нейкі рух — але не ўбачыў нічога. Між тым я не мог памыляцца. Я чуў гук, якім бы ціхім ён ні быў, і душа мая абудзілася. Я не спускаў вачэй з цела. Мінула шмат хвілінаў, перш чым адбылося тое, што кінула святло на таямніцу. Урэшце стала відавочна, што шчокі і дробныя жылкі павекаў заліў слабы, але заўважны румянец. Ад невымоўнага жаху і трапятання, для якіх мова смяротных не знойдзе выразу, маё сэрца перастала біцца, а цела знерухомела. Урэшце пачуццё абавязку вярнула мяне да прытомнасці. Не было сумневу, што мы паспяшаліся з падрыхтоўкаю, — Равэна яшчэ жывая. Трэба было неадкладна дзейнічаць, але вежа была далёка ад таго крыла абацтва, дзе жылі служкі, і паклікаць не было каго — я мусіў бы на пэўны час пакінуць пакой, а на гэта я не мог наважыцца. Таму я сам прыклаў усе намаганні, каб вярнуць у цела душу, што лунала паблізу. Аднак хутка стала відавочна, што Равэна вярнулася да ранейшага стану: румянец знік са шчок і павекаў, саступіўшы бялейшай за мармуровую бледнасці, вусны ўдвая зморшчыліся і сціснуліся ў жудаснай грымасе смерці, агідная халодная вільгаць хутка пакрыла цела, якое адразу застыла. Я, дрыжучы, вярнуўся на

атаманку, з якой быў падняты так рэзка, і зноў аддаўся жарсным мроям наяве пра Лігею.

Так мінула гадзіна, калі (няўжо гэта магчыма?) я другі раз пачуў нейкі няпэўны гук з боку ложка. Я ўслухоўваўся ў невымоўным жаху. Гук пачуўся зноўку — гэта быў уздых. Я кінуўся да цела і ўбачыў — выразна ўбачыў — трапятанне вуснаў. Праз імгненне яны варухнуліся, раскрыўшы бліскучую палоску жамчужных зубоў. Цяпер у маім сэрцы з трапятаннем, якое датуль панавала там усеўладна, пачало змагацца агаломшанне. Я адчуў, што ў вачах у мяне пацямнела, што розум мой затуманіўся, і толькі адчайным высілкам прымусіў сябе зноў выканаць свой абавязак. Яе лоб, шчокі і шыя паружавелі, цела пацяплела і нават слаба забілася сэрца. Яна *жыла*; з падвойным палам я пачаў вяртаць яе да прытомнасці. Я расціраў яе, змочваў скроні і рукі, пераспрабаваў усё, што памятаў з досведу і чытання медыцынскіх кніг. Але марна. Раптам румянец знік, сэрца спынілася, вусны змярцвела запалі, і праз імгненне цела зрабілася халодным, як лёд, пасінела, застыла, страціла абрысы і набыло ўсе гідкія прыкметы цела, якое шмат дзён праляжала ў магіле.

І зноў патануў я ў мроях пра Лігею, і зноў (ці дзіўна, што я дрыжу, пішучы гэта?), *зноў* пачуў ціхае рыданне з эбенавага ложка. Але нашто падрабязна перадаваць невымоўныя жахі тае ночы? Нашто спыняцца на аповедзе пра тое, як раз за разам, да самага шэрага світання, паўтаралася гэтая жудасная драма ажыўлення, як кожнае вяртанне да жыцця змянялася яшчэ страшнейшай, яшчэ больш непераможнай смерцю, як кожная агонія адлюстроўвала барацьбу з невядомым і нябачным ворагам і як кожная бітва жахліва змяняла выгляд трупа? Не, дазвольце мне хутчэй перайсці да развязкі.

Гэтая страшная ноч ужо амаль мінула, калі тая, што была мёртваю, зноў варухнулася — ужо жывей, чым у папярэднія разы, хаця абуджэнню гэтаму папярэднічала змярцвенне, найбольш безнадзейнае з усіх. Я ўжо даўно адмовіўся ад спробаў змагацца і нават рухацца і застаўся сядзець на атаманцы — бездапаможная ахвяра зграі пачуццяў, з якіх скрайні жах быў, мабыць, найменш страшным і валадарным.

Цела, паўтару, зварухнулася нашмат жывей. Фарбы жыцця з новай сілай ажывілі твар, мышцы расслабіліся, і калі б не заплюшчаныя вочы і пахавальныя павязкі і саван на нерухомай фігуры, што ўсё яшчэ злучалі яе з магілаю, я мог бы паверыць, што Равэна насамрэч апрытомнела і скінула кайданы Смерці. Але нават калі я не прыняў тады гэтай думкі, то ўсе сумневы зніклі, калі, узняўшыся з ложка, няўпэўненымі крокамі патрывожанага ў сне, з заплюшчанымі вачыма, тое, што было спавітае саванам, рашуча рушыла ў сярэдзіну пакоя.

Я не дрыжаў — я не варухнуўся — безліч немагчымых фантазіяў, выкліканых выглядам, абрысамі, паставай фігуры, пранеслася ў маёй галаве, паралізавала мяне і ператварыла ў халодны камень. Я не зварухнуўся — але глядзеў неадрыўна. У думках маіх панавалі разлад і мітусня. Няўжо насамрэч перада мною стаяла *жывая* Равэна? Ці магла гэта быць *Равэна* — светлавалосая блакітнавокая Равэна Трэмэньён з Трэмэйна? Чаму, *чаму* я засумняваўся ў гэтым? Павязкі моцна абвіналі рот — але хіба гэта не мог быць рот жывой лэдзі Равэны? А шчокі — яны квітнелі ружамі, як у паўдзённы час яе жыцця — так, гэта маглі быць шчокі жывой лэдзі Равэны. А падбароддзе, а ямачкі, што казалі пра здароўе, — чаму б ім не быць ейнымі? Але *няўжо яна магла стаць вышэйшай за час сваёй хваробы?* Якое невымоўнае вар'яцтва апанавала мяне ад гэтай думкі! Адзін скачок — і я апынуўся ля яе ног! Адхіліўшыся ад майго дотыку, яна адкінула жахлівую пахавальную павязку, якая абвінала яе галаву, і ў рухомым паветры пакоя рассыпаліся пасмы даўгіх растрапаных валасоў — *яны былі чарнейшыя за крумкачовыя крылы поўначы!* І тады павольна расплюшчыліся вочы тае, што стаяла перада мной.

— Прынамсі ў гэтым, — ускрыкнуў я, — у гэтым я не магу — ніколі б не змог памыліцца! Гэта чорныя, глыбокія, шалёныя вочы маёй страчанай каханай... лэдзі... ЛЭДЗІ ЛІГЕІ!

*Пераклала Марына Дзергачова*

# Маска Чырвонае Смерці

Чырвоная Смерць ужо даўно спусташала краіну. Ніводная пошасць не была ніколі такая згубная й такая агідная. Кроў была яе ўвасабленнем і яе пячаткаю — чырвань і жудасць крыві. Спачатку востры боль і раптоўная помарач, пасля з усіх пораў пачынала сачыцца кроў, пакуль не наставаў смяротны распад. Пунсовыя плямы на целе, асабліва на твары, былі кляймом пракляцця, якое пазбаўляла ахвяру людскоё дапамогі й спагады. І ўвесь гэты поступ хваробы, ад першых азнакаў да жахлівага канца, працягваўся паўгадзіны.

Але князь Праспэра быў шчаслівы, адважны й празорны. Калі ягоныя ўладанні былі выгубленыя напалову, ён прыклікаў да сябе тысячу дужых і легкадумных сяброў спасярод рыцараў і паннаў свайго двору і з імі адышоў у глыбокую адлюднасць аднаго з сваіх умацаваных кляштараў. Гэта была раскошная й велічная пабудова, твор князевых дзівацкіх і шляхетных густаў. Навокал бараніў яе магутны й неадольны мур. У муры былі жалезныя брамы. Вяльможныя ўцекачы ўзялі з сабою кавальскія горны й малаткі і, увайшоўшы, залітавалі ўсе засаўкі. Яны пастанавілі не пакінуць ніякіх магчымасцяў ні для ўваходу, ні для выхаду раптоўным прыступам роспачы ці вар'яцтва сярод тых, хто застаўся ў мурох. Кляштар быў шчодра забяспечаны. Належна засцярогшыся, княжы двор мог не зважаць на пагрозу заразы. А свет за мурамі хай сам пра сябе дбае. Тым часам было глупствам засмучацца або думаць. Князь паклапаціўся пра ўсе магчымыя забавы. Там былі блазны, імправізатары, балет, музыка, Прыгажосць, віно. Усё гэта й надзейная бяспека былі ў мурох. Вонках іх была Чырвоная Смерць.

Калі набліжаўся да канца пяты або шосты месяц кляштарнага замкнення й калі пошасць навокал лютавала найстрашней, князь Праспэра сабраў тысячу сваіх сяброў на маскаваны баль незвычайнае пышнасці. Маскарад гэты быў найдзівоснейшым відовішчам. Але дазвольце мне найперш апісаць пакоі, у якіх ён адбываўся. Іх было сем — велічная

анфілада. Шмат у якіх палацах, аднак, гэтыя анфілады складаюць доўгую й простую перспектыву, а дзверы рассоўваюцца на абодва бакі амаль да самых сценаў, так што скразны від усяе чарады пакояў нічым не затуляецца. Тут жа была зусім іншая рэч; як і можна было спадзявацца, уважаючы на князеву схільнасць да ўсяго *bizarre*[1]. Пакоі былі размешчаныя так бязладна, што за раз можна было ахапіць зрокам крыху больш за адзін. Праз кожныя дваццаць або трыццаць метраў быў круты паварот, і за кожным паваротам хавалася непрадбачанасць. Справа й злева, пасярэдзіне кожнай сцяны высокае й вузкае гатычнае акно выходзіла на крыты калідор, які паўтараў выгіны анфілады. Вокны гэтыя былі аздобленыя вітражамі, колер якіх мяняўся адпаведна з пераважным тонам розных пакояў. Крайні ўсходні, прыкладам, меў блакітную абставу — і ярка-сінія былі ў ім вокны. Другі пакой быў барвовы ў сваёй аздобе й шпалерах, барвовыя былі й шыбы. Трэці быў скрозь зялёны, гэткія ж былі й вокны. Чацверты быў абстаўлены й аздоблены ў памаранчавы колер — пяты ў белы — шосты ў ліловы. Сёмы пакой быў атулены шчыльна чорным аксамітам, які пакрываў усю столь і сцены ад верху да нізу ды спадаў цяжкімі складкамі на дыван — тае самае тканіны й адцення. Аднак толькі ў гэтым пакоі колер вокнаў не адпавядаў навакольнай аздобе. Шыбы тут былі пунсовыя — густа-крывавага колеру. Ні ў адным з сямёх пакояў сярод багатага залатога аздаблення, якое было раскіданае сям і там або звісала са столяў, не было ні свяцільняў, ні кандэлябраў. Ва ўсёй анфіладзе не гарэла ніводнае лямпы або свечкі. Аднак у калідоры, уздоўж анфілады, насупраць кожнага акна стаяў цяжкі трыножнік з жарніцаю, полымя якой зырка асвятляла пакой праз каляровыя шыбы. І гэтак у пакоі спараджалася мноства дзівосных фантастычных зданяў. Што да заходняга, чорнага пакоя, дык у ім святло ад агню, што лілося на чорныя заслоны праз крывавыя вокны, стварала асабліва несамавітае ўражанне. Той, хто ўваходзіў туды, гэтак страшна мяняўся тварам, што мала хто з прысутных наважваўся пераступіць парог пакоя.

[1] Вычварны, вышуканы (фр.).

І якраз у гэтым памяшканні, пры заходняй сцяне, стаяў вялізны гадзіннік з чарнадрэву. Ягоны маятнік вагаўся з нудным, цяжкім, манатонным гулам; і калі хвілінная стрэлка рабіла сваё кола й спаўнялася цэлая гадзіна, з медзяных грудзей гадзінніка вырываўся звонны бой — чысты, гучны, глыбокі й надзвычай музыкальны, але такога нязвыклага тону й выразнасці, што кожную гадзіну музыкі ў аркестры былі змушаныя на момант спыняць выкананне і ўслухоўвацца ў трывожныя гукі; гэтак і тыя, хто кружыўся ў вальсе, мімаволі затрымліваліся; на хвіліну ўся вясёлая грамада замірала ў няёмкім замяшанні; і, калі яшчэ чуўся звон, можна было заўважыць, што твары найбольш легкадумных бялелі, а больш сталыя й паважныя затулялі рукою лоб нібы ў няясным роздуме ці задуменні. Аднак калі рэха сунімалася цалкам, па пакоях адразу прабягаў лёгкі смех; музыкі глядзелі адзін на аднаго й пасміхаліся нібы з сваёй нервовасці й глупства ды шэптам абяцалі адзін аднаму, што наступны бой гадзінніка не абудзіць у іх такіх пачуццяў; аднак праз шэсцьдзесят хвілін (якія ахапляюць тры тысячы шэсцьсот секундаў хуткаплыннага часу) зноў чуўся звон, і зноў, як раней, усіх ахапляла збянтэжанасць, сполах і задуменне. Аднак нягледзячы на гэтыя рэчы то была вясёлая й раскошная гулянка. Князевы густы былі вельмі дзіўныя. Ён меў добрае вока на колеры й эфекты. Ён грэбаваў звычайнасцю. Ягоныя планы былі смелыя й бліскучыя, ягоныя задумы палалі дзікунскім агнём. Некаторыя маглі б палічыць яго вар'ятам, але ягоныя паплечнікі адчувалі, што ён не вар'ят. Трэба было пачуць і пабачыць яго, дакрануцца да яго, каб у гэтым пераканацца.

Ён збольшага сам кіраваў абстаўленнем сямёх пакояў з нагоды гэтага вялікага фэсту, а ягоны ўладарны густ фармаваў вобразы ўдзельнікаў маскараду. Можна не сумнявацца, што яны былі вычварныя. Было ў іх вельмі шмат зіхцення й бляску, пікантнасці й прывіднасці — шмат такога, што можна было пабачыць у «Эрнані»*. Былі тут постаці-арабескі з недарэчнымі часткамі цела й надобамі. Былі мройныя дзівосы, як, прыкладам, уборы вар'ятаў. Было шмат прыгожага, шмат дзівацкага, шмат *bizarre*, трохі жахлівага й ня-

мала таго, што магло б выклікаць агіду. Фактычна па сямёх пакоях сноўдала мноства дзівосных сненняў. І яны — гэтыя сенні — дзівосна курчыліся, мяняючы колер у кожным пакоі, і дзікаватая музыка аркестра здавалася рэхам іхных крокаў. Але вось — б'е чорны гадзіннік, што стаіць у аксамітнай залі. І тады на нейкі момант усё заціхае, усё маўчыць, апроч голасу гадзінніка. Сненні застываюць, як стаялі. Аднак водгулле званоў замірае — яно цягнулася ўсяго імгненне — і лёгкі, крыху прыдушаны смех ляціць яму наўздагон. І тады зноў грыміць музыка, і сненні аджываюць і сноўдаюцца сюды-туды яшчэ жвавей, чым перад гэтым, пазычаючы адценні ў каляровых вокнаў, праз якія ліюцца промні жарніцаў. Але ў пакой, што з усіх сямёх ляжыць найдалей на захад, ніхто з масак зайсці не наважваецца; бо ноч надыходзіць; усё чырванейшае святло ліецца праз крывавыя шыбы; і страшыць чорнасць драпіроўкі; і той, чыя нага ступае на чорны аксаміт дывана, чуе прыглушаны звон эбенавага гадзінніка, больш выразны і ўрачысты за гук, які дасягае вушэй тых, хто аддаецца самым бяздумным забавам у іншых пакоях...

А гэтыя іншыя пакоі былі поўныя вясёлых бяседнікаў, у іх хваравіта біўся пульс жыцця. І гулянка віравала далей, пакуль нарэшце апоўначы не пачаў біць гадзіннік. І тады музыка сціхла, як я казаў; і зноў, як і раней, усё замерла ў замяшанні. Але цяпер звон у гадзінніку меўся прабіць дванаццаць удараў; і так стала, што больш думак пракралася — бо доўшы быў звон — у роздум найбольш разважных сярод гулякаў. І яшчэ сталася так, што перш чым апошняе рэха апошняга ўдару патанула ў цішы, шмат хто ў натоўпе паспеў заўважыць прысутнасць постаці ў масцы, якую дагэтуль ніхто не бачыў. І калі чутка пра гэта глухім шэптам разышлася навокал, сярод усяе грамады ўзняўся гоман і гул, у якім спачатку чулася незадаволенасць і здзіўленне — а пасля пярэпалах, жах і агіда.

У тым зборы прывідаў, які я апісаў, штосьці звычайнае, будзённае не магло б абудзіць такіх пачуццяў. І праўда, распусная вольнасць начнога маскараду была амаль бязмежная; аднак постаць, пра якую йдзе гаворка, перайшла ўсе межы, нават няпэўныя рамкі прыстойнасці самога князя. Ёсць стру-

ны ў сэрцы нават самых легкадумных пустадомкаў, якія могуць адгукнуцца хваляваннем. Нават што да зусім згубленых душаў, для каго жыццё й смерць — аднолькава пустыя жарты, ёсць рэчы, з якімі і на іх думку не можа быць ніякіх жартаў. І сапраўды, цэлая грамада, здавалася, з усёй глыбінёю адчувала, што ўбор і паводзіны чужынца былі скрайне недарэчныя й непрыстойныя. Ён быў высокі, худы, ахутаны з галавы да ног у магільнае ўбранне. Маска, што хавала твар, так нагадвала застылага нябожчыка, што, нават блізка разгледзеўшы, цяжка было б заўважыць падман. Але ўсё гэта маглі б яшчэ сцярпець, а мо нават і ўхваліць звар'яцелыя паплечнікі князя. Аднак гэты штукар зайшоў так далёка, што прыбраўся Чырвонаю Смерцю. Яго адзенне было запэцканае крывёю — шырокі лоб, як і ўвесь твар, быў пазначаны пунсовым жахам.

Калі позірк князя Праспэра ўпаў на гэты прывідны вобраз (які павольна і ўрачыста, мо каб паўней выканаць ролю, хадзіў туды й сюды сярод тых, хто кружыўся ў вальсе), яго ў першую хвілю перасмыкнула ад жаху й агіды; аднак у наступны момант ягоны твар пачырванеў ад гневу. «Хто насмеліўся, — спытаўся ён хрыпла ў сваіх дворных, што стаялі побач, — хто насмеліўся абразіць нас такой блюзнерскаю насмешкай? Схапіць яго й зняць маску — каб мы ўсе даведаліся, каго заўтра ўранку павесяць на муры!»

Ва ўсходнім, блакітным, пакоі стаяў князь Праспэра, калі прамовіў гэтыя словы. Гучна й выразна пragрымелі яны па ўсіх сямёх пакоях, бо князь быў чалавек адважны й дужы, і музыка была сунялася на ўзмах ягонае рукі. У блакітным пакоі стаяў князь, а побач з ім — колькі збялелых падданых. Спачатку, як ён сказаў гэта, сёй-той з грамады нерашуча кінуўся да нязванага госця, які тады быў паблізу, а цяпер няспешна й самавіта падышоў да таго, хто прамовіў суворыя словы. Але з нейкага невыказнага страху, навеянага гэтым вар'яцкім убраннем, не знайшлося нікога, хто б наважыўся яго схапіць; так што, не сустрэўшы перашкодаў, ён прайшоў за метр ад князевай асобы; а калі ўвесь збор, нібы згаварыўшыся, адхінуўся з сярэдзіны заляў да сценаў, ён прайшоў, не спыняючыся, тым самым урачыстым і мерным крокам, уласцівым

яму ад самага пачатку, праз блакітны пакой у барвовы — праз барвовы ў зялёны — праз зялёны ў памаранчавы — праз гэты ў белы — адтуль у ліловы, перш чым была прынятая рашучая спроба яго спыніць. То ж бо тады Праспэра, шалеючы ад гневу за сваё хвілiннае баязлiўства, кінуўся паспешна праз шэсць пакояў, тым часам ніхто не пайшоў за ім з прычыны бязмежнага страху, які агарнуў усё навокал. Ён выхапіў з похваў корд і ў імклівым парыве нагнаў госця, калі той, дасягнуўшы дальняе сцяны аксамітнага пакоя, раптоўна павярнуўся й глянуў у вочы свайму перасдедніку. Пачуўся пранізлівы крык — і бліскучы корд упаў на чорны дыван, а праз імгненне на ім распасцерся ў смяротным сне князь Праспэра. І тады, сабраўшы рэшту адчайнае смеласці, збой гулякаў рынуў у чорную залю, і, схапіўшы злавесную постаць, якая стаяла штыўна й нерухома ў цені змрочнага гадзінніка, яны замерлі ў невымоўным жаху, пабачыўшы, што пад магільным убраннем і смяротнаю маскай, якія былі сарваныя з гвалтоўнай лютасцю, не хавалася нічога.

І тады быў заўважаны прыход Чырвонае Смерці. Яна прыйшла, як злодзей уночы. І падалі адзін за адным бяседнікі ў акропленых крывёю пакоях сваёй раскошы, і кожны з іх паміраў у безнадзейным падзенні. І жыццё гадзінніка згасла разам з жыццём апошняга распусніка. І памерлі агні ў жарніцах. І Цемра, Заняпад і Чырвоная Смерць бязмежна запанавалі над усім.

*Пераклаў Сяргей Шупа*



*...і бліскучы корд упаў на чорны дыван.*

# Вільям Вільсан

Што скажа мне суворае Сумленне,
здань на маёй сцяжыне?
Чэмберлен*. «Фараніда»

Для пачатку дазвольце мне называць сябе Вільямам Вільсанам. Белая папера перада мной не заслугоўвае таго, каб трываць маё сапраўднае імя. Яно даўно ўжо выклікае жах, зрабілася ганебнай плямай на маім родзе. Куды толькі не далятали абураныя вятры, разносячы плёткі пра маю неймаверную гнюснасць. О, выгнаннік выгнаннікаў, пакінуты цяпер усімі, ці не памёр ты назаўжды для свету? Для яго павагі, шанавання і найлепшых памкненняў? — ці не закрыла цяжкая, цёмная і бязмежная хмара ад цябе нябёсы і надзеі на райскае збавенне?

Дазвольце мне не апісваць тут апошнія гады маіх невыносных пакутаў і недаравальных злачынстваў. У апошнія гады я пераўзышоў самога сябе ў подласці, карані якой жадаю тут выкрыць. Людзі ва ўсім развіваюцца паступова — я ж, наадварот, усю дабрадзейнасць, нібы плашч, скінуў у адно імгненне і адзеў замест яе цяжкі саван віны. Ад даволі звычайнай распусты я зрабіў гіганцкі крок да гнюснасцяў Геліягабала*. Што і калі абудзіла гэтае зло? Паслухайце мяне, хаця б пакуль я буду гэта высвятляць. Смерць, набліжаючыся, ужо кінула на мяне свой слабы цень, змякчыўшы лютасць майго духу. Праходзячы цёмнай далінаю*, я прагну спачування — ледзь не сказаў «жалю» — маіх братоў. Я не супраць, каб яны паверылі, што я ў нечым ахвяра збегу абставін. Я быў бы рады, каб яны адшукалі ў прыведзеных фактах невялічкі аазіс перадвызначанасці ў пустыні памылак. Я з задавальненнем пераканаў бы іх — і яны пераканаліся б: хоць спакусы і раней былі вялікія, але чалавек ніколі так не падпадаў пад іх уплыў, а таму ніколі не падаў так нізка — і не так моцна пакутаваў. Ці не было гэта толькі сном? Ці не гіну я ахвярай самай жахлівай і таямнічай з усіх зямных віджэжаў?

Я нашчадак роду, чыёй вызначальнай рысай заўжды былі фантазія і палкі тэмперамент, і ўжо з маленства я быў жывым доказам сямейнага характару, атрыманага ў спадчыну. З гадамі ён праяўляўся ўсё мацней, нярэдка выклікаючы сур'ёзную трывогу ў маіх сяброў і прыносячы шкоду мне самому. Я рос свавольным гарэзнікам, ахвярай самых нястрымных жарсцяў. Мае слабахарактарныя бацькі, носьбіты такіх жа якасцяў, не здольныя былі супрацьстаяць маім заганам. Мае бацькі толькі вяла адзначалі мае злыя якасці. Іх рэдкія спробы майго выхавання заўжды прыводзілі да іх паразы і майго суцэльнага трыюмфу. З таго часу маё слова зрабілася законам для сям'і, і ва ўзросце, калі іншых дзяцей яшчэ водзяць за ручку, я быў пакінуты сам сабе і зрабіўся, па сутнасці, гаспадаром сваіх жаданняў.

Мае першыя ўспаміны пра школьнае жыццё звязаныя з прагулкамі пехам уздоўж вялікай сядзібы часоў каралевы Елізаветы ў туманным ангельскім мястэчку з мноствам велізарных крывых дрэваў, дзе ўсе дамы былі надзвычай старадаўнія. Напраўду, гэта быў рамантычны мройны горад, асвечаны часам. І цяпер мне здаецца, нібы я адчуваю асвяжальны халадок паўзмроку яго вулак, удыхаю водар паўсюднага хмызняку і зноў дрыжу ад невымоўнай прыемнасці пад глухія гукі царкоўнага звону, які штогадзіну нечакана тужлівым гулам разганяў спакой і цемру, у якой спачывала старажытная гатычная званіца.

Часамі мне прыемна згадваць школу і ўсё, што з ёй звязана, — прынамсі ў той ступені, у якой я здольны на гэта цяпер. Мне, зануранаму ў пакуты — пакуты, на жаль, надта сапраўдныя, — хай мне даруюць пошук палёгкі, хаця б слабой і часовай, у некалькіх разрозненых згадках. Яны, хоць цалкам звычайныя і нават смешныя, для мяне вельмі значныя, бо звязаныя з той парой і мясцовасцю, у якія я спазнаў першыя цьмяныя папярэджанні лёсу, што пазней цалкам паглынуў мяне. Таму дазвольце мне прыгадаць.

Сядзіба, як я казаў, была старая і несуладная, а падворак вакол — шырокі, атачаны высокім цагляным мурам, пасыпаным зверху бітым шклом. Гэты бастыён, што нагадваў

турму, і быў мяжой маёнтка, за які мы выходзілі тры разы на тыдзень; раз — у суботу апоўдні, калі нам разам з двума прыслужнікамі дазвалялася выйсці на кароткі шпацыр у палях, што раскідваліся побач, і двойчы — у нядзелю, калі нас шыхтом вялі на ранішняе і вячэровае набажэнствы ў вясковую царкву. Дырэктар нашай школы быў святар у гэтай царкве. З якім жа глыбокім душэўным здзіўленнем і разгубленасцю я пазіраў на яго з нашых царкоўных лаваў, калі ён павольна і велічна ўзыходзіў на кафедру. Пастар са сціплым і спакойным тварам у дбайна напудраным парыку, шорсткім і вялікім, у шатах, якія бліскучымі хвалямі спадалі на падлогу, — няўжо гэта ён яшчэ нядаўна з кіслай мінай, у неахайным сурдуце ў крышках табакі лінейкай вяршыў драконаўскія законы нашай установы? О, спалучэнне неспалучальнага, няўмольная супярэчлівасць, жудасная ў сваёй неспасцігальнасці!

З-за рога цяжкога мура пазірала яшчэ больш цяжкая брама. Яна была абкляпаная цвікамі, што вострымі шыпамі тырчалі з яе. Якое ж душэўнае трымценне яна выклікала! Яе ніколі не адчынялі, апроч трох разоў, якія я ўжо згадваў; таму кожны рып магутных петляў поўніўся таямніцамі — выклікаў мноства змрочных назіранняў і яшчэ змрачнейшых роздумаў.

Шырокая агароджа была няправільнай формы з мноствам ёмістых нішаў. Тры-чатыры найбольшыя з іх выконвалі функцыю пляцовак для гульняў. Яны былі роўныя, ашчадна пасыпаныя жвірам. Я добра памятаю, што там не было дрэваў, лаваў ці чагосьці такога. І месціліся пляцоўкі, зразумела, за сядзібай. А вось перад ёй быў кветнік, засаджаны самшытам і іншым хмызняком, але праз гэтае святое месца мы праходзілі толькі ў самых рэдкіх выпадках — калі, напрыклад, паступалі ў школу ці заканчвалі яе альбо калі бацькі ці сябры наведвалі нас, і мы радасна ад'язджалі дадому на Раство ці летнія вакацыі.

Але ж сядзіба... Наколькі адметны стары будынак! Ён здаваўся мне сапраўдным казачным замкам! Безліч разнастайных закуткоў і бясконцых калідораў. Складана было з пэўнасцю сказаць, на якім з двух яго паверхаў ты знаходзішся.

Трэба было зрабіць тры-чатыры крокі ўверх ці ўніз па прыступках, каб трапіць з аднаго пакоя ў іншы. Бакавых калідораў, разгалінаваных і заблытаных, было так неспасцігальна шмат, што нам прасцей было ўявіць бясконцасць, чым парадак іх размяшчэння. За ўсе пяць гадоў, што я там пражыў, я не мог з дакладнасцю вызначыць, дзе ж месціўся маленькі пакой, прызначаны для мяне і яшчэ васямнаццаці-дваццаці шкаляроў.

Клас быў найвялікшым пакоем у будынку — я не мог пазбавіцца думкі, што і ў свеце. Ён быў вельмі доўгі, вузкі і змрочны, з завостранымі гатычнымі вокнамі і навіслай дубовай столяй. У дальнім куце, што навяваў жах, частка плошчы была абгароджаная на восем-дзесяць футаў пад «святая святых» — кабінет дырэктара, вялебнага доктара Брэнсбі. Гэта была ўнушальная канструкцыя з масіўнымі дзвярыма — нават у адсутнасць «пастыра» яго авечкі хутчэй загінулі б у страшных пакутах, чым адчынілі іх. Па іншых кутах было яшчэ два падобныя адсекі, нашмат менш пачэсныя, але ўсё з той жа аўрай страху. Адзін з іх быў каморынай настаўніка класічных моваў, другі — настаўніка ангельскай і матэматыкі. Раскіданыя ўпоперак і ўздоўж, у кабінеце ў бясконцым беспарадку месціліся незлічоныя парты і лавы — чорныя, старыя, струхлелыя, заваленыя зашмальцаванымі кнігамі і настолькі спярэшчаныя літарамі ініцыялаў і поўнымі імёнамі, гратэскавымі выявамі ды іншымі слядамі сцізорыка, што цалкам страцілі першапачатковы выгляд і даўно чакалі замены. У адным канцы класа стаяла вялізнае вядро, у іншым — аграмадных памераў гадзіннік.

Атачаны вялізнымі мурамі гэтай прэстыжнай установы, я правёў без усялякай стомы ці агіды трэція пяць гадоў майго жыцця. Багатае дзіцячае ўяўленне не патрабуе дзеля забавы віру падзеяў, і, безумоўна, маркотная манатоннасць навучання выклікала моцнае хваляванне, якое пасля, у познім юнацтве, я атрымліваў выключна ад раскошы, а яшчэ пасталеўшы — ад злачынстваў. Аднак я мушу верыць, што пачатак духоўнага развіцця быў у чымсьці незвычайны — больш за тое, эксцэнтрычны. У большасці людзей падзеі ранніх гадоў жыцця рэдка

пакідаюць яскравыя ўспаміны да сталасці. Яны толькі шэры цень — слабая і цьмяная згадка: расплывістыя і невыразныя радасці і прывідныя жахі. У мяне ўсё інакш. Яшчэ ў дзяцінстве я адчуваў так па-даросламу, што і цяпер мая памяць захавала адбіткі ўспамінаў — такіх выразных, глыбокіх і трывалых, нібы надпісы на карфагенскіх медалях.

Але з пункту гледжання большасці тут амаль няма чаго згадваць. Ранішні пад'ём і вечаровы адбой; зубрэнні і чытанні на памяць; скарочаны дзень і суботні шпацыр; пляцоўка для гульняў з яе спрэчкамі, забавамі, інтрыгамі — усё гэта з дапамогай нейкіх даўно забытых духоўных чараў зацягвала ў бездань адчуванняў, у свет, багаты на падзеі, у вір разнастайных эмоцый, хваляванняў самых жарсных і ўзрушальных. *Oh, le bon temps, que ce siècle de fer!*[1]

Напраўду, палкасць, узнёсласць і ўладарнасць майго характару хутка вылучылі мяне сярод аднакашнікаў і паступова, паводле натуральнай іерархіі, далі мне ўплыў на ўсіх, нават крыху старэйшых за мяне — за адным выключэннем. Яно ўвасобілася ў постаці аднаго з вучняў, які, хоць і не быў мне сваяком, меў такое ж імя і такое ж прозвішча, як у мяне, — выпадак, заўважу, малавызначальны, бо, пры ўсім маім высакародным паходжанні, маё прозвішча было дастаткова распаўсюджаным і спрадвек належала нават простаму люду. Таму ў гэтым аповедзе я назваў сябе Вільямам Вільсанам — прыдуманым імем, якое не надта розніцца з сапраўдным. Мой цёзка быў адзіным з тых, з кім, як тады казалі, мы вадзіліся, і ён дазваляў сабе супернічаць са мной у навучанні, у спорце, у сутычках на пляцоўцы для гульняў, не давяраў на людзях майму слову і не падпарадкоўваўся майму ўплыву — больш за тое, быў перашкодай у любой праяве майго капрызнага дэспатызму. Калі на свеце і існуе найвышэйшая і неабмежаваная тыранія, то гэта тыранія мацнейшых духам над слабейшымі ў юнацкіх кампаніях.

Бунт Вільсана быў для мяне прычынай вялікіх пакутаў: нягледзячы на выклік і браваду, з якімі я паводзіўся з ім на

[1] Прыўкрасны час, жалезнае стагоддзе!* (фр.).

людзях, я ўсё ж разумеў, што баюся яго, бо не магу прыняць роўнасць між намі, якое ён з такой лёгкасцю дасягаў, — а гэта ўжо даказвала ягоную перавагу, бо мне каштавала бясконцых высілкаў. Да таго ж ягоная перавага — менавіта гэтая перавага — не была бачная нікому, апроч мяне, і нашыя таварышы з нейкай невытлумачальнай слепасці, здавалася, нават не падазраюць пра яе. Насамрэч, гэтае спаборніцтва, гэтае супрацьстаянне і асабліва нахабнае і ўпартае ўмяшальніцтва ў мае справы былі выключна паміж намі. Ён падаваўся пазбаўленым той ганарыстасці і палкасці розуму, якія падагравалі мяне і вылучалі сярод іншых. У суперніцтве яго мэтай было толькі капрызнае жаданне замінаць мне, зневажаць мяне, хоць часам я не без абразы і раздражнення заўважаў, што ў яго нападах, кпінах і пярэчаннях праглядае недарэчная і, вядома, непажаданая пяшчота да мяне. Я разумеў, што гэтая ганарлівая саманадзейнасць вынікала з жадання апекаваць і абараняць.

Магчыма, гэтая вызначальная рыса ў паводзінах Вільсана (плюс аднолькавыя імёны і абсалютна выпадковае паступленне ў школу ў адзін дзень) паўплывала на агульнае меркаванне, нібыта мы — браты, сярод старшакласнікаў. А яны зазвычай не надта паглыбляюцца ў справы малодшых. Я ўжо вышэй сказаў, прынамсі, мусіў сказаць, што Вільсан не меў нават аддаленага дачынення да маёй сям'і. Але, безумоўна, калі б мы былі братамі, мы б нарадзіліся блізнятамі, бо пасля таго як я пакінуў установу містэра Брэнсбі, я выпадкова даведаўся, што мой цёзка нарадзіўся 19 студзеня 1813 года* — а гэта даволі знакавае супадзенне, бо акурат у гэты ж дзень нарадзіўся і я.

Магчыма, гэта дзіўна, але нават злосць і пастаянны неспакой, выкліканыя ў мяне суперніцтвам з Вільсанам і яго нясцерпным духам супярэчнасці, не маглі прымусіць мяне ўзненавідзець яго да канца. Амаль штодня мы мелі сутычкі, у якіх ён, саступаючы пальму першынства, у сваёй адвечнай манеры заўжды знаходзіў магчымасць даць мне адчуць, што гэта ён, а не я, заслугоўвае перамогі; тым не менш адчуванне гонару з майго боку і пачуццё ўласнай годнасці з ягонага

дазвалялі нам не рабіцца шчырымі ворагамі, а падабенства нашых характараў абуджала ўва мне пачуццё, якому, магчыма, толькі нашае становішча замінала выспець у сяброўства. Вельмі складана вызначыць і пагатоў апісаць мае сапраўдныя пачуцці да яго. Яны ўтвараюць стракатую і неаднастайную сумесь — частка крыўдлівай варожасці, якая яшчэ не стала нянавісцю, часціна пашаны, вялікая частка павагі, шмат боязі і процьма цікаўнасці, за якую сорамна... Які-небудзь пісьменнік дадаў бы, што Вільсан і я былі непадзельнымі спадарожнікамі.

Няма сумневаў, ненармальныя стасункі, што скла́ліся ў нас, накіроўвалі ўсе мае напады супраць яго (а іх было мноства — адкрытых і прыхаваных) у рэчышча кпінаў і грубых жартаў (што пад выглядам мілых забавак прыносяць боль), не даючы гэтым адносінам перарасці ў сур'ёзную і рашучую варажнечу. Але мае высілкі ў гэтым кірунку не заўсёды мелі поспех, нават калі мае планы былі найбольш дасціпна задуманыя; у майго цёзкі ў характары прысутнічала сціплая і ціхая трываласць, што, атрымліваючы асалоду ад уласных жартаў, не мела ў сабе ніякай ахілесавай пяты і рабіла немагчымым смех з сябе. Я, вядома, здолеў адшукаць у ім прынамсі адну спецыфічную якасць, што ўзнікла, магчыма, ад хранічнага захворвання і магла б быць апошнім сродкам суперніка, што вычарпаў сваю фантазію гэтаксама, як я: мой супернік меў, відавочна, слабыя галасавыя звязкі, так што не мог размаўляць гучней, чым ціхім шэптам. Але і тое, што я апускаўся да карыстання такой перавагай, не сведчыла пра маю сілу.

Вільсан адплачваў мне вельмі разнастайна, але адзін з яго дасціпных метадаў турбаваў мяне найбольш. Якім чынам яго праніклівасць выкрыла гэты нязначны момант, што так раздражняў мяне, мне ніколі не зразумець, але, адшукаўшы яго, ён проста па-майстэрску ім карыстаўся. Я заўжды адчуваў агіду да свайго неарыстакратычнага прозвішча і да пашыранага, калі не плебейскага, імені. Яны былі атрутай для маіх вушэй, з дня майго паступлення, калі другі Вільям Вільсан таксама з'явіўся ў акадэміі, і я злаваў на яго за супадзенне і

ўдвая больш ненавідзеў сваё прозвішча, бо яго меў нехта яшчэ, так што яно паўтаралася ў два разы часцей. Ён быў пастаянна побач, і яго справы ў звычайнай школьнай руціне праз агіднае супадзенне непазбежна будуць нярэдка блытаць з маімі.

Адчуванне прыкрасці ўзмацнялася з кожным выпадкам, што паказваў падабенства — маральнае ці фізічнае — паміж маім канкурэнтам і мной. Тады я яшчэ не ведаў, што мы аднаго веку, але бачыў, што мы аднаго росту і маем агульныя рысы ў выглядзе і характэрныя асаблівасці. Да таго ж мяне закраналі чуткі пра нашае сваяцтва сярод вучняў старэйшых класаў. Карацей, нішто мяне так не раздражняла (хоць я ашчадна хаваў любое раздражненне), як напамін пра падабенства нашых розумаў, характараў і абставінаў жыцця. Але ў мяне не было прычыны падазраваць (апроч, бадай, абмеркавання сваяцтва), што гэтае падабенства было прадметам размоваў альбо хаця б заўважалася нашымі таварышамі. Толькі ён гэтак жа засяроджана, як і я, выдаваў гэта ў манеры трымацца; але нават тут ён знаходзіў магчымасці, каб пад дзець, што сведчыла, як я ўжо адзначыў, прыкметай надзвычайнай кемлівасці.

Яго тактыка палягала на тым, каб як мага больш дакладна капіяваць мяне і ў словах, і ў дзеяннях, і ён выдатна з гэтым спраўляўся. Скапіяваць маё адзенне было нескладана, хаду і манеру трымацца ён пераняў без цяжкасцяў і, нягледзячы на фізічны недахоп, нават мой голас быў ім узноўлены. Гучныя інтанацыі, зразумела, узнаўляць не атрымлівалася, але ўсе ключавыя моманты былі ідэнтычныя, і яго своеасаблівы шэпт напраўду зрабіўся маім рэхам.

Я цяпер не рызыкну апісаць, наколькі моцна гэты вытанчаны партрэт даймаў мяне (дзеля справядлівасці адзначу, што ён зусім не быў карыкатурай). Суцяшала мяне толькі тое, што гэтае капіяванне, несумненна, адзначаў толькі я, адзінаасобна трываючы дасведчанасць і дзіўныя з'едлівыя ўсмешкі майго цёзкі. Задаволены тым, што абуджаў унутры мяне, ён, падавалася, употай цешыўся з болю, які прыносіў, і паказальна грэбаваў ухваламі, якія яго паспяховыя практы-

каванні лёгка маглі б выклікаць. Доўгія месяцы для мяне было загадкай, чаму ніхто не зразумеў яго намераў, не ацаніў яго дзеянняў і не ўзяў удзелу ў высмейваннях. Магчыма, паступовасць яго дзеянняў не так лёгка спасцігалася, альбо, верагодней, за сваю бяспеку я мусіў быць удзячны майстэрству перасмешніка, які, грэбуючы вонкавымі праявамі (выключна іх на карцінах і заўважаюць недалёкія людзі), узнаўляў сам дух арыгіналу, дазваляючы толькі сваёй ахвяры сузіраць усё, чым і дапякаў толькі яе.

Я ўжо не раз казаў пра агідны паблажлівы тон, абраны ім у дачыненні да мяне, і пра яго няпрошанае ўмяшальніцтва ў мае справы. Гэтае ўмяшальніцтва ўвасаблялася ў навязлівых парадах, якія даваліся не пры ўсіх, а сам-насам з дапамогай паступовага навядзення на думку. Я выслухоўваў іх з раздражненнем, якое з гадамі толькі набірала сілу. Тым не менш сёння, у такі далёкі ад таго часу дзень, дазвольце мне дзеля справядлівасці прызнаць, што ніводная з парадаў майго суперніка не вяла да недальнабачных памылак, уласцівых юнаму ўзросту і недастатковай дасведчанасці; гэтае яго маральнае адчуванне, калі не талент і жыццёвая мудрасць, было нашмат вастрэйшым за маё — а сёння я сам быў бы лепшы і шчаслівейшы, калі б не так часта адрынаў парады, зробленыя выразным шэптам, парады, якія я тады ненавідзеў усім сэрцам і якімі люта пагарджаў.

Так пад яго надзвычай непрыемным наглядам маё раздражненне павялічвалася, і я ўсё больш і больш адкрыта выказваўся, што я думаю пра яго невыносную пыху. Я ўжо згадваў, што ў першыя гады школы мае пачуцці да яго маглі выспець у сяброўскія, але ў апошнія месяцы майго знаходжання ў акадэміі, нягледзячы на тое, што яго дзеянні што да мяне ў пэўнай меры паслабіліся, мае пачуцці — у роўнай прапорцыі — набліжаліся да недвухсэнсоўнай нянавісці. Пасля аднаго выпадку, я думаю, ён гэта заўважыў і пачаў пазбягаць мяне — альбо рабіць выгляд, што пазбягае.

Менавіта тады, калі мяне не падманвае памяць, у нейкай бурнай сварцы ён быў як не ў сабе — прамаўляў і паводзіўся з неўласцівай яму раней адкрытасцю, і я заўважыў (альбо мне

так падалося?) у яго тоне і агульнай манеры нешта такое, што спачатку выклікала страх, а пасля глыбока зацікавіла мяне, бо абудзіла слабыя згадкі пра маленства — блытаныя і тлумныя ўспаміны тых далёкіх часоў, калі памяць яшчэ і не нарадзілася. Я не здолею лепей перадаць пачуццё, што прыгнятала мяне тады, як прызнацца, што мяне апанавала дзіўнае адчуванне: чалавека перада мной я ведаю з самых даўніх, бясконца далёкіх часоў. Гэтая думка, аднак, знікла гэтак жа хутка, як і з'явілася, і я згадваю пра гэта толькі каб адзначыць дзень, калі я апошні раз размаўляў з маім незвычайным цёзкам.

У старым агромністым доме з незлічонымі прыбудовамі было некалькі велізарных прахадных пакояў, злучаных паміж сабой, у якіх спала пераважная большасць навучэнцаў. Там было, аднак (што звычайна для няўклюдна спланаваных будынкаў), шмат невялікіх клецяў і нішаў, утвораных разнастайнымі выступамі і перагародкамі, але вынаходлівы містэр Брэнсбі прыстасаваў іх для спальняў, хоць спачатку яны былі не больш чым уштукаванымі каморынамі, прыдатнымі для жыцця толькі аднаго чалавека. Адно з такіх невялікіх памяшканняў і займаў Вільсан.

Неяк пры канцы пятага года навучання, адразу пасля згаданай сутычкі, неспакойнай восеньскай ноччу, дачакаўшыся, пакуль усе паснуць, я ўзняўся з ложка і з лямпай у руцэ незаўважна пракраўся вузкімі пераходамі ад сваёй спальні да суперніка. Я ўжо даўно планаваў адпомсціць, здзейсніўшы адзін са сваіх дасціпных і зласлівых жартаў, якія пакуль не ўдаваліся. Я ішоў з мэтай ажыццявіць свае намеры, каб нарэшце даць яму зразумець усю глыбіню маёй злосці. Дасягнуўшы яго спальні, я ціхутка ўвайшоў, пакінуўшы накрытую лямпу звонку. Я зрабіў крок і прыслухаўся да ягонага роўнага дыхання. Запэўніўшыся, што ён спіць, я вярнуўся па лямпу і ўжо з ёй пайшоў да яго ложка, завешанага покрывам, якое, згодна з планам, я павольна і ціха адсунуў. І калі яркія промні святла трапілі на спячага, мой позірк упаў на ягоны твар. Я зірнуў — і скамянеў. Раптоўны холад прабраў маё нутро. Мае грудзі ўздымаліся, калені дрыжалі, а мой дух апанаваў невымоўны,

нясцерпны жах. Цяжка дыхаючы, я паднёс лямпу яшчэ бліжэй да яго твару. Ці ж гэты твар — твар Вільяма Вільсана? Вядома, я бачыў, што гэта яго твар, але не мог у тое паверыць і ліхаманкава дрыжаў. Што ж такое ў ім мяне збянтэжыла? Я ўглядаўся, — а ў маёй галаве віравала мноства абрывістых думак. Несумнеўна, удзень ён выглядаў зусім не так. Тое ж імя! Тыя ж рысы твару! У той жа дзень трапіў у пансіён! І да таго ж упартае і незразумелае капіяванне маёй хады, голасу, звычак і манеры трымацца! Ці пад сілу чалавеку дасягнуць такога падабенства ў гэтым саркастычным перайманні? Узрушаны да глыбіні душы, я з трымценнем згасіў лямпу, моўчкі выйшаў з пакоя і адразу пакінуў сцены пансіёна, каб ніколі больш туды не вяртацца.

Пасля колькіх месяцаў, праведзеных дома ў абсалютнай бяздзейнасці, я зрабіўся студэнтам Ітану. Кароткага часу было дастаткова, каб мае згадкі пра здарэнні ў пансіёне доктара Брэнсбі саслабелі, — прынамсі, штосьці змянілася ў прыродзе пачуццяў, з якімі я гэта прыгадваў. Гэта болей не выглядала так рэальна і драматычна. Я пачаў сумнявацца ў беспамылковасці маіх пачуццяў, прыгадваў гэта толькі зрэдку, здзіўляючыся чалавечай даверлівасці і ўсміхаючыся сіле фантазіі, якая мне дасталася ад продкаў. Лад жыцця ў Ітане толькі спрыяў такому скепсісу. Вір безразважнага шалу, якому я так хутка і неабдумана аддаўся, змыў усё, апроч пены апошніх гадзін, адначасова паглынуўшы ўсе цэльныя сур'ёзныя ўражанні і пакінуўшы ў памяці толькі легкадумнасць былога існавання.

Аднак мне не хочацца апісваць праявы бездапаможнай распусты, аддаючыся якой, мы кідалі сапраўдны выклік законам, унікаючы тым не менш пільнага вока нашага каледжа. Тры гады гэтага шалу прайшлі без усялякай карысці, прышчапіўшы толькі кепскія звычкі; да таго ж я раптам незвычайна вырас і зрабіўся вельмі высокім. І вось аднойчы пасля тыдня жорсткіх і легкадумных забаваў я запрасіў на невялікую таемную гулянку сваіх найбольш распусных аднакурснікаў. Мы сустрэліся позна ўначы, бо нашыя гулянкі зацягваліся да самага ранку. Віно лілося ракой, ды і ў больш

вострых спакусах не было недахопу, і калі золак толькі з'явіўся на ўсходзе, нашая апантаная блазнота была на самым піку. Моцна расчырванелы ад картаў і жарсці, я зацята прамаўляў больш чым блюзнерскі тост, калі нечакана маю ўвагу забраў рэзкі гук прачыненых дзвярэй і напружаны голас служкі. Не ўваходзячы, ён паведаміў, што нейкі чалавек, які вельмі спяшаецца, хацеў бы паразмаўляць у вітальні.

Шалёна ўзрушаны віном, я хутчэй узрадаваўся, чым здзівіўся, гэтай нечаканасці і адразу ж, хістаючыся, пайшоў у вітальню. У гэтым нізкім і маленькім пакоі не было лямпы, і цяпер сюды зусім не пранікала святла, апроч надзвычай слабога золку, які заглядаў праз паўкруглае акно. Пераступіўшы цераз парог, я апынуўся перад чалавекам майго росту, апранутым у белы кашміравы строй, пашыты па апошняй модзе, такі ж, які быў на мне. Слабое асвятленне дазволіла мне заўважыць толькі гэта, але рысаў твару я разгледзець не здолеў. Калі я ўвашоў, ён зрабіў крок да мяне і, нецярпліва схапіўшы маю руку, прашаптаў на вуха: «Вільям Вільсан!»

Я адразу ж цалкам працверазеў. У манеры незнаёмца трымацца, у ледзь заўважным трымценні ў мяне перад вачыма ягонага ўзнятага пальца штосьці напаўняла мяне неймаверным здзіўленнем, хоць насамрэч не гэта ўзрушыла мяне. Сур'ёзная перасцярога ў гэтым своеасаблівым, ціхім і шыпячым вымаўленні і, больш за тое, характар, гук і сутнасць гэтых простых і звыклых словаў ускалыхнулі ў маёй душы тысячы ўспамінаў і падзейнічалі як дотык да гальванічнай батарэі. Перш чым я апрытомнеў, ён сышоў.

Хоць гэты выпадак і наклаў яркі адбітак на маё хворае ўяўленне, адчуванне гэтае хутка знікла. Праўда, колькі тыдняў я займаў сябе грунтоўным пошукам звестак альбо паглыбляўся ў змрочныя роздумы. Я не спрабаваў разупэўніваць сябе, што гэта той самы чалавек, які так настойліва ўрываецца ў маё жыццё і даймае мяне сваімі падступнымі парадамі. Але хто і што такое гэты Вільсан? Адкуль ён? Якія ў яго намеры? Усе гэтыя пытанні засталіся без адказу; адзінае, што я здолеў даведацца пра яго, — гэта тое, што праз нейкае няшчасце ў сям'і ён вымушаны быў пакінуць установу докта-

ра Брэнсбі ўвечары таго ж дня, калі ўцёк я. Хутка я перастаў пра яго думаць, бо маю ўвагу цалкам паглынулі роздумы пра ад'езд у Оксфард. Туды я неўзабаве і накіраваўся; празмерная ганарыстасць маіх бацькоў забяспечыла мяне такім гардэробам і штогадовым грашовым утрыманнем, што я меў магчымасць песціць сябе ў раскошы, ужо такой мілай майму сэрцу, спаборнічаючы ў празмерных растратах з самымі фанабэрыстымі спадчыннікамі з самых заможных і шляхетных сем'яў Вялікабрытаніі.

Узрушаны магчымасцю разгарнуцца, я з падвойнай жарсцю даў волю свайму нораву і з грэблівасцю адмовіўся ад любых праяваў стрыманасці на карысць шалу балявання. Але было б неразумна спыняцца тут на апісанні маіх блазнотаў. Дастаткова сказаць, што ў растратах я пераірадзіў Ірада* і звязаў сваё імя з мноствам бздураў, нашмат павялічыўшы доўгі спіс заганаў, што бытавалі тады ў адным з самых распусных універсітэтаў у Еўропе.

Цяжка паверыць, але менавіта тут я нагэтулькі страціў маральнае аблічча, што пазнаёміўся з подлай прафесіяй шулера і зрабіўся экспертам у гэтай нізкай навуцы, карыстаючыся ёй для павелічэння майго і без таго немалога нажытку за кошт даверлівых знаёмцаў. Тым не менш гэта праўда. І маё гнюснае злачынства супраць усяго мужнага і высакароднага, без сумневу, было спрычыненае выключным адчуваннем беспакаранасці, з якім злачынства здзяйснялася. Насамрэч, любы з маіх нават найбольш распусных таварышаў хутчэй усумніўся б у сведчаннях сваіх пачуццяў, чым запасочыў бы ў чымсьці такога шчырага і высакароднага Вільяма Вільсана, самага шляхетнага і добразычлівага студэнта ў Оксфардзе, чые бздуры (як казалі яго падхалімы) былі адно бздурамі юнацтва і нястрымнай фантазіі, памылкі — адно непаўторнымі дзівацтвамі, а найстрашнейшыя заганы — дабрадушнымі заліхвацкімі блазнотамі.

Два гады я паспяхова ішоў у гэтым напрамку, калі ва ўніверсітэце з'явіўся малады арыстакрат-парвеню Глендэнінг — багаты, нібы Ірад Атык*, які гэтак жа лёгка займеў сваё багацце. Неўзабаве я зразумеў, што ён невялікага розуму,

і, вядома, вырашыў, што ён — лёгкая здабыча для майго майстэрства. Я нярэдка зацягваў яго ў гульню і адмыслова, згодна з шулерскім мастацтвам, дазваляў яму выйграваць істотныя сумы, каб надзейна зацягнуць у сваю пастку. Калі мой план даспеў, я сустрэў яго (з намерам зрабіць нашую сустрэчу вырашальнай) у кватэры яшчэ аднаго студэнта (містэра Прэстана), аднолькава знаёмага з намі абодвума, які, дзеля справядлівасці трэба дадаць, нават не падазраваў пра мой план. Каб надаць усяму адценне праўдападобнасці, я сабраў кампанію чалавек у 8–10 і старанна зрабіў так, каб прапанова гульні выглядала выпадковай і прагучала з вуснаў самой ахвяры. Каб сказаць як мага карацей пра гэтую гнюсную тэму, адзначу, што не быў прапушчаны ніводзін з нізкіх прыёмаў, якімі карыстаюцца ў такіх выпадках, таму проста здзіўляе, як шмат дагэтуль прасцякоў, што робяцца іх ахвярамі.

Гульня зацягнулася да самай ночы, і ў мяне паступова атрымалася пакінуць Глендэнінга маім апошнім супернікам. Да таго ж была мая любімая гульня — экартэ! Астатнія, зацікавіўшыся размахам нашай партыі, адкінулі свае карты і назіралі за намі. Выскачка Глендэнінг, які маімі ўлоўкамі яшчэ ў самым пачатку вечара добра выпіў, цяпер тасаваў, раздаваў і гуляў з такім нервовым напружаннем, што ап'яненне, мяркую, толькі часткова гэта тлумачыла. За вельмі кароткі час ён ужо прайграў мне значную суму, пасля чаго, выпіўшы нагбом вялікі бакал партвейну, зрабіў менавіта тое, чаго я ад яго чакаў, — прапанаваў падвоіць нашыя і без таго немалыя стаўкі. З бездакорна зграной неахвотай і толькі пасля таго як двойчы адмовіўся, чым справакаваў ягоную злосць, якая надала адценне крыўды і абразы маёй згодзе, я яе даў. Вынік, вядома, даказаў, наколькі глыбока ў маёй пастцы апынулася ахвяра: менш чым за гадзіну ён павялічыў свой доўг мне ў чатыры разы. Яшчэ да гэтага з яго твару знік румянец, выкліканы віном, але цяпер, на маё здзіўленне, я адзначыў, што гэта вылілася ў бледнасць сапраўднага жаху. Я сказаў — на маё здзіўленне. Мае ранейшыя роспыты ўпэўнілі мяне ў тым, што Глендэнінг неймаверна багаты і сума, якую ён прайграваў, нягледзячы на яе значнасць, не мусіла, на маю

думку, сур'ёзна злаваць і настолькі хваляваць яго. Першай думкай было, што гэта ў яго праз вялікую колькасць праглынутага віна; і, хутчэй зыходзячы з меркавання захавання ўласнай рэпутацыі, чым з пункту гледжання меней важкіх матываў, я быў гатовы настойваць на спыненні гульні, калі па пэўных фразах ад кампаніі навокал і па ўсклiку роспачы Глендэнінга я зразумеў, што пазбавіў яго ўсіх яго грошай пры абставінах, якія, робячы яго аб'ектам жалю ўсіх навокал, абаранілі б яго ад злых замахаў і нават ад самога д'ябла.

Складана сказаць, як бы я паводзіўся надалей. Вартае жалю становішча маёй ахвяры выклікала ва ўсіх змрочную разгубленасць, і на некаторы час у пакоі павісла цішыня. Я адчуў, як запалалі мае шчокі пад мноствам позіркаў, якія апякалі пагардлівым дакорам з боку найменш распусных з нашай кампаніі. Прызнаюся нават, што на кароткі момант нясцерпны цяжар трывогі быў зняты з мае душы раптоўным і незвычайным умяшальніцтвам. Важкія дзверы ў пакой нечакана расчыніліся нагэтулькі ўпэўненым рухам, што ўсе свечкі ў пакоі, нібы пад уздзеяннем чараў, згаслі. Іх святло, знікаючы, дазволіла ўсім заўважыць толькі тое, што ўвайшоў незнаёмец прыблізна майго росту, шчыльна захутаны ў плашч. Цемра, аднак, усталявалася абсалютная; мы маглі толькі адчуваць яго прысутнасць. Да таго як хто-небудзь з нас здолеў перамагчы здзіўленне, выкліканае гэтым грубым уварваннем, мы пачулі голас нахабніка.

— Джэнтльмены, — прамовіў ён ціхім, выразным і незабыўным *шэптам*, які прабраў мяне да касцей, — джэнтльмены, я не выбачаюся за свае дзеянні, бо гэтымі дзеяннямі, я толькі выконваю свой абавязак. Сумняюся, што вы слушна праінфармаваныя наконт асобы, якая сёння выйграла ў лорда Глендэнінга значную суму ў экартэ. А таму я дам вам імгненную і неабходную магчымасць атрымаць такую важную інфармацыю. Калі ласка, праверце ўнутраную падкладку манжэты яго левага рукава і некалькі невялікіх скруткаў, якія могуць знайсціся ў крыху зашырокіх кішэнях яго халата.

Калі ён гаварыў, стаяла такая цішыня, што можна было б пачуць, калі б на падлогу ўпала шпілька. Дагаварыўшы, ён

сышоў гэтак жа раптоўна, як і з'явіўся. Ці мае сэнс казаць, што я адчуў усе пакуты грэшнікаў у пекле? Але часу на разважанні ў мяне, вядома, не было. Мноства рук адразу ж схапіла мяне, свечкі зноў запалілі. Пачаўся вобшук. У падкладцы майго рукава знайшоўся ўвесь набор картаў, патрэбных для гульні ў экартэ, а ў кішэнях — некалькі калодаў, такіх жа, якімі карысталіся мы, з тым адрозненнем, што мае былі, як кажуць спецыялісты, *arrondées*[1]: казырныя анёры былі злёгку выпуклыя па краях, а малодшыя карты — па баках. Такім чынам, калі ахвяра здымае калоду, як правіла, уздоўж, яна непазбежна аддае суперніку старэйшую карту, у той час як шулер, здымаючы калоду па шырыні, вядома, не раздасць суперніку ніводнай выйгрышнай карты.

Любы ўсплёск абурэння на такое адкрыццё закрануў бы мяне менш за маўклівую пагарду і з'едлівы спакой, якімі сустрэлі гэтае адкрыццё ўсе прысутныя.

— Містэр Вільсан, — сказаў гаспадар, нахіляючыся, каб падняць з-пад ног вельмі дарагі плашч, аздоблены мехам, — містэр Вільсан, гэта вашае. (Надвор'е было халоднае, і таму, сыходзячы са свайго пакоя, я надзеў плашч, але скінуў яго, пачаўшы гульню). — Я мяркую, залішне шукаць і тут, — ён паглядзеў на складкі адзення са з'едлівай усмешкай, — дадатковыя доказы вашага майстэрства. Напраўду, дастаткова і ўжо атрыманых. Спадзяюся, вы разумееце, што вам варта пакінуць Оксфард, — у любым выпадку, пакіньце неадкладна мой дом.

Зняважаны, утаптаны ў бруд, я, можа, і адказаў бы на гэтыя дзёрзкія словы кулакамі, калі б усю маю ўвагу не забрала іншае. Мой уласны плашч быў аздоблены рэдкім мехам, настолькі рэдкім і дарагім, што не рызыкну сказаць. Яго крой таксама быў часткай маёй уласнай дзіўнай прыдумкі, бо ў такіх справах мая пераборлівасць часта даходзіла да абсурду. Таму калі містэр Прэстан працягнуў мне падняты з падлогі каля дзвярэй плашч, я адчуў неймавернае здзіўленне, якое пераходзіла ў жах, бо ўбачыў, што мой уласны ўжо вісіць на

[1] Акругленыя (фр.).

маёй руцэ (што я зрабіў, мабыць, абсалютна не заўважыўшы гэтага), а той, што мне працягнулі, быў дакладнай яго копіяй ва ўсіх найдрабнейшых дэталях. Я згадаў, што незнаёмец, які так згубна выкрыў мяне, прыйшоў захутаны ў плашч, а акрамя мяне, ніхто тут больш плашча не насіў. Спрабуючы захаваць прысутнасць духу, я прыняў той, што мне працягваў Прэстан, незаўважна паклаў яго на ўласны і пакінуў памяшканне з рашучым і пагардлівым позіркам, а наступнага дня таропка пакінуў Оксфард і ў ліхаманцы жаху і сораму скіраваўся на кантынент.

*Я ўцякаў марна.* Мая злая наканаванасць, нібы ў экстазе, пераследавала мяне, даказваючы, што праявы яе таямнічага валадарства яшчэ толькі пачаліся. Ледзь я апынуўся ў Парыжы, як атрымаў свежы доказ агіднай цікавасці гэтага Вільсана да мяне. Ішлі гады, але ён не пакідаў мяне. Злыдзень! Як не ў час, але з якой прывіднай урачыстасцю стаў ён у Рыме паміж мной і маімі намерамі! І ў Вене таксама, і ў Берліне, і ў Маскве! Ды і дзе ў мяне *не было* прычыны праклінаць яго ў душы? Ад яго невытлумачальнай тыраніі я ў паніцы ўцякаў як ад чумы, але і на край свету *я ўцякаў марна.*

Зноў і зноў у таямнічым падабенстве нашых душаў я шукаў адказы на пытанні: «Хто ён? Адкуль ён? Што яму трэба?» — але адказаў не было. Тады я ўважліва прааналізаваў усе формы, спосабы і галоўныя рысы яго нахабнага нагляду. Але нават тут мне амаль не было на чым будаваць здагадкі. Вартае ўвагі прынамсі тое, што ў кожным са шматлікіх выпадкаў, калі ён ставаў на маёй дарозе і зрываў мае планы, усё заканчвалася меншым для мяне злом у параўнанні з тым, якое напаткала б мяне, калі б намеры мае паспяхова ажыццявіліся. Але ж якое гэта нікчэмнае апраўданне для таго, каб так нахабна мною распараджацца! Кепская плата за маё натуральнае права вырашаць самастойна, так абразліва ў мяне аднятае!

Я вымушаны адзначыць, што мой кат за вельмі доўгі час (неверагодна і акуратна трымаючыся свае прыхамаці цалкам адпавядаць мне ў адзенні) ва ўсіх сваіх разнастайных умяшальніцтвах у мае справы схітрыўся ні разу не паказаць мне свайго твару. Кім бы ні быў Вільсан, гэта, прынамсі, бы-

ло праявай капрызу і дзівацтва. Няўжо ён мог падумаць, што ў маім папярэджвальніку ў Ітане, у разбуральніку маёй рэпутацыі ў Оксфардзе, у тым, хто зашкодзіў маім славалюбным намерам у Рыме, маёй помсце ў Парыжы, майму жарснаму каханню ў Неапалі альбо таму, што ён ілжыва назваў маёй сквапнасцю ў Егіпце, у маім выклятым ворагу і злым генію можна не пазнаць Вільяма Вільсана, майго школьнага таварыша — цёзку, аднакласніка і канкурэнта, ненавіснага і страшнага суперніка з установы доктара Брэнсбі? Немагчыма! Але дазвольце мне неадкладна перайсці да апошняй, поўнай на падзеі сцэны гэтай драмы.

Да гэтага часу я маўкліва падпарадкоўваўся гэтай цяжкой уладзе. Глыбокае трымценне, з якім я заўсёды глядзеў на ўзвышаную натуру, велічную мудрасць, усюдыіснасць і ўсёмагутнасць Вільсана, змешвалася з пачуццём страху, разам з якім усе адзначаныя рысы і праявы яго характару дасюль вымушалі мяне прызнаваць уласную бездапаможнасць і з горкай неахвотай скарацца яго дэспатычнай волі. Але апошнім часам я цалкам аддаўся віну, і яго раздражняльны ўплыў на мой нораў вымушаў мяне ўсё болей і болей нецярпліва прагнуць вызвалення з-пад гэтага кантролю. Я пачаў наракаць, пярэчыць, супрацьстаяць. І, магчыма, толькі ілюзія нараджала веру, што чым больш узрастала мая непахіснасць, тым слабейшай рабілася настойлівасць майго ката. Як бы там ні было, цяпер я адчуваў пякучы ўздым надзеі і пеставаў у думках цвёрдую рашучасць пазбавіцца прыгнёту.

У Рыме падчас карнавалу 18... году я пайшоў на маскарад у палаца неапалітанскага герцага Дзі Бролья. Я піў нашмат больш нястрымана, чым звычайна, і цяпер душнасць перапоўненых людзьмі залаў пачала невыносна мяне раздражняць. Дадавала мне раз'юшанасці яшчэ і тое, што трэба было пракладаць сабе дарогу скрозь лабірынты кампаній; я страшна нерваваўся, бо нецярпліва шукаў (можна і не казаць, з якім нізкім намерам) маладую, бесклапотную і прывабную жонку старога й нямоглага Дзі Бролі. Крыху раней яна з бессаромнай даверлівасцю прызналася мне па сакрэце, у якім касцюме будзе, і цяпер, заўважыўшы яе, я спяшаўся

наблізіцца. У гэты момант я адчуў лёгкі дотык да пляча і пачуў незабыўны, ціхі, ненавісны *шэпт*.

У шалёным прыпадку гневу я павярнуўся да таго, хто спыніў мяне, і моцна схапіў яго за каўнер. Яго касцюм, як я і чакаў, быў абсалютна такім жа, як мой: гішпанскі плашч з сіняга аксаміту, падпераханы малінавым пасам, што падтрымліваў рапіру. Маска з чорнага шоўку цалкам хавала твар.

— Нягоднік! — прамовіў я сіплым ад гневу голасам, і кожны гук, здавалася, толькі распаляў мяне. — Нягоднік! Самазванец! Пракляты зламыснік! Ты не будзеш, *не будзеш* пераследаваць мяне да смерці! Ідзі за мной, інакш я закалю цябе проста на месцы! — і я кінуўся з танцавальнай залы ў невялікі вестыбюль па суседстве, цягнучы яго за сабой і не адчуваючы супраціву.

Увайшоўшы, я ашалела адпіхнуў яго ад сябе. Ён, пахіснуўшыся, апынуўся ля сцяны, а я, з праклёнамі сяк-так замкнуўшы дзверы, загадаў яму рыхтавацца да абароны. Ён на імгненне завагаўся, але, пагардліва ўздыхнуўшы, моўчкі стаў у пазіцыю.

Бойка была кароткай. Я быў апантаны і надзвычай узрушаны, таму адчуваў, што мая рука мае сілу і моц цэлага натоўпу. За колькі секунд я прыціснуў яго да сцяны і, атрымаўшы ўладу над ім, з жывёльнай жорсткасцю шмат разоў пракалоў рапірай ягоныя грудзі.

У гэты момант нехта паспрабаваў адчыніць дзверы. Я паспяшаўся перадухіліць умяшальніцтва і адразу ж вярнуўся да паміраючага суперніка. Але якой чалавечай мовай можна дакладна перадаць здзіўленне і жах, якія завалодалі мной ад таго, што я ўбачыў? Кароткага імгнення, калі я адвёў вочы, было дастаткова для кардынальнай перамены ў іншым канцы памяшкання. Вялікае люстэрка — так спачатку падалося мне, збянтэжанаму, — стаяла там, дзе раней нічога не было, і калі я ў жаху зрабіў крок наперад, маё адлюстраванне, бледнае і акрываўленае, зрабіла няцвёрды крок насустрач.

Я сказаў, так мне падалося, але гэтак не было. Гэта быў мой супернік — гэта быў Вільсан, які стаяў перада мной у перадсмяротных пакутах. Ягоныя маска і плашч ляжалі на



*Ува мне ты існаваў — і ўпэўніся па гэтым абліччы, якое ёсць тваім уласным, як незваротна маёю смерцю ты загубіў самога сябе!*

падлозе, куды ён кінуў іх раней. І аніводная нітачка ў ягоным адзенні, аніводная лінія ў яго беспамылкова пазнавальных і непаўторных рысах *не адрозніваліся ад маіх уласных!*

Гэта быў Вільсан, але ён болей не шаптаў, і мне нават падалося, што гэта я сам прамовіў:

— *Ты перамог, і я скараюся. Але цяпер ты таксама мёртвы — для Свету, для Нябёсаў, для Надзеі! Ува мне ты існаваў — і ўпэўніся па гэтым абліччы, якое ёсць тваім уласным, як незваротна маёю смерцю ты загубіў самога сябе!*

*Пераклаў Віталь Рыжкоў*

# Праўда пра тое, што здарылася з містэрам Вальдэмарам

Безумоўна, я не збіраюся ўдаваць здзіўленне з нагоды таго, што надзвычайны выпадак з містэрам Вальдэмарам выклікаў столькі чутак. Было б дзіўна, калі б сталася наадварот, асабліва ўлічваючы абставіны. Праз тое, што ўсе, хто меў дачыненне да гэтае справы, хацелі пазбегнуць агалоскі, хаця б у найбліжэйшы час альбо да таго, як мы знойдзем магчымасць працягнуць даследаванні, менавіта праз нашыя спробы абысці гэта маўчаннем абставіны справы дайшлі да публікі ў перабольшаным і скажоным выглядзе, нарадзіўшы мноства непрыемных і памылковых тлумачэнняў, а гэта, натуральна, выклікала вялікі недавер.

І таму неабходна, каб я цяпер паведаміў факты, наколькі я сам здолеў іх зразумець. Калі сцісла, то вось яны.

Апошнія тры гады маю ўвагу неаднаразова прыцягвала пытанне месмерызму*. Каля дзевяці месяцаў таму мне раптам прыйшло ў галаву, што да сённяшняга часу гэтыя эксперыменты мелі адзін істотны і невытлумачальны недахоп: яшчэ нікога не падвяргалі месмерычнаму ўздзеянню *in articulo mortis*[1]. Варта было высветліць, па-першае, ці паддаецца чалавек у такім стане гіпнозу, па-другое, мацнейшае ці слабейшае яго ўздзеянне ў такім выпадку, і па-трэцяе, ці можна такім чынам запаволіць надыход смерці, і калі можна, то на які час і ў якой ступені. Былі яшчэ некаторыя пытанні, якія няблага было б высветліць, але гэтыя тры, і асабліва апошняе — зважаючы на вялізную важнасць меркаваных вынікаў, — цікавілі мяне найбольш.

Шукаючы ў сваім атачэнні таго, з чыёй дапамогаю я мог бы гэтыя дапушчэнні праверыць, я ўспомніў пра свайго сябра — містэра Эрнэста Вальдэмара, вядомага збіральніка

---

[1] Пры смерці, у агоніі (лац.).

«Bibliotheca Forensica»[1] і аўтара (пад *nom de plume*[2] Ісахара Маркса) перакладаў на польскую «Валенштайна»* і «Гарганцюа». Містэр Вальдэмар, які з 1839 года жыў пераважна ў Гарлеме, у штаце Нью-Ёрк, звяртаў на сябе ўвагу, прынамсі раней, надзвычайнай худзізною — ягоныя ніжнія канцавіны вельмі нагадвалі ногі Джона Рэндалфа*, — а таксама белымі бакенбардамі, якія рэзка кантраставалі з чорнымі валасамі, і праз гэта іх вельмі часта памылкова ўважалі за парык. Надзвычайная нервовасць рабіла яго вельмі прыдатным аб'ектам для месмерычнага эксперымента. Два-тры разы я ўсыпляў яго без асаблівых цяжкасцяў, але ў астатнім ён не апраўдаў надзеяў, якія выклікалі ў мяне асаблівасці ягонага целаскладу. Ягоную волю мне ні ў якай ступені не ўдалося падпарадкаваць сабе ні разу, а што да *clairvoyance*[3], то я не здолеў дасягнуць нічога з таго, на што спадзяваўся. Я заўсёды тлумачыў свае няўдачы ў гэтым ягоным расстроеным здароўем. За некалькі месяцаў да нашага знаёмства ягоныя дактары выявілі ў яго сухоты. Зазвычай ён гаварыў пра свой блізкі скон спакойна, як пра непазбежнасць, не вартую шкадаванняў.

Калі вышэйзгаданыя думкі ўпершыню прыйшлі мне ў галаву, я, натуральна, адразу згадаў пра містэра Вальдэмара. Я добра ведаў ягоную філасофскую цвёрдасць і быў упэўнены, што вагацца ён не будзе. Сваякоў, якія маглі б перашкодзіць, ён не меў. Я шчыра пра ўсё яму расказаў, і, на маё здзіўленне, ён вельмі жыва гэтым зацікавіўся. Я сказаў «на маё здзіўленне», таму што, хаця ён заўсёды лёгка згаджаўся на мае эксперыменты, ніпгто не сведчыла пра тое, што ён іх ухваляў. Характар ягонай хваробы дазваляў дакладна вызначыць час надыходу ягонае смерці, і мы дамовіліся, што ён пакліча мяне прыкладна за суткі да скачэння тэрміну, дадзенага яму дактарамі.

Прайшло ўжо больш за сем месяцаў з таго дня, калі я атрымаў ад містэра Вальдэмара наступную ўласнаручную запіску:

---

[1] Судовай бібліятэкі (лац.).

[2] Псеўданімам (фр.).

[3] Яснабачання (фр.).

*Шаноўны П.,*

*Думаю, Вам варта прыйсці цяпер. Д. і Ф. пагадзіліся на тым, што я не працягну даўжэй за заўтрашнюю поўнач, і думаю, што яны вылічылі час даволі дакладна.*

*Вальдэмар*

Я атрымаў гэтую запіску праз паўгадзіны пасля яе напісання, а яшчэ праз пятнаццаць хвілінаў быў у пакоі паміраючага. Я не бачыў яго дзесяць дзён і быў уражаны зменамі, што адбыліся з ім за такі кароткі час. Ягоны твар набыў шэры колер, вочы страцілі ўвесь бляск, і схуднеў ён настолькі, што косці скулаў амаль прарывалі скуру. Ён часта адхарквае макроту, а пульс намацваўся з цяжкасцю. Тым не менш ён захаваў ясны розум і нават пэўную фізічную моц. Ён выразна вымаўляў словы, самастойна прымаў некаторыя лекі, што палягчалі ягоны стан, і, калі я ўвайшоў, штосьці пісаў алоўкам у нататніку, паўседзячы на падушках. Пры ім былі дактары Д. і Ф.

Паціснуўшы Вальдэмару руку, я адвёў дактароў убок, і яны падрабязна расказалі мне пра стан пацыента. Ягонае левае лёгкае за паўтара года напалову кальцынавалася і, безумоўна, было ўжо абсалютна нежыццяздольным. Верхняя частка правага таксама часткова, калі не цалкам, сцвярдзела, а ніжняя ператварылася ў суцэльную масу гнойных туберкулёзных вузельчыкаў. Там было некалькі вялікіх кавернаў, а ў адным месцы лёгкае зраслося з рабрынай. Гэтыя змены ў правым лёгкім былі параўнальна нядаўнімі, а кальцынацыя ішла незвычайна хутка: месяц таму яе не было яшчэ ні знаку, а зрашчэнне заўважылі толькі цягам трох апошніх дзён. Апроч сухотаў у Вальдэмара падазравалі яшчэ анеўрызму аорты, аднак сцвярдзенне не дазваляла дыягнаставаць яе з дакладнасцю. Абодва лекары сыходзіліся на тым, што ён памрэ на наступны дзень, у нядзелю, недзе апоўначы. Тады ішла восьмая гадзіна суботняга вечара.

Калі дактары Д. і Ф. адышлі ад ложка хворага для размовы са мною, яны ўжо развіталіся з ім. Яны не збіраліся вяртацца, але па маёй просьбе згадзіліся зазірнуць сюды назаўтра каля дзесяці гадзінаў вечара.

Яны сышлі, і я адкрыта загаварыў з містэрам Вальдэмарам пра ягоны блізкі канец і — больш падрабязна — пра меркаваны эксперымент. Ён пацвердзіў сваю поўную згоду на ўсё і нават выказаў жаданне неадкладна пачаць дослед. Пры хворым былі санітар і сядзелка, але я не мог дазволіць сабе пачынаць такую справу без больш надзейных сведкаў, чым гэтыя людзі, на выпадак якое-небудзь непрадбачнасці. З гэтае прычыны я вырашыў адкласці дослед да васьмі гадзінаў наступнага вечара, калі прыход містэра Тэадора Л-ла — студэнта-медыка, з якім я быў крыху знаёмы, — вызваліў мяне ад гэтых перашкодаў. Спярша я збіраўся дачакацца лекараў, аднак давялося пачаць раней праз настойлівыя просьбы містэра Вальдэмара, падмацаваныя тым, што я бачыў, як ён на вачах слабее, і часу застаецца няшмат.

Містэр Л-л ветліва пагадзіўся натаваць усё, што тут адбудзецца. Менавіта з ягоных запісаў збольшага ўзята тое, што я маю сказаць, даслоўна ці са скарачэннямі.

Было амаль восем, калі я, узяўшы Вальдэмара за руку, папрасіў яго як мага выразней пацвердзіць для містэра Л-ла, што ён (Вальдэмар) у сваім цяперашнім стане добраахвотна падвяргаецца месмерызацыі. Ён слабым голасам, але даволі разборліва сказаў: «Так, я хачу падвергнуцца месмерызацыі, — і тут жа дадаў: — Баюся, вы задоўга марудзілі».

Пасля ягоных словаў я прыступіў да пасаў, якія раней, як я заўважыў, уздзейнічалі на яго найбольш. На яго відавочна падзейнічаў першы ж дотык маёй рукі да ягонага ілба, але нягледзячы на тое, што я прыклаў усе свае здольнасці, да пачатку адзінаццатай, калі ў адпаведнасці з дамовай прыйшлі дактары Д. і Ф., мне не ўдалося дасягнуць хоць якога адчувальнага поспеху. У некалькіх словах я патлумачыў ім сваю задуму і, не сустрэўшы з іх боку ніякіх пярэчанняў — а яны зазначылі, што хворы ўжо ў агоніі, — без ваганняў працягнуў свае дзеянні, перайшоўшы, праўда, ад падоўжных пасаў да папярочных і не адрываючы позірку ад правага вока няшчаснага.

Ягоны пульс тым часам перастаў намацвацца, а хрыплае дыханне вырывалася раз на паўхвіліны.

Каля пятнаццаці хвілінаў стан хворага збольшага не мяняўся. Але пасля натуральны, хаця і вельмі глыбокі ўздых вырваўся з грудзей паміраючага, і хрыплае дыханне спынілася, дакладней, хрыпаў больш не было чуваць, але дыхаў ён усё гэтак жа рэдка. Рукі і ногі хворага былі халодныя як лёд.

Без пяці адзінаццаць я заўважыў відавочныя прыкметы месмерычнага ўздзеяння. Выраз ашклянелых вачэй змяніўся: у іх з'явілася нейкая трывожная ўнутраная заглыбленасць, якую можна назіраць толькі ў загіпнатызаваных і якую немагчыма ні з чым пераблытаць. Некалькімі падоўжнымі пасамі я змусіў павекі затрымцець, як пры засынанні, пасля яшчэ некалькімі цалкам іх закрыў. Гэтым я, аднак, не задаволіўся, а з наймацнейшым напружаннем волі працягнуў рашучыя маніпуляцыі, пакуль канцавіны заснулага, якога я паклаў больш-менш зручна, не здранцвелі. Ногі былі выцягнутыя, рукі, што ляжалі ўздоўж цела на некаторай адлегласці ад сцёгнаў, — таксама. Галава была крышку прыпаднятая.

Калі я скончыў з гэтым, ужо надышла поўнач, і я папрасіў дактароў зрабіць заключэнне адносна стану містэра Вальдэмара. Пасля пэўных доследаў было зазначана, што ён знаходзіцца ў надзвычай глыбокім гіпнатычным трансе. Абодвух медыкаў гэта вельмі зацікавіла. Доктар Д. адразу ж вырашыў застацца з паміраючым на ўсю ноч, доктар Ф. сышоў, паабяцаўшы вярнуцца на досвітку. Містэр Л-л і сядзелка з санітарам засталіся.

Мы не трывожылі містэра Вальдэмара прыкладна да трэцяй гадзіны ночы. Пасля я падышоў да яго і знайшоў у тым самым стане, у якім ён быў перад сыходам доктара Ф.: ён ляжаў у той самай позе, пульс не намацваўся, дыханне было слабое, заўважнае толькі пры паднясенні да вуснаў люстэрка, вочы былі закрытыя, а рукі і ногі цвёрдыя і халодныя, як мармур. Тым не менш ён зусім не выдаваў на памерлага.

Падышоўшы да містэра Вальдэмара, я зрабіў лёгкае намаганне, каб прымусіць ягоную руку зварухнуцца, зрабіўшы над ёй такія ж пасы, якія нядаўна рабіў над яго целам. Раней такія эксперыменты не рабілі на містэра Вальдэмара ніякага значнага ўздзеяння, і таму я не вельмі спадзяваўся на поспех

і цяпер. Але, на маё здзіўленне, ягоная рука адразу ж, хаця і з цяжкасцю, пачала рухацца за маёй у любым паказаным кірунку. Я вырашыў рызыкнуць і загаварыць з ім.

— Містэр Вальдэмар, — сказаў я, — вы спіце?

Адказу не было, але я заўважыў, што вусны яго варухнуліся, а таму працягваў задаваць пытанне. Пасля трэцяга разу па яго целе прабеглі лёгкія дрыжыкі, павекі прыпадняліся, паказаўшы тонкія палоскі бялкоў, вусны вяла варухнуліся, і з іх сарваўся ледзь чутны шэпт:

— Так, цяпер сплю. Не будзіце мяне! Дайце памерці так!

Тут я дакрануўся да ягонага цела, але яно было такім жа цвёрдым, як і раней. Правая рука працягвала паслухмяна рухацца за маёй. Я зноў звярнуўся да загіпнатызаванага.

— Вы ўсё яшчэ адчуваеце боль у грудзях, містэр Вальдэмар?

Адказ пачуўся адразу ж, але быў яшчэ больш невыразны:

— Нічога не баліць... я паміраю.

Я падумаў, што далей турбаваць яго не варта, а таму да прыходу доктара Ф. больш нічога не казаў і не рабіў. Доктар прыйшоў перад самым світаннем і з бязмерным здзіўленнем убачыў, што хворы ўсё яшчэ жывы. Намацаўшы пульс і прыклаўшы да вуснаў Вальдэмара люстэрка, ён папрасіў мяне яшчэ раз звярнуцца да загіпнатызаванага. Я спытаў:

— Містэр Вальдэмар, вы ўсё яшчэ спіце?

Як і раней, прайшло некалькі хвілінаў, перш чым пачуўся адказ: здавалася, паміраючы збірае ўсе сілы, каб загаварыць. Калі я чацверты раз задаў пытанне, ён вельмі слаба, ледзьледзь чутна адказаў:

— Так... усё яшчэ сплю... паміраю.

Згодна з меркаваннем, ці, дакладней, жаданнем медыкаў, містэра Вальдэмара трэба было пакінуць у ягоным цяперашнім, вонкава спакойным стане, пакуль не надыдзе смерць, якую, паводле агульнай думкі, можна было чакаць у найбліжэйшыя хвіліны. Я ж вырашыў, аднак, звярнуцца да яго яшчэ раз і паўтарыў папярэдняе пытанне.

Пакуль я гаварыў, твар загіпнатызаванага раптам вельмі моцна змяніўся. Павекі марудна падняліся, вочы закаціліся, скура набыла трупнае адценне — колер, падобны хутчэй не

да пергаментнага, а да колеру белай паперы; плямы сухотнага румянцу, якія да гэтага былі выразна бачныя на шчоках, імгненна згаслі. Я ўжываю гэтае слова, бо нечаканасць такой змены нагадала мне менавіта свечку, якую задзьмулі. У той самы час верхняя губа адсунулася і агаліла зубы, якія дагэтуль былі цалкам схаваныя, ніжняя сківаца з выразным стукам апусцілася, рот шырока адкрыўся, і нам стаў бачны апухлы і счарнелы язык. Мяркую, што ўсе прысутныя да гэтага моманту ўжо сутыкнуліся хоць раз з жахлівым відовішчам смерці, але выгляд містэра Вальдэмара быў такі вусцішны, што мы разам адскочылі ад ложка.

Цяпер я, мабыць, дасягнуў таго месца ў сваім аповедзе, на якім любы чытач адмовіцца верыць маім словам. Але мая справа — проста расказваць далей.

Нічога не выдавала на тое, што містэр Вальдэмар яшчэ жывы. Зрабіўшы такую выснову, мы ўжо збіраліся перадаць яго сядзелкам, калі заўважылі, што язык яго моцна задрыжаў. Гэта доўжылася прыкладна хвіліну. Пасля з-за рассунутых нерухомых сківаў пачуўся голас — такі, што нават спроба апісаць яго падалася б вар'яцтвам. Існуе, канечне, два-тры эпітэты, якія акурат прыдаліся б у гэтай сітуацыі; так, напрыклад, я магу сказаць, што гэтыя гукі былі рэзкія, перарывістыя і замагільныя, але напраўду іх вусцішнасць не паддаецца апісанню з той простай прычыны, што такія гукі ніколі раней не трывожылі ніводнае чалавечае вуха. Тым не менш дзве асаблівасці гэтага голасу падаліся мне тады — дый падаюцца цяпер — характэрнымі, бо яны ў некаторай ступені дапамагаюць выявіць яго нечалавечае гучанне. Папершае, голас, здавалася, далятаў да нашых — прынамсі да маіх — вушэй аднекуль здалёк, быццам з нейкай вельмі глыбокай падземнай пячоры. Па-другое, ён падзейнічаў на мяне так (хаця, баюся, патлумачыць гэта проста немагчыма), як нешта студзяністае і клейкае дзейнічае на нас пры дотыку.

Я казаў пра «гукі» і «голас». Пад гэтым я меў на ўвазе, што гукі гэтыя былі выразна — прычым самым дзіўным, самым страшным чынам — зразумелыя. Містэр Вальдэмар гаварыў — і гаварыў, адказваючы на пытанне, якое я задаў

некалькі хвілінаў таму. Як чытачы, мабыць, памятаюць, я спытаў яго, ці спіць ён яшчэ. І ён адказаў:

— Так... не... я спаў, а цяпер... цяпер... я памёр.

Ніхто з прысутных нават не спрабаваў схаваць альбо стрымаць невымоўны жах, які працінаў да касцей, жах, выкліканы некалькімі словамі, прамоўленымі такім чынам. Містэр Л-л, студэнт, страціў прытомнасць. Санітар і сядзелка кінуліся з пакоя і катэгарычна адмовіліся вяртацца. Апісваць чытачам свае пачуцці я нават не бяруся. Каля гадзіны мы ў поўным маўчанні, не вымаўляючы ні слова, спрабавалі прывесці ў сябе містэра Л-ла. Калі гэта ўдалося, мы зноў вярнуліся да містэра Вальдэмара.

Яго стан заставаўся такім самым, якім я яго апісаў, калі не лічыць таго, што на люстэрку больш не з'яўлялася ніякіх знакаў дыхання. Спроба пусціць з рукі кроў пацярпела паразу. Апроч гэтага, варта згадаць, што рука містэра Вальдэмара больш не падпарадкоўвалася маёй волі. Марна спрабаваў я прымусіць яе рухацца. Адзіным паказнікам месмерычнага ўздзеяння заставалася дрыжанне языка кожны раз, калі я задаваў містэру Вальдэмару пытанне. Здавалася, ён спрабуе адказаць, але не мае для гэтага дастаткова сілы волі. Да пытанняў, задаваных іншымі, ён заставаўся неадчувальны, хаця я і спрабаваў стварыць паміж ім і кожным з прысутных гіпнатычную сувязь. Думаю, цяпер я паведаміў усё, што можа даць уяўленне пра стан загіпнатызаванага на той момант. Мы знайшлі новых сядзелак, і а дзясятай я сышоў разам з абодвума медыкамі і містэрам Л-лам.

Апоўдні мы зноў зайшлі паглядзець на пацыента. Ягоны стан заставаўся нязменным. Мы пачалі абмяркоўваць мэтазгоднасць і магчымасць абудзіць яго і хутка пагадзіліся, што нічога добрага мы гэтым не дасягнем. Да гэтага моманту было бачна, што смерць (ці тое, што мы звычайна называем смерцю) была, дзякуючы гіпнозу, прыпыненая. Нам здавалася відавочным, што абуджэнне містэра Вальдэмара прывядзе да імгненнага ці, прынамсі, хуткага скону.

З таго часу і да канца мінулага тыдня — цягам амаль сямі месяцаў — мы кожны дзень наведваліся да містэра Вальдэ-

мара, часам у суправаджэнні медыкаў ці проста сяброў. Увесь гэты час стан загіпнатызаванага заставаўся такім, як я ўжо апісаў. Пры ім нязменна знаходзіліся сядзелкі.

Мінулай пятніцай мы канчаткова вырашылі пабудзіць яго ці хаця б паспрабаваць гэта зрабіць, і менавіта (ці магчыма) няўдалы вынік гэтае спробы выклікаў столькі спрэчак у розных колах і столькі неапраўданых, на маю думку, усеагульных хваляванняў.

Дзеля таго каб вывесці містэра Вальдэмара з гіпнатычнага трансу, я выкарыстаў некалькі звычайных пасаў. Некаторы час яны не давалі ніякіх вынікаў. Першай прыкметай выхаду з трансу было частковае апусканне райка вока. Асаблівую ўвагу мы звярнулі на тое, што апусканне зрэнкаў суправаджалася моцным выдзяленнем з-пад павекаў жаўтаватай сукравіцы з вельмі непрыемным пахам.

Мне параілі пачынаць, як і раней, уздзейнічаць на руку пацыента. Я паспрабаваў і пацярпеў паразу. Тады доктар Ф. пажадаў, каб я задаў пытанне. Я спытаў:

— Містэр Вальдэмар, вы можаце расказаць нам цяпер пра вашыя пачуцці ці жаданні?

На шчоках імгненна з'явіўся сухотны румянец, язык у роце задрыжаў ці, хутчэй, шалёна закруціўся, хаця сківіцы і вусны засталіся такімі ж цвёрдымі, як і раней, і ўрэшце той самы вусцішны голас, які я апісваў вышэй, прамовіў:

— Богам прашу!.. хутчэй!.. хутчэй!.. усыпіце мяне!.. ці хутчэй... абудзіце мяне!.. хутчэй!.. кажу ж вам, я мёртвы!

Я дарэшты страціў усе свае сілы і імгненне вагаўся, не ведаючы, што рабіць. Спачатку я паспрабаваў зноў усыпіць пацыента, але, не здолеўшы зрабіць гэта праз поўнае аслабленне волі, пайшоў у адваротным кірунку і пачаў з усяе моцы яго будзіць. Я хутка зразумеў, што спробы мае прывялі да поспеху, — прынамсі, тады мне ўяўлялася, што поспех мой канчатковы, — і быў упэўнены, што ўсе прысутныя гатовыя да абуджэння пацыента.

Але падрыхтавацца да таго, што тады адбылося, напраўду не здольны ніводны чалавек.

Пакуль я паспешліва выконваў гіпнатычныя пасы сярод ускрыкаў «Мёртвы! Мёртвы!», што зрываліся з языка, але

не з вуснаў няшчаснага, усё ягонае цела раптам — за адну толькі хвіліну ці нават хутчэй — сціснулася, расклалася і распаўзлося пад маімі рукамі. На ложку перад намі ляжала напаўвадкая, моташлівая, агідная маса.

*Пераклалі Кацярына Маціеўская і Ганна Янкута*



*На ложку перад намі ляжала напаўвадкая, моташлівая, агідная маса.*

# Элеанора

Sub conservatione formae specificae salva anima.
*Пры захаванні пэўнай формы душа застаецца жывою (лац.)*
Раймунд Лулій*

Я паходжу з роду, слыннага сілаю фантазіі і палам жарсці. Мяне называлі вар'ятам, аднак яшчэ невядома, ці не ёсць вар'яцтва найвышэйшым розумам і ці не бярэ ўсё слаўнае і мудрае пачатак з запалёнае думкі, з асаблівага настрою розуму, узнесенага цаною страты звычайнага інтэлекту. Тыя, хто бачыць сны наяве, абазнаныя шмат у якіх рэчах, што недасяжныя для тых, хто бачыць сны адно ўначы. Скрозь туманныя летуценні яны зазіраюць у вечнасць і, прачнуўшыся, трымцяць ад адчування, што ім выпала стаяць на краі вялікае таямніцы. Урыўкамі да іх даходзяць крыхі мудрасці, якія ёсць дабром, і крыху больш — звычайныя веды, якія ёсць ліхам. Тым не менш без стырна і без компасу яны пранікаюць у неасяжны акіян «святла невымоўнага» і зноў, як у прыгодах нубійскага географа*, «*agressi sunt mare tenebrarum, quid in eo esset exploraturi*»[1].

Што ж, няхай кажуць, што я вар'ят. Прынамсі, я прызнаю, што ёсць дзве адрозныя формы майго псіхічнага існавання — бясспрэчны стан яснага розуму, якому належыць памяць пра падзеі, што склалі першы перыяд майго жыцця, і стан ценю й сумневаў, якія адносяцца да майго цяперашняга жыцця і згадак пра тое, што адбылося ў другой вялікай эры майго існавання. Такім чынам, давайце веры ўсяму, што я буду апавядаць пра першы перыяд, а што да пазнейшага перыяду, то стаўцеся да ўсяго роўна з такім даверам, як яно таго заслугоўвае, або сумнявайцеся, а калі сумнявацца вы не можаце, то ўявіце, што гэта — Эдыпава загадка.

Тая, каго я кахаў у юнацтве і пра якую цяпер ясна і спакойна пішу гэтыя ўспаміны, была адзінаю дачкою адзінае

[1] Уваходзяць у мора цемры*, каб даследаваць, што ў ім (лац.).

сястры маёй даўно ўжо спачылай маці. Маю кузіну звалі Элеанораю. Усё жыццё мы пражылі разам, сагрэтыя трапічным сонцам Даліны Шматколерных Траваў. Ніводзін чужы след не з'яўляўся ў той даліне, бо ляжала яна далёка-далёка, за ланцугом велізарных узвышшаў, што шчыльна навісалі наўкола, не прапускаючы сонечнае святло ў самыя прыгожыя яе закуткі. Ніводнае сцяжынкі не было пратаптана ў яе ваколіцах, і, каб трапіць у наш шчаслівы дом, трэба было прабрацца праз лісце тысячаў лясных дрэваў, да смерці растоптваючы хараство многіх мільёнаў духмяных кветак. Вось чаму мы жылі самотна, нічога не ведаючы пра свет па-за далінаю — я, мая кузіна ды яе маці.

З панурых земляў, што слаліся па-за высокімі гарамі, што з усіх бакоў абступілі наш край, прасочвалася вузенькая і глыбокая рачулка, ярчэйшая за ўсё на свеце, акрамя вачэй Элеаноры; і, крадучыся звілістым шляхам, яна знікала ў цяністай шчыліне гор, між узвышшаў, яшчэ больш панурых за тыя, з якіх яна брала пачатак. Мы назвалі яе Ракою Маўчання, бо здавалася, быццам плынь яе валодала нейкай сілай бязгучнасці. Ніякага цурчання не чулася ад яе, лілася яна так лагодна, што перламутравыя каменьчыкі, на якія мы так любілі глядзець, нерухома ляжалі ў глыбіні, кожны на адным і тым жа месцы, выпраменьваючы велічнае ззянне.

Берагі той ракі і яе шматлікіх бліскучых ручаёў, што лёгка рухаліся да рэчышча праз пакручастыя сцежкі, гэтаксама як і неасяжная прастора, што распасцерлася ад самых глыбокіх краёў да самага дна, высланага галькай, — гэтыя мясціны, як і ўся паверхня даліны, ад рэчкі да гор, што апярэзвалі яе, былі засланыя мяккаю зялёнаю травою, густою, нізкаю, беззаганна роўнаю, напоўненаю водарам ванілі і так прыгожа ўсеянаю паўсюль жоўтымі казяльцамі, белымі стакроткамі, пурпурнымі фіялкамі і рубінавымі асфадэлямі, што ўсё гэтае бязмернае хараство хвалявала нашыя сэрцы, гучна апавядаючы пра каханне і славу Усявышняга.

Дзе-нідзе сярод гэтае травы, нібы дзівосныя сны, узвышаліся незвычайныя дрэвы, чые высокія тонкія камлі стаялі не проста, а грацыёзна хіліліся да святла, што апоўдні

разлівалася ў самае сэрца даліны. Кара іх стракацела яркім бляскам, у якім чаргаваліся водбліскі чарноты й срэбра, і была яна пяшчотнейшая за ўсё, акрамя шчок Элеаноры, і калі б не пышная зяляніна вялізных лістоў, якія спадалі з вершалінаў даўгімі хісткімі радамі, падлашчваючыся да лёгкага ветрыку, то можна было прыняць тыя дрэвы за гіганцкіх сірыйскіх змеяў, што аддавалі пашану свайму ўладару — Сонцу.

Трымаючыся за рукі, пятнаццаць гадоў блукалі мы з Элеанораю па той даліне, пакуль каханне не запанавала ў нашых сэрцах. Сталася тое аднаго вечара на зыходзе трэцяга пяцігоддзя яе жыцця і чацвертага — майго, калі мы сядзелі пад змеепадобнымі дрэвамі, сціскаючы адно аднаго ў абдымках, і глядзелі на ваду ў Рацэ Маўчання, на нашыя адлюстраванні ў ёй. Мы не прамовілі ні слова ў той цудоўны дзень, і нават вымаўленае намі назаўтра было нешматлікім і нясмелым. Мы выклікалі бога Эрота з тае хвалі і цяпер адчувалі, што ён абудзіў у нас палкасць, закладзеную яшчэ ў нашых продках. Жарсці, якімі вякамі быў адзначаны наш род, сабраліся, перапоўненыя фантазіямі, і пранесліся шалёнаю асалодаю над Далінаю Шматколерных Траваў. Усё ў ёй змянілася. Незвычайныя цудоўныя кветкі, падобныя да зорак, распусціліся на дрэвах, тых, якія раней ніколі не ведалі квецені. Зяленіва смарагдавага кіліма стала яшчэ больш насычаным, а калі адна за адною звялі белыя стакроткі, замест іх параспускаліся дзясяткі рубінавых асфадэляў. Жыццё пачало з'яўляцца ўсюды, куды б нашая нага ні ступала, — высокі фламінга, дагэтуль не бачаны, разам з іншымі вясёлымі яркімі птушкамі выхваляўся перад намі сваім пунсовым апярэннем. Залатыя і срэбныя рыбкі заплюхаліся ў рацэ, з лона якое паціху пачало раздавацца цурчанне, што ўрэшце ператварылася ў мелодыю калыханкі, прыгажэйшую за Эолаву арфу, саладзейшую за ўсё на свеце, акрамя голасу Элеаноры. І вялізнае воблака, якое мы бачылі толькі блізу Геспера*, прыплыло адтуль, выпраменьваючы барвовыя і залатыя водбліскі, і, мірна ўладкаваўшыся па-над намі, дзень пры дні пачало апускацца усё ніжэй, аж пакуль краямі не ўлеглася на вершаліны гор, ператвараючы іх цьмянасць у

велічнасць і замыкаючы нас у чароўнай вязніцы пышнасці й прыгажосці.

Хараством Элеанора была падобная да серафіма, але была яна дзяўчо наіўнае і шчырае, як і кароткае жыццё, што яна прабавіла сярод кветак. Яна не хавала палымянага кахання, што хвалявала яе сэрца, і зазірнула разам са мною ў самыя патаемныя яго закуткі, калі мы ўдваіх шпацыравалі Далінаю Шматколерных Траваў, разважаючы пра вялікія змены, што кагадзе там адбыліся.

І аднойчы ў слязах загаварыла яна пра апошнюю змену, што напаткае ўсё чалавецтва, і з таго часу адно пра гэта цвердзіла, шторазу вяртаючыся да гэтае сумнае тэмы, гэтаксама як у песнях шыразскага паэта* ва ўсіх варыяцыях зноў і зноў сустракаюцца тыя самыя вобразы.

Яна адчула, што Смерць кранулася рукой яе грудзей — падобная да матылька, яна была надзеленая незвычайнаю прыгажосцю адно для таго, каб памерці; але жах смерці для яе быў толькі ў адным, аб чым аднойчы ўвечары яна і расказала мне на беразе Ракі Маўчання. Вялікі боль прыносіла ёй думка пра тое, што, пахаваўшы яе ў Даліне Шматколерных Траваў, я назаўсёды пакіну гэты шчаслівы край і дарыцьму каханне, палкасць якога дагэтуль належала толькі ёй, панне са свету вонкавага й бруднага. І тады я адразу ж кінуўся да ног Элеаноры і пакляўся перад ёй і Нябёсамі, што ніколі не ажанюся ні з адной дачкой зямлі, што нічым не здраджу яе светлай памяці або памяці яе шчырага пачуцця, якім яна гэтак мяне ашчасліла. І я паклікаў магутнага Уладара сусвету, каб Ён стаў сведкам урачыстасці мае клятвы. А як я парушу тую клятву, то няхай прыпадзе на мяне кара, аб якой я прасіў Яго і яе, святую, што жыцьме ў Элізіюме*, і няхай кара тая будзе такою жахліваю, што я нават казаць пра яе не наважуся. І ясныя вочы Элеаноры пасвятлелі, калі я сказаў гэтыя словы; і яна ўздыхнула, нібы смяротны цяжар упаў з яе душы, і, задрыжэўшы, вельмі горка заплакала, але прыняла маю клятву (бо яна была зусім дзіцем), і гэта дало ёй палёгку перад абліччам смерці. Праз колькі дзён, мірна адыходзячы, яна сказала мне, што за тое, што я зрабіў для заспакаення яе

душы, яна пасля смерці будзе ахоўваць мяне, і, калі ёй будзе дазволена, уначы будзе прыходзіць да мяне наяве; але ж, калі райскім душам тое не будзе дазволена, яна, прынамсі, часта давацьме мне знакі свае прысутнасці — ці то ўздыхаючы вечаровым ветрыкам, ці то напаўняючы паветра, якім я дыхаю, водарам анёльскіх кадзілаў. І з гэтымі словамі на вуснах яна рассталася са сваім нявінным жыццём, кладучы канец першай эпосе майго быцця.

Дасюль я казаў толькі праўду. Аднак, мінаючы бар'ер на шляху Часу, утвораны сконам маёй каханай, і ўступаючы ў другую эру свайго існавання, я адчуваю, як цень ахутвае мой розум, і я сумняюся ў беззаганнасці сваёй памяці. Аднак я буду казаць далей. Гады пакутліва цягнуліся адзін за адным, а я ўсё яшчэ не сыходзіў з Даліны Шматколерных Траваў; але яшчэ адна вялікая змена адбылася ў ёй. На дрэвах звялі падобныя да зорак кветкі і ніколі ўжо больш не з'яўляліся. Прыцьмелі фарбы смарагдавага кіліма, і адзін за адным змарнелі рубінавыя асфадэлі, замест іх распусціліся дзясяткі цёмных, нібы вочы, фіялак, што так трывожна выгіналіся і былі заўсёды абцяжараныя расою. Жыццё ўжо больш не віравала ў тых краях, дзе мы калісьці бавіліся, — высокі фламінга болей не выхваляўся сваім пунсовым апярэннем, а ў журбе адляцеў за горы разам з усімі калісьці вясёлымі птушкамі, што некалі прыляцелі разам з ім. Залатыя і срэбныя рыбкі сплылі ўніз па плыні цераз цясніну ў гарах і ўжо ніколі болей не ўпрыгожвалі нашае цудоўнае рэчкі. Мелодыя калыханкі, што была прыгажэйшаю за Эолаву арфу і саладзейшаю за ўсё на свеце, акрамя голасу Элеаноры, пакрысе знікала, бо цурчанне рабілася ўсё цішэйшым, пакуль нарэшце рака цалкам не занурылася ў сваё першапачатковае ўрачыстае маўчанне. Велізарнае воблака ўзнялося ўгару і, пакідаючы вяршаліны гор у іх ранейшай панурасці, адляцела назад у краі Геспера, прыхапіўшы з сабою сваё залатаноснае і раскошнае хараство з Даліны Шматколерных Траваў.

Аднак Элеанора не забылася на свае абяцанні, бо я чуў звон анёльскіх кадзілаў, а хвалі незямнога водару праплывалі ўвесь час па-над далінаю; і ў гадзіны самоты, калі цяжка

білася маё сэрца, вецер, што абвяваў мой лоб, даносіў да мяне ціхія ўздыхі; і няпэўны шэпт нярэдка поўніў начное паветра. А аднаго разу — о, усяго аднойчы! — я прачнуўся ад глыбокага, быццам смерць, сну, адчуўшы на сваіх вуснах прывідны дотык.

Але ж пустэча ў маім сэрцы не запаўнялася. Я прагнуў кахання, якое датуль перапаўняла яго. Нарэшце даліна пачала мучыць мяне ўспамінамі пра Элеанору, і я пакінуў яе назаўжды дзеля бурлівых і ўвадначас марных уцехаў свету.

***

Я апынуўся ў незнаёмым горадзе, дзе ўсё навокал, здавалася, спрыяла таму, каб збавіць маю памяць ад тых салодкіх сноў, што так доўга сніліся мне ў Даліне Шматколерных Траваў. Пышнасць і раскоша велічнага двара, і шалёны лязгат зброі, і асляпляльнае хараство жанчынаў збянтэжылі і ап'янілі мой розум. Аднак, як і раней, душа мая заставалася вернаю дадзеным абяцанням, і ціхімі начамі Элеанора нагадвала мне пра сябе сваёю нябачнаю прысутнасцю. Аж раптам усё скончылася, і свет змарнеў у мяне ўваччу, і я спалохаўся жахлівых думак, што авалодалі мною, і страшэнных спакусаў, якія апанавалі мяне, бо з нейкага далёкага і невядомага краю прыбыла да вясёлага двара караля, якому я служыў, панна, краса якое адразу ж паланіла маё няверная сэрца. Без ваганняў кінуўся я да яе ног у самым палкім, самым пакорным любоўным пакланенні. Бо ці ж маглі мае пачуцці да юнае дзяўчыны зраўнацца з тою палымянасцю, з тым шалам, з тою нябеснаю асалодаю пакланення, з якімі я выліў у слязах усю сваю душу незямной Эрменгардзе? О, светлы серафім Эрменгарда! Гэты вобраз прагнаў з мае памяці згадкі пра іншую. О, боскі анёл Эрменгарда! Углядаючыся ў глыбіню яе незабыўных вачэй, я думаў толькі пра іх — і пра яе.

Я ажаніўся і не страшыўся праклёну, які наклікаў на сябе; і горыч ягоная не спасцігла мяне. Аднаго разу, усяго аднойчы, сярод начное цішы праз краты акна да мяне данесліся мяккія ўздыхі, даўно ўжо забытыя мною, і я пачуў такі знаёмы пяшчотны голас:

— Спі спакойна! Бо над усім пануе Дух Кахання, і, аддаўшы сваё сэрца той, каго завеш Эрменгардаю, ты вызваляеш сябе ад абяцанняў, што даваў Элеаноры. Чаму? Пра тое дазнаешся на нябёсах.

*Пераклала Вераніка Сідарэнка*

# Сэрца выкрывае

Праўда! Я быў і застаюся нервовы, вельмі, нават жахліва нервовы; але ж чаму вы кажаце, што я — вар'ят? Хвароба абвастрыла мае пачуцці — ані не паслабіла, не прытупіла іх. Найвастрэйшае з усіх было пачуццё слыху. Я чуў усё, што адбывалася як на небе, так і на зямлі. Я чуў ці не ўсё, што чынілася ў пекле. Дык няўжо ж я — вар'ят? Паслухайце й майце ўвагу, як разважліва я магу апавесці ўсю гісторыю.

Нельга сказаць, як упершыню гэтая ідэя прыйшла мне ў галаву, але, прычапіўшыся аднаго разу, яна не пакідала мяне ні ўдзень, ні ўночы. Тут не было ні намеру, ні абвостранае жарсці. Я любіў гэтага старога. Ён аніводнага разу не зрабіў мне нічога кепскага, не пакрыўдзіў мяне. Я не зважаў на ягонае золата. Здаецца, прычынаю ўсяго было ягонае вока, менавіта яно! Вока, бледнае й блакітнае, зацягненае плеўкаю, было падобнае да вока грыфа. Калі ж яно натыкалася на мяне, мая кроў халадзела; гэтак спакваля я надумаў забіць старога, каб назаўжды пазбавіцца гэтага вока.

Вось і ўся рахуба. Мяркуеце, я — вар'ят? Вар'яты нічога не цямяць. Каб жа вы бачылі мяне, бачылі, як адмыслова я ўсё рабіў — з якою перасцярогай, з якою прадбачлівасцю, з якім удаваннем распачаў я работу! Ніколі я не ставіўся да старога так добра, як за тыдзень перад забойствам. І штоночы, блізу дванаццатае, я падымаў клямку ягоных дзвярэй і прачыняў іх — ціха-ціха! А пасля, зрабіўшы дастатковую для свае галавы шчыліну, я скіроўваў туды добра зачынены, каб не блiснула святло, зацемнены ліхтар, а ўслед ужо засоўваў галаву. Вас ахапіў бы смех, калі б пабачылі, як умела я прасоўваў яе. Я сунуў яе паволі, зусім паволі, каб не патурбаваць старога ў сне. Цэлая гадзіна ішла на тое, каб памясціць маю галаву ў шчыліне так, што я мог бачыць старога на ложку. Га!.. Хіба ж мог вар'ят дзеяць так разважліва? А калі мая галава трапляла ў пакой, я з асцярожнасцю расчыняў ліхтар, надзвычай асцярожна (абы не рыпнулі петлі) расчыняў яго, каб просты ценькі праменьчык спадаў на хіжае вока. І гэта я рабіў сем

доўгіх начэй — акурат апоўначы, — але вока, здавалася мне, заўсёды было заплюшчанае, чаму й не выпадала здзейсніць задуму, бо ж дадзяваў мне не сам стары, але ягонае Паганае Вока. І штораніцы, калі бралася ўжо на дзень, я смела ішоў у спачывальню й гучна гаманіў з ім, па-прыяцельску называючы яго па імені й дазнаючыся, як прамінула ноч. Гэткім парадкам, бачыце, яму належала быць вельмі праніклівым чалавекам, каб запасочыць, што кожнае ночы, рыхтык а дванаццатай, я зазіраў да яго, пакуль ён спаў.

На восьмую ноч я быў асабліва пільны, прачыняючы дзверы. Хвілінная стрэлка гадзінніка рухалася нашмат хутчэй, чымсьці мая рука. Ніколі дасюль я не адчуваў настолькі свае патужнасці, свае празорлівасці. Я ледзьве стрымліваў пачуццё трыюмфу. Адно падумаць, што я прыходзіў, спакваля расчыняў дзверы, а стары нават у сне не бачыў маіх таемных учынкаў ды задумаў. Уявіўшы гэта, я ажно пырснуў смехам, а ён, магчыма, пачуў мяне, бо раптам заварушыўся, нібы злякаўся нечага. Цяпер, мабыць, падумаеце, што я адступіўся — але зусім не так. Апраметная цемра ахінала ягоны пакой (ён баяўся зладзеяў і шчыльна зачыняў аканіцы), таму я ведаў, што ён не ўгледзіць шчылінкі ў дзвярох, і патроху налягаў на іх.

Я прасунуў у спачывальню сваю галаву і важыўся ўжо адчыніць ліхтар, але калі мой вялікі палец праслізнуў па бляшанай засаўцы, стары ўскочыў у ложку, выгукнуўшы: «Хто тут?»

Я застаўся нерухомы й маўчаў. Цэлую гадзіну я не варушыўся, але не пачуў тым часам, як ён зноўку лёг. Ён усё яшчэ сядзеў на ложку, услухоўваўся, дакладна гэтаксама як я ноч у ноч прыслухоўваўся да магільнае цішыні пакоя.

Трохі пазней я пачуў стогн, я ведаў, што гэты стогн спароджаны бязлітасным страхам. Гэта не быў енк пакуты або скрухі — ох, не! — гэта быў ціхі прыдушаны енк, што падымаецца з глыбіні душы, прасякнутай жахам. Я добра ведаў той гук. Часта ўночы, акурат апоўначы, калі ўсё спіць, ён вырываўся з маіх грудзей, паглыбляючы сваім смяротным рэхам тыя страхі, што шкуматалі мяне. Я ўяўляў, што адчувае стары, і спачуваў яму, хаця й пасмейваўся ў душы. Я ведаў, што ён не спаў ужо пасля першага нязначнага шуму, які змусіў яго

заварушыцца ў пасцелі. Жахі ўсё мацней сціскалі яго ў сваіх абцугох. Ён стараўся думаць пра іх: «Гэта не што іншае, як вецер у коміне, гэта адно мыш праскочыла па падлозе», — або: «гэта проста цвыркун крыху пасакатаў». Ведама, ён сіліўся суцешыць сябе гэткімі дапушчэннямі, але ўсё дарма. Усё дарма, бо Смерць, набліжаючыся да яго, падбіралася чорным ценем і ахінала сваю ахвяру. І якраз немінучае ўздзеянне бесцялеснага ценю прычынілася да адчування ім (хоць ён не чуў і не бачыў), да адчування таго, што мая галава тут, у пакоі.

Доўга й цярпліва прачакаўшы, я так і не пачуў, ці лёг ён зноўку; тады й наважыўся прачыніць ліхтар — зрабіць ценькую-найценькую шчылінку. І я прачыніў яго — спакойна, настолькі спакойна, што ў гэта цяжка паверыць, — і нарэшце шпурнуўся з шчылінкі нязыркі, бы павучыная ніць, праменьчык і апынуўся на хіжым воку.

Яно было расплюшчанае, шырока-найшырока расплюшчанае, і я шалеў, пазіраючы на яго. Я надзвычай добра бачыў яго — невыразна блакітнае, зацягненае агіднай плеўкаю, якая ледзяніла мяне да глыбіні душы; але праз цемру я не мог пабачыць ні твару, ні цела старога, бо нясведама скіраваў прамень дакладна на тое клятае месца.

Хіба ж я не казаў вам, што прыманае за вар'яцтва ёсць проста празмернай праніклівасцю? Я пачуў увушшу ціхі, прыглушаны, прудкі зык, гэткі, што робіць гадзіннік, загорнуты ў вату. Безумоўна, я ведаў гэты гук — білася сэрца старога. Тахканне распаліла ўва мне лютасць — падобна да таго, як пошчак бубнаў абуджае жаўнераву адвагу.

Але я ўсё яшчэ стрымліваў сябе й не варушыўся. Я ледзьве дыхаў, трымаючы застыглы ў руцэ ліхтар, і сіліўся не зводзіць праменю з вока. Тым часам агіднае тахканне пачасцілася. Яно ўсё нарастала й нарастала, рабілася штосекунды прудчэйшае й гучнейшае. Страх старога, пэўне, стаў надзвычайны. Біццё гучнела, паслухайце, гучнела з кожным імгненнем! Ці зважаеце вы на гэта? Я казаў, што я нервовы, гэта сапраўды так. І тады, глыбокай ноччу, спасярод вусцішнае цішы старога дому, гэты дзіўны шум пазбавіў мяне змогі кантраляваць страх. І ўсё ж колькі хвілінаў я таймаваў сябе. Але біццё гучнела й

гучнела! Мне здавалася, што сэрца можа разарвацца. І цяпер новая трывога ахапіла мяне — гук маглі пачуць суседзі! Прабіў час старога! З пранізлівым крыкам я расчыніў ліхтар і ўскочыў у пакой! Стары выгукнуў адзін, толькі адзін раз. Вокамгненна я сцягнуў яго на падлогу й прыдушыў цяжкім ложкам. Пасля я весела смяяўся, уважаючы, што ўсё ўрэшце зроблена. Але доўгія хвіліны сэрца яшчэ глуха тахкала. Гэта, тым не менш, не турбавала мяне; біцця не пачулі б за сцяной. Нарэшце яно сціхла. Стары быў мёртвы. Я адсунуў ложак і агледзеў труп. У ім зусім не было жыцця. Я прыклаў руку да ягонага сэрца й трымаў яе так колькі хвілінаў. Кроў не пульсавала. Ён быў назаўжды пазбаўлены жыцця. Ягонае вока больш не патрывожыць мяне.

Калі вы ўсё яшчэ лічыце мяне вар'ятам, дык пераканаецеся ў сваёй памылцы, дазнаўшыся пра мудрыя перасцярогі, выкарыстаныя мною, каб схаваць цела. Ноч сыходзіла, і я хапатліва, але без шуму, працаваў. Перадусім я разабраў труп: адрэзаў галаву, рукі й ногі.

Пасля я выняў з падлогі тры маснічыны й паклаў парэшткі паміж брусоў. А тады ўставіў дошкі назад так разумна й вынаходліва, што ніякае чалавечае вока, нават ягонае вока, не выявіла б нечага падазронага. Не трэ было нічога вымываць — нідзе ніводнае плямкі, ніводнае кропелькі крыві. Я быў вельмі акуратны. Усё засталося ў місе!

Калі я скончыў работу, была чацвертая — цямнота стаяла, як апоўначы. Адразу па тым, як звон прабіў чацвертую, пачуўся стук у парадныя дзверы. Я спусціўся адчыніць з спакоем у душы — чаго мне цяпер было баяцца? Увайшлі тры мужчыны і з бездакорнай ветлівасцю адрэкамендаваліся афіцэрамі паліцыі. Крык уначы пачуў сусед; вынікла запасочанне, што здарылася злачынства; інфармацыю перадалі ў пастарунак, і іх (афіцэраў) паслалі абшукаць дом.

Я ўсміхнуўся — чаго мне было баяцца? Я павітаў іх. Сказаў, што сам выгукнуў у сне. Стары, дадаў я між іншым, паехаў на вёску. Я паказаў ім увесь дом. Я прасіў іх агледзець — агледзець як след. Я прывёў іх нарэшце ў ягоны пакой. Я паказаў ім усе ягоныя каштоўнасці, цэлыя й нечапаныя. У захапленні

ад свае ўпэўненасці я прынёс у пакой крэслы й папрасіў афіцэраў адпачыць, а сам з шалёнай смеласцю ад поўнага трыюмфу паставіў сваё крэсла якраз там, дзе спачываў труп ахвяры.

Афіцэры былі задаволеныя. Мае дзеянні пераканалі іх. Я паводзіў сябе зусім нязмушана. Яны сядзелі й гаманілі пра нешта звычайнае, і я таксама штосьці бадзёра казаў ім. Але неўзабаве я адчуў, што бляднею, і захацеў, каб яны як мага хутчэй пайшлі. У мяне балела галава і, здаецца, стаяў звон увушшу; а яны ўсё сядзелі й гаманілі. Звон зрабіўся выразнейшы; ён не знікаў, не, ён большаў. Я пачаў гаварыць развязней, каб пазбыцца хвалявання, але ён не сціх, а праявіўся яшчэ болей — і нарэшце я зразумеў, што шум быў не ў маіх вушох.

Няма сумневу, цяпер я надта спалатнеў, але гаварыў безупынку й павысіў голас. Аднак гук нарастаў — што я мог зрабіць? Гэта быў ціхі, прыглушаны, прудкі зык, вельмі падобны да зыку, што робіць гадзіннік, загорнуты ў вату. Я цяжка дыхаў, але афіцэры яшчэ нічога не чулі. Я гаварыў больш нарыста й заўзята, але шум няўхільна нарастаў. Я падняўся і ўсчаў нейкую пустую спрэчку, голасна вёрз лухту й раз'юшана махаў рукамі; але шум няўхільна нарастаў. Чаму б ім не пайсці? Я хадзіў тупаючы, узад і ўперад, нібы раззлаваны іх заўвагамі, але шум няўхільна нарастаў. О, Божа! Што я мог зрабіць? Я шалеў — я халераваў — я лаяўся! Я круціў крэсла, на якім перад тым сядзеў, і соўгаў яго па дошках, але шум перабіваў усё і нарастаў няспынна. Ён гучнеў — гучнеў — гучнеў! А тыя людзі па-ранейшаму з прыемнасцю гаманілі і ўсміхаліся. Ці маглі яны не чуць? Божа ўсёмагутны!.. Не, не! Яны чулі!.. яны падазравалі!.. яны ведалі!.. яны смяяліся з майго страху!.. — так я думаў і так я думаю дасюль. Не магло быць нічога горшага за гэтую пакуту! Больш я не мог трываць іх крывадушных усмешак! Я адчуваў, што мушу або закрычаць, або памерці! Во цяпер зноўку!.. Гучней! Гучней! Гучней! Гучней!..

— Паганцы! — залямантаваў я. — Годзе ўдаваць! Я прызнаюся! Адарвіце маснічыны! Тут, вось тут!.. Гэта б'ецца яго агіднае сэрца!

*Пераклаў Юрась Бушлякоў*



*Тут, вось тут!.. Гэта б'ецца яго агіднае сэрца!*

# Д'ябал пярэчання

Падчас вызначэння здольнасцяў і пабуджэнняў, *prima mobila*[1] чалавечай душы, фрэнолагі* абмінулі схільнасць, якая, без сумневаў, заўсёды была адным з асноўных, першапачатковых і неад'емных пачуццяў, але тым не менш заставалася па-за ўвагай ранейшых маралістаў. Мы прагледзелі яе праз звычайную пыхлівасць розуму. Мы дазволілі ёй існаваць па-за межамі нашага асэнсавання выключна праз недахоп веры — ці то ў Апакаліпсіс, ці то ў Кабалу. Само ўяўленне пра яе ніколі не прыходзіла нам у галаву проста таму, што ў гэтым не было патрэбы. Мы не бачылі ніякай неабходнасці ў такім пабуджэнні, у такой схільнасці. Мы не ўсведамляем яе важнасці. Мы не разумеем, дый не здолелі б зразумець, калі б уяўленне пра гэтую *primum mobile* само прыйшло да нас; мы б не здолелі зразумець, якім чынам яна можа паслужыць мэтам чалавецтва, часовым ці вечным. Немагчыма адмаўляць таго факту, што фрэналогія, ды ў вялікай ступені і метафізіка, былі зляпаныя *a priori*[2]. Выдумляць схемы, дыктаваць Богу яго мэты пачаў не чалавек, што назірае і ўспрымае, а чалавек інтэлекту ды логікі. Даследаваўшы такім чынам глыбіні намераў Еговы, ён, задаволены сабою, пабудаваў на іх аснове незлічоную колькасць сістэмаў мыслення. Напрыклад, у дачыненні да фрэналогіі мы спачатку самым натуральным чынам вызначылі, што ў адпаведнасці з боскай задумай чалавек павінен есці. Тады мы прызначылі чалавеку орган харчавання, кару боскую, якая вымушае нас есці, хочам мы гэтага ці не. Затым, вызначыўшы, што па волі Бога чалавек павінен працягваць свой род, мы тут жа адкрылі орган юрлівасці. Гэтаксама адбылося і з ваяўнічасцю, уяўленнем, прычыннасцю, творчасцю — карацей кажучы, з кожным органам, які служыць нейкай схільнасці, маральнаму пачуццю ці здольнасці чыста інтэлектуальнага характару. Пры такім размеркаванні

---

[1] Першарухальнік (лац.).

[2] Раней за досвед і па-за ім (лац.).

*principia*[1] чалавечай актыўнасці паслядоўнікі Шпурцгайма* ўсяго толькі ішлі — правільна ці не, часткова ці ў цэлым — па слядох сваіх папярэднікаў, і ўсё ў іх вызначалася ды вынікала з перадвызначанасці чалавечага лёсу і задумаў Творцы.

Было б разумней, было б бяспечней, калі б нашая класіфікацыя (калі мы ўжо мусім класіфікаваць) зыходзіла з таго, што чалавек робіць звычайна ці час ад часу, чым з таго, што, паводле нашых уяўленняў, загадала яму рабіць боская воля. Калі мы не можам ахапіць розумам Бога ў яго бачных дзеяннях, то як можам мы спасцігнуць Ягоныя неспасцігальныя задумы, якія ўвасабляюцца ў гэтых дзеяннях? Калі мы не можам спасцігнуць Бога ў выніках працы рук яго, то як мы спасцігнем таямніцы Ягонае волі і фазы тварэння?

Індукцыя, *a posteriori*[2], прымусіла б фрэналогію прызнаць прыроджаным і першапачатковым стымулам чалавечай дзейнасці парадаксальнае нешта, якое можна было б назваць, не маючы больш удалага тэрміну, духам пярэчання. Я вызначаю яго як *mobile*[3] без матывацыі, як матыў не *motivirt*[4]. Праз яго падбухторванне мы пачынаем кіравацца неспасцігальнымі мэтамі, ці, калі гэта падаецца супярэчнасцю ў тэрмінах, мы можам перафармуляваць выказванне і сказаць, што праз яго падбухторванне мы робім штосьці менавіта таму, што рабіць гэтага катэгарычна нельга. Тэарэтычна няма для ўчынку падставы больш беспадстаўнай, але фактычна няма падставы мацнейшай. Для адпаведнага складу розуму ды пры адпаведных умовах дух пярэчання робіцца абсалютна неадольным. Гэтаксама, як у тым, што я дыхаю, я ўпэўнены, што ўсведамленне памылковасці і няправільнасці ўчынку часта бывае непераможнай сілай; яна — і толькі яна — змушае нас да гэтага ўчынку. Усёпаглынальная прага ўчыняць шкоду выключна дзеля шкоды не паддаецца ні аналізу, ні прэпараванню. Гэта асноўны, першапачатковы, прыроджаны імпульс. Упэўнены, мне за-

[1] Першапрычынаў (лац.).
[2] Пасля, на падставе досведу (лац.).
[3] Пабуджэнне (фр.).
[4] Матываваны (скаж. ням.).

пярэчаць, што калі мы ўпарта робім нешта толькі таму, што ведаем: рабіць гэтага нельга, — то такія паводзіны ёсць не больш чым разнавіднасцю таго, што фрэналогія акрэслівае як ваяўнічасць. Але самы першы погляд абвергне гэтае меркаванне. Фрэналагічная ваяўнічасць грунтуецца на неабходнасці самаабароны. Яна ахоўвае нас ад цялесных пашкоджанняў. Яе сутнасць — забяспечанне нашага дабрабыту, і таму ваяўнічасць павялічваецца адначасова з яго ростам. З гэтага вынікае, што імкненне да дабрабыту павіннае ўзрастаць адначасова з любой разнавіднасцю ваяўнічасці, але ў выпадку таго, што я называю духам пярэчання, не толькі не ўзнікае імкнення да дабрабыту, але намі кіруе пачуццё цалкам супрацьлеглае.

Зварот да ўласнага сэрца выявіцца ўрэшце найлепшым адказам на выказаную вышэй сафістыку. Кожны, хто шчыра і ўважліва зазірне ў сваю душу, упэўніцца, што гэтая схільнасць сапраўды найасноўнейшая. Яна настолькі ж відавочная, наколькі неспасцігальная. Няма на свеце чалавека, які хоць раз не пакутаваў бы, напрыклад, ад неадольнага жадання закатаваць слухача сваёй шматслоўнасцю. Моўца ведае, што ён невыносны, адзінае яго жаданне — дагадзіць. Звычайна ён гаворыць каротка, дакладна і ясна, на языку ў яго толькі самыя лаканічныя і зразумелыя фразы, і толькі з вялізнымі высілкамі ён іх не вымаўляе. Ён баіцца гневу суразмоўцы, і ўсё ж яго б'е маланкаю думка, што пастаянныя адступленні і мудрагелістасць ягоных прамоваў гэты гнеў дакладна выклічуць. Адной гэтай думкі дастаткова. Імпульс перарастае ў жаданне, жаданне — у памкненне, памкненне — у нястрымную прагу, і прага гэтая (на вялікі жаль і засмучэнне моўцы і насуперак здароваму сэнсу) наталяецца.

Перад намі стаіць задача, якая патрабуе неадкладнага развязання. Мы ведаем, любая затрымка ўсё зруйнуе. У жыцці наступае пераломны момант, труба кліча дзейнічаць зараз жа. Мы палаем рашучасцю, мы паміраем ад жадання схапіцца за працу — і прадчуванне слаўных вынікаў узбуджае нашую душу. Яе варта, яе неабходна зрабіць сёння, і ўсё ж мы адкладаем яе на заўтра, але чаму? Адказу няма, апроч таго, што мы

адчуваем жаданне зрабіць наадварот, самі не ведаючы чаму. Надыходзіць заўтра, і прага дзейнасці ўзмацняецца, але разам з ёй — і гэтае безназоўнае, проста-такі жудаснае, бо невытлумачальнае, жаданне марудзіць. І з кожным імгненнем яно толькі ўзрастае. Сплываюць апошнія гадзіны. Мы скаланаемся ад жорсткай барацьбы ўнутры нас, ад змагання рацыянальнага з ірацыянальным, матэрыі з ценем. Але калі барацьба заходзіць так далёка, то цень бярэ верх — мы змагаемся дарэмна. Гадзіннік б'е, адпяваючы наш дабрабыт. У той жа час гэта крык пеўня для прывіда, што валодаў намі. Ён адлятае, знікае — мы вольныя. Запал вяртаецца. *Цяпер* мы гатовыя працаваць. На жаль, запозна!

Мы стаім на краі бездані. Мы заглядаем у яе, ніякавеем, нам робіцца млосна. Нашае першае памкненне — збегчы ад небяспекі. Але невядома чаму мы застаемся. Паступова жах, моташнасць і млосць згушчаюцца ў воблака безназоўнага пачуцця. Паціху, яшчэ менш заўважна, гэтае воблака набывае пэўныя абрысы, як той дым з бутэлькі, што ператвараецца ў джына з «Тысячы і адной ночы». Але з нашага воблака на краі бездані матэрыялізуецца нешта нашмат больш жахлівае за любога казачнага джына ці дэмана. І тым не менш гэта толькі думка, хоць і вусцішная, якая працінае да самых костак, захапляючы сваёй жудасцю. Гэта толькі прадчуванне тых пачуццяў, што ахапілі б нас падчас падзення ў бездань з такой вышыні. І гэтае падзенне, гэтая вокамгненная пагібель, менавіта таму, што побач лунае найстрашнейшы і найагіднейшы з усіх найстрашнейшых і найагіднейшых вобразаў смерці і пакуты, якія калі-небудзь нараджала нашая фантазія, — менавіта таму яны такія жаданыя нам. І толькі таму, што наш розум з усяе моцы імкнецца ўтрымаць нас на краі бездані, мы з усё большым імпэтам ірвемся да яе. Няма ў прыродзе жарсці больш дэманічна прыцягальнай, чым тая, што валодае чалавекам, які ў трымценні стаіць над безданню і ўяўляе скачок. Паспрабаваць думаць у такі момант — значыць непазбежна загінуць, бо роздум змушае нас адысці, і менавіта таму мы гэтага зрабіць не можам. Калі побач не будзе сяброўскае рукі, каб затрымаць нас, ці калі ў апошні мо-

мант на самым краі бездані нам не ўдасца раптоўна кінуцца прэч, мы скокнем, мы загінем.

Аналізуючы гэтыя і падобныя дзеянні, мы разумеем, што ўсе яны народжаныя выключна духам пярэчання. Мы ажыццяўляем іх толькі таму, што разумеем, што гэтага рабіць не трэба. Гэтае імкненне не грунтуецца ні на якім уцямным прынцыпе, і мы насамрэч маглі б палічыць яго падгаворам ворага роду чалавечага, калі б часам яно не служыла дабру.

Я расказаў усё гэта, каб хоць у нейкай ступені адказаць на вашае пытанне і растлумачыць, чаму я тут, каб прадставіць вам хоць нейкае падабенства прычыны таго, што я закаваны ў кайданы і сяджу ў камеры смяротнікаў. Калі б я не быў такім шматслоўным, вы б альбо зусім мяне не зразумелі, альбо разам з натоўпам залічылі мяне да вар'ятаў. А так вы з лёгкасцю ўбачыце, што я — адна са шматлікіх ахвяраў Д'ябла Пярэчання.

Ніякі ўчынак ніколі не прадумваўся больш старанна. Тыднямі, месяцамі я шукаў спосаб забойства. Я адрынуў тысячы планаў, бо іх ажыццяўленне пакідала мажлівасць выпадковага раскрыцця. Урэшце ў нейкіх французскіх мемуарах я знайшоў апісанне хваробы, якая ледзь не прывяла да смерці мадам Піло, атручанай з дапамогай свечкі. Гэтая ідэя адразу завалодала маім уяўленнем. Я ведаў пра звычку маёй ахвяры чытаць на сон. Я таксама ведаў, што ягоная спальня цесная і кепска праветрываецца. Але не бачу сэнсу назаляць вам лішнімі падрабязнасцямі. Няма патрэбы апісваць тыя немудрагелістыя дзеянні, дзякуючы якім я замяніў васковую свечку ў ягоным кандэлябры на іншую, зробленую мною. На наступную раніцу яго знайшлі ў ложку мёртвым, і заключэнне каранёра гаварыла: «Смерць ад рукі Божай».

Атрымаўшы ягоную спадчыну, я гадамі жыў цалкам някепска. Думка пра выкрыццё ніколі не прыходзіла мне ў галаву. Я старанна знішчыў атручаную свечку. Я не пакінуў ні ценю ўлікі, з дапамогай якой мяне можна было б асудзіць ці хаця б запасочыць у злачынстве. Немагчыма перадаць, як я быў задаволены сабою, калі думаў пра сваю поўную бяспеку. Доўгі час я адчуваў незвычайную асалоду, якая прыносіла мне

больш задавальнення, чым усе матэрыяльныя даброты, якія даў мне мой грэх. Але нарэшце надышоў час, калі гэтае прыемнае пачуццё паступова і ледзь заўважна перарасло ў неадчэпную і гнятлівую думку. Менавіта яе неадчэпнасць і прыгнятала. Я ледзьве мог адагнаць яе на імгненне. Гэтаксама нас, бывае, раздражняе надакучлівы матыў нейкай пошлай песенькі ці пасрэдны ўрывак з оперы, што гучыць увушшу ці, хутчэй, у памяці. І пакуты не зменшацца, калі песня будзе добрая, а опера — вартая ўхвалы. Так і я ўрэшце пачаў лавіць сябе на тым, што ўвесь час думаю пра ўласную бяспеку і ціха сам сабе мармычу: «Мне не пагражае».

Аднаго дня, шпацыруючы па вуліцы, я заўважыў, што мармычу гэтыя звыклыя словы напаўголасу. У свавольным парыве я перайначыў іх такім чынам: «Мне нішто не пагражае, мне не пагражае... калі толькі я сам здуру не прызнаюся!»

Не паспеў я вымавіць гэтыя словы, як сэрца сціснула холадам. Са мной і раней здараліся такія прыпадкі пярэчання, прыроду якіх мне было складана растлумачыць, і я выразна ўспомніў, што ні разу не здолеў іх змагчы. Вось і цяпер тое, што я напалову ўнушыў сабе, нібыта магу быць такім вар'ятам, што прызнаюся ў забойстве, узнікла перада мною, як прывід мае ахвяры, і павабіла да смерці.

Спачатку я паспрабаваў пазбавіцца гэтага кашмару. Я паскорыў крок — хутчэй, яшчэ хутчэй, — потым пабег. Я адчуваў вар'яцкае жаданне закрычаць. Кожная наступная хваля думак залівала мяне новым жахам, бо — о гора! — я добра, занадта добра разумеў, што ў маім выпадку падумаць — значыць загінуць. Я яшчэ дадаў кроку. Я імчаўся, як вар'ят, праз людныя вуліцы. Урэшце мінакі ўстрывожыліся і пачалі мяне праследаваць. Тут я адчуў, што мой лёс вырашаны. Я вырваў бы сабе язык, калі б мог, але грубы голас прагучаў увушшу, чыясьці рука яшчэ больш груба схапіла мяне за плячо. Я павярнуўся, задыхаючыся. На момант я адчуў усе пакуты ўдушша, я аслеп, аглух, галава пайшла кругам, і тут мне падалося, што нейкі нябачны д'ябал штурхануў мяне ў спіну шырокай даланёй. Доўга хаваная таямніца вырвалася з мае душы.

Кажуць, што я гаварыў вельмі выразна, хаця і празмерна падкрэсліваючы кожнае слова і страшэнна спяшаючыся, нібыта хваляваўся, што мяне перапыняць да заканчэння кароткіх, але важкіх фразаў, што аддалі мяне кату і пеклу.

Расказаўшы ўсё неабходнае для незваротнага юрыдычнага абвінавачання, я страціў прытомнасць.

Што мне яшчэ казаць? Сёння я закаваны ў кайданы — і *тут*! Заўтра я буду вольны ад путаў! Але *дзе*?

*Пераклала Наталля Клабанава*

# Чорны кот

Я не настойваю, каб нехта паверыў найдзічэйшай і разам з тым найзвычайнейшай гісторыі, якую важуся тут апісаць; я й не спадзяюся на гэта. Трэ быць вар'ятам, каб мець якую надзею ў сітуацыі, калі я сам не прымаю сваіх сведчанняў. Аднак я не вар'ят, і ўсё гэта, відочна, — не сон. Але заўтра я памру, а сёння павінен скінуць з душы цяжар. Мой адзіны намер — шчыра, сцісла, не мудруючы расказаць людзям пра шэраг чыста сямейных здарэнняў. Гэтыя здарэнні спарадзілі ўва мне жах, змучылі, загубілі мяне. І ўсё ж я не буду шукаць ім разгадкі. Мне яны прынеслі-такі страху — шмат жа хто палічыць іх хутчэй вычварнымі, чым жахлівымі. Пасля, магчыма, які разумны чалавек знойдзе ўсяму простае тлумачэнне — такі чалавек, з розумам больш спакойным, больш лагічным і не такім уражлівым, як мой, не ўгледзіць у акалічнасцях, аб якіх я апавядаю з пакораю і трымценнем, нічога, апрача звычайнае паслядоўнасці цалкам натуральных прычынаў і вынікаў.

З дзяцінства я выдзяляўся слухмянасцю й лагоднай натураю. Відочная мяккасць мае душы выклікала нават насмешкі таварышаў. Я вельмі любіў усякую жыўнасць, і бацькі не перашкаджалі мне: дома было шмат свойскіх жывёлін. З імі я бавіў вольны час і быў надзвычай шчаслівы, кормячы й даглядаючы іх. Я сталеў, і расла гэтая асаблівасць характару; для мяне, ужо дарослага, памянёны занятак быў ці не найлепшай уцехаю. Тым, хто аддаваў любоў вернаму й разумнаму сабаку, няма патрэбы тлумачыць, якой вялікай удзячнасцю сабака плаціць за гэта. У бескарыслівай і самаахвярнай любові звера ёсць нешта, здольнае дайсці да сэрца кожнага, хто пераконваўся ў нікчэмным сяброўстве й падманнай адданасці звычайнага чалавека.

Я рана ажаніўся і, на шчасце, адкрыў у сваёй жонцы блізкія мне схільнасці. Заўважаючы маю сімпатыю да жыўнасці, яна скарыстоўвала кожную магчымасць пацешыць мяне. У нас жылі птушкі, залатыя рыбкі, заводны сабака, трусы, маленькая малпа й кот.

Кот быў надзвычай вялікі й прыгожы, чыста чорны ды надзіва верны. Кажучы пра яго кемнасць, мая жонка, поўная ў душы прымхаў, часта намякала на даўнюю народную прыкмету, згодна з якою ўсе чорныя каты лічыліся пярэваратнямі. Але ніколі яна не намякала сур'ёзна — і я падаю гэтую драбніцу адно таму, што якраз цяпер належыць яе прыпомніць.

Плутон — так звалі ката — быў маім улюбёнцам, і я часцяком забаўляўся з ім. Я заўсёды сам карміў яго, і ён спадарожыў мне ўсюды ў доме, куды б я ні ішоў. Было нават цяжка забараніць яму хадзіць за мною па вуліцах.

Нашае сяброўства доўжылася такім парадкам некалькі гадоў, і за гэты час мае натура й характар — пад уплывам д'ябальскае цягі да алкаголю — зазналі (я чырванею, прызнаючыся ў гэтым) рэзкую змену на горшае. Што ні дзень я рабіўся больш пануры, больш раздражлівы й менш уважны да пачуццяў іншых людзей. Я стаў нястрыманы ва ўзаемінах з жонкаю. Урэшце я нават падняў на яе руку. Мае гадаванцы, натуральна, таксама адчулі гэтую змену ў характары гаспадара. Я не толькі не зважаў на іх, але й блага абыходзіўся з імі. Аднак да Плутона я захаваў яшчэ належную пашану і стрымліваў сябе ад кепскага абыходжання з ім, чаго нельга сказаць пра трусоў, малпачку ці нават сабаку, якіх я без усякага сораму крыўдзіў, калі яны лашчыліся да мяне або выпадкова трапля́лі пад руку. Але хвароба нарастала ўва мне — што можа быць горшага за цягу да алкаголю! — і нарэшце нават Плутон пачаў спазнаваць сілу мае хворае натуры.

Аднае ночы, калі на добрым падпітку я вярнуўся з карчмы, уроілася мне ў галаву, быццам кот пазбягае мяне. Я схапіў яго; у спалоху ад мае грубасці ён нямоцна, але ўсё-такі да крыві ўкусіў мне руку. Лютасць дэмана зараз жа агарнула мяне. Я больш не валодаў сабою. Здавалася, мая душа ў адзін момант пакінула цела, і распаленая джынам злосць, люцейшая за д'ябальскую, працяла мяне навылёт. Я выхапіў з кішэні камізэлькі складанчык, расчыніў яго, сціснуў беднаму зверу горла і без спеху выразаў адно ягонае вока! Я чырванею, я палаю, я дрыжу, апісваючы гэтую жудасную жорсткасць.

Калі нараніцы розум вярнуўся да мяне — калі я праспаўся пасля начное папіўкі, — ліхадзейства, учыненае ўночы, выклікала ў мяне адначасова каянне й страх; але гэта было толькі слабое, малавыразнае адчуванне, якое не ўзрушыла мае душы. Я зноў забыўся на меру і неўзабаве патапіў у віне ўсю памяць пра ўчынак.

Тым часам кот пакрысе ачуняў. Праўда, пустая вачніца мела страшэнны выгляд, але боль, відаць, сцішыўся. Кот паранейшаму пахаджаў па доме, аднак, чаго й можна было чакаць, уцякаў у неймаверным страху пры маім набліжэнні. Сэрца ў мяне не зусім яшчэ скамянела, і я спачатку вельмі засмуціўся ад відочнае непрыязнасці істоты, якая некалі так любіла мяне. Але хутка гэтае пачуццё змянілася на раздражненне. І тады, нібы для мае канчальнае й незваротнае загубы, ачнуўся ўва мне дух Пярэчання. Філасофія не бярэ яго пад увагу. Але я глыбока ўпэўнены, што пярэчанне належыць да найпрасцейшых сілаў падахвочвання ў чалавечым сэрцы — да неадымных першатворных здольнасцяў ці адчуванняў, якія вызначаюць прыроду чалавека. Хто сотню разоў не адчуваў, што робіць подлы або дурны ўчынак з тае толькі прычыны, што гэтага нельга рабіць? Ці ж мы, насуперак здароваму сэнсу, не зазнаем вечнае спакусы парушыць Закон выключна таму, што гэта забаронена? Вось жа, згаданы дух пярэчання й прывёў да мае канчальнае загубы. Гэтае невытлумачальнае імкненне душы мардаваць сябе — гвалціць сваю натуру, чыніць зло дзеля зла — і падахвоціла мяне працягваць і давесці да канца здзек з нявіннага звера. Аднаго ранку, не трацячы ўпэўненасці ў руках, я накінуў кату на шыю пятлю і павесіў яго на суку, — павесіў з слязьмі ўваччу ды з найгарчэйшым шкадаваннем у сэрцы, — павесіў, бо ведаў, што ён любіў мяне і не даў мне ніякае падставы для крыўды, — павесіў, бо разумеў, што, робячы гэта, я ўчыняю грэх — смяротны грэх, які падводзіць маю неўміручую душу пад небяспеку стаць — каб гэта было магчыма — непрыступнаю нават для бязмежнае ласкі Найміласэрнейшага й Найжахлівейшага Госпада.

У ноч пасля гэтага бязлітаснага злачынства мяне абудзілі крыкі: «Пажар!» Полымя ахапіла фіранкі пры маім ложку.

Увесь дом палаў. Мая жонка, слуга ды я сам ледзьве вырваліся з пажару. Знішчана было ўсё. Агонь цалкам паглынуў маёмасць, і з таго часу безвыходнасць запанавала ў маім жыцці.

Я перасільваю імкненне ўстанавіць прычыну й вынік, угледзець залежнасць няшчасця ад мае жорсткасці. Тут адно падрабязны ланцуг падзеяў — не магу не ўзяць пад увагу кожнае, хоць бы й сумнеўнае, звяно. Назаўтра пасля пажару я пабываў на пагарэлішчы. Сцены, апрача аднае, заваліліся. Ацалела толькі даволі ценькая пярэгарадка пасярэдзіне дому, пры якой знаходзілася ўзгалоўе майго ложка. Тынк тут збольшага не паддаўся агню — на маё разуменне, гэта было звязана з нядаўнім тынкаваннем сцяны. Каля яе шчыльнай грамадою сабраліся людзі — пільна й прагна яны ўглядаліся ў нейкае месца на сцяне. Словы «дзіўна!», «незвычайна!» ды іншыя такога кшталту выгукі ўзбудзілі маю цікаўнасць. Я наблізіўся і ўбачыў на белай паверхні штосьці падобнае да барэльефа гіганцкага ката. Дакладнасць выявы сапраўды здавалася незразумелаю. На шыі ў ката была вяроўка.

Спярша гэты прывід — бо я ўжо не магу назваць яго іначай — нагнаў на мяне подзіву й страху. Але ўрэшце роздум дапамог мне. Я прыгадаў, што павесіў ката блізка дому. Падчас пярэпалаху, выкліканага пажарам, людзі на вокамгненні запоўнілі сад — нехта зрэзаў ката з дрэва і кінуў яго праз расчыненае акно ў маю спачывальню. Пэўне, зрабіў так, каб пабудзіць мяне. Абрынуўшыся, сцены прыціснулі ахвяру мае лютасці да свежага тынку, вапна якога з дапамогаю полымя й выпарэнняў трупа канчальна дарабіла выяву, бачаную мною.

Хаця я так лёгка супакоіў калі ўжо не сваё сумленне, то прынамсі розум, патлумачыўшы вышэйапісаную праяву, яна, тым не менш, пакінула ўва мне глыбокі след. Доўгія месяцы я не мог пазбыцца прывіду ката; і ў той час вярнулася ў маю душу цьмянае пачуццё, якое здавалася, але толькі здавалася, каяннем. Я пачаў нават шкадаваць аб страце і шукаў у брудных корчмах, дзе лічыўся заўсёднікам, другога ката такога ж заводу ды падобнага выгляду, які б замяніў мне былога майго ўлюбёнца.

Аднае ночы, калі ў паўзабыцці я сядзеў у нейкім найбрыдчэйшым месцы, маю ўвагу забрала нешта чорнае на веку ад-

нае з вялізных бочак з джынам або ромам, што складалі ці не ўвесь абсталюнак пакоя. Колькі хвілінаў я не зводзіў вачэй з бочкавага века, не цямячы, чаму дасюль нічога на ім не заўважаў. Я падышоў і дакрануўся да чорнага рукою. Гэта быў чорны кот, вельмі вялікі, як Плутон, падобны да яго, быццам кроплі зняў, з адным усяго адрозненнем. Плутон зусім не меў белае поўсці, на грудзёх жа ў гэтага ката была відаць расплывістая белая пляма.

Па маім дотыку ён адразу падняўся, голасна мурхнуў і пацёрся аб маю руку, усцешаны ўвагаю да сябе. Якраз такога ката я шукаў. Я зараз жа захацеў купіць яго; але гаспадар карчмы не патрабаваў грошай — ён нічога не ведаў пра ката, ніколі раней не бачыў яго.

Я не пакідаў гладзіць ката, а калі быў сабраўся дадому, ён яўна паказаў, што хоча ісці са мною. Я дазволіў яму; дарогаю я часам спыняўся й пагладжваў яго. Дома кот хутка асвойтаўся і ў адзін момант стаў улюбёнцам мае жонкі.

Аднак я неўзабаве адчуў да яго непрыязнасць — яна нарастала ўва мне. Гэтага я зусім не чакаў; але — не ведаю, як і чаму тое сталася, — ягоная відочная любоў дадзявала мне і выклікала ў мяне раздражненне. Спакваля гэтыя адчуванні перараслі ў лютую нянавісць. Я ўнікаў ката; адно невыразнае пачуццё сораму і памяць пра бязлітаснае злачынства стрымлівалі мяне ад здзекаў з жывой істоты. За некалькі тыдняў я ніводнага разу не выцяў яго дый увогуле не зачапіў; але паволі — вельмі паволі — мяне агарнула невымоўная агіда, і я моўчкі ўцякаў ад брыдкае істоты, нібы ад пошасці.

Нянавісці да ката паддало мне, несумненна, і тое, што ён, як і Плутон, быў пазбаўлены аднаго вока — гэта адкрылася раніцаю, пасля таго як я прывёў жывёліну дадому. Аднак у мае жонкі гэтае падабенства спарадзіла яшчэ большую прывязанасць да ката, яна ж бо, як я ўжо казаў, цалкам захавала ў сваёй душы тую людскасць, якая некалі была ўласцівая мне і служыла крыніцаю шматлікіх маіх найпрасцейшых і найчысцейшых радасцяў.

Здавалася, што адначасна з нарастаннем мае незычлівасці да ката большала ягоная да мяне прыхільнасць. Ён хадзіў за

мною па пятах з упартасцю, якую цяжка апісаць. Не паспяваў я сесці, як ён забіраўся пад маё крэсла або ўскокваў да мяне на калені, назаляючы сваімі абрыдлымі ласкамі. Калі я падымаўся, каб пайсці, ён блытаўся пад нагамі і ледзьве не збіваў мяне або, усадзіўшы свае доўгія й вострыя кіпці ў маё адзенне, караскаўся мне на грудзі. У такія хвіліны я нясцерпна хацеў забіць яго на месцы, але яшчэ стрымліваў сябе — часткова таму, што памятаў пра сваё ранейшае злачынства, але найперш — не буду ўтойваць — ад вялізнага страху перад зверам.

Гэта яўна не быў страх перад канкрэтным няшчасцем — але я не здатны акрэсліць свайго адчування якім іншым словам. Мне сорамна прызнацца — так, нават тут, у цэлі для крымінальных злачынцаў, — мне сорамна прызнацца, што жах і страх, якія кот нагнаў на мяне, узмацніліся пад уздзеяннем аднае зусім неймавернае выявы. Жонка ці раз звяртала маю ўвагу на лапіну белага валосся (пра яе я ўжо згадваў) — адзіную відочную рысу, што адрознівала гэтую дзіўную жывёліну ад той, якую я забіў. Чытач, пэўне, памятае, што тая немалая лапіна першапачатна была расплывістая; але спакваля — амаль непрыкметна, ажно мой розум доўгі час намагаўся адкінуць гэта, быццам недарэчную ўяву, — метка набыла абсалютна выразныя абрысы. Яна мела выгляд прадмета, які я жахаюся называць — і перадусім праз гэта я гідзіўся, і баяўся, і вызваліў бы сябе, калі б адважыўся, ад пачвары, — цяпер, толькі паслухайце, метка мела выгляд нечага страшнага й злавеснага — Шыбеніцы! — змрочнае ды вусцішнае прылады Жаху й Злачынства — Пакуты й Загубы!

Цяпер я быў сапраўды найняшчаснейшы з людзей на зямлі. Нікчэмнае стварэнне, субрата якога я з пагардаю знішчыў, — гэтае нікчэмнае стварэнне несла мне — мне, чалавеку, створанаму на вобраз і падабенства Усявышняга, — гэтулькі нясцерпных бедаў! На жаль, ні ўдзень і ні ўночы я ўжо не зведаў болей раскошы спачынку! Цэлы дзень звер ні на міг не пакідаў мяне, а понач я штогадзіны прачынаўся ад невымоўна страшных сноў і адчуваў на сваім твары гарачае дыханне істоты й яе нязносны цяжар — уцелаўлёную здань, якой я не меў сілы скінуць, — цяжар, што назаўсёды наваліўся на маё сэрца!

Ціск такіх мучэнняў пазбавіў мяне мізэрнае рэшты добрых пачуццяў. Адно злыя думкі спадарожылі мне — найзмрачнейшыя й найзлейшыя з магчымых. Мая звычайная панурасць перарасла ў нянавісць да ўсіх рэчаў і ўсяго людства. Але больш за іншых цярпела ад раптоўных, частых і неўтаймоўных выбухаў лютасці, у якую я безразважна ўпадаў, мая пакорлівая жонка.

Аднаго дня пры нейкай дамовай патрэбе мы пайшлі з ёю ў сутарэнне старога будынка, дзе беднасць змусіла нас пасяліцца. Кот лез мне пад ногі на стромкіх сходах — я спатыкнуўся, ледзь не скруціў сабе галавы і дайшоў да шаленства. Падняўшы сякеру і забыўшыся ў гневе на дзяціны страх, што дасюль стрымліваў маю руку, я мерыўся быў так выцяць ката, што зараз жа адабраў бы ягонае жыццё. Але жонка супыніла мяне. Даведзены перашкодаю да лютасці, мацнейшае за д'ябальскую, я адхапіў руку і запусціў сякеру ў яе галаву. Яна сканала на месцы без стогну.

Учыніўшы гэтае страшэннае забойства, я адразу ж паглыбіўся ў думкі, як схаваць цела. Я разумеў, што не маю магчымасці вынесці яго з дому ні ў светлую пару дня, ні ў цёмную без рызыкі трапіць на вочы суседзям. Мноства ідэяў прыходзіла ў галаву. Спачатку я быў намысліў разабраць труп на дробныя кавалкі, а тады знішчыць у агні. Затым сабраўся выкапаць для яго магілу ў сутарэнні. Пасля я думаў, што лепей, пэўне, выкінуць яго ў студню на двары — або ўкласці, быццам які тавар, у скрыню, згадзіць нашэнніка і загадаць, каб ён забраў яе з дому. Урэшце я абраў тое, што, на маё разуменне, найбольш падыходзіла. Я намерыўся замураваць труп у сцяне, як некалі ў сярэднявеччы замуроўвалі сваіх ахвяраў манахі.

Сутарэнне добра пасавала для гэтае мэты. Сцены там былі нетрывалыя, да таго ж нядаўна іх похапкам патынкавалі, і ад волкасці тынк яшчэ не прасох. Апрача таго, адна сцяна мела выступ, утвораны нечым накшталт каміна, закладзенага цэглаю й патынкаванага, каб ён не розніўся ад астатняе часткі сутарэння. Я не сумняваўся, што змагу лёгка выважыць у тым месцы цагліны, уставіць туды труп і зноў усё замураваць так, што ніводнае вока не выявіць нічога падазронага.

І тут я не памыліўся. З дапамогаю лома я без цяжкасцяў вывернуў цагліны і, асцярожна прыхінуўшы труп да нутраное сценкі, паставіў яго старчма; пасля залажыў выступ, вярнуўшы сцяне колішні выгляд. Здабыўшы з усімі магчымымі перасцярогамі вапну, пясок і волас, я зрыхтаваў тынк, якога нельга было адрозніць ад ранейшага, і вельмі старанна пакрыў ім новую муроўку. Скончыўшы, пераверыўся, што ўсё ў парадку. На сцяне не засталося найменшых слядоў перамены. Рупліва, да парушынкі, з падлогі было сабранае ўсё смецце. Я пераможна азірнуўся й сказаў сабе: «Прынамсі тут мае старанні не пайшлі на глум».

Затым я ўзяўся за пошукі звера, што прычыніў мне гэтулькі няшчасця; нарэшце я цвёрда пастанавіў пазбавіць яго жыцця. Калі б у тую хвіліну я натрапіў на ката, ягоны лёс быў бы прадвызначаны. Але хітры звер, напужаны маім нядаўнім лютым гневам, знік, пазбягаючы сустрэчы. Немагчыма ні апісаць, ні ўявіць таго глыбокага шчаснага адчування палёгкі, якое прынесла ў маё сэрца адсутнасць зненавіднай істоты. Кот не паказваўся ўночы — і ўпершыню ад часу, як ён з'явіўся ў доме, я моцна й спакойна спаў; так, спаў, дарма што ляжаў на маёй душы цяжар забойства!

Мінуў другі дзень, пасля трэці — мучыцель мой не вяртаўся. Ізноў я дыхаў, як вольны чалавек. Гнаная страхам пачвара ўцякла з дому назаўжды! Больш я не пабачу яе! Якое бязмежнае шчасце! Учынены жахлівы грэх амаль не парушыў майго спакою. Мяне былі дапыталі, але я без цяжкасці апраўдаўся. Зрабілі наватператрус — але, вядома ж, нічога не знайшлі. Я не сумняваўся ў сваім шчасці.

На чацверты дзень пасля забойства да мяне нечакана прыйшлі паліцыянты і зноў узяліся пільна абследаваць увесь дом. Тым не менш, упэўнены ў непрыступнасці свайго схову, я ні трохі не збянтэжыўся. Паліцыянты наказалі мне быць пры іх. Ніводзін закутак, ніводная шчылінка не засталіся па-за іхнай увагаю. Нарэшце трэці або чацверты раз яны спусціліся ў сутарэнне. Я й брывом не варухнуў. Маё сэрца білася спакойна, як б'ецца ў сне ў нявіннага чалавека. Я хадзіў па сутарэнні з кута ў кут. Склаўшы рукі на грудзёх, я cноўдаўся

ўзад і ўперад. Паліцыянты былі цалкам задаволеныя аглядам і збіраліся ўжо сыходзіць. Маё сэрца перапаўняла радасць — завялікая, каб утаймаваць яе. Мне карцела сказаць для трыюмфу хоць слова і падвоіць тым самым іх пераконанасць у маёй невінаватасці.

— Спадары, — урэшце сказаў я, калі яны ўжо падымаліся па сходах, — вельмі рады, што развеяў вашыя падазрэнні. Зычу ўсім вам здароўя і крыху болей пачцівасці. Дарэчы, спадары, гэта... гэта вельмі добра збудаваны дом (у шалёным жаданні сказаць нешта нязмушанае я ледзьве ўсведамляў, пра што ўвогуле кажу). Нават, можна сказаць, выдатна збудаваны дом. На гэтых сценах — ужо сыходзіце, спадары? — на гэтых сценах няма ніводнае расколінкі.

І тут у парыве безразважнае бравады я моцна ўдарыў кіем, што трымаў у руцэ, якраз па цаглінах, за якімі ў сцяне стаяў труп жанчыны майго сэрца.

Божа, уратуй і вызвалі мяне з іклаў Шатана! Не паспела яшчэ патануць у цішы водгулле маіх удараў, як мне адказаў голас з магілы! — крык, спярша прыглушаны й перарывісты, нібы дзіцячае хліпанне, які разросся пасля ў працяжны, гучны, няспынны лямант, абсалютна дзікі й нечалавечы, — у скавытанне — у поўны жаху й трыюмфу прарэзлівы віскат, што можа ўзнікнуць адно ў пекле, дзе пакутуюць усе засуджаныя на вечныя мукі ды цешацца перамогаю д'яблы.

Няма чаго й казаць, што дзеялася ў той момант са мною. Млеючы, я адхіснуўся да процілеглае сценкі. На нейкае імгненне паліцыянты, стоячы на сходах, знерухомелі ад жаху й здзіўлення. Але ўжо праз момант тузін дужых рук разбураў сцяну. Яна зараз жа абвалілася. Труп, ужо моцна пазначаны распадам і заплямлены запечанай крывёю, стаяў проста перад вачыма сведкаў. У яго на галаве, разявіўшы чырвоную ляпу і бліскаючы адзіным вокам, сядзеў агідны звер, які падступна падвёў мяне да забойства, а цяпер здрадніцкім віскам выдаў у рукі ката. Я замураваў пачвару ў магільнай сцяне!

*Пераклаў Юрась Бушлякоў*



*Я замураваў пачвару ў магільнай сцяне!*

# Калодзеж і півач

*Impia tortorum longos hic turba furores*
*Sanguinis innocui, non satiata, aluit.*
*Sospite nunc patria, fracto nunc funeris antro,*
*Mors ubi dira fuit vita salusque patent*[1].

*[Катрэн быў напісаны для рынкавай брамы, што мусіла ўзвышацца перад Домам Якабінскага клуба* ў Парыжы.]*

Я быў моцна знясілены, знясілены да смерці гэтым працяглым болем, і калі нарэшце яны мяне развязалі і дазволілі сесці, я адчуў, як пачуцці раптам пакідаюць мяне. Прысуд — страшэнны смяротны прысуд — апошняе, што яскрава ўспрыняў мой слых. А пасля гукі галасоў інквізітараў зліліся нейкі невыразны гул, што, падавалася, даносіўся аднекуль праз смугу сну. Гул нагадаў маёй душы пра ідэю кругазвароту, мабыць, таму, што быў дужа падобны да рыпення млынарскага кола. Аднак толькі на імгненне, бо ў хуткім часе я ўжо нічога не чуў, хоць яшчэ крыху бачыў. Але ж як скажаў усё мой зрок! Я бачыў вусны апранутых у чорнае суддзяў. Яны падаліся мне бледнымі, белымі — бялейшымі за аркуш, на якім я пішу гэтыя словы, — і гратэскава тонкімі. У іх танклявасці было столькі волі і цвёрдасці, непахіснай рашучасці, суровай пагарды да чалавечых пакутаў... Я бачыў, як іх вусны яшчэ прамаўлялі загады, што для мяне ўжо сталі Лёсам. Бачыў, як яны крывяцца, кажучы смяротныя словы. Бачыў, як яны звязваюць гукі ў маё імя, і скаланаўся, бо ніводзін з іх не дасягаў маіх вушэй. Таксама бачыў цягам некалькіх жахлівых імгненняў трызнення лёгкае, ледзь заўважнае калыханне чорных драпіровак на сценах залі. А потым мой позірк упаў на сем вялізных свечак на стале. Спачат-

---

[1] Хеўра забойцаў тут доўга людзей катавала
І прагавіта, без стомы піла кроў нявінных.
Вольная сёння Айчына і знішчана гнюснасць,
Смерць перамогшы, жыццё й дабрадаць тут пануюць (лац.).



*Бачыў, як яны звязваюць гукі ў маё імя, і скаланаўся,*
*бо ніводзін з іх не дасягаў маіх вушэй...*

ку была ў іх нейкая міласэрнасць, яны падаліся мне высокімі белымі анёламі, якім наканавана выратаваць мяне, але праз нейкі час мой дух раптам агарнула страшная агіда, я адчуваў, як кожная часцінка мяне ўздрыгвае, нібы ад дотыку аголенага дроту гальванічнай батарэі. Анёлы ж мігам ператварыліся ў невыразныя здані з вогненнымі галовамі, і я адразу адчуў, што чакаць дапамогі ад іх ужо не выпадае. А потым, нібы прыўкрасная мелодыя, закралася думка, як прыемна і спакойна будзе мне ў магіле. Думка падкралася мякка, употай, і зусім не адразу я ацаніў яе належным чынам. Але як толькі мой дух па-сапраўднаму адчуў яе каштоўнасць і насалодзіўся ёю, постаці суддзяў расталі перад маімі вачыма, нібы падуладныя нейкім чарам, высокія свечкі згінулі ў нябыт і згасла дзвання іх полымя, а затым усё агарнула цемра. Падавалася, усе мае пачуцці паглынае імклівае, шалёнае падзенне, нібы душа спускаецца ў Аід. Потым спакой, ціша і ноч сталі маім сусветам.

Я быў у забыцці, але ўсё ж не магу сказаць, што не ўсведамляў нічога. Не буду спрабаваць вызначыць ці нават апісаць свае адчуванні, але ўсё ж я не страціў прытомнасці цалкам. Не глыбокі сон... не трызненне... не млосць! І не смерць! Нават у магіле яшчэ не канец. Інакш для чалавека не было б несмяротнасці. Прачынаючыся ад найглыбейшага сну, мы разрываем танюткае павуцінне дрымоты. І ўжо праз хвіліну (такім кволым бывае гэтае павуцінне) і знаку таго сну не маем у памяці. А па вяртанні з забыцця мы праходзім два этапы. Першы — усведамленне разумовае і духоўнае, другі — усведамленне фізічнае, усведамленне быцця. Магчыма, дасягаючы другога этапу, мы можам успомніць уражанні ад этапу першага. Нам толькі трэба адшукаць тыя яскравыя моманты, што адбіліся ва ўспамінах глыбокай бездані, з якой мы выкараскаліся. А гэтая бездань — чым яна ёсць? Ці як нам папросту адрозніць яе цень ад ценю магілы? Але ж калі ўражанні ад таго, што я назваў першым этапам, не хочуць падпарадкавацца нашай волі і ўсплыць у памяці, тады, праз доўгі час, ці не з'яўляюцца яны да нас раптоўна, неспадзявана, а мы толькі дзівімся іх нечаканаму візіту? Той, каму не выпадала

трапіць у забыццё, ніколі не заўважаў дзівосных краінаў і страшна знаёмых твараў у жары вуголля; ніколі не назіраў за танцамі сумных відзежаў у паветры, відзежаў, якіх большасць ніколі не зможа пабачыць; ніколі не заміраў, удыхаючы водар незнаёмай кветкі, і ніколі яго розум не бянтэжыла сутнасць музычнага такту, што дагэтуль нічым не прыцягваў увагі.

Сярод частых і дбайных спробаў згадаць, сярод старанных высілкаў аднавіць у памяці хоць знак таго стану, у які занурылася мая душа і які падаваўся нябытам, я перажываў рэдкія імгненні ўдачы. У тыя кароткія, вельмі кароткія хвіліны я аднаўляў свае ўспаміны, якія, як ясным розумам я пазней пераконваўся, маглі быць водгуллем толькі таго нібыта забыцця. Цьмяныя прывіды памяці нашэптваюць мне пра высокія постаці, што моўчкі паднялі мяне і пачалі апускаць долу... ніжэй... яшчэ ніжэй, пакуль не закружылася галава ад адной думкі пра бясконцае пагружэнне. Яшчэ яны апавядаюць мне пра няясную жуду, што затаілася ў маім сэрцы праз яго дзіўны, незвычайны спакой. Потым прыйшло адчуванне раптоўнай знерухомленасці ва ўсім, нібыта тыя, хто апускаў мяне (о, гэтая жудасная світа!) дасягнулі мяжы бязмежнага і замерлі, зняможаныя сваёй цяжкай ношай. Пасля ў памяці ўваскрасае адчуванне пляскатасці і вільготнасці, а потым гэта ўсё абарочваецца шаленствам — шаленствам памяці, якая ўрываецца на забароненыя ёй тэрыторыі.

І раптам мая душа знянацку робіцца рухавай, зноў здабывае магчымасць чуць, і гукі мітуслівага сэрца аддаюцца ўвушшу. А потым усё замірае, няма нічога. Пасля зноў і гук, і рух, і дотык — дрыготкае адчуванне напаўняе маю грудную клетку. Пасля толькі ўсведамленне быцця і ніводнай думкі — такі стан цягнецца доўга. За ім — нечаканая думка, жудаснае трымценне і старанныя спробы ўсвядоміць свой сапраўдны стан. Затым моцная прага зноў стаць непрытомным. Потым імклівае ажыўленне душы і ўдалая спроба паварушыцца. І пасля я ўспамінаю ўсё: і судовы працэс, і суддзяў, і чорныя драпіроўкі, і прысуд, і млосць, і забыццё. А затым зноў не памятаю нічога з таго, што пазней вялізнымі высілкамі мне ўдалося хоць часткова згадаць.

Дагэтуль я не расплюшчваў вачэй. Я адчуваў, што ляжу на спіне, нічым не звязаны. Я працягнуў руку, і, цяжкая, яна ўпала на нешта цвёрдае і вільготнае. Цягам доўгіх хвілінаў ляжала яна так, пакуль я адчайна спрабаваў уявіць, дзе я і чым ёсць. Адчайна імкнучыся да гэтага, я ўсё ж не наважваўся расплюшчыць вочы. Я вельмі баяўся кінуць першы погляд на тое, што мяне акаляе. І не столькі асцерагаўся пабачыць жудасці наўкола, колькі проста ледзянеў ад жаху, уяўляючы, што наўкола не будзе нічога. Нарэшце ў дзікім адчаі я хутка расплюшчыў вочы. І мае найгоршыя падазрэнні спраўдзіліся. Чэрань адвечнай ночы апанавала мяне. Я пачаў хапаць паветра ротам. Падавалася, бяздонная імгла насоўвалася і душыла мяне — такім невыносна шчыльным было паветра. А я ўсё ляжаў нерухома і намагаўся напружыць свой розум. Я пакрысе, адно за адным, прыгадваў дзеянні інквізіцыі і зыходзячы з гэтых згадак спрабаваў зразумець, што са мной. Прысуд быў даўно выкананы, і мне здавалася, што з таго моманту прайшло ўжо даволі шмат часу. Але і на секунду я не мог дапусціць, што напраўду памёр. Такое дапушчэнне, нягледзячы на тое, што даводзіцца чытаць у раманах, цалкам супярэчыць сапраўднасці. Дык дзе ж я і што са мной? Асуджаных на смерць, як я ведаў, звычайна чакала аўтадафэ, а адно з іх якраз мусіла адбыцца ў тую самую ноч, калі быў суд нада мною. Ці мяне зноў кінулі ў ранейшы склеп чакаць новага ахвярапрынашэння, што, магчыма, адбудзецца толькі праз некалькі месяцаў? Але гэтага, як я тут жа зразумеў, быць не магло. Прынесці ахвяру неабходна было адразу. Да таго ж мой склеп ды камеры ў вязніцах Таледа мелі каменныя насцілы, і туды прабіваўся хоць які кволы прамень святла.

Ад страшнай здагадкі кроў забруіла ў маіх жылах, зайграла ў сэрцы, і на пэўны час я зноў праваліўся ў непрытомнасць. Прачнуўшыся, я адразу ж устаў на ногі. Трымценне працінала кожную клетку майго цела. Я шырока развёў рукі над галавою, па баках — паўсюль наўкол сябе. Нічога не было, і ўсё ж я баяўся зрабіць нават крок, каб не натыкнуцца на сцены труны. Пот ліўся з кожнай поры майго цела і вялікімі халоднымі пацеркамі застываў на ілбе. Нарэшце пакуты

невядомасці сталі невыноснымі, і я асцярожна зрабіў крок наперад, выставіўшы перад сабой рукі і шырока раскрыўшы вочы, спадзеючыся заўважыць хоць ледзь прыкметны прамень святла. Я зрабіў ужо шмат крокаў, але наўкола былі адно чэрань і пустэча. Я ўздыхнуў ужо вальней. Стала ясна — лёс мой яшчэ не з самых страшных.

І цяпер, калі я працягваў асцярожна прабірацца наперад, мне раптам прыгадаліся тысячы цьмяных чутак пра жахі Таледа. Пра яго сутарэнні хадзілі дзіўныя гісторыі, і, хоць я заўжды лічыў іх байкамі, яны былі настолькі незвычайнымі і агіднымі, што іх можна было пераказваць толькі шэптам. Мяне пакінулі паміраць з голаду ў гэтым падзямеллі цямрэчы — ці мне быў падрыхтаваны іншы, яшчэ больш жудасны скон? У любым разе ў канцы будзе смерць, смерць нечувана жорсткая, бо надта ж добра я ведаў норавы сваіх суддзяў. Якім чынам і калі я памру — вось што займала ці, хутчэй, бянтэжыла мяне.

Выцягнутыя наперад рукі нарэшце натыкнуліся на нешта цвёрдае. Гэта была сцяна, хутчэй за ўсё каменнай кладкі — вельмі гладкая, слізкая і халодная. Я пайшоў уздоўж яе, ступаючы з тым абачлівым недаверам, які ўнушылі мне старажытныя хронікі. Але ўсё ж, рухаючыся такім чынам, я абсалютна не ўяўляў памераў свайго склепа, бо я мог бы папросту абысці яго вакол і вярнуцца туды ж, адкуль пачаў, нават не здагадваючыся пра гэта, — такой роўнай і аднароднай падавалася сцяна. Таму я пачаў шукаць нож, які ляжаў у кішэні, калі мяне ўводзілі ў залю Інквізіцыі. Але яго не было. Маё адзенне замянілі на зрэбны балахон. Я хацеў усадзіць лязо ў шчыліну між кладкай і такім чынам пазначыць месца, з якога пачаў свой шлях. Цяжкасці ў гэтым не было ніякай, хаця майму хвораму ўяўленню такая задача спачатку падалася невырашальнай. Я адарваў кавалак крыса ад сваёй адзежыны і прымацаваў яго да сцяны. Абыходзячы па коле сваю вязніцу навобмацак, я б, натуральна, не прапусціў гэты бавоўняны абрэзак, што знаходзіўся ў самым пачатку майго шляху. Прынамсі, я так меркаваў, але не ўзяў пад увагу ні памераў склепа, ні мае фізічнае аслабленасці. Падлога была вільготная і слізкая. Я захістаўся, падаючыся наперад, потым

раптам спатыкнуўся і ўпаў. Празмерная стома вымусіла мяне апусціцца долу, і ў хуткім часе мной авалодаў сон.

Прачнуўшыся і выцягнуўшы руку, я знайшоў побач скібу хлеба і збанок вады. Я быў занадта стомлены, каб неяк абдумаць іх з'яўленне тут, але ж прагна паеў і папіў. У хуткім часе я працягнуў абыходзіць вязніцу і хоць з цяжкасцю, але знайшоў той бавўняны лапік. Да моманту падзення я налічыў пяцьдзясят два крокі, а пасля таго як зноў працягнуў свой шлях, налічыў яшчэ сорак восем, намацаўшы абрэзак. Такім чынам, разам атрымалася сотня крокаў і, прыняўшы, што два крокі — гэта ярд, памеры цямніцы, па маіх падліках, складалі пяцьдзясят ярдаў у дыяметры. Аднак ідучы ўздоўж сцяны, я сустракаў нямала кутоў і таму не мог меркаваць пра форму склепа, а наконт таго, што гэта быў менавіта склеп, я не меў ужо ніякіх сумневаў.

Мае блуканні былі практычна бязмэтнымі, бо нешта знайсці тут было амаль немагчыма, але ж нейкая няясная цікаўнасць штурхала мяне працягваць пошукі. Пакінуўшы вывучаць сцяну, я вырашыў перасекчы склеп наўскос. Спачатку я ступаў надзвычай асцярожна, бо падлога, хоць і здавалася цвёрдаю, была па-здрадніцку слізкая. Але нарэшце я набраўся смеласці і без асаблівых ваганняў пакрочыў даволі ўпэўнена, намагаючыся прайсці як мага больш роўным і простым шляхам. Такім чынам я адолеў дзесяць ці дванаццаць крокаў, калі раптам падраны падол майго балахона заблытаўся ў нагах. Я наступіў на яго і ўпаў, моцна ўдарыўшыся тварам.

Праз тую збянтэжанасць ад падзення я не адразу заўважыў адну дзіўную акалічнасць, якая ўжо праз некалькі секундаў, хоць я ўсё яшчэ працягваў ляжаць на зямлі, прыцягнула маю ўвагу. А гэта было вось што: шчакой я ляжаў на падлозе вязніцы, а мае вусны і верхняя частка галавы ўжо ні да чога не дакраналіся. У той жа час мой лоб быў нібы ахутаны халоднай ліпучай парай, і ноздры лавілі спецыфічны пах гнілля і цвілі. Я выцягнуў руку і здрыгануўся ад думкі, што ўпаў ля самага краю круглага калодзежа, але яго глыбіню я не мог натуральным чынам вымераць зараз жа. Абмацваючы каменную кладку ніжэй за край калодзежа, я здолеў адбіць невялікі кавалачак

каменя і кінуў яго ў бездань. Доўгія секунды прыслухоўваўся я да водгулля, што пакідаў каменьчык, грукаючыся аб сцены прадоння, пакуль нарэшце злавеснае гучнае рэха не адзначыла яго падзенне ў ваду. І ў той жа момант я пачуў, як недзе ўверсе хутка адчыніліся і зачыніліся дзверы, слабы прамень святла нечакана працяў імглу і тут жа знік.

Я выразна ўцяміў пагібель, прыгатаваную для мяне, і павіншаваў сябе са своечасовым здарэннем, дзякуючы якому выратаваўся. Яшчэ адзін крок — і не ўбачыць бы мне больш белага свету. А смерць, якой я толькі што пазбег, была з ліку тых, якія ў гісторыях пра норавы інквізіцыі я лічыў неабгрунтаванымі і надуманымі. Ахвяры іх лютасці маглі пасці ад смерці, спрычыненай або цяжкімі фізічнымі мукамі, або невыносным цяжарам жуды душэўнай. Мне было наканавана апошняе. Працяглыя пакуты расхісталі мае нервы настолькі, што мяне палохаў нават гук уласнага голасу, і найлепшым чынам падрыхтавалі да таго страшнага катавання, якое чакала мяне.

Дрыжучы ўсім целам, я адпоўз назад да сцяны, вырашыўшы лепш загінуць там, чым зведаць жахі калодзежаў, — маё ўяўленне малявала іх мноства ў самых розных кутках склепа. Калі б я быў у іншым душэўным стане, то, мабыць, наважыўся б імгнення скончыць сваё нікчэмнае існаванне, кінуўшыся ў самае прадонне, але цяпер я быў найбольшым у свеце баязліўцам. Таксама я не мог забыцца на тое, што чытаў пра гэтыя калодзежы — іх жудасная планіроўка не перадугледжвала хуткай смерці.

Цягам доўгіх гадзінаў мой стрывожаны розум не даваў мне заплюшчыць вочы, але нарэшце я зноўку задрамаў. Прачнуўшыся, я і гэтым разам знайшоў побач лусту хлеба і збанок вады. Моцная смага апанавала мяне, і я адным глытком асушыў збан. Але туды, мабыць, нечага падсыпалі, бо як толькі я папіў, на мяне тут жа зноў навалілася дрымота. І глыбокі сон ахапіў мяне — сон, так падобны да смерці. Як доўга я спаў, я, канечне, не магу меркаваць, але калі зноў расплюшчыў вочы, усё, што акаляла мяне ў вязніцы, стала бачным. У нейкім жоўта-зялёным ззянні, крыніцу якога я

спачатку не прыкмеціў, мне ўдалося заўважыць памеры і будову маёй вязніцы.

Я моцна памыліўся наконт яе памераў. Агулам дыяметр яе сценаў не перавышаў дваццаці пяці ярдаў. Некалькі хвілінаў я адчуваў пустую ўсхваляванасць, напраўду пустую, бо ў той сітуацыі, у якой я апынуўся, што можа мець меншае значэнне, чым памеры склепа? Але мой розум чамусьці дужа цікавілі гэтыя дробязі, і я заглыбіўся ў роздумы, шукаючы, дзе ж у сваіх падліках я мог памыліцца. Нарэшце я дайшоў да ісціны. Падчас першай спробы даследаваць склеп я налічыў пяцьдзясят два крокі, а потым упаў. Мабыць, тады я быў за два крокі ад лапіка бавоўны, сапраўды, я амаль абышоў вязніцу па перыметры. Потым заснуў, а калі прачнуўся, то вярнуўся назад і палічыў дыяметр вязніцы ў два разы большым, чым ён быў насамрэч. Заблытаўшыся, я не заўважыў, што пачынаў свой шлях, калі сцяна была злева, а скончыў яго, калі яна была ўжо справа.

Таксама я памыліўся наконт формы памяшкання. Намацваючы шлях паўз сцяну, я заўважыў шмат кутоў, і менавіта яны навялі мяне на думку пра няправільную форму склепа. Так моцна ўплывае апраметная цемра на таго, хто раптам абуджаецца ад летаргіі або сну! Кутамі мне падаліся ўсяго толькі лёгкія западзіны ці нішы праз няроўныя адрэзкі. Сама па сабе вязніца была збольшага квадратная. Тое, што я прыняў за каменную кладку, выявілася вялізнымі плітамі з жалеза ці нейкага іншага металу, швы ці сутыкі якіх якраз і ўтваралі западзіны. Паверхня металічных плітаў была груба размалявaная тымі жахлівымі і агіднымі сімваламі, якія маглі быць спароджаныя адно злавеснымі забабонамі манахаў. Пагрозлівыя выявы нячысцікаў, увасобленыя ў шкілеты і іншыя жудасныя вобразы, пакрывалі сцены. Я звярнуў увагу, што абрысы гэтых хімераў былі дастаткова выразнымі, а вось колеры падаваліся бляклымі і цьмянымі, нібы ад уздзеяння вільготнага паветра. Таксама я заўважыў, што падлога была з каменю. А ў самым цэнтры зеўраў вялізны калодзеж, прорвы якога мне такі ўдалося пазбегнуць. Але ў вязніцы ён быў усяго адзін.

Усё гэта я бачыў дужа невыразна і праз вялізныя высілкі, бо становішча маё моцна змянілася пасля сну. Цяпер я ляжаў,

выцягнуўшыся на спіне на нейкім драўляным каркасе. Да яго я быў прывязаны чымсьці падобным да доўгай папругі. Яна была шмат разоў аперазаная вакол майго цела, рук і ног, вольнымі заставаліся толькі галава і левая рука, але ўсяго настолькі, каб я з цяжкасцю здолеў дацягнуцца да талеркі з ежай, што стаяла побач на падлозе. Я жахнуўся, заўважыўшы, што збана з вадою не было. Кажу «жахнуўся», бо мяне даймала невыносная смага. Гэтую смагу, па ўсім відаць, наўмысна справакавалі мае прыгнятальнікі, бо ежа ў талерцы была вострым, моцна прыпраўленым мясам.

Падняўшы вочы ўгару, я агледзеў столь маёй вязніцы. Яна была трыццаць ці сорак футаў вышынёй і, як і сцены, абабітая металічнымі плітамі. На адной з яе панэляў была змешчаная самотная фігура, якая цалкам забрала маю ўвагу. Гэта была алегарычная выява Часу, якім яго зазвычай рысуюць, толькі замест касы ён трымаў намаляваны, як мне падалося спачатку, ківач, што бывае ў старым гадзінніку. Але нешта дзіўнае ў гэтай прыладзе прымусіла мяне прыгледзецца больш пільна. Пакуль я глядзеў на яго пад простым вуглом (а ён быў практычна нада мною), мне падалося, што я заўважыў, як ён рухаецца. Праз імгненне мае падазрэнні апраўдаліся. Амплітуда яго гайдання была кароткай і рух, натуральна, павольным. Я назіраў за ім некалькі хвілінаў са страхам, але ў большай ступені з цікаўнасцю. Стомлены нарэшце яго нудным рухам, я пачаў аглядаць іншыя прадметы ў вязніцы.

Слабы шум даляцеў да маіх вушэй, і, глянуўшы на падлогу, я заўважыў некалькі вялізных пацукоў. Яны вылезлі са студні, што была ў полі майго зроку справа. І нават пакуль я назіраў за імі, цэлае пацучынае войска з прагнымі вачыма паспешліва наблізілася да мяне, учуўшы пах мяса. Каб адпужаць іх, я мусіў прыкладаць даволі шмат руплівых высілкаў.

Мінула, мабыць, паўгадзіны ці нават гадзіна (звязаны, я толькі прыблізна мог меркаваць пра час), калі я зноў глянуў наверх. Тое, што я там пабачыў, збянтэжыла мяне і ў той жа час здзівіла. Амплітуда руху ківача павялічылася прыкладна на ярд. І натуральным чынам узрасла яго хуткасць. Але што ўсхвалявала мяне яшчэ больш, дык гэта тое, што ён прыкмет-

на зніжаўся. Цяпер я пабачыў — з жахам, які і апісваць не варта, — што на самым канцы яго быў серпападобны наканечнік з бліскучай сталі прыкладна фут шырынёй ад краю да краю; яго канцы былі загнутыя ўверх, а знізу ён быў востры, як лязо. І, як лязо, вялікі і цяжкі, а ўверсе масіўны і шырокі. Ён быў прымацаваны да трывалага медзянога прута, што, гайдаючыся, са свістам разразаў паветра.

Я больш не сумняваўся ў тым страшным сконе, што быў прыгатаваны для мяне манахамі, вялікімі спецыялістамі ў справе катавання. Тое, што я дазнаўся пра калодзеж, заўважылі агенты Інквізіцыі — пра калодзеж, чые жахі былі наканаваныя такому адступніку, як я, калодзеж — звычная з'ява для пекла, што, па чутках, лічыцца *Ultima Thule*[1] усіх іхных караў. Падзенне ў калодзеж я пазбег абсалютна выпадкова. Я добра ведаў, што нечаканасць ці нават пастка, за якой хаваліся пакуты, былі неад'емным складнікам тых страшных вынаходак, праз якія людзі сустракалі сваю смерць у цёмных склепах. І калі я сам не рухнуў у бездань, у іх д'ябальскія планы не ўваходзіла скінуць мяне сілком, таму мяне чакала (альтэрнатывы быць не магло) зусім іншая, больш міласэрная пагібель. Міласэрная! Я злёгку ўсміхнуўся, халадзеючы ад жаху, калі адчуў усю іронію гэтага слова.

Не трэба і казаць, што доўгімі, доўгімі гадзінамі вусцішы, якую і ўявіць сабе немагчыма, я лічыў хуткія хістанні сталі! Дзюйм за дзюймам — лінію за лініяй. Півач апускаўся толькі праз пэўныя інтэрвалы, што падаваліся вечнасцю, але імкліва, усё ніжэй і ніжэй! Праходзілі дні — а, магчыма, дзён прайшло вельмі шмат, пакуль ён не пачаў лётаць нада мною так нізка, што я ўжо лавіў едкае паветра яго дыхання. Пах навостранай сталі біў у ноздры. Я маліў, настойліва ўпрошваў нябёсы, каб ён апускаўся хутчэй. Утрапёны, я вар'яцеў, спрабуючы падняцца вышэй і зрабіцца ахвярай гайданняў страшэннага сярпа. А потым я раптам супакоіўся і ляжаў з усмешкай на вуснах, гледзячы на сваю бліскучую смерць, нібы дзіця на дзівосную цацку.

[1] Тут: апошняя мяжа (лац.).

Пасля мяне зноў апанавала забыццё, але цягнулася яно нядоўга, бо калі я зноў апрытомнеў, то не заўважыў, каб ківач прыкметна апусціўся ніжэй. Аднак прайшло, мусіць, шмат часу, бо я ведаў, што ліхадзеі такі заўважылі, што я сплю, і, магчыма, пажадалі часова прыпыніць рух ківача ўніз. Калі ж я прыйшоў у сябе, то адчуў таксама невымоўную слабасць і знясіленасць, нібыта праз працяглую змардаванасць. Нават нягледзячы на мой тагачасны стан і ўсе пакуты, маё чалавечае цела прагнула ежы. Пераадольваючы боль, я выцягнуў левую руку, наколькі мне дазвалялі путы, і завалодаў маленькім кавалкам, што застаўся мне пасля пацукоў. І калі я наблізіў яго да вуснаў, у галаве раптам заіскрылася ледзь акрэсленая думка, што несла радасць і надзею. Але што агульнага магло быць у мяне з надзеяй? Думка тая, як я ўжо сказаў, была ледзь акрэсленаю — такія думкі часта наведваюцца да людзей, але ніколі не спраўджваюцца. Я ведаў, што ёсць у ёй радасць і надзея, але адчуваў, што яна нібы загадзя была мёртваю яшчэ ў самым зародку. Дарэмна я імкнуўся зноў абудзіць яе, зноў авалодаць ёю. Працяглыя пакуты амаль не пакінулі ўва мне разумовых сілаў. Я быў дурнем, быў ідыётам.

Ківач хістаўся пад простым вуглом да майго цела. Я бачыў, што серп наканечніка мусіў прайсці ля самага майго сэрца. Ён кранецца тканіны балахона, вернецца і зноў паўторыць свае рухі, зноў і зноў. Але нягледзячы на шырачэзны да жудасці размах ківача (каля трыццаці футаў) і моцны свіст яго ляза, якое магло б адным рухам разрэзаць гэтыя жалезныя сцены, тканіна на маіх грудзях будзе праціраецца вельмі павольна, некалькі хвілінаў, а потым усё будзе скончана. І на гэтай думцы я спыніўся. Я не наважваўся ўявіць, што будзе далей. Я засяроджана затрымаўся на ёй, быццам бы, перастаўшы думаць, я мог бы спыніць набліжэнне сталі. Я прымушаў сябе ўяўляць гук металічнага сярпа, калі ён закране мае апранахі, і тое асаблівае ўсхваляванасці, што прыносіць пераціранне тканіны адчуванне нервам. Я ўяўляў сабе гэткае глупства, аж пакуль зубы не заскрыгаталі.

Ніжэй, ніжэй ён апускаўся. Я атрымліваў вар'яцкае задавальненне, супастаўляючы яго вертыкальны рух уніз і хут-

касць руху па гарызанталі. Направа — налева, далей, шырэй, з пранізлівым енкам праклятага духу, проста да майго сэрца таемным поступам тыгра! Я і смяяўся, і выў, калі то адна, то другая з гэтых ідэяў атрымлівала нада мною ўладу.

Ніжэй — няўмольна, няспынна — ніжэй! Ён здрыгаўся за тры дзюймы ад маіх грудзей! Шалёна і люта я спрабаваў вызваліць левую руку. Яна была вольнай толькі ад локця да далоні. З вялікай цяжкасцю я мог дацягнуцца да талеркі побач са мной, а потым да рота, але ніяк не далей. Калі б мне ўдалося разарваць путы, што трымалі локаць і плечы, я б вызваліўся і паспрабаваў затрымаць півач. Аднак з такім жа поспехам я б мог наважыцца спыніць лавіну!

Ніжэй — няўхільна, непазбежна ніжэй! Я ўздыхаў і намагаўся вызваліцца пры кожным яго хістанні. Я сутаргава адхінаўся пры кожным яго ўзмаху. З заўзятасцю бязглуздай роспачы сачыў я вачыма за яго рухамі то да мяне, то ад мяне. І рыўком завяршаўся іх цыкл унізе. Толькі смерць была б збавеннем, якім жа невымоўна жаданым збавеннем! І ўсё ж мяне трэсла ад думкі, як лёгка, заглыбіўшыся, гэтая прылада ўвап'ецца сваім вострым бліскучым лязом мне ў грудзіну. І менавіта надзея прымушала мяне скаланацца ад гэтай думкі і ўхіляцца целам. Гэта была надзея — надзея, што трыюмфуе ў катавальнях, што шэпча нават асуджанаму на смерць у цёмных склепах Інквізіцыі.

Я заўважыў, што ўсяго праз нейкіх дзесяць ці дванаццаць хістанняў сталёвае лязо наблізіцца да майго балахона, і тады маю душу нечакана апанаваў глыбокі, стрыманы спакой безнадзейнасці. Упершыню за некалькі гадзінаў — ці, хутчэй, дзён — я задумаўся. Нечакана я зразумеў: путы, ці папругі, што трымалі мяне, не былі аднароднымі. Я быў абвязаны не адной суцэльнай вяроўкай. Першы ж удар металічнага сярпа наўскос любога ўчастка папругі пашкодзіць яе настолькі, што я здолею развязаць яе левай рукою. Але ж якой жахлівай робіцца блізкасць вострай сталі! І ці ж не можа скончыцца смерцю гэты мой маленькі супраціў! Да таго ж прыслужнікі катаў маглі прадбачыць і паклапаціцца пра гэта загадзя. Якая верагоднасць, што путы на маіх грудзях апынуцца про-

ста на шляху сталёвага ляза ківача? Ад страху страціць прытомнасць, калі, як мне падалося, апошняй надзеі ўжо няма, я падняў галаву, каб добра разгледзець грудзі. Папруга апярэзвала мае рукі, ногі і тулава вельмі шчыльна, а таму натуральным чынам была на шляху смяротнага ляза.

Не паспеў я апусціць галаву ва ўжо звычнае для яе становішча, як раптам напаўусвядомленая, па-іншаму не ведаю як яе назваць, ідэя вызвалення азарыла мяне. Ідэя, якая ўжо з'яўлялася раней, але адно няўрымслівыя абрыўкі яе мяне закранулі, калі я падносіў ежу да сваіх сухіх, апаленых вуснаў. Цяпер жа думка аформілася цалкам — такая кволая, ледзь ясная, ледзь выразная, але ўсё ж цэльная. І адразу ж, у нервовым прыступе адчаю, я наважыўся яе ажыццявіць.

Цягам доўгіх гадзінаў прастора вакол таго нізкага каркаса, на якім я ляжаў, літаральна кішэла пацукамі. Дзікія, дзёрзкія і прагныя, іх чырвоныя вочы зыркалі на мяне, нібы чакалі, пакуль знерухомею назаўжды і яны здолеюць нарэшце пажывіцца. «Чым жа, — задаваўся я пытаннем, — яны харчаваліся ў калодзежы?»

Якія б перашкоды я ім ні чыніў, яны ўсё роўна зжыралі ежу з маёй талеркі амаль цалкам, пакідаючы мне адно рэшткі. Увесь гэты час я разгойдваўся на сваім каркасе то ўверх, то ўніз ці памахваў рукой над талеркай, але ўрэшце безуважная аднастайнасць маіх рухаў звяла эфект да мінімуму — ненажэрныя паразіты пачалі часцяком упівацца сваімі вострымі зубамі мне ў пальцы. Рэшткамі тлустай і добра здобленай спецыямі ежы, што засталася ў талерцы, я грунтоўна абмазаў усе папругі, да якіх толькі змог дацягнуцца, а потым, падняўшы руку з зямлі, замёр нерухома.

Спачатку прагныя жывёлы са здзіўленнем і жахам успрынялі перамены, то бок поўную адсутнасць рухаў. Спалоханыя, яны падаліся назад, многія рушылі да калодзежа. Але толькі на імгненне. Недарма я разлічваў на іх пражэрлівасць. Бачачы, што я ляжу абсалютна нерухома, адзін ці два самыя смелыя з іх ускочылі на каркас і пачалі нюхаць папругу. Гэта стала сігналам да дзеяння для астатніх. Цэлым войскам яны кінуліся з калодзежа. Чапляючыся за драўляны каркас, яны

пераскоквалі праз яго і сотнямі асядалі на маім целе. Вывераны рухківача ім зусім не замінаў. Унікаючы яго хістанняў, яны ўсаджвалі зубы ў пахкую ад спецый папругу. Я трымаў на сабе іх цяжар, а яны кішэлі на мне ўсё новымі і новымі хеўрамі. Пацукі спляталіся разам ля самага майго горла, іх халодныя лапы бегалі па мне, і я ледзь не задыхаўся пад цяжарам гэтай жывой шэрай масы. Агіда, апісаць якую мне не хопіць словаў, напінала мне грудзі і жудасным холадам напаўняла сэрца. Але я ведаў: яшчэ хвіліна — і палону майму канец. Я выразна адчуў, як аслаблі мае папругі. І прынамсі ў адным месцы пацукі ўжо зрабілі сваю справу. Са звышчалавечай рашучасцю я працягваў ляжаць абсалютна нерухома.

Як выявілася, ні мае падлікі, ні мае пакуты не былі дарэмнымі. І нарэшце я адчуў сябе вольным. Папругі шмаццём звісалі з майго цела. Але лязо ківача ўжо апусцілася на мае грудзі і разрэзала тканіну балахона. Прарвала сподняе. Ківач хіснуўся яшчэ двойчы, і востры боль праццяў кожны куточак майго цела. Але момант збавення ўжо прыйшоў. Ад узмаху рукі мае выратавальнікі раптам мітусліва кінуліся ва ўсе бакі. Адным упэўненым рухам, асцярожна, наўскос, павольна сцяўшыся, я выслізнуў з небяспечных абдоймаў папругі, далей ад смяротнага ляза ківача. І хоць на імгненне стаў вольным.

Вольным — у тугіх абцугах Інквізіцыі! Як толькі я ступіў з жахлівага ложа на каменную падлогу вязніцы, рух пякельнай машыны спыніўся, і я ўбачыў, як яе пацягнулі наверх і прыбралі праз шчыліну ў столі. Гэта было мне ўрокам, які я ў роспачы прыняў блізка да сэрца. Несумненна, за кожным маім рухам сочаць. Вольны! Я пазбег усяго адной формы жудаснай смерці, каб зрабіцца ахвярай смерці, мабыць, яшчэ страшнейшай. З гэтай думкай я ўсхвалявана абвёў вачыма жалезныя пліты, што акалялі і трымалі мяне тут. Нешта было не так, і хоць я не мог адчуць гэтага адразу, было ясна — у склепе нешта змянілася. Цягам доўгіх хвілінаў сонных і трапяткіх развагаў я марна перабіраў зусім не звязаныя між сабой гіпотэзы. Менавіта тады я заўважыў, прычым упершыню, крыніцу таго зялёна-жоўтага святла, што разлівалася па маім склепе. Яно лілося са шчыліны прыкладна на паўдзюйма



*... яны кішэлі на мне ўсё новымі і новымі хеўрамі*

шырынёй, што цягнулася колам пад сценамі вязніцы, — як выявілася, яны былі цалкам аддзеленыя ад падлогі. Я паспрабаваў глянуць праз шчыліну, але безвынікова.

Калі ж я падняўся, то загадка раптоўных зменаў у склепе нечакана раскрылася мне. Раней я заўважыў, што хоць абрысы фігураў на сценах былі дастаткова выразнымі, іх колеры падаваліся бляклымі і прыглушанымі. Цяпер жа колеры нібы праявіліся, умомант сталі нашмат ярчэйшымі, азарыліся страшным асляпляльным бляскам, што надаў прывідным д'ябальскім выявам выгляд, які зледзяніў бы нервы і нашмат мацнейшыя за мае. Дэманічныя пагляды ажыўленых дзікім пякельным полымем вачэй упіваліся ў мяне з усіх бакоў, адтуль, дзе раней і знаку іх не было, іскрыліся агністымі водбліскамі пажараў, і я ніяк не мог прымусіць сябе паверыць, што гэта толькі гульні майго ўяўлення, што яны несапраўдныя.

Несапраўдныя! Нават уцягваючы ноздрамі паветра, я адчуваў пах гарачага жалеза! Задушлівы смурод запаўняў цямніцу. Усё мацней разгараліся вочы, што неадрыўна сачылі за маімі пакутамі. Усё ярчэйшай рабілася барва, што залівала выявы крывёй жуды! Я задыхаўся! Хапаў ротам паветра! Сумневаў у прыдумцы маіх катаў быць не магло — што за жорсткія, што за бязлітасныя людзі! Ад гарачага металу сценаў я падаўся бліжэй да сярэдзіны вязніцы. Пры думцы аб пажары, што мусіў спаліць усё наўкола, прахалода калодзежа падалася мне бальзамам для стомленай душы. Я кінуўся да яго смертаноснага ўскрайку і стрывожана глянуў уніз. Зарыва палаючага даху асвятліла шматлікія западзіны і нішы. І ўсё ж нейкую секунду мой розум не хацеў успрымаць тое, што я пабачыў на свае вочы. Але нарэшце разуменне навалілася на мяне, дасягнула самых апошніх куточкаў маёй душы — агнём выпаліла сабе дарогу да ўтрапёнага ўсведамлення. Як вымавіць усё гэта? Жах, які жах! Што заўгодна, але толькі не гэта! З крыкам адскочыў я ад калодзежа і, абхапіўшы галаву рукамі, горка зарыдаў.

А гарачыня ўсё нарастала, і зноў я падняў вочы, скаланаючыся, нібы ў ліхаманцы. Змены ў маёй вязніцы адбыліся ўжо

другі раз, і цяпер было выразна відаць — змянілася яе форма. Як і раней, я спачатку беспаспяхова намагаўся адчуць ці зразумець, што адбываецца. Але ў хуткім часе сумневаў у мяне не засталося. Тыя два разы, калі я здолеў пазбегнуць смерці, прыспешылі помслівую Інквізіцыю — яны не збіраліся адкладаць маю сустрэчу са Смерцю. Памяшканне склепа было квадратным. Але цяпер я заўважыў, што два яго жалезныя куты сталі вострымі, а два астатнія, адпаведна, тупымі. Гэтая страшная розніца між імі пачала толькі павялічвацца з моцным грукатам і шумам. Умомант памяшканне ператварылася ў ромб. Але яго форма пры гэтым працягвала змяняцца і далей, праўда, я не жадаў і нават не спадзяваўся, што гэта спыніцца. Я б мог кінуцца грудзьмі на чырвоныя сцены маёй турмы і знайсці вечны спакой. «Смерць! — думаў я, — любая смерць, толькі не ў калодзеж!» Дурань! Няўжо я не разумеў, што менавіта ў калодзеж хацелі загнаць мяне гарачым жалезам?! Як мог бы я вытрымаць яго асляпляльнае святло?! А калі б мог, то ці хапіла б сілаў стрымаць яго націск?! А ромб вязніцы рабіўся тым часам усё больш пляскатым з такой хуткасцю, што часу на развагі ў мяне папросту не было. У яго цэнтры, там, дзе ромб быў найшырэйшым, зеўрала чорная бездань. Я падаўся наперад, але сцены, што няўмольна насоўваліся, адціскалі мяне назад. Урэшце майму скурчанаму болем і абпаленаму агнём целу не засталося і лапіка зямлі, каб зрабіць хоць крок па цвёрдай паверхні вязніцы. Я кінуў змаганне, але ўся жуда майго сэрца вырвалася адзіным гучным і працяглым, апошнім крыкам. Я адчуў, як упаў на цагліны, і адвёў пагляд.

І тут данёсся нястройны гул чалавечых галасоў! Зараўло мноства трубаў! І рэзкі скрыгат, нібы ад сотні громаў, напоўніў наваколле! Вогненныя сцены памкнулі назад! І выцягнутая рука схапіла маю, калі я, амаль непрытомны, падаў у калодзеж. Гэта была рука генерала Ласаля*. Французскае войска ўвайшло ў Таледа. Інквізіцыя апынулася ў руках сваіх ворагаў.

*Пераклала Юля Цімафеева*

# Цішыня

*Прыпавесць*

Горныя вяршыні дрэмлюць,
даліны, скалы і пячоры ў цішыні.
Алкман*

«Слухай мяне, — сказаў Дэман і паклаў мне на галаву рукі. — Край, пра які я апавядаю, — гэта маркотны край у Лівіі, на берагах ракі Заір*. І тут няма ні спакою, ні цішыні.

Воды гэтай ракі хваравітага шафранавага колеру, і яны цякуць не наперад, у мора, а адвечна і заўсёды пульсуюць пад чырвоным вокам сонца ва ўзбуджаным, сутаргавым руху. На іншым баку глеістага ложа ракі на шмат міляў раскінулася бледная пустыня гіганцкіх вадзяных лілеяў. Яны ўздыхаюць у гэтай самоце, цягнуць да нябёсаў доўгія, змярцвела-бледныя шыі і ківаюць у розныя бакі сваімі адвечнымі галовамі. І чуваць невыразны шолах, які ідзе ад іх, — як ад шыпення падземных водаў. І яны ўздыхаюць.

Але ёсць мяжа іхнай краіны — чорны, высокі, жудасны лес. Тут, як хвалі каля Гебрыдскіх астравоў, гайдаецца нізкі хмызняк. Але тут ніколі не бывае ветру. І высокія першатворныя дрэвы адвеку хістаюцца ў розныя бакі з магутным трэскам і гулам. І з іхных вяршыняў адна за адной падаюць адвечныя кроплі расы. Ля каранёў звіваюцца ў неспакойным сне дзіўныя атрутныя кветкі. А наверсе з шыпеннем і гулам заўсёдна нясуцца на захад шэрыя хмары, пакуль не перакоцяцца вадаспадам за палымнеючую сцяну далягляду. Але тут ніколі не бывае ветру. І на берагах ракі Заір няма ні спакою, ні цішыні.

Была ноч, і ішоў дождж, і пакуль ён ішоў, гэта быў дождж, але калі скончыўся — гэта была кроў. І я стаяў у балоце, паміж высокіх лілеяў, і дождж падаў на маю галаву — і лілеі ківалі адна адной ва ўрачыстай адзіноце.

Раптам з бледнага прывіднага туману з'явіўся месяц, і быў ён колеру крыві. Вочы мае напаткалі велізарную шэрую скалу, што стаяла на беразе мора, асветленая месяцовым

бляскам. І скала была шэрая і прывідная, і высокая — і скала была шэрая. На ёй былі знакі, выразаныя на камені, і я ішоў па балоце з вадзянымі лілеямі, пакуль не дасягнуў берага, каб прачытаць літары на камені. Але я не мог разабраць іх. І я пайшоў назад праз балота, месяц свяціў яшчэ ярчэйшай чырванню, я павярнуўся і зноў зірнуў на знакі — і літары былі АДЗІНОТА.

Я зірнуў уверх, і на вяршыні гары стаяў чалавек, і я схаваўся паміж вадзяных лілеяў, каб назіраць за гэтым чалавекам. Ён быў высокі і паважны, з плячэй да пятак захінуты ў старажытнарымскую тогу. Абрысы ягонай постаці былі расплывістыя — але ягоныя рысы былі рысамі боства; і плашч ночы і туману, і месяца, і расы не змаглі схаваць рысаў яго твару. Ягоны лоб быў высокім ад роздумаў, і вочы былі неспакойныя ад клопатаў, і ў барознах на яго шчоках я прачытаў прыпавесць тугі і журбы, і агіды да чалавецтва, і прагу самоты.

Чалавек сеў на гары, апусціў галаву на руку і глядзеў на адзіноту. Ён глядзеў уніз на рэдкі неспакойны хмызняк, і ўверх на высокія першатворныя дрэвы, і яшчэ вышэй, на шумныя нябёсы і барвовы месяц. І я стаіўся ў лілеях і сачыў за чалавекам. І чалавек трымцеў на самоце — але ноч святлела, і ён сядзеў на гары.

І чалавек адвёў вочы ад нябёсаў і паглядзеў на маркотную раку Заір, і на жудасныя жоўтыя воды, і на бледныя легіёны вадзяных лілеяў. Чалавек слухаў уздыхі вадзяных лілеяў і шолах, які ішоў ад іх. І я стаіўся ў сховах і сачыў за чалавекам. І чалавек трымцеў на самоце — але ноч святлела, і ён сядзеў на гары.

Тады я спусціўся ў твань і пайшоў уброд, праз пустыню лілеяў, і паклікаў гіпапатамаў, што жылі ў дрыгве. Гіпапатамы пачулі мой покліч, прыйшлі з Бегемотам* да падножжа гары і рыкалі гучна і жудасна пад тварам месяца. І я стаіўся ў сваім схове і сачыў за чалавекам. І чалавек трымцеў на самоце — але ноч святлела, і ён сядзеў на гары.

Тады я пракляў стыхіі праклёнам шаленства, і жудасная навальніца ўсчалася ў нябёсах, дзе дагэтуль не было ветру. І нябёсы раз'юшыліся барвовай сінечай — лютасцю навальніцы —



*...і ні гуку не было ў агромністай, бязмежнай пустыні.*

і дождж біў па галаве чалавека — і рака выйшла з берагоў — і воды яе курчыліся і пеніліся ад болю — і вадзяныя лілеі скавыталі ў сваіх ложках — і лес асыпаўся пад ветрам — і каціўся гром — і бліскала маланка — і гара гайдалася ля самай асновы. І я стаіўся ў сваім схове і сачыў за чалавекам. І чалавек трымцеў на самоце — але ноч святлела, і ён сядзеў на гары.

Тады я раззлаваўся і пракляў праклёнам цішыні раку, і лілеі, і вецер, і лес, і нябёсы, і гром, і ўздыхі вадзяных лілеяў. І яны зрабіліся выклятымі і сціхлі. І месяц перастаў кульгаць па нябеснай сцяжыне — і гром змоўк — і маланка не рассыпалася іскрамі — і нябёсы віселі нерухома — і воды апусціліся і застылі — і дрэвы перасталі хістацца — і вадзяныя лілеі больш не ўздыхалі — і ні шолаху не было чуваць ад іх, ні ценю і ні гуку не было ў агромністай, бязмежнай пустыні. Я ўбачыў знакі на камені, яны змяніліся — і літары былі ЦІШЫНЯ.

Мой позірк трапіў на твар чалавека, твар ягоны быў бледны ад жаху. Ён таропка падняў галаву і ўстаў, выпрастаўся і прыслухаўся. Але ні гуку не было ў агромністай, бязмежнай пустыні, і літары на камені былі ЦІШЫНЯ. І чалавек здрыгануўся, і адвярнуў твар, і спехам пайшоў упрочкі, і больш я яго не бачыў».

Так, цудоўныя гісторыі ёсць у кнігах Чарадзеяў — у акутых жалезам журботных кнігах Чарадзеяў. Там, кажу я вам, — слаўныя дзеі Нябёсаў, Зямлі, магутнага мора і Духаў, якія пануюць над морам, над зямлёй і над высокімі нябёсамі. Шмат мудрага было і ў казаннях сівілаў; святыя, святарныя рэчы былі пачутыя падаўна пад бледнай лістотай, што трымцела вакол Дадоны*, — але, клянуся Алахам, тую прыпавесць, што апавёў мне Дэман, седзячы побач са мной у цені надмагільнага помніка, я лічу самай цудоўнай! І калі гісторыя Дэмана падышла да канца, ён сышоў у адкрытую магілу і засмяяўся. І я не мог смяяцца разам з Дэманам, і ён пракляў мяне, бо я не мог смяяцца. І рысь, якая вечна жыве ў магіле, выйшла адтуль, і легла ля ног Дэмана, і неадрыўна глядзела яму ў твар.

*Пераклала Алена Пятровіч*

# Берэніка

Dicebant mihi sodales si sepulchrum amicae visitarem, curas meas aliquantulum fore levatas[1].

Ібн-Заят*

Пакута разнастайная. Няшчасце людское — шматаблічнае. Яно сягае за далягляд, як вясёлка, і мае столькі ж адценняў — выразныя, яны, тым не менш, паступова пераходзяць адно ў адно. Яно сягае за далягляд, як вясёлка! Як жа атрымалася, што з прыгажосці я здабыў пачварнае? Запавет міру прыпадобіў скрусе? Але гэтаксама як, з гледзішча этыкі, зло магчымае пры ўмове існавання дабра, так і скруха папраўдзе нараджаецца з радасці. І ці то ўспамін пра былое шчасце робіцца пакутай сённяшняга дня, ці то мукі, што нарадзіліся з радасці, якая магла быць.

Мяне хрысцілі імем Эхей; прозвішча сваё згадваць не буду. Аднак няма ў гэтых землях замкаў, больш асвечаных стагоддзямі, чым мае змрочныя, шэрыя спадчынныя ўладанні. Лічылася, што ў нашым родзе ўсе як не з гэтага свету, і асобныя цікавыя дэталі — і сам выгляд фамільнага маёнтка, і роспісы ў вялікай залі, і габелены ў спачывальнях, і разьба на калонах у збройні і асабліва ў галерэі старадаўняга жывапісу, і афармленне бібліятэкі, і, нарэшце, вельмі адмысловая падборка кніг у ёй — даводзілі гэта больш чым пераканаўча.

З гэтай бібліятэкай і яе кнігамі спрэс звязаныя ўспаміны майго ранняга дзяцінства; больш пра гэта я не скажу нічога. Тут памерла мая маці. Тут я з'явіўся на свет. Аднак няма ніякіх падставаў казаць, нібыта я не жыў да гэтага, нібыта нашыя душы не існуюць да нашага нараджэння. Вы не згодныя?.. Але не будзем спрачацца. Сам я ўпэўнены, а ўпэўніваць іншых не

---

[1] Казалі мне сябры, што калі наведаю я магілу каханай, то атрымаю палёгку (лац.).

хачу. Усплываюць жа ў нас, аднак, згадкі пра няісныя формы, узвышаныя і поўныя сэнсу погляды, гукі, меладычныя і сумныя, — згадкі, пазбавіцца якіх нельга, успаміны, падобныя да ценяў, невыразных, зменлівых, цьмяных, няўстойлівых, і, як ценяў, я не змагу іх пазбыцца, пакуль будзе свяціць сонца майго розуму.

У гэтым пакоі я з'явіўся на свет. Абудзіўшыся пасля доўгай ночы, якая здавалася небыццём, аднак не была ім, я апынуўся ў казачнай краіне, палацы фантазіі, у пустэльных землях, дзе я быў анахарэтам думкі і вучонасці, і таму няма нічога незвычайнага ў тым, што я пазіраў на свет здзіўленымі бліскучымі вачыма, што марнаваў дзяцінства за кнігамі і траціў юнацтва на мроі; незвычайным было, аднак, тое, што ішлі гады, і росквіт сталасці заспеў мяне ўсё ў тым жа бацькоўскім маёнтку. Дзіўным было і тое, як замерла тады маё жыццё, як перакуліліся з ног на галаву самыя звычайныя думкі. Рэальнае жыццё падавалася мне відзежай і толькі відзежай, а вар'яцкія ідэі, што прыходзілі да мяне з краіны мрояў, рабіліся, наадварот, нават не з'явамі майго штодзённага існавання, а самім існаваннем, сапраўдным і адзіным.

Берэніка была маёй стрыечнай сястрой, і мы разам раслі пад бацькоўскім дахам. Аднак раслі мы па-рознаму: я — хваравіты і апанаваны маркотай, яна — рухавая, прывабная і перапоўненая энергіяй; яна блукала па схілах пагоркаў — я сядзеў на самоце над кнігамі, я замыкаўся ў сабе і ахвяраваў целам і душой дзеля глыбокіх і пакутлівых развагаў — яна бесклапотна ішла па жыцці, не думаючы ні пра цені на шляху, ні пра бясшумны лёт гадзінаў з крумкачовымі крыламі. Берэніка! — я клічу яе па імені — Берэніка! — і ад гуку майго голасу тысячы трывожных успамінаў спалохана ўзлятаюць над шэрымі руінамі маёй памяці. Ах, яе вобраз так жыва ўстае перад маімі вачыма, як у былыя дні яе бестурботнасці і радасці! О неверагодная і надзвычайная краса! О сільфіда ў прысадах Арнгейма*! О наяда ў яго ручаях! А далей... далей толькі таямніца, і вусціш, і гісторыя, якую лепей бы не расказваць. Хвароба, смяротная хвароба наляцела на яе, як са-

мум, захапіла яе ў мяне на вачах, завалодваючы яе розумам, яе звычкамі, яе асобай і самым незаўважным і жахлівым чынам руйнуючы яе ўсю. О гора — хвароба-разбуральніца прыйшла і сышла, а ахвяра — дзе яна цяпер? Я не ведаў яе болей — а тая, каго ведаў, не была больш Берэнікай!

Сярод незлічоных хваробаў, выкліканых гэтай — самай першай і пагібельнай, што так жахліва паўплывала на духоўны і фізічны стан мае стрыечнае сястры, — варта згадаць найбольш пакутлівую і невылечную, пэўнага кшталту эпілепсію, што нярэдка заканчвалася трансам. Транс гэты было амаль немагчыма адрозніць ад смерці; у большасці выпадкаў яна ачуньвала надзвычай нечакана. У гэты ж час мая ўласная хвароба — а мне забаранілі вызначаць мой стан якім-небудзь іншым словам — мая ўласная хвароба хутка завалодвала мной і ўрэшце вылілася ў манаманію незвычайнай, невядомай раней формы, што з кожнай гадзінай, з кожнай хвілінай рабілася ўсё мацнейшай, пакуль не забрала нада мной невытлумачальную ўладу.

Гэтая манаманія (калі можна так яе назваць) выяўлялася ў паталагічным расстройстве тых здольнасцяў розуму, якія ў метафізіцы называюцца ўвагай. Цалкам магчыма, што тлумачу я незразумела, аднак, баюся, няма такіх словаў, якія дапамаглі б мне данесці да звычайнага чытача правільнае ўяўленне пра нервовы стан напружанай цікаўнасці, з якім уся мая, кажучы простымі словамі, воля да развагаў канцэнтравалася і засяроджвалася на сузіранні самага звычайнага аб'екта рэчаіснасці.

Задумацца на доўгія гадзіны, пільна разглядаючы нейкую нікчэмную дробязь або форму аркуша кнігі, амаль на цэлы летні дзень паглыбіцца ў сузіранне дзіўнага ценю, што коса падае на габелен ці на дзверы, сысці ў сябе, пазіраючы на тленне вуголля ў каміне ці на роўнае святло лямпы або свечкі, і так праседзець усю ноч, цэлымі днямі летуценіць, удыхаючы водар кветкі, манатонна паўтараць звычайнае слова, пакуль праз шматразовае паўтарэнне розум не перастане пазнаваць яго сэнс, надоўга замерці і не варушыцца, пакуль цела не забудзецца на сваё фізічнае існаванне і здольнасць рухацца, — такімі былі самыя звычайныя і найменш

згубныя дзівацтвы, выкліканыя станам маёй душы, які быў, мабыць, не такім ужо і незвычайным, але не пакідаў ніякіх магчымасцяў для аналізу або вытлумачэння.

Аднак зразумейце мяне правільна: гэтую надзвычайную, сур'ёзную і хваравітую ўвагу да нейкіх нікчэмных прадметаў не варта блытаць са схільнасцю заглыбляцца ў думкі, характэрную для ўсіх людзей і асабліва прыемную для асобаў з палкім уяўленнем. Яна не ёсць нават гэтай схільнасцю, даведзенай да паталогіі (як можа падацца на першы погляд), гэта — нешта ў аснове сваёй і ў найвышэйшай ступені іншае і непадобнае. Бывае, што летуценнік ці чалавек апантаны, захапіўшыся прадметам зусім не нікчэмным, незаўважна для сябе губляе яго з поля зроку, заглыбляючыся ў гушчар сілагізмаў і дапушчэнняў, на якія гэты прадмет яго навёў, пакуль пасля доўгіх развагаў, якім ён з асалодай аддаваўся, не заўважае, што першапрычына іх, або *incitamentum*[1], цалкам забылася. У маім выпадку першапрычына заўсёды была нікчэмнай, аднак маё хваравітае бачанне пераламляла яе па-новаму і надавала ёй уяўную значнасць. Думак (калі яны ўзнікалі) было няшмат, аднак нават яны настойліва вярталі мяне да прадмета, які іх выклікаў, як да нейкага цэнтру. Развагі ніколі не былі прыемнымі, і калі здранцвенне заканчвалася, цікавасць да яго прычыны, якая зусім не гублялася з поля зроку, дасягала надзвычайных памераў, — гэта і было вызначальнай рысай маёй хваробы. Адным словам, сілу свайго розуму, як казалася вышэй, я марнаваў на засяроджанасць, летуценнік жа — на тэарэтызаванне.

Кнігі, якія я чытаў у тыя часы, калі і не былі прычынай майго расстройства, то праз сваю фантастычнасць і нелагічнасць адыгралі ў яго развіцці значную ролю. Сярод іх я адразу згадваю трактат высакароднага італьянца Цэлія Секунда Курыёна* «*De Amplitudine Beati Regni Dei*»[2], вялікі твор святога Аўгустына* «Пра горад Божы» і «*De Carne Christi*»[3]

[1] Стымул, матыў (лац.).
[2] «Пра веліч шчаснага Царства Божага» (лац.).
[3] «Пра цела Хрыстова» (лац.).

Тэртуліяна*, у якім парадаксальная сентэнцыя «*Mortuus est Dei filius; credible est quia ineptum est: et sepultus resurrexit; certum est quia impossibile est*»[1] надоўга захапіла мяне і каштавала некалькіх тыдняў напружанай разумовай працы, якая не мела ніякага плёну.

З гэтага бачна, што мой розум, узрушыць які магло толькі нешта трывіяльнае, зрабіўся падобным да тае акіянскае стромы, апісанай Пталямеем Гефестыёнам*, што нязменна вытрымлівала і прыступы чалавечага шаленства, і найжахлівейшае лютаванне хваляў і ветру — і толькі дотык кветкі асфадэля мог прымусіць яе ўздрыгнуць.

І хаця на першы, павярхоўны погляд магло падацца цалкам відавочным, што змены ў душэўным стане Берэнікі, якія адбыліся пад уплывам яе злашчаснае хваробы, даюць безліч нагодаў для паглыблення ў тое напружанае і анамальнае сузіранне, якое я з такімі цяжкасцямі паспрабаваў апісаць вышэй, гэтага насамрэч не здарылася. У моманты прасвятлення яе бяда прымушала мяне пакутаваць, і, узрушаны да глыбіні душы руйнаваннем яе чыстага і высакароднага жыцця, я не раз паглыбляўся ў горкія разважанні пра тыя надзвычайныя сілы, што так імкліва здзейснілі гэтае дзіўнае пераўтварэнне. Аднак адмысловы характар мае хваробы ніякім чынам не ўплываў на гэтыя думкі: яны не адрозніваліся б ад думак любога іншага чалавека, калі б ён трапіў у такія абставіны. Верны самому сабе, мой расстроены розум чапляўся за найменш істотныя, аднак найбольш незвычайныя змены ў выглядзе Берэнікі — за асобныя і самыя вусцішныя скажэнні яе чалавечай сутнасці.

У дні найвышэйшага росквіту яе незраўнанае прыгажосці я, відавочна, яе не кахаў. Падчас існавання ў гэтым ненармальным стане сэрца маё ніколі не ведала пачуццяў, а жарсці нараджаліся розумам. У шэрай смузе ранку, сярод лясных ценяў летняга поўдня ці ў начной цішыні бібліятэкі яна ўсплывала перад маімі вачыма не жывой і сапраўднай Берэнікай, а Берэнікай-мрояй, не зямным стварэннем, а яго

[1] «Памёр Сын Божы — заслугоўвае даверу, бо недарэчна, памерлы ўваскрос — не падлягае сумневу, бо немагчыма» (лац.).

вобразам, не жанчынай, якой можна захапляцца, а з'явай, якую неабходна аналізаваць, не аб'ектам закаханасці, а прадметам найглыбейшых, хаця і бязладных, развагаў. А цяпер... цяпер я заміраў у яе прысутнасці, палатнеў, калі яна набліжалася; усё яшчэ бядуючы праз яе змарнеласць і няўцешнасць, я згадаў, што калісьці яна мяне кахала, і ў нядобры час загаварыў пра заручыны.

Ужо набліжалася нашае вяселле, калі адным зімовым днём, нечакана цёплым, ціхім і туманным — адным з тых дзён, якія клічуць калыскай прыгажуні Галцыёны[1], — я сядзеў (думаючы, што застаўся адзін) ва ўнутраным пакоі бібліятэкі. Аднак, падняўшы вочы, я ўбачыў перад сабой Берэніку.

Ці маё ўсхваляванае ўяўленне, ці ўплыў туманнага дня, ці невыразны паўзмрок пакоя, ці, можа, шэрая сукенка, што складкамі спадала з яе фігуры, зрабілі абрыс яе цела такім хісткім і расплывістым... не ведаю. Яна нічога не казала, а я ні за што ў свеце не змог бы вымавіць ні слова. Мяне ахапіла ледзяное здранцвенне, сціснула невыноснае пачуццё страху, на некалькі імгненняў я знерухомеў і сцяў дыханне — мае вочы былі прыкаваныя да яе. Яна, о гора, была цалкам знясіленая, і ніводная лінія фігуры не гаварыла пра яе ранейшую. Мой пякучы погляд спыніўся на яе твары.

Лоб яе быў высокі, бледны і надзвычай ціхамірны, яго часткова закрывалі валасы, калісьці чорныя, як смоль, запалыя скроні былі зацененыя пасмамі ярка-жоўтага колеру, якія сваім фантастычным выглядам рэзка кантраставалі з яе меланхалічным абліччам. Вочы былі нежывымі і цьмянымі, здавалася, што ў іх няма зрэнак, і, мімаволі адхінуўшыся ад шклянога погляду, я пачаў разглядаць яе тонкія звялыя вусны. Яны раскрыліся, і ў загадкавай усмешцы перад маімі вачыма павольна ўзніклі зубы новай Берэнікі. О Божа, лепей бы я іх ніколі не бачыў альбо, убачыўшы цяпер, адразу б, на месцы, памёр!

[1] «Бо з прычыны таго, што Юпітэр падчас зімы двойчы пасылае па сем цёплых дзён, людзі назвалі гэтую мяккую, умераную пару калыскай прыгажуні Галцыёны» (Сіманід*) — *заўв. Эдгара По.*

Ляскат дзвярэй вярнуў мяне да нармальнага стану, і я, азірнуўшыся, зразумеў, што мая стрыечная сястра пакінула пакой. Аднак майго расстроенага мозгу яна, о гора, не пакінула, і выгнаць яе адтуль не было ніякай мажлівасці — яе і гэтае відовішча белых жахлівых зубоў. Ні плямкі на іх паверхні, ні пацямнення на эмалі, ні зазубрынкі на краях — і аднаго імгнення хапіла на тое, каб яны ўтаўраваліся ў маю памяць. Цяпер я бачыў іх нават выразней, чым тады. Гэтыя зубы!.. зубы!.. яны былі перада мной, і тут, і там, і паўсюль, здавалася, я магу да іх дакрануцца, — доўгія, вузкія і немагчыма белыя, у аблямоўцы бляклых вуснаў, як у момант тае страшнае ўсмешкі. А далей мая манаманія дасягнула найвышэйшага ўздыму, і я марна змагаўся з яе дзіўным і неадольным уплывам. З усёй бясконцасці рэчаў навакольнага свету я не мог думаць ні пра што, апроч гэтых зубоў. Я прагнуў іх з усёй сваёй вар'яцкай апантанасцю. Бачанне гэтае паглынула ўсе астатнія прадметы і ўсе мае зацікаўленні. Яны адны, адны ўвесь час стаялі перад маімі вачыма і яны адны, ва ўсёй сваёй непаўторнасці, зрабіліся сэнсам майго душэўнага жыцця. Я бачыў іх у любым святле. Разглядаў іх з усіх бакоў. Аналізаваў іх асаблівасці. Спыняўся на кожным паасобку. Разважаў над формай. Задумваўся над адрозненнямі ў будове. Я ажно скаланаўся, уяўляючы, што яны здольныя самастойна нешта адчуваць і разумець і нават без дапамогі вуснаў набываць пэўны выраз. Пра мадэмуазэль Сале* казалі, «*que tous ses pas étaient des sentiments*»[1], пра Берэніку ж я мог з упэўненасцю сказаць, *que tous ses dents étaient des idées*[2]. *Des idées!* — о, вось бязглуздая думка, што разбурала мяне! *Des idées!* — о, вось чаму я так утрапёна жадаў іх! Здавалася, яны адны здольныя супакоіць маю душу, вярнуўшы мне розум.

Тым часам звечарэла, і надышла цемра, і схавала зямлю, а пасля адступіла, і развіднела на новы дзень, і зноў пачалі згуш-

---

[1] «У кожным яе кроку — пачуццё» (фр.).

[2] «У кожным яе зубе — сэнс» (фр.).

чацца начныя прыцемкі — а я ўсё яшчэ нерухома сядзеў у тым самотным пакоі, усё яшчэ сядзеў, заглыбіўшыся ў сузіранне, і ўсё тая ж *phantasma*[1] трымала мяне ў сваёй уладзе, з усёй сваёй агіднай выразнасцю лунаючы ў паветры пакоя, дзе святло паступова ператваралася ў цень. Праз некаторы час мае мроі перарвалі крыкі жаху і разгубленасці, за імі, імгненнем пазней, пачуліся гукі ўсхваляваных галасоў і слабых журботных і пакутлівых стогнаў. Я падняўся і, адчыніўшы адну з дзвярэй бібліятэкі, убачыў у перадпакоі служанку ў слязах, якая і расказала мне, што Берэнікі... болей няма. Раніцай у яе быў прыпадак эпілепсіі, і цяпер, з надыходам вечара, яе ўжо чакае труна — усё падрыхтаванае да пахавання.

Я ачуняў у бібліятэцы; побач зноў нікога не было. Здавалася, я толькі што прачнуўся пасля блытанага і хвалюючага сну. Я разумеў, што ўжо поўнач, і добра ўсведамляў, што пасля заходу сонца Берэніку пахавалі. Аднак што адбывалася пазней, у гэты маркотны час, я не меў ніякага выразнага або, прынамсі, хаця б прыблізнага ўяўлення. Аднак у памяці засталіся ўзгадкі пра нейкі жах — жах, яшчэ жахлівейшы праз сваю цьмянасць, вусціш, яшчэ больш вусцішная праз сваю няпэўнасць. Гэта была страшная старонка ў кнізе майго існавання, запоўненая цьмянымі, агіднымі і бязладнымі ўспамінамі. Я спрабаваў расшыфраваць іх, але дарэмна; аднак час ад часу я, здавалася, чуў пранізлівы і пакутлівы жаночы крык, які ажываў у маіх вушах прывідам памерлага гуку. Я нешта зрабіў — але што? Я задаваў гэтае пытанне ўголас, і рэха шэптам адказвала мне з кутоў пакоя: «Але што?» На стале насупраць гарэла лямпа, ля яе ляжала маленькая скрынка. Нічым асаблівым яна не вылучалася, я часта бачыў яе раней — яна належала нашаму сямейнаму доктару. Аднак як яна трапіла сюды, на мой стол, і чаму я скаланаюся, гледзячы на яе? Разабрацца з усім гэтым ніяк не атрымлівалася, і тут мой погляд упаў на разгорнутую кнігу і на падкрэслены сказ. Гэта былі незвычайныя, але простыя словы паэта Ібн-Заята: «*Dicebant mihi sodales si sepulchrum amicae visitarem, curas*

[1] Прывід, фантом, відзежа (лац.).



*Гэта была страшная старонка ў кнізе майго існавання...*

*meas aliquantulum fore levatas*». Чаму, калі я прачытаў гэтыя словы, валасы на маёй галаве сталі старчма, а кроў застыла ў жылах? У дзверы бібліятэкі ціха пагрукалі, і на дыбачках увайшоў бледны, як жыхар могільніка, слуга. Ён паглядзеў дзікімі ад жаху вачыма і звярнуўся да мяне няроўным, хрыплым і вельмі ціхім голасам. Што ён казаў? Я чуў толькі ўрыўкі фразаў. Ён апавядаў пра шалёны крык, які разарваў начную цішу, пра тое, як усе ў доме сабраліся, як рушылі на голас — тут яго словы зрабіліся пранізліва-выразнымі, ён пачаў нашэптваць мне пра апаганеную магілу, пра знявечанае захутанае цела, якое ўсё яшчэ дыхала, усё яшчэ білася, усё яшчэ было жывым! Ён паказаў на маё адзенне — яно было брудным, у плямах запечанай крыві. Я маўчаў, і ён мякка ўзяў мяне за руку — яна была ўся ў слядах чалавечых пазногцяў. Ён звярнуў маю ўвагу на нейкі прадмет, прыхілены да сцяны, я глядзеў на яго некалькі хвілінаў — гэта была рыдлёўка. Я з крыкам кінуўся да стала і схапіў скрынку, што на ім стаяла. Аднак адчыніць яе я не здолеў — яна выслізнула з маіх нервовых рук, і цяжка ўпала, і разляцелася на кавалкі, і з яе са стукам вываліліся інструменты дантыста разам з трыццаццю двума маленькімі, нібыта вытачанымі са слановага біўня костачкамі, якія ўроссып пакаціліся па падлозе.

*Пераклала Ганна Янкута*

# Падзенне ў Мальстрэм*

> Шляхі Божыя ў Прыродзе — гэта не нашыя шляхі. І узоры, намі створаныя, не могуць быць сувымернымі велічы, бездані і неспазнавальнасці Ягоных стварэнняў, глыбіня якіх большая за глыбіню Дэмакрытавага калодзежа*.
>
> Джозэф Глэнвіл*

Цяпер мы ўскараскаліся на самую вяршыню стромай скалы. Некаторы час стары здаваўся занадта стомленым, каб гаварыць. «Яшчэ нядаўна, — сказаў ён нарэшце, — я мог правесці вас гэтаю сцежкаю гэтак жа лёгка, як і наймаладзейшы з маіх сыноў. Але вось ужо тры гады мінула, як здарылася са мною нешта такое, што ніколі раней не выпадала вынесці смяротнаму. А калі й здаралася нешта такое, то наўрад ці хто здолеў бы перажыць гэткі жах ды расказаць пра яго. Шэсць гадзін смяротнай жуды, якія давялося мне вытрываць, знішчылі маё цела і душу. Вы думаеце, што я — нямоглы стары? Але не! Аднаго дня хапіла, каб я ператварыўся з чорнавалосага маладзёна ў сівога як лунь старога, каб цела маё саслабела, каб нервы мае так абшкуматала, што цяпер я дрыжу ад найменшага высілку і баюся нават ценю. Ведаеце, я і зірнуць не магу з гэтай малой стромы, каб галава не закружылася».

«Малая строма», на самым краі якой так неасцярожна ўлёгся стары, абапіраючыся локцем на вострыі слізкі камень, так што большая частка ягонага цела павісла над безданню, дык вось, гэтая «строма» ўздымалася вострым гладкім адгор'ем бліскуча чорнага каменю футаў на сто пяцьдзясят вышэй за бліжнія скалы, якія натоўпам скупіліся пад намі. Нішто ў свеце не магло б прымусіць мяне наблізіцца да яе ўскрайку бліжэй чым на шэсць ярдаў. Насамрэч рызыка, з якой уладкаваўся мой спадарожнік, усхвалявала мяне да такой ступені, што я ніцма ўпаў на зямлю і ўчапіўся ў рэдкае кустоўе, не насмельваючыся нават падняць вочы да неба.

Я ляжаў быццам скуты, знерухомлены думкаю аб тым, што ў любы момант скала можа абрынуцца ад шалёнага ветру. Доўгі час я змагаўся з самім сабою, пакуль набраўся нарэшце адвагі прыўзняцца і сесці, каб агледзецца.

«Кіньце свае дзівацтвы, — сказаў мой праваднік, — я ж і прывёў вас сюды, каб як найлепей паказаць месца, дзе адбыліся падзеі, пра якія я казаў, і каб вам лацвей было слухаць і мець усё адразу перад вачыма».

«Мы цяпер знаходзімся, — працягнуў ён з той асаблівай грунтоўнасцю, што прысутнічала ва ўсёй ягонай асобе, — мы цяпер знаходзімся над самым узбярэжжам Нарвегіі, на шэсцьдзесят восьмым градусе шыраты, у вялікай правінцыі Нордланд, на тужлівых абшарах Лафатэна*. Гара, на вяршыні якой мы цяпер сядзім, — гэта Хельсэген, Хмарная. Прыўстаньце вышэй ды трымайцеся за траву, калі галава кружыцца, во так, і зірніце далей за тую паласу тумаһоў, што ўнізе, проста ў мора».

Я глянуў туды, куды паказваў стары, і ледзьве не самлеў: пада мною слаўся разлеглы абшар акіяну, каціў свае чорныя як атрамант хвалі, так што мне адразу ўзгадаліся радкі нубійскага географа* з апісаннем *Mare Tenebrarum** — Мора цемры. Чалавечае ўяўленне не зможа намаляваць сабе больш спустошанага, маркотнага краявіду, чым той, які адкрыўся маім вачам. Справа і злева, наколькі было відаць, нібы бастыён свету, распасціраліся ланцугі жахліва чорных навіслых стромаў. Іх хмурнасць была яшчэ больш падкрэсленая наплывамі хваляў, якія высока ўздымалі свае жудасныя белыя грабяні, напаўняючы прастору пранізлівым стагнаннем і выццём. Якраз насупраць мыса, на вяршыні якога мы спыніліся, на адлегласці нейкіх пяці-шасці міляў, у моры можна было ўбачыць маленькую адкрытую выспачку ці, больш дакладна, адгадаць яе знаходжанне па высокіх хвалях, што шалёна біліся аб яе берагі з усіх бакоў. Прыблізна на дзве мілі бліжэй да ўзбярэжжа ўздымалася іншая выспа, меншага памеру, стромістая і пустынная, нераўнамерна аточаная цёмнымі скаламі.

Паверхня акіяну паміж найбольш аддаленай выспаю і берагам мела ў сабе нешта незвычайнае. Нягледзячы на тое,

што вецер у бок узбярэжжа дзьмуў настолькі моцны, што невялікі карабель удалечыні ішоў пад зарыфленым трысе-лем*, час ад часу знікаючы з вачэй, занураючыся ўсім корпусам у хвалі, тут можна было назіраць нешта зусім не падобнае да звычайнай марской гайданкі. Гэта былі хутчэй нейкія кароткія і хуткія раз'ятраныя ўсплёскі ва ўсе бакі — і па ветры, і супраць ветру. Пены амаль не было, толькі скаламучаная вада зусім побач са скаламі.

«Тую выспу, што паводдаль, — зноўку загаварыў стары, — нарвежцы называюць Вург. Гэтая, найбліжэйшая да нас — Моске. За мілю адсюль на поўначы — Амбарэн. Вунь там знаходзяцца Іфлезен, Хатхольм, Кейльхельм, Суарвен і Букхольм. Крыху далей, паміж Моске і Вургам — Атэрхольм, Флімен, Сандфлезен і Стакхольм. Вось вам дакладныя назвы гэтых мясцінаў, але для чаго было наагул даваць ім найменне — гэтага ні мне, ні вам не зразумець. Чуеце што-небудзь? Бачыце, як змяняецца вада?»

Мы былі на вяршыні Хельсэген ужо хвілін дзесяць. Уздымаліся сюды з унутранай часткі Лафатэна, аддаленай ад узбярэжжа, і таму не бачылі мора, пакуль яно знянацку не адкрылася нашым вачам з вяршыні скалы. Пакуль стары прамаўляў, я злавіў сябе на думцы, што чую нарастанне нейкага пранізлівага гулу. Ён нагадваў рык вялізнага статка буйвалаў на прасторах амерыканскіх прэрыяў. У тое ж самае імгненне я ўсвядоміў, што кароткія ўсплёскі на вадзе (рыбакі звычайна называюць іх «сечкаю») раптоўна ператвараюцца ў вірлівую плынь, якая імкне на ўсход. Літаральна на вачах гэтая плынь набывала шалёную хуткасць. З кожнай хвіляй раз'юшаная навала ўзрастала. Ужо праз пяць хвілін увесь марскі абшар да самага Вурга ператварыўся ў апантаную, нястрымную лютую пачвару. Найбольш утрапёна яна шалела на тым кавалку, што паміж берагам і Моске: тут шырокая водная прастора, цяпер ссечаная ўпоперак глыбокімі шнарамі і зморшчынамі ад тысяч сустрэчных плыняў, умомант скурчылася ў страшэнных сутаргах, уздыбленая, яна сыкала, клекатала, нібы кіпень, круцілася спіраллю, утвараючы незлічоныя вялізныя віры. І ўсё гэта віхураю шпурляла і несла на ўсход з нястрым-

наю моцай і хуткасцю, быццам вадаспад, што звяргаецца з вышыні ў бездань.

Яшчэ праз некалькі хвілін уся карціна зноў раптоўна змянілася. На паверхні мора пацішэла, злагаднела, і віры адзін за адным зніклі. Вада пакрылася непамерна вялікімі паласамі пены — там, дзе раней нічога не было. Яны даўжэлі, расцягваліся па шырокім абшары, злучаліся між сабою, усмоктваючы кругавы рух аціхлых ужо віроў і нібы рыхтуючы нараджэнне яшчэ адной, яшчэ большай крутаверці. У адно імгненне, зусім нечакана, абмаляваліся яе выразныя абрысы, бездань ашчэрыла зеўру, большую за паўмілі ў дыяметры. Самы край крутаверці быў аблямаваны шырокім пасам бліскучай пены, але ні каліва яе не трапляла ў сярэдзіну жудаснай лейкі, чыя ўнутраная частка ўяўляла, наколькі можна было зазірнуць туды, гладкую, бліскучую, як гагат, сцяну вады, нахіленую да гарызонту пад вуглом градусаў сорак пяць. Яна імкліва закручвалася ўглыб няроўнымі цяжкімі штуршкамі, напаўняючы паветра вусцішнымі гукамі — ці то пранізлівым енкам, ці то рыкам, які нават вадаспад Ніягары не здолеў бы ў сваёй агоніі ўзнесці да нябёсаў.

Гара задрыжэла да самага падножжа, скалы затрэсліся. Я кінуўся на зямлю тварам долу, нервова схапіўшыся за ўбогае бадыллё.

«Гэта, — нарэшце сказаў я старому, — без сумневу, той самы вялікі вір Мальстрэма».

«Так яго часам называюць, — адгукнуўся стары. — Мы, нарвежцы, мянуем яго Москестрэм, па назве выспы Моске, якая знаходзіцца пасярэдзіне».

Звычайныя апісанні паўсюдна вядомага віру ніякім чынам не маглі падрыхтаваць мяне да таго, што я ўбачыў. Апісанне Ёнаса Рамуса*, самае падрабязнае з усіх, не можа даць нават прыблізнага ўяўлення ні пра веліч, ні пра вусцішную прыгажосць відовішча, ні пра пачуццё разгубленасці і незвычайнасці, якое ўражвае гледача. Я не магу дакладна сказаць, адкуль аўтарназіраў за вірам і пры якім надвор'і, але адно можна сцвярджаць без сумневу: не з вяршыні Хельсэгена і не ў шторм. Вось некалькі абзацаў з ягонага апісання;

варта прывесці іх тут хаця б за іх дэталёвасць, хай і даволі невыразную ў параўнанні з уражаннямі, якія выклікае само відовішча.

«Між Лафатэнам і Моске, — піша ён, — глыбіня вады дасягае трыццаці шасці-сарака марскіх сажняў, а ў іншым кірунку, бліжэй да Вэра (або Вурга), яна памяншаецца так, што ніводзін карабель не можа прайсці там, не рызыкуючы разбіцца аб скалы, нават у самае пагоднае надвор'е. Калі пачынаецца прыліў, вада з шалёнай хуткасцю ўрываецца ў пратоку паміж Лафатэнам і Моске. Гул, які падымаецца, калі вада падчас адліву стрымгалоў імкне назад да мора, толькі аддалена можна параўнаць з гулам наймагутнейшых вадаспадаў. Яго чуваць за некалькі кіламетраў, а віры і лейкі дасягаюць такой шырыні і глыбіні, што варта толькі якому караблю падысці да іх бліжэй — і яго немінуча паглыне і зацягне вірам на самае дно, а там разаб'е аб скалы на малыя трэскі. Калі ж вада зноў супакойваецца, некаторыя з іх плынь выносіць на паверхню. Але гэтыя перапынкі зацішша бываюць толькі паміж прылівам і адлівам і толькі ў пагоднае надвор'е. Доўжыцца гэта не больш за пятнаццаць хвілін, пасля гайданка зноў пачынае нарастаць. У час, калі плынь найбольш шалёная, ды яшчэ раз'ятраная штормам, небяспечна падыходзіць да яе бліжэй чым на нарвежскую мілю*. Шлюпкі, чоўны, караблі засмоктвае ў вір, ледзь толькі яны неасцярожна падыходзяць бліжэй. Даволі часта здараецца таксама, што кіты праплываюць занадта блізка ад крутаверці, і тады іх зацягвае ў яе нутро. Немагчыма апісаць енкі і лямант падчас той бясплённай барацьбы, калі яны спрабуюць вызваліцца. Аднойчы мядзведзь спрабаваў пераплысці з Лафатэна на Моске, і яго закруціла плынню і пацягнула ўніз, і ягоны рык быў такі жудасны, што яго было чуваць ажно на беразе. Вялізныя камлі ялінаў і хвояў, пасля таго як іх засмокча вір, выплываюць на паверхню абшкуматаныя і патарганыя, быццам пакрытыя густою шчэццю. Бо на самым дне — вострыя камяні, аб якія іх і разбівае ўшчэнт. Крутаверць залежыць ад прыліваў і адліваў: вада ў моры падымаецца і спадае кожныя шэсць гадзін. У 1645 годзе, у перадапошнюю нядзелю перад

Вялікім постам, з самага рання мора ўскіпала так раз'юшана, што некалькі хацінаў на самым беразе разнесла ў друзачкі».

Што да глыбіні бездані, мне не ўяўляецца магчымым хоць якім-небудзь чынам вызначыць яе паблізу ад крутаверці. Тыя самыя «сорак сажняў», відавочна, адносяцца толькі да той часткі пратокі, што бліжэйшая да берага, каля Моске або Лафатэна. Глыбіня ж у сярэдзіне Москестрэма мусіць быць непараўнальна большай. Найлепшым доказам гэтага можа быць відовішча, якое адкрылася нам з вяршыні Хельсэгена, хоць і адтуль можна было зазірнуць у пашчу бездані толькі збоку. Цяпер, стоячы на стромым адгор'і, пад якім звар'яцела біўся нарвежскі Флегетон*, я не мог не ўсміхнуцца той прастадушнасці, з якой шаноўны Ёнас Рамус згадвае як прыклад немажлівага, з ноткаю недавеਰу, показкі пра кітоў і мядзведзяў. Для мяне ж было відавочна, што нават найвялікшы лінейны карабель*, трапіўшы ў пастку гэтай смяротнай каруселі, будзе толькі лёгкім пёркам, якое паспрабавала супраціўляцца ўрагану — і было адразу ж дарэшты знішчанае.

Спробы патлумачыць прыроду гэтага феномена, некаторыя з якіх, як мне згадваецца, падаваліся на першы погляд даволі верагоднымі, цяпер зусім не задавальнялі. Агульная ідэя заключалася ў тым, што сама крутаверць, «падобна як і тры меншыя віры паміж выспамі Феро, узнікае ад таго, што хвалі, падымаючыся і падаючы, сутыкаюцца, ствараючы дзве плыні. Яны рухаюцца ў розных напрамках і, сціснутыя шэрагамі скалаў і рыфаў, утвараюць нешта падобнае да вадаспаду; і чым вышэй стаіць прыліў, тым з большай вышыні падае маса вады. Натуральны вынік гэтага працэсу — узнікненне віру або лейкі. Вялізная сіла яго ўсмоктвання дастаткова вывучаная на матэрыяле меншых па значнасці прыкладаў». Такія звесткі падае Брытанская энцыклапедыя. Кірхер*, а іншыя мяркуюць, што ў цэнтры Мальстрэма знаходзіцца скразная бездань, якая працінае ўвесь зямны шар і выходзіць на паверхню ў аддаленым месцы — як сцвярджаюць некаторыя — у Батнічным заліве*. Гэтае меркаванне абсалютна бязглуздае само па сабе. Але яно, як я цяпер усвядоміў, было адзіным, з якім уяўленне было найбольш гатовае пагадзіцца.

Сказаўшы аб гэтым праваднiку, я са здзiўленнем пачуў, што, хоць гэты пункт гледжання найбольш распаўсюджаны сярод нарвежцаў, асабiста ён яго не падзяляе. Што да папярэдняга меркавання, то стары зазначыў, што наагул няздольны зразумець яго. І тут я з iм пагадзiўся, бо, як нi пераканаўча гэта выглядае на паперы, яно робiцца зусiм незразумелым пасярод аглушальнага рыку бездані.

«Вось цяпер, калi вы ўжо наглядзелiся на вiр, — прамовiў стары, — калi мы перабярэмся вось за гэты камень i прысядзем з падветранага боку, каб не так чуваць было шум вады, я раскажу вам гiсторыю, якая пераканае вас у тым, што я нешта цямлю ў Москестрэме».

Я ўладкаваўся, каб было зручна, i ён працягнуў.

«Нас было тры браты, i мы мелi шхуну на семдзесят тонаў. Зазвычай мы хадзiлi на рыбу да выспаў, што за Моске, блiжэй да Вурга. Ля бурлiвых вiроў у моры добра ловiцца рыба, пры належных умовах i калi дастае смеласцi, каб паспрабаваць. Але з усiх жыхароў Лафатэнскага ўзбярэжжа толькi мы ўтрох заўжды хадзiлi на лоўлю да выспаў, як я i казаў. Зазвычай дзялкi знаходзяцца нашмат нiжэй на поўдзень. Там рыбу можна браць у любы час i без небяспекi, i таму там заўсёды шмат народу. Тут, памiж скалаў, месцы — самыя вяршкi: i рыбы тут нашмат болей, i рэдкiя гатункi водзяцца, так што мы, бывала, за адзiн толькi дзень мелi столькi, колькi баязлiўцам з тутэйшых рыбакоў разам не наскрэбцi i за тыдзень. І вось гэта зрабiлася для нас адчайнай гульнёй — рызыкаваць жыццём, замест таго каб проста працаваць, i смеласцю зарабляць на хлеб.

Мы трымалi сваю шхуну ў затоцы, мiляў за пяць далей па ўзбярэжжы, калi лiчыць адсюль. Звычайна ў пагоду мы скарыстоўвалi пятнаццаць хвiлiн зацiшша, каб прайсцi праз галоўную пратоку Москестрэма, нашмат вышэй за вiр, i пасля стаць на якар недзе каля Атэрхольма цi Сандфлезена: там лейкi не так шалёна вiруюць, як паўсюль. Там мы чакалi амаль да наступнага зацiшша, тады збiралiся i йшлi дамоў. Мы нiколi не выбiралiся ў гэткi шлях, калi на моры не было трывалага бакавога ветру, такога, каб мы былi ўпэўненыя, што

ён не сціхне да нашага вяртання, і, трэба сказаць, мы рэдка памыляліся на гэты конт. Толькі двойчы за шэсць гадоў нам даводзілася стаяць усю ноч на якары праз мёртвы штыль, і аднойчы мы затрымаліся на дзялцы амаль на тыдзень, ледзьве не трапілі да Абрама на піва з галадухі, і ўсё праз шторм. Ён пачаўся адразу пасля таго, як мы прыйшлі на месца, і зрабіў пратоку такой бурлівай, што і думаць няма чаго было пра вяртанне. У гэтым выпадку нас бы абавязкова вынесла ў мора, бо віры так трапалі нас, так раз'юшана шпурлялі ва ўсе бакі, што якар урэшце заблытаўся і пацягнуўся па дне. І калі б мы не трапілі ў адну з тых шматлікіх сустрэчных плыняў, якія сёння ёсць, а заўтра няма, і каб гэтая плынь не аднесла нас пад Флімен, дзе мы, на шчасце, і спыніліся, гэта быў бы канец.

Я і малой часткі не змагу вам пералічыць з тых цяжкасцяў, якія нам траплялі на дзялцы, — нядобрае гэта месца, нават у пагоду, — але мы заўсёды высільваліся і неяк вымудраліся праслізнуць праз самае жарало Москестрэма без прыгодаў, хаця былі імгненні, у якія аж дух займала: гэта калі мы траплялі за хвілю да або пасля зацішша. Часам вецер дзьмуў не так моцна, як мы разлічвалі, і мы праходзілі меншы шлях, чым хацелі б, і праз плынь шхунаю немагчыма было кіраваць. У майго старэйшага брата быў сын васямнаццаці гадоў, і я сам меў двух дужых хлапцоў. Яны былі б добраю дапамогаю ў такія хвіліны, у веславанні ды і ў лоўлі таксама, але неяк так атрымалася, што, рызыкуючы сваім жыццём, мы не насмельваліся выпрабоўваць маладзейшых, бо, вось вам святая праўда, страшэнная небяспека гэта была.

Тое, пра што я хачу апавесці, здарылася, без некалькіх дзён, амаль тры гады таму. Гэта было дзясятага ліпеня 18.. года — дзень, які месцічы ніколі не забудуць, бо менавіта тады пачаўся самы вусцішны шторм, які нябёсы пасылалі на нашую грэшную зямлю. А раніцою і нават амаль праз цэлы дзень дзьмуў лёгкі ўстойлівы ветрык з паўднёвага захаду, сонца ярка свяціла, так што нават старэйшыя з рыбакоў не маглі нічога такога прадбачыць.

Мы ўтраіх з братамі трапілі да выспаў дзесьці а другой папоўдні, і вельмі хутка шхуна запоўнілася найлепшаю рыбай.

Мы ўсе заўважылі, што яе ў моры было нашмат больш, чым звычайна. На гадзінніку была рыхтык сёмая, калі мы сабраліся і накіраваліся дадому, разлічваючы так, каб прайсці праз вір Москестрэма ў зацішша, гэта значыць роўна а восьмай.

Калі мы выйшлі, з правага борту дзьмуў свежы вецер: пэўны час мы ішлі хутка, нават не думаючы пра небяспеку, бо не было аніякіх прычын для хвалявання. Але знянацку нас адкінула назад ветрам аднекуль з-за Хельсэгена. Вось гэта было зусім дзіўна, раней такога ніколі не здаралася, і мне стала злёгку ніякавата, сам нават не ведаю, чаму. Мы скіравалі шхуну па ветры, але здавалася, што яна стаіць на месцы, зусім не набліжаючыся да пратокі. Я ўжо прапанаваў быў вярнуцца і стаць на якар, калі, азірнуўшыся назад, мы ўбачылі вялізную хмару незвычайнага меднага колеру, якая вельмі хутка запаўняла небасхіл.

Акурат у гэты час вецер, што перашкаджаў нам кіравацца наперад, сціх, і шхуна застыла ў мёртвым штылі, гайдаючыся на сустрэчных плынях ва ўсе бакі адразу. Аднак усё гэта доўжылася недастаткова доўга, каб мы мелі час падумаць, што гэта ўсё значыць. Праз якую хвіліну нас ужо накрыла штормам, а праз дзве неба зацягнула дарэшты, мора ўспенілася, і раптам стала так цёмна, што мы не маглі ўбачыць нават адзін аднаго.

Бессэнсоўна нават спрабаваць апісаць, што гэта быў за шторм. Нават найстарэйшыя нарвежскія рыбакі ніколі не бачылі нічога падобнага. Мы паспелі спусціць ветразі, перш чым нас дарэшты накрыла, але першая ж навала паваліла абедзве мачты за борт, быццам пілой па іх прайшлася, і грот-мачта пацягнула за сабою майго малодшага брата, які прывязаў сябе да яе дзеля бяспекі.

Нашая шхуна была надзіва лёгкай — нібы пёрка, так і слізгала па паверхні вады. Палуба не мела ніякіх надбудоваў, толькі невялічкі люк на носе. Яго мы заўжды моцна задрайвалі перад тым як перасякаць Мальстрэм, дзеля перасцярогі, каб вада не трапіла ў трум. Каб не гэта, мы мусілі б адразу ж пайсці на дно — некалькі разоў нас дарэшты накрывала хваляю. Як мой старэйшы брат ацалеў у гэтай смяротнай небяспецы, не магу сказаць, бо ў мяне так і не з'явілася магчымасці запы-

таць яго. Што да мяне, то калі ветрам вырвала фок, я кінуўся плазам на дошкі, нагамі ўпіраючыся ў планшыр* на носе, а рукамі ўчапіўшыся ў рым* каля фок-мачты. Я зрабіў гэта чыста інстынктыўна, і гэта найлепшае, што можна было зрабіць у замяшанні, якое ахапіла мяне.

На некалькі імгненняў мы апынуліся пад вадою, як я і казаў, мне давялося затрымаць паветра і з усёй моцы трымацца за рым. Калі я ўжо не мог больш трываць, то падняўся на калені, моцна ўчапіўшыся рукамі, і ўзняў галаву, каб свабодна дыхаць. Якраз у гэтае імгненне нашу шхуну заматляла ва ўсе бакі, яна абтрэслася, быццам сабака, які выходзіць з вады, і прынамсі часткова выплыла наверх. Я спрабаваў скінуць з сябе здранцвенне, якое скавала мой розум, і вырашыць, што варта рабіць цяпер, калі раптам нехта схапіў мяне за руку. Гэта быў старэйшы брат, і сэрца маё моцна затахкала ад радасці, што яго ўсё ж не змыла хваляю за борт. Але ў наступнае мгненне гэтая радасцьператварылася ў суцэльную вусціш: брат нахіліўся і закрычаў мне ў самае вуха адно толькі слова — «Москестрэм»!

Нікому не зразумець, што я адчуў у гэты момант. Мяне ўсяго затрэсла з галавы да ног, быццам у жорсткай ліхаманцы. Я цудоўна ведаў, што ён хацеў сказаць, я ведаў, што мой брат хацеў, каб я зразумеў. Вецер нёс шхуну ў самае жарало крутаверці Мальстрэма, і ўжо нішто не магло нас выратаваць!

Памятаеце, я казаў, што, перасякаючы Москестрэм, мы заўсёды трымаліся як мага вышэй ад віру, нават у самае зацішнае надвор'е, і нават тады вымушаныя былі чакаць і ўважліва сачыць за часам, каб трапіць на спакойную ваду, але цяпер нас несла ў самую лейку, ды яшчэ ў такую буру! На імгненне мне падумалася, што вось жа — мы павінныя трапіць туды перад самым зацішшам — ёсць яшчэ надзея! Але адразу ж я стаў праклінаць самога сябе за гэтую дурноту, за нейкія бясплённыя мары аб выратаванні. Я выдатна ведаў, што мы вырачаныя. Будзь нашая шхуна хоць дзесяць разоў вялікім дзевяцігарматным караблём — ненажэрная бездань заглынула б і яго!

Цяпер бура ціснула не так моцна, а магчыма, мы проста перасталі адчуваць яе, бо слізнулі наперад. Але затое хвалі, якія раней ветрам утрымлівала ўнізе, дзе яны бруіліся і плескаталі, цяпер узняліся вакол нас, быццам горы. Раптам змянілася і неба. Вакол было па-ранейшаму цёмна, як у пекле, але над самаю галавой пыхнуў блакітам невялікі прагал чыстага неба — такога яснага блакіту я ў жыцці сваім не бачыў — і ў гэтым прагале бліснула незвычайна зыркая велічная поўня, асвятліўшы наваколле, так што можна было разгледзець усё да дробязяў. Але, Божа мой, што за відовішча адкрылася тады маім вачам!

Я некалькі разоў паспрабаваў загаварыць з братам, але зусім нічога не было чуваць, хоць я і крычаў яму ў самае вуха. Раптам ён пакруціў галавой і, пабялеўшы як смерць, наставіў палец, быццам хацеў звярнуць на нешта маю ўвагу.

Спачатку я ніяк не мог зразумець, чаго ж ён хоча, але пасля мяне як маланкаю праняла жахлівая здагадка. Я выцягнуў гадзіннік з кішэні. Канечне — стрэлкі стаялі на месцы. У месяцовым святле я паглядзеў на яго і, заліўшыся слязьмі, шпурнуў далёка ў акіян. Гадзіннік спыніўся акурат а сёмай! Мы прапусцілі час заціша, і цяпер вір Москестрэма шалеў з усёй сваёй моцаю!

Калі шхуна добра зробленая, аснашчаная і не надта глыбока сядзіць, калі ідзе на поўнай хуткасці, хвалі ў моцны шторм быццам праслізгваюць пад ёю — гэта здаецца дзіўным людзям, далёкім ад мора, мы ж называем гэтую з'яву «асядлаць хвалі».

Дык вось, да таго часу мы вельмі добра трымаліся на хвалях у гайданцы, але цяпер агромністая хваля падхапіла нас і, падымаючыся, пацягнула за сабою ўверх, у самыя нябёсы. Не пабачыўшы на свае вочы, я б ніколі не паверыў, што хваля можа ўзняцца так высока. А пасля мы паляцелі ўніз, стрымгалоў панесліся, саслізнулі, занурыліся носам у ваду. Ад гэтага я ледзьве не згубіў прытомнасць, ажно вантробы падкаціла пад горла — так бывае, калі ў сне падаеш з высачэзнай гары. Калі мы былі яшчэ наверсе, я здолеў азірнуцца навокал, і аднаго пагляду было дастаткова. У імгненне я ацаніў нашае

месцазнаходжанне. Вір Москестрэма быў за чвэрць мілі проста перад намі, але ідовішча тое нагадвала звычайны Москестрэм не больш, чым гэты вір, які вы цяпер бачыце, нагадвае ручай ля млына. Калі б я і без гэтага не ведаў, дзе мы знаходзімся, я ніколі не пазнаў бы гэтага месца. Скуты жудою, я, сам таго не жадаючы, заплюшчыў вочы. Павекі сціснула быццам сутаргай.

Не больш чым праз дзве хвіліны мы раптам убачылі, што хвалі становяцца ніжэйшымі, і нас пачынае заліваць пенаю. Шхуна рэзка развярнулася, нахіленая на левы борт, і паімчала маланкаю ў новым напрамку. У гэтае самае імгненне нізкі, грымлівы шум вады патануў у нейкім пранізлівым енку — быццам тысячы параходных комінаў выпускалі ўсе разам пару. Мы знаходзіліся цяпер у тым пасе пены, які заўсёды акаляе крутаверць, і, канечне, я падумаў, што ў наступнае імгненне нас заглыне бездань, глыб якой мы маглі толькі няясна разгледзець на вялікай хуткасці, з якой нас круціла па коле. Здавалася, што шхуна зусім не занураецца ў ваду, а слізгае, як бурбалка, па паверхні. Правым бортам яна глядзела на бездань, а па-за левым падымалася высачэзная сцяна акіяну, зыбліваю перашкодаю ўздымаючыся паміж намі і небасхілам.

Можа здавацца дзіўным, але цяпер, калі мы былі ў самай пашчы віру, мне стала спакайней, чым тады, калі мы толькі набліжаліся. Вырашыўшы не спадзявацца больш ні на што, я пазбыўся большай часткі страху, які спачатку пазбавіў мяне здольнасці думаць. Напэўна, адчай наструніў мне нервы.

Гэта можа здацца пустой пахвальбою, але кажу я святую праўду: я стаў разважаць над тым, як гэта велічна — загінуць такім чынам і якім глупствам было з майго боку баяцца за сваё мізэрнае жыццё перад такой вялікай, такой дзівоснай праявай магутнасці Божай. Здаецца, што я ажно пачырванеў ад сораму, калі гэтыя думкі закруціліся ў галаве. Праз хвілю мяне запаланіла вострае пачуццё цікаўнасці, і я пачаў углядацца ў хвалі крутаверці. Я адчуваў моцнае жаданне вывучыць яе глыбіні, нягледзячы на ахвяру, якую ў хуткім часе павінен быў скласці, і шкадаваў толькі, што не змагу ўжо

расказаць сваім старым таварышам там, на беразе, пра таямніцы, якія мне адкрыюцца. Усё гэта, я ўпэўнены, звычайныя трызненні, якія напаўняюць чалавечую істоту ў такой нязвыклай сітуацыі, і пасля я часта думаў, што гэта бясконцае кручэнне шхуны па краі лейкі крыху затлуміла мне галаву.

Была, між іншым, адна выгода, якая паспрыяла таму, што да мяне вярнулася вытрымка, — вецер аціх, мы не маглі адчуваць яго там, унізе. Бо, як самі бачыце, пас пены знаходзіцца нашмат ніжэй, чым узровень вады ў акіяне — і тады ён уздымаўся над намі высачэзнай стромкай чорнай сцяной. Калі вам не даводзілася бываць у моры падчас вялікага шторму, цяжка патлумачыць, як зблытвае глузды віскат ветру і бясконцыя пырскі. Яны асляпляюць, аглушаюць, агаломшваюць, пазбаўляюць магчымасці думаць і дзейнічаць. Але цяпер гэтыя невыгоды амаль не дакучалі нам: як злачынцы ў камеры смяротнікаў, мы цешыліся прыемнымі дробязямі, якіх былі пазбаўленыя, калі лёс быў не да канца вырашаны.

Немагчыма палічыць, як доўга нас круціла па пенным краі лейкі. Кола за колам, мы рухаліся так дзесьці з гадзіну, хутчэй ляцелі, чым плылі, усё бліжэй пасоўваючыся спачатку да сярэдзіны паса, пасля — да жахлівага ўнутранага краю. Увесь гэты час я працягваў трымацца за рым. Мой брат ляжаў на карме, учапіўшыся за надзейна прынайтаваную пустую бочку для вады. Яна адзіная засталася на палубе, калі першым жа парывам буры ўсе рэчы змыла ў акіян. Калі шхуна зусім ужо блізка падышла да зеўры лейкі, ён выпусціў з рук бочку і кінуўся да рыму. У спохваце смяротнай жуды, амаль у агоніі, брат стаў адрываць мае рукі ад рыма, занадта малога, каб мы абодва маглі трывала ўзяцца за яго. Якая ж горыч ахапіла мяне, калі мой родны брат пачаў рабіць такое! Я разумею, што ён, відаць, канчаткова страціў глузды ад жывёльнага страху — шаленец беспрытомны, які не ўсведамляе, што робіць. Ясна, што я не стаў змагацца з ім за выгоды месца. Якая розніца, за што трымацца і ці трымацца ўвогуле — таму я пакінуў яго на рыме, а сам пасунуўся на карму і абхапіў бочку. Гэта было зусім не цяжка: шхуну несла па хвалях устойліва, на роўным

кілі, толькі гайдала ўзад-уперад ад моцных штуршкоў і сутаргаў віру. Ледзь я ўладкаваўся на новым месцы, як шхуна рэзка нахілілася на правы бок і паляцела напрасткі ў бездань. Вось тут я і вырашыў, што нам канец, толькі малітву прамармытаць паспеў.

Плазам падаючы ў прорву, я інстынктыўна аж да болю ўчапіўся ў бочку і заплюшчыў вочы. Некалькі імгненняў я не мог наважыцца расплюшчыць іх — усё чакаў раптоўнай загубы і дзівіўся, чаму бязлітасныя абдымкі віру яшчэ не сціснулі мяне ў смяротнай барацьбе. Ішлі хвіліны, а я быў жывы. Адчуванне падзення знікла, мы рухаліся па коле, як і раней, з той толькі розніцаю, што цяпер былі значна ніжэй за пенны пас на краі лейкі. Я наважыўся зноў паглядзець навокал.

Ніколі мне не забыць таго трапяткога пачуцця жуды і адначасна захаплення, якое напоўніла мяне, як толькі я расплюшчыў вочы, і ад якога заняло дух. Шхуна завісла, нібы ўтрыманая нейкай чарадзейнай сілаю, на палове свайго шляху ў бездань, на ўнутранай паверхні крутаверці: неабсяжнай у акружыне, невымернай у глыбіню. Яе нібы адшліфаваныя сцены маглі б параўнацца гладкасцю і адценнем з каштоўным чорным дрэвам, калі б не шалёная хуткасць, з якой яны круціліся па коле, і калі б не люстраныя вусцішныя водбліскі на гэтых сценах, што ўзнікалі ад прамянёў, якія поўня струменіла з невялічкага прагалу сярод хмараў. Святло бруілася маляўнічым залатым вадаспадам, адбіваючыся ад чарнаты сценаў і пранізваючы цемру аж да самых глыбіняў бездані.

Спачатку я быў занадта агаломшаны, каб спрабаваць нешта пільна разгледзець. Усплёск палахлівага, амаль сакральнага захаплення вусцішнай веліччу, што адкрылася вачам, — вось што я перажываў у тыя хвіліны. Крыху апрытомнеўшы, я неяк несвядома стаў пазіраць долу — у самую лейку. Шхуна так завісла над безданню, што без аніякіх перашкодаў можна было ахапіць паглядам усё наваколле. Яна ішла раўнютка — так, што палуба была паралельная вадзе, але сцены крутаверці сыходзілі долу пад адхонам градусаў у сорак пяць, таму здавалася, што мы ідзем амаль лежма на баку.



*Шхуна завісла, нібы ўтрыманая нейкай чарадзейнай сілаю, на ўнутранай паверхні крутаверці.*

Аднак я не мог не заўважыць, што ўтрыманне раўнавагі тут займае менш высілкаў, чым калі б мы ішлі такім жа чынам па простай вадзе. Думаю, гэта адбывалася дзякуючы шалёнай хуткасці, з якой мы імчалі.

Прамяні поўні, здавалася, асвятлялі самае дно неабсяжнай прорвы, але ўсё ж я не мог нічога дакладна разгледзець праз шчыльны туман, які ахутваў наваколле і над якім вісела чароўная ў сваёй прыгажосці вясёлка. Яна нагадвала той вузкі і валкі мост, які, па мусульманскіх паданнях, адкрывае адзіны шлях з Часу ў Вечнасць. Гэты туман, завісь мільёнаў пырскаў, быў, без сумневу, выкліканы сутычкаю высачэзных сценаў крутаверці, калі яны сыходзіліся на дне прорвы, але нечалавечы жахлівы енк, які ўзносіўся да нябёсаў з глыбіняў гэтага туману, я нават і не спрабую апісаць.

Спачатку, калі мы саслізнулі ў бездань, сарваўшыся з паса пены, што круціўся ўверсе, шхуна адразу паляцела вельмі глыбока ў кацёл, але пасля мы апускаліся даволі нераўнамерна. Мы ўсё працягвалі круціцца, але не соўгаліся размерана і плыўна — рэзкія штуршкі і коўхі то шпурлялі нас на якіх футаў сто, то прымушалі ляцець ажно на цэлае кола наперад. Нашае прасоўванне — раз-пораз усё глыбей і глыбей — было павольным, але заўважным.

Аглядаючыся на бязмежную празрыста-чорную прастору, па чыёй паверхні нас несла з неверагоднаю моцай, я заўважыў, што нашая шхуна была не адзінай рэччу, якая трапіла ў смяротныя абдымкі крутаверці. Унізе і ўверсе можна было распазнаць карабельныя абломкі, вялізныя бярвёны гонкага лесу, камлі дрэваў, і мноства больш дробных рэчаў: хатняе начынне, пабітыя скрыні, бочкі і дошкі. Я ўжо апавядаў пра нейкую хваравітую цікаўнасць, якая апанавала мяне за першым пачуццём сполаху. Здавалася, яна толькі ўзрастала разам з тым, як я набліжаўся да спаўнення свайго жудаснага лёсу. Я пільна назіраў за шматлікімі рэчамі, якія сталі нашымі спадарожнікамі ў апошняй вандроўцы. Напэўна, гэта было трызненне — бо я нават знаходзіў задавальненне ў тым, каб адгадаць, якая з іх хутчэй сарвецца ў бездань. «Гэтая вось яліна, — казаў я самому сабе, — наступная дасць нырца і

назаўжды знікне», — а пасля здзіўлена і расчаравана назіраў, як яе апярэджваў касцяк галандскага гандлёвага карабля і ляцеў долу. Нарэшце сам факт маіх пастаянных памылак выклікаў у мяне думку, якая прымусіла ўсяго мяне задрыжаць; сэрца маё зноў шалёна закалацілася.

Не, гэтым разам не страх апанаваў маю душу, але неспадзяваная надзея, якая зыркім праблескам заззяла перада мною. Яна нарадзілася аднекуль з глыбіняў памяці і часткова — з цяперашніх назіранняў. Я паспрабаваў згадаць рознае халусце, якое звычайна засцілала ўзбярэжжа Лафатэна, усё, што спачатку заглынуў і затым выплюнуў Москестрэм. Большасць з гэтага была да такой ступені знявечаная — раструшчаная і абшкуматаная, што ад першапачатковай рэчы заставаліся адны шматкі і аскепкі. Але пасля я раптам прыгадаў, што некаторыя з іх былі быццам зусім не кранутыя стыхіяй.

Цяпер я быў абсалютна ўпэўнены ў прычыне гэтае з'явы: відавочна, толькі знявечаныя дарэшты ахвяры дасягнулі самага дна, дзе і былі раструшчаныя, а іншыя рэчы трапілі ў вір так позна або чамусьці апускаліся так павольна, што не паспявалі скончыць шлях да пачатку прыліву ці адліву. Я гатовы быў дапусціць, што ў такім выпадку іх магло зноў вынесці плынню на паверхню мора, так што іх не напаткаў лёс тых рэчаў, якія прорва заглынула раней ці ўсмоктвала з большай хуткасцю. Акрамя гэтага, я зрабіў тры істотныя назіранні. Першае: звычайна чым большымі па памерах былі рэчы, тым хутчэй яны знікалі ў віры. Другое: з дзвюх рэчаў аднолькавага памеру тая, што мела форму сферы, апускалася хутчэй, чым тая, што мела нейкую іншую форму. І трэцяе: з дзвюх рэчаў роўнага памеру павольней патанала тое, што мела цыліндрычную форму.

Ужо пасля выратавання я неаднойчы размаўляў пра гэта са старэнькім настаўнікам з мясцовых — гэта ён навучыў мяне гэтым мудрагелістым слоўцам: «цыліндр» і «сфера». Ён і патлумачыў мне, толькі я забыўся ўжо, у чым там соль, што гэтая з'ява, якую я назіраў, — натуральная для рэчаў рознай формы. Ён апавёў мне, як так атрымліваецца, што цыліндр,

які зацягвае вірам, больш трывала яму супраціўляецца, цяжэй паддаецца плыні, чым рэчы іншай формы такога ж аб'ёму[1].

Была і яшчэ адна дзівосная прычына, якая паўплывала на гэтыя мае развагі. Менавіта яна прымусіла мяне наважыцца на спосаб, які пасля і ўратаваў мяне: кожнага разу, на кожным вітку страшэннай спіралі, мы абміналі то бочку, то абломак рэі, то карабельную мачту. Тыя рэчы, што былі на адным узроўні з нашаю шхунай, калі я толькі расплюшчыў вочы, аглядаючы вусцішную прыгажосць крутаверці, цяпер былі нашмат вышэй: здавалася, яны ледзьве скрануліся з ранейшага месца.

Больш я ні хвіліны не вагаўся. Я вырашыў як мага мацней прывязаць сябе да бочкі, за якую цяпер трымаўся, адрэзаць найтоў і кінуцца разам з ёю ў мора. Я знакамі спрабаваў прыцягнуць братаву ўвагу да бочак, што плавалі поруч з намі, зрабіў усё, што мог, каб патлумачыць яму, што я збіраюся рабіць. Мне падалося, што ён нарэшце зразумеў маю задуму, але ў адчаі адно пахітаў галавою і адмовіўся скрануцца са свайго месца. Немагчыма было прымусіць яго, да таго ж справа патрабавала тэрміновасці, таму, хоць сэрца маё аблівалася крывёю, я пакінуў брата на волю лёсу. Прывязаўшы сябе да бочкі тымі ж вяроўкамі, якія ўтрымлівалі яе на карме, я, ні хвіліны больш не марудзячы, даў нырца ў бездань.

Вынік быў такі, на які я і спадзяваўся. То бок цяпер я сам апавядаю вам пра ўсё гэта і вы бачыце мяне жывым і ведаеце, якім чынам я выкараскаўся, і можаце ўжо здагадацца, што было далей. Таму я ўжо хутка скончу свой аповед. З гадзіну, можа, прайшло пасля таго як я выкінуўся са шхуны, калі яна, ужо знаходзячыся значна ніжэй за мяне, раптам на шалёнай хуткасці абярнулася разы тры-чатыры і назаўсёды знікла ў вірлівай прорве крутаверці, забраўшы з сабою і майго любага брата. Бочка ж, да якой я быў прывязаны, прайшла крыху больш за палову свайго шляху да дна лейкі, калі лічыць з таго месца, дзе я пакінуў шхуну, і раптоўна нешта ў бяскон-

[1] Гл.: Архімед. «De Incidentibus in Fluido» — «Пра целы на плыву», кніга 2 *(заўв. Э. По)*.

цым кручэнні віру моцна змянілася. Адхон страшных сцен увачавідкі рабіўся менш стромкім. Вір круціўся ўсё павольней. Паступова вада стала спакайнейшай, туман і вясёлка зніклі, і дно лейкі пачало пакрысе ўздымацца. Неба ачысцілася, вецер сціх, поўня ззяла ўжо на самым захадзе, і я апынуўся на паверхні акіяну, проста насупраць узбярэжжа Лафатэна, на месцы, дзе толькі што біўся апантаны вір Москестрэма. Надышоў час зацішша, але мора яшчэ не супакоілася пасля шторму і ўздыблівала высачэзныя хвалі. Мяне падхапіла імклівай плынню Мальстрэма і за некалькі хвілінаў даімчала да берага, на дзялкі мясцовых рыбакоў. Я быў настолькі зняможаны змаганнем, што цяпер, калі небяспека ўжо мінула, ледзьве дыхаючы ад пералжытага жаху, не мог вымавіць ні слоўца. Мяне падабралі старыя сябрукі, колішнія паплечнікі, але не пазналі мяне — дый як пазнаць прыхадня з таго свету! Валасы мае, якія яшчэ дзень таму былі чорныя, бы смала, ушчэнт пасівелі, як бачыце. Яны сказалі, што і сам выраз твару ў мяне змяніўся непазнавальна. Я апавёў ім пра ўсё, што адбылося, але яны мне не паверылі. Цяпер вось апавядаю вам, але і не спадзяюся нават, што вы дасце ўсяму гэтаму веры больш, чым бесклапотныя рыбакі з Лафатэна».

*Пераклала Юлія Шадзько*

# Залаты жук

> Гэй-гэй! Ён скача, бы шалёны,
> Яго тарантул укусіў...
> А. Мэрфі. «Усе памыляюцца»*

Шмат гадоў таму я сябраваў з містэрам Уільямам Легранам. Ён паходзіў са старажытнага гугеноцкага роду і некалі быў уладальнікам саліднай маёмасці, але шэраг няўдачаў давёў яго да суцэльнай беднасці. Ратуючыся ад ганебнага краху, ён пакінуў Новы Арлеан, горад сваіх продкаў, і пасяліўся на востраве Саліван пад Чарлстанам, што ў Паўднёвай Караліне.

Востраў гэты даволі незвычайны. Амаль увесь ён складаецца з аднаго марскога пяску і цягнецца ўсяго тры мілі ў даўжыню і не больш за чвэрць мілі ў шырыню. Ад кантынента востраў адмяжоўвае ледзь прыкметная ручаінка, што струменіць між густога глеістага трыснягу, дзе так любяць гняздзіцца балотныя птушкі. Расліннасць на востраве, як можна здагадацца, даволі рэдкая і чэзлая. Не знойдзеш тут ніводнага вялікага дрэва. Ля заходніх межаў, дзе стаіць форт Моўлтры* і месцяцца ўбогія забудовы, што на лета займаюць стомленыя гарадскім пылам і мітуснёй уцекачы з Чарлстану, можна пабачыць шурпатыя пальмы, але сам востраў, за выняткам гэтай заходняй яго часткі і белай паласы цвёрдага пляжа на ўзбярэжжы, цалкам пакрыты густым зараснікам мірту, што так цэніцца садоўнікамі Англіі. Кусты часта сягаюць пятнаццаці-дваццаці футаў у вышыню і сплятаюцца ў амаль непраходныя зараснікі, насычаючы паветра сваім водарам.

На лясной прагаліне ля ўсходніх, больш аддаленых межаў вострава Легран пабудаваў сабе хаціну, у якой і жыў, калі я ўпершыню па волі лёсу сустрэўся з ім. У хуткім часе нашае знаёмства перарасло ў моцнае сяброўства, і не дзіва, бо пустэльнік быў чалавекам адукаваным і надзвычай разумным, хоць і схільным пры гэтым да мізантропіі і хваравітых зменаў настрою — ад энтузіязму да меланхоліі. У Леграна

было шмат кніг, але чытаў ён рэдка. Час бавіў на паляванні, рыбалцы, шпацырах па пляжы і ў зарасніках мірту, шукаючы ракавінкі і рэдкіх насякомых, а яго энтымалагічнай калекцыі мог бы пазайздросціць сам Свамердам*. У гэтых падарожжах Леграну звычайна спадарожыў стары мурын па імені Юпітэр, які яшчэ да збяднення гаспадара атрымаў вольніцу, але ні пагрозы, ні абяцанкі не маглі прымусіць яго вырачыся свайго, як той лічыў, права паўсюль ісці следам за маладым «масам Ўілам». Цалкам верагодна, родныя Леграна, не зусім упэўненыя ў цвярозасці яго розуму, унушылі тыя ж падазрэнні Юпітэру, каб ён даглядаў і ахоўваў гора-вандроўніка.

У шыротах вострава Саліван зімы лютуюць рэдка, а ўвосень камін распальваюць толькі ў выключных выпадках. Аднак у сярэдзіне кастрычніка 18.. года дзень выдаўся надзвычай халодным. На самым змярканні я прадзёрся праз вечназялёныя зарасці да хаціны свайго сябра, з якім не бачыўся ўжо некалькі месяцаў, — у той час я жыў у Чарлстане, за дзевяць міляў ад вострава, але ж вандроўкі па моры былі тады зусім не такімі зручнымі, як цяпер. Наблізіўшыся да хаціны, я, як заўсёды, пагрукаўся, але, не пачуўшы адказу, дастаў схаваны ключ, адчыніў дзверы і ўвайшоў. Вясёлае полымя гарэла ў чарэні. Агонь у гэту пару года мяне здзівіў і, улічваючы мой стан, прыйшоўся дарэчы. Я скінуў паліто, уладкаваўся ў фатэлі насупраць каміна і, слухаючы патрэскванне дроваў, пачаў чакаць прыходу гаспадароў.

Яны прыйшлі неўзабаве, як узялося на цемру, і сустрэлі мяне надзвычай сардэчна. Юпітэр з усмешкай да вушэй адразу кінуўся гатаваць на вячэру курапатак. У Леграна ж быў адзін з яго прыступаў энтузіязму (а як іначай гэта назваць?). У той дзень ён знайшоў невядомага яму раней двухстворкавага малюска, прадстаўніка новага віду, і нават больш за тое — з дапамогай Юпітэра злавіў жука-скарабея, якога лічыў сваім адкрыццём і меркаванне пра якога хацеў пачуць ад мяне наступнага дня.

— А чаму не сёння? — запытаўся я, паціраючы адубелыя рукі над полымем і ў думках праклінаючы ўсё скарабеева племя.

— Каб жа я толькі ведаў, што вы тут! — усклікнуў Легран. — Мы не сустракаліся так даўна. Як жа я мог прадбачыць, што вы наведаецеся да мяне менавіта сёння?! Па дарозе дадому я сустрэў лейтэнанта Дж. з форта і вельмі неабачліва аддаў яму жука, таму, на жаль, пабачыць насякомае атрымаецца толькі з раніцы. Заставайцеся нанач, я пашлю па яго Юпітэра, як толькі надыдзе світанак. Гэта ж найпрыгажэйшая рэч ва ўсім свеце!

— Што? Світанак?!

— Ды не! Жук! Незвычайнага залатога колеру, памерам з вялікі грэцкі арэх, з дзвюма ярка-чорнымі плямкамі з аднаго боку і яшчэ адной прадаўгаватай з другога. А каб такія *вусікі* мець...

— Ды які там медзь, маса Ўіл, — перабіў яго Юпітэр, — гэта ж залаты жук, з чыста золата, і ўнутры, і звонкі, асабліва ж крылцы, я ў жыцці не бачыў такога цяжкога жука.

— Можа, і так, Юпі, — адказаў Легран, як мне падалося, больш суха, чым таго патрабавала сітуацыя, — але ж ці варта праз гэта спальваць нашу дзічыну? Аднаго колеру, — тут ён павярнуўся да мяне, — дастаткова, каб пацвердзіць словы Юпітэра. Падаецца мне, вы ніколі раней не бачылі такога яркага металічнага бляску, як на яго лусцы. Але ўпэўніцца ў гэтым вы зможаце толькі заўтра. А я тым часам паспрабую даць агульнае ўяўленне пра яго форму.

З гэтымі словамі ён сеў за маленькі столік, на якім стаялі чарніліца і пяро, але не было ніводнага аркуша. Ён пашукаў у шуфлядцы, ды не знайшоў і там.

— Нічога, — сказаў ён з глыбіні пакоя, — падыдзе й гэты, — і, выцягнуўшы з кішэні камізэлькі нейкі абрывак, падобны да кавалка бруднай паперы для пісьма, зрабіў на ім грубы накід пяром. Пакуль Легран маляваў, я працягваў сядзець у сваім фатэлі ля агню, бо пачуваўся яшчэ зусім зябка. Скончыўшы накід, ён, не падымаючыся з месца, працягнуў мне паперу. А калі я ўзяў яе, раптам пачулася моцнае гырканне, і нехта зашкробся ў дзверы.

Юпітэр адчыніў, і тут вялікі гаспадароў ньюфаўндленд уварваўся ў пакой, ускінуў мне лапы на плечы і атуліў мяне

ласкай, мабыць, памятаючы маю ўважлівасць да яго падчас папярэдніх візітаў. Калі ж яго свавольствы скончыліся, я зірнуў на паперу і, сказаць папраўдзе, дужа здзівіўся, пабачыўшы накід.

— Так, — пачаў я, прыгледзеўшыся да малюнка, — павінен прызнаць, гэта напраўду дзіўны жук. Абсалютна мне невядомы. Гэта нешта нечуванае, калі, канечне, не чэрап — эмблема смерці, бо менавіта да яго накід, па-мойму, падобны найбольш.

— Чэрап! — ускрыкнуў Легран. — Так, сапраўды, на паперы ён, без сумневу, да яго падобны. Дзве чорныя верхнія плямкі нагадваюць вочы, так? А прадаўгаватая пляміна ўнізе нібы рот, і па форме яго цела — авал.

— Магчыма, — сказаў я. — Але я баюся, вы проста благі мастак, Легран. Давядзецца мне самому агледзець жука, каб скласці хоць якое ўяўленне пра яго выгляд.

— Ну, не ведаю, — адказаў Легран крыху пакрыўджана. — Я малюю даволі прыстойна — прынамсі, *мушу* так маляваць, бо настаўнікі ў мяне былі добрыя, а я лічу сябе не такім ужо й няздарам.

— Тады, мой дружа, вы, мабыць, жартуеце, бо гэта даволі прыстойны *чэрап*, я б нават сказаў, *проста цудоўны* чэрап зыходзячы з абывацельскіх уяўленняў пра яго фізіялагічную будову, і ваш жук мусіць быць вельмі незвычайным жуком, калі нагадвае яго. З гэтага падабенства маглі б вынікнуць розныя цікавыя забабоны. Думаю, вы можаце назваць яго *scarabaeus caput hominis* — «скарабей чалавечая галава» ці нешта накшталт таго, у прыродазнаўчых энцыклапедыях шмат такіх назваў. Але ж дзе вусікі, пра якія вы згадвалі?

— Вусікі! — усклікнуў Легран (ён заўсёды расчульваўся, калі гаворка заходзіла пра іх). — Упэўнены, вы павінны іх бачыць. Я намаляваў іх гэтак жа выразна, як у сапраўднага жука. Мне падаецца, гэтага дастаткова.

— Ну-ну, — заўважыў я, — можа, вы і малявалі, але я іх тут не бачу.

І без далейшых тлумачэнняў я працягнуў яму паперу, не жадаючы больш раздражняць сябра, але пры гэтым у моцным здзіўленні ад таго, што адбылося. Яго нездаровы гумар

мяне азадачыў. Што ж да малюнка, вусікаў там дакладна не было, а сваімі абрысамі жук вельмі нагадваў звычайны чэрап.

Легран злосна схапіў паперку і ўжо збіраўся скамечыць яе і кінуць у агонь, як раптам яго позірк на імгненне спыніўся на малюнку. Твар яго ўмомант зрабіўся ярка-чырвоным, а потым рэзка збялеў. Некалькі хвілінаў ён безупынку разглядаў і вывучаў малюнак, седзячы ў фатэлі. Нарэшце ўстаў, узяў са стала свечку і заняў месца ў самым дальнім куце пакоя — на матроскім куфры. Там ён зноў вельмі пільна агледзеў абрывак, круцячы яго ў руках у розныя бакі. За ўвесь гэты час ён не прамовіў ні слова, і яго паводзіны мяне моцна здзівілі. Але я абачліва вырашыў не нагнятаць напружанасць сябра сваімі заўвагамі. Праз некаторы час Легран дастаў з кішэні паліто партманэт, асцярожна паклаў туды паперку і схаваў яго ў пісьмовым стале, зачыніўшы на ключ. Цяпер, падаецца, ён крыху супакоіўся, але яго ранейшы запал знік. І ўсё ж Легран выглядаў ужо не столькі сярдзітым, колькі заклапочаным. З набліжэннем ночы ён усё больш заглыбляўся ў свае думкі, і нават мае жарты не маглі выцягнуць яго з гэтага стану. Папярэдне я збіраўся пераначаваць у хаціне свайго сябра, як часцяком рабіў гэта раней, але, зважаючы на настрой гаспадара, палічыў больш разумным сысці. Ён не ўпрошваў мяне застацца, але на развітанне моцна пацiснуў руку з яшчэ большай сардэчнасцю, чым звычайна.

Пасля таго візіту мінуў, мабыць, месяц (увесь гэты час я не атрымліваў ад Леграна ніякіх навінаў), як раптам да мяне ў Чарлстан завітаў яго служка Юпітэр. Ніколі я не бачыў добрага старога мурына такім засмучаным. Я спалохаўся, што з маім сябрам здарылася нешта страшнае.

— Ну, Юпі, — сказаў я, — што гэтым разам? Як там твой гаспадар?

— Дальбог, маса, хутчэй дрэнна, чым добра.

— Дрэнна?! Вельмі прыкра чуць гэта. На што ж ён скардзіцца?

— А тое й яно, што маўчыць, дый годзе. А яму ж так пагана.

— Пагана, кажаш? Дык што ж ты маўчыш?! Ён што, ляжыць, не ўстае?

— Ды якое там! Дома й абцугамі не ўтрымаеш. А як сыдзе, не знойдзеш. Ой, баліць маё сэрца за масу Уіла.

— Юпітэр, хацеў бы я ведаць, што ты маеш на ўвазе. Ты кажаш, твой гаспадар захварэў. А ці не казаў ён, што ў яго баліць?

— Толькі ж не злуйце, маса. Маса Уіл не кажа, што з ім, але ж самі падумайце, чаго ён бегае паўсюль, галаў апусціўшы, белы, як гусак, ды на дошцы ўсё нешта крэсліць.

— Што крэсліць, Юпітэр?

— Ды значкі нейкія, ніколі ў жыцці такіх не бачыў. Ой, моцна мяне гэта пужае, скажу я вам. Яго цяпер трэба з вачэй не спускаць. А ўчора праспаў я, дык ён, як сонца яшчэ не ўзышло, уцёк і блукаў недзе ўвесь божы дзень. А я ўзяў вялізную палку ды збіраўся быў пабіць яго, як прыйдзе, але не паднялася мая рука, расчуліўся, як пабачыў гэтага небараку.

— Што?! Ого! Ведаеш, напэўна, так лютаваць не варта. Не бі бедалагу, Юпітэр, ён можа гэтага не вытрымаць. А ці ёсць у цябе нейкія здагадкі, што магло спрычыніцца да хваробы ці зменаў у яго паводзінах? Можа, здарылася што благое, пакуль мяне не было?

— Ды не, маса, потым нічога благога не здарылася. Якраз у той дзень, калі вы былі ў нас, яно й здарылася.

— Як так? Што ты маеш на ўвазе?

— Жука маю.

— Каго?

— Ну, жука таго. Думаю, гэта масу Уіла залаты жук у галаву ўкусіў.

— А чаму ты так лічыш?

— Па-першае, лічу лапы вялізныя, па-другое, рот шырачэзны. Ніколі раней такога страшнага жука не сустракаў — б'е ды кусае ўсё, што трапіць. Маса Уіл спаймаў яго, потым выпусціў, тады, мабыць, і цапнуў. Пашча страшная-страшная, голымі рукамі яго не возьмеш, дык я ўзяў кавалкам паперы, побач валяўся, закруціў у яго і зяпу заткнуў. Вось так.

— І ты напраўду думаеш, што твайго гаспадара пакусаў жук і нейкім чынам спрычыніўся да яго хваробы?

— Нічога не думаю, ведаю я. Чаму ж ён сніць пра золата, калі жук не кусаў? Шмат я чуў пра такіх жукоў.

— А адкуль ты ведаеш, што яму золата сніцца?

— Як адкуль? У сне ён пра яго гаворыць. Адкуль жа яшчэ?!

— Добра, Юпі, мабыць, ты маеш рацыю. Але чым я абавязаны твайму неспадзяванаму сённяшняму візіту?

— Вы пра што гэта, маса?

— Ці прынёс ты мне якое-небудзь пасланне ад Леграна?

— Ніякага паслання, маса, толькі пісьмо, — і Юпітэр працягнуў мне цыдулку наступнага зместу:

«Дарагі ***,

Чаму вы так даўна да нас не наведваліся? Спадзяюся, вы не пакрыўдзіліся на якую-небудзь маю нетактоўнасць. Але не, гэта проста немагчыма.

З часу нашай апошняй сустрэчы адбыліся падзеі, якія моцна мяне ўзрушылі. Мне неабходна вам нешта сказаць, але як гэта зрабіць і ці варта казаць наогул, не ведаю.

Цягам вось ужо некалькіх дзён я пачуваюся блага, а бедны стары Юпі сваёй добразычлівасцю і ўвагай прыносіць мне толькі раздражненне, часам я ледзь стрымліваюся. Можаце сабе ўявіць? Надоечы ён падрыхтаваў вялізную палку, каб пабіць мяне толькі за тое, што я ўцёк з-пад яго нагляду і ўвесь дзень правёў на самоце між узгоркаў мацерыка. Думаю, толькі хваравіты выгляд выратаваў мяне ад лупцоўкі.

Да маёй калекцыі не дадалося нічога новага.

Калі гэта толькі будзе зручна, калі ласка, прыязджайце разам з Юпітэрам. *Вельмі* прашу. Я хачу пабачыцца з вамі *сёння ўвечары* па справе, якая не церпіць адкладання. Запэўніваю вас, справа гэтая важная надзвычайна.

З найлепшымі пажаданнямі,

Ваш Уільям Легран».

У гэтым лісце было нешта такое, што адразу ўстрывожыла мяне. Стыль пісьма рэзка адрозніваўся ад звычайнай манеры Леграна. Што прыходзіць да яго ў снах? Якая новая фантазія захапіла яго ўразлівы розум? І што гэта за «надзвычайна важная справа», якую ён хоча ажыццявіць? Аповеды Юпітэра пра Леграна не абяцалі нічога добрага. Я баяўся, што

цяжар няўдачаў зусім звёў з розуму майго сябра. І таму, не марудзячы ні хвіліны, я сабраўся ў дарогу са старым мурынам.

Наблізіўшыся да прычала, я заўважыў на дне лодкі, на якой мы мусілі адплысці, зусім новую касу і тры рыдлёўкі.

— Што гэта значыць, Юпітэр? — запытаўся я.

— Каса гэта, маса, і рыдлёўкі.

— Маеш рацыю. Але што яны тут робяць?

— Касу і рыдлёўкі прасіў мяне купіць у горадзе маса Уіл, і чортаву ж купу грошай выклаў я за іх.

— Але, у імя ўсіх загадак на свеце, што твой маса Уіл збіраецца рабіць з гэтымі косамі і рыдлёўкамі?

— Адкуль жа мне ведаць? Ды чорт мяне пабяры, калі ён сам ведае. Але гэта жук ва ўсім вінаваты, напомніце маё слова.

Вырашыўшы, што задаваць пытанні Юпітэру больш не мае ніякага сэнсу, бо прычынай усяго яму бачыўся «залаты жук», я ступіў у лодку, і мы паплылі. Моцны й прыемны ветрык у хуткім часе дамчаў нас да маленькай бухты на поўнач ад форта Моўлтры, і праз дзве гадзіны пешай хады мы дабраліся да хаціны майго сябра. На гадзінніку было каля трох. Легран нецярпліва чакаў нас. Ён схапіў і паціснуў маю руку з надзвычайнай сардэчнасцю, што яшчэ больш умацавала мае падазрэнні. Бледнасць яго твару была амаль змярцвелай, а глыбока запалыя вочы свяціліся нездаровым бляскам. Спачатку даведаўшыся пра яго здароўе, я, абачліва падбіраючы словы, запытаўся, ці атрымаў ён назад скарабея ад лейтэнанта Дж.

— О так! — адказаў ён, моцна пачырванеўшы. — Я забраў яго на наступны ж дзень. І цяпер нішто не зможа разлучыць мяне з ім. Ведаеце, Юпітэр на яго конт не памыліўся.

— Што вы маеце на ўвазе? — запытаў я, прадчуваючы нядобрае.

— Гэты жук з чыстага золата.

Ён прамовіў гэтыя словы так сур'ёзна, што я быў проста агаломшаны.

— Гэты жук зробіць мяне багатым, — працягваў ён, пераможна ўсміхаючыся, — і дапаможа мне вярнуць сямейную маёмасць. Што ж дзіўнага ў тым, што я так цаню яго? Калі Лёс

вырашыў адарыць мяне ім, то мне варта скарыстаць гэты шанец належным чынам, і тады я знайду золата, на якое ён мне пакажа. Юпітэр, прынясі скарабея!

— Што?! Жука?! Не буду я яго чапаць, каб на яго ліха. Самі бярыце, як на тое ваша воля.

Легран велічна і годна ўстаў і паднёс мне жука, якога выцягнуў са шклянога футарала. Гэта быў прыгожы скарабей, у той час яшчэ зусім новы від, надзвычайная знаходка ў навуковым свеце. На яго цельцы — дзве круглыя чорныя плямкі з аднаго канца і адна прадаўгаватая з другога. Луска надзвычай цвёрдая і бліскучая, нібы адпаліраванае золата. І важыў ён таксама даволі шмат. Улічваючы ўсё гэта, я наўрад ці мог ганіць Юпітэра за яго меркаванні пра жука, але якім чынам патлумачыць згоду Леграна з гэтымі меркаваннямі, я ніяк не мог сабе ўявіць.

— Я паслаў па вас, — пачаў ён надзвычай напышлівым тонам, калі я нарэшце агледзеў жука, — я паслаў па вас, каб заручыцца падтрымкай і дапамогай і дазволіць Лёсу і жуку здзейсніць сваю волю.

— Дарагі Легран, — перабіў я яго, — вы крыху занядужалі. Цяпер вам трэба паберагчы сябе, паляжаць колькі дзён. А я застануся з вамі, пакуль вы не папravіцеся. Гэта проста гарачка і...

— Памерайце мне пульс.

Я прыклаў пальцы да яго рукі і, папраўдзе кажучы, гарачкі ў яго не адчуў.

— Але ж можна хварэць і без гарачкі. Дазвольце мне, калі ласка, даць вам колькі медычных парадаў. Па-першае, кладзіцеся ў ложак, па-другое...

— Вы памыляецеся, — перабіў ён мяне. — Мяркую, я знаходжуся пад уплывам нервовага ўзбуджэння, якое і ёсць прычынай майго стану. Калі вы напраўду жадаеце мне дабра, то дапаможаце мне гэтае ўзбуджэнне пераадолець.

— А якім чынам?

— Вельмі проста. Мы з Юпітэрам хутка рушым у горы на мацярык, а ў гэтай вандроўцы нам спатрэбіцца падтрымка чалавека, якому мы цалкам можам даверыцца. І вы — той адзіны,

каму я ў стане давяраць. Незалежна ад таго, што чакае нас у гарах — поспех ці правал, маё нервовае ўзбуджэнне спадзе.

— Лічу сваім абавязкам суправаджаць вас, але ж ці не хочаце вы сказаць, што гэты д'ябальскі жук мае нейкае дачыненне да вашай вандроўкі?

— Так, мае.

— У такім выпадку, Легран, я ні ў якім разе не хачу ўдзельнічаць у гэтай абсурднай авантуры.

— Вельмі прашу прабачэння. Значыць, нам давядзецца здзейсніць вандроўку самім.

— Самім?! Гэта ж вар'яцтва! Чакайце, а колькі часу вы плануеце там правесці?

— Магчыма, усю ноч. Мы павінныя выйсці зараз жа і, што б там ні было, вярнуцца на досвітку.

— Але ці можаце вы даць мне слова гонару, што як толькі ваш капрыз ажыццявіцца і справы з жуком (о божа!) вырашацца вам на радасць, вы вернецеся дахаты і будзеце ва ўсім слухацца мяне як вашага доктара.

— Так, даю слова, але ж трэба спяшацца, часу ў нас мала.

З каменем на душы я рушыў за сваім сябрам. Мы выправіліся каля чацвертай гадзіны — Легран, Юпітэр, сабака і я. Юпітэр трымаў у руках касу і рыдлёўкі, якія сам напрасіўся несці, як мне падалося, больш са страху даверыць інструменты гаспадару, чым ад жадання дагадзіць ці дапамагчы. Быў ён у надзвычай прыгнечаным настроі і ўсю дарогу прыгаворваў: «Чортаў жук!» Я ж нёс некалькі таемных ліхтароў, у той час як Легран цешыўся са свайго жука, трымаючы яго на матузку і разгойдваючы падчас хады з выглядам сапраўднага штукара. Пабачыўшы гэту апошнюю яскравую праяву хваробы майго сябра, я ледзь стрымліваў слёзы. Але палічыў найлепшым пасміхацца з яго выдумкі хаця б цяпер ці да таго моманту, пакуль не знайду нейкі іншы, больш дзейсны спосаб паўплываць на яго. А тым часам я спрабаваў, хоць і безвынікова, распытаць Леграна пра прычыну нашай вандроўкі. Але, спакусіўшы мяне выправіцца ў дарогу, ён і чуць не хацеў пра нейкія другарадныя тэмы, а ўсе мае пытанні адорваў адным адказам: «Пабачым!»

Праз ручай, што аддзяляе востраў, мы перабраліся на лодцы і, падымаючыся ўсё вышэй па стромкіх берагах мацерыка, скіраваліся на паўночны захад, па землях надзвычай дзікіх і спустошаных, дзе даўно не ступала нага чалавека. Легран рашуча вёў нас наперад, робячы кароткія перапынкі то тут, то там, каб адно спраўдзіць пазнакі, зробленыя падчас папярэдняй вандроўкі.

У дарозе мінула дзве гадзіны, і сонца ўжо садзілася, калі мы нарэшце ступілі ў мясціны, яшчэ больш змрочныя, чым тыя, што засталіся ззаду. Яны нагадвалі плато па дарозе да амаль недасяжнай вяршыні ўзгорка. З верху да нізу яго пакрывалі густыя лясы, і то тут, то там былі раскіданыя вялізныя абломкі горнай пароды, што ледзь трымаліся ў зямлі, і ў бальшыні сваёй не падалі ў лагчыны ўнізе толькі дзякуючы дрэвам, на якія абапіраліся. А глыбокія равы, разразаючы паверхню плато ў розных напрамках, толькі дадавалі гэтаму змрочнаму месцу суровай велічы.

Пласкагор'е, на якое мы ўскараскаліся, скрозь зарасло ажыннікам, і, як мы ў хуткім часе пераканаліся, прадзірацца праз яго было магчыма адно з дапамогай касы. На загад гаспадара Юпітэр пачаў расчышчаць для нас дарогу ў напрамку неймаверна высокага цюльпанавага дрэва ў атачэнні васьмі ці дзесяці дубоў. Уздымаючыся над імі, яно пераўзыходзіла ўсе вядомыя мне дрэвы вытанчанасцю сваёй лістоты, вабнасцю кроны, раскідзістасцю галінаў і тою веліччу, што ўнушаў яго незвычайны выгляд. Калі мы дабраліся да цюльпанавага дрэва, Легран запытаўся ў Юпітэра, ці здольны той узлезці на яго. Стары, агаломшаны пытаннем, пэўны час нічога не адказваў. Нарэшце ён наблізіўся да вялізнага камля, павольна абышоў вакол і надзвычай уважліва яго агледзеў. Скончыўшы сваё даследаванне, ён прамовіў:

— Так, маса, Юпі ўзлезе на ўсе дрэвы, якія пабачыць.

— Тады паспяшайся, бо ўжо хутка сцямнее, і мы не паспеем пабачыць тое, што трэба.

— А ці далёка мне лезці, маса?

— Спачатку па камлі, потым я скажу, куды далей. Але чакай, вазьмі з сабою жука!

— Жука, маса Ўіл?! Залатога жука?! — стрывожана ўсклікнуў мурын, падаючыся назад. — Ды нашто мне цягнуць жука на дрэва?! Каб мяне чэрці парвалі, не вазьму яго!

— Калі ты, Юпітэр, такі вялізны мурын, баішся ўзяць маленькага бясшкоднага мёртвага жучка ў рукі, то можаш трымаць яго за нітку. Але калі ты яго не возьмеш наогул, мне давядзецца раструшчыць тваю галаву гэтай самай рыдлёўкай.

— Ды што такое, маса? — прысаромлены Юпі пайшоў на саступкі. — Усё сварыцеся на старога мурына без дай прычыны. Я ж пажартаваў. Каб мяне той жук напужаў?! Ды нізашто! — пры гэтых словах ён узяўся за самы скрайчык ніткі і, трымаючы насякомае як мага далей ад сябе, падрыхтаваўся лезці на дрэва.

У маладым узросце цюльпанавае дрэва, ці *Liriodendron Tulipiferum*, найвялікшае дрэва амерыканскіх лясоў, мае незвычайна гладкі камель і часта дасягае значнай вышыні без аніякіх бакавых галінаў, але ў больш познім узросце паверхня дрэва робіцца гузаватай і няроўнай з мноствам маленькіх сучкоў. Таму падняцца на дрэва насамрэч не так і цяжка. Абхапіўшы таўшчэзны камель каленямі і рукамі як мага больш шчыльна, намацваючы далонямі выступы на дрэве і становячыся на іх голымі ступакамі, Юпітэр некалькі разоў ледзь не зваліўся долу, але ўсё ж ускараскаўся на першую вялікую развіліну і, відаць, вырашыў, што тэарэтычна мэта дасягнутая. Рызыка ўпасці з дрэва цяпер фактычна зводзілася да мінімуму, хаця служка і знаходзіўся на адлегласці шэсцьдзесят-семдзесят футаў над зямлёю.

— А далей куды, маса Ўіл? — запытаўся ён.

— Падымайся да самай вялікай галіны на гэтым баку, — адказаў Легран.

Мурын адразу ж падпарадкаваўся і, хоць з невялікімі цяжкасцямі, але пачаў караскацца далей, падымаючыся ўсё вышэй і вышэй, пакуль яго згорбленая пастава цалкам не схавалася ў густой лістоце. Цяпер голас яго гучаў глуха, нібы рэха.

— Колькі яшчэ лезці?

— А ты высока? — спытаў Легран.

— Анягож, — адказаў мурын, — неба праз голле свеціцца!

— Забудзься пра неба і зважай, што я табе скажу. Глянь уніз на камель і палічы, колькі галінаў пад табой па гэты бок. Колькі галінаў ты ўжо мінуў?

— Раз, два, тры, чатыры, пяць. Я пяць вялікіх голек па гэты бок пералез, маса.

— Тады падыміся вышэй яшчэ на адну.

Праз хвіліну мы зноў пачулі голас, які абвясціў, што і сёмую галіну мурын адолеў.

— А зараз, Юпі, — закрычаў Легран яшчэ больш усхвалявана, — я хачу, каб ты палез па гэтай галіне як мага далей. Калі натрапіш на нешта дзіўнае, паведамі мне.

Калі дагэтуль я і меў нейкія сумневы наконт вар'яцтва майго сябра, яны канчаткова рассеяліся. Мне не заставалася нічога іншага, як прызнаць яго псіхічна хворым і падумаць, якім чынам даставіць Леграна дахаты. Пакуль я разважаў, як гэта зрабіць найлепш, зноў данёсся голас Юпітэра.

— Я баюся далёка лезці, голька трухлявая ўся.

— Юпітэр, ты сказаў, трухлявая? — дрыготкім голасам пракрычаў Легран.

— Так, маса, трухлявая, каб я ночы не прыждаў, чым толькі дзержыцца...

— Божа, што рабіць? — надзвычай занепакоена ўсклікнуў Легран.

— Рабі наступным чынам, — прамовіў я, узрадаваны магчымасцю ўставіць слоўца, — чаму б нам не пайсці дахаты і не легчы спакойна спаць? Хадзем зараз жа — пашкадуй яго. Ужо цямнее, да таго ж ты даў мне абяцанне.

— Юпітэр, — пракрычаў Легран, не звяртаючы на мяне аніякай увагі, — ты мяне чуеш?

— Так, маса Уіл, добра чую.

— Правер галіну сваім нажыкам, ці напраўду яна спарахнелая.

— Як піць даць, маса, — адказаў мурын праз колькі хвілінаў, — але ж не так моцна, як магла б. Адзін змагу па ёй трохі пралезці.

— Адзін? Гэта ты пра што?

— Пра жука. Ён жа цяжкі, як вол! Як кіну яго долу, галіна пад адным мурынам не зламаецца.

— Ах ты падлюга! — закрычаў Легран, ужо больш паблажліва. — Што ты хочаш сказаць?! Толькі паспрабуй кінь жука, я табе шыю зламаю. Чуеш мяне, Юпітэр?

— Чую, маса, ой, не злуйце так на беднага мурына.

— Ага, а цяпер паслухай мяне: калі ты пралезеш па галіне яшчэ крыху наперад і не выпусціш жука, я дам табе срэбны даляр, як толькі спусцішся на зямлю.

— Добра, маса Уіл, я ўжо тут, — умомант адказаў служка, — амаль на краёчку.

— На краёчку, Юпі?! — цяпер ужо радасна ўскрыкнуў Легран. — Кажаш, напраўду далез да самага канца?

— Хутка ўжо, маса! Авохці мне! Што ж гэта такое?!

— Што там?! — вельмі ўсцешана закрычаў Легран.

— Ды ўсяго чарапушка — кінуў нехта яе на дрэве, а вароны ўсё мяса здзяўблі.

— Чэрап, кажаш? Выдатна! Чым ён мацуецца да галіны? Што яго трымае?

— Так і ёсць, маса, зараз гляну. Дзіву даюся, які ж вялізны цвік у чэрап убіты. Дык ён на дрэве і дзержыцць.

— Добра, Юпітэр, а цяпер рабі тое, што я табе загадаю, чуеш?

— Чую, маса.

— Тады будзь уважлівы. Знайдзі на чэрапе левае вока.

— Ого! Ага! Добра. Ды няма ў яго ніякага левага вока.

— Каб цябе, дурань! Ты хоць розніцу між правай і левай рукой бачыш?

— Ага. Бачу. Я яшчэ вельмі добра бачу. І левую руку таксама, я ёй дровы калю.

— Дакладна. Ты ляўшун. Тваё левае вока з таго ж боку, што і левая рука. Цяпер, спадзяюся, ты здолееш знайсці левае вока чэрапа ці тое месца, дзе яно было раней? Ну, знайшоў?

Юпітэр доўга нічога не адказваў. А потым нарэшце запытаўся:

— А левае вока чэрапа з таго ж боку, што і яго левая рука? Бо ў чэрапа ж ніводнай рукі няма... Ай, ды нічога. Знайшоў я левае вока! Вось яно! Што мне з ім рабіць?

— Працягні праз яго нітку з жуком і няхай яна спусціцца як мага ніжэй. Толькі асцярожна, не выпусці нітку з рук!

— Анягож, маса Уіл. Гэта проста — нітку з жуком праз шчыліну працягнуць. Гляньце, вунь матляецца!

— Выдатна. Цяпер патрымай яго некалькі хвілінаў.

Падчас гэтай гутаркі Юпітэра зусім не было відаць, але жук, якога ён такімі высілкамі спусціў уніз, на канцы ніткі ззяў, нібы шар з адпаліраванага золата, іскрыўся ў апошніх промнях вечаровага сонца, якое яшчэ слаба асвятляла наша ўзвышша. Скарабей свабодна вісеў між галінамі, і калі б мурын выпусціў нітку, упаў бы да нашых ног. Легран тут жа ўхапіў касу і, расчысціўшы круглы ўчастак дыяметрам тры-чатыры ярды, загадаў Юпітэру адпусціць нітку і злезці з дрэва.

З вялікім задавальненнем уваткнуўшы калок у тым самым месцы, дзе ўпаў жук, мой сябар дастаў з кішэні рулетку і, прымацаваўшы адзін яе канец да дрэва з найбліжэйшага боку, расцягнуў яе настолькі, каб рулетка дасягнула калка, а потым працягнуў у напрамку, ужо зададзеным двума пунктамі — дрэвам і калком — на адлегласць прыкладна пяцьдзясят футаў.

Юпітэр касой ачысціў дзялянку ад ажынніку. Адмераўшы адрэзак, мы ўваткнулі другі калок і вакол першага калка як цэнтра груба намалявалі кола дыяметрам чатыры футы. Узяўшы адну рыдлёўку сабе, даўшы другую Юпітэру, а трэцюю мне, Легран папрасіў нас пачаць капаць як мага хутчэй. Папраўдзе кажучы, я ніколі не атрымліваў асаблівай асалоды ад такога роду занятkaў, а ў той момант і пагатоў адхіліў бы просьбу, бо набліжалася ноч і я адчуваў знясіленасць яшчэ ад папярэдніх фізічных практыкаванняў. Але я не бачыў ніякай магчымасці гэтага пазбегнуць і да таго ж баяўся сваёй адмовай парушыць душэўную раўнавагу майго беднага хворага сябра. Калі б я быў цалкам упэўнены ў падтрымцы Юпітэра, я б тут жа ўзяўся даставіць вар'ята дадому, але ж я добра ведаў нораў старога мурына, каб спадзявацца, што ён пры любых умовах дапаможа мне ў спрэчцы са сваім гаспадаром. Я быў перакананы, што Легран падхапіў адзін з тых паўднёвых забабонаў, якія апавядаюць пра закапаны скарб.

Знаходка ж скарабея толькі падмацавала яго выдумку, ці да гэтага хутчэй спрычынілася вера Юпітэра, што «жук з чысцюткі золата». Розум, схільны да вар'яцтва, адразу памылкова прымае такія сцверджанні, асабліва калі яны гучаць ва ўнісон з выпеставанымі ім ідэямі. І тут я ўспомніў, як небарака сказаў, што жук «пакажа на багацце». Я быў збянтэжаны і ўсхваляваны сітуацыяй, але нарэшце вырашыў скарыстацца зручным момантам і добраахвотна капаць, каб такім чынам хутчэй пераканаць летуценніка ў памылковасці яго ідэяў.

Засвяціўшы ліхтары, мы ўзяліся за справу з запалам, які, мабыць, быў варты больш разумнага ўжытку. А калі святло азарыла нашыя фігуры і рыштунак, я не мог адагнаць думку пра тое, што за карціну мы ўяўлялі сабой у той момант і якім дзіўным і падазроным падаўся б наш занятак любому незнаёмцу, які выпадкова заблукаў бы сюды.

Мы капалі безупынна дзве гадзіны. Амаль увесь час маўчалі, і галоўнай прыкрасцю было цяўканне сабакі, якога моцна зацікавіла тое, што адбывалася наўкола. Нарэшце ён разышоўся настолькі, што мы спалохаліся — ён жа мог прыцягнуць увагу заблукалых вандроўнікаў, ці, дакладней, спалохаўся Легран, бо я хутчэй узрадаваўся б любой перашкодзе, якая дапамагла б мне адвесці сябра дахаты. Але ўвесь шум разам перапыніў Юпітэр, які, з надзвычайнай няспешнасцю выбраўшыся з ямы, перавязаў жывёліне пашчу адной са сваіх падцяжак і, змрочна хіхікаючы, вярнуўся да працы.

Праз згаданыя дзве гадзіны працы мы дасягнулі глыбіні пяць футаў, але і знаку схаванага скарбу не было. На гэтым мы спыніліся, і я ўжо пачынаў спадзявацца, што нарэшце фарс набліжаецца да свайго канца. Але Легран, хоць і відавочна збіты з панталыку, задуменна выцер лоб і зноў узяўся за працу. Да гэтага мы пракапалі кола дыяметрам чатыры футы, а цяпер крыху пашырылі яго і заглыбіліся яшчэ на два футы. Але ўсё роўна нічога не знайшлі. Наш золаташукальнік, якому я шчыра спачуваў, з выразам горкага расчаравання на твары і ва ўсёй паставе, вылез нарэшце з яміны і пачаў павольна і неахвотна надзяваць паліто, якое папярэдне так жвава скінуў. Я тым часам не прамовіў ні слова. А Юпітэр па загадзе

гаспадара ўзяўся збіраць рыштунак. Скончыўшы з гэтым і развязаўшы сабаку, мы моўчкі рушылі дахаты.

Мы зрабілі ўсяго з дзясятак крокаў у патрэбным кірунку, як раптам з праклёнамі і лаянкай Легран кінуўся на Юпітэра і ўхапіў яго за каўнер. Моцна здзіўлены, служка вылупіў вочы, разявіў рот, выпусціў з рук рыдлёўкі і ўпаў на калені.

— Ах ты, нягоднік! — працадзіў праз сціснутыя зубы Легран. — Зладзюга ты чорны! А ну кажы мне зараз жа, паказвай, і без свайго круцельства, дзе ў цябе левае вока!

— А божачкі мае, маса Уіл! Дык а гэта ці не левае маё вока? — зароў напужаны Юпітэр, прыціскаючы далонню свой *правы* орган зроку з такім адчаем і ўпартасцю, нібы баяўся, што гаспадар наважыцца яго вырваць.

— Я так і думаў! Я ведаў гэта! Ура! — загарланіў Легран, адпусціўшы мурына, і пачаў бегаць, скачучы і гарцуючы, чым дужа здзівіў свайго служку, які, падняўшыся з каленяў, маўкліва пераводзіў пагляд са свайго гаспадара на мяне і з мяне на гаспадара.

— Давайце ж, трэба вяртацца, — прамовіў Легран, — гульня яшчэ не скончаная.

І ён зноў рушыў у напрамку цюльпанавага дрэва.

— Юпітэр, ідзі сюды!- паклікаў ён, калі мы падышлі да дрэва. — Скажы, чэрап быў прымацаваны да дрэва тварам вонкі ці да ствала?

— Вонкі, маса, каб жа варонам зручней было вочы дзяўбці.

— Ага, тады праз гэта ці праз вось гэта вока ты працягнуў нітку з жуком? — пры гэтых словах Легран дакрануўся да вачэй Юпітэра.

— Праз вось гэта, маса, — левае, як вы мне і загадалі, — і мурын паказаў на сваё правае вока.

— Добра, тады варта паспрабаваць яшчэ раз.

Пры гэтых словах мой сябра, у вар'яцкіх паводзінах якога я бачыў — ці думаў, што бачу, — праявы пэўнай логікі, прыбраў калок, які паказваў месца падзення жука, і перанёс яго на тры дзюймы на захад ад таго месца, дзе ён быў раней. Цяпер, адмераўшы адрэзак ад дрэва з найбліжэйшага боку да калка і адлічыўшы пяцьдзясят футаў па простай, ён пазначыў новы

пункт, што знаходзіўся на некалькі ярдаў убок ад таго месца, дзе мы капалі.

Вакол новага пункта мы зноў намалявалі кола, крыху большае, чым папярэдняе, і ўзяліся за рыдлёўкі. Я быў моцна стомлены, але, ледзь разумеючы, што ж змяніла ход маіх думак, не адчуваў ніякай агіды да гэтай працы. Раптам невядома чаму тое, што з намі адбывалася, пачало ўнушаць мне цікаўнасць ці, хутчэй, нават усхваляванасць. Мабыць, у абсурдных паводзінах Леграна пачала прасочвацца пэўная разважлівасць і прадуманасць дзеянняў, што мяне моцна ўражвала. Я капаў з задавальненнем, час ад часу заўважаючы за сабой, што амаль са спадзевам насамрэч шукаю гэты ўяўны скарб, мары пра які звялі з розуму майго няшчаснага прыяцеля. У той самы момант, калі гэтыя думкі авалодалі мной у найвялікшай ступені і калі ад пачатку працы мінула ўжо гадзіны з паўтары, наша шчыраванне перапыніла выццё сабакі. І калі ў першым выпадку яго ўсхваляванасць была выкліканая хутчэй гуллівым настроем, то цяпер у яго галасе чуліся горыч і турбота. На спробу Юпітэра зноў завязаць яму пашчу сабака даў злосны адпор і, скокнуўшы ў яміну, пачаў шалёна грэбці лапамі зямлю. Праз некаторы час ён раскапаў рэшткі чалавечых костак, што некалі складалі два шкілеты, а цяпер ляжалі ў зямлі ўперамешку з металічнымі гузікамі і кавалкамі згнілай баваўны. Некалькі ўзмахаў рыдлёўкі выцягнулі на свет лязо вялізнага гішпанскага нажа, а капнуўшы далей, мы знайшлі тры ці чатыры залатыя манеты.

Пабачыўшы такую ўдачу, Юпітэр ад радасці ледзь стрымліваўся, а вось на твары яго гаспадара, наадварот, было надзвычайнае расчараванне. І ўсё ж ён загадаў нам капаць далей. Ніхто не прамовіў ні слова, калі, ледзь не ўпаўшы, я натыкнуўся ботам на схаванае ў зямлі жалезнае колца.

Мы ўзяліся за справу з яшчэ большым імпэтам. І ў наступныя дзесяць хвілін я перажыў найвялікшае хваляванне ў сваім жыцці: за гэты час мы практычна выкапалі з зямлі прадаўгаваты драўляны куфар, які, дзякуючы выключнай трываласці і выдатнай захаванасці, адчуў на сабе толькі пра-

цэсы мінералізацыі, верагодна, крышталікамі сулемы. Куфар быў тры з паловай футы ў даўжыню, тры футы ў шырыню і два з паловай футы ў глыбіню. Ён быў шчыльна сціснуты абадамі з кованага і закляпанага жалеза, што рашоткай абляноўвалі яго паверхню. Зверху з абодвух бакоў куфра было прымацавана па тры жалезныя колцы, разам шэсць, з іх дапамогай несці куфар можна было ўшасцёх. Але нашых агульных высілкаў хапіла толькі на тое, каб злёгку зварухнуць яго з месца. Стала зразумела, што такі вялікі цяжар падняць мы не здолеем. На шчасце, механізм зашчапкі века складаўся з дзвюх засавак. Стаіўшы дыханне і трасучыся ад хвалявання, мы адкінулі іх і паднялі века. Раптам нашым вачам адкрыліся невымернай каштоўнасці скарбы. Прамяні ліхтароў асвяцілі яміну, і мігценне ды бляск цэльных кавалкаў золата і россыпу ювелірных упрыгожанняў нас проста асляпілі.

Я не буду хаваць тых пачуццяў, якія спазнаў, пабачыўшы такую раскошу. Натуральна, збольшага мной авалодала здзіўленне. Легран, знясілены турботамі, прамаўляў мала. А Юпітэр, смяротна збялелы з твару, наколькі гэта магчыма для цемнаскурага, падавалася, атупеў, аслупянеўшы. Затым ён упаў на калені і, занурыўшы голыя рукі па локаць у золата, затрымаў іх там, нібы насалоджваючыся ваннаю з раскошы. А потым, глыбока ўздыхнуўшы, усклікнуў, нібы звяртаючыся да самога сябе:

— І ўсё гэта ён, залаты жук. Залаценечкі жучок, гаротны мой, а я ж яго так крыўдзіў! Гэй, стары мурын, і не сорамна табе, га? Ану адказвай!

Нарэшце мне давялося нагадаць і гаспадару, і служку, што ўжо час брацца за пераност нашага скарбу. Апускалася ноч. Яшчэ больш ускладняла нашу задачу тое, што багацце неабходна было схаваць яшчэ да світання. Нам цяжка было вырашыць, што рабіць далей, таму шмат часу мы змарнавалі, абмяркоўваючы свае наступныя дзеянні, бо прапановы былі даволі блытанымі. Нарэшце, выцягнуўшы з куфэрка дзве траціны ўсяго багацця, мы, хоць і з цяжкасцямі, здолелі падняць скрыню з яміны. Рэчы мы схавалі ў ажынніку, пасадзіўшы сабаку іх ахоўваць. Юпітэр строга наказаў яму ні ў якім вы-



*...мігценне ды бляск цэльных кавалкаў золата*
*і россыпу ювелірных упрыгожанняў нас проста асляпілі.*

падку не сыходзіць з месца і не раскрываць пашчы да нашага вяртання. Пасля гэтага мы паспешліва рушылі з куфрам дахаты і без асаблівых прыгодаў, хоць і прытаміўшыся, каля першай гадзіны ночы дабраліся да хаціны. Знямоханыя, мы былі не ў стане выправіцца ў дарогу адразу ж. Таму вырашылі павячэраць і адпачыць, а ўжо а другой гадзіне, узброіўшыся трыма вялізнымі торбамі, якія, на шчасце, знайшліся ў гаспадарцы, скіраваліся ў горы. Амаль а чацвертай раніцы мы былі каля яміны. Падзяліўшы пароўну рэшткі трафея і пакінуўшы яміну адкрытай, мы зноў рушылі ў напрамку хаціны і скінулі з плячэй свае залатыя ношы толькі калі першыя нясмелыя промні зараніцы на ўсходзе бліснулі між вершалінаў дрэваў.

Цяпер мы цалкам знясілелі, але ўзрушанасць падзеямі апошняй ночы не давала спакою. Пасля нейкіх трох-чатырох гадзінаў трывожнай дрымоты мы, нібы згаварыўшыся, падхапіліся разам, каб больш пільна агледзець сваё багацце.

Куфар быў поўны скарбаў па самае века, цэлы дзень і палову наступнай ночы мы правялі, даследуючы яго змесціва. Тут не было і намёку на нейкі парадак: рэчы былі перамяшаныя ды зваленыя ў кучу. Асцярожна ўсё разабраўшы, мы выявілі, што мы — уладальнікі яшчэ большага багацця, чым меркавалі спачатку. Улічваючы тагачасны кошт даляра, мы падлічылі, што толькі манетамі тут было больш за чатырыста пяцьдзясят тысяч даляраў. Ніводнай срэбнай — усе як адна былі з чыстага золата, старажытныя ды з розных краёў — французскія, нямецкія, гішпанскія, некалькі ангельскіх гінеяў, сустракаліся сярод іх і такія манеты, якіх мы раней ніколі не бачылі, а таксама некалькі вельмі вялікіх і цяжкіх манетаў, сцертых настолькі, што разабраць надпісы на іх было ўжо немагчыма. Амерыканскіх грошай не было зусім. Ацаніць жа кошт упрыгожанняў выявілася для нас яшчэ больш складаным. Былі тут дыяменты — некаторыя з іх неверагодна буйныя і прыгожыя — агулам сто дзесяць камянёў і ніводнага дробнага; трыста дзесяць смарагдаў, і ўсе як адзін непаўторныя, дваццаць адзін сапфір і яшчэ апал. Камяні, вырваныя з апраўаў, былі рассыпаныя па ўсім куфры. А самі ўпрыгожанні, якія мы аддзялілі ад іншых залатых

вырабаў, мелі на сабе сляды ўдараў, што мусілі ўскладніць працэс іх апазнання. Акрамя гэтага, мы знайшлі тут вялізную колькасць вырабаў з цэльнага золата, каля дзвюх сотняў цяжкіх пярсцёнкаў і завушніцаў, дарагія ланцужкі колькасцю ў трыццаць штук, калі, канечне, памяць мне не здраджвае, восемдзесят тры масіўныя і важкія распяцці, пяць вельмі дарагіх залатых кадзілаў, цудоўны кубак для пуншу, багата аздоблены выгравіяваным вінаградным лісцем і вакхічнымі фігурамі, дзве гарды выкшталцонай чаканкі і яшчэ шмат іншых дробных прадметаў, якіх я ўжо не ў стане ўзгадаць. Агульная вага ўсяго нашага багацця складала больш чым трыста пяцьдзясят ангельскіх фунтаў, а да спісу я яшчэ не дадаў сто дзевяноста сем выдатных гадзіннікаў, тры з якіх — коштам у пяцьсот даляраў кожны. Многія гадзіннікі былі надзвычай старыя і адлічваць час ужо непрыдатныя, іх унутраны механізм у той ці іншай ступені быў пашкоджаны іржой, але пры гэтым багатае ювелірнае аздабленне корпусу надавала некаторым з іх надзвычайную каштоўнасць. Той ноччу змесціва куфра па нашых ацэнках складала паўтара мільёна даляраў, але калі мы прадалі ўсе манеты і ювелірныя вырабы, за выняткам некаторых каштоўнасцяў, што вырашылі пакінуць сабе, выявілася, што мы моцна недаацанілі сваю знаходку.

Калі нарэшце мы завершылі поўны агляд сваёй маёмасці і эмацыйнае хваляванне крыху спала, Легран, заўважыўшы маю скрайнюю нецярплівасць дазнацца разгадку гэтага незвычайнага здарэння, пачаў ва ўсіх дэталях распісваць падзеі, што да яго спрычыніліся.

— Вы ж памятаеце, — сказаў ён, — тую ноч, калі я працягнуў вам свой накід скарабея. І памятаеце таксама, як мяне раззлавала вашае сцверджанне, што мой малюнак меў моцнае падабенства з чэрапам. Спачатку я палічыў вашыя словы проста жартам, але потым прыгадаў незвычайныя плямкі на спінцы жука і падумаў сам сабе, што, магчыма, вашая заўвага мае пад сабой падставы. Але ўсё ж вашыя кпіны з маіх мастацкіх здольнасцяў мяне раздражнілі, бо, у прынцыпе, мяне лічаць добрым мастаком, і таму, калі вы працягнулі

мне кавалак пергаменту, я ўжо збіраўся парваць яго на шматкі і кінуць у агонь.

— Вы маеце на ўвазе кавалак паперы, — заўважыў я.

— Не, ён вельмі падобны да паперы, з самага пачатку я і лічыў яго паперай, але калі пачаў маляваць, выявілася, што перада мною вельмі тонкі пергамент. Да таго ж даволі брудны, як вы памятаеце. І калі я ўжо наважыўся парваць той шматок, мой погляд раптам упаў на выяву, якую бачылі і вы. Уявіце ж маё здзіўленне, калі на тым самым, як мне падавалася, месцы, дзе я маляваў жука, я заўважыў чэрап. У той момант я быў занадта здзіўлены, каб мысліць разважна. Я ведаў, што мой рысунак моцна розніўся з гэтым, хаця ў агульных абрысах яны былі нечым падобныя. Я тут жа схапіў свечку і, заняўшы месца ў далёкім куце пакоя, працягнуў пільны агляд пергаменту. Перавярнуўшы яго, на адваротным баку я пабачыў свой рысунак. Мяне вельмі моцна ўразіла гэтае незвычайнае падабенства: вось так, думаў я, толькі дзякуючы простаму збегу абставінаў і з невядомых мне прычынаў, на адваротным баку пергаменту была выява чэрапа, ды яшчэ якраз пад маім рысункам скарабея, і пры гэтым чэрап не толькі абрысамі, але і памерам моцна нагадваў мой накід. Напраўду гэтая простая выпадковасць мяне моцна збянтэжыла. Так бывае заўжды, калі сутыкаешся з супадзеннямі: розум спрабуе выявіць сувязь, нейкую прычынна-выніковую паслядоўнасць, але калі знайсці яе не атрымліваецца, чалавек проста ўпадае ў ступар. Калі ж я ачомаўся, мяне пакрысе напаткала яшчэ адно адкрыццё, якое напалохала больш, чым падабенства. Паступова я вельмі яскрава пачаў успамінаць, што калі толькі ўзяўся за свой накід, на пергаменце не было ніякіх малюнкаў. У гэтым я быў практычна перакананы, бо згадаў, як варочаў пергамент у руках, шукаючы на ім чысцейшае месца. Калі б чэрап быў там, я, натуральна, не змог бы яго не заўважыць. Перада мною паўстала сапраўдная загадка, якую я не ведаў, як патлумачыць. Але ўжо тады я адчуваў, што ў самых далёкіх і таемных куточках маёй свядомасці паблісквае слабым агеньчыкам светляка разуменне таго, што найлепшым чынам прадэманстравалі падзеі мінулай ночы.

Я адразу ж падняўся і схаваў пергамент у надзейнае месца, адклаўшы ўсе далейшыя развагі да таго часу, пакуль не застануся на самоце.

Калі вы з'ехалі, а Юпітэр хутка заснуў, я заглыбіўся ў больш метадычныя даследаванні. Спачатку я абдумаў шлях, якім пергамент трапіў да мяне. Месца, дзе мы знайшлі скарабея, знаходзілася на ўзбярэжжы мацерыка, прыкладна за мілю на ўсход ад выспы, але непадалёк ад лініі прыліву. Калі я схапіў скарабея, ён моцна мяне ўкусіў, што вымусіла мяне яго кінуць. Юпітэр, перад тым як злавіць насякомае, што да яго падляцела, з заўсёднай асцярогай агледзеўся наўкола ў пошуках лістка ці нечага падобнага, каб ухапіць жука. Менавіта тады Юпі, а з ім і я, прыкмецілі шматок пергаменту, які ў той момант падаўся мне паперай. Шматок быў амаль цалкам закапаны, толькі кончык тырчэў з зямлі. Каля таго месца, дзе мы яго знайшлі, я заўважыў рэшткі карабля, што выявіліся часткай баркаса. Выглядала на тое, што рэшткі ляжалі тут ужо досыць даўна, бо падабенства з карабельнымі бэлькамі было вельмі аддаленае.

Юпітэр падняў з зямлі пергамент, загарнуў у яго жука і аддаў мне. У хуткім часе мы накіраваліся дахаты і па дарозе сустрэлі лейтэнанта Г... Я паказаў яму насякомае, а лейтэнант упрасіў мяне дазволіць яму аднесці жука ў форт. З маёй згоды ён сунуў жука ў кішэню камізэлькі, не загарнуўшы ў пергамент, што я так і трымаў у руках, пакуль ён аглядаў дзіўнае насякомае. Магчыма, ён баяўся, што я перадумаю, і лічыў найлепшым тут жа вызначыцца з цаною. Вы ж ведаеце, якім апантаным ён робіцца, калі справа датычыць прыродазнаўства. І ў той самы момант, незаўважна для самога сябе, я, мабыць, і паклаў пергамент у кішэню.

Памятаеце, калі я падышоў да стала, збіраючыся зрабіць накід жука, то не знайшоў паперы на яе звычайным месцы. Я глянуў у шуфлядзе, але паперы не было і там. Тады я пачаў абшукваць кішэні, спадзеючыся на які-небудзь стары ліст, і тут намацаў пергамент. Я так дэтальна апісваю шлях, якім скарабей трапіў да мяне, бо гэтыя акалічнасці ўразілі мяне надзвычайна.

Бясспрэчна, вы будзеце лічыце мяне летуценнікам, але я ўжо тады знайшоў сувязь між падзеямі. Я злучыў разам два звяны аднаго вялікага ланцуга. На беразе мора ляжаў карабель, непадалёк — пергамент (а не папера) з выяваю чэрапа. Натуральна, вы запытаецеся: дзе тут сувязь? А я адкажу, што чэрап, ці эмблема смерці, — шырока вядомы атрыбут піратаў. Свой сцяг з чэрапам яны падымаюць у любой сутычцы.

Я ўжо ўзгадваў, што гэты шматок быў пергаментам, а зусім не паперай. Пергамент жыве доўга, амаль вечна. Драбніцы яму давяраюць рэдка, бо для звычайнага ліста ці малюнка ён пасуе не так добра, як папера. І гэтая мая здагадка знайшла сабе апраўданне, пэўную адпаведнасць, у выяве чэрапа. Я таксама звярнуў увагу на форму пергаменту. Хоць адзін яго край выглядаў выпадкова пашкоджаным, было заўважна, што першапачаткова пергамент меў прадаўгаватую форму. Такі ўзор старонкі найхутчэй выбралі б для важнага дакумента, каб запісаць нешта такое, што будуць помніць доўга і захоўваць беражліва.

— Але ж вы кажаце, — перабіў я, — што, калі вы малявалі жука, на пергаменце чэрапа не было. Чаму вы тады звязваеце карабель і чэрап, улічваючы, што апошні быў дарысаваны (Бог ведае кім і як) у час, пазнейшы за стварэнне накіду скарабея.

— А вось тут і пачынаецца сапраўдная загадка, хоць разгадаць яе мне не склала асаблівай цяжкасці. Я ішоў цвёрдым поступам і мог дасягнуць адзіна правільнага рашэння. Разважаў я, да прыкладу, такім чынам: калі я маляваў скарабея, чэрапа на адваротным баку не было. Скончыўшы накід, я аддаў яго вам і ўважліва назіраў за вамі, пакуль вы не вярнулі рысунак мне. Такім чынам, чэрап намалявалі не вы, а ніхто іншы зрабіць гэтага не мог. Значыць, выява з'явілася тут не па волі чалавека. Але ў такім выпадку як?

Разважаючы ў гэтым кірунку, я намагаўся ўспомніць і напраўду ўспомніў з усёй яснасцю кожную дэталь, якая спадарожнічала падзеям таго вечара. Надвор'е выдалася халодным (што за рэдкі і шчаслівы выпадак!), і ў каміне гарэў агонь. Разагрэты дарогай дахаты, я сеў ля стала. А вы, у сваю чаргу, падсунулі фатэль бліжэй да агню. Як толькі я даў вам

у рукі пергамент і вы ўжо збіраліся яго разглядзець, наш ньюфаўндленд Вулф уварваўся ў пакой і кінуўся вам на плечы. Левай рукой вы лашчылі сабаку і спрабавалі адагнаць яго, а правую, якой трымалі пергамент, абыякава апусцілі між каленяў, моцна наблізіўшы да агню. Раптам мне падалося, што полымя вось-вось шугане на пергамент, але перш чым я паспеў перасцерагчы вас, вы ўжо пачалі яго аглядаць. Улічыўшы ўсе дэталі, я ўжо ні кроплі не сумняваўся, што менавіта цяпло каміну стала прычынай з'яўлення чэрапа, які я заўважыў на пергаменце. Вам, безумоўна, вядома пра пэўныя хімічныя сродкі, якія існавалі спакон веку. Яны дазваляюць пісаць на паперы ці тонкім пергаменце, і напісанае пры гэтым праявіцца толькі пад уздзеяннем цяпла. Цафру* распускаюць у «царскай гарэлцы», разводзяць вадою ў прапорцыі адзін да чатырох і ў выніку атрымліваюць зялёны атрамант. А кобальтавы штэйн, распушчаны ў салетравым спірце, дае чырвоны колер. Гэты атрамант раней ці пазней знікае з паверхні, на якой ім пісалі пры нізкай тэмпературы, і зноў праяўляецца пад уплывам цяпла.

Затым я ўважліва даследаваў чэрап. Яго абрысы, тыя, што найбольш набліжаліся да краёў пергаменту, былі выразнейшыя. Стала ясна, што ўздзеянне жару было толькі частковым і нераўнамерным. Я тут жа расклаў агонь і паднёс да зыркага полымя пергамент, дбаючы пра кожны яго ўчастак. Спачатку толькі светлыя лініі ў малюнку чэрапа пацямнелі, але, працягваючы свой эксперымент, я заўважыў, што ў куточку пергаменту, дыяганальна супрацьлеглым таму ўчастку, дзе быў чэрап, праступіла выява, якая спачатку падалася мне вельмі падобнай да дэльфіна. Але, агледзеўшы яе больш уважліва, я пераканаўся, што гэта мусіў быць кіт.

— Ха-ха! — не вытрымаў я. — Натуральна, я не маю ніякага права смяяцца з вас, бо паўтара мільёна даляраў — вельмі сур'ёзная падстава для радасці, але ж ці не хочаце вы сказаць, што знайшлі трэцяе звяно ланцуга? Вы ж не збіраецеся сцвярджаць, што між піратамі і дэльфінамі ёсць нейкая асаблівая сувязь. Усе мы ведаем, што піраты не палявалі на дэльфінаў, а зусім па-іншаму зараблялі на жыццё.

— Але ж я толькі што ўдакладніў, што выява была зусім не дэльфінам.

— Дэльфін ці кіт — ці не ўсё роўна?!

— Не, — зазначыў Легран. — Вы, мабыць, чулі пра такога сабе капітана Кіда*. Выяву жывёлы я адразу ж пачаў разглядаць як каламбур ці іераграфічны подпіс. Я кажу «подпіс», бо яго месцазнаходжанне на пергаменце падводзіла мяне менавіта да такой высновы. А эмблема смерці ў супрацьлеглым куце па дыяганалі ў той жа час была вельмі падобная да пячаткі ці штампа. І ўсё ж я быў моцна збянтэжаны адсутнасцю самага галоўнага — тэксту.

— Я мяркую, вы спадзяваліся знайсці ліст паміж пячаткай і подпісам.

— Кшталту таго. Папраўдзе кажучы, я адчуваў моцную ўзрушанасць, прадчуваючы вялікае багацце. І я не ведаў, як гэта патлумачыць. Хутчэй за ўсё гэта ў большай ступені было прагай, чым сапраўдным перакананнем. Ведаеце, дурнаватая балбатня Юпітэра пра жука з чыстага золата неверагодным чынам паўплывала на маё ўяўленне. А потым яшчэ гэтыя супадзенні ды выпадковасці — усё гэта было вельмі незвычайна. Вы заўважылі, як дзякуючы простаму збегу абставінаў падзеі адбыліся менавіта ў той, мабыць, адзіны дзень за ўвесь год, калі праз халоднае надвор'е давялося распаліць камін, а без агню ці без умяшальніцтва сабакі менавіта ў той момант, калі яно адбылося, я б ніколі не заўважыў эмблему смерці і ніколі б не стаў уладальнікам вялізнага багацця?

— Ну не цягніце ж, мне не церпіцца пачуць працяг.

— Вы, канечне, чулі мноства гісторый, тысячы няпэўных пагалосак, што апавядаюць пра грошы, закапаныя капітанам Кідам і яго памагатымі на берагах Атлантыкі. Гэтыя гісторыі мусілі ж на чымсьці грунтавацца. І прычына таго, што чуткі існуюць так доўга і даўна, падалося мне, заключалася менавіта ў тым, што закапаны скарб дагэтуль не знойдзены. Калі б Кід толькі часова схаваў свой рабунак, а потым забраў яго назад, наўрад ці пагалоскі дайшлі б да нас у сваім першапачатковым выглядзе. Заўважце, што ўсе гэтыя гісторыі — пра шуканне скарбу, а не яго знаходку. Мне ўявілася, што неяк выпадко-

ва — прыкладам, праз згубу дакумента з апісаннем месцазнаходжання багацця, — капітан быў пазбаўлены магчымасці знайсці яго зноў. Тым часам пра гэтую акалічнасць дазналіся яго паслядоўнікі, якія дагэтуль нават не здагадваліся, што багацце было схавана, і, безвынікова спрабуючы без мапы знайсці яго, спарадзілі, а потым распаўсюдзілі сведчанні, якія мы сустракаем цяпер. Ці даводзілася вам калі-небудзь чуць пра буйныя скарбы, раскапаныя на ўзбярэжжы?

— Не, ніколі.

— Але пра неймаверную каштоўнасць здабычы Кіда вядома ўсім. Я зыходзіў з таго, што яго багацце дагэтуль перабывае ў зямлі, і наўрад ці вы здзівіцеся, калі я скажу, што я адчуў надзею, амаль перакананне, што гэты дзіўным чынам знойдзены пергамент меў непасрэднае дачыненне да страчанага дакумента з пазнакай месцазнаходжання скарбу.

— І што вы рабілі далей?

— Калі агонь мацней разгарэўся, я зноў паднёс да яго пергамент, але нічога не з'явілася. Цяпер у мяне закралася падазрэнне, што, магчыма, мае спробы заканчваюцца няўдачай праз тоўсты слой бруду на паверхні. Таму я асцярожна прамыў пергамент цёплай вадой, а пасля паклаў яго на патэльню чэрапам уніз і паставіў на гарачае вуголле. Праз некалькі хвілінаў, калі патэльня ўжо моцна нагрэлася, я зняў пергамент і вельмі ўзрадаваўся, пабачыўшы ў некалькіх месцах на ім невялікія плямiны, якія, як выявілася, былі шэрагамі знакаў. Я зноў паклаў пергамент на патэльню і патрымаў яго так яшчэ з хвіліну. Калі я зноў яго зняў, ён выглядаў менавіта так, як цяпер.

З гэтымі словамі Легран, які загадзя разагрэў пергамент, працягнуў яго мне. Вышэйзгаданыя знакі былі груба накрэсленыя чырвоным атрамантам на месцы між выявамі чэрапа і кіта:

53 = = + 3 0 5)) 6 *; 4 8 2 6) 4 = §) 4 =); 8 0 6 *; 4 8 + 8 # 6 0)) 8 5; 1 = (;: = * 8 + 8 3 (8 8) 5 * +; 4 6 (; 8 8 * 9 6 *?; 8) * = (; 4 8 5); 5 * + 2: * = (; 4 9 5 6 * 2 (5 *- 4) 8 # 8 *; 4 0 6 9 2 8 5);) 6 + 8) 4 = =; 1 (= 9; 4 8 0 8 1; 8: 8 = 1; 4 8 + 8 5; 4) 4 8 5 + 5 2 8 8 0 6 * 8 1 (= 9; 4 8; (8 8; 4 (=? 3 4; 4 8) 4 =; 1 6 1;: 1 8 8; =?;

— Але, — прамовіў я, вяртаючы яму пергамент, — усё роўна не ведаю, што і думаць. Калі б нават усе багацці Галконды* чакалі мяне, развяжы я гэтую задачку, я зусім не пэўны, што змог бы іх здабыць.

— І ўсё ж разгадка, — працягваў Легран, — зусім не такая заблытаная, як вы сабе ўяўляеце, хуценька прабегшыся поглядам па гэтых пісьмёнах. Можна лёгка здагадацца, што знакі складаюць пэўны шыфр і, такім чынам, маюць нейкі сэнс. Грунтуючыся на агульнавядомых звестках пра Кіда, я меркаваў, што ён не здатны на стварэнне звышскладанага коду, і таму адразу ж вырашыў, што шыфр гэты сам па сабе не цяжкі, а такі, на які здатны прымітыўны розум марака, то бок проста патрабуе ключа.

— І вы напраўду знайшлі яго?

— Лёгка. Я разгадваў шыфры, у дзесяць тысяч разоў больш складаныя, чым гэты. Абставіны і пэўныя разумовыя схільнасці прывялі мяне да зацікаўленасці такімі задачкамі, і я не веру, што чалавечая кемлівасць здольная стварыць такую загадку, якую б іншая чалавечая кемлівасць, пры адпаведных высілках, не змагла б развязаць. Больш за тое, з самага пачатку вызначыўшы дакладную ўзаемасувязь паміж сімваламі, мне стала працей раскрыць іх сэнс.

У дадзеным выпадку, і гэта датычыць любога закадаванага тэксту, найперш варта вызначыцца з мовай, на якой напісаны шыфр. Што да спосабаў дэшыфроўкі, галоўным чыннікам будзе выступаць характар самой мовы, і гэта асабліва праўдзіва для простых кодаў. Наогул, не існуе іншага спосабу, як перабіраць розныя мовы, беручы пад увагу ўсе варыянты, пакуль патрэбная мова не будзе знойдзеная. Але ўсе цяжкасці дадзенага шыфру здымаліся подпісам на пергаменце. Гульня словаў «кіт» і «Кід» яскрава сведчыла, што гаворка ішла пра капітана Кіда, які як ангелец натуральна карыстаўся ангельскай мовай. Але перш чым рабіць такія высновы, я ўзяўся за гішпанскую і французскую мовы, на якіх таямніца піратаў Гішпанскага мацерыка* хутчэй за ўсё і магла быць перададзеная. Пасля гэтых спробаў я пераканаўся, што мова шыфру — ангельская.

Як бачыце, падзел на словы тут адсутнічае. Калі б ён быў, задача б значна спрасцілася. У такіх выпадках варта пачынаць з супастаўлення і аналізу кароткіх словаў, і калі знаходзіцца хоць адно, што складаецца з адзінай літары, напрыклад, «а» ці «і», разгадку, хутчэй за ўсё, можна лічыць справай вырашанай. Але ў дадзеным выпадку, калі падзелу на словы няма, маім першым крокам было вылучыць літары, якія сустракаюцца ў тэксце найчасцей і, адпаведна, тыя, якія сустракаюцца найрадзей. Пасля ўсіх падлікаў у мяне атрымалася наступная табліца:

Знак «8» паўтараецца 33 разы.
«;» — 26 разоў.
«4» — 19 разоў.
«=» і «)» — 16 разоў.
«*» — 13 разоў.
«5» — 12 разоў.
«6» — 11 разоў.
«+» і «1» — 8 разоў
«0» — 6 разоў.
«9» і «2» — 5 разоў.
«:» і «3» — 4 разы.
«?» — 3 разы.
«#» — 2 разы.
«-» і «§» —1 раз.

Ідзем далей. У ангельскай мове найчасцей ужываецца літара *e*. За ёй адпаведна — *a, o, i, d, h, n, r, s, t, u, y, c, f, g, l, m, w, b, k, p, q, x, z*. *E* сустракаецца так часта, што прыдумаць сказ любой даўжыні, дзе літара *e* не пераважала б, практычна немагчыма.

Такім чынам, мы ў самым пачатку ствараем падмурак для нечага большага, чым звычайная здагадка. Агульнае прызначэнне дадзенай табліцы цалкам зразумелае, але ў выпадку з нашым шыфрам яе магчымасці мы скарыстаем толькі часткова. Зыходзячы з таго, што найбольш ужываным сімвалам у нас ёсць «8», мы прымем, што гэта і ёсць літара *e* ангельскага алфавіту. Каб пацвердзіць сваю здагадку, праверым, ці часта сустракаецца падвойны знак «8» бо ў

ангельскай мове ўжыванне падвойнага *e* даволі пашыранае, як, напрыклад, у словах *meet, fleet, speed, seen, been, agree* і гэтак далей. У дадзеным шыфры мы бачым, што падвойны знак паўтараецца не менш як пяць разоў, хаця сам па сабе тэкст даволі кароткі.

Тады мы прымаем «8» за *e*. З усяго ангельскага лексікону азначальны артыкль *the* — самае ўжыванае слова. Такім чынам, давайце праверым, ці не сустракаецца ў нашым шыфры паўтор аднолькавай камбінацыі з трох знакаў, апошнім з якіх быў бы «8». І калі мы напраўду знойдзем паўтор такога спалучэння, то хутчэй за ўсё гэта і будзе слова *the*. Даследаваўшы шыфр, мы знаходзім не менш чым сем такіх паўтораў, а дадзенае спалучэнне выглядае як «;48». Значыць, мы можам зрабіць выснову, што «;» адпавядае *t*, «4» адпавядае *h*, а тое, што «8» ёсць *e*, ужо не выклікае ніякіх сумневаў. Такім чынам мы зрабілі вялізны крок наперад.

Але, вызначыўшы гэтае адзінае слова, мы атрымалі магчымасць высветліць яшчэ адну важную дэталь — так бы мовіць, пачатак і заканчэнне некаторых іншых словаў. Давайце разгледзім перадапошні выпадак ужывання камбінацыі «;48» амаль у канцы шыфру. Мы ведаем, што «;» ёсць пачаткам слова, і з шасці знакаў, якія ідуць за *the*, мы разумеем не менш чым пяць. Давайце выпішам іх на паперу, замяняючы сімвалы літарамі-адпаведнікамі і пакідаючы прагалы на месцы пакуль невядомых знакаў. Атрымалася: *t eeth*.

Цяпер, перабраўшы ўвесь алфавіт у пошуках літары, якая б магла запоўніць гэты прабел, мы прыходзім да высновы, што ў ангельскай мове няма ніводнага слова з такім наборам літар, якое б пры гэтым сканчалася на *th*, таму мы адразу ж адкідаем дадзенае спалучэнне. Такім чынам, наша слова скарачаецца да

t ee.

І зноў-такі, праштудыяваўшы алфавіт, як і ў папярэднім выпадку, мы знаходзім слова *tree* («дрэва») як адзіна магчымы варыянт. У нас з'яўляецца яшчэ адна вядомая літара — *r*, якой у шыфры адпавядае «(», а таксама спалучэнне

the tree.

Прыгледзеўшыся да гэтага радка, мы зноў заўважаем спалучэнне «;48» і прымаем яго як заканчэнне папярэдняга слова. Такім чынам, атрымліваем:

the tree;4(‡?34 the.

І, падставіўшы літары замест сімвалаў, якія мы ўжо расшыфравалі, чытаем:

the tree thr‡?3h the.

Пакінуўшы прабелы ці кропкі на месцы невядомых нам знакаў, маем:

the tree thr... h the.

Слова *through* адразу кідаецца ў вочы. Больш за тое, гэтае адкрыццё дорыць нам тры новыя літары: *o, u* і *g*, якія ў шыфры замяшчаюць «=», «?» і «3» адпаведна.

Цяпер, больш пільна праглядаючы шыфр у пошуках новых вядомых нам сімвалаў, амаль у самым пачатку тэксту мы сустракаем наступнае спалучэнне:

«83(88», ці *egree*,

якое натуральным чынам ёсць заканчэннем слова *degree* («градус»), і яно дае нам новую літару *d*, што ў шыфры ёсць знакам «+».

За чатыры сімвалы да слова *degree* мы знаходзім камбінацыю «;46(;88».

Замяшчаючы ўжо вядомыя нам знакі і падстаўляючы, як і раней, замест невядомых кропкі, чытаем: *th. rtee.*. Такое спалучэнне адразу наводзіць на думку пра слова *thirteen* («трынаццаць») і зноў адорвае нас дзвюма новымі літарамі: *i* і *n*, што зашыфраваныя знакамі «6» і «*».

Звяртаючыся, у сваю чаргу, да пачатку шыфру, мы бачым наступную камбінацыю:

«53==+».

Дэшыфруючы яе, як і раней, атрымліваем *good* («добры»). Гэта пераконвае нас, што першая літара — *A* (неазначальны артыкль), а першыя два словы — *A good* («добрае»).

Прыйшоў час упарадкаваць знойдзеныя намі адпаведнікі сімвалам у выглядзе табліцы, каб пазбегнуць непатрэбнай блытаніны. Табліца будзе выглядаць наступным чынам:

«5» адпавядае знаку *a*

«+» — *d*
«8» — *e*
«3» — *g*
«4» — *h*
«6» — *i*
«*» — *n*
«=» — *o*
«(» — *r*
«;» — *t*

Такім чынам, мы маем не менш за дзясятак найбольш важных літар, а таму, я лічу, не варта працягваць тлумачыць дэшыфроўку далей. Я ўжо дастаткова расказаў, каб пераканаць вас, што такія шыфры цалкам паддаюцца развязанню, пазнаёміўшы вас з асноўнымі механізмамі іх разгадкі. Але ўсё ж, запэўніваю вас, крыптаграма перад вамі належыць да самага простага віду тайнапісу. Зараз мне застаецца адно даць вам поўную расшыфроўку сімвалаў на пергаменце. Гучыць яна наступным чынам:

A good glass in the bishop's hostel in the devil's seat forty-one degrees and thirteen minutes northeast and by north main branch seventh limb east side shoot from the left eye of the death's-head a bee line from the tree through the shot fifty feet out.

(Добрае шкло ў біскупавым двары на чортавым крэсле сорак адзін градус трынаццаць хвілінаў поўнач-усход-поўнач галоўны сук сёмая галіна ўсходні бок страляй з левага вока мёртвай галавы проста ад дрэва праз стрэл на пяцьдзясят футаў).

— Але па-мойму, — сказаў я, — загадка лягчэйшай не робіцца. Як можна даць рады ўсёй гэтай тарабаршчыне накшталт «чортавых крэслаў», «мёртвых галоваў» ды «біскупавых двароў»?

— Прызнацца, — адказаў Легран, — тэкст падаецца складаным толькі на першы погляд. Спачатку я паспрабаваў падзяліць сказ натуральным чынам.

— Вы маеце на ўвазе расставіць знакі прыпынку?

— Нешта накшталт таго.

— Але якім чынам вы збіраліся гэта зрабіць?

— Я падумаў, што пісаць словы разам без аніякіх прабелаў, ускладняючы разгадку шыфру, было адмысловай задумаю аўтара. А звышасцярожны чалавек, імкнучыся да гэтага, хутчэй за ўсё перастараецца. Таму калі аўтар набліжаўся да верагоднай паўзы ці кропкі ў сваім шыфры, то ў гэтым месцы ён з яшчэ большай стараннасцю ляпіў знакі бліжэй, чым звычайна. Калі вы зірнеце на тайнапіс у яго цяперашнім выглядзе, то лёгка заўважыце пяць выпадкаў празмернай шчыльнасці тэксту. Кіруючыся гэтай падказкай, я зрабіў падзел наступным чынам:

«Добрае шкло ў біскупавым двары на чортавым крэсле... сорак адзін градус трынаццаць хвілінаў... поўнач-усход-поўнач... галоўны сук сёмая галіна ўсходні бок... страляй з левага вока мёртвай галавы... простая ад дрэва праз стрэл на пяцьдзясят футаў».

— Але нават гэты падзел мне нічога не праясніў, — заўважыў я.

— Мне спачатку таксама, — працягваў Легран. — Але тым часам я заняўся стараннымі роспытамі ўсіх у наваколлі вострава Саліван пра будынак, які б мог насіць назву «дом біскупа» і, натуральна, не зважаў на састарэлае слоўца «двор». Не знайшоўшы і блізка нічога такога, я ўжо збіраўся пашырыць геаграфічныя межы сваіх пошукаў і ўзяцца за справу больш сістэматычна, як аднойчы раніцай мне нечакана прыйшло да галавы, што «біскупаў двор» нейкім чынам звязаны са старажытным родам Біскапаў, што ў далёкія часы валодаў старадаўнім маёнткам за чатыры мілі на поўнач ад вострава. Такім чынам, я накіраваўся ў раён плантацыяў і пачаў апытваць састарэлых мурынаў той мясцовасці. І тут жа адна старая сказала, што чула некалі пра месца, што завецца «Біскупаў двор», і можа правесці мяне туды, але гэта зусім не карчма і не маёнтак, а высокая гара.

Я прапанаваў ёй шчодрую ўзнагароду за турботы, і пасля некаторых ваганняў яна пагадзілася правесці мяне да месца. Мы знайшлі яго без асаблівых цяжкасцяў, і, адпусціўшы старую, я пачаў аглядацца. «Двор» складаўся з чарады няроўных стромаў і скалаў, адна з якіх, адасобленая ад іншых, вылуча-

лася сваёй надзвычайнай веліччу і ненатуральным выглядам. Забраўшыся на яе вяршыню, я разгубіўся, бо што рабіць далей, не ведаў.

Калі ж я цалкам заглыбіўся ў роздумы, мой погляд раптам упаў на вузкі выступ з усходняга боку скалы, на адлегласці прыкладна ярд ад месца, дзе я стаяў. Выступ быў каля васямнаццаці дзюймаў у даўжыню і не больш за фут у шырыню, а ніша ў скале над ім надавала выступу некаторае падабенства да крэслаў, якімі некалі карысталіся нашы продкі. У мяне не было сумневаў, што гэта менавіта тое «чортава крэсла», пра якое згадвалася ў пергаменце. І тут, падаецца, я разгадаў усе таямніцы тайнапісу.

Я ведаў, што «добрае шкло» — не што іншае, як падзорная труба, бо маракі рэдка ўжываюць слова «шкло» ў іншым значэнні. Цяпер я зразумеў, навошта патрэбная труба, і знайшоў дакладны пункт, адкуль трэба ў яе глядзець. Таксама ў мяне не было сумневаў, што выразы «сорак адзін градус трынаццаць хвілінаў» і «поўнач-усход-поўнач» былі не чым іншым, як напрамкам, у якім трэба павярнуць трубу. Моцна ўзрушаны сваімі адкрыццямі, я паспяшаўся дахаты, захапіў падзорную трубу і зноў вярнуўся да скалы.

Я спусціўся на выступ, і выявілася, што ўладкавацца на ім магчыма толькі ў адной позе. Гэты факт пацвердзіў мае ранейшыя здагадкі. Я ўзяў у рукі падзорную трубу. Натуральна, «сорак адзін градус і трынаццаць хвілінаў» было вышынёй над лініяй далягляду, а гарызантальны кірунак яскрава адлюстроўвалі словы «поўнач-усход-поўнач». Спачатку я лёгка зарыентаваўся з дапамогай кішэннага компаса, а потым, трымаючы трубу пад вуглом, максімальна блізкім да сорак аднаго градусу, бо мераў на вока, я рухаў трубу то ўверх, то ўніз, пакуль маю ўвагу не прыцягнула круглая дзірка ці прагал у лістоце вялізнага дрэва, якое высока сягала па-над іншымі. У самым цэнтры прагалу я заўважыў белую пляму, але спачатку ніяк не мог разгледзець, што гэта. Падладжваючы фокус трубы, я зноў прыгледзеўся і нарэшце зразумеў: гэта быў чалавечы чэрап.

Пасля такога адкрыцця я вельмі ўзрадаваўся, бо лічыў таямніцу ўжо раскрытай: выраз «галоўны сук сёмая галіна

ўсходні бок» мог характарызаваць толькі месцазнаходжанне чэрапа на дрэве, а «страляй з левага вока мёртвай галавы» таксама мела адно-адзінае тлумачэнне і датычыла таго месца, дзе схаваны скарб. Я меркаваў, рабіць трэба было наступнае: выпусціць кулю праз левае вока чэрапа, потым правесці простую лінію ад найбліжэйшай часткі дрэва праз «стрэл», то бок тое месца, куды ўпала куля, і, працягнуўшы яе яшчэ на пяцьдзясят футаў, атрымаць пэўны пункт, дзе, як я думаў, прынамсі гіпатэтычна будзе каштоўны скарб.

— Усё гэта, — сказаў я, — даволі ясна і хоць крыху мудрагеліста, але проста й дасціпна. А што было, як вы сышлі з «Біскупавага двара»?

— Ну, уважліва вывучыўшы, дзе месціцца дрэва, я накіраваўся дахаты. Дарэчы, як толькі я злез з «чортавага крэсла», прагал у лістоце знік, і як я пазней ні намагаўся яго заўважыць ізноў, нічога не атрымлівалася. Вось гэта мне і падалося найвялікшай цікавосткай — як я ні спрабаваў пабачыць той прагал у лістоце, прыкметны ён быў толькі з вузкага выступу, «чортавага крэсла», і больш ніадкуль.

Да «Біскупавага двара» мяне праводзіў Юпітэр, які, без сумневу, заўважыў маю збянтэжанасць цягам апошніх тыдняў і, усхваляваны маімі паводзінамі, ні пры якіх абставінах не хацеў пакідаць мяне аднаго. Але наступнага дня, імкнучыся ўнікнуць яго апекі, я прачнуўся вельмі рана і адзін выправіўся ў горы шукаць тое дрэва. Хоць і моцна знясілеўшы, я знайшоў яго. А калі вярнуўся дахаты, мой служка вырашыў даць мне чосу. Пра астатнія прыгоды, мяркую, вы ведаеце не горш за мяне.

— Падаецца, — адказаў я, — першым разам вы памыліліся з месцам праз дурасць Юпітэра, бо той, пераблытаўшы, працягнуў нітку з жуком праз правае вока замест левага?

— Дакладна. У тым месцы, дзе мы пазначылі месца «стрэлу» і ўбілі калок, хібнасць была два з паловай дзюймы. Калі б скарб быў менавіта пад «стрэлам», дык вялікай праблемы не было б, але ж «стрэл» і найбліжэйшае месца ствала ўяўлялі сабой усяго толькі два пункты для пабудовы простай, і хаця спачатку хібнасць была амаль незаўважнай, праз пяцьдзясят

футаў яна ўжо значна адводзіла нас убок. І калі б не мая цвёрдая перакананасць, што недзе тут закапаны скарб, нашыя высілкі маглі стацца дарэмнымі.

— Мяркую, ідэю прапусціць кулю праз вока чэрапа Кіду падказала выява на пірацкім сцягу. Ды і самой задуме вярнуць грошы такім злавесным чынам не бракуе паэтычнага густу.

— Магчыма, вы маеце рацыю. Але ж мне падаецца, паэтычнасць тут у большай ступені абавязаная здароваму глузду. Бо каб з «чортавага крэсла» заўважыць невялічкі прадмет, ён мусіць быць менавіта белым, а што найлепшым чынам адпавядае гэтай мэце, як не чалавечы чэрап, які дажджы і непагадзь з часам адбельваюць яшчэ больш?

— А гэтае вашае красамоўства і маханне жуком! Я быў проста ўпэўнены, што вы звар'яцелі! І чаму вы так настойвалі, каб праз вока чэрапа прайшоў менавіта жук, а не куля?

— Ведаеце, папраўдзе кажучы, мяне крыху раззлавала вашая яўная няўпэўненасць у маім душэўным здароўі, і таму я вырашыў вас злёгку, па-свойму, пакараць, разыграўшы невялікую містыфікацыю. Менавіта з гэтай прычыны я размахваў жуком на нітцы і загадаў спусціць яго з дрэва. Вашая ж заўвага пра яго незвычайную вагу і падштурхнула мяне да гэтых хітрыкаў.

— Так, цяпер разумею. Тады ў мяне ўзнікае толькі адно пытанне: што гэта за шкілеты, якія мы знайшлі ў яміне?

— На яго мне гэтаксама цяжка знайсці адказ, як і вам. Але па-мойму, тут ёсць толькі адно магчымае тлумачэнне, у жорсткасць і бесчалавечнасць якога страшна паверыць. Зразумела, што Кід, закопваючы свае скарбы (калі, канечне, гэта быў ён, а ў мяне на гэты конт няма ніякіх сумневаў), рабіў цяжкую справу не адзін. А калі ўсё было зроблена, ён, мабыць, палічыў мэтазгодным прыбраць непажаданых сведкаў сваёй таямніцы. Магчыма, пары ўдараў матыкай, пакуль памагатыя завіхаліся ў яміне, было дастаткова, а можа, спатрэбілася і з дзясятак — хто ведае?

*Пераклала Юля Цімафеева*

# Забойствы на вуліцы Морг

Што за песню спявалі сірэны,
якім імем назваўся Ахіл, калі
хаваўся сярод жанчын? Хоць гэта і
загадкавыя пытанні, але і яны
не застануцца без адказу.
Сэр Томас Браўн*

Адметныя асаблівасці розуму, якія адносяцца да аналітычных, самі па сабе амаль не паддаюцца аналізу. Мы вемяркуем аб іх толькі па рэальных выніках. Прынамсі, мы ведаем, што для тых, хто валодае аналітычнымі здольнасцямі, асабліва калі чалавек надзелены гэтымі якасцямі шчодра, яны заўсёды ёсць крыніцай самай шчырай радасці.

Гэтак жа, як дужы чалавек цешыцца сваімі фізічнымі здольнасцямі, з захапленнем выконваючы практыкаванні, у час якіх дзейнічаюць мышцы яго цела, аналітык ганарыцца сваёй інтэлектуальнай дзейнасцю, якая дазваляе штосьці разгадваць і разблытваць. Крыніцай асалоды для яго могуць быць самыя банальныя заняткі, праз якія выяўляецца ягоны талент. Такі чалавек захапляецца загадкамі, рэбусамі і крыптаграмамі, дэманструючы ў знойдзеных рашэннях адпаведную ступень пранікліваcці, якая для звычайнага ўсведамлення здаецца звышнатуральнай. Вынікі, народжаныя самой душой і сутнасцю метаду, насамрэч здаюцца суцэльным патокам інтуіцыі.

Здольнасці да разгадак, відаць, у значнай ступені спрыяюць матэматычныя даследаванні, і асабліва той іх напрамак, які беспадстаўна і толькі дзякуючы яго функцыям рэгрэсіўнага кірунку назвалі аналізам, як бы аналізам *par excellence*[1].

Між тым разлік — гэта яшчэ не аналіз. Шахматыст, напрыклад, займаецца першым, не прыкладаючы ніякіх

[1] Пераважна (фр.).

намаганняў да другога. Адсюль вынікае, што ўяўленне пра шахматы з гледзішча іх уплыву на разумовыя здольнасці чалавека вельмі памылковае. Я зараз прапаную вашай увазе не трактат, а толькі выпадковыя назіранні ў якасці ўступу да аднаго ў нейкай ступені незвычайнага апавядання. У сувязі з гэтым я карыстаюся выпадкам, каб зазначыць, што найвышэйшыя здольнасці аналітычнага розуму могуць быць ужытыя з большай карысцю і мэтазгоднасцю ў сціплай гульні — шашках, чым у шахматах, гульні вытанчанай, але павярхоўнай. У шахматах, з іх разнастайнымі фігурамі і мудрагелістымі хадамі, рознымі і пераменнымі велічынямі, складанасць памылкова (і гэтая памылка — даволі распаўсюджаная) успрымаецца як глыбіня. Але тут патрэбная найперш увага. Паслабіш яе — і атрымаецца недагляд, а з ім пралік ці нават пройгрыш. А з прычыны, што шахматныя хады не толькі разнастайныя, але і шматзначныя, шанцы недагляду вялікія, і ў дзевяці выпадках з дзесяці перамагае не больш здольны, а больш уважлівы гулец. У шашках, наадварот, дазваляецца адзін від ходаў з лічанымі варыянтамі, таму і шанцы недагляду нязначныя, уважлівасць сама па сабе амаль не адыгрывае такой ролі, і перавага таго ці іншага боку залежыць ад кемлівасці. Каб быць больш канкрэтным, возьмем партыю шашак, у якой на дошцы засталіся ўсяго чатыры дамкі, і таму пра нейкі недагляд і гаворкі не можа быць. Відавочна, перамога залежыць (калі гульцы роўныя ва ўсіх адносінах) толькі ад удала вышуканага ходу і актыўных разумовых высілкаў. Пазбаўлены звычайных сродкаў, аналітык пранікае ў душу праціўніка, ставіць сябе на яго месца і нярэдка з першага погляду знаходзіць такім чынам той адзіны спосаб (часам да абсурду просты), дзякуючы якому ён можа скіраваць праціўніка на памылковы шлях або прыспешыць, садзейнічаючы тым самым праліку.

Віст здаўна вядомы як добрая школа для развіцця здольнасці, якая завецца разлікам, і вядома, што людзі найвышэйшага ўзроўню інтэлекту знаходзілі ў гэтай гульні невытлумачальную асалоду, грэбуючы шахматамі як нікчэмным заняткам. Несумненна, ніякая іншая гульня нават блізка

не патрабуе такіх аналітычных здольнасцяў. Найлепшы ў хрысціянскім свеце шахматыст можа аказацца ўсяго толькі найлепшым гульцом у шахматы, калі ж гаворка ідзе пра высокі клас гульні ў віст, то маецца на ўвазе наяўнасць здольнасцяў да поспеху і ў кожнай іншай сур'ёзнай дзейнасці, звязанай са спаборніцтвам інтэлектаў. Гаворачы пра «высокі клас», я маю на ўвазе тую дасканаласць у гульні, якая ўключае ў сябе веданне ўсіх шляхоў, што вядуць да сумленнай перамогі. Шляхі гэтыя не толькі шматлікія, але і разнастайныя, і часта схаваныя ў патаемных кутках, сярод думак, зусім не дасягальных звычайнаму разуменню. Уменненазіраць — гэта здольнасць дакладна запамінаць, і таму шахматыст, які гуляе засяроджана, будзе мець поспех і ў вісце, бо правілы Хойла* (заснаваныя на простай механіцы гульні) дастаткова зразумелыя ўсім.

Такім чынам, лічыцца, што дастаткова мець учэпістую памяць і дзейнічаць дакладна «па кнізе» — і можна смела гуляць у віст. Але майстэрства аналітыка выяўляецца якраз у тым, што выходзіць за межы правілаў. Ён робіць сам сабе мноства высноваў і назіранняў. Так, відаць, дзейнічаюць і яго партнёры, але розніца ў атрыманай інфармацыі залежыць не столькі ад надзейнасці, колькі ад якасці назірання. Важна — што назіраць. Але наш гулец нічым сябе не абмяжоўвае. І хоць яго галоўная мэта — гульня, ён не адмаўляецца і ад высноваў наконт рэчаў, што выходзяць за межы гульні. Ён вывучае твар партнёра, параўноўваючы яго з тварамі праціўнікаў, назірае, як кожны гулец сартуе карты, якія апынуліся ў яго на руках, часта вядзе падлік козыраў, анёраў па позірках, якія кідаюць на іх гульцы. Адзначае кожную змену выразу твару ў час гульні, збіраючы такім чынам у сваю аналітычную скарбонку самыя розныя высновы на падставе разнастайных адценняў упэўненасці, здзіўлення, трыюмфу або жалю. Назіраючы, як чалавек бярэ бітку, аналітык прыходзіць да высновы, ці будзе за ёй яшчэ адна — у масць. Па тым, як гулец кідае карты на стол, ён здагадваецца, фінт гэта ці не. Неабачлівае або неасцярожнае слова, выпадкова выпушчаная з рук або перавернутая карта, тое, як яе хаваюць, — насмешліва або спакойна, улік бітак і іх раскладка, збянтэжанасць, ваганне, апантанасць

або трывога — усё гэта для ягонага, безумоўна, інтуітыўнага ўсведамлення — прыкметы сапраўднага стану рэчаў. Пасля першых двух-трох хадоў яму ўжо зразумела, што ў каго на руках, і вось ён ужо выкладае карты настолькі ўпэўнена, нібыта астатнія гульцы спецыяльна адкрылі яму свае.

Здольнасць да аналізу не трэба блытаць з простай вынаходлівасцю, бо калі аналітык — абавязкова чалавек вынаходлівы, то чалавек проста вынаходлівы часта аказваецца надзіва не здатным да аналізу. Здольнасць да лагічнага пабудавання ці злучэння, якую звычайна лічаць прыкметай вынаходлівасці і для якой фрэнолагі* вызначылі спецыяльны орган (памылкова, на мой погляд), лічачы гэтую здольнасць першаснай, настолькі часта назіралася ў людзей з інтэлектам, блізкім да ідыятызму, і гэта неаднойчы заўважалася літаратарамі, што пішуць на тэмы маралі. Паміж вынаходлівасцю і здольнасцю да аналізу існуе нашмат большая розніца, чым паміж здольнасцямі да фантазій і ўяўленняў, але па сваім характары розніца абсалютна тая самая. Сапраўды, нельга не заўважыць, што вынаходлівыя людзі заўсёды схільныя да фантазіі, але толькі тыя, якія насамрэч здольныя да ўяўлення, непазбежна аказваюцца аналітыкамі.

Далейшы аповед прапануецца чытачу нейкім чынам як прыклад да выказаных вышэй меркаванняў.

Жывучы ў Парыжы цягам вясны і часткі лета 18.. года, я пазнаёміўся з нейкім мсьё С. Агюстам Дзюпэнам. Быў ён зусім яшчэ малады, паходзіў са шляхетнага, сапраўды знакамітага роду, але ў выніку самых розных неспрыяльных падзеяў апынуўся ў такой галечы, што страціў прыродную энергію, ні да чога ў гэтым свеце не імкнуўся і нават не спрабаваў вярнуць былое багацце. З ласкі крэдытораў у яго засталася невялічкая частка родавай спадчыны, на прыбыткі ад якой ён здолеў, дзякуючы вялікай ашчаднасці, забяспечваць сябе самым неабходным для жыцця, не звяртаючы ўвагі на нешта іншае. Кнігі — гэта адзіная раскоша, якую ён сабе дазволіў, а ў Парыжы яна даволі дасягальная.

Упершыню мы сустрэліся ў непрыкметнай бібліятэцы на вуліцы Манмартр, дзе выпадкова — мы абодва шукалі адну і

тую ж кнігу, вельмі рэдкае і адметнае выданне, — выявілася агульнасць нашых інтарэсаў. Потым мы сустракаліся зноў і зноў. Мяне глыбока зацікавіў кароткі, але грунтоўны экскурс у гісторыю яго роду, які ён зрабіў з усёй шчырасцю, на якую здольны француз, калі гаворка заходзіць пра яго асобу.

Мяне ўразіла яго начытанасць, але больш за ўсё — нястрымная палкасць і свежасць уяўлення. Шукаючы ў Парыжы тое, што моцна вабіла мяне тады, я разумеў, што кампанія гэтага чалавека ўяўляе для мяне неацэнную каштоўнасць, і адкрыта сказаў яму пра гэта. Урэшце было вырашана, што на той час, пакуль я буду ў Парыжы, мы будзем жыць разам, і з прычыны, што мае жыццёвыя абставіны былі ў нейкай ступені не такія цяжкія, то я з яго згоды ўзяў на сябе выдаткі, звязаныя з наймам і абсталяваннем дому. Гэта быў асабняк у стылі, адпаведным нашаму з ім характару рамантычнай меланхоліі, пашкоджаны часам і своеасаблівы па сваёй архітэктуры, у зацішным і адасобленым кутку Сэн-Жэрменскага прадмесця*. У ім ужо даўно не жылі гаспадары праз нейкія там забабоны, якімі мы не цікавіліся, і таму ён паступова прыходзіў у заняпад.

Калі б лад нашага жыцця стаў вядомы свету, нас бы абавязкова палічылі вар'ятамі — хоць, відаць, і бясшкоднымі. Наша адасобленасць была поўная. Нікога ў сваім доме мы не прымалі. Месца нашага жыхарства старанна трымалася ў таямніцы ад маіх былых кампаньёнаў, а Дзюпэн ужо даўно не цікавіўся Парыжам, ды і Парыж не ўспамінаў пра яго. Мы існавалі толькі для сябе.

Адным з фантазійных дзівацтваў майго прыяцеля — бо як яшчэ гэта назваць? — была ўлюбёнасць у ноч, і я пакорна пагадзіўся з гэтым *bizarrerie*[1], як і з усімі астатнімі, цалкам падпарадкаваўшыся яго няспынным капрызам.

Царыца-ноч не магла заставацца з намі ўвесь час, але мы навучыліся імітаваць яе прысутнасць. Раніцай, з першым святлом, мы зачынялі тоўстыя аканіцы старога дому, запальвалі пару вельмі духмяных свечак, здатных толькі на

[1] Дзівацтва (фр.).

цьмянае святло. У іх святле мы поўнілі сэрцы мроямі — чыталі, пісалі, дзяліліся думкамі, пакуль звон гадзінніка не абвяшчаў надыходу сапраўднай цемры. Тады мы выпраўляліся з дому, ідучы поплеч, працягвалі пачатыя ўдзень размовы або бязмэтна шпацыравалі ўздоўж і ўпоперак па вялікім горадзе да позняй ночы, шукаючы сярод мільгаючых агнёў і ценяў тую бясконцую душэўную ўзбуджанасць, якая вынікае з ціхага сузірання.

У такія моманты я міжволі заўважаў (хоць, ведаючы яго схільнасць да фантазій, я прадбачыў гэта) своеасаблівыя здольнасці Дзюпэна і захапляўся імі. Ён, відаць, таксама са шчырым захапленнем карыстаўся імі — нават калі іх не дэманстраваў — і не вагаючыся прызнаваўся, што робіць гэта з задавальненнем. Ён хваліўся мне, ціха пасмейваючыся, што калі для іншых чалавечая душа была за глухой сцяной, то ён мог зазірнуць у большасць душаў праз шырока расчыненыя для яго вокны, і звычайна суправаджаў такія заявы ашаламляльнымі доказамі глыбокага ведання маёй душы. У такія моманты ён быў халодны і безуважны, вочы яго рабіліся непранікальныя, а голас, сакавіты тэнар, пераходзіў у дыскант, і ў ім можна было адчуць нават раздражнёнасць, калі б не выразная дыкцыя і падкрэсленая няспешнасць у словах. Назіраючы за ім у такія моманты, я часта задумваўся над старадаўняй філасофскай тэорыяй пра дваістасць душы, і ў галаву прыходзіла забаўная думка пра двух Дзюпэнаў: адзін нешта ствараў, а другі ламаў створанае на кавалкі.

Прачытаўшы ўсё гэта, не падумайце, што я збіраюся расказаць вам у падрабязнасцях нейкую таямнічую гісторыю або апісаць нейкі рамантычны эпізод. Тыя асаблівасці прыяцеля-француза, пра якія я вам паведаміў, былі ўсяго толькі вынікам узбуджанасці ці, можа, хваравітасці розуму. Але характар яго заўваг у моманты, пра якія тут ідзе гаворка, лепш за ўсё праілюструе адзін прыклад.

Аднойчы ўвечары мы гулялі па доўгай бруднай вуліцы непадалёк ад Пале-Раяля*. Кожны з нас, відаць, быў заняты сваімі думкамі, і цягам чвэрці гадзіны ніхто не сказаў ані слова. І тут раптам цішыню перарвалі наступныя словы Дзюпэна:

— Ён недаростак, гэта праўда, і было б лепей, каб ён паспрабаваў свае сілы ў тэатры «Вар'етэ»*.

— Ну, вядома, так, — адказаў я машынальна, спачатку не звярнуўшы ўвагі (настолькі быў заняты думкамі) на тое, што гэтыя словы вельмі дзіўна супалі з маімі разважаннямі. Праз нейкі момант я апамятаўся, і маё здзіўленне было бязмежным.

— Дзюпэн, — сказаў я сур'ёзна, — гэта вышэй за маё разуменне. Шчыра кажучы, я вельмі ўражаны і ледзь веру сваім вушам. Як гэта ты здагадаўся, што я думаю пра... — тут я спыніўся, каб пераканацца, што ён сапраўды ведае, пра каго я думаў.

— ...пра Шантыі, — сказаў ён. — Чаму ты змоўк? Ты падумаў, што яго мізэрная постаць не падыходзіць для трагедыйных роляў.

Менавіта пра гэта я і разважаў. Шантыі, *quondam*[1] шавец з вуліцы Сэн-Дэні, які да вар'яцтва захапіўся тэатрам, паспрабаваў сыграць ролю Ксеркса ў аднайменнай трагедыі Крэбіёна*, вельмі стараўся, але ў выніку атрымаў знішчальныя водгукі.

— Растлумач напраміласць Бог, — усклікнуў я, — свой метад, калі ён існуе, праз які ты толькі што зазірнуў мне ў душу.

Папраўдзе кажучы, я імкнуўся быць вонкава спакойным, хаваючы такім чынам збянтэжанасць, што ахапіла мяне.

— Гандляр садавінoй навёў цябе на думку, што гэты маэстра па падэшвах не дарос да Ксеркса *et id genus omne*[2].

— Гандляр садавінoй? Ну, ты мяне здзіўляеш! Не ведаю я ніякага гандляра садавінoй.

— Ну, той, з кім ты сутыкнуўся, калі мы зварочвалі на гэтую вуліцу, хвілін пятнаццаць таму.

Тут я ўзгадаў, што сапраўды нейкі гандляр з кошыкам яблыкаў на галаве ледзь не збіў мяне знянацку з ног, калі мы зварочвалі з вуліцы С. на тую, дзе цяпер стаялі. Але я не мог ніяк зразумець, якое гэта мела дачыненне да Шантыі.

---

[1] Былы (лац.).
[2] І такіх, як ён (лац.).

Але Дзюпэн ні на кроплю не быў схільны да *charlatanerie*[1].

— Я зараз растлумачу, — сказаў ён. — І каб ты ўсё зразумеў, мы спачатку адновім ход тваіх думак, пачынаючы з таго моманту, як я звярнуўся да цябе, да *rencontre*[2] з тым самым гандляром. Асноўныя звёны ланцуга — Шантыі, Арыён, д-р Нікалс*, Эпікур, стэрэатамія, каменне ў бруку, гандляр садавіной.

Няма, відаць, такіх людзей, якія б у адпаведныя моманты свайго жыцця не паўтаралі ў думках дзеля забавы крок за крокам шлях, які прывёў іх да той ці іншай высновы. Занятак гэты часта вельмі цікавы, і той, хто сутыкаецца з ім упершыню, дзівіцца неабмежаванай адлегласці і неадпаведнасці паміж зыходным пунктам і канчатковай высновай. Вялікім, відаць, было і маё здзіўленне, калі я пачуў тое, што сказаў Дзюпэн, і не мог не пагадзіцца, што ўсё гэта — праўда.

Ён жа працягваў:

— Перад тым як звярнуць з вуліцы С., я добра памятаю, мы гаварылі пра коней. На гэтай тэме і перарвалася нашая размова. Калі мы пераходзілі на гэтую вуліцу, гандляр, які прабягаў побач з кошыкам яблыкаў на галаве, адпіхнуў цябе на кучу камянёў, паскіданых у тым месцы, дзе рамантуюць брук. Ты спатыкнуўся аб камень, паслізнуўся, крыху расцягнуў звязку на костачцы, відаць, раззлаваўся, ва ўсякім разе, спахмурнеў, нешта прамармытаў, азірнуўся на груду камянёў і моўчкі пакрочыў далей. Я не вельмі стараўся сачыць за тваімі дзеяннямі, але назіральнасць зрабілася апошнім часам неад'емнай часткай маёй натуры.

Ты працягваў ісці з апушчанай галавой, незадаволена косячыся на калдобіны і расколіны ў бруку (такім чынам я зразумеў, што ты ўсё яшчэ думаеш пра камяні), пакуль мы не дайшлі да завулка, што носіць імя Ламарціна* і які забрукавалі ў якасці эксперымента «ўнакладку», шчыльна падладзіўшы пліткі заклёпкамі. Твой твар павесялеў, і па вуснах я здагадаўся, што ты прамармытаў слова «стэрэатамія» — тэрмін, вельмі

[1] Ашуканства (фр.).
[2] Сустрэча (фр.).

штучна суаднесены з гэтым тыпам бруку. Я ведаў, што ты не мог вымавіць гэта слова, не ўзгадаўшы пра атамы, а таксама пра тэорыі Эпікура. Мы не так даўно абмяркоўвалі гэтую тэму — я заўважыў, як надзіва дакладна, хоць на гэта мала хто звярнуў увагу, не вельмі выразныя здагадкі высакароднага грэка пацвердзіліся пазней касмагоніяй у дачыненні да нябесных туманнасцяў, — а таму я падумаў, што ты абавязкова падымеш вочы, каб зірнуць на вялікую туманнасць у сузор'і Арыёна, і спадзяваўся, што менавіта так і атрымаецца. Ты сапраўды зірнуў угору, тым самым упэўніўшы мяне, што я правільна іду па тваім следзе. Але ў вельмі адмоўным водгуку на выступ Шантыі ва ўчорашняй *Musée* нейкі з'едлівы крытык, вельмі нетактоўна намякаючы на тое, што шавец, які стаў на катурны, змяніў і прозвішча, прыпомніў адзін радок на лацінскай мове, да якога мы часта звярталіся ў размовах. Я маю на ўвазе гэты: *Perdidit antiquum litera prima sonum*[1].

Я неяк казаў табе, што радок быў напісаны адносна Арыёна, бо некалі ён пісаўся як Урыён. Мы яшчэ тады пажартавалі наконт гэтага, і я ведаў, што ўсё засталося ў тваёй памяці. Таму было зразумела, што ты абавязкова злучыш у галаве думкі пра Арыёна і Шантыі. Тое, што менавіта так і здарылася, пацвердзіла твая ўсмешка. Ты падумаў, што бедны Шантыі сам сябе прынёс у ахвяру. Спачатку ты ішоў згорбіўшыся, а тут — выпрастаўся на ўвесь рост. Такім чынам, я быў упэўнены, што ты падумаў пра мізэрную фігуру Шантыі. У той самы момант я перабіў твае думкі, зазначыўшы, што гэты Шантыі і праўда недаростак і было б лепей, каб ён паспрабаваў свае сілы ў тэатры «Вар'етэ».

Неўзабаве пасля гэтага мы праглядалі вечаровы выпуск «Судовай газеты», і нашую ўвагу прыцягнулі наступныя радкі:

«Незвычайнае забойства.

Сёння а трэцяй гадзіне ночы жыхароў квартала Сэн-Рош абудзілі ад сну немыя крыкі, што чуліся, відаць, з пятага паверха дому на вуліцы Морг, у якім, як было вядома, жылі толькі мадам Л'Эспанэ і яе дачка мадэмуазэль Каміла

---

[1] Страціла былое гучанне першая літара* (лац.).

Л'Эспанэ. Пасля некаторай затрымкі, якая тлумачылася спробай зайсці ў дом звычайным чынам, дзверы пад'езда адчынілі ломам, і туды зайшлі восем ці дзесяць чалавек суседзяў і разам з імі два жандары. Да таго часу крыкі ўжо сціхлі, але калі згаданая група адолела першы пралёт лесвіцы, то пачула, як недзе, відаць, на верхніх паверхах, грубымі галасамі сварацца не менш за два чалавекі. Пакуль дабеглі да другой лесвічнай пляцоўкі, гэтыя галасы ўжо сціхлі і ўсюды панавала цішыня. Людзі падзяліліся на групы і пачалі прачэсваць пакой за пакоем. Калі яны апынуліся ў вялікай спальні на пятым паверсе ў задняй частцы будынка (дзверы, замкнёныя на ключ з сярэдзіны, таксама выламалі), дык сталі сведкамі відовішча, якое вельмі напалохала і здзівіла прысутных.

Усё ў кватэры было ў страшэнным беспарадку — усюды валялася паламаная мэбля. У пакоі стаяў толькі адзін ложак, і з яго сцягнулі і параскідалі па падлозе пасцель. На крэсле ляжала брытва з акрываўленым лязом. Да каміна прыліплі дзве-тры тоўстыя акрываўленыя пасмы вырваных, відаць, з коранем сівых валасоў. На падлозе знайшлі чатыры напалеандоры, адну завушніцу з тапазам, тры срэбныя сталовыя, тры чайныя мельхіёравыя лыжкі і два мяшэчкі з залатымі манетамі амаль на чатыры тысячы франкаў. Шуфляды камоды, якая стаяла ў куце пакоя, былі выцягнутыя, у іх, відаць, корпаліся, але многія рэчы засталіся на сваіх месцах. Пад пасцеллю (а не пад ложкам) была знойдзеная невялічкая жалезная скрынка. Яна была адамкнёная і ў дзверках яшчэ тырчэў ключ. Унутры нічога не было, акрамя некалькіх старых лістоў і іншых нязначных папераў.

Ад мадам Л'Эспанэ не засталося ніякіх слядоў, але калі ў каміне заўважылі незвычайна вялікую колькасць сажы, то праверылі дымаход і — які жах! — выцягнулі адтуль за галаву труп дачкі: значыць, нехта запхнуў яго ў вузкі праход, і даволі далёка. Цела было яшчэ цёплае. Як высветлілася ў час агляду, скура ў многіх месцах была паздзіраная — несумненна, вынік таго, што яе гвалтоўна запіхвалі ў комін. На твары шмат глыбокіх драпін, на шыі сінякі і глыбокія сляды ад пазногцяў, падобна да таго, што дзяўчыну душылі.

Пасля таго як старанна абшукалі ўсе куткі і нічога больш не знайшлі, усе пайшлі ўніз у брукаваны дворык за домам, дзе ўбачылі труп старэйшай жанчыны — рана на шыі была настолькі глыбокая, што калі труп паспрабавалі падняць, адразу адвалілася галава. І цела, і галава страшэнна знявечаныя, асабліва цела, якое было ўжо амаль не падобнае да чалавечага.

Як нам вядома, для разгадкі гэтай жудаснай гісторыі не знойдзена пакуль што ніводнага ключа».

На другі дзень газета паведаміла новыя падрабязнасці:

«Трагедыя на вуліцы Морг. У сувязі з гэтай неверагоднай і жудаснай афёрай (слова «афёра» не набыло ў Францыі такога фрывольнага сэнсу) дапытаныя многія асобы, але так нічога і не высветлілася.

Ніжэй падаюцца найбольш істотныя сведчанні:

Палін Дзюбур, прачка, сведчыць, што ведала нябожчыц апошнія тры гады, прала іх бялізну. Старая пані з дачкой жылі, відаць, дружна, любілі адна адну. Плацілі вельмі добра. Наконт таго, за што яны жылі, на якія сродкі, нічога сказаць не можа. Лічаць, што мадам Л'Эспанэ зарабляла на жыццё варажбой. Гаварылі, што грошы ў яе былі. Сведка нікога чужога ў доме не сустракала — і калі прыходзіла па бялізну, і калі вяртала яе. Ведае дакладна, прыслугі яны не трымалі. Як ёй вядома, мэбля была толькі на пятым паверсе.

П'ер Маро, уладальнік тытунёвай крамы, сведчыць, што цягам чатырох гадоў прадаваў мадам Л'Эспанэ тытунь і табаку невялікімі порцыямі. Ён нарадзіўся і ўсё жыццё жыў у гэтым квартале. Нябожчыца з дачкой займалі дом, дзе былі знойдзеныя іх трупы, больш за шэсць гадоў. Раней там жыў ювелір, які здаваў пакоі на верхніх паверхах розным асобам. Дом належаў мадам Л'Эспанэ. Ёй не спадабалася, як кватарант ставіцца да яе маёмасці, таму сама пераехала ў дом і адмаўляла ўсім, хто хацеў зняць той ці іншы пакой. Старая пані здзяцінела. Цягам усіх гэтых гадоў сведка бачыў дачку разоў пяць-шэсць. Абедзве жанчыны жылі надзвычай адасоблена і, паводле чутак, былі пры грашах. Чуў, суседзі гаварылі, што мадам Л'Эспанэ займалася варажбой, але ён гэтаму не

верыў. Ніколі не бачыў, каб хто-небудзь заходзіў у дом, акрамя самой гаспадыні і дачкі, разы два быў прыбіральшчык, восем-дзесяць візітаў зрабіў доктар.

Прыкладна тое самае засведчылі і іншыя асобы, якія жывуць па суседстве. Яны не маглі назваць нікога, хто б часта наведваўся ў дом. Невядома, ці былі ў нябожчыц сувязі з навакольным светам. Аканіцы на фасадзе адчыняліся рэдка, а тыя, што з двара, былі зачыненыя заўсёды, за выняткам аднаго вялікага пакоя на пятым паверсе. Будынак моцны — не вельмі стары.

Ізідор Мюзэ, жандар, сведчыць, што яго выклікалі каля трох гадзін ночы. Калі падышоў да дому, убачыў ля ўваходных дзвярэй чалавек дваццаць-трыццаць, якія спрабавалі зайсці ўсярэдзіну. Праз некаторы час ён узламаў дзверы, штыхом, а не ломам. Зрабіць гэта было няцяжка, бо дзверы двухстворкавыя і не замкнёныя на засаўку ні зверху, ні знізу. Крыкі чуліся ўвесь час, пакуль адчынялі дзверы, — а потым раптам сціхлі. Відаць, крычалі (цяжка сказаць, адзін чалавек або некалькі) у перадсмяротнай агоніі — моцна і працягла, а не адрывіста. Наверх сведка падымаўся ў ліку першых. Апынуўшыся на першай лесвічнай пляцоўцы, ён пачуў, як двое гучна і са злосцю сварацца — адзін хрыплым, а другі — больш пранізлівым, вельмі дзіўным голасам. Змог разабраць некалькі словаў, што сказаў першы. Ён быў француз. Можна сказаць дакладна, што не жанчына. Змог разабраць словы *sacré* і *diable*[1].

Пранізлівым голасам гаварыў чужаземец. Сведка не мог разабраць, быў гэта мужчынскі ці жаночы голас. Што гаварылі — не зразумеў, але лічыць, што мова была гішпанская. Выгляд пакоя і трупаў, згодна з апісаннем сведкі, не адрозніваецца ад апісання, дадзенага ва ўчорашняй газеце.

Анры Дзюваль, сусед, па прафесіі срэбранік, сведчыць, што ў ліку першых зайшоў у дом. Увогуле пацвярджае тое, што паведаміў Мюзэ. Як толькі яны зайшлі ў пад'езд, то адразу ж зачынілі за сабой дзверы, каб стрымаць натоўп,

[1] «Ліха на яго» і «д'ябал» (фр.).

які сабраўся вельмі хутка, нягледзячы на позні час. На думку сведкі, пранізлівы голас належаў італьянцу. Упэўнены, што гэта быў не француз. Не можа сказаць дакладна, ці мужчына. Магла быць і жанчына. Сведка італьянскай мовы не ведае. Словаў не разабраў, але па інтанацыі лічыць, што гаварыў італьянец. Мадам Л'Эспанэ і яе дачку ведаў. Часта гутарыў з імі. Упэўнены, што пранізлівы голас належаў не ім.

Адэнгеймер, рэстаратар. Сведка сам пажадаў даць паказанні. Французскай мовай ён не валодае, таму допыт вёўся праз перакладчыка. Ураджэнец Амстэрдама. Праходзіў каля дому, калі адтуль пачуліся крыкі. Крычалі цягам некалькіх хвілін, відаць, дзесяці. Крыкі былі доўгія і моцныя — жудасныя і невыносныя. Быў сярод тых, хто зайшоў у дом. Згодны з ранейшымі сведчаннямі па ўсіх пунктах, акрамя аднаго. Упэўнены, што пранізлівы голас належаў мужчыну, да таго ж французу. Словаў не разабраў. Гаварылі вельмі гучна і хутка — з перапынкамі, відаць, са страхам і злосцю. Голас быў рэзкі, хутчэй рэзкі, чым пранізлівы. Не, пранізлівым яго не назваў бы. Хрыплы голас увесь час паўтараў *sacré* і *diable* і адзін раз сказаў *mon Dieu*[1].

Жуль Міньё, банкір, фірмы «Міньё і сыны», вуліца Дэлярэн. Ён — Міньё-старэйшы. Мадам Л'Эспанэ валодала сякой-такой маёмасцю. Яна адкрыла ў іх рахунак увесну 18.. года, восем гадоў таму. Часта рабіла ўнёскі — невялікімі сумамі. Чэкі ніколі не выпісвала, але за тры дні да смерці асабіста ўзяла з рахунку чатыры тысячы франкаў. Грошы выплацілі золатам, іх даставіў на дом банкаўскі службовец.

Адольф Лё Бон, службовец банка «Міньё і сыны», сведчыць, што ў той дзень, пра які ідзе размова, недзе апоўдні, праводзіў мадам Л'Эспанэ да самага дому і аднёс чатыры тысячы франкаў, якія былі раскладзеныя ў два мяшэчкі. Адчыніўшы дзверы, мадэмуазэль Л'Эспанэ ўзяла з ягоных рук адзін мяшэчак, а старая пані — другі. Сведка развітаўся і пайшоў. Нікога на вуліцы ён тады не заўважыў. Вуліца — бакавая, вельмі ціхая.

[1] «Божа мой» (фр.).

Уільям Бёрд, кравец, сведчыць, што разам з іншымі зайшоў у дом. Ангелец. Два гады як жыве ў Парыжы. У ліку першых падняўся па лесвіцы. Чуў, як сварыліся двое. Хрыплы голас належаў французу. Змог разабраць некалькі словаў, але ўсіх не памятае. Выразна чуў *sacré* і *mon Dieu*. Словы суправаджаліся шумам, нібыта змагаліся міжсобку некалькі чалавек — чуліся шорганне ног, скрогат. Пранізлівы голас крычаў вельмі моцна, нашмат мацней, чым хрыплы. Упэўнены, што не ангелец. Хутчэй немец. Можа быць, і жанчына. Сам сведка па-нямецку не разумее.

Чатыры чалавекі на другім допыце засведчылі, што дзверы спальні, дзе знайшлі труп мадэмуазэль Л'Эспанэ, на той момант, калі туды зайшлі людзі, былі замкнёныя з сярэдзіны. Цішыня была поўная — ні стогнаў, ні шолахаў. Калі дзверы ўзламалі, нікога там не ўбачылі. Вокны пакояў, што выходзяць на вуліцу і ў двор, былі апушчаныя і наглуха замкнёныя з сярэдзіны. Дзверы паміж двума пакоямі былі зачыненыя, але не замкнёныя. Дзверы з пакоя ад вуліцы ў калідор былі замкнёныя на ключ з сярэдзіны. Невялічкі пакой з вокнамі на вуліцу, на пятым паверсе, той, што ў канцы калідора, быў незамкнёны, дзверы крыху прачыненыя. Ён быў поўны старых ложкаў, скрыняў і іншага хламу. Усё гэта вынеслі і ўважліва агледзелі. Абшукалі ўвесь дом з верху да нізу, сантыметр за сантыметрам. З дапамогай камінараў праверылі ўсе дымаходы. У доме пяць паверхаў і яшчэ памяшканні на гарышчы (mansardes). На дах можна выйсці праз лаз, але ён быў надзейна забіты цвікамі і, відаць, шмат гадоў не адчыняўся. Час, што прайшоў паміж тым, як пачулі галасы, і тым, калі адчынілі дзверы, вызначаецца сведкамі па-рознаму. На думку адных, прайшло ўсяго тры хвіліны, другіх — цэлых пяць. Каб адчыніць дзверы, спатрэбілася шмат намаганняў.

Альфонса Гарсія, трунар, засведчыў, што жыве на вуліцы Морг. Гішпанец па нараджэнні. Разам з іншымі быў у доме. Наверх не падымаўся. Слабыя нервы, яму нельга хвалявацца. Галасы чуў. Хрыпла гаварыў француз. Што ён сказаў, разабраць не мог. Пранізлівым голасам гаварыў ангелец, у гэтым сведка ўпэўнены. Па-ангельску не разумее, мяркуе па інтанацыі.

Альберта Мантані, уладальнік крамы гатовага адзення, засведчыў, што ў ліку першых падняўся па лесвіцы. Галасы, пра якія ідзе размова, чуў. Хрыпла гаварыў француз. Разабраў некалькі словаў. Здалося, што некага папракалі. З таго, што крычаў пранізлівы голас, не зразумеў нічога. Словы сыпаліся часта, але нераўнамерна. Здаецца, гаварыў расіец. Пагаджаецца з ранейшымі сведчаннямі. Сам ён італьянец. З расійцамі размаўляць ніколі не даводзілася.

Некалькі сведкаў на другім допыце зазначылі, што коміны ў абодвух пакоях занадта вузкія, каб праз іх мог пралезці чалавек. Калі гаварылі пра «камінараў», дык мелі на ўвазе цыліндрычныя шчоткі, якімі карыстаюцца для чысткі комінаў. Гэтымі шчоткамі прайшліся па ўсіх дымаходах. У доме няма чорнай лесвіцы, па якой можна было б збегчы ўніз у той час, пакуль натоўп падымаўся на пяты паверх. Труп мадэмуазэль Л'Эспанэ быў настолькі шчыльна заціснуты ў коміне, што толькі агульнымі намаганнямі чатырох-пяці мужчын удалося яго адтуль выцягнуць.

Поль Дзюма, лекар, сведчыць, што яго выклікалі агледзець трупы недзе на досвітку. Абодва ляжалі на голым ложку ў пакоі, дзе знайшлі мадэмуазэль Л'Эспанэ. Усё цела дачкі было ў сіняках і драпінах. Гэта ў дастатковай меры тлумачыцца тым, што яе запіхвалі ў дымаход. Асабліва пашкоджаная шыя. Крыху ніжэй за падбароддзе — некалькі глыбокіх драпін і шэраг сінякоў, відавочна, сляды пальцаў. Твар страшэннага колеру, вочы павылазілі з арбітаў. Язык ледзь не наскрозь пракушаны. Вялікі сіняк на ніжняй частцы жывата сведчыць пра тое, што тут націскалі каленам. На думку мсьё Дзюма, мадэмуазэль Л'Эспанэ была задушаная адной або некалькімі невядомымі асобамі. Труп маці жудасна знявечаны. Усе косці правай рукі і нагі ў той ці іншай ступені паламаныя. Пашчэпленыя *tibia*[1] і рэбры з левага боку.

Усё цела ў сіняках і драпінах. Цяжка вызначыць, чым нанесеныя гэтыя пашкоджанні. Гэта можна было зрабіць і тоўстай палкай, і жалезным ломам, і крэслам — любой важкай і тупой

[1] Галёнкавая косць (лац.).

рэччу ў руках вельмі дужага чалавека. У жанчыны не хапіла б сілы так моцна ўдарыць. Галава забітай, калі яе ўбачыў лекар, ляжала асобна ад цела і таксама была вельмі знявечаная. Горла перарэзалі, відавочна, вельмі вострым інструментам, магчыма, брытвай.

Аляксандр Эцьен, хірург, быў выкліканы разам з мсьё Дзюма, каб агледзець трупы. Далучаецца да сведчанняў і думак калегі.

Больш нічога істотнага высветлена не было, хоць дапыталі яшчэ некалькі чалавек. У Парыжы ніколі раней не чулі пра забойства, здзейсненае ў такіх загадкавых і заблытаных абставінах, калі гэта насамрэч забойства. Паліцыя ў поўнай разгубленасці — незвычайная з'ява ў такіх справах. Няма нават намёку на магчымую разгадку».

У вячэрнім выпуску газеты паведамлялася, што ў квартале Сэн-Рош па-ранейшаму пануе страшэнны пярэпалах і што згаданы дом зноў старанна абшукалі і яшчэ раз дапыталі сведкаў, але ўсё аказалася дарэмна. Дадаткова паведамлялася, што арыштавалі і пасадзілі за краты Адольфа Лё Бона, хоць, здавалася, ніякіх новых фактаў у дачыненні да яго, апрача тых, што паведамляліся, устаноўлена не было.

Дзюпэн, здавалася, вельмі цікавіўся ходам следства — зрэшты, я меркаваў так па яго паводзінах, бо ніякіх заўваг з яго боку не чуў. І толькі калі з'явілася вестка пра арышт Лё Бона, ён пацікавіўся маёй думкай наконт забойства.

Я мог толькі пагадзіцца з усім Парыжам, што гэтую таямніцу разгадаць нельга. Я не бачыў ніякіх шляхоў, якія б маглі вывесці на след забойцы.

— Мы не павінны меркаваць пра магчымыя шляхі на падставе такога павярхоўнага вышуку, — заўважыў Дзюпэн. — Парыжская паліцыя, якую так хваляць за праніклівасць, насамрэч толькі хітрая — і не больш за тое. У яе дзеяннях няма сістэмы, агенты жывуць адным момантам. Займаюцца дэманстрацыяй шматлікіх прыёмаў, але нярэдка гэтыя прыёмы настолькі не адпавядаюць аб'ектам вышуку, што на думку прыходзяць словы мсьё

Журдэна*, які загадваў прынесці *robe-de-chambre — pour mieux entendre la musique*[1].

Вынікі іх дзейнасці нярэдка сапраўды ўражваюць, але дасягаюцца яны ў большасці выпадкаў стараннасцю і энергічнасцю. Калі гэтыя якасці адсутнічаюць, іх задумы аказваюцца марнымі. Відок*, напрыклад, вельмі здагадлівы і ўпарты чалавек. Але калі яму бракуе інтэлекту, дык ён увесь час блытаецца, робячыся ахвярай сваёй мітуслівасці. Бачанне аб'екту скажаецца, бо ён трымае яго занадта блізка да вачэй. Ён, бадай, здольны бачыць адну-дзве дэталі выразна, але адначасова ўвесь аб'ект вывучэння абавязкова аказваецца паза межамі зроку. Такім чынам, існуе такая з'ява, як залішняе паглыбленне. Праўда не заўсёды на дне глыбокага калодзежа*. Больш за тое, найбольш важныя веды, я ўпэўнены, непазбежна ляжаць на паверхні. Глыбіня — у тых безданях, дзе мы шукаем гэтыя веды, а не на горных вышынях, дзе іх знаходзім. Характар і карані вось такіх памылак можна вызначыць шляхам назірання за нябеснымі целамі. Калі глядзець на зорку па-рознаму — зірнуць на яе коса, паступова павярнуць да яе вонкавую частку сятчаткі (больш адчувальную да ледзь прыкметных водбліскаў святла, чым яе ўнутраны бок), убачыць зорку выразна, — можна выбраць найлепшы шлях да ўяўлення пра яе бляск — бляск, які робіцца ўсё больш цьмяным, чым шырэй наш позірк ахоплівае зорку. У апошнім выпадку ў вока трапляе фактычна больш промняў, але ў першым — больш вострая ўспрымальнасць. У выніку беспадстаўнай заглыбленасці думкі збіваюцца і паслабляюцца, так і Венера можа растаць на нябесным купале, калі ўзірацца ў яе занадта ўпарта або занадта засяроджана.

Што ж датычыць гэтых забойстваў, давай зробім самастойныя вышукі, перад тым як выказаць пра іх сваю думку. Расследаванне забавіць нас. — (Я падумаў, што слова «забавіць» — недарэчнае ў дадзеным выпадку, але змаўчаў). — Акрамя таго, Лё Бон аднойчы зрабіў мне паслугу, за якую я не магу не быць яму ўдзячны. Пойдзем і агледзім будынак самі. Я знаё-

[1] Халат — каб лепш чуць музыку (фр.).

мы з Ж., прэфектам паліцыі, таму мы без цяжкасцяў атрымаем неабходны дазвол.

Атрымаўшы дазвол, мы адразу ж рушылі на вуліцу Морг. Гэта ціхі завулак, які злучае вуліцы Рышэльё і Сэн-Рош. Квартал быў далёка ад дому, дзе мы жылі, і таму мы дабраліся туды толькі пад вечар. Дом знайшлі адразу ж, бо вакол яго па-ранейшаму было шмат людзей, якія, стоячы на процілеглым баку вуліцы, з пустой цікаўнасцю пазіралі на зачыненыя аканіцы. Гэта быў звычайны парыжскі асабняк з шырокімі дзвярыма параднага ўваходу, да якога збоку прыляпілася будка з адсоўным акенцам, па якім можна было здагадацца, што гэта *loge de concierge*[1].

Перад тым як зайсці ў дом, мы прайшліся па вуліцы, звярнулі ў завулак, зноў звярнулі, прайшліся каля дому з двара — увесь гэты час Дзюпэн вывучаў квартал і сам дом з незвычайнай пільнасцю, хоць я не разумеў, што яго магло так зацікавіць.

Вярнуўшыся той жа дарогай да ўваходу, мы пазванілі і, паказаўшы адпаведныя паперы, атрымалі ад дзяжурных паліцэйскіх дазвол зайсці ўсярэдзіну. Мы пайшлі наверх, у пакой, дзе была знойдзеная мадэмуазэль Л'Эспанэ і дзе ўсё яшчэ ляжалі абодва трупы. Там па-ранейшаму быў беспарадак, бо ўсё, як гэта звычайна робіцца, захоўвалася ў непарушнасці. Нічога новага ў параўнанні з тым, што пісала «Судовая газета», я не заўважыў. Дзюпэн, аднак, уважліва агледзеў кожную дробязь, не абмінуў і трупаў. Потым мы зайшлі ў іншыя пакоі і спусціліся ў двор — увесь гэты час нас суправаджаў паліцэйскі. Агляд працягваўся да самай цемры, толькі з яе надыходам мы нарэшце развіталіся. На зваротнай дарозе дадому мой прыяцель зайшоў на хвіліну ў рэдакцыю адной ранішняй газеты.

Я ўжо гаварыў, што дзівацтвы майго сябра былі самыя нечаканыя, але *je les ménageais*[2]: у ангельскай мове няма адпаведнага эквіваленту.

[1] Памяшканне кансьержа (фр.).
[2] Я ім патураў (фр.).

У той вечар у яго не было настрою весці гаворку пра забойства, і распачаў ён яе толькі апоўдні наступнага дня. Менавіта тады ён спытаў мяне, ці заўважыў я што-небудзь асаблівае ў той сцэне жорсткасці. Ён вымавіў слова «асаблівае» з такім націскам і такім дзіўным тонам, што я, не ведаю чаму, скалануўся.

— Не, нічога асаблівага, — адказаў я, — ва ўсялякім разе, у параўнанні з тым, што паведамлялася ў газеце.

— Баюся, што газета, — запярэчыў Дзюпэн, — не спасцігла ўсяго неймавернага жаху таго, што здарылася. Але забудзем пра дылетанцкія разважанні прэсы. Здаецца, загадку лічаць невырашальнай з тае самае прычыны, якая дае падставу ставіцца да яе як да вельмі зразумелай, — я маю на ўвазе тое, што ўсё ў ёй неяк *празмерна* жудаснае.

Паліцыю, відаць, збіла з тропу адсутнасць матывацыі не столькі забойства, колькі жорсткасці, з якой яно было здзейсненае. Іх таксама бянтэжыць, здавалася, невырашальная супярэчнасць: сведкі чулі, як нехта сварыўся, але наверсе нікога, акрамя забітай мадэмуазэль Л'Эспанэ, не знайшлі. Выйсці ж адтуль, каб не заўважылі людзі, што падымаліся па лесвіцы, было немагчыма. Страшэнны беспарадак у пакоі, заціснуты ў комін уніз галавой труп, жахліва знявечанае цела старой — гэтых абставін, а таксама тых, пра якія я толькі што гаварыў, і іншых, што не варта ўспамінаць, было дастаткова, каб спаралізаваць высілкі ўладаў, якія, нягледзячы на сваю праніклівасць, якой яны так ганарацца, апынуліся ў тупіку. Яны сталі ахвярамі грубай, але вельмі распаўсюджанай памылкі, зблытаўшы незвычайнае з незразумелым. Але менавіта дзякуючы адхіленню ад звычайнага і адкрываецца прастор, калі гэта сапраўды магчыма, для розуму ў пошуках ісціны. У вышуках, накшталт гэтых, якімі мы цяпер займаемся, трэба ставіць не столькі пытанне «што здарылася?», колькі «што здарылася такога, чаго ніколі раней не здаралася?». І насамрэч існуе непасрэдная сувязь паміж лёгкасцю, з якой я прыйду ці ўжо прыйшоў да разгадкі гэтай таямніцы, і яе невырашальнасцю, якая існуе на думку паліцэйскіх.

Я глядзеў на Дзюпэна ў нямым здзіўленні.

— Цяпер я чакаю, — працягваў той, пазіраючы на дзверы, — чалавека, які, відаць, не быў непасрэдным выканаўцам тых жорсткіх забойстваў, але ў нейкай ступені меў дачыненне да іх здзяйснення. Што датычыць самай жудаснай часткі злачынства, дык тут ён, відаць, невінаваты. Спадзяюся, што не памыляюся ў сваім меркаванні, бо на ім будуецца раскрыццё ўсёй таямніцы. Я чакаю, што гэты чалавек прыйдзе сюды, у гэты пакой, з хвіліны на хвіліну. Праўда, ён можа і не з'явіцца, але больш імаверна, што ён усё-ткі будзе тут. Калі ж ён прыйдзе, неабходна яго затрымаць. Вось пісталеты; мы абодва здолеем выкарыстаць іх належным чынам, калі ўзнікне патрэба.

Я ўзяў пісталеты, амаль не разумеючы, што раблю, не верачы пачутаму, а Дзюпэн працягваў свой маналог. Я ўжо гаварыў, што ў такія моманты яму была ўласцівая некаторая безуважнасць. У сваіх развагах ён звяртаўся да мяне і таму гаварыў ціха, але нешта ў яго інтанацыі гучала так, нібыта ён гаворыць да кагосьці далёкага, не адводзячы ад сцяны пазбаўленых усялякага выразу вачэй.

— Тое, што галасы, якія пачулі людзі, пакуль беглі па лесвіцы, не належалі нябожчыцам, дастаткова абгрунтавана доказамі. У выніку зніклі ўсялякія сумневы наконт таго, што старая жанчына магла спачатку забіць дачку, а потым скончыць жыццё самагубствам. Я кажу пра гэта таму, каб растлумачыць ход сваіх меркаванняў, бо фізічнае сілы мадам Л'Эспанэ было зусім недастаткова, каб запхнуць труп дачкі ў комін, дзе яго знайшлі, ды і выгляд яе цела выключае ўсялякую думку пра самазабойства. Забойства, такім чынам, было здзейсненае нейкім трэцім бокам, менавіта яму і належалі галасы людзей, што сварыліся паміж сабой. Давай звернемся цяпер не ўвогуле да сведчання пра тыя галасы, а да таго, што было асаблівым у тых сведчаннях. Ты заўважыў у іх што-небудзь асаблівае?

Я заўважыў, што калі ўсе сведкі пагаджаліся ў сваіх меркаваннях наконт таго, што хрыплы голас належаў французу, то думкі наконт пранізлівага, або, як сказаў адзін сведка, рэзкага голасу значна разыходзіліся.

— Гэта было само сведчанне, — запярэчыў Дзюпэн, — але яго асаблівасць у іншым. Ты не заўважыў самага характэрнага. А тое-сёе варта было заўважыць. Меркаванні сведкаў наконт хрыплага голасу, як ты адзначыў, супалі і былі аднадушныя. Што ж датычыць пранізлівага голасу, асаблівасць тут вынікае не з таго, што іх паказанні не супалі, а з таго, што, калі італьянец, ангелец, гішпанец, галандзец і француз спрабавалі апісаць яго, кожны адзначыў, што голас належыць іншаземцу. Кожны ўпэўнены, што гаварыў не яго суайчыннік. І кожны суадносіў яго не з голасам прадстаўніка нацыі, на мове якой ён гаворыць, а з той ці іншай іншаземнай гаворкай. Француз лічыць, што гэта голас гішпанца і што «змог бы разабраць некалькі словаў, калі б быў знаёмы з гішпанскай мовай». Галандзец сцвярджае, што гэта быў француз, але мы ведаем, што «з прычыны, што сведка не разумее французскай мовы, допыт вёўся праз перакладчыка». Ангелец лічыць, што гэта голас немца, а ён «не разумее нямецкай мовы». Гішпанец упэўнены, што гаварыў ангелец, «але мяркуе аб гэтым па інтанацыі, бо не ведае ангельскай». Італьянец лічыць, што гэта голас расійца, але «ніколі не гаварыў з сапраўдным расійцам». Думка другога француза, акрамя таго, адрозніваецца ад меркавання першага, і ён упэўнены, што голас належаў італьянцу, але, сам не валодаючы гэтай мовай, як і гішпанец, «грунтуе свае меркаванні на інтанацыі». Як бачым, голас мусіў быць сапраўды незвычайным, калі пра яго атрымалі такія сведчанні і калі ў яго інтанацыі выхадцы з пяці вялікіх рэгіёнаў Еўропы не маглі разабраць штосьці ім знаёмае! Ты скажаш, што гэта мог быць голас азіята або афрыканца. І азіятаў, і афрыканцаў не так многа ў Парыжы, але, не адмаўляючы цалкам такой ідэі, я проста звярну тваю ўвагу на тры акалічнасці. Голас быў вызначаны адным сведкам як «хутчэй рэзкі, чым пранізлівы». На думку двух іншых, гаворка была «хуткая, але няроўная». Нікому не ўдалося разабраць ніводнага слова, ніводнага гуку. Не ведаю, — працягваў Дзюпэн, — якое ўражанне могуць выклікаць у цябе мае меркаванні, але я не вагаючыся заяўляю, што абгрунтаваных высноваў, якія вынікаюць на падставе гэтай

часткі сведчанняў — той часткі, што датычыць хрыплага і пранізлівага галасоў, — дастаткова для таго, каб узніклі падазрэнні, якія вызначаць далейшы ход разгадкі таямніцы. Сказаўшы «абгрунтаваныя высновы», я не вельмі дакладна выказаў свае думкі. Я меў на ўвазе, што гэта адзіна магчымыя высновы і што яны непазбежна вядуць да падазрэння як да адзінага выніку. Аднак, чаго датычыць гэта падазрэнне, я пакуль не скажу. Проста хачу, каб ты меў на ўвазе, што для мяне яно было дастаткова пераканаўчае, каб надаць канкрэтную форму — і адпаведны напрамак — маім вышукам у спальні старой жанчыны.

Давай у думках вернемся ў той самы пакой. Што перш за ўсё мы будзем там шукаць? Выхад, які выкарысталі забойцы. Мы з табой, вядома, не верым у звышнатуральнае. Не злыя ж духі забілі мадам і мадэмуазэль Л'Эспанэ. Тыя, хто здзейсніў забойства, існавалі рэальна і, каб знікнуць, карысталіся рэальнымі шляхамі. Але якімі? На шчасце, ёсць толькі адзін спосаб вырашыць гэтую праблему, і гэты спосаб павінен прывесці нас да канкрэтнай высновы. Давай разгледзім паслядоўна ўсе магчымыя шляхі ўцёкаў. Зразумела, што ў той час, калі натоўп бег уверх па лесвіцы, забойцы былі ў спальні, дзе знайшлі мадэмуазэль Л'Эспанэ. Таму выхады мы шукаем толькі ў гэтых двух памяшканнях. Паліцэйскія абшукалі ўздоўж і ўпоперак падлогу, столь, кожную цагліну ў сценах. Ніводзін патаемны выхад не мог аказацца па-за межамі іх пільнай увагі. Але, не давяраючы іх вачам, я праверыў усё сам. Што ж, патаемных выхадаў там не было. Абое дзвярэй з пакояў у калідор былі надзейна замкнёныя, ключы ўстаўленыя з сярэдзіны. Звернемся цяпер да дымаходаў. Хоць у ніжняй іх частцы шырыня звычайная, вышэй яны звужаюцца настолькі, што там не пралезе нават больш-менш укормлены кот. Упэўніўшыся, што ўсе згаданыя шляхі для ўцёкаў — абсалютна немагчымыя, нам не застаецца нічога іншага, як звярнуць сваю ўвагу на вокны. Калі б хто паспрабаваў вылезці праз вокны, што ў пакоі ад вуліцы, гэта б адразу заўважылі людзі, што там тоўпіліся. Забойцы мусілі ў такім выпадку ўцякаць праз вокны, што выходзяць у двор. Што ж, прыйшоўшы да гэтай вы-

сновы шляхам лагічных разважанняў, нам як прыхільнікам філасофскага падыходу да вышукаў не варта адмаўляцца ад яе на падставе таго, што гэта на першы погляд здаецца немагчымым.

У спальні двое вокнаў. Адно з іх нічым не застаўленае і відаць з верху да нізу. Другое ж унізе закрытае прысунутай наўсутыч спінкай грувасткага ложка. Першае акно было надзейна зачыненае з сярэдзіны. Усе намаганні падняць яго аказаліся марнымі. Злева ў аконнай раме была знойдзеная шырокая дзірка з забітым туды па самую галоўку вялікім цвіком. Калі агледзелі другое акно, дык знайшлі такі самы цвік, які быў гэтак жа забіты ў раму; энергічныя спробы падняць гэтае акно таксама аказаліся марнымі. Такім чынам паліцыя цалкам пераканалася, што злачынцы не маглі ўцячы гэтым шляхам, і таму палічыла за лішняе выцягваць цвікі і адчыняць вокны.

Маеназіранні былі ў пэўнай меры больш уважлівыя, я ўжо тлумачыў чаму. Мне трэба было даказаць, што ўсё тое, што здавалася немагчымым, насамрэч зусім не такое.

Я пачаў разважаць *a posteriori*[1].

Забойцы, скажам, вылезлі праз адно з тых вокнаў. Калі так, то яны не маглі зачыніць вокны з сярэдзіны, іх жа знайшлі апушчанымі. Гэтая акалічнасць, бо яна была відавочная, спыніла пошукі паліцэйскіх. Усё ж такі рамы былі замкнёныя. У такім разе яны павінныя былі зачыняцца аўтаматычна. Ад такой высновы адмовіцца было немагчыма. Я падышоў да свабоднага акна, не без цяжкасці выцягнуў цвік і паспрабаваў падняць раму. Як я і думаў, яна не паддавалася. Тады я зразумеў, што існуе патаемная спружына, і дзякуючы гэтай ідэі ўпэўніўся, што мае меркаванні, урэшце, былі правільныя, якімі б таямнічымі па-ранейшаму ні здаваліся акалічнасці, звязаныя з цвікамі. У выніку старанных пошукаў тая самая патаемная спружына знайшлася. Я націснуў на яе, задаволены сваёй знаходкай, але абмежаваўся толькі гэтым, не спрабуючы падняць акна.

[1] Выходзячы з досведу (лац.). Тут: у зваротным напрамку.

Я ўставіў цвік назад і ўважліва агледзеў яго. Чалавек, які вылез праз акно, мог звонку апусціць раму, і спружына спрацавала б, але як уставіць назад цвік? Выснова была простая і зноў жа адпавядала ходу маіх даследаванняў. Забойцы павінныя былі ўцякаць праз другое акно. Калі меркаваць, што спружыны на кожнай раме былі аднолькавыя, а гэта было верагодна, тады павінна быць розніца паміж цвікамі або паміж тым, як яны ўстаўленыя ў рамы. Стаўшы на ложак, я зазірнуў за яго спінку і ўважліва агледзеў другую раму. Правёў па ёй рукой і адразу ж намацаў спружыну і націснуў на яе. Потым я агледзеў цвік. Ён быў такі ж тоўсты, як і першы, і таксама ўваходзіў у раму амаль па самую галоўку.

Калі ты скажаш, што гэта мяне збянтэжыла, значыць, ты не зразумеў характару індуктыўнага спосабу мыслення. Гаворачы мовай паляўнічых, я ніводнага разу «не згубіў следу». Нюх усё ж мяне не падвёў. Ва ўсім ланцугу разважанняў не знайшлося ніводнага разарванага звяна. Я прайшоўся па ўсім ланцугу — і ў канцы знайшоў цвік. Ён па ўсіх прыкметах быў падобны да свайго калегі ў суседнім акне, але сам гэты факт быў абсалютна нязначны (хоць і здаваўся пераканаўчым) у параўнанні з тым меркаваннем, што якраз тут і можна знайсці ключ да разгадкі таямніцы. «Тут, відаць, нешта не так з цвіком», — падумаў я. Потым дакрануўся да яго, і ў маёй руцэ засталася галоўка цвіка разам з абломкам шпянька даўжынёй паўсантыметра. Астатняя частка цвіка засталася ў дзірцы, дзе ён, відаць, і зламаўся. Злом даўні, бо на ім паспела з'явіцца іржа, і, відаць, быў вынікам удару малатком, які і увагнаў у раму галоўку цвіка. Я асцярожна ўставіў назад выцягнутую частку цвіка, і ў выніку пачало здавацца, што цвік цэлы, нават без адзінай расколіны. Націскаючы на спружыну, я прыпадняў раму, а разам з ёю паднялася і галоўка цвіка, якая моцна трымалася ў дзірцы. Я апусціў акно, і цвік зноў стаў падобным да цэлага.

Такім чынам, гэтая частка загадкі была разгаданая. Забойца ўцёк праз акно, якое было застаўлена ложкам. Калі ён вылез, рама апусцілася сама па сабе (або яе зачынілі спецыяльна) і замкнулася спружынай, паліцэйскія ж падумалі, што

акно забітае цвіком і палічылі далейшае расследаванне немэтазгодным.

Наступнае пытанне — як злачынца спусціўся ўніз. Тут мяне задаволіла нашая прагулка вакол будынка. Прыкладна за паўтара метра ад згаданага акна — громаадвод. Дацягнуцца праз такую адлегласць да акна, а тым болей залезці праз яго — немагчыма. Аднак я заўважыў, што аканіцы на пятым паверсе — парыжскія цесляры называюць іх *ferrades* — былі асаблівыя: яны даўно выйшлі з моды, але іх часта яшчэ можна ўбачыць на старадаўніх асабняках дзе-небудзь у Ліёне або ў Бардо. Яны па форме нагадваюць дзверы (звычайныя, аднастворкавыя), з той толькі розніцай, што ў ніжняй частцы рашотка, і таму за яе зручна брацца рукамі. У доме мадам Л'Эспанэ шырыня аканіцаў крыху большая за метр. Калі мы бачылі іх з двара, яны былі напалову адчыненыя — гэта значыць былі перпендыкулярныя сцяне. Відавочна, паліцэйскія, як і я, аглядалі дом з двара, але, гледзячы на гэтыя *ferrades* у папярочным разрэзе (а я ўпэўнены, што так і было), яны не ўсвядомілі, наколькі тыя шырокія, ці, ва ўсякім разе, не надалі гэтаму належнай увагі. Карацей кажучы, упэўніўшыся, што злачынцы не маглі вылезці праз акно, яны, вядома, абмежаваліся вельмі павярхоўным аглядам. Я ж зразумеў, што калі аканіцу акна, застаўленага ложкам, расчыніць да самай сцяны, дык адлегласць паміж ёю і громаадводам будзе крыху большая за паўметра. Было таксама відавочна, што дзякуючы выключнай смеласці і спрыту можна было пералезці з громаадвода ў акно. Выцягнуўшы руку на восемдзесят сантыметраў, пры ўмове, што аканіца была адчыненая насцеж, рабаўнік, відаць, ухапіўся за рашотку. Адпусціўшы потым громаадвод і ўпершыся нагамі ў сцяну, ён мог адпіхнуцца і зачыніць аканіцу, а калі акно ў той час было адчыненае, то і апынуцца ў пакоі.

Заўваж, што я гавару пра выключны спрыт як абавязковую ўмову поспеху ў такім рызыкоўным і цяжкім учынку. Я маю намер даказаць, што, па-першае, здзейсніць такое было магчыма, а па-другое — і гэта самае галоўнае, — хачу, каб ты ўявіў сабе, якую надзвычайную, амаль звышнатуральную спрытнасць трэба мець, каб зрабіць такі скачок.

Ты, вядома, скажаш, карыстаючыся юрыдычным лексіконам, што, каб «забяспечыць пераканаўчыя доказы, я павінен хутчэй утойваць, чым прызнаваць у поўнай меры спрытнасць, неабходную ў дадзеным выпадку». Такая практыка, можа, і прыдатная для юрыспрудэнцыі, але толькі не для аналітычных разважанняў. Мая канчатковая мэта — ісціна. Найбліжэйшая задача — даць табе магчымасць супаставіць надзвычайную спрытнасць, пра якую я толькі што гаварыў, з вельмі своеасаблівым, пранізлівым (або рэзкім) голасам і невыразнай гаворкай чалавека, пра нацыянальнасць якога не знайшлося нават двух аднолькавых меркаванняў і які гаварыў так, што нельга было разабраць ніводнага складу.

Пры гэтых словах у маёй галаве мільганула нейкая яшчэ зусім цьмяная здагадка наконт таго, пра што гаварыў Дзюпэн. Здавалася, вось-вось — і я ўсё зразумею. Так часам чалавеку здаецца, што ён зараз нешта ўспомніць, але ўрэшце ўсе намаганні застаюцца марнымі. Між тым мой прыяцель працягваў:

— Як бачыш, я раблю цяпер націск не на пытанні пра тое, як забойца ўцёк з дому, а як ён там апынуўся. Мне хацелася, каб ты ўсвядоміў, што і тое і другое было здзейснена адным і тым жа шляхам і ў адным і тым жа месцы. А зараз вернемся ў пакой. Што мы там убачылі? Як паведамлялася ў газетах, шуфляды камоды былі перарытыя, хоць многія рэчы засталіся на сваіх месцах. Такое заключэнне абсурднае. Яно не больш чым меркаванне, ды і тое не вельмі разумнае. Адкуль мы можам ведаць, што там было раней, можа, у шуфлядах і не было нічога, акрамя знойдзеных рэчаў? Мадам Л'Эспанэ і яе дачка жылі вельмі адасоблена, нікога не прымалі і рэдка выходзілі на людзі — у іх не было патрэбы часта мяняць уборы. Убранні, якія знайшлі, ва ўсякім разе, не найгоршыя, што маглі мець гэтыя пані. Калі злодзей пакваліўся на адзенне, дык чаму ён не ўзяў найлепшых рэчаў — чаму не захапіў з сабой усяго? Да таго ж калі ён спакусіўся жаночай бялізнай, чаму ён адмовіўся ад чатырох тысяч франкаў золатам? Бо золата ж засталося ў пакоі. Суму, згаданую мсьё Міньё, банкірам, амаль некранутай знайшлі ў мяшэчках, што ляжалі на пад-

лозе. Таму я хачу, каб ты выкінуў з галавы памылковае меркаванне пра матывы забойства, якое ўзнікла ў паліцэйскіх галовах на падставе той часткі сведчанняў, у якой ішла размова пра дастаўленыя на дом грошы. Супадзенні, у дзесяць разоў больш дзіўныя, чым дастаўка грошай, а потым забойства праз тры дні пасля атрымання іх кліентам, здараюцца кожную гадзіну цягам усяго нашага жыцця, мы іх нават не заўважаем. Супадзенні — гэта наогул вялікая перашкода на шляху тых філосафаў, адукацыя якіх не перадугледжвала знаёмства з тэорыяй імавернасці — той самай тэорыяй, якой найбольш слаўныя чалавечыя даследаванні абавязаныя сваімі не менш слаўнымі адкрыццямі. Вядома, калі б у дадзеным выпадку золата знікла, да таго факту, што яго прынеслі за тры дні да забойства, ставіліся б як да чагосьці больш значнага, чым простае супадзенне. Гэты факт пацвердзіў бы менавіта такую версію матыву забойства. Але калі з улікам рэальных акалічнасцяў справы мы будзем лічыць золата матывам гэтага гвалтоўнага злачынства, то павінныя будзем пагадзіцца з тым, што злачынца быў настолькі нерашучы і настолькі дурны, што забыўся і пра золата, і пра тое, дзеля чаго ён усё гэта зрабіў.

Цвёрда памятаючы пра тыя акалічнасці, на якія я звярнуў тваю ўвагу, — своеасаблівы голас, надзвычайную спрытнасць і незразумелую адсутнасць матыву ў такім неймаверна жорсткім забойстве, — зноў звернемся да жудаснай карціны злачынства. Вось ахвяра, якую задушылі голымі рукамі і запхнулі ў дымаход уніз галавой. Звычайныя злачынцы так не забіваюць. І, ва ўсякім разе, не хаваюць трупаў забітых. Пагадзіся, у тым, што труп зацiснулі ў дымаход, ёсць нешта больш чым ненатуральнае — гэта ніякім чынам не адпавядае нашым уяўленням пра чалавечыя ўчынкі, калі нават і ўявіць, што дзейнічалі канчаткова дэградаваныя тыпы. Уяві сабе, якую трэба мець сілу, каб запхнуць труп у дымаход *знізу ўверх* так, што некалькі мужчын агульнымі намаганнямі ледзь выцягнулі яго адтуль — *зверху ўніз*.

Звярні ўвагу і на іншыя праявы гэтай неймавернай сілы. На каміне знайшлі тоўстыя пасмы — вельмі тоўстыя — сівых

чалавечых валасоў. Іх павыдзіралі з каранямі. Ты ўяўляеш, колькі трэба сілы, каб вырваць вось так з галавы адразу дваццаць або трыццаць валасоў? Ты ж, як і я, бачыў тыя пасмы. На каранях — жудаснае відовішча! — засохлі кавалкі скуры, паздзіранай з галавы — доказ той неймавернай сілы, з якой адным махам вырвалі з каранямі, відаць, паўмільёна валасоў. Горла старой не проста перарэзалі — адсеклі галаву, а ў руках забойцы была звычайная брытва. Звярні таксама ўвагу на звярыную жорсткасць злачынства. Я не кажу ўжо пра сінякі на целе мадам Л'Эспанэ. Мсьё Дзюма і яго шаноўны калега мсьё Эцьен лічаць іх вынікам удараў нейкай тупой зброяй, і, трэба сказаць, панове маюць рацыю. Тупой зброяй — цяпер гэта ўжо відавочна — быў брук, на якім аказалася мадам Л'Эспанэ, калі вывалілася з акна, застаўленага ложкам. Аднак гэтая ідэя, якая, хоць і здаецца цяпер вельмі простай, не прыйшла ў галаву паліцэйскім, яны не звярнулі ўвагі на шырыню аканіц — і гэта таму, што праз тыя самыя цвікі ўся іх здольнасць думаць канчаткова атрафіраваліся і яны не дадумаліся да таго, што вокны ўсё ж маглі адчыняцца.

Калі цяпер яшчэ і ўважліва паразважаць наконт незразумелага беспарадку ў спальні, застаецца толькі супаставіць неймаверны спрыт, нечалавечую сілу, звярыную жорсткасць, беспадстаўнасць крывавага забойства, неймаверную жахлівасць зусім не ўласцівых чалавеку паводзін і незразумеласць інтанацыі голасу людзям самых розных нацыянальнасцяў, якія не змаглі разабраць не тое што ніводнага слова, але нават складу. Што ж вынікае з усяго гэтага? Які вобраз я стварыў у тваім уяўленні?

У мяне ад гэтага пытання па целе папаўзлі мурашкі.

— Вар'ят! — усклікнуў я. — Гэта справа рук шаленца, які, відаць, уцёк з найбліжэйшай вар'ятні.

— У нейкай ступені, — заўважыў Дзюпэн, — твая версія не такая ўжо і недарэчная. Але выкрыкі вар'ята нават у час самых шалёных прыпадкаў непадобныя да гукаў таго голасу, што чулі людзі, калі беглі ўверх па лесвіцы. У вар'ята ёсць нацыянальнасць, мова. Ён можа вярзці нешта незразумелае, вымаўляючы словы без усялякай сувязі, але захоўваючы тым

не менш сувязь паміж складамі. Апрача таго, валасы чалавека, хоць і вар'ята, непадобныя да тых, што я трымаю ў руцэ. Я выцягнуў гэтую пасмачку са счэпленых у кулак пальцаў мадам Л'Эспанэ. Ну, што ты наконт гэтага скажаш?

— Дзюпэн! — усклікнуў я, канчаткова разгублены. — Валасы гэтыя вельмі незвычайныя — яны не чалавечыя!

— А я і не сцвярджаю, што яны чалавечыя, — сказаў Дзюпэн, — але перш чым прыйсці да нейкай высновы, хачу, каб ты зірнуў вось на гэты рысунак, які я намаляваў на паперы. Гэта дакладная ілюстрацыя той часткі сведчання, дзе ішла гаворка пра «чорныя сінякі і глыбокія сляды ад пазногцяў» на шыі мадэмуазэль Л'Эспанэ, а таксама і другога сведчання, якое атрымалі ад паноў Дзюма і Эцьена, дзе ішла гаворка пра «шэраг сініх плямаў, што відавочна былі слядамі пальцаў».

— Пагадзіся, — працягваў мой прыяцель, распраўляючы перада мной на стале паперу, — што, мяркуючы па малюнку, хватка моцная і ўчэпістая. У ахвяру ўпіліся ўсімі пальцамі і не адпускалі шыю, пакуль дзяўчына не сканала. Паспрабуй зараз адначасова пакласці пальцы на ўсе адпаведныя адбіткі. Паглядзім, як у цябе гэта атрымаецца.

Я паспрабаваў зрабіць так, як сказаў Дзюпэн, але ў мяне нічога не выйшла.

— Можа, мы робім гэта не так, як трэба, — сказаў Дзюпэн. — Папера ляжыць на роўнай паверхні, чалавечая ж шыя — круглая. Вось палена прыкладна такога ж радыюсу, што і шыя. Абгарні яго паперай з малюнкам і паспрабуй яшчэ раз.

Я ўсё зрабіў, як ён сказаў, але зрабіць гэта было яшчэ цяжэй, чым раней.

— Гэта, — сказаў я нарэшце, — адбітак не чалавечай рукі.

— А зараз, — прапанаваў Дзюпэн, — прачытай вось гэты ўрывак з Кюўе*.

Гэта было падрабязнае анатамічнае і агульнае апісанне бурага арангутана, які водзіцца на Ост-Індскіх астравах. Велізарная жывёліна, яе неймаверныя моц і спрыт, неўтаймавальная злосць і надзвычайныя здольнасці да перайманння агульнавядомыя. Я адразу ж зразумеў увесь жах забойства.

— Апісанне пальцаў, — сказаў я, скончыўшы чытанне, — дакладна супадае з рысункам. Цяпер я разумею, што ніякая другая жывёліна, акрамя арангутана, не магла пакінуць такіх адбіткаў, якія ты тут намаляваў. Жмуток рудой поўсці таксама адпавядае апісанню, дадзенаму Кюўе. Але я ніяк не магу зразумець акалічнасцяў гэтай жахлівай таямніцы. Да таго ж людзі чулі, як сварыліся два чалавекі, і адзін голас бясспрэчна належаў французу.

— Сапраўды так; і табе запомніўся выраз, які ледзь не ўсе прыпісваюць гэтаму голасу, — *mon Dieu!* Гэтыя словы, улічваючы абставіны, як справядліва ахарактарызаваў адзін сведка (Мантані, уладальнік крамы), выказвалі пратэст і папрок. Таму менавіта з дапамогай гэтых двух словаў я і спадзяваўся знайсці разгадку таямніцы. Нейкі француз быў сведкам забойства. Магчыма, і нават больш чым імаверна, ён невінаваты ў крывавым забойстве. Арангутан мог ад яго ўцячы. Француз жа, відаць, адшукаў яго ў тым самым пакоі, але ў сумятні, што там узнікла, не здолеў яго злавіць. Малпа па-ранейшаму на волі. Я не хацеў бы падрабязна казаць пра свае здагадкі, бо пакуль не маю права называць іх інакш, таму што хісткія меркаванні, на якіх яны грунтуюцца, далёка не такія глыбокія, каб я мог канчаткова ўпэўніцца ў іх правільнасці, а таксама таму, што не магу сцвярджаць, што яны будуць пераканаўчымі для іншых. Таму будзем па-ранейшаму называць іх здагадкамі і ставіцца да іх адпаведна. Калі той самы француз, як я спадзяюся, насамрэч невінаваты ў жорсткім забойстве, дык вось гэтая аб'ява, што я занёс учора вечарам па дарозе дадому ў рэдакцыю газеты «Монд», папулярнай сярод маракоў, прывядзе яго да нас.

Дзюпэн даў мне газету, і я прачытаў наступнае:

«ЗЛОЎЛЕНЫ ў Булонскім лесе на досвітку адпаведнага дня (якраз тады, калі адбылося забойства) вельмі вялікіх памераў буры арангутан, з тых, што водзяцца на востраве Барнэа, будзе вернуты ўладальніку (згодна са звесткамі, матросу мальтыйскага судна) пры ўмове дастатковых доказаў прыналежнасці яму жывёліны і кампенсацыі выдаткаў, звязаных з яе лоўляй і ўтрыманнем. Звяртацца па адрасе:

дом № *** па вуліцы *** у Сэн-Жэрменскім прадмесці, спытаць на трэцім паверсе».

— Як гэта, — спытаў я, — ты даведаўся, што гэты чалавек — матрос, ды яшчэ з мальтыйскага судна?

— Я гэтага не ведаю, — адказаў Дзюпэн, — і не ўпэўнены ў гэтым. Але вось кавалачак стужкі, якім, калі меркаваць па вонкавым выглядзе і зашмальцаванасці, відавочна завязвалі валасы ў *queues*[1], якія так падабаюцца матросам.

Больш за тое, такі вось вузел мала хто можа завязаць, акрамя матросаў, а дакладней, мальтыйскіх матросаў. Я падабраў стужку пад громаадводам. Яна не магла належаць забітым жанчынам. Калі ж усё-ткі я і памыляюся ў сваіх высновах і наконт стужкі, і наконт таго, што француз — матрос з мальтыйскага судна, вялікай бяды з таго, што я напісаў у аб'яве, няма. Калі гэта памылка, ён проста падумае, што мяне ўвяла ў зман якая-небудзь акалічнасць, пра якую і дазнавацца не будзе. Калі ж я маю рацыю, такім чынам будзе выратаваная важная справа. Як сведка, хоць і невінаваты ў забойстве, француз, натуральна, будзе вагацца, перш чым адгукнуцца на аб'яву наконт арангутана. Разважаць ён будзе так: «Я невінаваты; да таго ж чалавек я бедны, арангутан наогул каштуе шмат, а для такога, як я, ён сапраўднае багацце — навошта ж мне страчваць яго толькі таму, што я баюся невядома чаго? Ён тут, побач, толькі руку працягні. Знайшлі арангутана ў Булонскім лесе — гэта значыць вельмі далёка ад месца таго жорсткага забойства. Хто здагадаецца, што гэта зрабіла малпа? Паліцыя — у тупіку, не здолела знайсці нават самага нязначнага ключа да разгадкі. Калі яны і выйшлі на след малпы, ім не ўдасца даказаць, што я быў сведкам забойства, або навесіць на мяне адказнасць за тое, што здарылася, толькі таму, што я ведаў пра здарэнне. Галоўнае ж тое, што пра мяне ведаюць. Той, хто даў аб'яву, вызначыў мяне як уладальніка жывёліны. Не ведаю, наколькі падрабязныя яго звесткі пра мяне. Калі ж я не прызнаюся, што я — уладальнік такой каштоўнай маёмасці, а гэта ўжо вядома, жывёліна акажацца

[1] Хвасты (фр.).

пад падазрэннем. Такім чынам, не варта залішне звяртаць увагу на сябе ці на малпу. Лепш я з'яўлюся па аб'яве, забяру арангутана і схаваю яго, пакуль уся гэтая справа не атрымала розгаласу».

У той самы момант мы пачулі, як нехта затупаў па лесвіцы.

— Трымай пісталеты напагатове, — звярнуўся да мяне Дзюпэн, — але не паказвай іх і не страляй без маёй каманды.

Уваходныя дзверы былі незачыненыя, наведнік зайшоў не пазваніўшы і пачаў уздымацца па прыступках. Але, відаць, завагаўся. Мы пачулі, як ён пайшоў уніз. Дзюпэн кінуўся да дзвярэй, але тут мы пачулі, што прыбыш вяртаецца. Больш ён не рабіў спробы павярнуць назад, рашуча пайшоў уверх па лесвіцы і хутка пастукаў у дзверы пакоя.

— Уваходзьце! — бадзёра і добразычліва адгукнуўся Дзюпэн.

У пакой зайшоў мужчына. Гэта відавочна быў матрос — высокі, дужы, мускулісты. На выгляд — той яшчэ вісус, але нельга сказаць, каб зусім несімпатычны. Моцна загарэлы твар быў напалову схаваны пад бакамі і *mustachio*[1].

У руках матрос трымаў тоўстую дубовую палку, відаць, адзіную сваю зброю. Ён няўклюдна пакланіўся і пажадаў нам «добрага вечара» на добрай французскай мове, праўда, з лёгкім неўшатэльскім* акцэнтам, але ўсё ж было зразумела, што ён карэнны парыжанін.

— Сядайце, прыяцель. — сказаў Дзюпэн. — Відаць, вы прыйшлі наконт арангутана. Папраўдзе кажучы, я амаль зайздрошчу вам, выдатны экзэмпляр і, безумоўна, вельмі каштоўны. Колькі яму гадоў, як вы лічыце?

Матрос уздыхнуў з палёгкай чалавека, з плячэй якога зваліўся важкі камень, і загаварыў упэўненым тонам.

— Не ведаю, што вам сказаць, — гады чатыры або пяць, не больш. Ён тут, у вас?

— Ну што вы, не — у нас няма ўмоваў для ягонага ўтрымання. Ён на платнай стайні, што па вуліцы Дзюбур, зусім побач. Можаце забраць раніцай. Вядома, вам няцяжка будзе даказаць свае правы.

---

[1] Вусы (іт.).

— Вядома, не, сэр.

— Шкада будзе развітвацца з ім, — сказаў Дзюпэн.

— Не думайце, што ўсе вашы клопаты не будуць узнагароджаныя, сэр, — сказаў матрос. — Я ж не які-небудзь там... Ахвотна заплачу ўзнагароду за тое, што вы знайшлі жывёліну, — вядома, адпаведную маім магчымасцям.

— Што ж, — адказаў мой прыяцель, — вельмі прыстойна з вашага боку. Дайце падумаць, што ж я магу ў вас папрасіць? Ага! Слухайце. Узнагарода будзе вось якая. Вы паведаміце мне ўсю інфармацыю, якой валодаеце пра забойства, што адбылося на вуліцы Морг.

Дзюпэн сказаў апошнія словы вельмі ціха і спакойна. Гэтак жа спакойна ён падышоў да дзвярэй, замкнуў іх і паклаў ключ у кішэню. Потым дастаў пісталет, які трымаў за пазухай, і паклаў без усялякага шуму на стол.

Твар матроса зрабіўся барвовы, нібыта яго нехта душыў за горла. Ён ускочыў і схапіўся за палку, але адразу ж асеў на крэсла, потым увесь закалаціўся і зрабіўся белы як смерць, не здольны вымавіць ніводнага слова. Мне было шчыра шкада яго.

— Паслухайце, прыяцель, — спагадліва звярнуўся да яго Дзюпэн, — паверце слову двараніна і француза — мы не збіраемся рабіць вам нешта дрэннае. Мне добра вядома, што вы невінаваты ў крывавых забойствах, што адбыліся на вуліцы Морг. Аднак разам з тым нельга сцвярджаць, што вы не маеце да іх ніякага дачынення. З таго, што я ўжо сказаў, вы, відаць, здагадаліся, што я валодаю інфармацыяй наконт гэтай справы — прычым з крыніцы, пра існаванне якой вы нават не здагадваліся. Абставіны складваюцца наступным чынам. Вы не зрабілі нічога такога, за што вас маглі б прыцягнуць да адказнасці. Вас нельга абвінаваціць у рабаўніцтве, хоць вы маглі беспакарана завалодаць чужымі рэчамі. Вам няма чаго хаваць і няма падстаў для ўтойвання чагосьці. З іншага боку, згодна з прынцыпамі гонару, вы павінны засведчыць усё, што вам вядома. За кратамі апынуўся бязвінны чалавек, якога вінавацяць у забойстве, а вы можаце паказаць на сапраўднага злачынцу.

Словы Дзюпэна падзейнічалі — матрос у значнай ступені ачуняў, але ад яго былой самаўпэўненасці нічога не засталося.

— Ну, што ж, застаецца спадзявацца на Божую літасць, — адказаў матрос, крыху памаўчаўшы. — Няхай будзе так, я раскажу вам усё, што ведаю пра гэтую справу. Трэба быць дурнем, каб спадзявацца, што вы хоць напалову паверыце маім словам. І ўсё ж я невінаваты, і хай мяне пакараюць смерцю, але я вам раскажу ўсё як на споведзі.

Паведаміў ён, па сутнасці, наступнае. Нядаўна ён плаваў на астравы Індыйскага архіпелага. Кампанія матросаў, у якой быў і ён, выйшла на бераг у Барнэа і скіравалася на прагулку. Яны з таварышам злавілі арангутана. Кампаньён хутка памёр, і матрос застаўся адзіным уладальнікам жывёліны. Перажыўшы шмат турбот праз неўтаймаваны нораў малпы ў час вяртання на радзіму, ён нарэшце здолеў прывесці яе ў свой парыжскі дом, дзе і трымаў як мага далей ад цікаўных вачэй суседзяў, чакаючы, пакуль у арангутана зажыве пашкоджаная на караблі нага. Матрос разлічваў яго выгадна прадаць.

Неяк вярнуўшыся дадому з гулянкі, а было гэта ў тую ноч, дакладней, у тую раніцу, калі адбылося забойства, матрос убачыў арангутана ў спальні, куды той залез, вырваўшыся з суседняй каморкі, дзе яго звычайна замыкалі за, здавалася, надзейна замкнёнымі дзвярыма. Трымаючы ў руцэ брытву і намыліўшыся па ўсіх правілах, малпа сядзела перад люстэркам і збіралася галіцца, пераймаючы дзеянні гаспадара, за якімі, несумнеўна, назірала праз замочную адтуліну. Матрос напалохаўся, убачыўшы такую грозную зброю ў руках небяспечнай жывёліны, з якой яна да таго ж так спрытна ўпраўлялася, і на некалькі хвілін разгубіўся. Аднак яму неаднойчы даводзілася ўтаймоўваць арангутана, нават у моманты неймавернай раз'юшанасці, з дапамогай бізуна, таму і цяпер ён збіраўся зрабіць тое ж самае. Убачыўшы бізун, арангутан кінуўся да дзвярэй, паімчаў уніз па лесвіцы і адтуль праз акно, якое, на жаль, было адчынена, скочыў на вуліцу.

Француз у адчаі пабег наўздагон. Малпа, па-ранейшаму трымаючы ў руцэ брытву, раз-пораз спынялася, азіралася, крывіла пысу ў бок гаспадара і, падпусціўшы яго зусім блізка,

зноў кідалася наўцёкі. Так яны адбеглі далёка ад дому. Было тры гадзіны ночы, і на вуліцах панавала мёртвая цішыня. Прабягаючы па завулку каля вуліцы Морг, уцякач звярнуў увагу на святло, што мігцела ў адчыненым акне спальні мадам Л'Эспанэ на пятым паверсе яе дому. Кінуўшыся ў бок будынка, арангутан заўважыў громаадвод, з надзвычайным спрытам палез наверх па сцяне, ухапіўся за аканіцу, якая была адчыненая насцеж, і з яе дапамогай скочыў на спінку ложка. На ўсё гэта спатрэбілася менш за хвіліну. Апынуўшыся ў пакоі, арангутан штуршком зноў расчыніў аканіцу.

Матрос не ведаў, радавацца ці бедаваць. Ён вельмі спадзяваўся злавіць уцекача, бо наўрад ці той мог выбрацца з пасткі, у якую трапіў, мінаючы громаадвод, а тут матрос якраз і меркаваў яго падлавіць. Але яго непакоіла тое, што малпа магла нарабіць у доме. Менавіта гэта прымусіла матроса рушыць следам за жывёлінай. Узлезці ўверх па громаадводзе яму, матросу, было няцяжка; але апынуўшыся на ўзроўні акна, што было злева, ён вымушаны быў спыніцца. Адзінае, што ён мог зрабіць, дык гэта, учапіўшыся за аканіцу, зазірнуць у акно. Ад жаху ён ледзь не зваліўся ўніз. Якраз тады і пачуліся тыя жудасныя крыкі, што абудзілі жыхароў вуліцы Морг. Мадам Л'Эспанэ і яе дачка, адзетыя ў начныя кашулі, відаць, разбіралі паперы ў жалезнай скрынцы, выцягнутай на сярэдзіну пакоя. Яна была адчыненая, а паперы ляжалі побач на падлозе. Жанчыны, пэўна, сядзелі спінамі да акна, і, мяркуючы па тым, што паміж з'яўленнем арангутана і іх крыкамі прайшоў некаторы час, яны заўважылі яго не адразу, вырашыўшы, што аканіца грукнула ад ветру.

Калі матрос зазірнуў у акно, велізарная жывёліна трымала мадам Л'Эспанэ за валасы (распушчаныя, бо яна расчэсвала іх на ноч) і, імітуючы цырульніка, круціла перад яе тварам брытвай. Дачка нерухома ляжала на падлозе. Яна страціла прытомнасць. Ад крыкаў старой жанчыны і ў выніку яе супраціўлення — менавіта тады і былі выдраныя з яе галавы валасы — спачатку, відаць, мірныя намеры арангутана саступілі месца раз'юшанасці. Адным рашучым рухам мускулістай рукі ён ледзь зусім не адрэзаў галаву старой.

Калі жывёліна ўбачыла кроў, яе гнеў перайшоў у раз'ятранасць. Зубы арангутана заскрыгаталі, вочы запалалі агнём. Ён кінуўся на непрытомную дзяўчыну, учапіўся сваімі страшэннымі кіпцюрамі за горла і не расціснуў іх, пакуль тая не сканала. Азірнуўшыся ў раз'юшанасці на спінку ложка, ён разгледзеў у цемры здранцвелы ад жаху твар гаспадара. Лютасць жывёліны, якая, відаць, не паспела забыцца пра грозны бізун, імгненна перайшла ў страх. Разумеючы, што яго чакае пакаранне, арангутан, відаць, вырашыў схаваць сляды сваіх крывавых дзеянняў і, ахоплены панікай, замітусіўся па пакоі, раскідваючы і ламаючы мэблю, сцягваючы з ложка пасцель. Нарэшце ён схапіў труп дачкі і запхнуў у комін, дзе яго пасля і знайшлі; потым надышла чарга старой жанчыны, якую ён выкінуў праз акно.

Калі арангутан з сваёй знявечанай ахвярай з'явіўся ў акне, матрос прыціснуўся да громаадвода і, хутчэй з'ехаўшы, чым злезшы ўніз, кінуўся адразу ж дадому, з жахам усведамляючы магчымыя вынікі крывавага забойства і ахвотна даручаючы лёсу апекавацца арангутанам. Поўныя жаху воклічы француза і раз'юшаныя крыкі малпы і былі тымі галасамі, што пачулі людзі, калі беглі ўверх па лесвіцы.

Вось, бадай, і ўсё. Арангутан, відаць, знік са спальні старой, спусціўшыся ўніз па громаадводзе якраз перад тым як узламалі дзверы. Ён жа, відаць, і апусціў за сабой акно. Праз некаторы час малпу злавіў сам яе ўладальнік і прадаў за вялікія грошы ў *Jardin des Plantes*[1].

Лё Бона выпусцілі на волю адразу ж пасля таго, як мы пайшлі да прэфекта і ўсё расказалі (з каментарамі Дзюпэна). Гэты чыноўнік зычліва ставіўся да майго прыяцеля, аднак не змог схаваць прыкрасці ад такога павароту справаў і нават не ўтрымаўся, каб не зрабіць адной ці дзвюх саркастычных заўвагаў наконт таго, што кожны павінен займацца сваёй справай.

— Няхай пабурчыць, — сказаў потым Дзюпэн, не палічыўшы патрэбным сказаць што-небудзь у адказ. — Няхай

[1] Батанічны сад (фр.).



*Зубы арангутана заскрыгаталі, вочы запалалі агнём...*

пафіласофствуе і супакоіць тым самым сумленне. Я рады, што перамог на ягонай жа тэрыторыі. Тым не менш яму не варта здзіўляцца ўласнай няздольнасці знайсці разгадку таямніцы, бо, папраўдзе кажучы, наш прыяцель прэфект занадта хітры для таго, каб быць здатным зазіраць у глыбіню праблем. Яго ведам бракуе грунтоўнасці. Адна галава без тулава, як у выявах багіні Лаверны*, ці, у найлепшым выпадку, — галава ды плечы, як у траскі. Але ўсё ж ён добры хлопец. Асабліва мяне захапляе яго здольнасць адным махам здабываць сабе рэпутацыю вялікага разумніка. Я маю на ўвазе яго манеру *de nier ce qui est, et d'expliquer ce qui n'est pas*[1].

*Пераклаў Уладзімір Шчасны*

[1] Адмаўляць тое, што ёсць, і развважаць пра тое, чаго не існуе* (фр.).

# Сфінкс

У той час, калі ў Нью-Ёрку лютавала халера*, я прыняў запрашэнне ад сваяка правесці з ім тыдні два ў цішы яго *cottage orné*[1] на беразе Гудзона. Тут было ўсё для летніх забаваў: мы мелі магчымасць гуляць па лесе, рабіць замалёўкі, катацца на лодцы, лавіць рыбу, купацца, музіцыраваць і чытаць кнігі. Мы б бавілі час даволі прыемна, калі б не страшныя навіны, што кожнае раніцы даходзілі да нас з вялікага горада. Не праходзіла і дня, каб мы не даведваліся пра скон якога-небудзь знаёмага. З ростам смяротнасці мы прызвычаіліся штодзень чакаць звестак пра чарговую страту. Урэшце мы пачалі трымцець пры падыходзе любога наведніка. Сам вецер з поўдня, здавалася, дыхаў смерцю. Гэтая думка канчаткова спаралізавала маю душу. Ні пра што іншае я не мог гаварыць, думаць ці сніць. Мой гаспадар быў менш уражлівы, а таму, нягледзячы на сваю прыгнечанасць, усяляк спрабаваў мяне падтрымаць. Ягоны філасофскі розум ніколі не падпадаў пад уздзеянне фантомаў. Сапраўдныя жахі маглі яго напалохаць, аднак іх цені мала яму абыходзілі.

Ягоныя намаганні развеяць маю хваравітую панылась не займелі плёну ў значнай ступені праз некаторыя кнігі, знойдзеныя ў ягонай бібліятэцы. Яны былі здольныя абудзіць да жыцця насенне векавых забабонаў, што хаваліся ў маіх грудзях. Ён не ведаў, што я чытаю гэтыя кнігі, і губляўся ў здагадках, што ж магло так моцна ўздзейнічаць на маю фантазію.

Маёй улюбёнай тэмай была шырока распаўсюджаная вера ў прыкметы — вера, якую я ў пэўны час быў схільны абараняць амаль сур'ёзна. На гэтую тэму мы жыва і падоўгу дыскутавалі: ён цвёрда настойваў на беспадстаўнасці веры ў такія глупствы, я ж казаў, што вераванне, якое з'яўляецца ў народзе абсалютна спантанна — без аніякага ўплыву звонку, — нясе ў сабе бясспрэчную долю ісціны і заслугоўвае павагі.

---

[1] Загарадны дамок (фр.).

Рэч у тым, што неўзабаве пасля майго прыезду сюды са мною здарылася нешта настолькі невытлумачальнае і злавеснае, што з майго боку было цалкам зразумела палічыць гэта знакам. Гэта жахнула мяне і адначасова так разгубіла, што толькі праз шмат дзён я наважыўся расказаць пра гэта майму гаспадару.

На зыходзе гарачага летняга дня я сядзеў з кнігай каля адчыненага акна, з якога былі бачныя рака і аддалены ўзгорак, дзе амаль не было дрэваў пасля так званага апоўзня. Думкі мае ўжо даўно перанесліся ад кнігі ў маіх руках у суседні горад, поўны скрухі і адчаю. Падняўшы вочы ад старонкі, я пабачыў аголены схіл, а на ім — сапраўдную пачвару жудаснага выгляду, якая вельмі хутка спусцілася з пагорка і знікла ў густым лесе. Убачыўшы гэтую пачвару, я спачатку засумняваўся ў сваёй нармальнасці ці, прынамсі, не паверыў вачам; прайшло нямала часу, перш чым я ўпэўніўся, што я не звар'яцеў і не сплю. Аднак калі я апішу пачвару, якую выразна бачыў і за якой меў мажлівасць назіраць цягам усёй яе дарогі са схілу, баюся, чытачу будзе яшчэ складаней паверыць у яе існаванне, чым мне самому.

Пачвара, пра памеры якой я мог меркаваць, параўнаўшы яе з камлямі самых высокіх дрэваў на яе шляху — рэдкіх лясных волатаў, што перажылі апоўзень, — была нашмат большая за любы акіянскі карабель. Я кажу «карабель», бо пачвара нагадвала яго формай тулава — корпус нашага сямідзесяцічатырохгарматнага судна можа даць досыць дакладнае ўяўленне пра яе постаць. Рот яе змяшчаўся на канцы хобата даўжынёй шэсцьдзесят-семдзесят футаў і таўшчынёй амаль з тулава слана. Аснова хобата была пакрытая чорнай калматай поўсцю, якой хапіла б на тузін бізонаў; з яе тырчалі, выгінаючыся ўніз і ўбок, два бліскучыя іклы накшталт дзіковых, толькі невымерна большыя. Па абодва бакі ад хобата ўперад выступалі два гіганцкія рогі футаў на трыццаць-сорак, прызматычныя і, здавалася, з чыстага крышталю: у іх масляпляльна адбіваліся промні вечаровага сонца. Тулава мела форму кліну з вастрыём уніз. Ад яго адыходзілі дзве пары крылаў, кожнае даўжынёй каля ста ярдаў. Крылы мясціліся

адно пад другім і былі шчыльна пакрытыя металічнай лускою, і кожная лускавінка мела ў дыяметры дзесяць-дванаццаць футаў. Я заўважыў, што верхнія і ніжнія крылы былі злучаныя тоўстым ланцугом. Але галоўнай асаблівасцю гэтага жудаснага стварэння была выява чэрапа, што займала амаль усю паверхню грудзей і ярка бялела на цёмным тулаве, быццам старанна вымаляваная мастаком. Пакуль я з пачуццём жудасці і страху, з прадчуваннем непапраўнай бяды, якое не маглі адолець аніякія разумовыя высілкі, глядзеў на гэтую пачварную жывёліну, і асабліва на выяву на яе грудзях, агромністыя сківіцы на канцы хобата раптам адкрыліся, і з іх вырваўся гучны і тужлівы енк, што ўдарыў па маіх нервах, як пахавальны звон. Калі пачвара знікла ля падножжа пагорка, я ўпаў без прытомнасці.

Калі я ачуняў, маім першым памкненнем было расказаць сябру пра тое, што я бачыў і чуў, але пачуццё агіды, якое я наўрад ці магу вытлумачыць, было настолькі моцным, што я прамаўчаў.

Аднойчы ўвечары, дні праз тры ці чатыры пасля здарэння, мы з сябрам былі разам у тым самым пакоі, дзе мяне наведала відзежа, — я сядзеў на тым жа месцы ля акна, а ён разваліўся побач на канапе. Выкліканыя месцам і часам успаміны падштурхнулі мяне расказаць пра здарэнне. Ён выслухаў мяне не перабіваючы і спачатку шчыра рассмяяўся, а пасля вельмі пасур'ёзнеў, быццам больш не сумняваўся ў маім вар'яцтве. У гэты момант я зноў убачыў удалечыні пачвару і з крыкам жаху паказаў на яе. Ён уважліва ўгледзеўся, але пачаў запэўніваць, што нічога не бачыць, хаця я падрабязна апісаў, як яна спускаецца па бязлесым схіле.

Я быў бязмежна ўзрушаны, бо палічыў відзежу прадвесцем мае смерці ці, што яшчэ горай, вар'яцтва. У адчаі я адкінуўся назад у фатэль, схаваўшы твар у далонях. Калі я адкрыў вочы, відзежа знікла.

Тым часам да гаспадара вярнулася яго звычайная разважлівасць, і ён падрабязна распытаў мяне пра выгляд фантастычнага стварэння. Застаўшыся цалкам задаволены маімі адказамі, ён глыбока ўздыхнуў, быццам камень зваліўся ў

яго з душы, і са спакоем, які падаўся мне амаль бесчалавечным, працягнуў размову на некаторыя тэмы спекулятыўнай філасофіі. Памятаю, як між іншым ён вельмі настойваў, што асноўнай прычынай усіх чалавечых памылак ёсць схільнасць розуму да перабольшання ці перамяншання значнасці нейкага прадмета праз недакладнае вызначэнне адлегласці. «Так, напрыклад, — сказаў ён, — каб дакладна вызначыць уплыў дэмакратыі на чалавецтва, трэба абавязкова ўзяць пад увагу аддаленасць эпохі, калі яна ўсё чалавецтва ахопіць. А тым не менш ці можаце вы назваць мне хаця б аднаго аўтара, які піша пра формы кіравання і лічыць, што гэтую тэму ўвогуле варта абмяркоўваць?»

Тут ён, змоўкшы на хвілінку, падышоў да кніжнай шафы і выцягнуў пачатковы курс прыродазнаўства. Потым, папрасіўшы мяне памяняцца з ім месцамі, каб яму было лягчэй разбіраць дробны шрыфт, ён заняў маё месца ў фатэлі ля акна, разгарнуў кнігу і працягнуў размову ў тым самым тоне.

— Калі б вы так падрабязна не апісалі пачвару, — сказаў ён, — я, магчыма, не змог бы паказаць вам, што гэта такое. Дазвольце мне зачытаць школьнае апісанне аднаго з прадстаўнікоў роду *Sphinx*, сямейства *Crepuscularia*[1], атраду *Lepidortera*[2], класа *Insecta*, то бок інсектаў. Вось яно:

«Чатыры перапонкавыя крылцы, пакрытыя каляровымі лускавінкамі з металічным бляскам; рот у выглядзе закручанага хабатка, які ёсць працягам скіўіцаў, па баках яго — рудыментарныя жавалы і пушыстыя шчупікі. Ніжнія крылцы злучаныя з верхнімі жорсткімі валаскамі; доўгія вусікі прызматычнай формы; брушка завостранае. Сфінкс Мёртвая Галава неаднойчы наводзіў жах на недасведчаных журботным гукам, які ён выдае, а таксама эмблемай смерці на панцыры».

Ён загарнуў кнігу і нахіліўся наперад, сеўшы акурат так, як сядзеў я, калі назіраў «пачвару».

---

1 Прыцемкавы (лац.); замест назвы сямейства Sphingidae (бражнікі) По ўжывае назву віду.

2 Лускакрылыя (лац.).

— Ага, вось яно! — усклікнуў сябра. — Цяпер яно паўзе па схіле наверх, і, мушу прызнаць, выглядае досыць незвычайна. Толькі яно зусім не такое вялікае і зусім не так далёка, як вам падалося. Яно караскаецца па павуціне, якую сплёў павук уздоўж рамы, і я бачу, што даўжыня яго — не больш за адну шаснаццатую дзюйма, і такая ж адлегласць аддзяляе яго ад маёй зрэнкі!

*Пераклала Наталля Клабанава*

# Чалавек натоўпу

Ce grand Malheur, de ne pouvoir être seul.
La Bruyère[1]

Пра адну нямецкую кнігу было добра сказана, што *es lässt sich nicht lessen* — яна не дае сябе прачытаць. Бываюць таямніцы, якія не даюць сябе выказаць. Штоночы людзі паміраюць у сваіх ложках, сціскаючы рукі духоўных спаведнікаў, жалосна зазіраючы ім у вочы, паміраюць з роспаччу ў сэрцы й сутаргамі ў горле дзеля агідных таямніцаў, якія не выносяць таго, каб іх раскрывалі. Часам, аднак, чалавечае сумленне бярэ на сябе такую цяжкую ў сваёй страшлівасці ношу, што скінуць яе можна толькі ў магільны дол. І так сутнасць усяго злачыну застаецца неразгаданая.

Не так даўно, адным восеньскім надвячоркам, я сядзеў каля вялікага акна ў кавярні Д. у Лондане. Ужо колькі месяцаў я быў хворы, але цяпер пачынаў вяртацца да здароўя і, адчуваючы, як дадаецца сіла, перабываў у адным з тых шчасных настрояў, якія становяць дакладную процілегласць *ennui* — настрояў найвастрэйшага хацення, калі спадае смуга з разумовага зроку, ἀχλὺς ἢ πρὶν επῆεν[2] і ўзварушаны інтэлект нагэтулькі пераўвышае свой будзённы стан, як жывы й востры розум Ляйбніца вар'яцкую й нетрывалую рыторыку Горгія*. Мяне радавала ўжо проста магчымасць дыхаць; я знаходзіў нават нейкую прыемнасць у тым, што звычайна спрычыняе боль. Я адчуваў спакойнае, але дапытлівае зацікаўленне да ўсяго. З цыгарэю ў роце й газетаю на каленях я прабавіў большую частку вечара то вывучаючы абвесткі, то разглядаючы стракатую публіку ў залі, то пазіраючы праз замглёныя шыбы на вуліцу.

Гэта была адна з галоўных праезных вуліцаў у горадзе, цэлы дзень на ёй было поўна людзей. Аднак калі апускаўся

---

[1] Уся нашая бяда ў тым, што мы не ўмеем быць адны. — Лабруер* (фр.).

[2] Смуга, што навісала раней (грэцк.).

змрок, натоўп рабіўся штораз люднейшы; у святле ўжо запаленых ліхтароў два густыя няспынныя патокі гарадскога жыхарства паспешліва праплывалі міма дзвярэй. Мне ніколі не даводзілася быць у падобнай сітуацыі ў гэткую вечаровую часіну, і таму шумлівае мора чалавечых галоваў напаўняла мяне чароўнаю навізною пачуцця. Нарэшце я зусім забыўся пра кавярню й цалкам захапіўся агляданнем вулічнага відовішча.

Напачатку мае назіранні абмяжоўваліся абстракцыямі й абагульненнямі. Я глядзеў на мінакоў ва ўсёй іхнай масе й думаў пра іх у сукупе іхных дачыненняў. Неўзабаве, аднак, я перайшоў да дэталяў і пачаў з падрабязным зацікаўленнем разглядаць незлічоную разнастайнасць постацяў, адзення, настрою, хады, позіркаў і выразаў твару.

Пераважная большасць тых, хто прамінаў кавярню, мела задаволены і дзелавы выгляд і думала, здавалася, толькі пра тое, як прабіцца праз тлум. У іх былі насупленыя бровы й заклапочаныя вочы; сутыкнуўшыся з іншымі падарожнікамі, яны не выяўлялі ніякіх знакаў нецярплівасці, а толькі папраўлялі вопратку й паспешліва мкнулі далей. Іншыя ж, якіх таксама было нямала, вылучаліся неспакойнымі рухамі й расчырванелымі тварамі, яны гаварылі самі з сабою, заўзята махаючы рукамі, нібы адчувалі самоту якраз з прычыны гушчыні навакольнага натоўпу. Калі нехта стрымліваў іхны рух наперад, гэтыя людзі раптам пераставалі мармытаць і пачыналі ўдвая шырэй махаць рукамі, чакаючы з няшчыра-безуважнай усмешкай на вуснах, пакуль іх абміне сустрэчная перашкода. Калі іх штурхалі, яны шчодра кланяліся штурхальніку і, здавалася, моцна бянтэжыліся. У людзей гэтых дзвюх групаў не было нічога асабліва выразнага, апрача таго, што я заўважыў. Іх убранне належала да таго гатунку, які справядліва завецца добрапрыстойным. Гэта, без сумневу, былі арыстакраты, гандляры, юрысты, камерсанты, біржавыя маклеры — эўпатрыды* й банальнасці грамадства — людзі зусім вольныя ад заняткаў або надзвычай занятыя нейкімі сваімі клопатамі — самастойным вядзеннем нейкіх справаў. Яны не надта прыцягвалі маю ўвагу.

Адразу можна было пазнаць племя службоўцаў; сярод іх я вылучаў дзве выразныя катэгорыі. Гэта былі дробныя клеркі з навамодных фірмаў — маладыя джэнтльмены ў абцягнутых сурдутах, бліскучых чаравіках, з густа намашчанымі валасамі й надзьмутымі вуснамі. Калі не браць пад увагу пэўную фарсістасць у паставе, якую, за адсутнасцю лепшага слова, можна назваць кляркунствам, манеры гэтых людзей здаваліся мне дакладным адбіткам таго, што за год-паўтара перад тым лічылася вяршыняю бон тону. Яны падабралі адкіды дабрачыннасці вышэйшага грамадства; у гэтым, на маю думку, заключаецца найлепшае акрэсленне згаданае групы.

Катэгорыю вышэйшых службоўцаў салідных фірмаў, або «старых надзейных прыяцеляў», цяжка было зблытаць з некім іншым. Яны пазнаваліся з іх цёмных або чорных сурдутаў і нагавіцаў, пашытых дзеля зручнейшага сядзення, насілі яны таксама белыя гальштукі й камізэлькі, шырокія самавітыя чаравікі і тоўстыя шкарпэткі або гетры. Усе яны былі лысаватыя, а правае вуха ў іх, гадамі прызвычаенае трымаць асадку, паводле дзіўнага звычаю было крыху адтапыранае ўверсе. Я заўважыў, што яны заўсёды здымалі й надзявалі капялюш абедзвюма рукамі, а яшчэ насілі гадзіннікі на кароткім залатым ланцужку трывалага старадаўняга ўзору. Яны ўсяляк удавалі самавітасць, калі толькі можна ўдаваць штосьці нагэтулькі паважнае.

Нямала траплялася мне зухаватых з выгляду асобінаў, што належалі, як я лёгка разумеў, да пароды кішэннікаў экстра-класа, якімі поўняцца ўсе вялікія гарады. Я разглядаў гэтае племя з вялікай цікавасцю і ніяк не мог уявіць, як могуць прымаць іх за джэнтльменаў самі джэнтльмены. Неабсяжнасць іхных манжэтаў у спалучэнні з выразам празмернае шчырасці на твары адразу іх выдавала.

Шулераў, якіх я таксама заўважаў нямала, было яшчэ лягчэй распазнаць. Яны былі ўбраныя вельмі розна: і як мацёрыя напарстачнікі — у вельветавыя камізэлькі з каляровымі хусткамі вакол шыі, залачонымі ланцужкамі й філіgranавымі гузікамі, або як падкрэслена незаўважны святар, які менш

за ўсё мог выклікаць падазрэнні. І аднак усе яны вылучаліся нейкай прыпухлай смуглявасцю твараў, бляклай замглёнасцю вачэй, бледнасцю сціснутых вуснаў. Да таго ж, былі яшчэ дзве рысы, з якіх я заўсёды мог іх распазнаць, — асцярожная сцішанасць тону ў размове і вялікі палец на руцэ, больш чым звычайна адстаўлены прастакутна да іншых пальцаў. Вельмі часта, у кампаніі з гэтымі круцялямі мне траплялася пароўда людзей, што хоць і мелі крыху іншыя манеры, усё роўна былі птушкі з тае самае чарады. Іх можна было б акрэсліць джэнтльменамі, якія жывуць з свае спрытнасці. Яны, як выглядае, палююць на людзей у двух атрадах — фарсуноў і вайскоўцаў. Галоўныя адзнакі першае групы — доўгія валасы й заўсёдная ўсмешка; другое — мундур з аксельбантамі й насупленыя бровы.

Апускаючыся, як той казаў, па шкале арыстакратычнасці, я знайшоў больш змрочныя й глыбокія тэмы для разважанняў. Я бачыў габрэйскіх вулічных гандляроў з ястрабінымі вачыма, якія глядзелі з твараў, дзе ўсе іншыя рысы былі пазначаныя пакорлівым прыніжэннем; дужых прафесійных жабракоў, што злосна касавурыліся на больш прыстойных з выгляду просьбітаў, якіх толькі нясцерпная роспач выгнала ў змрок ночы па міласціну; хвараблівых і страхотных інвалідаў, на якіх смерць ужо паклала сваю цвёрдую руку, якія, няпэўна валочачы праз натоўп свае кволыя целы, умольна зазіралі кожнаму ў твар, нібыта шукаючы нейкага неспадзяванага суцяшэння, нейкай страчанай надзеі; сціплых маладых дзяўчат, што вярталіся пасля доўгай і позняй працы ў панурыя дамы і сціскаліся, больш ад страху, чым ад абурэння, пад позіркамі нахабных нягоднікаў, якіх было не абмінуць, каб яны не прыцiснуліся сярод натоўпу; вулічных жанчын самага рознага веку й гатунку — неаспрэчную прыгажуню ў найлепшым жаночым веку, што нагадвае Лукіянаву* статую, з абліччам з пароскага мармуру, але з поўным гнюснага бруду нутром — агідную й безнадзейна пагіблую пракажоную ў лахманах — паморшчаную, завешаную аздобамі, абмазаную пудрамі й памадамі старую чапялу ў апошнім намаганні вярнуць маладосць — зусім малое дзіця

з няспелымі формамі, спрактыкаванае праз багаты досвед ва ўсіх страшных манернасцях свайго рамяства, ахопленае шалёным памкненнем параўнацца ў заганах з старэйшымі; незлічоных і неапісальных п'яніцаў — адных у палапленым рыззі, што маўкліва хісталіся на бакі, з пабітымі тварамі й тусклымі вачыма — другіх у цэлым, але брудным адзенні, з крыху няпэўнай фанабэрлівай хадою, з тоўстымі гарачымі вуснамі і з прыязнымі расчырванелымі тварамі — іншых, чыё адзенне некалі было добрае, а й цяпер яшчэ было старанна выгладжанае шчоткай — людзей, якія йшлі пругкаю хадою, але твары ў якіх былі смяротна бледныя, вочы жахліва-дзікія й чырвоныя, якія, праціскаючыся скрозь натоўп, чапляліся дрыготкімі пальцамі за ўсё, што трапляла ім пад руку; апрача ўсіх гэтых — піражнікаў, насьбітоў, вугальшчыкаў, смецяроў; катрыншчыкаў, малпаводаў і складальнікаў баладаў, тых, хто гандляваў імі і тых, хто спяваў; абадраных рамеснікаў і знясіленых работнікаў усіх гатункаў, і ўсё гэта было поўнае шумлівай і бязладнай жывасці, якая рэзала вуха і ад якой балела ўваччу.

Чым глыбейшая рабілася ноч, тым больш паглыблялася й мая цікаўнасць да відовішча, бо не толькі матэрыяльна змяніўся агульны характар натоўпу (яго далікатнейшыя рысы знікалі з адступленнем са сцэны больш прыстойнае часткі гараджанаў, грубейшыя ж, наадварот, рабіліся штораз больш выразныя, бо позняя часіна выцягвала з дзённых логваў самую розную гнюсоту), але й святло газавых ліхтароў, напачатку кволае ў ягоным змаганні з апошнімі промнямі дня, паволі бралася ў сілу й пакрывала ўсё навокал сутаргавай бляклай свеценню. Усё навокал было цёмнае і ўрачыстае — як той чарнадрэў, з якім параўноўваюць стыль Тэртуліяна*.

Зачараваны дзівоснымі гульнямі святла, я захапіўся разгляданнем асобных твараў; і хоць хуткасць, з якою зіхоткі сусвет мільгаў за вакном, дазваляла мне кінуць толькі адзін позірк на кожны твар, усё ж здавалася, што ў тым маім асаблівым стане душы й розуму я часта быў здольны нават за найкарацейшае імгненне беглага позірку прачытаць гісторыю доўгіх гадоў.

Прыціснуўшыся лобам да шыбіны, я сядзеў, падрабязна аглядаючы натоўп, калі раптам перада мною з'явіўся твар (струхлелага старога чалавека гадоў шасцідзесяці пяці або сямідзесяці) — твар, які спыніў і захапіў усю маю ўвагу, дзякуючы абсалютнай непаўторнасці ягонага выразу. Нічога, што б хоць найдалей нагадвала гэты выраз, я ніколі яшчэ не бачыў. Я добра памятаю, што маёй першай думкай, калі я ўбачыў яго, было, што Рэц*, паглядзеўшы на яго, не вагаючыся выбраў бы гэты твар для сваіх партрэтных уцелаўленняў д'ябла. Калі я паспрабаваў за кароткую хвіліну майго арыгінальнага агляду прааналізаваць значэнне, схаванае ў гэтым твары, перада мною няясна й блытана паўсталі вобразы вялікае разумовае сілы, абачлівасці, скупасці, хцівасці, стрыманасці, хітрасці, крыважэрнасці, злацешнасці, весялосці, празмернага страху, глыбокай — скрайняй роспачы. Я быў дзівосна ўзрушаны, спалоханы, зачараваны. «Якая дзікая гісторыя, — сказаў я сам сабе, — запісаная ў гэтай душы!» Тады ў мяне ўзнікла нясцерпнае жаданне прасачыць за гэтым чалавекам, даведацца пра яго болей. Паспешліва накінуўшы плашч і схапіўшы капялюш і кій, я выбег на вуліцу й пачаў прадзірацца праз натоўп у той бок, куды, як я пабачыў, пайшоў стары, бо ён ужо знік з вачэй. Не без цяжкасці праз нейкі час я ўсё ж заўважыў яго, наблізіўся й пайшоў за ім, захоўваючы асцярожнасць, каб не прыцягнуць ягонае ўвагі.

Цяпер я мог добра яго разгледзець. Ён быў з выгляду вельмі кволы. Вопратка на ім, агулам кажучы, была брудная й падзертая; але калі час ад часу на яго падала зыркае святло ліхтара, было відаць, што ягоная бялізна, хоць і брудная, была пашытая з дыхтоўнае тканіны; і, можа, мяне падмануў мой зрок, але праз прагал у шчыльна зашпіленым і відавочна пазычаным з чужога пляча roquelaur'ы[1], у які ён быў загорнуты, я заўважыў дыямент і кінжал. Гэтыя назіранні падагрэлі маю цікаўнасць, і я вырашыў ісці за незнаёмцам, куды б ён ні скіраваўся.

Было ўжо зусім цёмна, і над горадам павісла шчыльная сырая смуга, якая хутка абрынулася густым зацяжным даж-

[1] Roquelaure (фр.) — сурдут да каленяў; адзенне XVII ст.

джом. Гэтая змена ў надвор'і дзіўным чынам паўплывала на натоўп, у ім распачаўся новы розрух, а над ім павырасталі незлічоныя парасоны. Калыханне, штурханіна й гамана ўзмоцніліся ўдзесяцёра. Што да мяне, дык я не надта зважаў на дождж — з увагі на старую гарачку, што хавалася недзе ў глыбінях майго арганізма, вільгаць была мне нейкай небяспечнай прыемнасцю. Абвязаўшы рот хусткай, я ішоў далей. Паўгадзіны стары, змагаючы ўсе перашкоды, ішоў напрасткі па вялікай вуліцы; я ішоў зусім побач, баючыся згубіць яго з вачэй. Ні разу не азірнуўшыся назад, ён мяне не бачыў. Пасля ён павярнуў на папярэчную вуліцу, якая, хоць і густа напоўненая людзьмі, была ўсё ж не такая тлумная, як тая, з якой ён толькі што сышоў. І тут адразу заўважылася перамена ў ягоных паводзінах. Цяпер ён ішоў павольна й не так мэтанакіравана, як перад тым, — больш нерашуча. Некалькі разоў ён перайшоў сюды-туды вуліцу без ніякае бачнае мэты; навокал усё яшчэ было так людна, што падчас кожнага з гэтых пераходаў я мусіў трымацца блізка ад яго. Вуліца была вузкая й доўгая, ён ішоў па ёй гадзіну, за якую натоўп паступова паменшаў да той колькасці, якую звычайна можна пабачыць на Брадвеі каля Парку — такая вялікая розніца ў жыхарстве паміж Лонданам і найбольш людным горадам Амерыкі. Яшчэ адзін паварот вывеў нас на ярка асветлены пляц, перапоўнены жыццём. Да старога зноў вярнуліся старыя манеры. Угнуўшы галаву, ён кідаў навокал дзікія позіркі з-пад броваў. Упарта й неадступна ён ішоў далей. Я, аднак, здзівіўся, калі заўважыў, што, абышоўшы пляц, ён зноў пайшоў па сваіх слядох. Яшчэ больш я быў уражаны, калі ён паўтарыў тую самую праходку некалькі разоў — адзін раз ледзь не выкрыўшы мяне, калі нечакана павярнуўся.

Так ён практыкаваўся яшчэ гадзіну, пад канец якой насустрач нам траплялася ўжо значна менш мінакоў, чым спачатку. Дождж не пераставаў; у паветры пахаладнела; людзі разыходзіліся па дамах. Нецярпліва махнуўшы рукою, мой вандроўнік звярнуў у параўнаўча пусты завулак. Па гэтым завулку, даўжынёю чвэрць мілі, ён памкнуў так хутка, як нельга было й спадзявацца ад такога старога чалавека, і мне

давялося прыкласці нямала намаганняў, каб не адстаць ад яго. Праз колькі хвілінаў мы выйшлі да вялікага й людна-га базару, з наваколлем якога незнаёмец быў, відаць, добра знаёмы. Там зноў я пабачыў яго такім, як і на самым пачат-ку, ён бязмэтна снаўдаў сюды-туды сярод мора гандляроў і пакупнікоў.

Паўтары гадзіны ці каля таго, што мы прабылі ў гэтай мясціне, я мусіў ужыць усю маю асцярожнасць, каб не згубіць старога й разам з тым не прыцягнуць ягонае ўвагі. На шчасце, на нагах у мяне былі гумовыя галёшы, і я мог рухацца зусім бязгучна. Ні разу ён не заўважыў, што я за ім назіраю. Ён уваходзіў у адну крамку за другой, ні да чога не прыцэньваўся, не казаў ні слова і глядзеў на ўсе тавары дзікім і пустым позіркам. Я быў да таго здзіўлены ягонымі паводзінамі, што цвёрда пастанавіў, што мы з ім не расстанемся, пакуль я хоць у нейкай меры не задаволю сваю цікаўнасць адносна гэтага чалавека.

Гадзіннік гучна прабіў адзінаццаць удараў, і наведнікі пачалі паспешліва пакідаць базар. Нейкі крамнік, зачыня-ючы аканіцы, штурхануў старога, і я ўбачыў, як усё цела ягонае моцна здрыганулася. Ён паспяшаўся на вуліцу, на хвіліну неспакойна азірнуўся і з неймаверным спрытам па-бег незлічонымі крывымі бязлюднымі завулкамі, пакуль мы зноў не апынуліся на вялікай праезнай вуліцы, адкуль пача-лося нашае падарожжа — дзе стаяў гатэль Д. Вуліца, аднак, мела ўжо зусім іншы выгляд; яна ўсё яшчэ блішчала ў святле ліхтароў, але ліў моцны дождж, і людзей на ёй было вельмі ма-ла. Незнаёмец быў цяпер бледны. Ён у задуменні зрабіў пару крокаў па нядаўна яшчэ людным праспекце, пасля, глыбока ўздыхнуўшы, павярнуў у бок ракі і, паблукаўшы бясконцымі кружнымі дарогамі, выйшаў нарэшце да аднаго з галоўных тэатраў. Ён ужо зачыняўся, і тлум публікі выліваўся з дзвярэй. Я пабачыў, як стары разявіў рот, нібы каб глынуць паветра, і кінуўся ў натоўп; мне падалося, што невыносная пакута, якая адбівалася на ягоным твары, крыху сунялася. Ён зноў угнуў галаву і зноў стаўся такім, якога я ўбачыў яго напачат-ку. Я заўважыў, што ён увайшоў туды, куды скіравалася боль-

шасць гледачоў — але наагул я так і не здолеў спасцігнуць непрадказальнасць ягоных дзеянняў.

Пакуль ён ішоў далей, гурт людзей паступова рассейваўся, і да старога вярталіся разгубленасць і неспакой. Нейкі час ён неадступна крочыў за купкай з дзесяці-дванаццаці п'яных гулякаў; але яны адзін за адным разыходзіліся, пакуль не засталіся толькі трое, у нейкім вузкім і змрочным бязлюдным завулку. Незнаёмец прыпыніўся і, здавалася, на хвіліну задумаўся; тады, раптоўна ажывіўшыся, хутка пашыбаваў па дарозе, якая вывела нас на край горада, да ваколіцаў, вельмі непадобных да тых, што мы толькі што прамінулі. Гэта быў самы агідны лонданскі квартал, дзе ўсё было пазначанае страшным кляймом самае неймавернае беднасці й самага невыпраўнага злачынства. Пад цьмяным святлом выпадковых ліхтароў высокія старасвецкія паточаныя чарвякамі драўляныя будыніны стаялі, гатовыя ўпасці. Набудаваныя яны былі так тлумна й бязладна, што між імі цяжка было распазнаць штосьці падобнае да праходу. Брук быў укладзены абы-як, між камянёў буяла густая трава. У забітых канавах гніло ўсякае паскудства. Усё навокал патыхала заняпадам. Аднак па меры таго як мы ішлі наперад, гукі чалавечага жыцця паступова ажывалі, пакуль урэшце мы не ўбачылі вялікія грамады найбольш занядбаных насельнікаў Лондана, якія сноўдалі сюды-туды. Дух старога зноў успыхнуў, як свечка, перад тым як пагаснуць. Ён зноў памкнуўся наперад пругкім поступам. Раптам, павярнуўшы за рог, мы ўбачылі полымя яркага святла й апынуліся перад адной з вялізных загарадных святыняў Няўстрыманасці — перад адным з палацаў д'ябла Джына.

Ужо амаль пачало світаць, аднак гурт няшчасных п'яніцаў усё яшчэ тоўкся каля завабнага ўваходу. Ледзь не закрычаўшы ад радасці, стары прабіўся ў будыніну, зноў вярнуўшыся да пачатковага настрою і там хадзіў сярод натоўпу ўзад і ўперад без бачнае мэты. Але не паспеў ён удосталь там набыцца, як агульны рух да дзвярэй зазначыў, што гаспадар збіраецца зачыніць іх на ноч. І тады я заўважыў нешта яшчэ больш балючае за роспач у твары дзіўнага стварэння, за якім я так

неадступна назіраў. Ён, аднак, не стаў доўга вагацца, а з шалёнай энергіяй павярнуў у зваротную дарогу, у самае сэрца магутнага Лондану. Ён бег доўга й шпарка, а я не адставаў ад яго, ахоплены надзвычайнай цікаўнасцю, пастанавіўшы не спыняць даследавання, якое цяпер завалодала мною дарэшты. Тым часам узышло сонца, і калі мы зноў апынуліся ў самай люднай мясціне вялікага горада, на вуліцы з гатэлем Д., яна зноў поўнілася не меншым людскім тлумам і рухам, чым я назіраў папярэднім вечарам. І тут, сярод штораз большага натоўпу, я працягнуў свае доўгія назіранні за незнаёмцам. Але, як звычайна, ён хадзіў сюды-туды і за ўвесь дзень не пакінуў шумлівага віру адной гэтай вуліцы. Але калі ўвечары на горад апусцілася сутонне, я адчуў смяротную стому і, спыніўшыся перад маім падарожнікам, паглядзеў яму проста ў твар. Ён не звярнуў на мяне ніякае ўвагі і ўрачыста пашыбаваў далей, а я, кінуўшы сачыць за ім, спыніўся ў глыбокім задуменні. «Гэты стары, — сказаў я нарэшце, — увасабленне й дух страшнага злачынства. Ён не можа заставацца адзін. Ён — чалавек натоўпу. Няма сэнсу за ім ісці; бо я нічога не даведаюся ні пра яго самога, ні пра ягоныя ўчынкі. Нават самае ўбогае ў свеце сэрца — кніга, гнюснейшая за *Hortulus Animae*[1], і, можа, найвялікшая Божая ласка ў тым, што *es lässt sich nicht lessen*.

*Пераклаў Сяргей Шупа*

[1] «Садок душы»* (лац.).

# Некалькі выпадкаў з жыцця знакамітасці

...І прышлы люд
Глядзеў на дзіва там і тут.
«Сатыры» біскупа Хола*

Я знакаміты, дакладней сказаць, быў знакаміты, хаця я не аўтар «Лістоў Юніюса»* і не Жалезная Маска*; завуць мяне, калі я не памыляюся, Роберт Джонс і нарадзіўся я недзе ў горадзе Абра-Ка-д'Абра.

Першае, што я зрабіў пасля свайго нараджэння, — схапіўся за свой нос дзвюма рукамі. Пабачыўшы гэта, маці назвала мяне геніем, а бацька расплакаўся ад шчасця і прэзентаваў мне трактат пра насалогію. Я ведаў яго на памяць яшчэ раней, чым на мяне надзелі першыя паўзункі.

Тады я пачаў пракладаць дарогу ў навуку і хутка зразумеў, што, маючы выбітны нос і трымаючы яго па ветры, можна выбіцца ў знакамітасці. Аднак я не абмяжоўваўся толькі тэорыяй. Кожнага ранку я некалькі разоў торгаў сябе, выцягваючы свой свярдзёлак, і выпіваў пяць-шэсць глыткоў чаго-небудзь спрыяльнага.

Калі я дасягнуў паўнагоддзя, аднаго дня бацька паклікаў мяне ў свой кабінет:

— Сын мой, — сказаў ён, калі мы селі, — што ёсць асноўнай мэтай твайго існавання?

— Вывучэнне насалогіі, бацька мой, — адказаў я.

— А чым жа, Роберт, — працягнуў ён, — ёсць насалогія?

— Насалогія, сэр, — патлумачыў я, — ёсць навукай пра насы.

— А ці можаш ты сказаць, — запытаў ён, — што такое нос?

— Нос, тата, — пачаў я, вельмі задаволены, — шматбакова апісвалі больш за тысячу аўтараў (тут я зірнуў на гадзіннік). Цяпер поўдзень ці каля таго, а значыць, да поўначы мы маем досыць часу, каб прабегчыся па іх усіх. Таму пачнем: паводле Бартоліна*, нос — гэта тая пукатасць, тая пухлінка, тая нарасць, тая...

— Досыць, Роберт, — перапыніў мяне гэты стары добры джэнтльмен, — я да глыбіні душы ўражаны шырынёй тваіх даляглядаў... я проста... дальбог! (Тут ён заплюшчыў вочы і паклаў руку на сэрца). Падыдзі сюды! (Тут ён узяў мяне за плячо). Тваё навучанне можна лічыць скончаным, і табе самы час пачаць самому пра сябе клапаціцца, а лепш за ўсё трымаць нос па ветры, а таму... таму... таму прэч з майго дому і памагай табе Бог (і тут ён спусціў мяне з лесвіцы і выштурхаў за дзверы).

Адчуваючы ўнутры сябе боскі *afflatus*[1], я палічыў гэты выпадак хутчэй шчаслівым, чым наадварот. Я наважыўся трымацца бацькоўскае парады. Я вырашыў трымаць нос па ветры. Раз-другі тарганууўшы свайго насовіча, я адразу ж напісаў брашуру па насалогіі.

Уся Абра-Ка-д'Абра прыйшла ў захапленне.

— Чароўны геній! — сказалі ў «Квартальным»*.

— Незвычайны фізіёлаг! — сказалі ў «Вестмінстэрскім весніку».

— Разумнік! — сказалі ў «Замежным».

— Цудоўны пісьменнік! — сказалі ў «Эдынбургскіх навінах».

— Глыбокі мысляр! — сказалі ў «Вячэрнім Дубліне».

— Вялікая асоба! — сказалі ў «Бэнтлі-прэс».

— Высокі дух! — сказалі ў «Фрэзеры».

— Свой чалавек! — сказалі ў «Блэквудзе».

— Хто ж ён? — спытала місіс Панчох-Сіньё.

— Што ж ён? — спытала старэйшая міс Панчох-Сіньё.

— Як жа ён так? — спытала малодшая міс Панчох-Сіньё.

Аднак я не надаў гэтым людзям аніякае ўвагі, а проста ўвайшоў у майстэрню аднаго мастака.

Герцагіня Божа-Барані пазавала для партрэта, маркіз Вось-Дык трымаў яе пудзеля, граф Абал-Дзець заляцаўся да яе нюхальнага флакона, а Яго каралеўская вялікасць Асадзі-Назад прыхіліўся да яе крэсла.

Я падышоў да мастака і задраў нос.

— Якая прыгажосць! — уздыхнула яе светласць.

[1] Парыў, натхненне (лац.).

— Які жах! — пралапатаў маркіз.

— Якая брыда! — прастагнаў граф.

— Якое паскудства! — прабуркатала яго каралеўская вялікасць.

— Колькі вы за яго хочаце? — спытаў мастак.

— За гэты нос! — ускрыкнула яе светласць.

— Тысячу фунтаў, — адказаў я, сядаючы.

— Тысячу фунтаў? — задуменна перапытаў мастак.

— Тысячу фунтаў, — сказаў я.

— З гарантыяй? — удакладніў ён, паварочваючы мой нос да святла.

— З гарантыяй, — адказаў я, добра яго высмаркаўшы.

— А ён у вас сапраўдны? — настойваў ён, пачціва да яго дакранаючыся.

— А то! — сказаў я і скрывіў яго.

— І ніводнай копіі не рабілі? — дапытваў мастак, вывучаючы яго пад мікраскопам.

— Ніводнай, — паведаміў я і задраў яго.

— Чароўна! — усклікнуў ён, цалкам трацячы асцярожнасць ад прыгажосці гэтага манеўра.

— Тысячу фунтаў, — сказаў я.

— Тысячу фунтаў? — спытаў ён.

— Менавіта, — сказаў я.

— Тысячу фунтаў? — спытаў ён.

— Дакладна, — сказаў я.

— Вы іх атрымаеце, — упэўніў ён. — Гэта сапраўдны твор мастацтва! — і ён адразу ж выпісаў мне чэк і зрабіў накід майго носа. Я зняў кватэру на Джэрмін-стрыт і даслаў Яе вялікасці дзевяноста дзявятае выданне «Насалогіі» з партрэтам майго насовіча. І гэты няшчасны шалапут, прынц Уэльскі, запрасіў мяне на абед.

Мы ўсе там былі знакамітасці і *recherchés*[1].

Прысутнічаў навамодны платонік. Ён цытаваў Парфірыя*, Ямвліха*, Плотына*, Пракла*, Гіерокла*, Максіма Тырскага* і Сірыяна*.

---

[1] Вытанчаныя людзі (фр.).

Прысутнічаў адзін ідэаліст-перфекцыяніст. Ён цытаваў Цюрго*, Прайса*, Прыстлі*, Кандарсэ*, дэ Сталь* і «Славалюбнага навукоўца, што пакутуе на хваробу».

Прысутнічаў сэр Парадоксаў друг Бессумнеўны. Ён лічыў усіх дурняў філосафамі, а ўсіх філосафаў — дурнямі.

Прысутнічаў Этык Эстэтыкус. Ён казаў пра агонь, адзінства і атамы, пра раздваенне душы і яе прабыццё, пра роднаснасць і дысгармонію, пра першабытны розум і гамеамерыі*.

Прысутнічаў Тэолагас Тэалогій. Ён разважаў пра Яўсевія* і Арыя*, пра ерась і Нікейскі сабор*, пра п'юзеізм* і адзінаіснасць, гамузію і гамуёзію*.

Прысутнічаў мсьё Фрыкасэ з Рашэ-дэ-Канкаля. Ён згадваў мюрытон з чырвонага языка, квяцістую капусту пад соўсам *velouté*[1], *ялавічыну à la St. Menehoult*, марынад пасвятафларэнтыйску і апельсінавы мус *en mosaïques*[2].

Прысутнічаў Бібамус О'Вылівах. Ён раскрыў тэму латуру і маркбрунэну, мусо і шамбертэну, рошбуру і сэнт-жоржу, абрыёну, леанвілю і медоку, бараку і прэньяку, граву і сэнпэрэ. Ён паціскаў плячыма, калі згадвалі кло-дэ-вужо, і мог з заплюшчанымі вачыма адрозніць херас ад амантыльяда.

Прысутнічаў сіньёр Цінтанцінціна з Фларэнцыі. Ён заглыбляўся ў разважанні пра Чымбаўэ*, Арпіна*, Карпача* і Агастына*, пра змрочнасць Караваджа*, пра чароўнасць Альбані*, пра колеры Тыцыяна, пра жанчын Рубенса і свавольствы Яна Стэйна*.

Прысутнічаў рэктар універсітэта Абра-Ка-д'Абры. Ён меркаваў, што ў Фракіі поўню называлі Бендыдай*, у Егіпце — Бубастыдай*, у Рыме — Дыянай, а ў Грэцыі — Артэмідай.

Прысутнічаў султан са Стамбула. Ён не мог не думаць, што анёлы выглядаюць як коні, пеўні і быкі, што хтосьці на шостым небе мае семдзесят тысяч галоваў і што зямлю трымае нябесна-блакітная карова з бясконцай колькасцю зялёных рагоў.

Прысутнічаў Дэльфінус Паліглот. Ён расказаў нам, што здарылася з васьмюдзесяццю трыма страчанымі трагедыямі

---

1 Далікатны (фр.).
2 Мазаікай (фр.).

Эсхіла*, пяццюдзесяццю чатырма творамі Ісэя* і трыста дзевяноста адной прамовай Лісія*, ста васьмюдзесяццю трактатамі Тэафраста*, восьмай кнігай Апалонія* пра канічныя сячэнні, гімнамі і дыфірамбамі Піндара* і сарака пяццю трагедыямі Гамэра Малодшага*.

Прысутнічаў Сэмюэл Сэнт-Самацвет Сапфірны. Ён адукоўваў нас адносна ўнутраных агнёў і трацічных фармацыяў, адносна рэчываў газападобных, вадкіх і цвёрдых, адносна турмаліну і мергеляў, жалезняку і вапняку, гіпсу і туфу, стэатыту і трагладыту, адносна цынку і цынкавай падманкі, слюды і шыферу, цыяніду і лепідаліту, гематыту і трэмаліту, сурмы і турмы, марганцу і чаго яшчэ вам заўгодна.

Прысутнічаў я. Я гаварыў пра сябе, пасля зноў пра сябе і яшчэ крыху пра сябе, пра насалогію, пра сваю брашуру і пра сябе. Я задзіраў нос і гаварыў пра сябе.

— Які розум! — сказаў прынц.

— Чароўна! — сказалі госці, і наступным ранкам яе светласць Божа-Барані нанесла мне візіт.

— Ты будзеш заўтра ў Элмаку*, маё золатка? — запытала яна, патрапаўшы мяне па шчацэ.

— Слова гонару, — адказаў я.

— А нос пакажаш? А то некаторыя кажуць, прыйду, а самі і носа не паказваюць, — удакладніла яна.

— Каб мне з носам застацца, — упэўніў я.

— Тады вось табе, курносік, мая візітоўка. Ці магу я быць упэўненая, што ты *хочаш* туды пайсці?

— Ды ўсім сэрцам хачу, дарагая герцагіня.

— Фі, не! А ці ўсім носам?

— І носам, нават усімі мухамі, што ёсць у ім, мая даражэнькая, — сказаў я і, скрывіўшы нос, адразу апынуўся ў Элмаку.

Людзей там было — нос да носа.

— Ён ідзе! — закрычаў хтосьці на лесвіцы.

— Ён ідзе! — закрычаў хтосьці вышэй.

— Ён ідзе! — закрычаў хтосьці яшчэ вышэй.

— Ён прыйшоў! — абвесціла герцагіня. — Прыйшоў, носік мой каханенькі! — тут яна схапіла мяне за рукі і тройчы пацалавала ў нос.

Гэта адразу зрабіла сенсацыю.

— *Diavolo*[1]*!* — ускрыкнуў граф Казяроцці.

— *Mille tonnerres*[2]*!* — выгукнуў прынц дэ Жаб.

— *Tousand teufel*[3]*!* — прарычэў курфюрст Краўважэрт.

Сцярпець гэта было немагчыма. Я раз'юшыўся. Я рэзка павярнуўся да курфюрста.

— Сэр, — сказаў я, — вы макака.

— Сэр, — адказаў ён, хвілінку падумаўшы, — *Donner und Blitzen*[4]*!*

Большага я нават не жадаў. Мы абмяняліся візітоўкамі. Наступным ранкам пад Чок-Фармам я адстрэліў яму нос і паехаў да сяброў.

— Быдла! — сказаў адзін.

— Дурань! — сказаў другі.

— Ідыёт! — сказаў трэці.

— Асёл! — сказаў чацверты.

— Вар'ят! — сказаў пяты.

— Ёлуп! — сказаў шосты.

— Шыбуй адсюль! — сказаў сёмы.

Такі прыём мяне проста забіў, і я паехаў да бацькі.

— Бацька мой, — спытаў я, — што ёсць асноўнай мэтай майго існавання?

— Сын мой, — адказаў ён, — гэта ўсё яшчэ вывучэнне насалогіі, аднак, трапіўшы ў нос курфюрсту, ты застаўся з носам. У цябе цудоўны нос, гэта сапраўды так, аднак у Краўважэрта цяпер цудоўнага носа няма. Ты даў маху, а ён зрабіўся героем дня. Я ўпэўнены, што ў Абра-Ка-д'Абры слава наўпрост прапарцыйная памерам носа, аднак — о Божа! — хто можа параўнацца са знакамітасцю, у якой носа ўвогуле няма?

*Пераклала Ганна Янкута*

---

[1] Д'ябал (іт.).

[2] Каб цябе ліха (фр.).

[3] Тысяча чарцей (ням.).

[4] Перуны і маланкі (ням.).

# Акуляры

Калісьці было модна высмейваць так званае «каханне з першага позірку»; але людзі Пачуцця, гэтак жа як і людзі Думкі, ніколі не ставілі пад сумнеў яго існаванне. І сапраўды, актуальныя даследзіны ў галіне таго, што можна назваць этыкамагнетызмам альбо магнетаэстэтыкай, сведчаць: найбольш натуральныя і, адпаведна, найбольш глыбокія і найменш фальшывыя эмоцыі чалавека — тыя, што ўспыхваюць у сэрцы нібы па нейкім электрычным імпульсе — то бок найбольш яскравыя і трывалыя з душэўных прыхільнасцяў родзяцца *вока-мгненна* — у літаральным сэнсе гэтага слова. Прызнанне, якое я маю намер зрабіць, паслужыць яшчэ адным звяном і без таго бясконцага ланцуга доказаў рацыі вышэйсказанага.

Аповед мой вымагае дакладных аўтабіяграфічных звестак. Я зусім яшчэ маладзён — мне няма і дваццаці двух. Прозвішча маё на дадзены момант даволі банальнае і нават плебейскае — Сімпсан. Я кажу «на дадзены момант», бо такое прозвішча ў мяне ад нядаўна — я афіцыйна ўзяў яго менш за год таму, каб атрымаць вялікую спадчыну, якую пакінуў мне далёкі крэўны мужчынскага полу, Адольф Сімпсан, эсквайр. Умовай тэстаменту было тое, што я мушу ўспадчыніць і прозвішча памерлага; толькі прозвішча, не імя. Імя, а дакладней, імёны мае — Напалеон Банапарт.

Прозвішча Сімпсан я прыняў ускрай неахвотна, бо па праве ганарыўся сваім родавым імем — Фруасар, свята веруючы, што паходжу ад несмяротнага аўтара «Хронік»*. Дарэчы, пра імёны: у прозвішчах маіх непасрэдных продкаў меў месца шэраг займальных гукавых супадзенняў. Мой бацька быў нехта Фруасар з Парыжу. Яго жонка — мая маці — якая пабралася з ім у пятнаццаць гадоў, — у дзявоцтве насіла прозвішча Круасар; яна была старэйшай дачкой банкіра Круасара, чыя жонка, у сваю чаргу, выйшла замуж шаснаццацігадовай і была старэйшай дачкой чалавека, якога звалі Віктор Вуасар. Гэты Вуасар, як ні дзіўна, быў жанаты з дамай, што да таго мела падобнае прозвішча — Муасар. Яна таксама выйшла замуж

амаль дзіцем, і яе маці нейкі Муасар павёў пад вянец, калі нявесце было ўсяго чатырнаццаць. У Францыі такімі раннімі шлюбамі нікога не здзівіш. Вось жа, Муасары, Вуасары, Круасары і Фруасары — і ўсё гэта мае продкі па простай лініі. Я ж, як я ўжо сказаў, зрабіўся Сімпсанам, падпарадкоўваючыся закону і з такой унутранай агідай, што пэўны час нават вагаўся, ці прымаць спадчыну пры такіх раздражняльных і бязглуздых юрыдычных *варунках.*

Што да асабістых якасцяў, то я, безумоўна, чалавек адораны. Ніякіх дэфектаў не маю. Наадварот, я станісты, і дзевяць дзясятых усяго свету назавуць мой твар прыгожым. Рост мой складае пяць футаў адзінаццаць дзюймаў[1]. Мой волас чорны і кучаравы. Мой нос вельмі нават нішто сабе. Мае вочы вялікія і шэрыя; і хоць бачаць яны так кепска, што гэта прыносіць мне плойму нязручнасцяў, па іх выглядзе гэтага аніяк не скажаш. Слабасць зроку, аднак, заўжды раздражняла мяне, і я перапрабаваў усе сродкі — апроч акуляраў. Малады і прывабны, я, натуральна, адпрэчваў гэты *аксэсуар* і ўсялякім чынам пазбягаў ім карыстацца. Нішто не надае маладому твару болей занудства ды нейкага старэчага ханжаства. Манокль жа, у сваю чаргу, — атрыбут піжонаў ды снобаў. Пакуль што я з пераменным поспехам абыходзіўся і без таго, і без другога. Зрэшты, годзе пра дэталі, тым больш што яны малаважныя. Дадам яшчэ для поўнай карціны, што ў мяне тэмперамент сангвініка: я чалавек палкі, імпэтны, поўны энтузіязму і ўсё сваё жыццё быў адданым заўзятарам жанчынаў.

Аднойчы зімовым вечарам я падняўся ў ложу тэатра П., на пару з маім сябрам па прозвішчы Толбат. Давалі оперу, анонсы абяцалі рэдкае відовішча, таму заля была забітая публікай. Мы прыйшлі акурат у час, каб заняць зарэзерваваныя для нас месцы ў першым шэрагу, прабрацца да якіх тым не менш было няпроста.

Дзве гадзіны запар таварыш мой, апантаны *меламан,* быў зліўшыся са сцэнай у адно цэлае; я ў гэты час забаўляў сябе, разглядаючы *бамонд,* які збольшага складаўся з гарадской

---

[1] 1 м 81 см.

эліты. Нацешыўшыся гэтым заняткам, я быў гатовы звярнуць свае вочы на прымадонну, калі раптам іх спыніла і прыкула да сябе постаць у адной з прыватных ложаў, што дагэтуль заставалася па-за маёй увагаю.

Пражыві я хоць тысячу гадоў, я ніколі не забуду моцнага пачуцця, з якім я аглядаў гэтую постаць. Гэта была найчароўнейшая з кабетаў, якіх я калі-кольвек устракаў. Твар быў павернуты да сцэны такім чынам, што пару хвілінаў я не мог бачыць яго цалкам, але форма была боскаю, ніякае іншае слова не перадасць напоўніцу яго выдатных прапорцыяў, і нават слова «боскі» здаецца да смешнага мізэрным, калі я пішу яго.

Жаночыя вабноты, чары жаночай грацыі заўжды былі сілай, з якой я не мог змагацца, але тое была ўвасобленая грацыя, мой ідэал, уцелясненне маіх самых смелых і самых апантаных відзежаў. Постаць, якую канструкцыя ложы дазваляла мне бачыць амаль цалкам, мела рост крыху вышэйшы за сярэдні і, без значнага перабольшання, сягала каралеўскай велічы. Яе формы былі цудоўна налітымі, пастава — *перфектнаю*. Абрысам яе галоўкі, бачнай толькі ззаду, магла б пазайздросціць сама грэцкая Псіхея, і элегантны капялюшык з тканіны *gaze äerienne*[1], які выклікаў у мяне асацыяцыі *ventum textilem*[2] Апулея*, хутчэй падкрэсліваў, чым хаваў гэта. Правая рука ляжала на балюстрадзе, змушаючы трымцець кожны нерв майго цела сваімі дасканалымі прапорцыямі. Яна была па апошняй модзе абхопленая свабодным адкрытым рукавом, якое адно крыху прыкрывала локаць. Ніжняе ж рукаво з нейкай далікатнай матэрыі шчыльна абцягвала руку і завяршалася пышнай карункавай манжэтай, якая спадала складкамі на далонь так, што былі відаць толькі тонкія пальчыкі, на адным з якіх ззяў дыямент, які я адразу ацаніў як надзвычай каштоўны. Запамарочную кругліню запясця ўдала падкрэсліваў бранзалет; таксама ўпрыгожаны нізкай каштоўных камянёў, ён пераканаўча даводзіў багацце і тонкі густ уладальніцы.

---

[1] Паветраны газ (фр.).
[2] Тканіна з паветра (лац.).

Я разглядаў гэтую каралеўскую постаць сама меней паўгадзіны, нібы аслупянеўшы; і ўвесь гэты час я напоўніцу адчуваў моц і праўдзівасць усяго, што калі-кольвек было прамоўлена ці праспявана пра «каханне з першага позірку». Тое, што я перажываў, не было падобна ні да аднаго пачуцця, што я зазнаваў дагэтуль у прысутнасці самых слаўных прыгажуняў. Неадольнае і, змушаны прызнаць, магнетычнае прыцягненне душаў прыкавала, здаецца, не адно мой зрок, але ўсю моц думак і пачуццяў маіх да незямнога аб'екта перада мною. Я бачыў — я адчуваў — я ведаў, што я глыбока, шалёна, незваротна закаханы — і гэта я яшчэ не бачыў твару багіні. Жарсць, што апанавала мяне, была такой нясцерпнай, што, думаю, калі б яшчэ не ўбачаны тварык выявіўся абсалютна звычайненькім, для мяне мала што змянілася б, калі б змянілася ўвогуле; такая ўжо гэта анамалія: сапраўднае — з першага позірку — каханне. І так мала залежыць яно ад чагосьці па-за намі: нам адно здаецца, што гэта вонкавыя абставіны раскладаюць мілосны агонь і падтрымліваюць яго.

І пакуль я стаяў саляным слупом у гонар гэтай цудатворнай іконы насупраць, раптоўны пошум у залі змусіў яе крыху павярнуць галоўку да мяне, і такім чынам я быў узнагароджаны ўсім яе профілем. Яго прыгажосць нават пераўзышла мае чаканні — і ўсё-ткі штосьці ў ім — я не мог патлумачыць сабе, што менавіта, — расчаравала мяне. Я сказаў «расчаравала», але гэта не зусім тое слова. Мае пачуцці суцішыліся, і адначасова я перажыў нечуванае ўзнясенне. У іх было менш узрушэння і больш разлітага экстазу — экстатычнага спакою. Гэты кшталт пачуцця спарадзіла, відаць, тое, што перада мной быў твар Мадонны, які нёс на сабе пячатку шчаслівага мацярынства; і раптам я зразумеў, што прычына не толькі ў гэтым. Было штосьці яшчэ — нейкая недаступная мне таямніца, — нешта ў манерах, выразе твару, што адначасова абудзіла маю трывогу і расцвяліла маю цікаўнасць. Так што я перабываў у такім душэўным стане, калі чуллівы юнак гатовы на самыя экстравагантныя ўчынкі. Калі б дама была адна, я, без сумневу, уварваўся б у яе ложу і рызыкнуў загаварыць з ёй; але, на жаль, ёй складалі кампанію нейкі джэнтльмен і

надзіва прыгожая жанчына, з выгляду на некалькі гадоў за яе маладзейшая.

Я пракруціў у галаве тысячы спосабаў, што дазволілі б мне быць прадстаўленым старэйшай за мяне даме, ці, для пачатку, хаця б лепей разгледзець яе. Я б мог прасунуцца бліжэй у яе бок, але ў залі, перапоўненай, як таго вечару, гэта здавалася немагчымым. У той жа час няпісанае, але суворае правіла *бон тону*, апошнім часам пашыранае ў свеце, забараняла мне скарыстацца тэатральным біноклем для такіх мэтаў, нават калі б я меў шчасце мець яго, а я не меў — і з гэтай прычыны перабываў у адчаі.

Нарэшце я даўмеўся звярнуцца да свайго таварыша.

— Толбат, — сказаў я, — у вас пры сабе тэатральны бінокль. Дайце яго мне, калі ласка.

— Тэатральны бінокль? Не! Нашто гэта *мне*, па-вашаму, тэатральны бінокль? — і ён нецярпліва павярнуўся назад да сцэны.

— Але Толба-а-ат! — працягнуў я, торгаючы яго за плячо, — паслухайце сюды, дружа. Зірніце на тую ложу.

— Гэтую?

— Не, суседнюю... Ці сустракалі вы калі-небудзь такую красуню?

— Анягож, харошанькая — адказаў Толбат.

— Цікава, хто яна?

— Святыя анёлы, вы што, не ведаеце? «Яе не ведаць — значыць быць нікім»*. Гэта ж знакамітая мадам Лаланд, першая красуня, ва ўсім горадзе пра яе гавораць. Да таго ж надзвычай багатая ўдава і выгадная партыя — нядаўна з Парыжу.

— Вы з ёй знаёмы?

— Так, маю гонар быць.

— Вы прадставіце мяне?

— Зразумела — з вялікай прыемнасцю; калі вам заўгодна?

— Заўтра, а гадзіне дня, я зайду па вас у гатэль.

— Цудоўна. А цяпер памаўчыце, калі можаце.

Мне нічога не заставалася, як паслухацца Толбата, бо ад таго моманту ён нібы аглух і не рэагаваў на мае рэплікі, наўсуцэль захоплены падзеямі на сцэне.

Я ж тым часам не зводзіў вачэй з мадам Лаланд і ўрэшце меў шчасце пабачыць яе твар *анфас*. Ён быў надзвычай гожанькім: вядома ж, маё сэрца падказвала мне гэта яшчэ да таго, як Толбат задаволіў маю цікаўнасць на гэты конт, і ўсё-ткі нешта няўцямнае не давала мне спакою. Урэшце я вырашыў, што мяне бянтэжыла пэўная сумесь самавітасці, маркоты, ці, слушней сказаць, стомы, якая пазбаўляла яе існасць драбка маладосці і свежасці, каб надаць ёй анёльскай пяшчоты і велічы, што, вядома ж, дзесяцікротна павялічвала яе цікавасць для маёй жарснай і рамантычнай натуры.

Паядаючы даму вачыма, я з трымценнем прачытаў па ледзь прыкметных зменах у яе паводзінах, што яна заўважыла мой неадчэпны позірк. Але я быў у поўным захапленні і не мог адвесці ад яе вачэй нават на хвілю. Яна адвярнула твар, і я зноў мог бачыць адно дыхтоўны абрыс патыліцы. Праз некаторы час, нібы цікавячыся, ці я ўсё яшчэ гляджу на яе, яна крадком зноў павярнула твар да мяне і зноў напаткала мой палымяны погляд. Яе вялікія цёмныя вочы тут жа апусціліся, і густая чырвань заліла шчокі. Але, да майго глыбокага здзіўлення, я заўважыў, што яна не толькі не адвярнула галаву другі раз, але выцягнула з рыдыкюля ларнет, узняла яго, паднесла да твару — і ўважліва вывучала мяне праз яго на працягу некалькіх хвілінаў.

Калі б мяне працяла маланкай, я не быў бы агаломшаны так моцна — але толькі агаломшаны, ні ў якім разе не абражаны ці непрыемна здзіўлены, хоць гэткі смелы жэст з боку любой іншай жанчыны мусіў бы выклікаць крыўду ці агіду. Але гэта было зроблена з такой вытрымкай, з такой *апрычонасцю*, з такім спакоем, з такой выхаванасцю, што ў гэтым не было і ценю бессаромнасці, і душа мая поўнілася багомленнем і *фасцынацыяй.*

Я заўважыў, што, падняўшы ларнет першы раз, яна нібы задаволілася кароткім сузіраннем маёй асобы і ўжо адводзіла сваю прыладу, калі раптам, прыспетая нечаканай думкай, узняла яе зноў і цягам некаторага часу засяроджана разглядала мяне — сама меней, клянуся, гэта доўжылася пяць хвілінаў.

Жэст, такі незвычайны ў амерыканскім тэатры, прыцягнуў усеагульную ўвагу і паслужыў прычынай няяснага хваляван-

ня, шэпту ў залі; на нейкае імгненне я сумеўся, чаго нельга было сказаць пра мадам Лаланд.

Задаволіўшы сваю цікаўнасць — калі гэта была цікаўнасць, — яна дала ларнету павіснуць на руцэ і спакойна вярнула сваю ўвагу сцэне; цяпер яна была да мяне ў профіль, як і раней. Я працягваў пільна сузіраць яе, цалкам усведамляючы ўсю непрыстойнасць гэтага. Праз пэўны час я заўважыў, што яе галава пакрысе зрушылася ў мой бок, і хутка я ўпэўніўся, што дама, робячы выгляд, што сочыць за сцэнай, насамрэч крадком вывучае мяне. Лішне казаць, як шакавалі маё ўяўленне гэткія паводзіны гэткай фантастычнай жанчыны.

Паглядзеўшы на мяне такім чынам недзе з чвэрць гадзіны, гэты чысты аб'ект маёй жарсці звярнуўся да джэнтльмена, які суправаджаў яе, і па позірках суразмоўцаў я беспамылкова вызначыў, што гавораць яны пра мяне.

У выніку мадам Лаланд зноў павярнулася да сцэны і некалькі хвілінаў, здавалася, уважліва сачыла за спектаклем. Праз пэўны адцінак часу яна, аднак, прывяла мяне ў экстаз, другі раз абярнуўшыся; ларнет, што да таго вісеў на руцэ, зноў быў накіраваны на мяне, і, выклікаўшы паўторнае перашэптванне ў залі, яна ўзялася аглядаць мяне з ног да галавы з тым самым дзівосным халаднакроўем, якое было так усхвалявала маю натхнёную душу.

Гэткія нечуваныя паводзіны, пасяліўшы ўва мне ліхаманку захаплення, наўсуцэль ап'яніўшы мяне каханнем, хутчэй падбадзёрылі, чым збянтэжылі мяне. У мілосным шале я забыўся на ўсё, апроч велічнай красуні, якая апанавала мой зрок. Прычакаўшы момант, калі заля, здавалася, была занятая адно операй, я нарэшце злавіў позірк мадам Лаланд і зрабіў хуткі, лёгкі, але выразны паклон.

Яна расчырванелася — потым адвяла вочы — потым паволі і асцярожна азірнулася, відаць, правяраючы, ці мой дзёрзкі жэст быў кім-кольвек заўважаны, — потым нахілілася да джэнтльмена, які сядзеў поруч з ёй.

Цяпер я адчуваў усю скандальную недарэчнасць свайго ўчынку і быў перакананы, што наступствы не змусяць сябе чакаць; карціны заўтрашняй дуэлі прамільгнулі ў маёй

галаве. І які ж вялікі камень зваліўся з майго сэрца, калі я пабачыў, што яна проста моўчкі перадае суседу праграмку; і няхай шаноўны чытач хоць крышачку ўявіць, якім быў мой шок — маё бязмежнае здзіўленне, — які вэрхал ап'янення ўсчаўся ў сэрцы й душы, калі праз імгненне, зноў неўпрыкмет азірнуўшыся, яна паглядзела сваімі бліскучымі вачыма проста ў мае і з лёгкай усмешкай, што прыадкрывала яе бялюткія жамчужныя зубы, двойчы выразна і недвухсэнсоўна прыязным чынам схіліла галаву.

Не мае сэнсу апісваць тут маю радасць, маё ўзрушэнне, бязмежны экстаз майго сэрца. Калі можна звар'яцець ад шчасця, то гэта быў акурат такі момант. Я кахаў. Кахаў *упершыню* — так мне тады здавалася. Гэта было найвышэйшае, абсалютнае каханне. «Каханне з першага позірку» — і гэты першы позірк быў ацэнены і *вернуты.*

Так, вернуты. Як я мог сумнявацца ў гэтым хаця б хвіліну? Як яшчэ можна было патлумачыць паводзіны гэткай прыгожай, багатай і, несумненна, культурнай, бездакорна выхаванай дамы з гэткім статусам у свеце і гэтак паважанай усімі, якой, безумоўна, была мадам Лаланд? О так, яна кахала мяне — яна адказала на маё палкае каханне гэткай жа бяспамятнай, няспыннай, бурлівай палкасцю — гэткай жа бурлівай, як мая ўласная! Мае прыўкрасныя фантазіі і летуценні былі, аднак, перапыненыя падзеннем заслоны. Заля ўстала, тут жа ўсчаўся звычайны ў такіх выпадках гармідар. Спехам развітаўшыся з Толбатам, я з усіх сілаў паспрабаваў як мага шчыльней наблізіцца да мадам Лаланд. Паколькі натоўп не дазволіў мне здзейсніць гэтага намеру, я спыніў пераслед і выправіўся дадому; свой адчай з той нагоды, што мне не ўдалося кранупца і акрайчыка яе сукні, я ўтаймоўваў думкай, што наступнага дня Толбат прадставіць мяне ёй належным чынам.

І ён надышоў, гэты дзень; дню, трэба сказаць, папярэднічала доўгая бяссонная ноч нецярплівасці; але вось развіднела — і пацягнуліся бясконцыя, незлічоныя гадзіны «да першай дня». Але нават Стамбулу, як гаворыцца, аднойчы будзе крэс, быў крэс і гэтаму пакутліваму чаканню. Прабіла

гадзіну. Ледзь аціхла рэха ўдару, як я ўвайшоў у гатэль Б. і папрасіў паклікаць сябра.

— Нямашака, — адказаў служка — лёкай Толбата.

— Ня-ма-ша-ка? — перапытаў я, адступіўшы на колькі крокаў. — Мушу сказаць вам, шаноўны, што гэта абсалютна немагчыма і недапушчальна. Містэра Толбата *не можа* не быць. Што вы маеце на ўвазе?

— Толькі тое, сэр, што містэра Толбата няма ў апартаментах, вось і ўсё. Ён выехаў у С. адразу пасля сняданку і прасіў перадаць, што не вернецца ў горад раней чым праз тыдзень.

Я скамянеў ад жаху і раз'юшанасці. Я намагаўся гаварыць, але мой язык адмаўляўся слухацца. Нарэшце я выйшаў вонкі, збялелы ад гневу, у думках пасылаючы ўсё Толбатава племя ў найжарчэйшыя мясціны Апраметнай. Было відавочна, што мой абавязальны таварыш, гэты *оперны маніяк*, выкінуў з галавы нашую сустрэчу, не паспелі мы прызначыць яе. Зрэшты, ён ніколі не быў чалавекам, які надта трымаецца свайго слова. Але не было рады, утаймоўваючы, як мог, сваё злаванне, я панура сунуўся па вуліцы, завязваючы марныя размовы з кожным стрэчным, спрабуючы выпытаць нешта пра мадам Лаланд. Як я выявіў, ведалі яе ўсе, многія толькі з выгляду — яна гасцявала ў горадзе адно пару тыдняў, і ўсяго некалькі асобаў маглі пахваліцца асабістым знаёмствам з ёю. Гэтыя людзі, аднак, лічылі сваё знаёмства павярхоўным і не маглі — або не хацелі — узяць на сябе місію прадставіць мяне ёй падчас фармальнага ранішняга візіту. Пакуль я, поўны адчаю, гутарыў пра адзіны аб'ект маіх думак з трыма сябрамі, здарылася так, што аб'ект гэты мінаў нашую кампанію.

— У імя ўсяго святога, вось і яна! — ускрыкнуў першы сябар.

— Рэдкая красуня! — заявіў другі.

— Анёл на зямлі! — заключыў трэці.

Я абярнуўся. У дрожках, што паволі набліжаліся да нас па вуліцы, сядзела чароўная здань оперы ў кампаніі маладой дамы, якая тады была з ёй у ложы.

— Яе спадарожніца таксама выглядае даволі няблага, — сказаў той з тройцы, хто пачынаў першым.

— Неверагодна — ніяк не завяне: мастацтва здзяйсняе цуды. Клянуся, яна выглядае лепей, чым пяць гадоў таму ў Парыжы. Усё яшчэ прыгажуня, га, Фруасар, я хацеў сказаць, Сімпсан?

— *Усё яшчэ?* — быў мой адказ. — А чаму не? Але ў параўнанні са сваёй сяброўкай яна як свечка поруч з Мілавіцай, святляк поруч з Антарэсам*.

— Га-га-га, Сімпсан, у вас дзівосны дар рабіць адкрыцці — і вельмі арыгінальныя, я вам скажу.

Мы развіталіся, і адзін з тройцы пачаў напяваць вясёлы вадэвільчык, з якога я ўлавіў адно радкі:

Ninon, Ninon, Ninon à bas —
A bas Ninon De L'Enclos![1]

Падчас гэтай сцэнкі, аднак, здарылася рэч, якая суцешыла мяне, хоць і падагрэла маю ўсёабдымную жарсць. Калі дрожкі мадам Лаланд міналі нашу кампанію, я заўважыў, што яна мяне пазнала і, больш за тое, недвухсэнсоўна дала гэта зразумець, надзяліўшы самай анёльскай з усіх магчымых усмешак.

Што да нашага афіцыйнага знаёмства, я мусіў пакінуць усялякія спадзевы на гэта да моманту, калі Толбату заманецца вярнуцца з правінцыі. Цягнучы час, я спраўна наведваў усе папулярныя месцы свецкіх збораў і ў выніку, у тэатры, дзе я пабачыў яе ўпершыню, я меў шчасце пабачыць яе зноў, яшчэ аднаго разу абмяняўшыся з ёй позіркамі. Здарылася гэта, аднак, праз два тыдні. Усе два тыдні я штодня заходзіў да Толбата ў гатэль і штодня заходзіўся ў прыступе нямой ярасці ад вечнага «яшчэ нямашака» з вуснаў яго лёкая.

Вось жа, у вечар, пра які будзе гаворка, я быў у стане, блізкім да шаленства. Мадам Лаланд, якая, як мне сказалі, была парыжанкай — нядаўна з Парыжу, — магла туды нечакана вярнуцца — да прыезду Толбата, — і тады я страціў бы яе назаўсёды. Думаць пра гэта было невыносна. Вялося пра маё будучае шчасце, і я пастанавіў дзейнічаць як сапраўдны мужчына. Таму пасля заканчэння п'есы я пайшоў за дамай да

[1] Нінон, Нінон, далоў Нінон,
Далоў Нінон Ланкло* (фр.).

яе дому, запомніў адрас і наступнага ранку даслаў ёй падрабязны ліст, у якім разнасцежыў сваю душу.

Я пісаў напорыста, вольна — пісаў жарсна. Я не хаваў нічога — нават сваіх слабасцяў. Я спасылаўся на рамантычныя абставіны нашай першай сустрэчы — у тым ліку на позіркі, якімі мы абмяняліся. Я дайшоў да таго, што выказаў упэўненасць ва ўзаемнасці нашых пачуццяў; гэтая ўпэўненасць, а таксама моц маёй прыхільнасці, паводле маіх словаў, апраўдвалі мае недаравальныя ў іншых абставінах паводзіны. Па-трэцяе, я казаў пра свой страх, што яна пакіне горад да таго, як я атрымаю магчымасць быць ёй прадстаўленым. Я скончыў гэтае самае палкае пасланне з тых, што калі-кольвек выходзілі з-пад пяра пісьменных, шчырым аповедам пра свае грашовыя справы — сваю заможнасць — і прапанаваў ёй руку і сэрца.

Я чакаў адказу ў агоніі прадчуванняў. І праз пэўны час, які падаўся мне стагоддзем, адказ прыйшоў.

Так, ён сапраўды прыйшоў. Як ні рамантычна ўсё гэта гучыць, я сапраўды атрымаў ліст ад мадам Лаланд — прыгожай, багатай небажыхаркі мадам Лаланд. Яе вочы — яе боскія вочы — казалі праўду ад усяго яе высакароднага сэрца. Як сапраўдная француженка, якой яна і была, яна падпарадкавалася шчырым памкненням розуму — высакародным імпульсам сваёй натуры, якія змаглі пурытанскія ўмоўнасці свету. Яна не адрынула маёй прапановы, яна не вярнула майго ліста неадкрытым. Яна нават накрэсліла мне адказ, трымаючы пяро сваімі харошанькімі пальчыкамі. Вось ён:

> Мсьё Сімпсон даруе мяне я не пішу belle мова яго краіна вельмі bien. Я прыехаю не так рано і яшче не меў час bien мова вучыў.
>
> Мсьё Сімпсон прабачайся манёры, я кажу о! Ён bien адгадай усё вельмі праўда. Што тут кажу яшче? О? Я не буду кажу болей.
>
> Eugenie Lalande

Эжэні! Я цалаваў гэтую шляхотную нататку мільёны разоў і, думаю, здзейсніў з ёй безліч іншых дзівацкіх рытуалаў, якіх

цяпер ужо не прыгадаю. А Толбат усё не вяртаўся. О, каб жа ён хоць крыху здагадваўся, як ён катуе сябра сваёй адсутнасцю, ці не кінуўся б ён, добрая душа, аблегчыць мае пакуты? І паколькі ён усё не ехаў, я напісаў яму. Ён адказаў. Яго затрымлівалі неадкладныя справы — але неўзабаве ён мусіў быць. Ён прасіў мяне быць цярплівым: стрымліваць памкненні, чытаць кнігі супакаяльнага зместу, не піць нічога мацнейшага за рэйнскае віно і шукаць паратунку ў філасофіі. Ідыёт! Калі ён не мог прыехаць сам, чаму, у імя найвышэйшага розуму, чаму ён не далучыў да свайго адказу рэкамендацыйны ліст? Я напісаў яму зноў, молячы аб такім лісце. Мой ліст вярнуў той самы лёкай з наступнай зробленай алоўкам прыпіскай. Падонак выпраўляўся ў правінцыю да свайго гаспадара:

> З'ехаўшы з С. учора немавед куды, калі вернецца — не сказаўшы. Таму рашыў вярнуць ліст. Рука нібы вашая, а вы заўсёды нецярплівіце.
>
> Кланяюся,
>
> Стабс

Пасля гэтага лішне казаць, што я ў думках нанізаў гаспадара на пару са служкам чарцям на вілы. Але злаваць не было сэнсу, а нараканні не суцяшалі.

Апошняй маёй надзеяй была мая прыроджаная дзёрзкасць. Дагэтуль яна служыла мне добрую службу, і я вырашыў зноў ужыць яе на сваю карысць. Да таго ж пасля гэткага ліставання што такога непрыстойнага, у рамках дазволенага, я мог здзейсніць, каб мадам Лаланд палічыла гэта недапушчальным? Атрымаўшы ліст, я ўзяў за звычку сачыць за яе домам і такім чынам даведаўся, што шарай гадзінай яна мае завядзёнку выпраўляцца на шпацыр па публічным парку, на які глядзелі яе вокны, у суправаджэнні адно мурына ў ліўрэі. Тут, у раскошным цені дрэваў, у паўзмроку ліпеньскага вечара, я прычакаў момант і наблізіўся да яе.

Каб служка нічога не сцяміў, я зрабіў гэта ўпэўнена, так, нібыта мы старыя знаёмыя. З прысутнасцю духу сапраўднай

парыжанкі яна адразу ўключылася ў гульню і, вітаючы мяне, працягнула чароўную маленькую ручку. Слуга адразу запаволіў хаду; нашыя сэрцы, перапоўненыя каханнем, нарэшце змаглі пачаць бясконцае і шчырае сумоўе.

Паколькі мадам Лаланд гаварыла па-ангельску нават менш спрактыкавана, чым пісала, мы маглі разумецца адно па-французску. На гэтай салодкай мове, такой прыдатнай для мілосных справаў, я з уласцівым мне імпэтам і палкасцю адкрыўся ёй і з усім красамоўствам, на якое быў здольны, пераконваў яе пагадзіцца неадкладна стаць маёй жонкай.

На маю нецярплівасць яна адказала ўсмешкай. Яна завяла старую песню пра «што скажуць людзі» — забабон, які так часта стае на шляху да шчасця, даючы шчасцю сысці назаўжды. Па яе назіраннях, я ўскрай неабачліва даў сваім сябрам зразумець, што прагну нашага знаёмства, — то бок што мы яшчэ не знаёмыя, а значыць, не можам утаіць час, калі гэта адбылося. І потым яна зазначыла, пачырванеўшы, наколькі гэты час непрацяглы. Неадкладны шлюб быў бы памылкай, нагодай для плётак, гэта было б *занадта*. Усё гэта яна прамовіла з чароўнай наіўнасцю, якая прывяла мяне адначасова ў захапленне і адчай, але змусіла пагадзіцца. Яна нават жартам звінаваціла мяне ў паспешлівасці — у непрыстойнасці. Яна нагадала мне, што я нават не ведаў, хто яна, якія перспектывы, сувязі мае, якое становішча займае ў грамадстве. Яна, хоць і насуперак сваім пачуццям, маліла мяне добра абдумаць маю прапанову і назвала маё каханне апантанасцю — фантомам, хвілінным насланнём, хімернай ды эфемернай *крэатурай* хутчэй уяўлення, чым сэрца. Усе гэтыя рэчы яна прамовіла ў мяккіх прыцемках, што ўсё гусцелі вакол нас, а потым адным пяшчотным поціскам сваёй боскай ручкі ў адзін салодкі міг абрынула сцяну аргументаў, якую толькі што збудавала.

Я адказаў як мог, уклаўшы ў адказ усю моц праўдзівага кахання. Я гаварыў доўга і напорыста пра сваю жарсць, сваю апантанасць, пра яе неверагодную красу, пра сваё бязмежнае захапленне. Пры канцы я з пераканаўчай энергіяй згадаў пра падводныя камяні, што атачаюць фарватар кахання — таго

праўдзівага кахання, шлях да якога заўжды цярністы, і таму, падсумаваў я, дзеля ўзаемнай бяспекі не варта намотваць на гэтым шляху збыткоўныя мілі.

Апошні аргумент, здавалася, змякчыў суворасць яе намераў. Яна палагаднела. Але, па яе словах, заставалася яшчэ адна перашкода, якую я належным чынам не ўзяў да ўвагі. Гэта быў далікатны момант — пагатоў для жанчыны; згадваючы пра гэта, яна, як адчувала, мусіла ахвяраваць сваімі пачуццямі; але ж *для мяне* яна была гатовая на любую ахвяру. Яна намякала на пытанне ўзросту. Ці ведаю я — ці дакладна ведаю я розніцу ў нашым веку? Калі ўзрост мужа на некалькі гадоў — нават на пятнаццаць ці дваццаць — перавышае ўзрост жонкі, у свеце гэта лічаць дапушчальным і нават слушным, але яна заўсёды трымалася перакanання, што жонка не павінная пераўзыходзіць мужа гадамі. Такая ненатуральная розніца ў веку, на жаль, часта стаецца запарукай няшчасця ў асабістым жыцці. Цяпер яна ведае, што мне споўнілася дваццаць два, у той жа час я магу не мець уяўлення, наколькі век маёй Эжэні перавышае гэтую лічбу.

Усё гэта было прамоўлена з душэўным высакародствам, з годнай шчырасцю, якая ўсхвалявала, зачаравала мяне, узмацніўшы путы кахання. Я ледзьве стрымліваў памкненні, якія авалодалі мною.

— Душачка мая Эжэні! — ускрыкнуў я. — Ды пра што можа быць гаворка? Вы на некалькі гадоў старэйшая ад мяне. І што з таго? Звычаі свету — дурныя ўмоўнасці. Для тых, хто кахае, як кахаем мы, хіба год неяк розніцца з гадзінаю? Мне споўнілася дваццаць два, гаворыце вы; дапусцім, мне амаль дваццаць тры. Ну а вы, мая дарагая Эжэні, хіба вам можа быць болей за... за... за...

Тут я зрабіў невялічкую паўзу, спадзеючыся, што мадам Лаланд уставіць у маю фразу свой сапраўдны ўзрост. Але француженка ніколі не скажа наўпрост і заўжды, калі ёй задаюць нясціплае пытанне, мае напагатове нейкую адмысловую прыдумку. У нашым выпадку Эжэні, якая перад тым, здавалася, шукала нешта ў ліфе, нарэшце ўраніла ў траву мініяцюру, якую я тут жа падняў і паказаў ёй.

— Вазьміце яе — сказала яна, пасміхаючыся сваёй наймілейшай усмешкай. Гэта падарунак вам ад той, каго яна так прывабна выяўляе. Да таго ж на адваротным баку вы, магчыма, знойдзеце адказ на пытанне, якое вас так хвалюе. Цяпер, як бачыце, даволі цёмна — але вы можаце спакойна разгледзець яго заўтра зранку. А пакуль што праводзьце мяне ў дом. Мае сябры ладзяць музычную *імпрэзку*. У дадатак, абяцаю, вы пачуеце выдатныя спевы. Мы, французы, не такія пурытане, як вы, амерыканцы, і я без цяжкасцяў увяду вас у салон пад відам старога знаёмца.

Сказаўшы гэта, яна абаперлася на маю руку, і я правёў яе ў дом. Сядзіба была вельмі гожай і, думаю, густоўна мэбляванаю. Наконт апошняга мне было цяжка меркаваць, бо мы прыйшлі, калі стала зусім цёмна, а ў найлепшых дамах Амерыкі ў гарачыя летнія вечары часта любяць трымаць шарую гадзінку. Праз пэўны час пасля майго прыходу, вядома ж, у галоўнай гасцёўні запалілі цыліндрычную лямпу, і я мог пабачыць, што гэты пакой быў абстаўлены з надзвычай добрым і нават выдатным густам, але два іншыя пакоі, у якіх збольшага перабывалі госці, заставаліся ўвесь вечар ахутаныя прыемным паўзмрокам. Гэта вельмі прадуманы звычай, які дае запрошаным права выбару паміж святлом і цемрай, і нашыя заморскія сябры зрабілі як найлепей, пераняўшы яго.

Такім чынам я прабавіў, без сумневаў, найпрыўкраснейшы вечар свайго жыцця. Мадам Лаланд не перабольшыла музычныя здольнасці сваіх сяброў; я пачуў спевы, выдатнейшых за якія не чуў нідзе, апроч хіба Вены. Выканаўцаў музыкі было шмат, і талент яны мелі неймаверны. Спявалі збольшага дамы, і кожная прынамсі добра. Нарэшце, калі пачулася патрабавальнае «Мадам Лаланд!», яна хутка паднялася, без какетлівых адмаўленняў, з *шэзлонгу*, на якім сядзела поруч са мной, і ў суправаджэнні аднаго ці двух джэнтльменаў і той самай сяброўкі з оперы рушыла да піяніна ў галоўнай гасцёўні. Я мусіў бы праводзіць яе, але адчуў, што, беручы да ўвагі тое, як я трапіў у дом, мне лепей заставацца ў цені, дзе я і заставаўся. Таму я быў пазбаўлены прыемнасці бачыць спявачку, але мог чуць яе.

Уражанне, якое яна зрабіла на слухачоў, было неверагодна моцным, на мяне ж яе спевы падзейнічалі з яшчэ большай сілай. Я не ведаю, як апісаць гэта належным чынам. Часткова эфект, вядома ж, быў выкліканы каханнем, якое перапаўняла мяне, але галоўным чынам тым, як чулліва спявала Эжэні. Гэта па-за магчымасцямі мастацтва — надаць арыі ці рэчытатыву большай жарснай выразнасці, чым гэта выйшла ў яе. Тое, як яна выканала раманс з «Атэла»*, інтанацыя, з якой яна праспявала «*Sul mio sasso*»[1] з «Капулецi»*, дагэтуль гучыць у маёй памяці. Яе нізкі голас здзяйсняў цуды. Ён ахопліваў тры поўныя актавы, ад канральтавага «рэ» да верхняга «рэ» сапрана і, хоць быў дастаткова моцны, каб напоўніць Сан-Карла*, філігранна даваў рады ўсім вакальным складанасцям — узыходным і сыходным гамам, кадэнцыям і фіярытурам. У фінале «Самнамбулы»* яна вельмі эфектна праспявала:

Ah! non giunge uman pensiero
Al contento ond 'io son piena[2].

Наследуючы Малібран*, яна змяніла арыгінальнае лібрэта Беліні, узяўшы тэнаровае «соль», пасля чаго перакінула «соль» на дзве актавы ўверх.

Устаўшы ад піяніна пасля ўсіх гэтых вышыняў вакальнага майстэрства, яна зноў села поруч са мной; тады я ў самых узнёслых выразах выказаў ёй маю ўзнесенасць, маё захапленне канцэртам. Я не сказаў нічога пра сваё здзіўленне, і ўсё ж я быў вельмі і вельмі здзіўлены: пры звычайнай размове яе голас быў слабаватым і як бы крыху дрыжэў, што не дазваляла мне чакаць ад яе вялікіх вакальных здольнасцяў.

З гэтага моманту пацякла доўгая, шчырая, сур'ёзная і бесперапынная размова. Яна прымусіла мяне закрануць многія эпізоды майго ранняга дзяцінства; слухала яна з глыбачэзнай увагай, не прапускаючы ні слова. Я апавёў усё, адчуваючы,

---

1 Над маім уцёсам (іт.).
2 Ах! Розум чалавека не спасцігне
Радасці, што мяне перапаўняе (іт.).

што гэта мой абавязак — апавесці ўсё, нічога не ўтойваць ад яе давяральнага спачування. Падбадзёраны яе ўласнай шчырасцю што да далікатнага пытання ўзросту, я з вартай пахвалы адкрытасцю спыніўся не толькі на сваіх кепскіх звычках, але пералічыў усе свае маральныя і нават фізічныя недахопы; такія прызнанні патрабуюць вялікай мужнасці, а таму ёсць найлепшым доказам кахання. Я згадаў свае студэнцкія гады — дзівацтвы, гулянкі, даўгі і інтрыжкі. Я зайшоў так далёка, што прызнаўся ў лёгачным кашлі, які пэўны час нязначна турбаваў мяне, у хранічным рэўматызме, у спадчыннай схільнасці да падагры і, нарэшце, у непрыемнай і нязручнай ніцавокасці, якую, тым не менш, дагэтуль мне ўдавалася ад усіх утойваць.

— Што да апошняга, — сказала мадам Лаланд, смеючыся, — вы дарма зрабілі такое прызнанне, бо без яго ніводная душа, клянуся, не западозрыла б вас. Дарэчы, — працягнула яна, — ці памятаеце вы, — і тут яна пачырванела так, што нават змрок пакоя не змог схаваць полымя яе шчок, — ці памятаеце вы, *mon cher ami*[1], пра аптычную прыладу, якая вісіць вось тут, на маёй шыі?

Гаворачы, яна круціла ў пальцах той самы двайны ларнет, які так збянтэжыў мяне ў оперы.

— О, я надта добра яе памятаю! — ускрыкнуў я, жарсна пацiскаючы пяшчотную ручку, якая прапаноўвала мне ларнет. Гэта была складаная і раскошная цацка, багата дэкараваная разьбой, філігранню і каштоўнымі камянямі; нават у слабым асвятленні было бачна, наколькі высокай можа быць іх цана.

— *Eh bien! mon ami*[2], — працягнула яна з некаторай настойлівасцю, якая мяне нават здзівіла. — *Eh bien, mon ami*, вы патрабуеце ад мяне дар, які самі называеце бясцэнным. Вы патрабуеце, каб заўтра я стала вашай жонкай. Калі я пайду насустрач вашым угаворам і, дадам, памкненням маёй душы, ці змагу я атрымаць права на маленькую, зусім маленькую паслугу з вашага боку?

---

[1] Мой мілы (фр.).
[2] Вось жа, мой мілы (фр.).

— Якую паслугу? — усклікнуў я з імпэтам, які амаль прыцягнуў да нас увагу кампаніі, наяўнасць якой толькі і ўстрымала мяне ад намеру кінуцца да яе ног. — Якую паслугу, мая каханая, мая Эжэні? Якую паслугу? Лічыце, яна ўжо выкананая!

— Вы павінны змагчы, *mon ami*, — сказала яна, — дзеля Эжэні, якую вы кахаеце, маленькую слабасць, у якой толькі што прызналіся, слабасць хутчэй маральную, чым фізічную, якая, паверце мне, зусім не спалучаецца з высакароднасцю вашай сапраўднай натуры, не пасуе вашай прыроджанай шчырасці і якая, калі не кантраляваць яе, абавязкова ўцягне вас, раней ці пазней, у якую-небудзь вельмі непрыемную сітуацыю. Вы павінны змагчы дзеля мяне прыхамаць, якая, як вы самі гаворыце, прымушае вас хаваць недахоп зроку. Бо вы хаваеце гэты недахоп, адмаўляючыся карыстацца сродкам, які яго прыбірае. Думаю, вы зразумелі: я хачу, каб вы насілі акуляры — ц-с-с-! — вы ўжо паабяцалі насіць іх, *дзеля мяне*. Вазьміце гэтую штучку з маіх рук, яна паляпшае зрок, у астатнім яе каштоўнасць невялікая. Бачыце, яе лёгка скласці так і так, можна насіць на носе як акуляры або ў кішэні камізэлькі як ларнет. Аднак вы ўжо паабяцалі мне насіць яе ў першай якасці, *дзеля мяне*.

Такая просьба — ці трэба казаць? — нямала мяне збянтэжыла. Але ўмова, з якой яна была спалучаная, не дапускала ніякіх ваганняў.

— Згода! — закрычаў я з усёй палкасцю, на якую быў здольны ў той момант. — Згода! Я з радасцю пагаджаюся! Дзеля вас я ахвярую ўсім. Сёння я буду насіць гэты ларнет як ларнет, каля сэрца, але заўтра, як толькі ўзыдзе сонца дня, у які я буду мець шчасце назваць вас сваёй жонкай, я надзену яго на... на нос і буду насіць не здымаючы, у менш рамантычным і модным, але больш зручным выглядзе, які вам даспадобы.

Пасля гэтага мы пачалі абмяркоўваць дэталі нашага заўтрашняга прадпрыемства. Толбат, як я даведаўся ад нарачонай, толькі што вярнуўся ў горад. Я мусіў неадкладна знайсці яго і арандаваць фурманку. Вечарына мела скончыцца не раней за другую ночы; у гэты час фурманка павінная была ста-

яць каля дзвярэй; тады ў развітальнай мітусні мадам Лаланд зможа незаўважна ў яе сесці. Мы тут жа заедзем да святара, што ўжо будзе чакаць нас; ажаніўшыся, мы развітаемся з Толбатам і выправімся ў падарожжа на Усход, пакінуўшы свецкім салонам горада каментаваць наш учынак як ім заманецца.

Склаўшы такі план, я неадкладна развітаўся і выправіўся шукаць Толбата, але па дарозе не змог утрымацца ад спакусы зайсці ў першы-лепшы гатэль, каб разгледзець мініяцюру, што і здзейсніў з карыснай дапамогай акуляраў. Выява была казачна прыгожай! Гэтыя вялікія зіхоткія вочы! Гэты горды грэцкі нос! Гэтыя цёмныя раскошныя валасы! «Ах! — сказаў я сабе, — які дакладны *візэрунак* маёй каханай!» Я перавярнуў партрэт і знайшоў надпіс: «Эжэні Лаланд у веку дваццаці сямі гадоў і сямі месяцаў».

Я знайшоў Толбата дома і тут жа апавёў яму пра сваё шчасце. Ён, зразумела, быў агаломшаны, але як найпрыязней павіншаваў мяне і прапанаваў любую дапамогу, якая ў яго сілах. Карацей, мы ажыццявілі наш план: а другой ночы, праз дзесяць хвілінаў пасля вянчання, я сядзеў у закрытай фурманцы поруч з мадам Лаланд — я хацеў сказаць, місіс Сімпсан, і коні неслі нас з горада на паўночны захад.

Толбат вызначыў, што ехаць нам трэба ўсю ноч, і таму першы прыпынак варта зрабіць у К., вёсцы за дваццаць міляў ад горада, дзе мы зможам паснедаць і адпачыць перад тым як працягваць вандроўку. Такім чынам, роўна а чацвертай ранку фурманка падляцела да дзвярэй галоўнай карчмы. Я падаў руку маёй ненагляднай жонцы і тут жа замовіў сняданак. Пакуль ён гатаваўся, нас правялі ў маленькую гасцёўню, і мы селі.

Ужо амаль развіднела, хоць не да канца. Захоплена гледзячы на анёла поруч са мной, я раптам падумаў, што гэта першая магчымасць з моманту знаёмства са знакамітай прыгажуняй мадам Лаланд сузіраць гэтую прыгажуню зблізу і ў дзённым святле.

— А цяпер, *mon ami*, — сказала яна, узяўшы мяне за руку і перапыняючы ланцуг маіх роздумаў, — а цяпер, *mon cher ami*, калі мы адно цэлае, калі я адгукнулася на вашу жарсць і выканала сваю частку пагаднення — я спадзяюся, вы не забыліся,

што вінны мне маленькую паслугу, — за вамі адно абяцаннейка. Ах! Дайце згадаю, як там было? Так, я добра памятаю дакладныя словы абяцання, якое вы далі ўчора сваёй Эжэні. Слухайце! Вы сказалі: «Згода! Я з радасцю пагаджаюся! Дзеля вас я ахвярую ўсім. Сёння я буду насіць гэты ларнет як ларнет, каля сэрца, але заўтра, як толькі ўзыдзе сонца дня, у які я буду мець шчасце назваць вас сваёй жонкай, я надзену яго на... на нос і буду насіць не здымаючы, у менш рамантычным і модным, але больш зручным выглядзе, які вам даспадобы». Гэта адзін у адзін вашыя словы, мой мілы муж, ці не так?

— Гэта так! — адказаў я. — У вас выдатная памяць, і магу вас упэўніць, мая прыўкрасная Эжэні, з майго боку няма намеру ўхіляцца ад выканання таго, што вы працытавалі. Глядзіце. Вось! Яны мне нават да твару, ці не так?

Кажучы гэта, я надаў ларнету форму акуляраў і асцярожна прыладзіў на адпаведнае месца. У гэты момант місіс Сімпсан, паправіўшы капялюшык і склаўшы рукі на грудзях, выпрасталася на стуле ў нейкай нацягнутай, неграцыёзнай і нават непрыемнай позе.

— Божа мілы шчыры!!! — закрычаў я амаль у той жа момант, калі дужка акуляраў кранулася майго ўзносся. — Божа мой! Ды *што* з гэтымі акулярамі? — Тут жа сарваўшы іх з носа, я працёр іх ядвабнай хусткай і надзеў зноў.

Але калі ў першы момант я адчуў нешта, што можна назваць здзіўленнем, у другі здзіўленне перарасло ў шок; шок быў надзвычайны, шок быў жудасны, я нават магу сказаць, я быў у жаху. Што, дзеля ўсяго агіднага, гэта значыла? Як я мог паверыць сваім вачам? *Як?* — вось у чым пытанне. Гэта што... гэта што... *румяны*? А гэта — гэта зморшчкі на твары Эжэні Лаланд? О Юпітэр і ўвесь пантэон багоў і бажкоў! Што... што... што сталася з зубамі? Я з сілай шпурнуў акуляры аб падлогу, ускочыў на ногі, устаў пасярод пакоя насупраць місіс Сімпсан, упёршы рукі ў бокі, ашчэраны, з пенай на вуснах, нямы і бездапаможны ад жаху і ятры.

Як я ўжо казаў, мадам Эжэні Лаланд — я маю на ўвазе, Сімпсан — гаварыла па-ангельску не нашмат лепей, чым пісала, і з гэтай прычыны зазвычай не карысталася на-

шай моваю. Але лютасць можа кінуць жанчыну ў любыя скрайнасці; у дадзеным выпадку яна кінула місіс Сімпсан у вельмі экзатычную скрайнасць распачаць маналог на мове, якой яна амаль не разумела.

— Б'ен, мсьё, — сказала яна пасля паўзы, дэманструючы скрайняе здзіўленне. — Б'ен, мсьё — што ц'япер? Што ёсь такой? 'Эта з вамі такой танесь дэ сэнт Віт? Калі вы не кахай мяне, зачшэм купляй свінь у мяшок?

— Ведзьма! — закрычаў я, хапаючы ротам паветра. — Ах ты, гнюсная старая падла!

— Падл*а*? Стар*а*я? Не вельм*і* вам стар*а*я, трэба сказаць! Няшмат дні бал*е*й за восемдзесят дув*а*!

— Восемдзесят два! — выгукнуў я, адсоўваючыся да сцяны. — Восемдзесят дзве тысячы бабуінаў! На мініяцюры напісана дваццаць сем гадоў і сем месяцаў!

— Ус'ё ёсь рэзон! Слюшн*а*! Але партрэт малявай ран*а* п'яйсят п'яць гадоў. Калі я жаню за мой другі муш мсьё Лаланд, тады партрэт малявай для мая дош ад першы муш мсьё Муасар.

— Муасар! — сказаў я.

— Так, Муасаррр, — сказала яна, — перадражніваючы мой пранонс, які, трэба сказаць, быў не на вышыні. — І што ц'япер? Што вы ведай пра Муасар?

— Нічога, старое ты пудзіла! Нічога я не ведай, толькі тое, што меў далёкага продка з гэткім прозвішчам.

— 'Этк*і* празв*і*шч! І што н'е ёсь так з 'этк*і*м празв*і*шч? Вельм*і* б'ен празв*і*шч, як і Вуасар — таксам вельм*і* б'ен празв*і*шч! Мая дош, мадэмуазэль Муасар, ёсь Вуасар — бо жаній мсьё Вуасар, і 'эта таксама вельм*і* рэспектабль празв*і*шч!

— Муасар? — ускрыкнуў я. — І Вуасар? Гэта вы пра што?

— Як пра што? Пра Муасар, і Вуасар, і калі ўжо мы аб тым казай, Круасар і Фруасар. Дош маёй дош, мадэмуазэль Вуасар, яна жаній мсьё Круасар, а ўнушк маёй дош, мадэмуазэль Круасар, у свой чарга жаній мсьё Фруасар, вы будзеш казай 'эта н'е рэспектабль празв*і*шч?

— Фруасар! — сказаў я ў амаль запамарочным стане. — Вы кажаце, Муасар, Вуасар, Круасар і Фруасар?

— Так, — сказала яна, абапершыся на спінку крэсла і свабодна выцягнуўшы ніжнія канцавіны. — Так, Муасар, і Вуасар, і Круасар, і Фруасар. Але мсьё Фруасар, ён быў вельм*і* вялік, як у вас казай, дур*а*нь, вельм*і* вялік асёль, проста як вы, бо з'ехай з *la belle France* у эты глюп *Amérique*, і калі ён прыехай с'юды, ён зрабій вельм*і* глюп, вельм*і*, вельм*і* глюп сын, так я чуй, але яшэ не май плезір сустракай яго, і мая амі, Стэфані Лаланд, таксама не май плезір. Яго празв*і*шч Напалеон Банапарт Фруасар, вы што сказай, 'эта таксама не рэспектабль празв*і*шч?

Ці то працягласць яе прамовы, ці то яе эмацыйнасць увяла місіс Сімпсан у стан надзвычайнага афекту; з цяжкасцю скончыўшы, яна, нібы апантаная, падхапілася з крэсла, абрынуўшы разам з сабой на падлогу вялізнае кубло крыналіну. Скрыгочучы ўстаўнымі сківіцамі, яна размахвала рукамі, закасаўшы рукавы, трэсла кулаком перад маім тварам і скончыла спектакль, садраўшы з галавы капялюшык, а разам з ім — вялізны каштоўны парык з раскошных чорных валасоў. Усё гэта яна з енкам ляснула аб падлогу і пачала таптаць, а потым усчала на парыку энергічнае фанданга ў шалёным прыступе раз'ятранасці і экзальтацыі.

Я між тым у жаху апусціўся на вызваленае ёй крэсла. «Муасар і Вуасар!» — паўтараў я ў задуменні, пакуль яна рабіла адно са сваіх па, і «Круасар і Фруасар!» — пакуль яна рабіла другое.

— Муасар, і Вуасар, і Круасар, і Напалеон Банапарт Фруасар! Ты, гнюсная старая змяюка, гэта *я*, гэта *я* — чула? Гэта *я*! — закрычаў я, даючы пеўня. — Гэта *я-я-я-я*! *Я* Напалеон Банапарт Фруасар! І я толькі што ажаніўся з уласнай прапрабабкай, каб мяне вечна перуном секла!

Мадам Эжэні Лаланд, *ілжэ*-Сімпсан, былая Муасар, і сапраўды была маёй прапрабабкай. У маладосці яна была прыгажуняй і нават у восемдзесят два захавала велічнасць паставы, разную форму галавы, чароўныя вочы і грэцкі нос юнай паненкі. З дапамогай жамчужнай пудры, румянаў, накладных валасоў, устаўных зубоў і крыналіну, а таксама дзякуючы самым здатным парыжскім мадысткам, яна ўмудралася захоўваць свой пачэсны пасад між *не першай свежасці* красуняў французскай сталіцы. У гэтым яе і насамрэч з

поўным правам можна было параўнаць са слаўнавядомай Нінон дэ Ланкло.

Яна была неверагодна багатай і, застаўшыся другі раз удавой пасля бяздзетнага шлюбу, прыгадала, што ў Амерыцы ў яе ёсць я, і з мэтай адпісаць мне ўсё сваё майно выправілася ў ЗША разам з далёкай і неверагодна мілай сваячкай свайго другога мужа — мадам Стэфані Лаланд.

У оперы ўвагу маёй прапрабабкі прыцягнулі мае паводзіны, і, сузіраючы мяне ў ларнет, яна была ўражаная нашым з ёй фамільным падабенствам. Зацікаўленая гэтым і да таго ж ведаючы, што спадкаемца ў дадзены час знаходзіцца ў горадзе, яна распытала свайго спадарожніка на мой конт. Джэнтльмен, які яе суправаджаў, ведаў мяне і сказаў, хто я такі. Атрымаўшы пацверджанне нашага сваяцтва, яна ўзнавіла свой агляд — агляд, што падбадзёрыў мяне на жывапісаныя мной раней бязглуздыя паводзіны. Яна вярнула мне паклон, падумаўшы, што я выпадковым чынам дазнаўся, кім яна мне даводзіцца. Калі, падмануты сваім слабым зрокам і моднымі штукамі што да веку і чараў незнаёмкі, я з такім энтузіязмам пацікавіўся ў Толбата, хто яна такая, ён вырашыў, што я маю на ўвазе маладую красуню, і, адпаведна, сказаў мне чысцюткую праўду, маўляў, гэта «знакамітая ўдава мадам Лаланд».

Наступным ранкам на вуліцы мая прапрабабка сустрэла Толбата, свайго даўняга знаёмага па Парыжы; натуральным чынам размова перайшла на маю асобу. Ёй апавялі пра мой кепскі зрок, бо гэты мой недахоп быў відавочны ўсім, хоць я пра гэта зусім не здагадваўся. І мая добрая старая сваячка з расчараваннем сцяміла, што памылялася, мяркуючы, нібы я пазнаў яе. І што я проста выглядаў дурнем, публічна захапляючыся ў тэатры незнаёмай бабцяй. Каб пакараць мяне за такую непрыстойнасць, яна ўступіла ў змову з Толбатам. Ён наўмысна пазбягаў мяне, каб я не мог пазнаёміцца з прабабкай. Мае вулічныя роспыты пра «мілую ўдаву мадам Лаланд» усе, зразумела, адносілі на адрас маладой дамы, і такім чынам можна было лёгка патлумачыць размову з трыма джэнтльменамі, якіх я сустрэў неўзабаве пасля візіту ў гатэль Толбата, як і іх намёкі на Нінон дэ Ланкло. Я не меў

магчымасці разгледзець мадам Лаланд зблізу пры дзённым святле, а на яе музычнай *імпрэзе* мая дурная адмова скарыстацца ларнетам надзейна адсунула мяне яшчэ далей ад адкрыцця яе сапраўднага веку. Калі «мадам Лаланд» запрасілі спяваць, гэта датычыла маладзейшай дамы; і гэта яна ўзнялася на запрашэнне; мая прапрабабка, каб не выкрываць маёй аблуды, таксама ўзнялася і суправадзіла сваячку да піяніна ў вялікай гасцёўні. Калі б я вырашыў пайсці за ёй, яна б пераканала мяне заставацца там, дзе я быў; але праз мае намеры датрымлівацца рамак прыстойнасці гэтага не спатрэбілася. Канцэрт, які я так упадабаў і які пацвердзіў юнасць маёй каралевы, выканала мадам Стэфані Лаланд. Ларнет старая падарыла мне, каб узмацніць эфект розыгрышу, у якасці іскрынкі анекдота. Гэты падарунак паслужыў нагодай для сапраўды дзейснага для мяне ўроку аб шкодзе прытворства. Ну і лішне казаць, што свае старэчыя лінзы мадам Лаланд замяніла на дзве іншыя, больш прыдатныя для маіх вачэй. Яны і сапраўды карэктавалі мой зрок як найлепей.

Святар, які быў злучыў нас фатальнымі вузамі, выявіўся зусім не святаром, а добрым таварышам Толбата. Ён жа граў ролю фурмана: замяніўшы рызу на шэры плашч, ён спрытна кіраваў дрожкамі, якія звезлі «шчаслівую пару» з горада. Толбат сядзеў поруч з ім. Такім чынам, прайдзісветы бачылі развязку і пацяшаліся, сочачы ў прачыненае акно задняга пакоя таверны за фіналам драмы. Думаю, мне давядзецца выклікаць абодвух на дуэль.

Нягледзячы на тое, што я, да маёй вялікай палёгкі, не пабраўся з уласнай прапрабабкай, я ўсё-ткі пабраўся з мадам Лаланд — мадам Стэфані Лаланд, з якой мяне клапатліва звяла мая старая сваячка, зрабіўшы мяне да таго ж спадкаемцам усяго свайго майна, калі яна памрэ, — у сэнсе, калі яна *ўвогуле* калі-небудзь памрэ. І нарэшце: я назаўжды зарокся пісаць мілосныя лісты і, куды б ні йшоў, нашу на носе АКУЛЯРЫ.

*Пераклала Марыя Мартысевіч*

# Анёл Надзвычайнасцяў

*Экстраваганца*

Быў халодны лістападаўскі вечар. Я толькі што скончыў зусім не сціплы абед, у якім не апошняе месца займалі цяжкія для страўніка *truffe*[1], і цяпер сядзеў адзін у сталовай, закінуўшы ногі на камінныя краты і паклаўшы локці на маленькі столік, які я падкаціў да полымя і на які паставіў, не пры вас кажучы, дэсерт і некалькі бутэлек віна, лікёраў і некаторых іншых напояў. З раніцы я чытаў «Леаніда» Гловера*, «Эпіганіяду» Ўілкі*, «Паломніцтва» Ламарціна*, «Калумбіяду» Барлаў*, «Сіцылію» Такермана* і «Дзівоты» Грысвалда* і цяпер, шчыра кажучы, пачуваўся крышку дурнем. Спрабуючы прыйсці ў сябе, я не раз прыкладаўся да лафіту, але пацярпеў паразу і ў адчаі схапіўся за выпадковую газету. Уважліва прачытаўшы калонку «ПРАДАЕЦЦА ДОМ», калонку «ЗГУБІЎСЯ САБАКА» і дзве калонкі пра збеглых жонак і служак, я смела рушыў на перадавіцу, прачытаў яе з пачатку да канца, не зразумеў ніводнага слова і, палічыўшы цалкам мажлівым тое, што яна напісаная па-кітайску, перачытаў з канца да пачатку, але з тым самым сумным вынікам. Я ўжо хацеў з агідай выкінуць

Той чатырохстаронкавы талмуд,
Які не крытыкуе і паэт*, —

калі маю ўвагу забраў наступны абзац:

«Шматлікія і нечаканыя дарогі, што вядуць да смерці. Лонданская газета паведамляе пра смерць у надзвычайных абставінах. Чалавек бавіў час гульнёй «Смяротная зацяжка», у якой неабходна, глыбока ўдыхнуўшы паветра, выдзьмуць доўгую іголку, замацаваную ў бляшанай трубцы, і трапіць у мішэнь. Ён змясціў іголку не тым канцом і, набіраючы паве-

[1] Труфелі (фр.).

тра, каб дзьмухнуць памацней і стрэліць ёю, уцягнуў іголку сабе ў горла. Яна ўвайшла ў лёгкія, і праз некалькі дзён ён сканаў».

Прачытаўшы гэта, я немаведама чаму раззлаваўся. «Гэты артыкул, — усклікнуў я, — паскудная мана, бессаромная ліпа, бязглуздая чмутня нейкага нікчэмнага пісакі, які нават для Эдэму сфабрыкуе катастрофу-другую. Такія людзі, ведаючы пра надзвычайную легкавернасць эпохі, скіравалі ўсю сваю дасціпнасць на выдумлянне неймаверных выпадкаў і надзвычайных, як яны кажуць, здарэнняў. Але розуму, схільнаму да аналізу (як мой, дадаў я ў дужках, па звычцы глыбакадумна наморшчыўшы лоб), да сузірання, на якое я здольны як ніхто, адразу зразумела: чароўнае памнажэнне гэтых «надзвычайных здарэнняў» і ёсць самым надзвычайным. Я, са свайго боку, надалей не збіраюся верыць таму, што нясе адзнаку выключнага».

— Майн Гот, ну ты і турань! — адказаў адзін з самых дзіўных галасоў, якія мне даводзілася чуць. Спачатку я палічыў, што ў мяне звініць увушшу: так здараецца, калі вып'еш крыху зашмат, — але добра падумаўшы, я зразумеў, што такія гукі хутчэй можна пачуць, б'ючы палкай па пустой бочцы; на гэтым бы я і спыніўся, калі б гукі не складаліся ў словы. Я па прыродзе не нервовы, да таго ж некалькі келіхаў лафіту дадалі мне смеласці, таму я не адчуў ніякага хвалявання, спакойна падняў вочы і агледзеў пакой у пошуках няпрошанага госця. Аднак зусім нікога не знайшоў.

— Так-та-ак! — працягнуў голас, пакуль я аглядаў пакой. — Фы налісаліся як швіня, калі не заўфашылі мяне, а я сусім тут.

Тут я здагадаўся паглядзець проста перад носам: і сапраўды, насупраць мяне за сталом сядзела істота, якая не паддавалася класіфікацыі, хаця апісанню — цалкам. Яе тулавам была бочка ці то для віна, ці то для рому, ці нешта такога кшталту, і выглядала гэтае тулава сапраўды фальстафаўскім. Знізу былі прымацаваныя два кадоўбчыкі, якія мусілі замяняць ногі. Замест рук віселі рыльцамі ўніз дзве даволі доўгія бутэлькі. Галава пачвары была рыхтык гесенская пляшка і нагадвала табакерку з дзіркай пасярэдзіне вечка. Гэтая пляш-

ка з лейкай, ссунутай набакір, нібы кавалерыйская фуражка, глядзела дзіркай на мяне; праз гэтую дзірку, якая, здавалася, моршчылася, як рот педантычнай старой дзевы, істота шыпела і хрыпела, лічачы, відавочна, гэтыя няўцямныя гукі зразумелымі словамі.

— Я башу, — сказаў ён, — што фы напіліся як швіня, бо сеціце там і не башыце, што я сяшу тут, і я башу, што фы дурны, як фарона, таму што не ферыце натрукаванаму ў труку. Гэта прафда — кошнае слофа прафда.

— Ды хто вы, дальбог? — з годнасцю, хаця і крыху разгублена, прамовіў я. — Як вы сюды трапілі? Пра што вы ўвогуле?

— Як я трапіў сюты, — адказала фігура, — не фашая спрафа, хафару я ўфогуле пра тое, пра што ўфогуле хачу хафарыць, а хто я такі, тык я прыйшоў, каб фы самі гэта пабачылі.

— Вы п'яны бадзяга, — сказаў я. — Я зараз пазваню і загадаю лёкаю выкінуць вас на вуліцу.

— Хе-хе-хе! — засмяяўся госць. — Ухіхі! Фы не зробіце гэтага.

— Не зраблю? — абурыўся я. — Што вы маеце на ўвазе? Чаго не зраблю?

— Не пасфоніце, — адказаў ён, спрабуючы пасміхнуцца сваім гнюсным ротам.

Пасля гэтых словаў я паспрабаваў падняцца, каб спраўдзіць сваю пагрозу, але нягоднік без спеху перагнуўся праз стол і ўдарыў мяне па ілбе рыльцам адной з бутэлек так, што я паваліўся назад у фатэль, з якога ўжо напалову падняўся. Я быў вельмі здзіўлены і на момант разгубіўся. Тым часам ён працягваў.

— Фось башыце, — сказаў ён. — Лепш сяціце ціха. А цяпер я фам скажу, хто я! Гляціце! Слухайце! Я — Анёл Натсфычайнасцяў!

— І надзвычайны, дальбог, — рызыкнуў я ўставіць. — Я заўсёды думаў, што ў анёлаў ёсць крылы.

— Крылы! — раззлавана ўскрыкнуў ён. — Што мне рабіць з крыламі? Майн Гот! Я фам што, курыца?

— Не-не! — адказаў я, спалохаўшыся. — Якая ж вы курыца! Безумоўна, не!

— Тады сяці ціха і пафоць сябе тобра, а то зноў кулака паспытаеш. У курыца ёсць крылы, і ў сафа ёсць крылы, і ў чарцяня ёсць крылы, і ў Фэльзефул ёсць крылы. Анёл не мае крылы, а я — Анёл Натсфычайнасцяў.

— І вашая справа да мяне...

— Мая спрафа! — выкрыкнула пачвара. — Ты няфыхафаны шчанюк, калі пытаешся ў тшэнтльмэна і анёла пра яго спрафу!

Такой манеры гаварыць я не мог вытрываць нават ад анёла і таму, сабраўшы ўсю сваю мужнасць, схапіў сальнічку, якая стаяла пад рукой, і кінуў яе ў галаву нязванаму госцю. Аднак ці то ён адхіліўся, ці то я не пацэліў, але я здолеў толькі разбіць шкло гадзінніка на каміннай паліцы. Што да анёла, то ён, як і раней, выказаў сваё стаўленне да майго ўчынку трыма паслядоўнымі ўдарамі па ілбе. Гэта змусіла мяне падпарадкавацца, і, сорамна сказаць, ці то ад болю, ці то ад прыкрасці ў мяне выступілі на вачах слёзы.

— Майн Гот! — прамовіў Анёл Надзвычайнасцяў, якога відавочна змякчыла сузіранне маіх пакутаў. — Майн Гот, гэты шалавек ці фельмі п'яны, ці фельмі засмушоны. Не трэба піць такое моснае фіно, трэба распафляць. Фыпі гэтага, пуць харошы хлопшык і не плаш, ну не плаш!

Тут Анёл Надзвычайнасцяў даліў у мой келіх (які быў на траціну поўны партвейнам) бясколернай вадкасці з адной са сваіх бутэлек. Я заўважыў на гэтых бутэльках налепкі вакол рыльцаў. Там было напісана *Kirschenwasser*[1].

Тактоўнасць і дабрыня Анёла ў немалой ступені супакоіла мяне, а вадкасць, якою ён неаднойчы разбавіў мой партвейн, прывяла мяне ў настрой слухаць яго надзвычайны маналог. Я нават не спрабую пераказаць усё тое, што ён мне гаварыў, але з ягоных словаў я зразумеў, што ён геній, якому падлеглыя ўсе непрыемнасці, што здараюцца з чалавекам, і які арганізуе надзвычайныя здарэнні, што пастаянна здзіўляюць скептыкаў. Раз ці два, калі я спрабаваў выказаць недавер адносна ягоных заяваў, ён вельмі злаваўся, таму я вырашыў, што найму-

[1] Вішнёвая настойка (ням.).

дрэйшай стратэгіяй будзе маўчаць і дазваляць яму казаць што заманецца. Пакуль ён раздабарваў, я з прымружанымі вачыма сядзеў, адкінуўшыся на спінку фатэля, і забаўляўся тым, што жаваў вінаград і раскідваў костачкі па ўсім пакоі. Аднак Анёл хутка палічыў мае паводзіны зняважлівымі. Ён падняўся, страшэнна разгневаны, насунуў сваю лейку на самыя вочы, шматслоўна вылаяўся, выгукнуўшы пагрозу, сэнсу якой я так і не зразумеў, урэшце нізка пакланіўся мне і знік, мовай арцыбіскупа з «Жыля Блаза»* пажадаўшы *beaucoup de bonheur et un peu plus de bon sens*[1].

Ягоны сыход прынёс мне палёгку. Некалькі шклянак лафіту навявалі сон, і мне захацелася пятнаццаць-дваццаць хвілінак падрамаць, як і звычайна пасля абеду. А шостай у мяне была важная сустрэча, прапускаць якую вельмі не хацелася. Тэрмін страхоўкі майго дому скончыўся дзень таму, узніклі некаторыя непаразуменні, і я дамовіўся з кіраўніцтвам страхавой кампаніі пра сустрэчу а шостай, дзе мы маглі абмеркаваць пытанне яе працягу. Зірнуўшы на гадзіннік, што стаяў на каміне (я быў такі снулы, што не мог дастаць кішэнны), я ўзрадаваўся, што ў мяне яшчэ дваццаць пяць вольных хвілінаў, а мая сіеста ніколі не доўжылася больш за дваццаць. Таму я цалкам супакоіўся і аддаўся сну.

Неймаверна задаволены сном, я зноў зірнуў на гадзіннік — і амаль паверыў у магчымасць надзвычайных здарэнняў, пабачыўшы, што замест звычайных пятнаццаці-дваццаці хвілінаў я праспаў усяго тры: гадзіннік паказваў без дваццаці сямі шэсць. Я зноў заснуў, потым прачнуўся і вельмі здзівіўся, зразумеўшы, што ў мяне *па-ранейшаму* засталося дваццаць сем хвілінаў. Я ўскочыў праверыць гадзіннік і выявіў, што ён не працуе. Мой кішэнны гадзіннік паказваў палову восьмай; праспаўшы дзве гадзіны, я, безумоўна, спазніўся на сустрэчу.

«Ну і што, — падумаў я, — зайду туды зранку і выбачуся. Але што здарылася з гадзіннікам?» Пасля праверкі выявілася, што адна з костачак вінаграду, якія я раскідваў па пакоі падчас маналога Анёла Надзвычайнасцяў, пераляцела

[1] Усялякага шчасця і крыху болей здаровага сэнсу (фр.).

цераз разбітае шкло і выпадкова засела ў шчыліне для заводу, спыніўшы рух хвіліннай стрэлкі.

— О, — прамовіў я, — цяпер я разумею. Усё відавочна. Такое *бывае*.

Я больш не думаў пра гэты выпадак і пайшоў спаць у звычайны час. Паставіўшы свечку на пюпітр у галавах ложка, я паспрабаваў засяродзіцца на «Усюдыіснасці Бога»*, аднак, на вялікі жаль, менш чым за дваццаць секундаў заснуў, пакінуўшы святло гарэць.

Маім снам жахліва перашкаджаў Анёл Надзвычайнасцяў. Мне здавалася, што ён стаіць ля ложка, рассоўвае занавескі і найагіднейшым замагільным голасам бочкі для рому пагражае мне самай страшнай помстай за маё кепскае да яго стаўленне. Пасля доўгага рассусольвання ён зняў лейку, засунуў яе мне ў горла і так паіў мяне цэлым акіянам *Kirschenwasser*, які ліўся бясконцым струмянём з бутэлькі з доўгім рыльцам, што замяняла яму руку. Урэшце мая агонія стала невыноснай, і я прачнуўся акурат у час, каб заўважыць, што пацук сцягнуў запаленую свечку, але запозна, каб перашкодзіць яму збегчы са сваёй здабычай у дзірку. Вельмі хутка мой нос адчуў задушлівы пах, і я зразумеў, што дом гарыць. Праз некалькі хвілінаў полымя ўжо распаўсюджвалася са страшэннай сілай, і хутка ўвесь будынак быў ахоплены агнём. Усе выхады з майго пакоя, акрамя акна, былі адрэзаныя. Аднак неўзабаве сабраўся натоўп, і мне прынеслі доўгую лесвіцу. Спускаючыся па ёй, я ўжо быў паверыў у сваё выратаванне, калі вялізная свіння, чыё круглае пуза, і пыса, і ўвесь выгляд чымсьці нагадалі мне Анёла Надзвычайнасцяў, — свіння, якая да гэтага спакойна спала ў брудзе, раптам вырашыла, што трэба пачухаць левы бок, і не знайшла для гэтага нічога лепшага за маю лесвіцу. Праз імгненне я грымнуўся і, на сваё няшчасце, зламаў руку.

Гэты выпадак, разам са стратай страхоўкі і стратай больш сур'ёзнай — валасоў, якія гарам згарэлі ў полымі, настроіў мяне на сур'ёзны лад, і я вырашыў ажаніцца. Побач жыла адна багатая ўдава, якая пахавала сёмага мужа, і яе параненаму сэрцу я прапанаваў бальзам шлюбнай клятвы. Яна сарамліва

паддалася маім благанням. Удзячны і захоплены, я ўкленчыў ля яе ног з пачуццём падзякі і захаплення. Яна пачырванела, і яе шыкоўныя валасы спляліся з маімі, часова пазычанымі ў Гранжана. Я так і не зразумеў, як здарыўся гэты канфуз. Я падняўся без парыка, свецячы лысінай, а ахопленую гневам і пагардай удаву напалову схавалі чужыя валасы. Так непрадказальны выпадак, які, аднак, быў вынікам цалкам звычайнага збегу абставінаў, загубіў мае надзеі на ўдаву.

Але я не паддаўся адчаю і пачаў аблогу менш непахіснага сэрца. Мне зноў некаторы час шанцавала, але потым чарговым разам умяшаўся звычайны выпадак. Сустрэўшы сваю каханую сярод гарадской *élite*[1], я паспяшаўся павітацца з ёю сваім найлепшым паклонам, калі нейкае чужароднае цела трапіла мне ў вока, на момант цалкам асляпіўшы мяне. Калі да мяне вярнуўся зрок, я ўбачыў, што дама майго сэрца знікла, неймаверна абражаная наўмыснай, як ёй падалося, грубасцю з майго боку, якая выявілася ў тым, што я прайшоў міма не павітаўшыся. Пакуль я стаяў, здзіўлены неспадзяванкай (якая, аднак, магла здарыцца з любым чалавекам), нічога не бачачы, са мной павітаўся Анёл Надзвычайнасцяў, які прапанаваў мне дапамогу з ветлівасцю, на якую я не разлічваў. Ён умела і акуратна агледзеў маё вока і сказаў, што там нейкая драбяза і (чым бы яна ні была) дастаў яе, і мне стала лепей.

Я вырашыў, што час мне памерці, бо лёс апантана праследаваў мяне, і пайшоў да найбліжэйшай рэчкі. Там, раздзеўшыся (а чаму мы не можам памерці ў чым маці нарадзіла?), я кінуўся ў ваду. Адзінай сведкай майго ўчынку была самотная варона, якая акурат дзяўбла прапітанае брэндзі зерне, адстаўшы ад сваіх сяброўак. Як толькі я апынуўся ў вадзе, птушцы раптам заманулася зляцець, прыхапіўшы самую неабходную дэталь майго гардэробу. Адклаўшы на некаторы час самагубства, я засунуў ногі ў рукавы паліто і пабег даганяць злачынку са спрытам, якога вымагала сітуацыя і наколькі дазвалялі абставіны. Але кон не пакідаў мяне. У той

[1] Эліта (фр.).

час, калі я бег як ветрам гнаны, утаропіўшыся ў неба і спрабуючы ўгледзець выкрадальніцу сваёй маёмасці, я раптам адчуў, што ногі больш не кранаюцца *terra firma*[1]. Аказваецца, я паляцеў з абрыву і непазбежна разбіўся б, калі б, на шчасце, не схапіўся за канец вяроўкі, што звісала з паветранага шару, які пралятаў побач.

Калі да мяне вярнулася здольнасць асэнсоўваць рэчаіснасць, я напружыў лёгкія і закрычаў да аэранаўта, каб звярнуць на сябе ўвагу. Але доўгі час мае высілкі не мелі плёну. Ці то ён, дурань, не мог, ці то, мярзотнік, не хацеў заўважаць мяне. Шар падымаўся ўсё вышэй, а сілы мае заканчваліся ўсё хутчэй. Я ўжо хацеў падпарадкавацца лёсу і пакорліва зваліцца ў мора, калі мой дух акрыяў ад гуку замагільнага голасу зверху, які ціхамірна напяваў, здаецца, нейкую арыю з оперы. Зірнуўшы ўверх, я ўбачыў Анёла Надзвычайнасцяў. Ён перагнуўся цераз край гандолы, склаўшы рукі на грудзях і няспешна зацягваючыся піпкай, цалкам задаволены сабой і сусветам. Я быў настолькі знямоханы, што нават не мог гаварыць, і толькі жаласна глядзеў на яго. Некалькі хвілінаў ён разглядаў мяне, нічога не кажучы. Нарэшце асцярожна перасунуў піпку справа налева і паблажліва сказаў:

— Хто фы такі і якога шорта там робіце?

На гэтае жорсткае і нахабнае пазёрства я змог выціснуць толькі: «Ратуйце!»

— Ратафаць? — адазваўся нягоднік. — Не-а. Фось фам бутэлька, частуйцеся і ідзіце к шорту!

З гэтымі словамі ён кінуў цяжкую бутэльку кіршэнвасэру, якая трапіла мне ў галаву і, здаецца, выбіла адтуль усе мазгі. Засмучаны гэтай стратай, я ўжо быў гатовы выпусціць вяроўку і прыгожа памерці, але мяне спыніў крык Анёла:

— Трымайсеся! — прамовіў ён. — Не спяшайсеся. Хошасе яшчэ бутэльку, ці фы ўшо цфяросы і прыйшлі ў сябе?

Я хуценька двойчы пахітаў галавой: першы раз адмоўна, паказваючы, што яшчэ адной бутэлькі мне не трэба, другі —

[1] Цвёрдая зямля (лац.).

становуча, дэманструючы, што я ўжо цвярозы і цалкам прыйшоў у сябе. Анёл памякчэў.

— Ну, фы нарэшце паферылі? — спытаў ён. — Паферылі ў машліфасць надсфычайнага?

Я яшчэ раз кіўнуў.

— І фы ферыце ў мяне, Анёла Натсфычайнасцяў?

Я кіўнуў.

— І фы расумееце, што фы п'яніса і турань?

Я кіўнуў.

— Тады пакладзіце правую руку ў левую кішэню штаноў на знак поўнага патпараткафання Анёлу Натсфычайнасцяў.

З пэўных прычынаў мне падалося гэта немажлівым. Па-першае, левую руку я зламаў, зваліўшыся з лесвіцы, і таму, калі б я выпусціў вяроўку з правай рукі, левая не змагла б мне дапамагчы. Па-другое, мае штаны скрала варона. Таму я пачаў адмоўна хітаць галавой, каб паказаць, што выканаць цалкам разумнае патрабаванне Анёла я цяпер не магу. Але я не паспеў зрабіць нават гэтага.

— Ідзі к шорту тады! — пракрычаў Анёл Надзвычайнасцяў.

З гэтымі словамі ён дастаў востры нож і перарэзаў вяроўку, за якую я трымаўся. Так выйшла, што мы праляталі акурат над маім домам (які падчас маіх падарожжаў быў цудоўненька адбудаваны). Я ўпаў галавой уніз у комін і ляснуўся ў камін у сталовай.

Ачуняўшы пасля такога аглушальнага падзення, я зразумеў, што цяпер недзе чатыры гадзіны раніцы. Я ляжаў у тым самым месцы, куды зваліўся з шару. Мая галава была сярод попелу, а ногі — на аскепках століка сярод рэштак дэсерту, змяшаных з газетамі, разбітым шклом, перакуленымі бутэлькамі і пустым гарлачыкам з-пад кіршэнвасэру. Так мне адпомсціў Анёл Надзвычайнасцяў.

*Пераклала Кацярына Дубоўская*

# Сістэма доктара Смола і прафесара Пер'е

Увосень 18** года, падчас падарожжа па самым поўдні Францыі, я апынуўся за некалькі міляў ад аднае *maison de santé*[1], альбо прыватнай вар'ятні, пра якую шмат чуў у Парыжы ад маіх калегаў-медыкаў. Я ніколі не быў у такім месцы, таму палічыў, што магчымасць надарылася занадта добрая, каб яе не скарыстаць, і прапанаваў свайму спадарожніку — джэнтльмену, з якім выпадкова пазнаёміўся некалькі дзён таму, — крыху збочыць (што заняло б у нас гадзіну ці каля таго) і агледзець гэтую ўстанову. Ён, што праўда, адмовіўся, спаслаўшыся, па-першае, на спешку, а па-другое, на звычайны страх перад вар'ятамі, аднак папрасіў мяне не зважаць на яго з ветлівасці, якая магла б перашкодзіць задавальненню мае цікаўнасці, і сказаў, што ён паедзе далей павольней, каб я здолеў дагнаць яго цягам гэтага ці хаця б наступнага дня. Калі ён пачаў са мною развітвацца, я раптам падумаў, што мяне могуць туды не пусціць, і падзяліўся з ім сваімі сумневамі. Ён пагадзіўся, сказаўшы, што без асабістага знаёмства з дырэктарам гэтае ўстановы мсьё Маярам альбо рэкамендацыйных лістоў я сапраўды магу сутыкнуцца з цяжкасцямі, бо правілы ў гэтых прыватных вар'ятнях нашмат больш строгія, чым у звычайных лякарнях. Ён дадаў таксама, што некалькі гадоў таму яму давялося пазнаёміцца з Маярам, і ўсё, што ён можа для мяне зрабіць, — гэта праводзіць да дзвярэй і прадставіць мяне, таму што пачуцці, якія выклікае ў яго вар'яцтва, не дазволяць яму зайсці ў дом.

Я падзякаваў. Мы збочылі на зарослую травою сцяжыну, якая ішла ўздоўж падножжа гары і праз паўгадзіны стала ледзь бачная сярод густога лесу. Мы праехалі праз цёмны, панылы гушчар каля дзвюх міляў, калі ўбачылі перад сабою *maison de santé*. Гэта быў дзівосны замак, у некаторых месцах напаўразбураны, які быў такі стары й занядбаны, што яго наўрад ці можна было здаваць у арэнду. Убачыўшы бу-

[1] Псіхіятрычная лякарня (фр.).

дынак, я мімаволі скалануўся і, спыняючы каня, ледзьве не павярнуў назад. Аднак адразу ж засаромеўся свае слабасці і рушыў далей.

Калі мы пад'ехалі да брамы, я заўважыў, што яна крыху прачыненая, а праз шчыліну вызірае нейкі чалавек. Праз імгненне ён выйшаў наперад, звярнуўся да майго спадарожніка па імені, сардэчна пацiснуў яму руку і запрасіў увайсці. Гэта быў сам мсьё Маяр — мажны, прыемнага выгляду джэнтльмен старое закваскі з вытанчанымі манерамі, паважнасць і годнасць якога моцна ўражвалі.

Мой таварыш, прадставіўшы мяне, згадаў пра маё жаданне агледзець лякарню, выслухаў запэўніванні мсьё Маяра пра тое, што ўся ўвага будзе належаць мне, развітаўся, і больш я яго не бачыў.

Калі ён паехаў, дырэктар правёў мяне ў маленькую, вельмі акуратную гасцёўню, у якой разам з іншымі праявамі вытанчанага густу я ўбачыў шмат кніг, малюнкаў, вазаў з кветкамі і музычных інструментаў. Яркі агонь весела палаў у каміне. За фартэп'яна сядзела маладая і вельмі прыгожая жанчына, якая спявала арыю Беліні, але змоўкла, калі я ўвайшоў, прывітаўшы мяне з ветлівай далікатнасцю. У яе быў ціхі голас, а ў паводзінах я заўважыў нейкую прыгнечанасць. Мне здалося таксама, што цень смутку ляжаў на яе твары, празмерна бледным, але ад гэтага не менш прывабным, як на мой густ. Яе жалобны строй абудзіў ува мне змяшанае пачуццё павагі, цікаўнасці і захаплення.

У Парыжы мне даводзілася чуць, што ва ўстанове мсьё Маяра дзейнічае так званая «сістэма палёгкі», што ўсе пакаранні скасаваныя, абмежаванні ўжываюцца вельмі рэдка, а пацыенты, за якімі таемна назіраюць, карыстаюцца ўяўнай свабодаю: многія з іх могуць гуляць па доме і садзе, апранутыя ў звычайнае адзенне, быццам ніякія не вар'яты.

Маючы ўсё гэта на ўвазе, я быў асцярожны, размаўляючы з маладою лэдзі, бо не быў упэўнены, што яна здаровая, да таго ж нейкі трывожны бляск у яе вачах амаль упэўніў мяне ў адваротным. Я ўважліва сачыў за сваімі словамі, гаворачы толькі на агульныя тэмы, якія не маглі раздражніць ці

ўсхваляваць нават вар'ята. На ўсё, што я гаварыў, яна адказвала выключна разумна, і нават яе незвычайныяназіранні сведчылі пра непахісна здаровы сэнс; але доўгае знаёмства з метафізікаю шаленства навучыла мяне не даваць веры такім доказам нармальнай псіхікі, і я па-ранейшаму прытрымліваўся ў размове той абачлівасці, якую абраў з самага пачатку.

Праз некаторы час спрытны служка ў ліўрэі прынёс садавіны, віна і іншых пачастункаў, якія я пакаштаваў; неўзабаве маладая лэдзі выйшла з пакоя, і я запытальна паглядзеў на гаспадара.

— О не, — сказаў ён, — не, што вы, гэта ж мая сваячка — пляменніца, вельмі паважаная жанчына.

— Вельмі выбачаюся за такое падазрэнне, — адказаў я, — але ж у мяне ёсць апраўданне. Вашая незвычайная сістэма кіравання добра вядомая ў Парыжы, таму я палічыў магчымым, што... што...

— Так-так, можаце больш нічога не казаць, мне нават варта падзякаваць вам за вашую ўхвальную асцярожнасць. Такую разважлівасць нячаста сустрэнеш у маладых людзях. У нас здараліся *праблемы,* выкліканыя легкадумнасцю некаторых нашых наведнікаў. Калі дзейнічала мая старая сістэма і пацыентам было дазволена гуляць туды-сюды як заманецца, іх часта ўводзілі ў небяспечны шал неразважныя асобы, якія прыходзілі агледзець дом. Гэта змусіла мяне ўвесці строгую сістэму абмежаванняў, і цяпер доступ сюды атрымлівае толькі той, у чыёй абачлівасці я магу быць упэўнены.

— Калі дзейнічала вашая старая сістэма... — паўтарыў я ягоныя словы. — Ці правільна я разумею, што «сістэма палёгкі», пра якую я так шмат чуў, скасаваная?

— Вось ужо некалькі тыдняў, як мы пастанавілі адмовіцца ад яе назаўсёды, — адказаў ён.

— Няўжо праўда?! Вы шалёна мяне здзівілі!

— Сэр, — сказаў ён уздыхнуўшы, — мы палічылі абсалютна неабходным вярнуць ранейшыя парадкі. Патуранні ва ўсе часы пагражалі страшэннай небяспекай, а іх карысць

значна перабольшвалася. Я лічу, сэр, што для гэтай установы такая сістэма сталася значна большым выпрабаваннем, чым для любой іншай. Мы заўсёды дзейнічалі ў межах разумнае гуманнасці. Шкада, што вы не наведалі нас раней, каб мець магчымасць пра ўсё меркаваць самастойна. Але вы, здаецца, добра знаёмы з сістэмай палёгкі.

— Не зусім. Я атрымаў звесткі з трэціх ці чацвертых рук.

— Тады я ў агульных рысах вам пра яе раскажу. Значыцца, пацыенты былі такімі сабе *ménagés*[1], іх песцілі і ўлагоджвалі. Мы не пярэчылі ніводнай з фантазіяў, што прыходзілі ў галовы вар'ятаў. Наадварот, мы іх нават падтрымлівалі і многіх канчаткова вылекавалі менавіта так. Нішто так не ўплывае на кволы розум вар'ята, як *reductio ad absurdum*[2]. Напрыклад, у нас былі людзі, што ўяўлялі сябе куранятамі. Лячэнне палягала ў тым, што мы настойвалі на гэтым як на ісціне: называлі пацыента ідыётам, калі ён недастаткова ўсведамляў гэтую ісціну, і цэлы тыдзень адмаўлялі яму ў любой ежы, апроч той, якую ядуць кураняты. У такіх выпадках крыху зярнятаў і каменьчыкаў рабілі сапраўдныя цуды.

— І гэта ўсё, што вы рабілі?

— Безумоўна, не. Мы аддавалі шмат увагі простым забавам: у асноўным музыка, танцы, гімнастыка, карты, некаторыя кнігі і так далей. Мы рабілі выгляд, што лекуем кожнага ад найзвычайнейшай цялеснай хваробы. Слова «вар'яцтва» ніколі не прамаўлялася. Важна было прымусіць кожнага назіраць за тым, што робяць астатнія. Упэўні вар'ята ў тым, што ты верыш у ягоныя розум ды разважлівасць, — і ён твой душою й целам. Дзякуючы гэтаму мы маглі абыходзіцца без штату наглядчыкаў, даволі дарагога, дарэчы.

— І вы не ўжывалі ніякіх пакаранняў?

— Ніякіх.

— І ніколі не замыкалі пацыентаў?

— Вельмі рэдка. Час ад часу, калі ў каго-небудзь наступаў крызіс альбо раптоўнае шаленства, мы змяшчалі яго ў адасо-

[1] Тыя, каму патураюць (фр.).
[2] Звядзенне да абсурду (лац.).

бленую палату, каб ягонае хваляванне не парушала спакою, і трымалі там, пакуль не надаралася магчымасць перадаць яго на рукі сябрам. Небяспечных шаленцаў у нас няма, іх звычайна адвозяць у дзяржаўныя лякарні.

— І вы цяпер усё гэта скасавалі. Думаеце, да лепшага?

— Безумоўна. Сістэма мела свае недахопы і нават пагражала небяспекай. Цяпер, на шчасце, яна выкараненая з *maisons de santé* па ўсёй Францыі.

— Вашыя словы, — сказаў я, — неймаверна мяне здзівілі. Да гэтага моманту я быў упэўнены, што ва ўсёй краіне не практыкуецца іншага метаду лекавання маніяў.

— Вы яшчэ малады, мой дружа, — адказаў гаспадар, — але прыйдзе час, калі вы навучыцеся самастойна меркаваць пра тое, што адбываецца ў свеце, і не будзеце давяраць балбатні іншых. Не верце ні каліву з таго, што чуеце, і давярайце толькі палове таго, што бачыце. Што да нашае *maison de santé*, то зразумела, што вас увёў у зман нейкі невук. Зрэшты, пасля абеду, калі вы дастаткова адпачылі, буду рады паказаць вам увесь дом і пазнаёміць вас з сістэмай, якая (так думаю і я, і ўсе, хто ўпэўніўся ў яе эфектыўнасці) незраўнана больш дзейсная, чым усе распрацаваныя да гэтага.

— Яна належыць вам? — пацікавіўся я. — Гэта вашае вынаходніцтва?

— Маю гонар прызнаць, — адказаў ён, — што гэта так, прынамсі, у некаторай ступені.

Так мы з мсьё Маярам размаўлялі гадзіну ці дзве, пакуль ён паказваў мне іхныя сады і аранжарэі.

— Я цяпер не магу паказаць вам пацыентаў, — сказаў ён. — Уражлівы розум ад такога відовішча заўсёды больш ці менш непрыемна ўзрушваецца, а я б не хацеў сапсаваць вам апетыту перад абедам, які ўжо хутка. Прапаную ялавічыну а-ля *Sainte-Ménehould*[1], квяцістую капусту пад соўсам *velouté*[2], пасля шклянку кло-дэ-вужо, і вашыя нервы стануць выключна моцнымі.

[1] Сэнт-Мену*, камуна ў дэпартаменце Марна (Францыя).
[2] Далікатны (фр.).

А шостай пазванілі да абеду, і гаспадар праводзіў мяне ў прасторную *salle à manger*[1], дзе сабралася вялікая кампанія — чалавек дваццаць пяць-трыццаць. Гэта былі, несумненна, людзі з найвышэйшых слаёў грамадства, безумоўна, высакароднага паходжання, нягледзячы на тое, што іхнае адзенне вылучалася, я б сказаў, экстравагантнай раскошаю, чымсьці моцна нагадваючы паказную пышнасць *vieille cour*[2]. Я звярнуў увагу на дамаў: іх было не менш за дзве траціны гасцей. Некаторыя былі апранутыя так, што парыжане нізашто не пахвалілі б іх за вытанчаны густ. Напрыклад, дамы, якім было ніяк не меней за семдзесят, былі проста абвешаныя ўпрыгожаннямі — пярсцёнкамі, бранзалетамі й завушніцамі, а іх аголеныя рукі і глыбокія дэкальтэ выглядалі зусім непрыстойна. Я таксама заўважыў, што большасць касцюмаў пашытая кепска, прынамсі, добра сядзелі на ўладальніках вельмі нямногія. Агледзеўшыся, я заўважыў маладую жанчыну, якая мяне так зацікавіла і якой мсьё Маяр прадставіў мяне ў маленькай гасцёўні. Але як жа я быў здзіўлены, убачыўшы на ёй сукенку з крыналінам, туфлі на высокіх абцасах і брудны чэпчык з брусэльскімі карункамі, які быў такі вялікі, што яе твар здаваўся проста недарэчна дробным. Яе жалобны ўбор, які я бачыў падчас нашай першай сустрэчы, быў найгустоўнейшы. Карацей, у адзенні ўсёй кампаніі было штосьць вельмі дзіўнае, і гэта змусіла мяне вярнуцца да свае першае думкі пра «сістэму палёгкі»: маўляў, мсьё Маяр вырашыў нічога мне не казаць да канца абеду, каб я не адчуваў няёмкасці, усведамляючы, што сяджу побач з вар'ятамі. Але потым я ўспомніў, што мне ў Парыжы казалі пра жыхароў поўдня: яны нібыта зусім эксцэнтрычныя, з безліччу састарэлых забабонаў, а размова з двума-трыма гасцямі хутка развеяла апошнія сумневы.

Што да сталовага пакоя, то яму, бадай, бракавала вытанчанасці, нягледзячы на выгоднасць і вялікія памеры. На падлозе, да прыкладу, не было дываноў, зрэшты, у Францыі часта абыходзяцца без іх. Але і вокны былі без штораў, за-

[1] Сталовы пакой (фр.).
[2] Старога двара (фр.).

чыненыя аканіцы надзейна замкнулі на жалезныя засаўкі крыж-накрыж, так, як звычайна замыкаюць вокны на нашых крамах. Пакой, я заўважыў, паўтараў прастакутную форму замкавага крыла, на тры бакі выходзілі вокны, якіх было не менш за дзесяць, на чацверты — дзверы.

Стол быў багата серніраваны, ламіўся ад шыкоўнага посуду з вытанчаным стравамі ў сапраўды варварскай раскошы. Мяса хапіла б і на тое, каб накарміць сыноў Энакавых*. Першы раз у жыцці я бачыў такое вялікае, такое празмернае марнаванне жыццёвых дабротаў. Але густу ва ўсім гэтым было вельмі мала, і мае вочы, звыклыя да мяккага спакойнага святла, жахліва пакутавалі ад асляпляльнага бляску безлічы васковых свечак у срэбных кандэлябрах, якія стаялі на стале, па ўсім пакоі і ўвогуле ўсюды, дзе для іх знайшлося месца. Паслужлівыя лёкаі былі гатовыя ва ўсім дагадзіць, а за вялікім сталом у дальнім куце пакоя сядзела сем-восем чалавек са скрыпкамі, флейтамі, трамбонамі і барабанам. Гэтыя даймалі мяне наймацней: у перапынках паміж ежай яны выдавалі бясконца разнастайныя гукі, якія, мабыць, павінныя былі ўважацца за музыку і якія, як я заўважыў, усіх вельмі весялілі.

Карацей, я не мог пазбавіцца думкі, што ва ўсім бачаным мною было шмат незвычайнага... але ж у свеце сустракаюцца самыя розныя людзі, з самым розным складам думак і самымі рознымі звычкамі й меркаваннямі. Да таго ж я дастаткова паездзіў па свеце, каб стаць прыхільнікам прынцыпу *nil admirari*[1], таму спакойна сеў па правую руку ад гаспадара і з уласцівым мне цудоўным апетытам аддаў належнае найсмачнейшым стравам, што стаялі перада мною.

Агульная размова тым часам ажывілася. Дамы, як заўжды, гаварылі шмат. Хутка мне стала зразумела, што ўсё таварыства амаль цалкам складалася з людзей адукаваных, а гаспадар быў проста невычарпальнай крыніцай смешных гісторыяў. Ён, відаць, вельмі любіў пагаварыць пра свае абавязкі дырэктара *maison de santé*, ды і ўсім прысутным, на

[1] Нічому не дзівіцца (лац.) — гл. Гарацый, «Пасланні», I, 6, I.

маё вялікае здзіўленне, найбольш падабалася абмяркоўваць вар'яцтва. Асноўная частка забаўных гісторыяў, расказаных тады, была менавіта пра дзівацтвы пацыентаў.

— Быў тут у нас адзін тыпус, — сказаў нізенькі тоўсты джэнтльмен, што сядзеў справа ад мяне, — адзін тыпус, якому здавалася, што ён чайнік. Дарэчы, проста ўражвае, наколькі часта менавіта гэтая вар'яцкая ідэя заходзіць псіхам у галаву. У Францыі наўрад ці знойдзецца прытулак для вар'ятаў, які не мог бы пахваліцца чалавекам-чайнікам. Наш джэнтльмен быў чайнікам брытанскае вытворчасці і штораніцы сумленна начышчаў сябе аленевай замшай і крэйдай.

— А яшчэ, — загаварыў высокі мужчына насупраць, — у нас быў, не так даўно, суб'ект, які ўбіў сабе ў галаву, што ён асёл; кажучы метафарычна, гэта чыстая праўда. Гэта быў цяжкі пацыент, і мы займелі шмат складанасцяў, спрабуючы трымаць яго ў рамках. Доўгі час ён не еў нічога, апроч чартапалоху, але ад гэтага мы яго хутка вылекавалі, настойваючы, каб ён еў толькі яго. Дык ён увесь час брыкаўся, вось так, вось так...

— Мсьё дэ Кок, я была б вам вельмі ўдзячная, калі б вы паводзілі сябе прыстойна, — перарвала прамоўцу старая дама, што сядзела побач з ім. — Прашу вас, трымайце свае ногі пры сабе! Вы сапсавалі мне парчовую сукенку. Няўжо неабходна ілюстраваць сваю думку так наглядна? Наш сябар, несумненна, і так вас зразумее. Шчыра кажучы, вы амаль такі самы асёл, якім уяўляў сябе той няшчасны. У вас усё так натуральна атрымліваецца, далібог.

— *Mille pardons*[1], мамзэль! — усклікнуў мсьё дэ Кок. — Сто разоў выбачаюся, не хацеў нікога пакрыўдзіць! Мамзэль Лаплас, мсьё дэ Кок мае гонар піць за вашае здароўе!

Тут мсьё дэ Кок нізка пакланіўся, вельмі цырымонна пацалаваў сабе руку і чокнуўся з мадэмуазэль Лаплас.

— Дазвольце мне, *mon ami*[2], — сказаў мсьё Маяр, звяртаючыся да мяне, — прапанаваць вам крышку ялавічыны а-ля *Sainte-Ménehould*, яна проста выдатная, вось убачыце.

---

[1] Вельмі выбачаюся (фр.).

[2] Мой сябра (фр.).

У гэты момант трое дужых служкаў пасля некаторых высілкаў урэшце паставілі на стол велізарны паднос, на якім ляжала тое, што падалося мне *monstrum, horrendum, informe, ingens, cui lumen ademptum*[1]. Але, уважліва разгледзеўшы яго зблізку, я зразумеў, што гэта ўсяго толькі маленькае цяля: яно было запечанае цалкам і стаяла на каленях з яблыкам у роце — у Англіі такім чынам гатуюць зайцоў.

— Не, дзякую, — адмовіўся я. — Шчыра кажучы, я не асабліва люблю ялавічыну а-ля святога... чаго?.. сумняюся, што яна мне добра пойдзе. Я лепей памяняю талерку і паспрабую трусяціны.

На стале стаяла некалькі талерак з тым, што мусіла быць звычайнай трусяцінай па-французску. Найсмачнейшы *morceau*[2], хачу я вам сказаць.

— П'ер, — паклікаў гаспадар, — памяняйце нашаму госцю талерку і пакладзіце яму порцыю гэтай трусяціны *au chat*[3].

— Як-як вы сказалі? — спытаў я.

— Гэтай трусяціны *au chat*.

— Дзякуй, мабыць, не варта, — сказаў я, крыху падумаўшы. — Я сабе вяндліны пакладу.

Ніколі не ведаеш, чым цябе накормяць гэтыя правінцыялы, думаў я. Не трэба мне ні іхных трусоў пад ката, ні, калі ўжо на тое пайшло, катоў пад труса таксама.

— А яшчэ, — загаварыў з далёкага кута, падхопліваючы абарваную размову, наступны госць, бледны, нібы мярцвяк, — сярод іншых дзівакоў быў у нас пацыент, які ўпарта настойваў, што ён кордаўскі сыр, і хадзіў за ўсімі з нажом, упрошваючы адрэзаць і паспрабаваць хаця б скрылёчак з ягонай нагі.

— Без сумневаў, ён быў поўны дурань, — уставіў хтосьці, — але ён не можа параўнацца з індывідуюмам, якога ведаем мы ўсе, апроч гэтага незнаёмага джэнтльмена. Я маю на ўвазе гэтага, які лічыў сябе бутэлькай шампанскага і ўвесь час адкаркоўваўся з бабахам і шыпеннем, вось так!

[1] Страшнае, злое, жахліва агіднае, змроку стварэнне* (лац.).
[2] Кавалачак (фр.).
[3] Пад ката́ (фр.).

З гэтымі словамі прамоўца (як на мяне, гэта была страшэнная нявыхаванасць) засунуў вялікі палец правае рукі за левую шчаку, рэзка выцягнуў яго з гукам, падобным да хлопання корка, і, пераймаючы шампанскае, што пеніцца, выдаў працяглы свіст і шыпенне, спрытна прыціскаючы язык да зубоў. Такія паводзіны відавочна прыйшліся не зусім даспадобы мсьё Маяру, але ён нічога не сказаў, і размову падхапіў вельмі худы чалавечак у пышным парыку.

— Быў тут яшчэ дурнаваты, — сказаў ён, — што ўважаў сябе за жабу. Дарэчы, да жабы ён быў абсалютна не падобны. Шкада, што вам не давялося з ім сустрэцца, сэр, — звярнуўся ён да мяне, — вы б атрымалі сапраўдную асалоду, убачыўшы, як натуральна ў яго атрымлівалася. Сэр, калі ён не быў жабаю, мне застаецца пра гэта толькі пашкадаваць. Ягонае кумканне, гэтае «ква-ак, ква-ак» было найцудоўнейшым гукам у свеце, чыста сі-бемоль! І калі ён пасля аднаго-двух келіхаў віна ставіў локці на стол — вось так! — шырока раскрываў рот — вось так! — вылупліваў вочы — вось так! — і шалёна хутка пачынаў імі лыпаць — вось так, — о, дазволю сабе наўпрост сказаць вам, сэр: вы б звар'яцелі ад захаплення такой геніяльнасцю.

— Не сумняюся, — адказаў я.

— А яшчэ, — сказаў хтосьці, — быў тут адзін мілы свавольнік, упэўнены, што ён дробка табакі, які бязмежна расстройваўся, бо не мог узяць сябе вялікім і ўказальным пальцамі.

— А яшчэ тут быў Жуль Дэзульер, сапраўдны, выключны геній, скажу я вам, які зрухнуўся на думцы, што ён гарбуз. Ён даймаў кухара, каб той запёк яго ў пірог, а кухар абурана адмаўляўся. Што да мяне, то я зусім не ўпэўнены, што гарбузовы пірог а-ля Дэзульер быў бы такім ужо нясмачным.

— Надзвычайна! — сказаў я, запытальна гледзячы на мсьё Маяра.

— Ха-ха-ха! — сказаў гаспадар. — Хе-хе-хе! Хі-хі-хі! Хо-хо-хо! Гы-гы-гы! Цудоўна! Не здзіўляйцеся так, *mon ami*. Наш сябар жартаўнік, *drôle*[1], не варта разумець яго літаральна.

[1] Гарэза (фр.).

— А яшчэ, — сказаў нейкі іншы госць, — было тут адно пудзіла гарохавае, таксама свайго роду выбітны суб'ект. Ён з'ехаў з глузду ад кахання і ўявіў, што ў яго дзве галавы, адна — Цыцэронава, а другая — ад ілба да рота Дэмасфенава і з падбароддзем лорда Брума*. Магчыма, ён і памыляўся, але ўпэўніць вас у сваёй рацыі мог як ніхто, бо быў выключным аратарам. Ім валодала неўтаймоўная жарсць прамаўляць, ён проста не мог утрымацца ад публічных выступаў. Бывала, заскочыць на стол — вось так — і як пачне...

Тут адзін з суседзяў прамоўцы паклаў яму на плячо руку і прашаптаў на вуха некалькі словаў, пасля чаго той неахвотна змоўк і паныла сеў назад на крэсла.

— А яшчэ, — пачаў той самы сусед, — быў тут Булар-ваўчок. Я называю яго ваўчком, бо ён, па сутнасці, быў апанаваны дзівацтвам, не такім ужо, зрэшты, абсурдным... фантазіяй, што яго ператварылі ў ваўчок. Вы б памерлі ад рогату, калі б яго пабачылі. Ён мог цэлую гадзіну круціцца на адным абцасе, прыкладна вось так...

Тут ягоны таварыш, якога ён кагадзе спыніў шэптам, зрабіў тое самае з ім.

— А ўсё-ткі, — закрычала на ўвесь голас нейкая старая дама, — ваш мсьё Булар быў вар'ят, і да таго ж найдурнейшы вар'ят. Хто, скажыце вы мне, хто хоць калі-небудзь чуў пра чалавека-ваўчка? Гэта ж бязглуздзіца нейкая. Вось мадам Жуаёз мела нашмат больш цвярозы розум, як вы ведаеце. У яе таксама была фантазія, але фантазія, поўная здаровага сэнсу і прыемная ўсім, хто меў гонар ведаць мадам. Па сталым роздуме яна прыйшла да высновы, што нейкім чынам ператварылася ў маладога пеўніка, і пачала паводзіцца адпаведна. Яна проста дзівосна лопала крыламі — вось так, вось так, вось так! А яе кукарэканне... яно проста зачароўвала! Кукарэку! Кукарэку! Кукарэку-ку-ку-ку-у-у-у!..

— Мадам Жуаёз, я прашу вас паводзіць сябе прыстойна! — спыніў яе наш гаспадар, вельмі раззлаваны. Альбо вы будзеце паводзіць сябе як належыць лэдзі, альбо зараз жа пакінеце стол. Выбірайце!

Дама (я быў шалёна здзіўлены тым, што яе назвалі мадам Жуаёз, пасля апісання мадам Жуаёз, якое мы толькі што ад яе пачулі), пачырванеўшы да вушэй, выглядала вельмі прысаромленай гэтай заўвагаю. Яна апусціла галаву і не прамовіла ні слова, але размову падхапіла іншая дама, маладзейшая. Гэта была мая знаёмая — прыгожая дзяўчына з маленькае гасцёўні.

— О, мадам Жуаёз была ідыёткай! — усклікнула яна. — А вось у меркаваннях Эжэні Сальсафет сапраўды адчуваўся здаровы розум. Гэта была вельмі прыгожая і хваравіта сціплая маладая лэдзі, якая лічыла звычайны спосаб апранацца непрыстойным і хацела быць не ўнутры свайго адзення, а звонку. Зрэшты, гэта вельмі лёгка. Трэба толькі зрабіць так, потым вось так, вось так і нарэшце...

— *Mon Dieu!*[1] Мадэмуазэль Сальсафет! — раздалося адначасова каля дзясятка галасоў. — Што вы задумалі?! Хопіць! Дастаткова! Мы ўжо зразумелі, як гэта робіцца! Усё! Усё! — некалькі чалавек паўскоквалі з месцаў, каб перашкодзіць мадэмуазэль Сальсафет паказацца нам на вочы ў вобразе Венеры Медыцэйскай, калі раптам, ставячы кропку ў эфектнай сцэне, гучны крык, я б нават сказаў, лямант, данёсся аднекуль з цэнтральнай часткі замка.

На мае нервы гэты лямант паўплываў вельмі гнятліва, але да астатніх я адчуў сапраўды шчымлівае шкадаванне; ніколі ў сваім жыцці я не бачыў нармальных людзей такімі спалоханымі. Яны збляднелі, быццам мерцвякі, скурчыліся на крэслах і, прыслухоўваючыся да крыкаў, дрыжалі і ляскалі зубамі ад жаху. Крыкі паўтарыліся, гучней і, як мне падалося, бліжэй, потым яшчэ раз, вельмі гучна, і яшчэ раз, з нашмат меншай сілаю. Калі стала відавочна, што шум сціхае, настрой гасцей падняўся, усе ажывіліся, і зноў пасыпаліся жарты. Тут я наважыўся спытацца пра прычыны такога хвалявання.

— Чыстая дробязь, — сказаў мсьё Маяр. — Мы ўжо да гэтага прывыклі і насамрэч амаль не хвалюемся. Часам вар'яты ўсе разам усчынаюць выццё; адзін падхоплівае за другім, як

[1] Божа мой! (фр.).

гэта бывае ўначы ў сабачых зграях. Здараецца, праўда, што такія канцэрты скавытанняў суправаджаюцца спробамі вызваліцца; тады, канечне, пэўная небяспека існуе.

— А колькі хворых тут у вас пад апекаю?

— Цяпер не больш за дзесяць.

— У асноўным жанчыны, як я разумею?

— О не, усе мужчыны. Моцныя хлопцы, скажу я вам.

— Няўжо? Я заўсёды думаў, што большасць вар'ятаў належаць да слабога полу.

— Найчасцей так, але не заўсёды. Не так даўно тут было дваццаць сем пацыентаў, і з іх не менш за васямнаццаць жанчынаў, але потым, як бачыце, усё моцна змянілася.

— Так, усё, як бачыце, моцна змянілася, — перарваў нас джэнтльмен, які ледзь не пераламаў ногі мадэмуазэль Лаплас.

— Усё, як бачыце, моцна змянілася, — рэхам паўтарылі ўсе госці разам.

— Ану прытрымайце языкі, вы ўсе! — раз'ятрана сказаў гаспадар, пасля чаго недзе на хвіліну запанавала мёртвая цішыня. Адна лэдзі выканала патрабаванне мсьё Маяра дакладна — высунула вонкі язык, які выявіўся незвычайна доўгім, і асцярожна трымала яго абедзвюма рукамі да канца прыёму.

— А тая шляхетная дама, — шэптам спытаў я ў гаспадара, нахіліўшыся да яго, — якая нядаўна тут кукарэкала, — яна ж бяскрыўдная, зусім бяскрыўдная, так?

— Бяскрыўдная? — усклікнуў ён з непадробным здзіўленнем. — У сэнсе?.. Ды што вы маеце на ўвазе?

— Толькі крыху... таго? — спытаў я, пакруціўшы пальцам ля скроні. — Здаецца ж, яна не зусім звар'яцела, не так, каб быць небяспечнай?

— *Mon Dieu!* Што вы там сабе надумалі?! Гэтая лэдзі — мая старая добрая сяброўка мадам Жуаёз — такая ж абсалютна здаровая, як я сам! Ну так, яна крыху эксцэнтрычная, але, каб вы ведалі, усе старыя дамы больш-менш эксцэнтрычныя!

— Безумоўна, — сказаў я, — безумоўна. А астатнія лэдзі й джэнтльмены...

— Мае сябры і таварышы, — перарваў мсьё Маяр, фанабэрліва выпростваючыся, — мае адданыя сябры і памочнікі.

— Як? Усе? — здзівіўся я. — І дамы, і астатнія?

— Канечне, — адказаў ён. — Мы ж не можам працаваць зусім без жанчынаў. Яны лепш за ўсіх даглядаюць за вар'ятамі. У іх свае метады, як вы ведаеце; іхныя прамяністыя пагляды цудоўна дзейнічаюць, гэта як чары змяі ў пэўным сэнсе.

— Безумоўна, — сказаў я, — безумоўна. Яны крыху незвычайна паводзяцца, праўда? Ну... дзіўнавата крыху, як вы лічыце?

— Незвычайна? Дзіўнавата?! Вы што, сапраўды так думаеце? Безумоўна, мы тут, на поўдні, не асабліва абмяжоўваем сябе ўмоўнасцямі, паводзімся як нам падабаецца, радуемся жыццю і ўсё такое, разумееце?..

— Безумоўна, — сказаў я, — безумоўна.

— Магчыма, кло-дэ-вужо было занадта моцнае, яно магло крыху... затуманіць... разумееце, пра што я?

— Безумоўна, — сказаў я, — безумоўна. Дарэчы, мсьё, ці правільна я зразумеў, што сістэма, уведзеная вамі замест славутай сістэмы палёгкі, вылучаецца скрайняй строгасцю й суворасцю?

— Ні ў якім разе. Нашыя абмежаванні сапраўды даволі строгія, але ж гэта неабходна. Затое такога дагляду — медычнага дагляду, я маю на ўвазе, — пацыент больш нідзе не атрымае.

— А гэтая сістэма — вашае вынаходніцтва?

— Не ва ўсім. Некаторыя яе элементы распрацаваныя прафесарам Смолам, пра якога вы, без сумневаў, чулі. А пэўнымі зменамі, унесенымі мною, я — з радасцю пра гэта абвяшчаю — абавязаны знакамітаму Пер'е, з якім вы, калі не памыляюся, блізка знаёмы.

— Мне вельмі сорамна прызнацца, — адказаў я, — але я ніколі не чуў імёнаў гэтых джэнтльменаў.

— Божа мой! — усклікнуў гаспадар, рэзка адсунуўшы крэсла і ўздымаючы рукі. — Я, пэўна, вас недачуў. Вы ж не хацелі сказаць, што ніколі не чулі ні пра найадукаванейшага доктара Смола, ні пра славутага прафесара Пер'е!

— Мушу прызнаць сваю недасведчанасць, — сказаў я, — але праўда вышэйшая за ўсё. Аднак я ўсё адно адчуваю сябе проста-такі зрынутым у прах, бо не знаёмы з працамі гэтых, без сумневаў, выдатных навукоўцаў. Я абавязкова адшукаю іхныя працы і вывучу іх з усёю пільнасцю. Мсьё Маяр, пасля вашых словаў мне сапраўды — мушу гэта прызнаць, — сапраўды вельмі сорамна за сябе.

Так і было.

— Не будзем больш пра гэта, мой дарагі малады сябра, — ласкава сказаў ён, паціскаючы мне руку. — Выпіце са мною келіх сатэрну.

Мы выпілі. Уся кампанія зрабіла тое ж, ні ў чым сябе не абмяжоўваючы. Яны весела размаўлялі, жартавалі, смяяліся, рабілі тысячу глупстваў, вішчалі скрыпкі, грукатаў барабан, трамбоны раўлі, як медныя быкі Фаларыда*, і сцэна, па меры таго як віно затуманьвала галовы, рабілася ўсё больш агіднай, ператварыўшыся нарэшце ў нейкую оргію *in petto*[1]. Тым часам мы з мсьё Маярам, пасля некалькіх бутэлек вужо і сатэрну, працягвалі нашую размову, крычучы на ўвесь голас. Слова, сказанае звычайным тонам, мела такія ж шанцы быць пачутым, як голас рыбіны з дна Ніягарскага вадаспаду.

— Сэр, — крыкнуў я яму ў вуха, — вы перад абедам нешта казалі пра небяспеку, якою пагражала старая сістэма палёгкі. Што вы мелі на ўвазе?

— О так, — адказаў ён, — часам становішча сапраўды рабілася вельмі небяспечным. Усе фантазіі вар'ятаў прадбачыць немагчыма, і, на маю думку, гэтак жа як і на думку доктара Смола і прафесара Пер'е, іх ніколі нельга пакідаць зусім без нагляду. Вар'яту часамі можна, так бы мовіць, патураць, але ўсё ж ён вельмі схільны да буйства. Да таго ж іхная незвычайная хітрасць зрабілася прыказкай. Калі ён штосьці задумаў, ён хавае гэта незвычайна вынаходліва, а спрыт, з якім ён удае душэўнае здароўе, ставіць перад філосафамі адну з найскладанейшых праблемаў у вывучэнні чалавечага

[1] Тут: у зародку (іт.).

розуму. Дарэчы, калі вар'ят выглядае цалкам здаровым, самы час надзець на яго ўтаймавальную кашулю.

— Але тая небяспека, дарагі сэр, пра якую вы згадвалі... ці спазналі вы яе на сабе тут, кіруючы гэтай установай? Ці маеце вы фактычныя падставы лічыць свабоду вар'ятаў небяспечнаю?

— Тут? На сабе? Ну, можна сказаць, так. Напрыклад, не так даўно ў гэтым самым доме адбылося выключнае здарэнне. Дзейнічала, як вы ведаеце, сістэма палёгкі, і пацыенты карысталіся поўнаю свабодай. Яны паводзілі сябе проста цудоўна, і нават больш за тое. Любы чалавек у сваім розуме зразумеў бы, што спее д'ябальская змова, ужо з аднаго таго, як надзвычайна добра паводзіліся гэтыя суб'екты. І, безумоўна, у адзін цудоўны дзень наглядчыкі ўбачылі, што вар'яты прысвоілі іхныя абавязкі, звязалі іх па руках і нагах, кінулі ў ізалятары і цяпер наглядаюць за імі, быццам вар'яты — яны.

— Не можа быць! Я ў жыцці не чуў нічога больш неверагоднага!

— Бясспрэчна. Усё адбылося праз аднаго дурня — ну, вар'ята, — які чамусьці ўбіў сабе ў галаву, што ён вынайшаў найлепшую сістэму кіравання, якая калі-небудзь увогуле існавала, — я маю на ўвазе сістэму кіравання вар'ятняй. Мяркую, ён вырашыў выпрабаваць сваё вынаходніцтва і падбухторыў астатніх пацыентаў да змовы з мэтаю зрынуць існае кіраўніцтва.

— І ён дабіўся свайго?

— Несумненна. Наглядчыкі й нагляданыя ў хуткім часе памяняліся месцамі. Нават больш за тое, бо вар'яты паранейшаму карысталіся свабодаю, а наглядчыкаў пасадзілі ў ізалятары і, з жалем мушу зазначыць, абыходзіліся з імі вельмі бесцырымонна.

— Аднак, мяркую, неўзабаве адбылася рэстаўрацыя ўлады? Не магло ж такое становішча трываць доўга. Сяляне, што жывуць побач, наведнікі, што прыходзяць агледзець дом, паднялі б трывогу.

— Вось тут вы памыляецеся. Галоўны бунтаўнік быў занадта хітры, каб такое дапусціць. Ён увогуле не пускаў

наведнікаў, за нядаўнім выняткам аднаго вельмі недалёкага з выгляду маладога чалавека, баяцца якога ён не бачыў прычынаў. Ён прыняў яго і паказаў дом — для забавы, каб з яго пасмяяцца. Дастаткова павадзіўшы яго за нос, ён адпусціў яго і адправіў дахаты.

— І як доўга тут верхаводзіў вар'ят?

— О, даволі доўга... не менш за месяц, а дакладней не скажу. Для вар'ятаў гэта быў вясёлы час, можаце быць упэўнены. Яны скінулі свае лахманы і напоўніцу скарысталіся вопраткай і ўпрыгожаннямі, якія тут былі. Вінныя склепы замка былі поўныя запасаў, а вар'яты ж наконт выпіць сапраўдныя чэрці. Цудоўныя для іх былі дзянькі, можаце мне паверыць.

— Ну а лекаванне? Якія асаблівыя метады лекавання ўвёў галава бунтаўнікоў?

— О, што да гэтага, то, як я ўжо казаў, вар'ят — не абавязкова дурань, і, на маю сціплую думку, ягонае лекаванне нашмат пераўзыходзіла ранейшае, якое ён скасаваў. Гэта была сапраўды выдатная сістэма — ясная, простая, яна не прыносіла ніякіх складанасцяў, нават самых дробных...

Тут майго гаспадара перарваў выбух скавытанняў, такіх жа, як тыя, што нядаўна парушылі наш спакой. Але гэтым разам яны, здаецца, хутка набліжаліся.

— Божа літасцівы! — ускрыкнуў я. — Вар'яты вырваліся на волю!

— Баюся, што так, — адгукнуўся мсьё Маяр, страшэнна збялеўшы.

І ледзь ён дагаварыў, ад вокнаў пачуліся гучныя крыкі й праклёны, і мы ўбачылі, што некалькі чалавек спрабуюць прарвацца ў пакой. У дзверы чымсьці білі, відаць, кувалдаю, а аканіцы хтосьці трос і зрываў з неўтаймоўнай ярасцю.

А потым запанаваў поўны хаос. Мсьё Маяр, страшэнна мяне здзівіўшы, кінуўся хавацца за буфет. Я чакаў ад яго большай рашучасці. Музыкі, якія апошнюю чвэрць гадзіны здаваліся занадта п'янымі, каб рабіць сваю справу, у адзін момант ускочылі, пахапалі свае інструменты, і, узлезшы на стол, зладжана зайгралі «Янкі Дудл»*, выканаўшы яго, пры ўсім гэтым гаме, можа, і не зусім дакладна, але з нечалавечым натхненнем.

Тым часам на абедзенны стол, раскідаючы бутэлькі і шклянкі, ускочыў той самы джэнтльмен, якога зусім нядаўна з такой цяжкасцю ад гэтага ўтрымалі. Цудоўна там уладкаваўшыся, ён пачаў прамову, якая, без усялякіх сумневаў, атрымалася б найвыдатнейшай, калі б была хоць якая магчымасць яе пачуць. Тут жа джэнтльмен, што сімпатызаваў ваўчкам, з неймавернай энергіяй закруціўся па ўсім пакоі, выцягнуўшы рукі пад прамым вуглом да цела; ён сапраўды стаў вельмі падобны да ваўчка і збіваў з ног усіх, хто трапляўся яму па дарозе. У гэты час, пачуўшы гучны свіст і шыпенне шампанскага, я выявіў, што ідуць яны ад суб'екта, які ўдаваў бутэльку гэтага далікатнага напою за абедам. І тут жа чалавек-жаба закрумкаў так старанна, нібы ад гэтых гукаў залежала выратаванне ягонай душы. І над усім гэтым разносіўся працяглы крык асла. Мая старая знаёмая мадам Жуаёз — як жа я шкадаваў небараку! — разгубілася цалкам: яна стаяла ля каміна і няспынна крычала на ўвесь голас: «Кукарэку-у-у-у-у-у-у-у-у!»

Нарэшце настаў найвышэйшы пункт, кульмінацыя драмы. З прычыны, што прысутныя не зладзілі ніякага супраціву, апроч крыку, выцця й кукарэкання, дзесяць вокнаў вельмі хутка паддаліся і амаль адначасова разбіліся. Я ніколі не забуду таго здзіўлення й жаху, з якімі глядзеў, як праз аконныя праёмы ўварвалася й змяшалася з намі ў адну кучу, б'ючыся, брыкаючыся, драпаючыся і выючы, цэлая армія істотаў, якіх я прыняў за шымпанзэ, арангутанаў або вялікіх чорных бабуінаў з Мыса Добрай Надзеі.

Я атрымаў магутны штуршок, ад якога скаціўся пад канапу і застыў у нерухомасці. Праляжаўшы там недзе з гадзіну і ўважліва прыслухоўваючыся да ўсяго, што адбывалася ў пакоі, я дачакаўся шчаслівае развязкі гэтай трагедыі. Выявілася, што мсьё Маяр, расказваючы пра вар'ята, які падбухторыў сваіх таварышоў да бунту, апавядаў мне пра ўласныя подзвігі. Гэты джэнтльмен два ці тры гады таму сапраўды кіраваў установаю, але крануўся і сам стаў пацыентам. Мой спадарожнік, што прадставіў нас адзін аднаму, пра гэта не ведаў. Дзесяцярых наглядчыкаў, знянацку пазбаўленых

улады, спачатку добра выпацкалі смалою, потым старанна вываялялі ў пер'і і замкнулі ў ізалятарах на ніжнім паверсе. Там яны праседзелі каля месяца, цягам якога мсьё Маяр спраўна забяспечваў іх не толькі смалой і пер'ем, якія былі элементамі ягонае «сістэмы», але й хлебам у невялікай колькасці і без абмежаванняў — вадою. Апошнюю штодзень перакачвалі ім помпаю. Урэшце адзін з вязняў, выбраўшыся праз сцёкавую трубу, вызваліў астатніх.

«Сістэма палёгкі» з істотнымі зменамі была адноўленая ў замку. Але я не магу не пагадзіцца з мсьё Маярам у тым, што ягоны метад «лекавання» быў у сваім родзе сапраўды выдатным — як ён сам зазначыў, ясным, простым і не прыносіў ніякіх складанасцяў, нават самых дробных.

Я мушу толькі дадаць, што, нягледзячы на старанныя пошукі па ўсіх бібліятэках Еўропы працаў доктара Смола і прафесара Пер'е, я да гэтага часу не змог знайсці ніводнай.

*Пераклала Кацярына Мацієўская*

# Размова з муміяй

Учорашняй бяседы было крыху зашмат для маіх нерваў. Мне пачала жахліва балець галава і да таго ж неадольна хіліла ў сон. З гэтай прычыны я, замест таго каб згодна з планамі прабавіць вечар у гасцях, вырашыў, што самае мудрае ў маім выпадку — злёгку павячэраць і неадкладна легчы спаць.

Вячэра была ну вельмі лёгкая. Я вялікі аматар грэнак па-валійску — гарачых, з расплаўленым сырам. Але нават іх звычайна не варта з'ядаць адным захадам больш за фунт. Тым не менш якія-небудзь сур'ёзныя пярэчанні нават супраць двух фунтаў адсутнічаюць. Двух ці трох — вялікай розніцы тут няма. Таму я спыніўся на чатырох. Мая жонка сцвярджае, што на пяці, але яна, несумненна, пераблытала дзве вельмі розныя рэчы. Саму па сабе лічбу пяць я не адмаўляю, але з усёй дакладнасцю магу давесці, што яна адносілася да бутэлек чорнага портара: без такой прыправы грэнак па-валійску трэба пазбягаць як толькі магчыма.

Сціпла такім чынам павячэраўшы і надзеўшы начны каўпак са шчырай надзеяй не здымаць яго да наступнага поўдня, я ўсклаў галаву на падушку і, як чалавек з самым чыстым сумленнем, у тое ж імгненне заснуў.

Але ці спраўджваліся калі чалавечыя надзеі? Бо не паспеў я выдаць і трэцяга храпу, як хтосьці люта зазваніў у мой званок, а пасля нецярпліва закалаціў дзвярным малатком — і гэта канчаткова абудзіла мяне. Праз хвіліну, калі я ўсё яшчэ праціраў вочы, жонка сунула мне пад нос цыдулку ад майго старога сябра, доктара Зубдамуса. Там было напісана:

Мой дарагі сябра! Як толькі вы гэта атрымаеце, абавязкова і неадкладна прыходзьце да мяне. Прыходзьце і парадуйцеся разам з намі! Пасля доўгіх і настойлівых дыпламатычных перамоваў я ўрэшце атрымаў ад дырэкцыі гарадскога музея згоду на вывучэнне муміі — вы памятаеце, якой. Мне дазволена распавіць і, калі трэба, ускрыць яе. Прысутнічаць пры гэтым будзе толькі некалькі сяброў — вы, безумоўна, у

іх ліку. Цяпер мумія ляжыць у мяне дома, раскручваць яе мы пачнем сёння аб адзінаццатай.

Шчыра ваш,

Зубдамус

Дайшоўшы да слова «Зубдамус», я зразумеў, што прачнуўся акурат у такой ступені, у якой гэта неабходна. Я ў захапленні выскачыў з ложка, руйнуючы ўсё па дарозе, проста з неверагоднай хуткасцю апрануўся і поўным ходам кінуўся да доктара.

Усе ўжо сабраліся і нецярпліва чакалі майго з'яўлення; мумію размясцілі на абедзенным стале. Я ўвайшоў акурат у самым пачатку даследавання.

Гэта была адна з дзвюх муміяў, прывезеных некалькі гадоў таму кузэнам Зубдамуса капітанам Артурам Ківерам з Лівійскіх гор, з пахавання каля Іліфіі*, за шмат кіламетраў ад Фіваў на Ніле. Пячоры ў гэтай мясцовасці хай сабе і не так уражваюць, як фіванскія пахаванні, але ўяўляюць вялікую цікавасць, бо ў іх можна знайсці шмат выяваў, што расказваюць пра быт егіпцянаў. Камера, у якой знайшлі наш экспанат, лічылася вельмі багатай на такія выявы: яе сцены былі суцэльна пакрытыя фрэскамі і барэльефамі, а статуі, вазы і раскошныя мазаікі сведчылі пра заможнасць памерлых.

Гэты скарб перамясціўся ў музей у тым самым выглядзе, у якім знайшоў яго капітан Ківер — труна засталася непатрывожанай. Так яна прастаяла ў музеі восем гадоў, даючы публіцы магчымасць выключна вонкавага агляду. Такім чынам, перад намі ляжала нікім не кранутая мумія, і тыя, хто ўяўляе, як рэдка старажытнасці дасягаюць нашых берагоў неабрабаванымі, адразу зразумеюць, колькі мы мелі нагодаў дзякаваць нашаму шчасліваму лёсу.

Падышоўшы да стала, я ўбачыў на ім вялікую каробку, ці скрыню, каля сямі футаў даўжынёй, прыкладна тры футы шырынёй і два з паловай футы вышынёй. Яна была прадаўгаватай формы, але не ў форме труны. Спачатку нам падалося, што яна выраблена з драўніны сікамора (сямейства платанавых), але, зрабіўшы надрэз, мы зразумелі, што яна з кардону ці, дакладней кажучы, з папірусавага

пап'е-машэ. Яна была пышна ўпрыгожаная сцэнамі пахавання і іншымі жалобнымі выявамі, якія ў самых розных месцах перамяжаліся аднолькавымі іерогліфамі, што без сумневу абазначалі імя памерлага. На шчасце, сярод нас знаходзіўся містэр Глідан*, які з лёгкасцю расшыфраваў зроблены простым фанетычным пісьмом надпіс. Ён чытаўся як «Хібанахібіё».

Адчыніць скрыню, не пашкодзіўшы яе, выявілася справай нялёгкай, аднак даўшы ўрэшце гэтаму рады, мы знайшлі ўнутры другую скрыню, больш падобную да труны і нашмат меншую за папярэднюю памерам, але ва ўсім астатнім — яе дакладную копію. Прамежак паміж імі быў запоўнены смалой, і гэта ў некаторай ступені пашкодзіла фарбы ўнутранай скрыні.

Адчыніўшы і яе (а гэта атрымалася ў нас досыць лёгка), мы дайшлі да трэцяй скрыні, якая таксама мела форму труны і адрознівалася ад папярэдняй толькі матэрыялам: яна была зробленая з кедру і дагэтуль струменіла своеасаблівы і надзвычай духмяны пах гэтага дрэва. Паміж гэтымі дзвюма скрынямі вольнага месца не заставалася — яны былі дакладна падагнаныя адна да адной.

Адчыніўшы трэцюю скрыню, мы знайшлі там саму мумію і выцягнулі яе вонкі. Мы чакалі, што яна, як звычайна, будзе цесна спавітая палатнянымі палосамі ці стужкамі, аднак замест гэтага ўбачылі штосьці накшталт пакрытага слоем замазкі футарала з папірусу, багата пазалочанага і размаляванага. Малюнкі гэтыя выяўлялі самыя розныя нібыта падарожжы душы і яе сустрэчы з шэрагам бостваў, а таксама безліч аднолькавых чалавечых фігурак — верагодна, адлюстраванняў забальзамаваных асобаў. Ад галавы да ног муміі папярочным слупком ішоў надпіс, зроблены фанетычнымі іерогліфамі, які зноў называў імя памерлага і яго тытулы, а таксама імёны і тытулы яго родных.

Такім самым футаралам шыю муміі ахаплівалі каралі з цыліндрычных рознакаляровых пацерак, сплеценых у форме багоў, скарабеяў і іншага, а таксама шару з крыламі. Такія ж каралі, ці пояс, ахаплівалі і талію.

Зняўшы папірус, мы ўбачылі, што цела ў выдатным стане і зусім не пахне. Скура была чырванаватага колеру, цвёрдая, гладкая і бліскучая. Зубы і валасы таксама добра захаваліся. Вочы, відаць, дасталі і замянілі на шкляныя шарыкі, надзвычай прыгожыя і неверагодна праўдападобныя, хіба што пазіралі яны занадта рашуча. Пазногці і пальцы блішчэлі пазалотай.

Містэр Глідан выказаў думку, што, мяркуючы па чырвоным колеры эпідэрмісу, цела бальзамавалася выключна асфальтавай смалой, аднак калі са скуры саскрэблі крыху парашкападобнага рэчыва і кінулі яго ў агонь, усе выразна адчулі водар камфоры і духмяных смолаў.

Мы вельмі старанна агледзелі цела, шукаючы адтуліны, праз якія звычайна дастаюцца вантробы, але, на сваё здзіўленне, нічога такога не знайшлі. У той час ніхто з нас не ведаў, што цэлыя і няўскрытыя муміі сустракаюцца не так ужо і рэдка. Мозг часцей за ўсё вымаўся праз нос, кішкі — праз надрэзы ў баку, пасля чаго цела галілі, абмывалі і апускалі ў саляны раствор, і толькі праз некалькі тыдняў пачыналася ўласна бальзамаванне.

Ніякіх надрэзаў мы так і не знайшлі, і доктар Зубдамус пачаў рыхтаваць інструменты для ўскрыцця, але тут я заўважыў, што мінула ўжо другая гадзіна ночы. Мы вырашылі адкласці ўнутранае даследаванне да наступнага вечара і сабраліся ўжо разыходзіцца, калі хтосьці сказаў: «А ці не правесці нам дослед-другі з гальванічнай батарэяй?»

Ідэя ўздзейнічаць на мумію ўзростам як найменш тры ці чатыры тысячы гадоў была калі і не зусім геніяльнай, то абсалютна свежай, і мы ўсе адразу ж яе падхапілі — на дзевяць дзясятых жартам і на адну дзясятую ўсур'ёз. Мы ўсталявалі ў кабінеце доктара батарэю і перанеслі туды егіпцяніна.

Толькі пасля доўгіх намаганняў мы здолелі крыху агаліць скроневыя цягліцы, якія выявіліся не такімі скамянелымі, як астатнія часткі цела, аднак (як мы і чакалі) натуральным чынам не паказалі пасля судакранання з дротам ніякай гальванічнай адчувальнасці. Вынікі гэтай першай спробы падаліся пераканаўчымі, і мы, у душы смеючыся з уласнай

дурасці, ужо вырашылі пажадаць адзін аднаму добрае ночы, калі мой погляд выпадкова ўпаў на мумію і адразу ж на ёй спыніўся. Але напраўду хапіла б і аднаго беглага позірку, каб упэўніцца ў тым, што вочы муміі, зробленыя, як мы меркавалі, са шкла і адзначаныя намі за рашучы выраз, былі цяпер прыкрытыя павекамі так, што бачнымі заставаліся толькі тонкія палоскі бялкоў.

Сваім ускрыкам я звярнуў увагу на гэтую акалічнасць, і праз імгненне пра яе ўжо ведалі ўсе.

Не магу сказаць, што з'ява гэтая мяне ўстрывожыла, бо трывога ў маім выпадку — не самае дакладнае слова. Цалкам магчыма, што калі б не чорны портар, я быў бы крыху ўсхваляваны. Што да рэшты нашае кампаніі, ніхто нават не спрабаваў схаваць жах, які яго апанаваў. На доктара Зубдамуса нават зірнуць без шкадавання было нельга. Містэр Глідан так спалохаўся, што нейкім адмысловым чынам увогуле зрабіўся нябачным. А ў містэра Сілка Бэкінгема, думаю, наўрад ці хопіць мужнасці адмаўляць, што ён кінуўся пад стол з усіх чатырох канцавінаў.

Аднак калі прайшло першае ўзрушэнне, мы, натуральна, тут жа вырашылі працягнуць эксперымент. Цяпер усе нашыя высілкі былі скіраваныя на вялікі палец правай нагі. Мы зрабілі надрэз з боку *os sesamoideum pollicis pedis*[1], агаліўшы корань адводнае цягліцы. Прыладзіўшы батарэю, мы скіравалі ток на рассечаны нерв, і тут мумія, рухаючыся зусім як жывая, спачатку сагнула правую нагу, амаль прыцісонуўшы калена да жывата, а пасля з неверагоднай сілай выпрастала канцавіну, узнагародзіўшы доктара Зубдамуса штурхалём, які меў досыць сур'ёзны вынік: гэты джэнтльмен вылецеў праз акно на вуліцу нераўнуючы камень з катапульты.

Мы ўсе разам кінуліся вонкі, каб прынесці разбітыя рэшткі ахвяры, аднак мелі шчасце спаткаць Зубдамуса на лесвіцы — ён на ўсёй магчымай хуткасці імчаў назад, прасякнуты філасафічнай жарсцю і больш чым калі-небудзь яшчэ

[1] Сесамападобная костка вялікага пальца нагі (лац.).

ўпэўнены ў неабходнасці з усёй сілай і ўсім запалам працягнуць наш дослед.

Згодна з яго парадай мы тут жа зрабілі глыбокі надрэз на кончыку носа аб'екта нашага эксперымента, і доктар, схапіўшы гэты самы нос нецярплівымі рукамі, рэзкім штуршком падцягнуў мумію да дроту.

Атмасфера наэлектрызавалася — як у фізічным, так і ў метафізічным, як у наўпростым, так і ў пераносным сэнсе. Па-першае, труп адкрыў вочы і некалькі хвілінаў вельмі хутка міргаў, акурат як містэр Барнс у пантаміме*, па-другое, ён чхнуў, па-трэцяе, сеў, па-чацвертае, патрос кулаком перад тварам доктара Зубдамуса і па-пятае, павярнуўшыся да высакародных Глідана і Бэкінгема, на дасканалай егіпецкай звярнуўся да іх з наступнымі словамі:

— Мушу сказаць, джэнтльмены, што вашыя паводзіны здзівілі мяне настолькі ж, наколькі пакрыўдзілі. Ад доктара Зубдамуса нічога лепшага і чакаць не варта, ён проста нікчэмны тоўсты дурань, іншага абыходжання ён і не ведае. Мне шкада яго, і яму я дарую. Але вы, містэр Глідан, вы, містэр Сілк, — вы, што столькі падарожнічалі і столькі часу правялі ў Егіпце, што можна падумаць, там і нарадзіліся, вы, якія так доўга жылі сярод нас, што гаворыце цяпер па-егіпецку гэтаксама свабодна, як, мяркую, пішаце на сваёй роднай мове, вы, якіх я заўсёды ўважаў за блізкіх сяброў муміяў, — ад вас я напраўду чакаў паводзінаў больш джэнтльменскіх. І што мне цяпер думаць пра вас, калі вы спакойна стаіце сабе і назіраеце, як непачціва са мной абыходзяцца? Як мне разумець тое, што вы дазваляеце любому сустрэчнаму здымаць з мяне саркафагі і адзежы ў такім агідна халодным клімаце? І самае галоўнае — якога меркавання трымацца мне што да вашае дапамогі і вашага судзейнічання гэтаму жалю вартаму нягодніку, гэтаму доктару Зубдамусу, у цяганні мяне за нос?

Можна было чакаць, што, пачуўшы ў такой сітуацыі гэтую прамову, кожны з нас альбо кінецца да дзвярэй, альбо заб'ецца ў істэрыцы, альбо ўвогуле страціць прытомнасць. Любое з гэтых трох дзеянняў выглядала б цалкам натуральна. Усе гэтыя спосабы рэагавання, безумоўна, маглі мець мес-

ца. І, слова гонару, я дагэтуль не магу зразумець, чаму нічога такога не адбылося ні з адным з нас. Магчыма, сапраўдная прычына гэтага палягае ў духу эпохі, які дзейнічае зусім адваротным спосабам і якім цяпер тлумачаць любую парадаксальную ці неверагодную з'яву. Альбо, можа быць, уся справа ў тым, што мумія трымалася вельмі натуральна і нязмушана, і гэта пазбавіла яе словы жахлівага гучання. Як бы там ні было, факт ёсць фактам: ніводны з нашае кампаніі не адчуў ніякага адмысловага трымцення і нават не падаў выгляду, што нешта вакол нас адбываецца надта ўжо не так.

Я, напрыклад, быў цалкам упэўнены, што ўсё так і мае быць, і толькі пасунуўся трошачкі назад, падалей ад кулака егіпцяніна. Доктар Зубдамус вельмі пачырванеў і, узіраючыся ў твар муміі, засунуў рукі ў кішэні штаноў. Містэр Глідан пагладзіў бараду і паправіў каўнер кашулі. Містэр Бэкінгем апусціў галаву і засунуў вялікі палец правай рукі ў левы куточак рота.

Некалькі хвілінаў егіпцянін сувора разглядаў яго і ўрэшце насмешліва зазначыў:

— Містэр Бэкінгем, чаго вы маўчыце? Вы чулі мае пытанні ці не? І дастаньце палец з рота!

Містэр Бэкінгем адразу ж злёгку скалануўся, дастаў вялікі палец правай рукі з левага куточка рота і ў якасці кампенсацыі ўклаў вялікі палец левай рукі ў правы куточак вышэйзгаданай адтуліны.

Не атрымаўшы адказу ад містэра Бэкінгема, мумія раздражнёна павярнулася да містэра Глідана і безапеляцыйным тонам у агульных выразах запатрабавала ад яго прыкладна таго ж самага.

Містэр Глідан грунтоўна адказаў ёй на размоўнай егіпецкай, і калі б у нашых амерыканскіх друкарнях не было такога сур'ёзнага недахопу іерагліфічных шрыфтоў, я з вялікім задавальненнем змясціў бы гэтую выбітную прамову ў арыгінале.

Тут я скарыстаюся магчымасцю і ўдакладню, што ўся наступная размова з муміяй вялася на старажытнаегіпецкай мове пры пасярэдніцтве (калі справа датычыла мяне і іншых сябраў-дамаседаў нашае кампаніі), пры пасярэдніцтве, паўта-

руся, перакладчыкаў містэра Глідана і містэра Бэкінгема. Гэтыя джэнтльмены гаварылі на матчынай мове ўсіх муміяў з непаўторнай хуткасцю і вытанчанасцю, але я не мог не звярнуць увагу на тое, што час ад часу (калі з'яўлялася неабходнасць закрануць нейкія цалкам сучасныя і, натуральна, цалкам невядомыя нашаму госцю паняцці) два падарожнікі былі змушаныя тлумачыць нейкія адмысловыя значэнні ледзь не на мігах. Так, напрыклад, у адзін момант містэр Глідан не мог патлумачыць егіпцяніну паняцце «палітыка» да таго часу, пакуль не намаляваў вугольчыкам на сцяне карбункуланосага джэнтльмена з падранымі локцямі, які выступаў з прамовай, адставіўшы назад левую нагу, правую руку са сціснутым кулаком выцягнуўшы наперад, з вачыма, вырачанымі ў нябёсы, і з ротам, адкрытым пад вуглом дзевяноста градусаў. А містэр Бэкінгем ніяк не мог патлумачыць вельмі сучаснае паняцце «сухі закон», пакуль згодна з парадай доктара Зубдамуса не дастаў з-пад палы і, моцна пачырванеўшы, не паказаў чужаземцу пустую флягу.

Зразумела, прамова містэра Глідана круцілася ў асноўным вакол тае вялікае карысці, якую прыносіць навуцы раскручванне і ўскрыццё муміяў. З гэтай прычыны ён выбачыўся за ўсе нязручнасці, якія давялося сцярпець, у прыватнасці, муміі на імя Хібанахібіё, і скончыў лёгкім намёкам (бо іначай акрэсліць яго вагу наўрад ці магчыма), што калі з усімі гэтымі нязначнымі падрабязнасцямі скончана, надышоў самы час працягнуць запланаваныя даследаванні. На гэтых словах доктар Зубдамус падрыхтаваў свае інструменты.

Што да апошняй прапановы прамоўцы, то тут у Хібанахібіё былі пэўныя сумневы, прыроды якіх я так канчаткова і не зразумеў. Але прабачэнні яго задаволілі: падняўшыся са стала, ён паціснуў рукі ўсёй кампаніі.

Скончыўшы гэтую цырымонію, мы адразу ж заняліся выпраўленнем пашкоджанняў, нанесеных нашаму госцю скальпелем. Мы зашылі рану на скроні, забінтавалі нагу і наляпілі цэлы дзюйм чорнага пластыру на нос.

І тут мы заўважылі, што граф (здаецца, менавіта такі тытул меў Хібанахібіё) злёгку дрыжыць — без сумневу, ад хо-

ладу. Доктар адразу ж скіраваўся да свайго гардэробу і хутка вярнуўся з чорным фракам наймаднейшага крою, парай клятчастых нябесна-блакітных панталонаў са штрыпкамі, ружовай кашулькай у палоску, шырокай гафтаванай камізэлькай, белым плашчом, тросцю з гнутай ручкай для шпацыраў, капелюшом без палёў, ботамі з лакаванай скуры, саламянага колеру лайкавымі пальчаткамі, маноклем, накладнымі бакенбардамі і гальштукам, завязаным двайным «гордыевым» вузлом. Праз неадпаведнасць памераў графа і доктара (у прапорцыі два да аднаго) падчас адзявання егіпцяніна мы сутыкнуліся з некаторымі праблемамі, але калі ўсе яны былі вырашаныя, сябра нашага можна было лічыць адзетым. Містэр Глідан падаў яму руку і правёў да зручнага фатэля каля каміна, а доктар тым часам пазваніў, каб прынеслі цыгары і віно.

Размова хутка ажывілася. Найбольшую цікавасць, натуральна, выклікала тое, што Хібанахібіё нейкім дзівосным чынам да гэтага часу застаўся жывы.

— Мне падаецца, — заўважыў містэр Бэкінгем, — што вы даўно ўжо мусілі памерці.

— З чаго б гэта? — вельмі здзіўлена пацікавіўся граф. — Мне ж не нашмат больш за семсот гадоў! Мой бацька пражыў тысячу і тым не менш памёр пры ясным розуме.

Тут пасыпаліся пытанні і падлікі, у выніку чаго зрабілася відавочным, што егіпцянін значна недаацаніў свой узрост: ён праляжаў у іліфійскіх катакомбах пяць тысяч пяцьдзясят гадоў і яшчэ некалькі месяцаў.

— Але мая заўвага, — зазначыў містэр Бэкінгем, — ніякім чынам не датычыць вашага ўзросту на момант пахавання. Магу дапусціць, што вы, па сутнасці, яшчэ досыць малады; мая думка абумоўленая працягласцю таго часавага прамежку, цягам якога вы, паводле вашых жа сведчанняў, праляжалі ў асфальтавых смолах.

— У чым, у чым? — удакладніў граф.

— У асфальтавых смолах, — паўтарыў містэр Бэкінгем.

— А-а, гэта... Я, здаецца, разумею, пра што вы. Пэўна, іх таксама можна выкарыстоўваць. Але ў мае часы мы наўрад ці ўжывалі штосьці апроч хлорнай ртуці.

— Вось чаго мы зусім ніяк не можам зразумець, — сказаў доктар Зубдамус, — дык гэта таго, як вы, памерлы і пахаваны ў Егіпце пяць тысяч гадоў таму, сёння выявіліся вельмі нават жывым — і выглядаеце проста цудоўна.

— Калі б я быў, як вы кажаце, памерлым, — адказаў граф, — больш чым верагодна, што цяпер я б такім і заставаўся. Я бачу, вы ў гальванізме пакуль яшчэ зусім дзеці і не можаце з яго дапамогай дасягнуць таго, што лічылася ў старыя часы рэччу самай звычайнай. Уся справа ў тым, што ў мяне здарыўся каталептычны прыпадак, і добрыя мае сябры вырашылі, што я альбо памёр, альбо блізкі да гэтага, таму яны мяне тут жа забальзамавалі — спадзяюся, вы добра ўяўляеце сабе асноўныя прынцыпы бальзамавання?

— Не тое каб зусім...

— Ох, ну якое безнадзейнае невуцтва! Але не магу ж я цяпер занурацца ў дэталі. Хаця трэба патлумачыць, што ў Егіпце набальзамаваць па сутнасці значыла спыніць на няпэўны час усе жыццёвыя функцыі, залежныя ад працэсаў у арганізме. Я ўжыў тут слова «жыццёвыя» ў самым шырокім сэнсе, які ўлучае не толькі фізічнае, але і духоўнае, і вітальнае быццё. Паўтаруся, што ў нас асноўны прынцып бальзамавання — гэта імгненнае спыненне і захаванне навечна ўсіх жыццёвых функцыяў, залежных ад працэсаў у арганізме. Карацей кажучы, у якім стане знаходзіўся чалавек падчас бальзамавання, у такім ён і застаецца. Я меў шчасце нарадзіцца з крывёй Скарабея і таму быў забальзамаваны жывым, такім, якім вы цяпер мяне бачыце.

— З крывёй Скарабея? — усклікнуў доктар Зубдамус.

— Так. Скарабей быў эмблемай, ці сімвалам, аднаго выбітнага і вельмі арыстакратычнага роду. Нарадзіцца з крывёй Скарабея — значыць проста належаць да адной з тых сем'яў, якія мелі сваёй эмблемай Скарабея. Гэта я так метафарычна выказаўся.

— Але як гэта звязана з тым, што вы засталіся жывым?

— Ну, у Егіпце прынята перад бальзамаваннем даставаць у мерцвяка вантробы і мозг, і толькі род Скарабея не трымаецца гэтае традыцыі. А таму, калі б я не быў Скарабеем, то

пазбавіўся б вантробаў і мозгу, без якіх, між іншым, жыць досыць нязручна.

— Ага, зразумела, — сказаў містэр Бэкінгем. — Значыць, усе няўскрытыя муміі, што трапляліся нам, належалі да роду Скарабея?

— Без сумневу.

— А я думаў, — сціпла заўважыў містэр Глідан, — што Скарабей быў адным з егіпецкіх багоў.

— Адным з егіпецкіх чаго? — усклікнула мумія, ускочыўшы.

— Багоў! — паўтарыў падарожнік.

— Містэр Глідан, мне напраўду дзіўна чуць ад вас такія словы, — сказаў граф, зноў сядаючы ў фатэль. — Ніводны народ на зямлі ніколі не прызнаваў існаванне больш чым аднаго бога. Скарабей, Ібіс і іншыя былі для нас (а для кагосьці іншага — іншыя стварэнні) усяго толькі сімваламі, ці пасярэднікамі, праз якіх мы ўслаўлялі Творцу, занадта велічнага, каб звяртацца да яго наўпрост.

Тут павісла паўза. Праз некаторы час доктар Зубдамус працягнуў размову:

— Згодна з вашымі тлумачэннямі, зусім не выключана, — сказаў ён, — што ў катакомбах ля Ніла могуць ляжаць і іншыя жывыя муміі сямейства Скарабея?

— Без усялякіх сумневаў, — адказаў граф. — Усе Скарабеі, выпадкова забальзамаваныя жывымі, застаюцца жывымі дагэтуль. І нават забальзамаваныя жывымі спецыяльна маглі быць забытыя сваімі павернікамі і дагэтуль ляжаць у трунах.

— А ці не маглі б вы патлумачыць, — папрасіў я, — што вы маеце на ўвазе пад словамі «забальзамаваныя жывымі спецыяльна»?

— З вялікім задавальненнем, — адказаў егіпцянін, няспешна агледзеўшы мяне праз манокль, бо гэта быў першы раз, калі я насмеліўся звярнуцца да яго з пытаннем.

— З вялікім задавальненнем, — паўтарыў ён. — У мае часы сярэдняя працягласць чалавечага жыцця складала прыкладна восемсот гадоў. Людзі рэдка паміралі, не дажыўшы да шасцісот, — хіба толькі ад няшчаснага выпадку, — і рэдка жылі даўжэй за дзесяць стагоддзяў. Восемсот гадоў лічы-

ліся сярэднім тэрмінам. Пасля таго як быў вынайдзены той прынцып бальзамавання, пра які я ўжо расказаў, нашым філосафам прыйшло ў галаву задаволіць вартую павагі цікаўнасць, а да таго ж пасудзейнічаць развіццю навукі, пражываючы гэты тэрмін па частках. Для гісторыі, напрыклад, такі досвед проста неабходны. Уявім сабе гісторыка, які дасягнуў пяцісотгадовага ўзросту, напісаў кнігу, уклаўшы ў яе шмат намаганняў, і пасля быў старанна забальзамаваны, пакінуўшы сваім павернікам указанні праз некаторы час ажывіць яго — ну, скажам, гадоў праз пяцьсот ці шэсцьсот. Вярнуўшыся да жыцця па сканчэнні гэтага тэрміну, ён абавязкова ўбачыць, што яго вялікую працу ператварылі ў набор маргіналіяў, так бы мовіць, у літаратурную арэну для супярэчлівых гіпотэзаў, загадак і прыватных спрэчак усёй хеўры раздражнёных каментатараў. Ён убачыць, што гэтыя гіпотэзы, распаўсюджаныя ў выглядзе анатацыяў ці выпраўленняў, да такой ступені зацямнілі, сказілі і знішчылі першапачатковы тэкст, што аўтару даводзіцца шукаць яго днём з агнём. Робіцца зразумелым, што не варта было даваць сабе клопату з гэтым даследаваннем. Пасля таго як кніга цалкам перапісаная, гісторыку ставіцца ў абавязак неадкладна выправіць з пазіцый уласнага досведу і ведаў паданні сённяшняга дня пра эпоху, у якую ён жыў. Дзякуючы такому перапісванню і самавыпраўленню, за якое час ад часу бяруцца асобныя мудрацы, наша гісторыя яшчэ не ператварылася ў чыстую казку.

— Прашу мне прабачыць, — сказаў тут доктар Зубдамус, мякка паклаўшы сваю руку на руку егіпцяніна, — прашу мне прабачыць, але ці магу я на хвілінку вас перапыніць?

— Канечне, сэр, — адказаў граф і замаўчаў.

— Мне толькі хацелася задаць вам адно пытанне, — сказаў доктар. — Вы казалі пра тое, што гісторык сам выпраўляе памылкі ў паданнях пра яго эпоху. Тады скажыце, прашу вас, колькі праўды звычайна заставалася ва ўсёй гэтай кабалістыцы?

— Уся гэтая, як вы правільна заўважылі, кабалістыка звычайна выяўляецца настолькі ж праўдзівай, як і факты ў

кнігах, якія самі гісторыкі потым не перапісвалі: невядома ніводнае дэталі, якая так ці іначай не была б цалкам і дарэшты памылковай.

— Калі мы з вамі высветлілі, — працягнуў доктар, — што з часу вашага пахавання прайшло не менш за пяць тысяч гадоў, я ўпэўнены, што вашыя тагачасныя гістарычныя працы, а можа, нават паданні ўтрымлівалі шмат падрабязнай інфармацыі на тэму, цікавую для усіх, — тэму стварэння свету, якое адбылося, як вы, мабыць, ведаеце, усяго за тысячу гадоў да вашага нараджэння.

— Прашу прабачэння, сэр?.. — не зразумеў граф Хібанахібіё.

Доктар паўтарыў сваю думку, але яму давялося шмат дадаткова тлумачыць, перш чым чужаземец змог яго зразумець. Урэшце апошні няўпэўнена сказаў:

— Згаданыя вамі ідэі, шчыра прызнаюся, для мяне зусім новыя. У мае часы я не ведаў нікога, хто б трымаўся незвычайнай фантазіі, нібыта сусвет (ці гэты свет, калі вам будзе заўгодна) увогуле калісьці меў пачатак. Помніцца, як аднойчы і толькі аднойчы я чуў ад аднаго мысляра штосьці аддалена да гэтага падобнае, звязанае з паходжаннем чалавечае расы. Дарэчы, гэты чалавек ужываў імя Адам, ці Гліна, пра якое вы гаварылі. Аднак ужываў ён яго ў шырокім сэнсе, кажучы пра адвольнае зараджэнне з урадлівай глебы (як зарадзіліся тысячы ніжэйшых відаў), адвольнае зараджэнне, паўтаруся, пяці вялізных чалавечых плямёнаў, што адначасова з'явіліся ў пяці асобных, але амаль роўных частках свету.

Тут мы ўсе пацiснулі плячыма, а нехта з нас нават са шматзначным выглядам пастукаў сябе па ілбе. Містэр Сілк Бэкінгем, слізгануўшы позіркам спачатку па патыліцы, а потым па макаўцы Хібанахібіё, зазначыў:

— Такая працягласць чалавечага жыцця ў вашыя часы, а таксама адзінкавыя выпадкі пражывання яго, як вы казалі, па частках, мусілі напраўду моцна паўплываць на агульнае развіццё і назапашванне ведаў. А таму я мяркую, што мы можам вытлумачыць відавочнае адставанне ўсіх дасягненняў старажытнаегіпецкай навукі ад сучасных, асабліва ад дасягненняў янкі, надзвычайнай цвёрдасцю егіпецкіх чарапоў.

— Мушу прызнацца, — пачціва сказаў граф, — што я згубіў вашую думку. Скажыце, калі ласка, якія дасягненні навукі вы маеце на ўвазе?

Тут уся нашая кампанія хорам пачала падрабязна расказваць пра палажэнні фрэналогіі* і пра цуды жывёльнага магнетызму.

Выслухаўшы нас да канца, граф пераказаў некалькі анекдотаў, з якіх мы зразумелі: слава прататыпаў Галя* і Шпурцгайма* была ў зеніце і пасля закацілася ў Егіпце так даўно, што пра іх паспелі ўжо забыць, а цуды Месмера* былі напраўду вартымі жалю фокусамі ў параўнанні з дзівосамі фіванскіх мудрацоў, якія стварылі вошаў і мноства такога іншага.

Тут я спытаў у графа, ці ўмелі яго землякі вылічваць час зацьменняў. Ён досыць пагардліва ўсміхнуўся і адказаў, што ўмелі.

Гэта крыху мяне збянтэжыла, але я працягваў распытваць яго пра астранамічную навуку егіпцянаў, пакуль адзін з нашае кампаніі, які дагэтуль ні разу не адкрыў рота, не шапнуў мне на вуха, што па гэтым пытанні мяне нашмат лепей пракансультуе Пталямей (і хто гэта такі?), а яшчэ нейкі Плутарх у працы *De facie lunae*[1].

Тады я спытаў мумію пра запальвальныя шкельцы, лінзы і ўвогуле пра вытворчасць шкла, але не паспеў нават скончыць пытанне, як маўклівы ўдзельнік зноў ціха крануў мяне за локаць і дзеля ўсяго святога папрасіў лепш зірнуць у працы Дыядора Сіцылійскага*. Граф жа замест адказу пацікавіўся, ці маем мы мікраскопы, якія дазволілі б нам выразаць камеі, што рабілі егіпцяне. Пакуль я думаў, што адказаць на гэтае пытанне, маленькі доктар Зубдамус даў вельмі незвычайнага маху:

— А паглядзіце на нашую архітэктуру! — усклікнуў ён да вялікага абурэння абодвух падарожнікаў, якія пачалі шчыкаць яго амаль да сінякоў, але без ніякае карысці. —

[1] «Пра твар, бачны ў дыску месяца» (лац.) — дыялог Плутарха (46–120 н. э.).

Паглядзіце на фантан, што на Боўлінг-Грын* у Нью-Ёрку! — захоплена працягваў ён. — Ці, калі ён занадта велічны для сузірання, успомніце на імгненне Капітолій у Вашынгтоне*!

І добры маленькі доктар пачаў вельмі падрабязна апісваць усе элементы будынка, які толькі што згадаў. Ён патлумачыў, што адзін партал упрыгожаны не менш як дваццаццю чатырма калонамі пяці футаў у дыяметры на адлегласці дзесяці футаў адна ад адной.

Граф адказаў, што ён, на жаль, не можа цяпер прыгадаць дакладныя памеры любога значнага будынка ў горадзе пад назвай Азнак*, закладзеным калісьці ў цемры часу і руіны якога пры жыцці графа ўсё яшчэ можна было пабачыць у шырокай пустэльні на ўсходзе ад Фіваў. Аднак калі гаварыць пра парталы, то яму прыгадваецца, што адзін такі, прыбудаваны да пасрэднага палаца ў Карнаку* (гэта штосьці накшталт прыгарада), складаўся са ста сарака чатырох калонаў трыццаці сямі футаў па акружнасці на адлегласці дваццаці пяці футаў адна ад адной. З боку Ніла да палаца можна было пад'ехаць па алеі даўжынёй дзве мілі, утворанай сфінксамі, статуямі і абеліскамі вышынёй дваццаць, шэсцьдзесят і сто футаў. Сам палац, наколькі ён памятае, быў дзве мілі ў даўжыню і штосьці каля сямі па акружнасці. Муры яго былі ўсярэдзіне і звонку багата распісаныя іерогліфамі. Ён не можа дакладна сказаць, ці змясцілі б сцены гэтага палаца пяцьдзясят ці шэсцьдзесят Капіталіяў доктара, але ён упэўнены, што з некаторымі цяжкасцямі туды можна было б увапхнуць іх штук дзвесце-трыста. І ўсё ж палац у Карнаку быў досыць нязначным будынкам. Тым не менш ён, граф, з усёй шчырасцю не можа адмовіць фантану на Боўлінг-Грын у арыгінальнасці, раскошнасці і выбітнасці, як казаў пра яго доктар. Нічога такога, ён вымушаны адзначыць, ніколі не бачылі ні ў Егіпце, ні дзе-небудзь яшчэ.

Я спытаў у графа, што ён можа сказаць пра нашыя чыгункі.

— Нічога асаблівага, — адказаў ён. Яны досыць ненадзейныя, нядбайна зробленыя і нязграбна пакладзеныя. Іх нельга нават параўноўваць, скажам, з шырокімі, роўнымі, наўпростымі дарогамі з жалезнымі латакамі, па якіх егіпцяне

транспартавалі вялікія храмы і цэльныя абеліскі вышынёй сто пяцьдзясят футаў.

Я згадаў пра нашыя вялізныя механічныя сілы.

Ён пагадзіўся, што нешта пра гэта чуў, але пацікавіўся, якім чынам я справіўся б з задачай падняць пяты арак хаця б аднаго з невялікіх палацаў Карнака.

Я вырашыў не пачуць гэтае пытанне і пацікавіўся, ці ўяўляе ён, што такое артэзіянскі калодзеж, але ён проста падняў бровы, тым часам як містэр Глідан пачаў мне люта падміргваць і зашаптаў, што, маўляў, адзін такі быў зусім нядаўна знойдзены інжынерамі, якія рабілі свідравіну, шукаючы ваду ў Вялікім Аазісе*.

Я ўспомніў пра нашую сталь, але чужаземец толькі задраў нос і пацікавіўся, ці можна з дапамогай нашай сталі выконваць каменярэзныя працы — такія, як на абелісках, што, дарэчы, былі зробленыя выключна меднымі разакамі.

Гэта настолькі нас збянтэжыла, што мы вырашылі разнастаіць свае нападкі і звярнуцца да метафізікі. Быў прынесены асобнік «Даела»*, адкуль мы зачыталі частку-другую пра нешта досыць няўцямнае, але акрэсленае бостанцамі як «вялікі рух прагрэсу».

Але граф толькі і сказаў, што «вялікія рухі» ў яго час здараліся ледзь не кожны дзень. Што ж да прагрэсу, то некаторы час ён прыносіў-такі пэўныя нязручнасці, але надта далёка не пайшоў.

Тады мы загаварылі пра каштоўнасці і значнасць дэмакратыі і паспрабавалі, хоць і з сур'ёзнымі цяжкасцямі, уразіць графа тымі разумнымі перавагамі, якімі мы карысталіся, галасуючы як душа пажадае і не маючы над сабой караля.

Граф слухаў нас з відавочнай цікавасцю: выглядала, што нашыя словы яго добра павесялілі. Калі мы скончылі, ён зазначыў, што калісьці даўно ў іх адбывалася нешта падобнае да гэтага. Трынаццаць егіпецкіх правінцыяў вырашылі раптам зрабіцца свабоднымі і паказаць прыўкрасны прыклад усяму чалавецтву. Яны склікалі сваіх мудрых мужоў і зляпілі самую выштукаваную канстытуцыю, якая толькі магчымая. Некаторы час яны някепска спраўляліся, вось толькі сама-

надзейнасць іх была надзвычайнай. Калі гэтыя трынаццаць штатаў аб'ядналіся з астатнімі пятнаццаццю ці дваццаццю, усё скончылася, выліўшыся ў такую гнюсную і невыносную дэспатыю, якая толькі магла існаваць на Зямлі.

Я спытаў, як звалі іх узурпатара.

Наколькі памятаў граф, яго звалі Натоўп.

Не ведаючы, што казаць далей, я ўзвысіў голас і пашкадаваў, што егіпцяне не ведалі пары.

Граф паглядзеў на мяне са здзіўленнем, але прамаўчаў. А маўклівы джэнтльмен з усяе моцы пхнуў мяне локцем у рэбры і прашаптаў, што я ўжо дастаткова паказаў свае здольнасці, здзівіўшыся толькі, як нават такі дурань, як я, можа не ведаць, што сучасны паравы рухавік заснаваны на вынаходніцтве Герона, апісаным Саламонам дэ Ко*.

Параза нашая падавалася непазбежнай, але, на шчасце, доктар Зубдамус, сабраўшыся з думкамі, прыйшоў нам на дапамогу і пацікавіўся, ці могуць егіпцяне скласці нашым сучаснікам сур'ёзную канкурэнцыю ў такім важным пытанні, як адзенне.

Граф зірнуў на штрыпкі сваіх панталонаў, потым узяў адну з фалдаў фрака, паднёс яе да самых вачэй і разглядаў так некалькі хвілінаў. Калі ён урэшце выпусціў яе, яго ўсмешка спакваля распаўзлася ад вуха да вуха, аднак не магу прыгадаць, каб ён штосьці адказаў.

Тут мы павесялелі, і доктар, з вялікай важнасцю падышоўшы да егіпцяніна, пажадаў дазнацца, ці можа даць ён зуб, што яго супляменнікі здолелі калі-небудзь наладзіць вытворчасць «Пігулак Зубдамуса» ці «Таблетак Брандрэта»*.

З глыбокім трымценнем чакалі мы адказу — але марна. Адказу не было. Егіпцянін пачырванеў і апусціў галаву. Ніколі трыюмф не быў такім поўным, ніколі параза не прымалася з такім жалю вартым выглядам. Шчыра кажучы, я не мог нават глядзець на прыгнечаную мумію. А таму ўзяў свой капялюш, суха пакланіўся графу і выйшаў.

Вярнуўшыся дадому, я ўбачыў, што ўжо пятая гадзіна, і тут жа скіраваўся ў ложак. Цяпер дзесяць гадзінаў ранку. Я на нагах з сямі, заняты напісаннем гэтай памятнай нататкі

на карысць мае сям'і і ўсяго чалавецтва, якіх я больш ніколі не ўбачу. Мая жонка — змяя. Папраўдзе кажучы, мне дарэшты абрыдла і гэтае жыццё, і гэтае дзевятнаццатае стагоддзе ўвогуле. Я ўпэўнены, што ўсё ідзе кепска. Да таго ж мне страшна цікава, хто будзе прэзідэнтам у 2045-м. А таму як толькі я пагалюся і праглыну кубачак кавы, то адразу ж скіруюся да доктара Зубдамуса і папрашу забальзамаваць мяне на пару стагоддзяў.

*Пераклала Ганна Янкута*

# Тамерлан

У час смяротны суцяшэнне,
Стары, цяпер не для мяне!
Я не ў вар'яцкім захапленні,
Што спіша ўла́да на зямлі
Грахі, што не з яе пайшлі.
Час мроіць ці кахаць? Ды не!
Агонь агнёў назваць надзеяй?
А тая жарсць адно буцвее:
Каб *мог* я жыць надзеяй, Божа!
З крыніцы боскае святой,
Цябе не зваў бы дурнем, можа,
Ды гэта лёс, стары, не твой...

Спазнай жа *духу* таямніцу,
Што ў сорам з дзікай пыхі ўпаў.
О сэрца палкае! Драбніцу
Твайго змарнення я прыняў,
Прывялай славы, дзе спакон
Брыльянтамі зіхцеў мой трон...
Ах, пекла! Ні яно, ні прах
Мяне не змусяць зведаць жах —
А ў сэрцы боль па першацвеце,
Па сонечным мінулым леце!
Я чую голас у цішы —
Праз пустату маёй душы.
Гучыць у ёй, нібы заклён,
Хаўтурны векавечны звон.

Я не заўсёды гэткі быў:
Карону, ўсю ў агні, здабыў
Прымусам. Хіба ж не з такім,
Як мой, захопніцкім імпэтам
Быў Цэзарам здабыты Рым?

Уладны дух трыюмфаваў
Над родам чалавечым гэтым,
Як над адной са звыклых з'яў.

Што ж, гадаваўся я ў гарах:
Над галавою ў час начны
Таглай развешваў туманы,
Яе зарошваў — і працяг
Жыцця мне ўжо на ўсе часы
Кудлаціў бурай валасы.

Раса лілася на мяне
У пекле вусцішнай начы
З нябёсаў (у спазнелым сне);
І, сполахамі плюючы,
Агонь з-за хмар, што, як сцягі,
Віселі, так шугаў здалёк
І ўлады відмам вабіў зрок,
І гул грымот праз берагі
Каціўся нада мною з весткай
Пра бітву люду, й голас мой
Гучаў — дурны, дзіцячы! — рэзка
(О, з неўтаймоўнасцю якой —
Аж ад яе нямеў язык),
І вырастаў трыюмфу крык!

Гулі вятры, лілі дажджы
У мяне над голай галавой;
Зацьміўся зрок, слых, розум мой,
Ды *людзі* мне, што ні кажы,
Маглі даць лаўры; і напад
Вятроў прарокаваў мне бітвы,
Вяшчаў імперый занапад.
І — пад нявольнікаў малітвы —
Гурма ліслiўцаў на паклон
Ішла ды абступала трон.

І поцяг мой, каб быць тыранам,
Быў наймацнейшы з той пары —
І не здаваўся ён падманам
Для іншых; хай сабе і так!
Але ўва мне жыла, стары,
*Адна*: з дзяцінства раздзьмувала
Ўва мне агонь яна няўзнак
(Век юнай жарсці — нетрывалы),
А й ведала, што слабасць ёсць
І ў сэрцы з каменю — мілосць.

А я — на жаль! — не маю слоў
Сказаць любоўна пра любоў!
Дае мажлівасць мовы дар
Адно апісваць пекны твар...
Ды не пра тое я: штодзень
Вятрыскі зменлівага цень
Я ўзгадваю, бо гэта ён
Павольным зрокам прагарнуў
Старонкі, каб я сэнс пісьмён
Спасціг, які ўжо не відзён,
І ў мрою выліўся ў адну.

О, вартая Любові ўсёй
Была яна — што змалку я
Адчуў: маглі анёлы ёй
Зайздросціць толькі, і мая
Надзея ў сэрца да яе
Тым'янам, нібы на алтар,
Цякла, у цноце й чысціні...
Ах, шчырасці няма тае
Даўно ўва мне, дзіцячых мар!
Бо я шукаў святла ў агні...

Раслі мы разам: закахана
Блукалі між хмызоў і траў;
Грудзьмі ад сцюжаў я аддана
Яе затульваў і чакаў
Усмешак сонца. І працяг
Нябёс быў у *яе* вачах.

Урок душы дае Мілосць,
Пад тым бо сонцам, між уцех
Мы забывалі ўсе, што ёсць,
Турботы... Быў дзявочы смех
Гарэзлівы; я да грудзей
Яе ў раскошы прыпадаў,
Душу ў слязах усё часцей
Без лішніх словаў выліваў.
Яна ж і не пытала шмат:
Спакойны быў яе пагляд.

Ды большага мой дух хацеў:
Ён ад амбіцый вар'яцеў,
Калі я на гары крутой
Стаяў — ён біўся сам з сабой.
А ты была маім жыццём:
І ўсё, што запаўняла свет —
Зямля, паветра, — пачуццём
Уцехаў, прадчуваннем бед
Было — і новым захапленнем,
І мрояй прывіднай начы,
Што (цьмяным і нікчэмным сненням
Кшталт больш рэальны даючы)
Плыла на крылах туманоў...
І — цуд! Імя і вобраз твой
Былі ў свядомасці маёй
Асобна — а зліліся зноў!

Любіў я славу моцна. Не,
Таго не цяміш ты, стары!
Галетніку, паўсвету мне
Здабыць — наяве, а не ў сне —
Хацелася з тае пары.
Бо сненні, перш чым зіркне дзень,
Знікаюць з росамі, як ёсць,
А мары, нібы той прамень,
Заўсёды жывіць Прыгажосць:
І ёй штодня, штохвілі я
Быў зачараваны ўдвая.

І поруч мы па схіле йшлі
Гары высознай і былі
Пад позіркам, што ёй належаў:
Ён да хацін на ўзгорках вёў
Сярод узлескаў, скалаў-вежаў
Пад плёскат сотняў ручаёў.

Каханай я апавядаў
Пра ўладу, годнасць: той расказ
(Містычным чынам!) выглядаў
Нічым, бо я чытаў штораз —
І бесклапотным быў мой зрок —
Падобнае ў вачах яе;
Нібы румянец пекных шчок
Жывіў амбіцыі мае,
Нібы ззяў толькі ён праз змрок
Бяздоннай дзікасці тае...

І я ў раскошы патануў,
Карону ўяўную надзеў,
Але не ў мроях і не ў сне
Убор створаны фальшывы мне —

Убачыў праўду я адну:
Да ўладара амбіцый леў
У збоі ціхенька паўзе;
Іначай — у пустэльні, дзе
Агню не ўтаймаваць, павер,
Калі яго раздзьмухаў звер!

На Самарканд цяпер зірні! —
Хіба ён гарадам не цар?
Ці ж не ў ягонай далані
Іх лёсы? Нібы валадар,
Як цуд, не бачаны здавён,
Самотна-горда ўзнёсся ён...
Калі б прыйшоў ягоны скон,
Апошні камень лёг бы ў трон!
А хто ж скарыў вялікі свет?
Каранаваны рабаўнік,
Цімур, здзівіў народы — й след
Імперый бляску знік...

Мілосць! Ты ёсць у нас, людская,
Ты — наш спадзеў дайсці да раю,
Дождж, што душу, дзе сухавей
Стварыў пустэльню, найжвавей
Як след умее ажывіць,
Ды буйства сэрца не спыніць!
О, думка! Ты жыццё, свет мрой
Мацуеш музыкай адной,
Спрадвечнай пекнатой — наздзіў...
Бывай! Сусвет я ўжо здабыў!

Надзея ў небе, як арол,
Ляціць, і вольны небасхіл;
А вочы ўжо глядзяць у дол,
І мкне дадому поцяг крыл.

Заходзіць сонца, гасне зрок,
І ў сэрца западае змрок,
Дзе славы ўсё гарэў агмень
І — летні сонечны прамень.
Імглу вячэрнюю яно
Знялюбіць — слухацьме адно
Сутоння гукі (чуе іх,
Хто ўмее чуць). Спасціг
Пагрозы ў снах той, хто *хацеў*
Ад іх *зляцець*, ды *не ўзляцеў*.

Халоднай поўня белізной
Зеніт начны сустрэне свой
І промні ўсмешліва пралье
У час тугі. Вось, паўстае
(Не перавесці й дых як след!)
Па смерці зроблены партрэт.
Маленства — сонца летніх дзён,
Якога непазбежны скон,
Бо досвед, мудрасць, веды ўсе
Ў нябыт сыходзяць пакрысе.
Хай з пекнатой паўдня — усім,
Што ёсць, — жыццё сплыве зусім.

Дамоў прыйшоў я — толькі дом
Не быў тым, чым ён быў даўней:
Парог пазарастаў імхом...
Ступаў я ціха, а гучней
Мне чуўся голас: я яго
З юнацтва памятаў свайго.
О, пекла! Горшай хоць кляцьбы
Няма, ды твой агонь слабы —
Слабейшы ад маёй журбы!

Я *ведаю*, стары, што Смерць,
За мной з далёкіх ідучы
Краёў, дзе ўжо няма хлусні,
Адчыненымі будзе мець
Вароты, й Праўды прамяні
Усё ж будуць ззяць сярод начы.
Вядома ж, гэта не падман:
Расставіў пасткі скрозь шайтан.
Бо як жа йнакш, падумай сам:
Наведваў я Мілосці храм,
Дзе стод няспынна, ночы й дні,
Узмахам снежных крыл, зірні,
Павеў разносіць чысціні.
І дзе чароўнае жытло
Пад промнямі Нябёс сышло
Ў нябыт. Дзе нават матылёк
Арлу не падмануў бы зрок —
Там Славалюбства падпаўзло
Да ўдзельнікаў бяседы ўпотай
І шал свой, скокнуўшы, ўпляло
Ў Мілосці вабныя цянёты.

*напісана ў 1827*

*Пераклаў Лявон Баршчэўскі*

# Сон

Я сніў у змрочны час начны
Былога шчасця хвілі,
Ды зніклі ў дзённым сне яны
І сэрца мне разбілі.

Хіба не сніць наяве сон
Той, хто глядзіць наўкола
І бачыць след мінулых дзён,
Што ззяе ў часе квола?

О, сон святы! О, сон святы!
Як промні ў дзень грымотны,
Ты працінаеш змрок густы
І дух вядзеш самотны.

Трымціць святло ў імгле начэй,
Далёкае бясконца, —
Што ў свеце можа быць ярчэй,
Чым Праўды сонца?

*напісана ў 1827*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Шчаслівы дзень

Шчаслівы дзень! Адрынуў звады
Мой дух, загнаны, быццам звер,
І пыха, і спадзеў на ўладу
Сышлі цяпер.

Улада? Так, яе я прагнуў,
Але даўно мінуў той час,
Не цягнуць мары больш у багну,
Парыў мой згас.

А пыха — чыстая пакута!
Хай іншы паспытае зух
Струмень той зманлівай атруты.
Маўчы, мой дух!

Шчаслівы дзень! Адрынуў звады
Наступных дзён і дзён былых,
Пыхлівасць і спадзеў на ўладу —
Пазбыўся іх!

Калі і пыху мне, і ўладу
Вярнулі б зноў — маю віну, —
Я не прыняў бы іх прынаду,
Бо час мінуў.

Бо я, падпалы іх пагрозам,
Ва ўладзе сілаў дзвюх,
Адчуў: яны руйнуюць розум
І нішчаць дух!

*напісана ў 1827*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Духі мёртвых

Самотна духі бачаць сны
У змроку вусцішнай труны,
І таямніцу скону іх
Ніхто дагэтуль не спасціг.

Маўчы — у цішыні магіл
Твая самота ёсць падманам:
Без цел лунаюць і без крыл
Усе, хто быў калісь жаданым,
Яны вяртаюцца ўначы
І шэпчуць мёртваму: маўчы!

У небе змрочны цень павіс,
І зоры не глядзяць уніз
Са ззяючых высокіх тронаў
Надзеі, не відаць каронаў
Сузор'яў светлых — толькі след
Крывавых і сляпых камет,
Жахлівай немачы навала
Навечна дух жывы скавала.

Толькі думкі — ланцугамі,
Бачанні — цяжкімі снамі,
Быццам росы на лугах,
Будуць твой трывожыць прах.

І вецер — Божы ўздых — сцішэў,
Туман сярод замшэлых дрэў
Плыве, плыве, жахлівы, вадкі,
Ён — сімвал, ён — твае здагадкі
(Ім тут, у цішыні, клубіцца)
Пра таямніцу таямніцаў.

*напісана ў 1827*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Песня

Я бачыў чырвань шчок тваіх
У твой вясельны дзень.
Да шчасця вёў цябе жаніх,
Кахання ззяў прамень.

Глядзець у вочы мне дазволь:
Агонь, што ў іх здабыў,
Для сэрца, што спазнала боль,
Святлом адзіным быў.

Хай хутка зблякне чырвань шчок
І зменіцца твой твар,
Яны раздзьмулі вугалёк
Маёй душы ў пажар,

Маёй! — бо чырвань шчок тваіх
Падгледзеў я ў вясельны дзень.
Да шчасця вёў цябе жаніх,
Кахання ззяў прамень.

*напісана ў 1827*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Да***

Не страшна, што зямны мой шлях
Няшмат зямнога меў.
Гады кахання на вачах
Хвілінны знішчыў гнеў.

Ды не магу стрымаць я слёз,
Няшчасны, як жабрак,
Бо ты аплакваеш мой лёс,
Хаця я ў ім — мінак.

*напісана ў 1828/1829*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Самотны

Я быў з дзіцячае пары
Інакшым, чым мае сябры,
Бо не любіў я іх забаў,
Іх простых радасцяў не знаў,
Мой смутак іншы меў выток,
І шчасця светлага глыток
Спазнаў адзін, любіў адзін
Тады — бег ранішніх гадзін
Жыцця загадкаю адной
Акрэслены быў незямной,
Што з глыбіні дабра і зла
Мяне ў жыцці маім вяла —

З рэк, што рвуцца на прастор,
З бурых стромаў, дзікіх гор,
Сонца ў строях залатых
На шляхах адных і тых,
З бліскавіц, што між нябёс
Стрэлы шлюць сваіх пагроз —
Навальнічныя агні,
З воблака, што ў вышыні
На нябесным чыстым дне
Дэманам здаецца мне.

*напісана ў 1829*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Раманс

Раманс, спявак лясоў панылы,
Драмаць аматар, склаўшы крылы
Ў лістоты дрогкасці зялёнай
Ля прахалоды прыазёрнай,
Мне чыюком быў каляровым —
Птушкай, знаёмаю з дзяцінства,
З ягоных спеваў навучыўся
Я абяцадлу й першым словам,
Калі ляжаў падоўгу ў пушчы,
У неба ўпяўшы зрок відушчы.

Хістае столь нябесных сфер
Сучаснасць крыламі нястрымна,
З-за ейных грыфаў угары мне
Няма калі блукаць цяпер —
Адно сачу, калі дзе грымне.
Калі ж нядоўгі супакой
Зляціць на дух турботны мой,
Каб з лірай, рыфмаю застацца
Я мог сам-насам, як ізгой,
Душа лічыла б святатацтвам
Не затрымцець сваёй струной.

*напісана ў 1829*

*Пераклаў Максім Шчур*

# Санет да навукі

Навука! Ты заўжды сухой была,
Дачка былых часоў з паглядам пільным,
Раскрыеш сумных ісцін два крыла,
Як грыф, што вее холадам магільным.

Паэт цябе не любіць. Ты — лавец
Яго душы, што марыць пра блуканні,
З нябёс яго спускаеш у чысцец
І смелыя спыняеш парыванні.

Гамадрыяду гоніш ты з гаёў,
Дыяну пазбаўляеш калясніцы,
Наядаў больш не стрэць ля ручаёў —
Бяздомным, ім няма куды сяліцца.

І гоніш эльфаў з траваў, а мяне —
З-пад тамарында, дзе лунаў я ў сне.

*напісана ў 1829*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Да ***

Бы ў садзе, дзе ў палоне мрой
На птушак ладжу ловы, —
Злятае з вуснаў словаў рой,
Спяваюць птушкі-словы.

З нябёсаў сэрца твой пагляд
Упаў, нібы зляцела
Да мёртвых зорка ў змрочны сад,
На розум мой змярцвелы.

Твая душа — *душа*!.. Я сплю,
І сны мне будуць сніцца
Пра ісціну, што не куплю,
І танныя драбніцы.

*напісана ў 1829*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Калізей

Рэліквія былых стагоддзяў Рыму!
Загадка, што цяперашнім часам
Пакінулі вякі багацця й моцы!
Урэшце я, сходзіўшы сто дарог,
Спазнаўшы смагу доўгай пілігрымкі
І прагу веды, што душу пячэ,
Укленчыў, ціхамірны і пакорны
У цені велічы тваёй і піў
З твае раскошы змрочнае і славы!

Прастора! Час! Узгадкі пра былое!
О ноч і спусташэнне! Цішыня!
Цяпер твае я адчуваю чары,
Мацнейшыя за веду, што адкрыў
Іўдзейскі Цар у Гефсіманскім садзе,
І таямніцы, што халдэям зоры
Ніколі не здалелі б патлумачыць.

Дзе паў герой — там падаюць калоны.
Дзе золатам блішчэў калісь арол,
Цяпер кажан вартуе цішу ночы.
Дзе з пасмамі матрон гуляўся вецер,
Цяпер дзядоўнік з ветрыкам гуляе.
Дзе на стальцы каштоўным уладар
Калісь сядзеў, цяпер у ззянні поўні
Спяшаецца ў свой мармуровы дом
Старая яшчарка развалін даўніх.

Ды пачакайце! Гэтыя аркады,
Руіны, спрэс абвітыя плюшчом,
Патрэсканыя фрызы і пілястры,
Антаблементы, гэты пыл гадоў

І камяні — усё, што нам пакінуў
Няўмольны і ўсёразбуральны час
Ад велічнага некалі калоса?

«Не ўсё, — прашэпча рэха, — не, не ўсё!
Гучаць адвеку нашыя прароцтвы,
І мудрыя пачуюць спеў руін —
Спеў Мемнана, што звернуты да сонца!
Мы валадарым розумамі тых,
Што моцныя і целам, і душою.
Мы не аслаблі, часу камяні!
Не ўся растала сіла і раскоша,
Не ўся вабнота знішчана ў вяках,
Не ўсе дзівосы, што наўкол лунаюць,
Не ўсе загадкі, што схаваны ў лёх,
Не ўсе ўспаміны, што жывуць стагоддзі,
Што аплятаюць сцены, быццам строй,
І значаць нават болей, чымсьці слава!»

*напісана ў 1833*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Серэнада

Лагодны вечар, прыемны час —
Нібы злачынец, сустрэну вас,
Бо сон пануе да небакраю,
А я да ранку на лютні граю.
Заснуў Элізій, аднак узнік
На хвалях мора яго двайнік,
Сямі Плеядаў у небе ззянне —
І сем сясцёр іх у акіяне.
Глядзіцца ў мора Эндыміён —
Шукае ў хвалях каханне ён.
А ў цьмяных логах і на каналах,
У жоўтым бляску лістоў апалых
Згасае сонца — і спіць у скалах.
Нябёсы, мора і ўся зямля
Паснулі ціха, і ціха я
Табе спяваю — і зор сябрына
Цябе вітае, о Адэліна.
Паслухай — песня плыве ўначы.
Гучы, о лютня! Мой спеў, гучы!
Праз сон, быць можа, кахання словы
Табе здадуцца таемнай мовай,
Бо гукі лютні, што так пяе,
Спрабуюць трапіць у сны твае,
Каб, нас сагрэўшы сваім цяплом,
Звязаць любові тугім вузлом.

*напісана ў 1833*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Гімн

Улетку, восенню, зімой,
Марыя, гімн ты чула мой!
У шчасны час і ў час бяды, —
О Панна, будзь са мной заўжды!

Калі спакойна беглі дні,
Свяціла сонца ў вышыні,
Мне ззялі, каб запал не сціх,
І ты, й бязмежжа цнот тваіх.

Калі ж сягоння — пыл і тло
Усё, што ёсць і што было,
Ратуюць хай ад пустаты
Бязмежжа цнот тваіх і ты!

*напісана ў 1833*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Гімн

І ў ноч, і ў раніцы глухія
Ты чула гімн мой, о Марыя!
Прыйдуць хваробы ці спакой —
Будзь, Багародзіца, са мной.

Калі ляцяць гадзіны ярка,
На небе — ані хмары шпаркай,
Душа імкнецца ў барацьбе
І да твайго, і да цябе.

Шторм лёсу зруйнаваў, павер,
Маё «Былое» і «Цяпер»...
У будучыню — новы крок —
Тваё ды ты разгоняць змрок!

*напісана ў 1833*

*Пераклаў Аляксей Арцёмаў*

# Да Ф(рэнсіс) С(арджэнт) О(сгуд)

Каханай хочаш быць? — Тады
Сваёй дарогі не забудзь,
Будзь тою, кім была заўжды,
Кім не была — не будзь.

Нястач не будзе ў пахвальбе:
Твае краса і годнасць —
Нагода праслаўляць цябе,
Любоў жа — неабходнасць.

*напісана ў 1833/1845*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Да Зантэ

Прыўкрасны востраў, падарыла кветка
Табе імя дзівоснае красы.
Як шмат абудзіш ты, былога сведка,
Узгадак пра шчаслівыя часы!
Як шмат развагпра сонечныя мары!
Як шмат надзей, якія сёння — прах.
Ды прыгажуні больш не цешаць чары:
Яе няма на гэтых берагах!

Яе няма! — гучыць журботна й востра
І ўсё змяняе! Больш няма яе
І памяці няма! Кляну, о востраў,
Расквечаныя берагі твае!
О гіяцынтава-пурпурны Зантэ!
«Isola d'oro! Fior di Levante![1]»

*напісана ў 1836*

*Пераклала Ганна Янкута*

[1] Залаты востраў! Кветка Леванта! (іт.).

# Цішыня

Бываюць рэчы без увасаблення
З жыццём падвойным сутнасцяў двайных.
Святло і гліна, рэчыва і цені
Даюць пачатак існаванню іх.
Дзве Цішыні ёсць — берага і мора,
Душы і цела — першая жыве
У землях суму, у густой траве,
У краі ўзгадак пра былое гора;
Яе не бойся. Ёй імя — «Учора».
Такая Ціша ўвасабленне мае,
І сілам зла не авалодаць ёй.
Калі ж аднойчы лёс жыццё зламае,
І стрэнеш эльфа на мяжы пустой
(Цень Цішы, што выходзіць у дарогу,
Дзе не было людзей), даверся Богу!

*напісана 25 снежня 1839*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Юлалі

Жыў доўгім часам
З бядой сам-насам —
І ў сэрцы боль нясцерпны панаваў
Пакуль красуню Юлалі нявестай не назваў,
Усмешлівую Юлалі сваёй я не назваў.

Блішчэць ярчэй
Сярод начэй
Яе вачам, чым зорцы ў цішы стылай.
І месяца ззянне,
Туманнае ўбранне —
Пурпура, пярліны, бялілы —
Не ззяюць так ярка, як кудзеркі Юлалі мілай,
Зблякаюць ад золата локанаў Юлалі мілай.

Няма больш болю,
Тугі, нядолі:
Пад сілу ўсё вачам яе іскрыстым.
І дзень пры дні
Нібы ў агні
Астарта ў небе чыстым,
Бо Юлалі ў яго глядзіць паглядам прамяністым,
Бо Юлалі яго асвеціць позіркам празрыстым.

*напісана ў лютым 1843*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Лінор

О смерці сон! Спрадвечны кон б'е чашу залатую!
Хай звоніць звон! Да Стыкса ён вядзе душу святую!
О, Гай дэ Вэр, у смерць павер! Быць гору з гэтых пор!
Тужы цяпер, о кавалер: сышла твая Лінор!
Мы заспяваем за спачын, абрад мы справім свой —
Сышла найлепшая з жанчын, памерла маладой.
Быў двойчы жорсткі смерці чын — спачыла маладой.

«Няшчасныя! не дух жывы — багацце вабіць вас!
На смерць багаславілі вы яе ў журботны час!
Як рэквіем цяпер спяваць, абрад як справіць свой
Вам, хто спаганіў сэрцы злом, а языкі — маной,
Вам, хто наблізіў смерць яе, нявіннай, маладой?»

*Peccavimus*[1], ды плач суціш, хай нашыя псальмы
Да Госпада імкнуць — яе не патрывожым мы.
*Пайшла ад нас яна ў свой час*, ды шчасця ёй стае,
А ты — яе жаніх — як мніх, маліся за яе.
Яна ўжо прах, і ў сэрцы жах і горыч ты адчуў:
Жыццё не згасла ў валасах, ды згасла ўжо ўваччу,
Жыццё шчэ ззяе ў валасах, ды смерць жыве ўваччу.

«О, прэч! Святло ў душы, і тло — гук вашых галасоў!
Пяю з анёлам вам на злосць пэан былых часоў!
Хай сціхне звон! Бо наўздагон яе святой душы
Імчыць напеў — і ён заспеў каханую ў цішы.
Туды, найдалей ад бяды, ад д'яблавых пагроз
Ляці — і ўвойдзеш у палац Уладара нябёс,
Адрынь адчай — бо прыме ў рай цябе Уладар нябес!»

*напісана ў лютым 1843*

*Пераклала Ганна Янкута*

[1] Мы памыліліся (лац.).

# Крумкач

Нeяк змрочным часам ночы, калі я заплюшчыў вочы,
Разбіраючы прарочы сэнс старых пажоўклых кніг,
Раптам стук пачуў праз стому, ціхі стук у дзверы дому,
Быццам нехта невядомы прыпыніўся каля іх.
«Гэта нейкі госць, — я мовіў, — прыпыніўся каля іх,
Там, каля дзвярэй маіх».

Быў, я помню, снежань слотны, у каміне неахвотна
Гаснуў жар, і цень дрымотны варушыўся ў зборках штор.
І чакаў я час світання, як збавення, бо чытанне
Не прынесла мне адхлання ў смутку вечным па Лінор,
Па святой, якой анёлы кажуць там цяпер «Лінор», —
Безыменнай тут з тых пор.

Неакрэслены, трывожны шолах штор, іх зморшчкі кожнай,
Нейкім жахам прыварожным да сябе прыкуў мой слых,
І стаяў я, спалатнелы, паўтараючы нясмела:
«Гэта нейкі госць спазнелы там, каля дзвярэй маіх,
Гэта нейкі госць спазнелы прыпыніўся каля іх,
Там, каля дзвярэй маіх».

І сябе пераканаўшы, што там госць, і страх суняўшы,
«Сэр, — я мовіў, — або лэдзі, выбачайце, што на міг
Я заснуў і вас, як брата, не пусціў адразу ў хату,
Дый пастукаліся надта ціха вы ў дзвярох маіх», —
Дзверы я штурхнуў... нікога, толькі цемра каля іх,
Там, каля дзвярэй маіх.

Я ўзіраўся ў прадчуванні немажлівага спаткання
У ахутаны маўчаннем і цямрэчаю прастор,
Ды пачуў у непрабуднай цішы толькі водгук скрутны,
Толькі водгук ледзьве чутны слова ціхага «Лінор?» —
Гэта я шапнуў, і цемра прашаптала мне: «Лінор?»,
Прашаптала, як дакор.

І, гаруючы ад страты, я вярнуўся ў жальбе ў хату,
Як знячэўку стук зацяты зноў пачуўся і аціх.
«Так, — я мовіў, — мне не сніцца: стукнуў нехта ў аканіцу,
Трэба вызнаць таямніцу незвычайных стукаў тых.
Гэта вецер — вось разгадка таямнічых стукаў тых,
Вецер ля вакон маіх».

Ды калі акно шырока разнасцежыў я — са змроку
У пакой крумкач звячэлы, быццам прывід дзён сівых,
Увайшоў хадою цвёрдай і пратупаў з пыхай лорда
Ля мяне ў паставе гордай проста да дзвярэй маіх,
І на бюст Палады ўзбіўся там, каля дзвярэй маіх,
Сеў панура і заціх.

Чапурыстасць і паважнасць чорнай птушкі нехлямяжнай
Змусілі мяне ўсміхнуцца цераз сум: «Хоць і абдзёр
У сутычцы нейкі вораг на тваёй макушцы пёры,
Ты не страціў смелы нораў, змрочны дух начных пячор,
Як Плутон цябе мянуе ў нетрах тых начных пячор?»
Крук пракрумкаў: «Nevermore!»

Хоць адказ начнога птаха на душу мне ўпаў, як плаха,
Быў бы дзень — не меў бы страху, а цяпер — які выбар,
Калі ноч і бездарожжа, калі, быццам дух варожы,
Уваходзіць крук нягожы і сядае насупор
На скульптурны ўзгруд Палады, над дзвярыма, насупор,
Крук з мянушкай Nevermore.

А тым часам крук пануры знерухомеў на скульптуры,
Бы душу ўсю ўклаў у слова страшнае, як прыгавор.
«Як сябры мае, — ледзь чутна я шапнуў, —
крумкач прыблудны
Знікне заўтра ў каламутным цемрыве начных пячор,
Як мае надзеі, знікне ў цемрыве начных пячор».
Крук пракрумкаў: «Nevermore!»

Напалоханы адказам, я ачуўся не адразу
І прамовіў: «Несумненна, слова гэтае — паўтор
Скаргі нейкага нябогі, што пад гнётам лёсу злога
Праз усю сваю дарогу паўтараў, нібы дакор,
На хаўтурах мар, да скону паўтараў, нібы дакор,
Толькі слова «nevermore».

Так разважыўшы, з усмешкай я на крэсла сеў без спешкі
Тварам да жудлівай птушкі, спінаю да цьмяных штор,
На падушку сеў у крэсла і задумаўся над сэнсам
Слова, што прынёс злавесны, змрочны дух начных пячор.
Што паведаміць хацеў мне змрочны дух начных пячор
Гэтым словам «nevermore»?

Так раздумваў я ў маўчанні над прароцтвам незвычайным
Птаха, што паглядам жорсткім на мяне глядзеў ва ўпор.
У святле сядзеў няісным каганца і ненаўмысна
На падушку прыхіліўся — так мяне адолеў змор.
Ах, ніколі на падушку не прыхіліцца Лінор
Ля мяне, о nevermore!

І здалося, пасмы дыму паплылі перад вачыма
І за спінай серафімы павыходзілі з-за штор.
«Хлус! — я ўсклікнуў. — Без сумнення,
дзіўнае тваё з'яўленне —
Боскі знак майго збавення ад жалобы па Лінор!
Дай мне зелля, каб забыцца, каб не помніць пра Лінор!»
Крук пракрумкаў: «Nevermore!»

«О вястун, — я ўсклікнуў, — птушка проста ты
ці д'яблаў служка!
Хай прыслаў цябе нячысты, хай прынёс цябе віхор
У бязрадны мой закутак, дзе пануе вечны смутак,
Ці пазбаўлюся пакутаў я ля Галаадскіх гор?
Ці знайду я панацэю там, ля Галаадскіх гор?»
Крук пракрумкаў: «Nevermore!»

«О вястун, — я ўсклікнуў, — птушка проста ты
ці д'яблаў служка!
Дзеля Бога, што справуе існым ад зямлі да зор,
Адкажы душы гаротнай, ці ўзляціць яна ў зіхотны
Райскі сад да несмяротнай, што завецца там Лінор?
Да святой, якой анёлы кажуць там цяпер «Лінор»»?
Крук пракрумкаў: «Nevermore!»

«Хай жа гэта слова стане знакам нашага расстання! —
Крыкнуў я. — Туды вяртайся, скуль прынёс цябе віхор!
І не ўздумай неўзаметку скінуць мне пяро, як сведку
Злой хлусні сваіх адведкаў, і не трэба так ва ўпор
Мне ў душу глядзець, і з бюста прэч нясі свой чорны ўбор!»
Крук пракрумкаў: «Nevermore!»

З той пары крумкач закляты, з бюста бледнага Палады
Не злятаючы ніколі, прымасціўся насупор,
Ён вачыма патарочы соннымі за мною сочыць
І пад лямпай цень свой змрочны на падлозе распасцёр,
І душой я з таго ценю нізашто цяпер да зор
Не ўзлячу, о nevermore!

*напісана ў канцы 1844*

*Пераклаў Алег Мінкін*

# Крумкач

Нeяк поўначчу панылай я сядзеў, як над магілай,
Над пісьмёнамі, расклаўшы старажытны стос папер.
Раптам ціхі стук у дзверы мае змрочнае кватэры
Разагнаў усе хімеры. «Мабыць, нейкі візітэр, —
Я падумаў, — не хвалюйся, проста позні візітэр
Ля дзвярэй тваіх, павер».

Тая снежаньская замець назаўжды запала ў памяць.
Цень на сценах, і не сцяміць — прывід? таямнічы звер?
І няма палёгкі ў горы — вечным смутку па Леноры,
Што цяпер зіхціць, як зоры, з вышыні нябесных сфер,
Але ў нашым грэшным свеце, дзе не бачна райскіх сфер,
Безназоўная цяпер.

Шоргат, шолахі і рухі, і душа ў палоне скрухі
Сочыць цені — у трымценні фіялетавых парцьер,
І кажу, пакуль у змозе, паўтараючы ў трывозе:
«Гэта проста на парозе нейкі позні візітэр,
Проста грукаецца ў дзверы і чакае візітэр,
Так, душа мая, павер!»

І, пагнаўшы прэч апаску, па гасцінным абавязку
Я прамовіў: «Калі ласка! Выбачайце мне, о сэр
Або лэдзі! Я, нябога, стуку не пачуў слабога...»
Адчыніў, а там — нікога, нібы змрок усё пажэр.
Дзверы адчыніў — нікога, нібы змрок усё пажэр.
Змрок, што на душы цяпер.

Я глядзеў у твар цямрэчы й бачыў там такія рэчы,
Нібы просячы сустрэчы ў найгарчэйшае з хімер.
Ды ні гуку і ні зыку, быццам Бог забраў музыку,
Кінуўшы, нібы ў пазыку, тры галосныя ў этэр —
Рэха імені Ленора, што прамовіў я ў этэр,
Мне пакінуў напавер.

Я вярнуўся да чытання, ды спакойным быць не ў стане,
Раптам тое ж грукатанне, ды мацнейшае цяпер:
«Хто не можа ўгаманіцца, б'ецца проста ў аканіцу?
Разгадаем таямніцу й госця дзіўнага намер.
Гэта вецер б'ецца ў шыбу на паўночны свой манер,
Вецер снежаньскі, павер!»

Не паспела аканіца як належыць адчыніцца,
Увайшоў Крумкач паважны, бы мінулага жаўнер,
Старадаўні князь пярнаты крочыў у мае пенаты,
Як усе арыстакраты, не пазбаўлены манер,
Зграбна сеў на бюст Палады, не губляючы манер,
Як глядач — у свой партэр.

Вось дзівосы ў мой закутак! І на хвілю сціх мой смутак,
І спытаўся я: «Чаму так абадраны твой каўнер?
Кіпці ворагаў пасеклі? (Тых, што ўрэшце ў жаху ўцеклі?)
Як цябе завуць у пекле, дасканалы грэнадэр?
Як цябе Плутон у пекле называе, грэнадэр?»
Адказаў Крумкач: «Не вер!»

Я застыў у захапленні ад птушынага маўлення,
Хай крылаты мой аратар быў далёка не Гамэр,
Ды не кожны дзень у госці птах заходзіць да кагосьці,
Хай не першай маладосці, але важны кавалер!
Не заўжды на белы мармур сядзе чорны кавалер
З рэдкім іменем «Невер»!

Госць жа, з выглядам суровым, не азваўся больш ні словам,
Бы зрабіцца мармуровым і напраўду меў намер,
У нямоце занурыўся — і самоце я скарыўся:
«Зранку, як мае сябры ўсе, знікне й гэты візітэр,
Як усе мае надзеі, знікне й гэты візітэр!»
Паўтарыў Крумкач: «Не вер!»

Адказаў ён так дарэчна, што прамовіў я сардэчна:
«Гаспадар яго, бясспрэчна, быў пакутнік і блюзнер!
Быў іх лёс настолькі дрэнным, што ліліся скаргі трэнам,
І зрабіліся рэфрэнам боль і роспачы надмер,
Кожны дзень гучалі ў скаргах боль і роспачы надмер:
«Больш не вер! не вер! не вер!»

Хваляванне больш не трэсла, хоць надзея не ўваскрэсла.
Я бліжэй пасунуў крэсла, нібы крочыў за бар'ер
Немагчымых супадзенняў, сеў — і доўга летуценіў:
«Што прынёс мне з царства ценяў гэты вусцішны кур'ер?
Што прарочыць мне злавеснай вечнай вусцішы кур'ер,
Прамаўляючы «не вер»?

Толькі змучаны спачынам, скуты страхам беспрычынным,
Я сядзеў пад крумкачыным позіркам, што пёк і жэр.
Бо душа ўсё памятае: тут раней сядзела тая,
Што цяпер не завітае з вышыні нябесных сфер,
Не прысядзе, завітаўшы з вышыні нябесных сфер,
Тут каханая, не вер!

Раптам у салодкім дыме пахі робяцца густымі,
Цені робяцца святымі і сыходзяць са шпалер...
Я сказаў: «У падарунак шле мне Госпад паратунак,
Забыцця гаючы трунак — мне, што звыш усякіх мер
Пра нябесную Ленору памятае дацяпер!»
Адказаў Крумкач: «Не вер!»

«Будзь ты д'яблам ці прарокам, ці з'явіўся ненарокам,
Ды катуеш сэрца змрокам, быццам тысячы сякер!
Ці ў тваёй, крумкач, уладзе загаіць душы бязладдзе,
Ці мне лекі ў Галаадзе дасць твой сябра Люцыфер?
Ці бальзам у Галаадзе дасць мне чорны Люцыфер?»
Адказаў Крумкач: «Не вер!»

Будзь ты д'яблам ці прарокам, ці з'явіўся ненарокам,
Дзеля Бога на высокім троне тагасветных сфер,
Адкажы душы ў спагадзе, ці сустрэне ў райскім садзе
Тую, у чыім паглядзе — толькі неба? Не блюзнер,
Ці сустрэнемся з Ленорай? Дзеля неба, не блюзнер!
Адказаў Крумкач: «Не вер!»

«Праз цябе гаворыць бездань, значыць — згінуць і табе, здань!
Прэч у цемру да пачвараў, вурдалакаў і мегер!
Хай не плямяць тваё пёры светлай памяці Леноры,
Згінь туды, дзе змрок, і зморы, й пекла вогненны ашчэр!
Веру, што цябе чакае пекла вогненны ашчэр!»
Адказаў Крумкач: «Не вер!»

Так трывяю страх і вусціш я ля мармуру, на бюсце ж —
Госць, якога не адпусціш, бо ўладарыць *ён* цяпер:
Беручы душу ў аблогу, кінуў цень на ўсю падлогу,
І не збавіцца ад злога ценю гібельных хімер!
І душа з палону злога, з віру гібельных хімер
Больш не вернецца, не вер!

*напісана ў канцы 1844*

*Пераклаў Андрэй Хадановіч*

# Да Ф***

Каханая! У час бяды —
Якое я спазнаў даволі
На шляху змроку і жуды,
Дзе, руж не бачыўшы гады,
Я жыў хвілінамі спатолі
У марах пра цябе — тады
Трапляў я ў райскія сады.

Узгадкі пра цябе ўсплывалі,
Як востраў чарадзейных мрой
На моры, дзе гулялі хвалі,
На акіяне ў час баталій
Вятроў, дзе штармавой парой
Святло нябёсы пралівалі
На востраў незвычайны мой.

*надрукавана 26 красавіка 1845*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Улялюм

Неба шэрым рыззём па-сірочы
Навісала над лісцем сухім —
Над пакурчаным лісцем сухім:
Быў кастрычнік, тужлівы і змрочны,
У няласкавым годзе маім:
Слаўся золкі туман нездароўчы,
Сеяў жудасць у лесе глухім —
Поўз ад возера Обэра ноччу
Па гушчарніку Віра глухім.

Тут, сярод кіпарысаў магутных,
Я аднойчы з Душою блукаў.
Між Тытанаў з Псіхеяй блукаў.
Я тады, як паток каламутны,
Палкім сэрцам бурліў, клекатаў
І з жаролаў вулканаў раскутых
Ў край сцюдзёны на полюс сцякаў —
Па адхонах вулканаў раскутых
Ў край бязлюдны на полюс сцякаў.

Мы хаваліся ў словах сірочых,
Як у выстылым лісці сухім —
У пакручаным лісці сухім;
І хаця быў кастрычнік прарочы
У бязлітасным годзе маім
(Ноч Начэй узышла над усім!) —
Мы забылі, што гэтаю ноччу
У прыстанішчы зданяў глухім,
Каля возера Обэра ноччу
Вір блукае па лесе глухім.

А тым часам на ранак патрохі
Павярнуў неабзорны цалік,

Прыйсця ранку пачаўшы адлік,
І ў канцы нашай мглістай дарогі
У расплывістай далечы ўзнік
І, нібыта паўмесяц двурогі,
Таямніча заззяў маладзік —
Як Астарты паўмесяц двурогі,
Чарадзейны заззяў маладзік.

І сказаў я: «Астарта аблíччам
У сатканай з уздыхаў начы
Не ўступае Дыяне нічым.
Яна ўсе нашы слёзы падлічыць,
Праз уздыхаў эфір летучы
За сузор'ем Ільва таямнічым.
Яе цёплыя вочы ўначы,
Яе чулыя вочы ўначы
Зіхацяць і ў Нябёсы нас клічуць,
Дзе мы знойдзем нарэшце спачын —
Там, у Леце, за Львом ваяўнічым
Знойдзем мы забыццё і спачын».

Ды сказала Псіхея: «Не веру
Бледнай зорцы, што ў небе ўстае,
Здраднай зорцы, што там устае:
Ах, не стой жа! Ах, пойдзем наперад!
Яе бляск забыцця не дае!»
Так Псіхея сказала і ў шэры
Прах занурыла крылы свае —
Спалатнела ад жаху і ў шэры
Прах занурыла крылы свае —
Белапёрыя крылы свае.

Адказаў я: «Твой страх — недарэчны:
Дрогкай зоркі не маніць святло!
Акунемся ў жывое святло!
Гэта ззянне Сівіліна сведчыць,

Што ўначы Спадзяванне ўзышло —
Ува ўсёй Прыгажосці ўзышло! —
Прывядзе бляск Астарты бясспрэчна
Нас у неба, што днець пачало, —
Ах, даверыцца можна бясспрэчна,
Каб у неба нас ззянне вяло,
Дзе ўначы спадзяванне ўзышло».

Гэтак я супакойваў Псіхею,
Каб развеяць смугу яе дум,
Яе горкіх і роспачных дум,
Як упёрлася раптам алея
Ў склеп замшэлы, адкуль веяў сум —
Невыносная жальба і сум.
Мовіў я: «Хто ў тым склепе гібее,
Апавіты ў жалобу і сум?»
Адказала яна: «Улялюм! —
Там магіла тваёй Улялюм!»

Сэрца жалем зайшлося сірочым
І пакрылася лісцем сухім —
Мёртвым, скурчаным лісцем сухім:
Год назад у кастрычніку змрочным,
Год таму перад склепам нямым
Я ўжо плакаў над горам сваім —
Я ўжо плакаў у змроку глухім
Над няўцешным адчаем сваім!
Ах, якім чараваннем благім
Зноў сюды я зваблены ноччу,
Каб пакутваць у змроку глухім —
Каля возера Обэра ноччу
У прыстанішчы Віра глухім?

І ў слязах мы сказалі абое:
«Ах, няўжо духі дрэў і вады —
Духі чулыя дрэў і вады —
Каб не даць нам сустрэцца з журбою,
Не хацелі пускаць нас сюды —
Да жудлівага склепу сюды —
І наслалі сваёй варажбою
З пекла зорку грахоў і бяды —
З нетраў пекла сваёй варажбою
Зіхатлівую зорку бяды?»

*напісана ў 1847*

*Пераклаў Алег Мінкін*

# Улялюм

Небасхіл быў халодна-змярцвелы
  І зямлю засцілала імгла,
  Ўсё вакол ахінала імгла.
Быў кастрычнік — тужлівы, знямелы,
  Памяць кепска той год зберагла...
Сцежка стаў абмінала нясмела,
  Затуманеным лесам вяла,
Стаў Абэр абмінала нясмела,
  Уірам, лесам фантомаў, вяла.

Кіпарысы ў прысадах Тытанаў
  Мы міналі, з рукою рука, —
  Я й Псіхея, з рукою рука,
І бурліла ўнутры несціхана
  Маё сэрца, як лавы рака,
  Як нястрымнае лавы рака,
Як паток, што па схілах вулкана,
  Вывяргаючы стогны, сцякаў,
Што з Яанэка — злога вулкана —
  У каралеўстве палярным сцякаў.

Нашы словы гучалі змярцвела,
  Нашы думкі заслала імгла,
  Згадкі ўсе ахінула імгла.
Што кастрычнік стаіць анямелы,
  Мы не ведалі: ўсё адняла
  Ноч начэй — успамін адняла.
Мы забылі, што сцежка нясмела
  Нас калісьці да Уіру вяла,
Стаў Абэр абмінала нясмела,
  Уірам, лесам фантомаў, вяла.

Нам гадзіннік паведаміў зорны:
Ранак цемру бяздонную змог,
Ранак ноч састарэлую змог...
Бляск няясны, амаль ілюзорны,
Нарадзіўся на нашых вачох,
І, хрыбет асвятляючы горны,
Выплыў месяца здвоены рог —
Рог Астарты схіл высвеціў горны,
Дыямантавы здвоены рог.

Я сказаў: «Не зраўнацца Дыяне
З той, што ў небе саткала гало,
Што з уздыхаў саткала гало;
З той, хто ведае, што не завяне
Хараство, не загіне цяпло,
І якая з-за Льва ўстала ўранні,
Каб забылі мы ўсё, што было,
Ў Лету кінулі ўсё, што было.
Льва мінуўшы, у ранішнім ззянні
Ўстала зорка, каб гора і зло
Мы забылі ў вачэй яе ззянні,
Каб адрынулі гора і зло».

Адказала Псіхея са страхам:
«Зорцы той я не веру зусім,
Бледнай зорцы не веру зусім.
Не марудзь жа, бо скончацца крахам
Спадзяванні твае... Паляцім!»
Яе крылы пакрыліся прахам,
Патанулі у пыле сухім,
Апусціліся крылы, і прахам
Агарнулася пер'е сухім,
Стала шэрым у пыле сухім.

Я ўсміхнуўся: «Падманвае сненне,
  Лепш амыемся ў гэтым святле,
  Крышталёвым нябесным святле.
Хай заззяе ў прарочым трымценні
  Зорка нам і Надзею спашле,
  Хай Краса нам Надзею спашле!
Паглядзі, як празрыста мігценне
  Асвятляе нам шлях у імгле.
Павядзе за сабою мігценне,
  Асвятляючы шлях у імгле,
  На нябёсы надзею спашле».

Супакойваў яе не дарма я —
  Яе думак суцішыўся тлум,
  Думак сумных суцішыўся тлум.
Там, дзе сцежка да лесу збягае,
  Склеп стаяў, лісця чутны быў шум —
  Ціхі, смерцю азмрочаны шум.
Запытаў я: «Сястра дарагая,
  Хто тут спіць пад густы гэты шум?»
Быў адказ: «Улялюм! Улялюм!
  Тут спачыла твая Улялюм!»

І тады маё сэрца змярцвела
  І заслала мой розум імгла,
  Непрагляднага болю імгла,
І згадаў я кастрычнік знямелы,
  Ноч, якая бы сёння была, —
Ноч начэй, калі любае цела
  Паглынула магілы імгла.
Што ж за сіла мяне захацела
  Звабіць зноў і сюды прывяла?
О, я ўспомніў, як сцежка нясмела
  Гэтым лесам туманным вяла,
Стаў Абэр абмінула нясмела
  І ў праклятыя лес Ўір прывяла!

Мы з Псіхеяй усклікнулі: «Гэта
  Дух спагадны ці хітры вядзьмак,
  Чулы дух ці зламысны вядзьмак,
Каб схаваць гэтых пустак сакрэты,
  Каб заблытаць дарогу ўсяляк,
  Пераплесці сцяжыны ўсяляк,
Нам спаслаў прывід грэшнай планеты
  З лімбу — душаў блукаючых знак,
Гэтай грэшнай зіхоткай планеты
  З пекла — душаў блукаючых знак!»

*напісана ў 1847*

*Пераклала Кацярына Маціеўская*

# Званы

I.

Чую бомаў чысты звон,
Срэбны звон!
Колькі радасці імклівай нам цяпер прарочыць ён!
Як звіняць званочкі звонка,
І смяюцца ў цішыні
Зоры тонка, тонка, тонка,
І ў нябёсах — зораў гронкі,
Крышталёвыя агні!
Мерных зыкаў пералівы —
Сагаў даўнія матывы
У іскрыстых пераззвонах, што гучаць, нібыта сон,
Цераз край б'е ясны звон,
Наўздагон
Разаб'ецца — і смяецца дзёрзкі звон!

II.

Чую я вясельны звон,
Свята звон!
Колькі светлае надзеі нам цяпер прарочыць ён!
Золата яго гучання
Адзначае ноч кахання!
І ўрачысты хваласпеў,
Шчасця поўны,
Палка ў гэты час гарэў
Для пяшчотнае галубкі, што сустрэў
Часам поўні!
Як звіняць усе званы,
Пра любоў пяюць яны,
І пра сны
Той вясны,

Што спазнаем мы адны,
Пра запал, што абудзіў
Найдзівоснае між дзіў,
Гэты найзванчэйшы звон,
Залаты, зіхоткі сон,
Запаветны той палон,
У якім, бы верш, палае і спявае светлы звон!

III.

Чую я набату звон,
Медны звон!
Колькі страху і трывогі ў сэрцы абуджае ён!
Як гучыць начны той жах
У спалоханых вушах!
Болей сіл няма маўчаць —
І званы крычаць, крычаць,
Звон раптоўны
Гучна просіць шкадавання ў полымя, што не згасае,
І стыхію суцішае, тую, што заўжды глухая,
Не сціхае, не сціхае,
Не сціхае звон адчаю,
Звон ірвецца, быццам звер,
Каб усіх падняць цяпер,
Перад тварам бледнай поўні.
Медны, медны, медны звон,
Вусціш абуджае ён,
Боль і гора!
Як званы крычаць і просяць,
Вецер іх адчай разносіць
І звініць прастора,
Каб паведаміць усім
Праз гудзенне,
Галашэнне,
Што гарым, гарым, гарым,
І гучыць, нібы праклён,

Бразгатанне —
Спадзяванне,
Што растане жах, як сон,
Як растане ў цішы ночы гэты звар'яцелы звон,
Медны звон,
Страшны звон, што займее ўрэшце плён
І спакойным будзе сон,
Шум і тлум тады суціхне, як суціхне гэты звон!

IV.

Пахавальны чую звон,
Скрухі звон!
Колькі гэты стогн жалезны абуджае дум пра кон!
Пасяляе ў сэрцы страх
І гучыць ён у вушах,
Гэты звон злавесны, змрочны і глухі,
Плач і ўздых, што зноў і зноў
Вылятае са званоў,
За грахі
Кліча вернікаў маліцца,
Толькі чутны на званіцы
Смех сухі.
Гэта смех званічных зданяў,
Што залезлі на вярхі,
Шчасце, мары і каханне
Знеслі ў чорныя мяхі,
Ім не жыць і не памерці,
Бо не людзі і не чэрці —
Вупыры,
Вусцішныя званары,
І вупыр-кароль стары
Угары
Выбівае смерці звон!
Танчыць, весяліцца ён:
Смерць гукае ён здавён,

I плыве журботны звон,
Мерных зыкаў пералівы —
Сагаў даўнія матывы,
Танчыць, весяліцца ён,
Б'ецца звон,
Мерных зыкаў пералівы —
Сагаў даўнія матывы,
I гудзе жалобна звон,
Звон, нібыта смерці сон,
I ідзе жалобны звон,
Мерных зыкаў пералівы,
Са званіцы той здавён,
Сагаў дзіўныя матывы
Прасякаюць зычны звон,
Што прарочыць хуткі скон,
Праганяе светлы сон,
I імчыцца наўздагон — і ў палон!
Вечны сон
Напрарочыць гэты крык і зык і звон!

*напісана ў 1848*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Эльдарада

Мужны ваяр
Цераз гушчар
Зліваў, дажджоў і граду
Ў зыркай брані
Мчаў на кані
Ў пошуках Эльдарада.

Ехаў штодзень,
Ехаў, аж цень
Лёг на душу, як здрада, —
Бо не знайшоў
Ў свеце краёў
Пекных, як Эльдарада.

Чуючы схіл
Колішніх сіл,
Рыцар і здані рады:
«Здань, адкажы,
Дзе рубяжы
Шчаснага Эльдарада?»

«Ценяў далінаю,
Як на зямлі
Іншай не стане рады,
Мчы, вою, мчы,
Каб дасягчы
Любага Эльдарада!»

*напісана ў 1849*

*Пераклаў Андрэй Хадановіч*

# Эльдарада

Сівой парой
Адважны вой
Між бур і лістападу
Блукаў сто год
Без сну й клапот:
Шукаў ён Эльдарада.

На тых шляхах
Спазнаў ён жах:
Былыя мары — здрада.
Надзей няма —
Ішоў дарма
Да мэты — Эльдарада.

Стаміўся ён,
Бо йшоў здавён,
Ды ўбачыў цень-прынаду
І на мяжы
Спытаў: «Скажы,
Дзе шлях да Эльдарада?»

«Па сцежках зорных
Кроч да гор —
Адзіная парада.
Не мерай час, —
Гучыць адказ, —
І знойдзеш Эльдарада».

*напісана ў 1849*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Эль — да радасці

Пена і бурштыну ззянне —
Шклянку асушу я ўміг.
Весела мільгаюць здані,
Я не ў стане выгнаць іх.

Дзіўных духаў карагоды
Парушаюць мой спакой.
Сумаваць няма нагоды:
Сёння эль цячэ ракой!

*напісана прыкладна 10 ліпеня 1848*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Анабэль Лі

Можа й помніце вы: вельмі-вельмі даўно
Ў каралеўстве прыморскай зямлі
Мной каханая страсна дзяўчына жыла
З дзіўным іменем Анабэль Лі; —
Мы кахалі й хацелі быць разам заўжды,
Толькі гэтым мы з ёй і жылі.

Быў я гэткім жа самым дзіцём, як яна,
Ў каралеўстве прыморскай зямлі,
І мацней за любога кахалі мы там —
Я і юная Анабэль Лі —
Серафімы — і тыя зайздросцілі нам
І каханню, якім мы жылі.

І таму з вышыні вельмі-вельмі даўно
Ў каралеўстве прыморскай зямлі
Неяк ноччу дыхнуў сцюжны вецер з-за хмар
На каханую Анабэль Лі;
Сваякі яе шэсцем хаўтурным прыйшлі
І яе ў мяне з рук узялі.
І схавалі у склеп, каб кахаць не маглі
Мы ніколі ў прыморскай зямлі.

І анёлы на небе не зведалі той
Асалоды, ў якой мы жылі, —
І таму з вышыні (тое знаюць усе
Ў каралеўстве прыморскай зямлі)
Неяк ноччу дыхнуў сцюжны вецер з-за хмар
І забіў маю Анабэль Лі.

Але ж людзі так моцна кахаць не маглі,
Хоць старэйшыя значна былі

І мудрэйшыя значна былі, —
Ні анёлы з бяскрайнасці райскіх далін,
Ані дэманы з нетраў зямлі
Не маглі разлучыць мяне з Анабэль Лі,
З незабыўнаю Анабэль Лі.

І так ззяе ўгары месяц мне з той пары,
Каб я сніў маю Анабэль Лі;
І так зорка мігціць, каб не мог я забыць
Вочы любай мне Анабэль Лі;
І таму я ўначы тут ляжу на плячы
Самай юнай, каханай і пекнай з жанчын
Ў каралеўстве прыморскай зямлі —
Тут, у склепе прыморскай зямлі.

*напісана ў траўні 1849*

*Пераклаў Алег Мінкін*

# Для Эні

О неба! Знікаюць
Хваробы сляды,
І боль, і пакуты
Сышлі назаўжды —
Жыцця ліхаманку
Здалеў назаўжды.

Скрухі няма.
Рук не чую і ног;
Што навечна я скуты,
Што падняцца не змог, —
Не нагода для суму,
Бо нягоды я змог!

Спачыў бестурботна,
Каб выспацца ўсмак,
Спытаецца кожны:
«Ляжыць тут мярцвяк?»,
І зоры адкажуць:
«Напэўна мярцвяк».

І стогны, і жальбы,
І ўздыхі, і плач
Заціхлі, а з імі —
Гадзіннік няўдач,
Жахлівы стук сэрца,
Жахлівых няўдач.

Агіда, і немач,
І болю страла
Забыты, і знікла
Бяда, што пякла,
Жыцця ліхаманка,
Што сэрца пякла.

Жахліваю мукай
Быў змучаны тут,
Бо зведаў я смагу
У пекле пакут:
Праклятае жарсці
Агонь — мой прысуд,
Ды ў водах гаючых
Пазбыўся пакут.

У водах падземных,
Што ціха цяклі,
Крыніцы, што бегла
Ля самай зямлі,
Крыніцы ў пячоры
Амаль на зямлі.

Хай дурань не кажа,
Што змрок тут густы,
Што дом мой панылы,
Пакой мой пусты,
Што нельга, каб ложак
Заўчасна астыў, —
Ды класціся мусім
У ложак пусты.

Знявечаны дух мой
Прывабіла глуш,
Забыў я навечна
Пах зманлівых руж,
Забыў пра трывогі,
Пах міртаў і руж.

Цяпер у самоце
Мне песціць узгадкі
Пра боскі нектар
І пахкія браткі.

Я сню размарыны,
І руту, і браткі,
І пешчу я ў цемры
Цнатлівыя згадкі.

У шчасным спакоі
Узношу маленні
Да высокае праўды,
І прыўкраснае Эні,
І спакой абяцаюць
Рукі мілае Эні.

Яна мне пяшчоту
Сваю аддае,
Засну я ў ласкавых
Абдоймах яе,
І шчасце прысніцца
Ў абдоймах яе.

У змроку застылым
Схавала мяне,
Маліла анёлаў:
«Хай гора міне!»
Прасіла Ўладарку:
«Хай зло праміне!»

Ляжу бестурботна,
Каб выспацца ўсмак
(З любоўю яе),
Нібыта мярцвяк,
Спачыў бесклапотна,
Каб выспацца ўсмак
(З каханай сваёй),
Нібыта мярцвяк.
Любы падарожны
Ускрыкне: «Мярцвяк!»

Ды шчасце палае
У сэрцы не меней,
Чым зоры ў нябёсах,
Бо побач ёсць Эні,
Мяне асвятляе
Каханая Эні,
І ў думках палае
Святло мае Эні.

*напісана 23 сакавіка 1849*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Сон у сне

Вуснамі твой лоб крану...
І, пакінуўшы адну,
Разумець цяпер пачну
Ўсё, што ты казала мне:
Дні свае пражыў я ў сне.
Бо як згас надзей агмень,
Збег у ноч ці збег у дзень,
Знік у марах, небыцці —
Дзе прасцей яго знайсці?
Што было і што міне —
Гэта толькі сон у сне.

Я стаю, ля ног прыбой
З сушай пачынае бой,
І ў руках ляжыць маіх
Скарб пясчынак залатых,
Ён сцякае да вады,
Тоне ў моры назаўжды,
А на твары — слёз сляды...
Божа, дай жа мне спыніць
Гэту залатую ніць!
Божа, хоць адну вярні
Мне пясчынку з глыбіні!
Што было і што міне —
Гэта толькі сон у сне?

*напісана 31 сакавіка 1849*

*Пераклала Ганна Янкута*

# Філасофія кампазіцыі

У лісце, які цяпер ляжыць перада мной, Чарлз Дыкенс, згадваючы пра маё даследаванне механізму «Барнэбі Раджа»*, напісаў: «Ці заўважылі Вы, між іншым, што Годвін* ствараў свайго «Калеба Уільямса» пачынаючы з канца? Спачатку ён уцягнуў героя ў цэлы шэраг складаных сітуацый — так атрымаўся другі том, — а пасля ў першым томе паспрабаваў патлумачыць тое, што адбылося».

Я не ўпэўнены, што Годвін рабіў усё *менавіта так*, — бо насамрэч тое, што ён гаворыць сам пра сябе, не зусім супадае са сцверджаннем містэра Дыкенса, аднак аўтар «Калеба Уільямса» занадта добры творца, каб не зразумець перавагаў, якія дае выкарыстанне такога прыёму. Цалкам відавочна, што любы сюжэт, варты называцца сюжэтам, павінен быць прадуманы да самай развязкі *перад* тым, як будзе напісанае першае слова: Толькі пастаянна трымаючы ў галаве развязку, можна пабудаваць неабходныя прычынна-выніковыя сувязі, а пасля дэтальна распрацаваць эпізоды і асабліва стварыць атмасферу, раскрываючы сваю задуму.

Ёсць адна сутнасная памылка, якая пагражае тым, хто выбудоўвае твор звычайным чынам. Тэму падказвае альбо гісторыя, жыццёвае здарэнне, альбо, у найлепшым выпадку, аўтар імкнецца ўвесці пэўныя займальныя падзеі, каб сфармаваць фабулу, а пасля запоўніць апісаннямі, дыялогамі ці аўтарскімі заўвагамі прабелы ў фактах ці дзеяннях — прабелы, якія з кожнай старонкай могуць рабіцца ўсё больш заўважнымі.

Я звычайна пачынаю з таго, што абдумваю, якое *ўражанне* зробіць твор. Ніколі не забываючы пра арыгінальнасць — бо сам сябе падманвае той, хто наважваецца адмовіцца ад такога безумоўнага і простага спосабу выклікаць цікавасць, — я перш за ўсё кажу сабе: «З усёй бясконцасці ўражанняў, альбо адчуванняў, якія могуць уздзейнічаць на сэрца, розум ці (гаворачы агульнымі словамі) душу, якое менавіта я абяру гэтым разам?» Абраўшы, па-першае, новае, а па-другое, яр-

кае ўражанне, я разважаю, ці можна яго ўзмацніць пэўным эпізодам ці інтанацыяй — банальным эпізодам і незвычайнай інтанацыяй, альбо наадварот, альбо ўзмацніць незвычайнасцю як эпізоду, так і інтанацыі, — а пасля шукаю вакол сябе (ці, хутчэй, унутры) такое спалучэнне падзеяў і інтанацыяў, якое найлепей дапаможа стварыць неабходнае ўражанне.

Я часта думаў, які цікавы артыкул мог бы напісаць любы пісьменнік, калі б ён захацеў (дакладней, калі б змог) падрабязна, крок за крокам, выкласці ўвесь працэс давядзення любога свайго твора да яго поўнай завершанасці. Ніяк не магу зразумець, чаму ніводны такі артыкул не пабачыў свет; магчыма, рэч тут хутчэй у аўтарскай пыхлівасці, чым у нейкай іншай прычыне. Большасць пісьменнікаў, асабліва паэтаў, хоча, каб людзі думалі, нібыта яны ствараюць у стане нейкага высокага вар'яцтва, з дапамогай экстатычнай інтуіцыі, а таму ажно скаланаюцца ад думкі пра тое, што нехта зможа зазірнуць за кулісы і пабачыць, як нерашуча і нясмела рухаецца думка наперад, пабачыць, што сам аўтар пачынае разумець сваю мэту толькі ў апошні момант, што бясконцыя ідэі ўвесь час адкідаюцца, бо іх немагчыма ўпісаць у агульную карціну твора, што цалкам завершаныя фантазіі ў адчаі адхіляюцца, бо іх немагчыма ўвасобіць, пабачыць, як асцярожна аўтар выбірае і сартуе, як пакутліва знішчае і дапісвае, — адным словам, пабачыць усю машынерыю, усе сакрэты змены дэкарацый, усе драбіны і схаваныя люкі, пеўневае пер'е, чырвоную фарбу і мушкі, якія ў дзевяноста дзевяці выпадках са ста ёсць рэквізітам літаратурнага *histrio*[1].

З другога боку, я ведаю, што аўтар, увогуле здольны аднавіць шлях, які прывёў яго да таго ці іншага выніку, — з'ява зусім не частая. Звычайна ідэі ўзнікаюць досыць хаатычна, і іх такім жа чынам разглядаюць і пасля забываюць.

Што да мяне, то мне ніколі не падабалася такая сарамлівасць, і я ў любы час лёгка магу прыгадаць, як той ці іншы мой твор быў напісаны; а з прычыны, што цікавасць да аналізу ці рэканструкцыі для мяне важнейшая за рэальную

[1] Актор (лац.).

ці ўяўную цікавасць да прадмета аналізу, з майго боку не будзе ніякім парушэннем правілаў прыстойнасці, калі я прадэманструю *modus operandi*[1], якім быў пабудаваны адзін з маіх твораў. Я выбіраю «Крумкача», бо гэты верш найбольш вядомы. Мая мэта — давесці, што ў стварэнні гэтага твора не ўдзельнічалі ні выпадковасць, ні інтуіцыя, што праца крок за крокам рухалася да завяршэння з усёй дакладнасцю і жорсткай паслядоўнасцю — як рашэнне матэматычнай задачы.

Адкінем як безадносную да верша *per se*[2] тую ўмову, ці, скажам, неабходнасць, якая з самага пачатку спарадзіла намер напісаць *які-небудзь* верш, што задаволіў бы густы як шырокай публікі, так і крытыкаў.

Пачнем, такім чынам, з гэтага намеру.

Першая думка датычыць аб'ёму. Калі які-небудзь літаратурны твор занадта доўгі, каб прачытаць яго за адзін раз, мы павінныя быць гатовымі да таго, што надзвычай важнае ўражанне, звязанае з цэласнасцю ўспрыняцця, знікне, бо калі за твор сядаеш два разы, то ўмешваюцца штодзённыя справы, і ўсялякае адзінства раз і назаўсёды знішчаецца. Але з прычыны, што, *ceteris paribus*[3], ніводны паэт не можа ахвяраваць ніводнай дэталлю, якая дапамагла б яму раскрыць сваю задуму, застаецца толькі паглядзець, ці з'яўляецца ў такім выпадку якая-небудзь перавага, што магла б ураўнаважыць страту цэласнасці. І тут я адразу магу сказаць: не. Тое, што мы называем паэмай, насамрэч ёсць усяго толькі шэрагам кароткіх вершаў, іншымі словамі, кароткіх паэтычных уражанняў. Няма патрэбы даводзіць, што верш ёсць вершам толькі таму, што ён надзвычай хвалюе нас, узвышаючы душу, а ўсе моцныя ўзрушэнні бываюць, з псіхалагічных прычынаў, толькі кароткачасовымі. Таму як найменш палова мілтанаўскага «Страчанага Раю» празаічная па сутнасці — паэтычныя ўзрушэнні непазбежна разбаўляюцца спадамі напружання — і ў выніку праз значную даўжыню твора знікае

[1] Спосаб дзеяння (лац.).
[2] Сам па сабе (лац.).
[3] Пры астатніх аднолькавых умовах (лац.).

вельмі важны мастацкі элемент: адзінства, альбо цэласнасць, уражання.

Такім чынам робіцца відавочным існаванне дакладных межаў, якія павінныя акрэсліваць аб'ём любога літаратурнага твора, — магчымасць прачытаць яго за адзін раз, — і што хаця ў некаторых празаічных творах, такіх як «Рабінзон Круза» (дзе цэласнасці не патрабуецца), гэтыя межы можна парушыць, атрымаўшы пэўныя выгады, парушаць іх у вершах нельга ніколі. У гэтых межах даўжыню верша можна матэматычна суаднесці з яго вартасцямі, іначай — з хваляваннем ці ўзвышэннем, яшчэ іначай — са ступенню сапраўднага паэтычнага ўражання, якое ён можа выклікаць. Відавочна, што сцісласць павінная вызначацца інтэнсіўнасцю запланаванага ўражання з умовай, што пэўная мінімальная працягласць цалкам неабходная, каб стварыць любое ўражанне ўвогуле.

Маючы на ўвазе ўсе гэтыя развагі, а таксама такое захапленне, якое я палічыў не вышэйшым за магчымасці шырокай публікі і не ніжэйшым за густы крытыкі, я адразу вырашыў, які *аб'ём* падыдзе для задуманага мной верша, — прыкладна сто радкоў. У выніку атрымалася сто восем.

Далей я пачаў думаць, якое пачуццё, альбо ўражанне, павінен выклікаць мой твор; магу таксама адзначыць, што падчас напісання я ўвесь час імкнуўся стварыць верш, які спадабаецца *усім*. Я занадта далёка адышоў бы ад маёй непасрэднай тэмы, калі б пачаў даводзіць тое, на чым настойваю ўвесь час, і што ў выпадку паэзіі зусім не трэба даказваць, — тое, што Прыгожае ёсць адзінай законнай сферай паэзіі. Аднак сказаць колькі словаў, каб патлумачыць, што я маю на ўвазе, усё ж неабходна, бо некаторыя мае сябры схіляюцца да памылковага разумення маёй думкі. Самая глыбокая, самая ўзвышаная і адначасова самая чыстая асалода, на маю думку, дасягаецца шляхам сузірання прыгожага. Калі гавораць пра Прыгажосць, безумоўна, маюць на ўвазе не якасць, як гэта звычайна лічыцца, а ўражанне, карацей кажучы, гавораць пра тое глыбокае і чыстае ўзрушэнне душы — а не розуму ці сэрца, — пра якое я ўжо згадваў і якое адчуваюць падчас сузірання «прыгожага». Я ж вызначаю Прыгожае як сферу паэзіі толькі

згодна з відавочным законам Мастацтва, паводле якога ўражанне мусіць вынікаць з непасрэдных прычынаў, а мэты павінныя дасягацца сродкамі, найбольш прыдатнымі для іх дасягнення; яшчэ ніхто не дайшоў да такой неразважлівасці, каб адмаўляць тое, што апісанае вышэй узрушэнне лягчэй за ўсё дасягаецца сродкамі паэзіі. Калі мэта — Праўда, ці задавальненне розуму, альбо калі мэта — Жарсць, ці захапленне сэрца, то мэты гэтыя, хаця і дасягальныя ў паэзіі, лягчэй за ўсё дасягаюцца ўсё ж з дапамогай прозы. Бо Праўда патрабуе дакладнасці, а Жарсць — пэўнай *прастаты* (сапраўды жарсныя натуры мяне зразумеюць), а ўсё гэта абсалютна не сумяшчальна з прыгажосцю, якая (я на гэтым настойваю) ёсць узрушэннем, альбо ўзвышанай асалодай душы. З усяго сказанага вышэй ніякім чынам не вынікае таго, што жарсць ці праўда не могуць быць выяўленыя, і выяўленыя з карысцю, у паэзіі, — бо яны могуць дапамагчы раскрыць агульнае ўражанне, як дысанансы ў музыцы, шляхам кантрасту, — але сапраўдны мастак заўсёды зможа, па-першае, падпарадкаваць іх сваёй найвышэйшай мэце, а па-другое — ахінуць іх, як толькі магчыма, той прыгажосцю, якая ёсць атмасферай і самой сутнасцю паэзіі.

Выбраўшы, такім чынам, сваёй сферай Прыгожае, я задаў сабе наступнае пытанне: якая *інтанацыя* змагла б яго падкрэсліць найлепш, — і ўвесь мой досвед падказаў мне, што гэтая інтанацыя мусіць быць *сумнай*. Прыгажосць любога кшталту ў сваім найвышэйшым развіцці нязменна кранае чуллівую душу да слёз. Адпаведна, меланхолія — самая законная з усіх паэтычных інтанацый.

Вызначыўшы аб'ём, сферу і інтанацыю, я звярнуўся да звычайнай індукцыі з мэтай знайсці што-небудзь па-мастацку вострае, тое, што магло б задаць тон усяму вершу, — якую-небудзь вось, вакол якой будзе круціцца ўся структура твора. Уважліва абдумаўшы ўсе звычайныя мастацкія ўражанні, ці, ужываючы тэатральны тэрмін, *прыёмы*, я не мог адразу не зразумець, што ніводны з іх не выкарыстоўваецца так шырока, як *рэфрэн*. Гэтага хапіла, каб упэўніць мяне ў безумоўнай значнасці гэтага прыёму, што пазбавіла мяне неабходнасці

аналізаваць яго. Аднак я разгледзеў яго з мэтай даведацца, ці нельга яго палепшыць, і хутка зразумеў, што ён перабывае ў прымітыўным стане. Звычайны рэфрэн, альбо паўтор, не толькі выкарыстоўваюць пераважна ў песнях, але і абмяжоўваюць яго ўздзеянне, робячы стаўку выключна на аднастайнасць гучання і сэнсу. Усё задавальненне зводзіцца адзіна да пачуцця тоеснасці, паўтарэння. Я вырашыў унесці варыяцыі і такім чынам значна пашырыць уражанне, захоўваючы збольшага аднастайнасць гучання, аднак увесь час змяняючы сэнс: інакш кажучы, я вырашыў увесь час ствараць новыя ўражанні, *па-рознаму* выкарыстоўваючы рэфрэн, пры гэтым пакідаючы яго ў большасці выпадкаў без зменаў.

Вызначыўшыся з усім гэтым, я пачаў разважаць пра *характар* майго рэфрэну. Улічваючы тое, што выкарыстанне рэфрэну ўвесь час будзе змяняцца, зразумела, што сам рэфрэн павінен быць кароткім, бо інакш узніклі б непераадольныя складанасці з частым вар'яваннем любога доўгага сказа. Здольнасць вар'яваць наўпрост залежала ад сцісласці фразы. Такім чынам, найлепшым рэфрэнам я палічыў аднаслоўны.

Наступнае пытанне датычыла таго, *якім* будзе гэтае слова. Спыніўшы свой выбар на рэфрэне, я ўсведамляў, што верш неабходна разбіць на строфы: кожная мусіла заканчвацца гэтым рэфрэнам. Не выклікала сумневаў тое, што такое заканчэнне дзеля сілы мусіць быць гучным і прыдатным да працяглага прамаўлення. Усе гэтыя разважанні прывялі мяне да неабходнасці ўжыць слова з доўгім «о» як самай гучнай галоснай разам з «р» як самай зручнай для вымаўлення зычнай.

Калі гучанне рэфрэну было акрэсленае, з'явілася неабходнасць выбраць слова, якое ўвасобіла б гэтае гучанне і адначасова як найлепш перадавала б меланхолію, якую я выбраў асноўнай інтанацыяй верша. З такімі ўмовамі абсалютна немагчыма было абмінуць слова *nevermore*[1]. Дый менавіта яно прыйшло ў галаву першым.

Далей было неабходна прыдумаць падставу для частага паўтарэння слова *nevermore*. Разважаючы над складанас-

[1] Больш ніколі (анг.).

цю, якая ўзнікла адразу ж, як я пачаў спрабаваць вынайсці больш-менш прыстойную прычыну пастаяннага паўтарэння, я зразумеў, што ўся складанасць палягае адзіна ў тым, што, на маю думку, пастаянна і манатонна гэтае слова павінен прамаўляць *чалавек*, — карацей кажучы, я зразумеў, што мне складана суаднесці гэтую манатоннасць з разумнасцю істоты, якая паўтарае адно і тое ж слова. І тады ў мяне адразу ўзнікла ідэя пра *не*разумнасць істоты, якая мае здольнасць гаварыць; спачатку я, натуральна, падумаў пра папугая, аднак яго тут жа выцесніў крумкач — птушка, якая мае такую самую здольнасць да гаварэння, аднак нашмат больш адпавядае абранай інтанацыі.

На той момант я ўжо даволі добра ўяўляў крумкача — птушку, што прарочыць бяду, манатонна паўтарае аднаадзінае слова *nevermore* пры канцы кожнай страфы верша, напісанага ў журботнай інтанацыі, аб'ёмам каля ста радкоў. Цяпер, не забываючыся ні на хвіліну пра мэту — *ідэальнасць*, альбо дасканаласць ва ўсіх адносінах, я запытаў сябе: «Сярод усіх сумных рэчаў якая, у адпаведнасці з *усеагульным* меркаваннем, будзе *самай* сумнай?» Смерць — вось відавочны адказ. «А калі, — працягнуў я, — гэтая самая сумная рэч будзе яшчэ і самай паэтычнай?» З таго, што я ўжо тлумачыў вышэй, вынікае зноў жа відавочны адказ: «Тады, калі яна самым непасрэдным чынам звязаная з Прыгожым; адпаведна, смерць прыгожай жанчыны, безумоўна, будзе самай паэтычнай тэмай на свеце; няма сумневаў і ў тым, што лепш за ўсё гэтую тэму можа раскрыць яе прыгнечаны горам каханы».

Цяпер мне трэба было спалучыць дзве ідэі — закаханага, што аплаквае сваю памерлую каханую, і крумкача, што пастаянна паўтарае слова *nevermore*, — і зрабіць гэта было неабходна, не забываючы ўвесь час *па-рознаму* выкарыстоўваць гэтае слова. Аднак адзіны магчымы спосаб спалучыць усё гэта — прымусіць крумкача паўтараць слова ў адказ на пытанні закаханага. І тут я ўбачыў магчымасць стварыць ураджанне, на якое я разлічваў, то бок ураджанне *сэнсавых варыяцый*. Я ўбачыў, што магу зрабіць першае пытанне, зададзенае закаханым, — першае пытанне, на якое крумкач павінен адка-

заць *nevermore*, — банальным, другое — менш банальным, трэцяе — яшчэ менш і гэтак далей — пакуль урэшце закаханы, выведзены са свайго звычайнага стану абыякавасці скрушнасцю самога слова, яго частым паўтарэннем і асэнсаваннем злавеснасці птушкі, што яго вымаўляе, не ўспамінае розныя забабоны і не пачынае апантана задаваць зусім іншыя пытанні — пытанні, адказы на якія западаюць яму ў сэрца, — задаваць іх напалову з забабоннага жаху, напалову з таго адчаю, які знаходзіць задавальненне ў самакатаванні, задаваць не таму, што ён верыць у прарочую ці д'ябальскую сілу птушкі (якая, як упэўнівае яго розум, проста паўтарае вывучаны на памяць урок), а таму, што ён адчувае вар'яцкае задавальненне, будуючы свае пытанні так, каб ад *чаканага nevermore* адчуць гора самае невыноснае і таму самае вытанчанае. Зразумеўшы, якія магчымасці дае ці, хутчэй, навязвае мне гэта ў працэсе пабудовы верша, я перш за ўсё засяродзіўся на кульмінацыі, ці заключным пытанні — тым, на якое *nevermore* будзе канчатковым адказам, тым, у адказ на якое слова *nevermore* зацягне ў самую глыбокую бездань гора і адчаю, якую толькі можна ўявіць.

З гэтага, можна сказаць, і пачаўся верш — з канца, з таго, з чаго і павінныя пачынацца ўсе мастацкія творы, бо менавіта тут, у гэты момант папярэдніх разважанняў, я ўпершыню крануў пяром паперу, ствараючы наступную страфу:

«О вястун, — я ўсклікнуў, — птушка проста ты ці д'яблаў служка!
Дзеля Бога, што справуе існым ад зямлі да зор,
Адкажы душы гаротнай, ці ўзляціць яна ў зіхотны
Райскі сад да несмяротнай, што завецца там Лінор?
Да святой, якой анёлы кажуць там цяпер «Лінор»?»
Крук пракрумкаў: «Nevermore!»[1]

Тады я напісаў гэтую страфу, па-першае, каб, вызначыўшы кульмінацыю, лепей вар'яваць і павялічваць напружанне

[1] Верш «Крумкач» цытуецца ў перакладах Алега Мінкіна і Андрэя Хадановіча.

кожнага наступнага пытання, што задае закаханы, з гледзішча іх сур'ёзнасці і значнасці, і, па-другое, каб дакладна задаць рытм, метр, даўжыню і агульную кампаноўку страфы, а таксама размясціць наступныя строфы так, каб ніводная з іх не магла пераўзысці гэтую рытмічным уражаннем. Калі б я быў здольны пасля напісаць больш энергічныя строфы, я без ваганняў наўмысна паслабіў бы іх, каб яны не знішчалі ўражання, створанага кульмінацыйнай страфой.

Тут варта таксама сказаць некалькі словаў пра версіфікацыю. Першай маёй мэтай была, як заўсёды, арыгінальнасць. Тое, што на яе амаль не зважаюць, — адна з самых незразумелых рэчаў у свеце. Можна пагадзіцца на тым, што існуе зусім няшмат вершаваных памераў, аднак цалкам відавочна, што магчымасці варыяцый для рытму і строфікі сапраўды бясконцыя, — і нягледзячы на гэта, *цягам стагоддзяў ніводны чалавек не стварыў і нават, здаецца, не падумаў стварыць што-небудзь арыгінальнае ў гэтай галіне.* Справа ў тым, што арыгінальнасць (калі не казаць пра розумы надзвычайнай сілы) ніякім чынам не з'яўляецца, як лічаць некаторыя, вынікам парыву альбо інтуіцыі. Больш за тое, перад тым як яе знайсці, трэба старанна шукаць, і хаця арыгінальнасць — станоўчая і надзвычай значная якасць, дзеля яе дасягнення патрэбная не столькі вынаходлівасць, колькі ўменне адкідаць лішняе.

Безумоўна, я не прэтэндую на арыгінальнасць у плане памеру «Крумкача». Гэта васьмістопны харэй з чаргаваннем мужчынскіх (у другім, чацвертым і пятым радках) і жаночых клаўзулаў (у першым і трэцім) і чатырохстопны харэй з мужчынскай клаўзулай (шосты радок). Гаворачы без педантызму, ужытая стапа (харэй) складаецца з двух складоў, націскнога і ненаціскнога; першы радок уключае восем такіх стопаў, другі — сем поўных стопаў і адну ўсечаную, трэці — восем поўных, чацверты — сем поўных і адну ўсечаную, пяты — тое самае, шосты — тры і ўсечаную апошнюю стапу. Такім чынам, кожны з гэтых радкоў, узяты асобна, ужо выкарыстоўваўся раней, і арыгінальнасць «Крумкача» палягае ў *спалучэнні гэтых радкоў у страфу*; ніхто да гэтага нават блізка не ствараў нічога падобнага. Уражанне арыгінальнасці ўзмацняецца

іншымі незвычайнымі і нават безумоўна новымі ўражаннямі, якія выклікае больш шырокае выкарыстанне прынцыпаў рыфмавання і алітэрацыі.

Далей неабходна разгледзець умовы сустрэчы закаханага і крумкача, і перш за ўсё — *месца дзеяння.* У гэтай якасці найбольш натуральна выглядаў бы лес ці поле, аднак мне заўсёды здавалася: каб стварыць уражанне адасобленага эпізоду, абсалютна неабходная *замкнёная прастора* — як рама для карціны. Такія межы маюць бясспрэчную ўнутраную сілу прыцягваць увагу і падтрымліваць яе сканцэнтраванай, і іх, безумоўна, не варта блытаць з адзінствам месца.

Так я вырашыў, што закаханы будзе ў пакоі — пакоі, святым для яго ў памяць пра тую, што калісьці часта яго наведвала. Пакой багата абстаўлены — выключна дзеля ўвасаблення ідэі, пра якую я ўжо казаў, — ідэі Прыгожага як адзінай сапраўднай тэмы паэзіі.

Вызначыўшы такім чынам месца дзеяння, я павінен увесці і птушку, прычым абсалютна неабходна ўвесці яе праз акно. Ідэя прымусіць закаханага спачатку падумаць, нібыта лопанне крылаў птушкі аб аканіцу — гэта груканне ў дзверы, перарасла ў жаданне ўзмацніць цікаўнасць чытача, падоўжыўшы чаканне, і дадаць яшчэ адно ўражанне, паказаўшы, як закаханы кідаецца адчыняць дзверы, знаходзіць за імі адно цемрадзь і ў выніку пачынае цьмяна ўяўляць, нібыта ў дзверы пагрукаў прывід яго каханай.

Я выявіў у вершы начную непагадзь, па-першае, каб патлумачыць, чаму крумкач шукае прытулку, а па-другое — каб стварыць кантраст з вонкавай ціхамірнасцю пакоя.

Я пасадзіў птушку на бюст Палады таксама дзеля кантрасту паміж мармурам і пер'ем — безумоўна, бюст з'явіўся ў вершы *толькі пад уплывам птушкі,* — а бюст менавіта Палады быў выбраны, па-першае, як найбольш адпаведны адукаванасці закаханага, а па-другое, праз гучнасць самога слова «Палада».

Прыкладна на сярэдзіне верша я выкарыстаў таксама сілу кантрасту, каб паглыбіць канчатковае ўражанне. Напрыклад, з'яўленне крумкача ў нечым фантастычнае і амаль

набліжаецца, калі толькі гэта магчыма, да недарэчнага. Ён уваходзіць «паважным крокам», «як прывід дзён сівых»:

Увайшоў хадою цвёрдай і *пратупаў з пыхай лорда*
Ля мяне *ў паставе гордай* проста да дзвярэй маіх...

У дзвюх наступных строфах гэтае ўражанне яшчэ больш узмацняецца:

*Вось дзівосы ў мой закутак!* І на хвілю сціх мой смутак,
І спытаўся я: «Чаму так *абадраны твой каўнер?*
Кіпці ворагаў пасеклі? (Тых, што ўрэшце ў жаху ўцеклі?)
*Як цябе завуць у пекле, дасканалы грэнадэр?*
Як цябе Плутон у пекле называе, грэнадэр?»
Адказаў Крумкач: «Не вер!»

Я застыў у захапленні ад птушынага маўлення,
*Хай крылаты мой аратар быў далёка не Гамэр,*
Ды не кожны дзень у госці птах заходзіць да кагосьці,
*Хай не першай маладосці, але важны кавалер!*
Не заўжды *на белы мармур сядзе чорны кавалер*
З рэдкім іменем «Невер»!

Калі развязка такім чынам была забяспечаная, я адразу адкінуў усё фантастычнае і перайшоў да інтанацыі найглыбейшай сур'ёзнасці, пачынаючы ад страфы, якая ідзе пасля працытаванай вышэй:

А тым часам крук пануры знерухомеў на скульптуры... і г. д.

З гэтага моманту закаханы болей не жартуе і не бачыць у абліччы крумкача нічога фантастычнага. Ён называе яго «злавесны, змрочны дух начных пячор», адчувае сябе «пад крумкачыным позіркам, што пёк і жэр». Такая рэзкая змена думак альбо фантазіяў закаханага мела на мэце гэткім жа чынам змяніць думкі чытача, прывесці яго ў неабходны стан для развязкі, якая цяпер мусіць адбыцца *як найхутчэй.*

Пасля самой развязкі — калі крумкач адказаў «*Nevermore*» на апошняе пытанне закаханага пра тое, ці сустрэне ён сваю каханую ў іншым свеце, — верш, на гэтай відавочнай стадыі простага аповеду, можа лічыцца скончаным. Пакуль што ўсё ў межах вытлумачальнага, рэальнага. Крумкач, што вывучыў на памяць адно-адзінае слова *nevermore* і пакінуў свайго гаспадара, сярод начной непагадзі шукае прытулку і спрабуе трапіць у акно, дзе яшчэ гарыць святло, — акно пакоя кніжніка, які напалову заглыбіўся ў чытанне, напалову — у мары пра сваю памерлую каханую. Калі на лопанне крылаў акно адчыняюць, птушка сядае на самае зручнае для яе месца, недасяжнае для кніжніка, які, здзіўлены такім выпадкам, а таксама незвычайным выглядам госця, жартам пытае, не чакаючы адказу, пра яго імя. Крумкач па звычцы адказвае «*Nevermore*», і слова гэтае адразу знаходзіць водгук у маркотным сэрцы кніжніка, які, выказваючы свае думкі, зноў уражаны тым, што птушка паўтарае «*Nevermore*». Кніжнік пачынае разумець, у чым справа, аднак ім рухаюць, як я ўжо згадваў вышэй, уласцівая людзям прага да самакатавання і часткова забабоны, і ён задае птушцы такія пытанні, што, пачуўшы чаканы адказ «*Nevermore*», можа з асалодай усё глыбей апускацца ў бездань пакуты. І калі ён дасягае ў самакатаванні самага дна гэтае бездані, аповед у тым, што я назваў яго першай і відавочнай стадыяй, самым натуральным чынам заканчваецца, не пераступаючы межаў рэальнасці.

Але прадметы, трактаваныя такім чынам, хай сабе апісаныя вельмі таленавіта ці ўпрыгожаныя надзвычай яркімі падзеямі, заўсёды застаюцца ў пэўным сэнсе аголенымі і шурпатымі, і гэта рэжа вока мастака. Абавязкова павінныя прысутнічаць дзве рэчы: першая — гэта пэўная складанасць, дакладней, старанная апрацоўка, другая — гэта пэўная недагаворанасць, падводная плынь, прыхаванасць. Апошняе асабліва надае мастацкаму твору тое *багацце* (калі ўжыць размоўны выраз), якое мы часта блытаем з *ідэалам*. Менавіта збыткоўнае праясненне сэнсу, вывядзенне тэмы на паверхню, замест таго каб пакінуць яе ў якасці падводнай плыні,

ператварае ў прозу (прычым самую няякасную) так званую паэзію так званых трансцэндэнталістаў*.

Трымаючыся такіх поглядаў, я дадаў да верша два заключныя слупкі — і іх недагаворанасць пранізвае ўвесь папярэдні аповед. Падводная плынь сэнсу ўпершыню паказваецца на паверхні толькі ў гэтых радках:

«Згінь туды, дзе змрок, і зморы, й пекла вогненны ашчэр!
Веру, што цябе чакае пекла вогненны ашчэр!»
Адказаў Крумкач: «Не вер!»

Можна заўважыць, што словы «пекла вогненны ашчэр» з'яўляюцца першым метафарычным выразам у вершы. Яны, разам з адказам «*Nevermore*», схіляюць да пошуку маралі ва ўсім расказаным вышэй. Чытач пачынае разглядаць крумкача як сімвал, аднак толькі ў самым апошнім радку робіцца відавочным намер ператварыць яго ў сімвал *скрушных і бясконцых успамінаў*:

Так трываю страх і вусціш я ля мармуру, на бюсце ж —
Госць, якога не адпусціш, бо ўладарыць *ён* цяпер:
Беручы душу ў аблогу, кінуў цень на ўсю падлогу,
І не збавіцца ад злога ценю гібельных хімер!
І душа *з палону злога, з віру гібельных хімер*
Больш не вернецца, не вер!

*Пераклала Ганна Янкута*

# Паэтычны прынцып

Гаворачы пра паэтычны прынцып, я не прэтэндую ні на грунтоўнасць, ні на глыбіню. Разглядаючы, галоўным чынам бессістэмна, самую сутнасць таго, што мы называем паэзіяй, я перш за ўсё хачу схіліць вас да развагаў і прапаную некалькі дробных вершаў ангельскіх і амерыканскіх паэтаў, якія найбольш падыходзяць для маёй задумы або, як мне здаецца, пакідаюць найбольш пэўнае ўражанне. Гаворачы «дробныя вершы», я, безумоўна, маю на ўвазе вершы невялікага памеру. І ў пачатку дазвольце мне сказаць некалькі словаў пра адзін досыць дзіўны прынцып, які, справядліва ці не, заўсёды ўплываў на маю крытычную ацэнку верша. Я лічу, што доўгіх вершаў або паэмаў не існуе. Я сцвярджаю, што выраз «вялікі верш» — не больш чым супярэчнасць у тэрмінах.

Наўрад ці варта гаварыць, што верш мае права называцца вершам толькі тады, калі ён хвалюе, узвышаючы душу. Яго вартасць прапарцыйная гэтаму ўзвышанаму хваляванню. Аднак любое хваляванне хутка мінае: такая ўласцівасць нашых душаў. Тая ступень хвалявання, якая дазваляе вершу так называцца, не можа захоўвацца на працягу ўсяго твора вялікага аб'ёму. Максімум пасля паловы гадзіны чытання яно слабее, заціхае,ператвараецца ў нешта іншае — і тады верш, па сутнасці, перастае быць вершам.

Несумненна, многім падалося складаным прымірыць, з аднаго боку, сцверджанне крытыкаў, нібыта мілтанаўскім «Страчаным Раем» неабходна шчыра захапляцца цягам чытання ўсяго твора, і, з другога боку, абсалютную немагчымасць, чытаючы згаданую паэму, падтрымліваць у сабе патрабаваны крытыкамі ўзровень захаплення. Фактычна гэты вялікі твор можна назваць паэтычным толькі ў тым выпадку, калі, адкінуўшы найважнейшае патрабаванне да ўсіх твораў мастацтва — патрабаванне адзінства, — мы будзем разглядаць яго выключна як шэраг невялікіх вершаў. Калі ж дзеля захавання адзінства, цэласнасці ўражання ці ўздзеяння мы прачыталі б яго за адзін раз, то ў выніку нашае хваляванне

ўвесь час то нарастала, то змяншалася б. Пасля сапраўды паэтычнага ўрыўку нязменна ідуць банальнасці, і ніякія прадпісанні крытыкаў не прымусяць нас імі захапляцца; аднак калі, скончыўшы паэму, мы возьмемся яе перачытваць, прапусціўшы першую кнігу (то бок адразу пачаўшы з другой), мы будзем здзіўленыя, заўважыўшы, як захапляе нас тое, што раней абурала, і як абурае тое, чым мы зусім нядаўна так захапляліся. З гэтага вынікае, што канчатковае, сумарнае, ці абсалютнае ўражанне нават ад найлепшай у свеце эпічнай паэмы роўнае нулю — і гэта бясспрэчны факт.

Што датычыць «Іліяды», то мы маем калі не зусім дакладныя, дык несумненна надзвычай важкія доказы таго, што аўтар задумаў яе як шэраг лірычных вершаў; але, дапускаючы магчымасць задумы яе як эпасу, мы можам сказаць, што яна вырасла з недасканалага разумення мастацтва. Сучасны эпас — гэта не больш чым бяздумнае і сляпое перайманне няправільна зразуметых старажытных узораў. Аднак час такіх мастацкіх анамаліяў мінуў. Калі і здаралася такое, што вельмі доўгая паэма насамрэч была папулярнай (у чым я моцна сумняюся), то відавочна, што ніякая вельмі доўгая паэма больш ніколі папулярнай не будзе.

Меркаванне пра тое, што памер паэтычнага твора, *ceteris paribus*[1], можа быць крытэрам яго ацэнкі, сфармуляванае такім чынам, несумненна, палічаць досыць бязглуздым, аднак гэтым мы абавязаныя нашым часопісам, у тым ліку «Куотэрлі Рэв'ю». Напраўду не можа быць нічога адмысловага ў абстрактна разгледжаным памеры твора, як не можа быць нічога адмысловага ў аб'ёме тых кніг, якімі так часта захапляюцца гэтыя суворыя выданні. І калі гара адным сваімі памерамі і той колькасцю месца, якое яна займае ў прасторы, выклікае ў нас узвышанае і ўзрушанае пачуццё, то ніводны чалавек не будзе гэтаксама ўражаны грандыёзным памерам «Калумбіяды»*. Нават усялякія «Куотэрлі» пакуль не раілі нам захапляцца творам у такім аспекце. Часопісы ніколі не настойвалі яшчэ на тым, каб мы ацэньвалі Ламарціна* ў

[1] Пры астатніх аднолькавых умовах (лац.).

кубічных футах, а Полака* — у фунтах, аднак ці можам мы зразумець нейкім іншым чынам іх пастаяннае раздабарванне на тэму «вялізных высілкаў»? Калі з дапамогай «вялізных высілкаў» нейкі спадарок накрэмзае эпічную паэму, шчыра ўхвалім яго за тыя самыя высілкі (калі яны хоць чагосьці вартыя), але давайце ўстрымаемся ад пахвалаў ягонаму твору выключна з гэтых прычынаў. Можна спадзявацца, што ў будучыні дзякуючы здароваму сэнсу людзі пачнуць меркаваць пра твор мастацтва ў адпаведнасці з уражаннем, якое ён стварае, уражаннем, якое спараджае, а не зыходзячы з часу, неабходнага для дасягнення гэтага ўражання, ці колькасці «вялізных высілкаў», што спатрэбіліся, каб некага ўразіць. Справа ў тым, што стараннасць — гэта адно, а талент — зусім іншае, і ніякія «Куотэрлі» ва ўсім хрысціянскім свеце не змогуць гэтага абвергнуць. І паступова гэтае меркаванне, разам з некаторымі іншымі, прапанаванымі мной, будзе прынятае як відавочнае. Аднак пакуль іх адмаўляюць як памылковыя — што ніякім чынам не перашкаджае іх правільнасці.

З другога боку, не выклікае сумневаў і тое, што верш можа быць недаравальна кароткім. Празмерная сцісласць выраджаецца ў голы эпіграматызм. Хоць вельмі кароткі верш і можа часам быць яскравым і жывым, ён ніколі не створыць глыбокага або працяглага ўражання. Пячатка мусіць раўнамерна ўціскацца ў сургуч. Беранжэ* напісаў незлічоную колькасць твораў, вострых і натхнёных, аднак у большасці сваёй яны занадта бязважкія, каб глыбока ўпячатацца ў грамадскую думку, і праз гэта іх, як і многія іншыя пёркі фантазіі, знесла лёгкім павевам ветрыку.

Яскравым прыкладам таго, як празмерная сцісласць пашкодзіла вершу, не даўшы публіцы звярнуць на яго ўвагу, можа служыць наступная вытанчаная маленькая «Серэнада»*:

Гоніць мроя пра цябе
Сны ў салодкай цішыні,
Дыхае лагодна змрок,
Свецяць ярка зор агні.

Гоніць мроя пра цябе
Сны, і нейкі дух ізноў
Вабіць, быццам незнарок,
Да акна твайго, любоў!

Слабне гукаў тонкі звон
На маўклівых струмянях,
Як імгненні дзіўных мрой,
Растае магнолій пах.
Прадчувае блізкі скон
Плач тужлівы салаўя,
Я ж памру каля цябе,
Незраўнаная мая.

Дзень яшчэ б адзін пражыць!..
Падымі мяне з зямлі,
Пацалункаў на мяне
Жыватворны дождж пралі.
Рвецца сэрца і дрыжыць,
Засталося мне адно:
Абдымі мяне мацней,
Каб разбілася яно[1].

Мала каму, мабыць, вядомыя гэтыя радкі, хаця іх аўтар — такі буйны паэт, як Шэлі. Цеплыню іх вобразаў, далікатных і вытанчаных, здольны ацаніць кожны, і глыбей за ўсіх той, хто сам узлятаў у салодкіх крозах пра каханую, каб патануць у духмяным паветры паўднёвай летняй ночы.

Адзін з найлепшых вершаў Ўіліса* — па-мойму, найлепшы з усяго, што ён напісаў, — менавіта праз гэты недахоп — празмерную сцісласць — не здолеў заняць належнае месца ў суджэннях як крытыкаў, так і чытачоў.

Брадвей начны ўжо бачыць сны,
Цямнее пакрысе,

[1] Пераклад Кацярыны Мацiеўскай.

Красуні крок чуваць праз змрок,
Ідзе ў сваёй красе.
І духаў рой смуга за ёй
Бы ветрыкам нясе.

І чысціня ў змярканні дня
Зачаравала свет,
Любы мінак глядзеў няўзнак
Красуні той услед,
З усім, чым Бог адорваць мог,
Спраўлялася як след.

Яна як след свой запавет
Захоўвала ўвесь час:
Манетаў звон — яе закон,
Цана любых украс,
Сябе прадаць — вось дабрадаць,
Прыдбаўшы мужа ўраз.

Яшчэ адна ідзе без сна
Лілеяй уначы,
І духі іншыя за ёй
Ляцяць, бы крумкачы:
Там ганьба ды відзеж бяды —
Ёй не дапамагчы.

Прасіць дарма — душы няма
У аматараў забаў.
Хоць сам Хрыстос, праліўшы слёз,
Грахі ёй дараваў,
Ды чалавек, нібы на здзек,
Не робіць добрых спраў[1].

[1] Тут і далей, за выняткам асобна адзначаных, пераклад вершаў з ангельскай — Ганны Янкута.

Складана пазнаць у гэтым творы Уіліса, які напісаў столькі нязначных салонных вершаў. Радкі не толькі багатыя і бездакорныя, але і поўныя энергіі, аднак пры гэтым дыхаюць відавочнай і сур'ёзнай шчырасцю пачуцця, якія б мы марна шукалі ў іншых творах Уіліса.

Пакуль эпічная манія, пакуль ідэя пра тое, што без шматслоўнасці ў паэзіі пашаны не заслужыць, цягам апошніх гадоў, выключна праз сваю бязглуздасць, паступова памірае ў меркаваннях публікі, мы бачым, як наўзамен ёй ідзе ерась занадта відавочная і ілжывая, каб яе можна было доўга цярпець, але якая за кароткі час свайго існавання прынесла нашай паэзіі больш шкоды, чым усе астатнія яе ворагі, разам узятыя. Я маю на ўвазе ерась, якую называюць дыдактызмам. Прынята лічыць, моўчкі і ўголас, наўпрост і ўскосна, што асноўная мэта любой паэзіі — ісціна. Лічыцца, што кожны верш мусіць несці мараль, і па гэтай маралі трэба ацэньваць вартасць твора. Мы, амерыканцы, з асаблівым імпэтам падтрымліваем гэтую ідэю, больш за тое — мы, бостанцы, надзвычай ахвотна развілі яе напоўніцу. Мы забралі сабе ў галаву, што напісаць верш проста дзеля верша ды яшчэ і прызнацца ў гэтым — значыць прадэманстраваць адсутнасць сапраўднай паэтычнай велічы і сілы; аднак калі б мы насамрэч дазволілі сабе зазірнуць у глыбіню свае душы, мы б адразу зразумелі, што няма пад сонцам і ніколі не існавала — дый не можа існаваць — твора, больш велічнага, больш высакароднага, чым гэты самы верш, верш *per se*[1], верш, які ёсць толькі вершам і больш нічым, верш, напісаны выключна дзеля самога верша.

Адчуваючы да ісціны такую глыбокую пашану, якую толькі можа адчуваць чалавек, я, тым не менш, у пэўнай ступені абмежаваў бы спосабы яе насаджэння. Абмежаваў бы з мэтай узмацніць іх. Я не паслабляў бы іх рассейваннем. Патрабаванні ісціны суворыя. Ёй няма справы да міртавых вянкоў. Тое, без чаго ў песні ніяк не абысціся, — гэта акурат тое, з чым ісціна не мае нічога агульнага. Упрыгожваць яе

[1] Сам па сабе (лац.).

каштоўнасцямі і кветкамі — значыць рабіць з яе вычварны парадокс. Змагаючыся за ісціну, мы маем патрэбу хутчэй у строгай, а не расквечанай мове. Мы мусім быць простымі, дакладнымі, нешматслоўнымі. Мы мусім быць халоднымі, спакойнымі, бясстраснымі. Адным словам, мы мусім быць у тым стане, які як мага больш процілеглы паэтычнаму. Напраўду сляпы той, хто не бачыць карэннай і непераадольнай розніцы паміж пераканаsuccнем з дапамогай ісціны і перакананнем з дапамогай паэзіі. Невылечна хворы тэарэтык той, хто, нягледзячы на гэтае адрозненне, усё ж настойліва спрабуе змяшаць алей і ваду — паэзію і ісціну.

Раздзяліўшы свядомасць на тры відавочныя галіны, мы маем чысты розум, густ і маральнасць. Я змяшчаю густ пасярэдзіне, бо гэта акурат тое месца, якое ён займае ў свядомасці. Ён цесна судакранаецца з іншымі галінамі, аднак аддзелены ад маральнасці такой малазаўважнай мяжой, што Арыстоцель не вагаючыся аднёс некаторыя яго праявы да маральных якасцяў. Тым не менш мы бачым, што функцыі частак гэтай трыяды маюць дастаткова адрозненняў. Гэтаксама як розум мае дачыненне да ісціны, так густ паведамляе нам пра прыгожае, а маральнасць клапоціцца пра абавязак. Гаворачы пра апошні складнік, можна дадаць, што сумленне вучыць нас паважаць абавязак, розум тлумачыць яго мэтазгоднасць, тым часам як густ толькі дэманструе яго прывабнасць, абвяшчаючы вайну заганам выключна таму, што яны выродлівыя, непрапарцыйныя, варожыя ўсяму цэльнаму, сувымернаму і гарманічнаму — адным словам, прыгожаму.

Такім чынам, несмяротны інстынкт, што жыве ў глыбіні чалавечага духу, — гэта, папросту кажучы, пачуццё прыгожага. Менавіта яно дапамагае чалавеку атрымаць асалоду ад шматстайнасці формаў, гукаў, пахаў і адчуванняў, сярод якіх ён існуе. Як лілея адбіваецца ў возеры, а вочы Амарыліс* — у люстэрку, так і вуснае ці пісьмовае ўзнаўленне гэтых формаў, гукаў, колераў, пахаў і адчуванняў падвойвае крыніцу асалоды. Аднак такое паўтарэнне не ёсць яшчэ паэзіяй. Той, хто проста спявае, хай сабе з палкай захопленасцю ці жывой праўдападобнасцю ўзнаўлення, пра вобразы, гукі, водары і

пачуцці, дасягальныя для яго, як і любога іншага чалавека, не даказвае свайго права на боскае званне. У далечыні ўсё яшчэ засталося нешта, чаго ён не здолеў дасягнуць. Усё яшчэ ёсць у нас неспатольная смага, для спатолі якой ён не паказаў нам крыштальных ручаёў. Смага гэтая належыць несмяротнасці чалавечай. Яна адначасова і вынік, і прыкмета ягонага спрадвечнага існавання. Яна — імкненне матылька да зораў. Гэта не проста спасціжэнне прыгажосці наўкола нас, гэта і адчайная спроба сягнуць прыгажосці вышняй. Натхнёныя экстатычным прадбачаннем хараства па той бок магілы, мы змагаемся за тое, каб у шматстайных спалучэннях часовых рэчаў і думак здабыць хаця б крыху таго прыўкраснага, кожная часцінка якога, магчыма, належыць адзіна вечнасці. І таму тады, калі паэзія — або музыка, найбольш чароўная сярод усяго паэтычнага, змушае нас залівацца слязьмі, мы плачам не ад вялізнае асалоды, як меркаваў абат Гравіна*, а ад нейкай нецярплівай, нястрымнай скрухі, спароджанай нашай няздольнасцю цяпер, тут, на зямлі, адразу і назаўсёды, напоўніцу спазнаць гэтую боскую і натхнёную радасць, няўлоўную і хісткую згадку пра якую дорыць нам верш або мелодыя.

Жаданне спасцігнуць незямную прыгажосць, гэтае жаданне душаў адмысловага складу, і дало свету ўсё тое, што ён мог адразу і зразумець, і назваць паэтычным.

Безумоўна, паэтычнае пачуццё можа развівацца па-рознаму: у жывапісе, скульптуры, архітэктуры, танцы, асабліва ў музыцы, і вельмі своеасабліва і шырока — у садова-паркавым мастацтве. Аднак нашая сённяшняя тэма абмяжоўваецца толькі яго слоўным выяўленнем. Дазвольце каротка закрануць тут пытанне рытму. Я задаволюся толькі тым, што з усёй упэўненасцю скажу: музыка ва ўсёй разнастайнасці метру, рытму і рыфмы мае такое вялікае значэнне для паэзіі, што адмаўляцца ад яе заўсёды неразумна; яна настолькі жыццёва важнае дапаўненне, што грэбаваць яе дапамогай — значыць папросту паказваць сваю абмежаванасць, — і не буду далей спыняцца, сцвярджаючы яе абсалютную важнасць. Магчыма, менавіта ў музыцы душа найбольш набліжаецца да вялікай мэты, да якой яна імкнецца, натхнёная паэтычным

пачуццём, — да стварэння незямной прыгажосці. Магчыма, насамрэч толькі ў музыцы гэтая найвышэйшая мэта часам дасягаецца. Мы часта з трапяткім захапленнем адчуваем, што зямная арфа стварае гукі, якія могуць чуць у нябёсах анёлы. І таму нельга сумнявацца, што з'яднанне паэзіі і музыкі ў агульнапрынятым сэнсе адкрывае шырокае поле для паэтычнага развіцця. Старадаўнія барды і мінезінгеры мелі перад намі перавагу, і калі Томас Мур* спяваў свае песні, ён самым разумным чынам дасканаліў іх як вершы.

Падвядзем высновы. Я б каротка вызначыў паэзію словаў як стварэнне прыгожага з дапамогай рытму. Яе адзіны суддзя — густ. Яе дачыненне да розуму ці сумлення мае другаснае значэнне. З абавязкам ці ісцінай яна ніякім чынам не звязаная.

Скажу, аднак, некалькі словаў, каб патлумачыць. Я сцвярджаю, што асалоду, адначасова найбольш чыстую, найбольш узнёслую і найбольш глыбокую, можна атрымаць, сузіраючы прыўкраснае. Толькі ў сузіранні прыўкраснага мы здольныя адчуць узвышанае задавальненне, ці ўзрушэнне душы, якое мы называем паэтычным пачуццём і якое вельмі лёгка адрозніць ад ісціны, што прыносіць задавальненне розуму, ці ад жарсці, што хвалюе сэрца. А таму я лічу прыгожае (я ўжываю слова таксама ў значэнні «ўзвышанае») сферай паэзіі проста ў адпаведнасці з відавочным законам мастацтва, паводле якога вынікі мусяць наўпрост выцякаць з прычынаў, і ніхто яшчэ не дайшоў да такой неразважлівасці, каб адмаўляць тое, што ўзрушэнне, пра якое ідзе гаворка, лягчэй за ўсё дасягаецца сродкамі паэзіі. З гэтага ніякім чынам не вынікае, аднак, тое, што пабуджэнні жарсці, ці загады абавязку, ці нават урокі ісціны не могуць быць выяўленыя, і выяўленыя з карысцю, у вершы, бо яны здольныя час ад часу рознымі спосабамі паслужыць асноўным мэтам твора; аднак сапраўдны мастак заўсёды зможа падпарадкаваць іх той прыгажосці, якая ёсць атмасферай і самой сутнасцю паэзіі.

Самы час цяпер прадставіць тыя некалькі вершаў, якія я збіраюся прапанаваць вам для разважанняў, і пачаць з уступу да «Блукальца» Лангфэла*:

Згасае дзень, цямнее;
Як пёрка ад крыла,
Ноч на зямлю злятае,
І бачны цень арла.

Агні далёкай вёскі
Мігцяць праз дождж і мжу
І скруху абуджаюць,
І я пра штось тужу,

І скруху, і маркоту,
Ды сэрцу не баліць —
Так дождж вісіць імжою,
Не здольны з неба ліць.

Чытай, чытай мне вершы,
Гучаць яны няхай,
Што сум мой утаймуюць,
Прагоняць мой адчай,

Ды не паэтаў даўніх,
Не велічных майстроў,
Што ў калідорах часу
Больш не трывожаць кроў.

Іх вершы — быццам маршы:
Працуй, імкніся, кроч!
Ды трызню я пра цішу,
Спакоем вабіць ноч.

Хачу пачуць я вершы,
Што рвуцца на прастор,
Як дождж з нябёс улетку
Ці ноччу слёзы зор.

Паэт, што напісаў іх
Праз дні і ночы мук

Здалее чуць у сэрцы
Мелодый светлых гук.

Здалеюць тыя вершы
Вярнуць душы святло —
Нібыта блаславенне
На верніка сышло.

Пасля чытай на выбар
Радкі з каштоўных кніг,
Каб новай прыгажосцю
Гучалі рыфмы іх.

Ноч музыкай заззяе,
І, свой сабраўшы стан,
Мае трывогі рушаць
У шлях, бы караван.

Хаця размах фантазіі ў гэтых радках не надта вялікі, чытачы справядліва захапляюцца тонкасцю іх выяўлення. Некаторыя з вобразаў гэтага твора надзвычай моцна ўражваюць. Няма нічога лепшага за гэтыя радкі:

...велічных майстроў,
Што ў калідорах часу
Больш не трывожаць кроў.

Вельмі моцна ўздзейнічае таксама ідэя апошняга чатырохрадкоўя. Аднак верш у цэлым заслугоўвае ўхвалы за вытанчаную неахайнасць памеру, які цудоўна адпавядае выяўленым пачуццям, і за непасрэднасць стылю ўвогуле. Гэтую непасрэднасць, ці натуральнасць, мастацкага стылю даўно стала модным лічыць непасрэднасцю выключна вонкавай — а таму надзвычай цяжка дасягальнай. Але гэта не так: натуральная манера складаная толькі для тых, каму і квапіцца на яе не варта, — людзям, пазбаўленым натуральнасці. Выключна ў выніку таго, што верш будзе

пісацца з разуменнем ці з прыродным чуццём, яго інтанацыя апынецца прымальнай для большасці людзей і, безумоўна, будзе ўвесь час змяняцца ў залежнасці ад абставінаў. Той аўтар, які на манер «Паўночнаамерыканскага агляду» ва ўсіх абставінах будзе заставацца ўсяго толькі «ціхім», абавязкова апынецца ва ўсіх абставінах таксама бязглуздым ці дурным і будзе мець не больш правоў лічыцца «непасрэдным» ці «натуральным», чым кокні-франт або спячая прыгажуня ў музеі васковых фігураў.

Сярод дробных вершаў Браянта* найбольш уразіў мяне той, які быў названы аўтарам «Чэрвень». Вось урывак з гэтага твора:

І будзе сонца летнім часам
Бруіць святло здалёк,
Мой крыж агорнуць травы пасам
І ўзыдзе васілёк,
Спляце гняздоўе авяльга,
А побач зажыве туга
І сонны матылёк.
І будзе ўлетку чутны тут
Птушыны спеў, пчаліны гуд.

Чуць буду ўрыўкі гаманы,
Што даляцяць з сяла,
Ці спеў дзяўчыны ў час начны,
Што марыць тут прыйшла.
І стрэнуцца ў маёй цішы
Дзве закаханыя душы —
Найдалей ад жытла.
Каханне, спевы, вербалоз...
Ні ўздыхаў, ні пакутных слёз.

Я ведаю: мой скрушны дом
Лагода абміне,
І не абдорыць дзень цяплом,
Не апячэ мяне.

Калі ж са скрухаю зямной
Сябры збяруцца нада мной,
Іх гэты край кране,
Ім будзе добра ля магіл:
У кветках мой зялёны схіл.

Яны згадаюць, што было, —
Шчаслівыя часы,
Таго, хто сёння — толькі тло
Й не бачыць больш красы,
Таго, чый лёс — смяротным сном
Заснуць пад гэтым харaством.
Іх слухаць галасы
Я буду дзесьці пад травой,
Шчаслівы гаманой жывой.

Нават сама рытмічная плынь тут падаецца пачуццёвай — нішто не можа быць больш меладычным. Гэты верш заўсёды ўздзейнічаў на мяне вельмі цікавым чынам. Напружаная меланхолія, якая, здаецца, вымушаная выплёсквацца на паверхню ўсяго светлага, што паэт гаворыць пра сваю магілу, кранае нас да глыбіні душы — гэта і ёсць найбольш шчырае паэтычнае ўзрушэнне. Верш пакідае ўражанне прыемнага суму. І калі астатнія творы, якія я прапаную вашай увазе, абудзяць штосьці больш ці менш падобнае да гэтага суму, дазвольце нагадаць, што з невядомых прычынаў менавіта такое адценне суму непадзельна звязанае з усімі найвышэйшымі праявамі сапраўднае прыгажосці. Аднак гэта выклікае ўсяго толькі

І скруху, і маркоту,
Ды сэрцу не баліць —
Так дождж вісіць імжою,
Не здольны з неба ліць.

Адценне, пра якое я кажу, найбольш заўважнае нават у такім бліскучым і жывым вершы, як «Тост за здароўе» Эдварда Коўта Пінкні*:

За тую п'ю, што апяю
Ажно да самых зор,
За тую, што для ўсіх жанчын —
Красы і цноты ўзор.
Свой бляск нябесныя агні
Дарылі ёй адной,
Той, што была дачкой святла,
Нябеснай, не зямной.

Гучанне слоў — спеў салаўёў
У цёплы весні час,
Хай голас соладка гучыць
І захапляе нас!
Бо словы — з глыбіні душы,
Найпрыгажэйшай з душ.
Яны — як мёд, які для сот
Пчала збірае з руж.

Пачуцці ў сэрцы дарагім
Палаюць, бы агмень,
Іх поўніць водар чысціні,
Як кветкі ў летні дзень,
О жарсці сэрца, як гарацць
Узвышана яны;
Яна ж — бы ўвасабленне іх,
Багіня даўніны.

Зірнеш у твар — і вось пажар
У сэрцы назаўжды,
А голас забярэ ў палон
На доўгія гады.
І толькі пра яе ўвесь час
І думкі, й сны мае,

А ў скрушны дзень вазьму я ў цень
Узгадкі пра яе.

За тую п'ю, што апяю
Ажно да самых зор,
За тую, што для ўсіх жанчын —
Красы і цноты ўзор.
За тую!.. Хай наш знае край
Найбольш красы такой,
І ён дыхне, бы ў шчасным сне,
Паэзіяй жывой!

Містэру Пінкні не пашанцавала, што ён нарадзіўся так далёка на Поўдні. Калі б ён жыў у Новай Англіі, магчыма, высакародная хеўра, якая цяпер кантралюе лёс амерыканскага пісьменства, выдаючы тое, што называецца «Паўночнаамерыканскім аглядальнікам», прызнала б яго першым амерыканскім лірычным паэтам. Працытаваны вышэй верш надзвычай прыгожы, аднак выкліканае ім паэтычнае ўзрушэнне варта прыпісаць галоўным чынам таму спачуванню, якое выклікае аўтарская захопленасць. Мы выбачаем яму гіпербалы за відавочную сур'ёзнасць, з якой яны прамаўляюцца.

Аднак я не маю ніякага намеру разважаць пра вартасці таго, што збіраюся вам чытаць. Вершы заўсёды гавораць самі за сябе. Бакаліні* ў «Вестках з Парнаса» расказвае, што аднойчы Заіл прэзентаваў Апалону вельмі з'едлівую крытыку на ўсебакова расхваленую кнігу, пасля чаго бог спытаў яго пра вартасці твора. Крытык адказаў, што яго цікавілі толькі недахопы. Пачуўшы гэта, Апалон уручыў яму мех непраеянай пшаніцы, прапанаваўшы ўзяць у якасці ўзнагароды ўсю мякіну.

Гэтая гісторыя можа вельмі добра служыць выпадам супраць крытыкаў, аднак я зусім не ўпэўнены, што бог меў рацыю. Я зусім не ўпэўнены, што асноўныя абавязкі крытыка разумеюцца цяпер цалкам правільна. Вартасць твора, асабліва верша, можа быць прынятая за аксіёму, якую трэба

проста правільна падаць, каб яна аказалася відавочнай. Бо вартасць перастае быць вартасцю, калі яе трэба даводзіць такім чынам, і спыняцца занадта падрабязна на вартасцях нейкага твора мастацтва — гэта значыць прызнаваць, што не такія яны і вялікія.

Сярод «Мелодыяў» Томаса Мура ёсць адзін выбітны верш, які, здаецца, быў незаслужана пакінуты па-за ўвагаю. Я маю на ўвазе радкі, што пачынаюцца словамі: «Алень, мой паранены сябра...» Іх напружаную энергію не пераўзышоў нават Байран. Апісанае ў двух радках гэтага верша пачуццё ўвасабляе ўсю сутнасць боскае жарсці любові — пачуцця, якое, магчыма, адгукнулася рэхам у большай колькасці самых жарсных чалавечых сэрцаў, чым любое іншае пачуццё, што калісьці было адлюстраванае ў словах:

Алень, мой паранены сябра, спачні,
Згубіўся твой статак удалечыні,
Тут дом твой — і ў доме не будзеш адзін,
Я буду з табой да апошніх гадзін.

Любоў застанецца сабой назаўжды —
У радасны час і ў хвіліну бяды.
Хай будзеш ты злым, вінаватым, слабым,
Я знаю — цябе палюблю я любым.

Анёлам назваў ты, шчаслівы, мяне,
Я буду анёлам і ў вусцішным сне.
У пекла без жаху з табой я пайду,
І згіну з табой — ці развею бяду!

Апошнім часам стала модным адмаўляць Муру ва ўяўленні, пакідаючы яму адно фантазію, розніцу паміж якімі першым вызначыў Колрыдж*, што лепш за ўсіх разумеў вялізную сілу Мура. Але рэч у тым, што фантазія гэтага паэта настолькі пераважвае ўсе астатнія яго здольнасці, а таксама фантазію ўсіх астатніх людзей, што стварылася цалкам натуральнае ўражанне, нібыта гэта адзіная ягоная якасць.

Аднак гэта — самая вялікая ў свеце памылка. Ніколі не здаралася большай несправядлівасці са славай сапраўднага паэта. Я не магу згадаць іншага ангельскамоўнага верша, які сведчыў бы пра больш глыбокае, больш таямнічае (у найлепшым сэнсе гэтага слова) уяўленне, чым той, што пачынаецца радкамі «Хачу стаяць над цьмяным ставам» і які напісаны Томасам Мурам. На жаль, не магу згадаць яго цалкам.

Адным з самых высакародных і, гаворачы пра фантазію, адным з самых адораных гэтай якасцю сярод сучасных паэтаў быў Томас Гуд*. Ягоная «Прыўкрасная Інэса» заўжды поўнілася для мяне неапісальнай чароўнасцю:

Вы бачылі Інэсу?  
На захад адышла  
Бліщчэць святлей ад сонца —  
Стаў свет калыскай зла.  
Пазбавіла нас шчасця  
І дзённага святла  
Яна, што ззяла перламі  
І чырванню цвіла.

Прыйдзі да нас, Інэса,  
І змрок начны развей!  
Сумуюць зоры з поўняй  
Без гэтых лёгкіх вей.  
Шчаслівы твой каханы,  
Найлепшая між фей;  
Ты будзеш побач з кімсьці —  
Мне прамаўчаць лацвей.

О, быць бы мне, Інэса,  
Выбраннікам тваім,  
Які ў вандроўках доўгіх —  
Твой сябра-пілігрым!  
Няўжо няма паненак тут,  
Няўжо мы так гарым,

Што трэба мора пераплыць
За сябрам дарагім?

Сустрэў цябе, Інэса,
На нашых берагах
Сярод найлепшых юнакоў —
У кожнага свой сцяг;
Дзяўчаты, рыцары, плюмаж —
Святло на ўвесь прасцяг.
О найпрыўкраснейшы мой сон!
Ці ўбачу я працяг?..

На гора мне, Інэса,
Сышла ты назаўжды.
Пад музыку і спевы
Згубіліся сляды.
І сёння ў сэрцы — горыч,
І чую, як тады,
Я гэты спеў: бывай, бывай
На доўгія гады!

Бывай, бывай, Інэса!
Закончаны наш баль,
Узыдзеш ты на карабель —
Цябе чакае даль:
На гора ўсёй зямлі сплывеш,
На радасць сотням хваль.
Ты дорыш шчасце аднаму,
Астатнім — вечны жаль.

«Дом з прывідамі» таго ж аўтара — адзін з самых праўдзівых вершаў, што былі калісьці напісаныя, самых праўдзівых, самых дасканалых, самых па-мастацку завершаных як у плане тэмы, так і ў плане выканання. Апроч гэтага, ён сведчыць пра магутную і амаль узорную сілу ўяўлення. На жаль, яго памер не дазваляе працытаваць яго тут. Замест гэтага дазвольце прапанаваць вам верш, які любяць усе, — «Мост слёз».

О нешчасліваая!
Змерыла ты
Крокі жахлівыя
Да пустаты.

Думкі варожыя
Кіньце свае;
Тонкія й гожыя
Рысы яе.

Саванам стане
Змоклае ўбранне
І пахавальнаю
Чыстай абновай.
Вы спачувальнае
Вымаўце слова.

Думкаю светлаю,
Сумнай і ветлаю,
Стрэньце няшчасную,
Не, не заганную,
Не апантаную —
Толькі прыўкрасную.

Погляды злосныя
Ёй невыносныя.
Ціхай паўстанніцы
Неацалелае
Сэрца збалелае
Больш не параніцца.

Цела гаротнае
Евы наступнае
Стыне, вільготнае, —
Смерць неадступная.

Пасмы сплятайце
Моцным вузлом,
Косы сплятайце,
Ды не пытайце,
Дзе яе дом.

Дзе яны, родныя,
Дзе яны, згодныя,
Блізкія душы?
Ці звар'яцела
Да найкаханага,
Сэрцам жаданага,
Ў думках ляцела?

Жорсткасць паганская
Між хрысціянскае
Ўсёй грамады:
Сэрцы — далёкія,
Сцены — высокія,
Шлях — да вады.

Ёй, што адчужана,
Лёсам асуджана,
Мала цяпла.
Ўсім яна лішняя,
Скруха няўцішная —
Нават найвышняя
Літасць сышла.

Вокны наўкола...
Ах, як вясёла
Свецяць яны —
Яркаю злівай!
Ёй жа, трымтлівай,
Падаць імкліва
Ў морак начны.

Шалеюць вятры...
Яна маладая,
Чаму да пары
Памерці жадае?
Бедамі змушана,
Смерцю спакушана,
Плача наўзрыд —
Толькі б сысці адсюль,
Хай і ў нябыт!

Браце мой грэшны,
Сэрца няўцешна
Мусіць балець!
Як ты на скрушную
Плынь непарушную,
Зважыўшы ледзь,
З пыхай бяздушнаю
Можаш глядзець?

Думкі варожыя
Кіньце свае;
Тонкія й гожыя
Рысы яе.

Будзьце лагодныя —
Рукі халодныя
Лёгка краніце,
Ад неспагаднасці,
Чэрствай зларадпасці
Абараніце.

Мёртвыя вочы
Праз хуткацечныя
Беды й сірочы
Лёс там, у ночы,
Сны бачаць вечныя.

Вось апантаная,
Ганьбаю гнаная
Ад бессардэчнасці,
Бесчалавечнасці

Ў холад і ў прах.
Вы не глядзіце —
Рукі складзіце
Ёй на грудзях.

Яна пасля скону
З пакорай схіляцца
Хай прыйдзе да трону
Спрадвечнага Ўладцы[1].

Сіла гэтага верша не менш значная, чым яго пафас. Версіфікацыйная тэхніка хаця і даходзіць да самае мяжы фантастычнага, тым не менш цудоўна адпавядае бязмежнай звар'яцеласці, якая ляжыць у аснове верша.

Сярод дробных вершаў лорда Байрана* ёсць адзін, які ніколі не атрымліваў ад крытыкі той пахвалы, якой ён напраўду варты:

Не прашу я збавення ў долі,
Хай ламае, і крышыць, і гне,
Тваё добрае сэрца ніколі
Не судзіла сурова мяне.
І той боль, што мяне агартае,
Ты гатова дзяліць папалам.
За спагаду тваю, дарагая,
Я табе сваю вернасць аддам.

Калі часам усмешка прыроды
Праганяла з душы маёй змрок,
Гэта, мабыць, таму, што заўсёды
Ты мне зоркай свяціла здалёк.
І калі акіянскія хвалі
Уздымаліся аж да нябёс,
Мо таму яны так бушавалі,
Што з табой разлучыў мяне лёс.

Хоць надзеі мае і разбіты,
Патанулі ў прадонні жыцця,

[1] Пераклад Кацярыны Мацівускай і Ганны Янкута.

Хоць мой дух чорным смуткам спавіты,
Я не стану рабом пачуцця.
Самых лютых пакут не баюся,
Яны сіл прыдадуць удвая.
Да цябе ў сваіх марах імкнуся,
Яснавокая зорка мая.

Ты мяне не пакінула ў горы,
Абышла ты людскі нагавор,
Не схіляла да нізкай пакоры,
Не сказала мне слова ў дакор.
Яны ж брудам мяне аблівалі,
Абміналі, скрывіўшы раты,
І калі баязліўцы маўчалі,
За мяне заступілася ты.

Але я не кляну іх за гэта:
Распраўляцца так лёгка з адным!
Хто не ўмее згаджацца са светам,
Таму лепей не звязвацца з ім.
За памылку мяне пакаралі:
Хіба можна так жорстка караць?
Яны ўсё ад мяне адабралі,
Не ўдалося цябе адабраць.

Можа, згубнай мне будзе дарога,
Хай нядоля цябе не кране!
Між руін і асколкаў былога
Ты адна засталася ў мяне.
У пясках б'е крыніца жывая,
Ля крыніцы той — пальмавы гай,
Там самотная птушка спявае
Пра цябе, пра пакінуты край[1].

Хаця памер гэтага верша — адзін з самых складаных, дадаць сюды што-небудзь у плане тэхнічнага выканання наўрад ці мажліва. Ніколі больш высакародная тэма не заклікала да працы пяро паэта. Ідэя верша ўзвышае душу і палягае ў тым,

[1] Пераклад Юркі Гаўрука.

што ніводны чалавек не мае права жаліцца на лёс, калі ў час нягодаў яго падтрымлівае нязменнае каханне жанчыны.

З Алфрэда Тэнісана* — хаця я з усёй шчырасцю лічу яго найвысакароднейшым паэтам сярод усіх, што калі-небудзь жылі ў свеце, — я паспею прачытаць толькі вельмі кароткі ўрывак. Я называю і лічу яго найвысакароднейшым сярод паэтаў не таму, што ўражанне, якое ён стварае, заўсёды надзвычай глыбокае, і не таму, што паэтычнае хваляванне, якое ён узбуджае, заўсёды вельмі моцнае, а таму, што яно заўсёды найбольш тонкае, іншымі словамі, найбольш узвышанае і чыстае. Няма паэта менш зямнога, менш звязанага з зямлёй. Урывак, які я збіраюся вам прачытаць, узяты з ягонай апошняй вялікай паэмы «Прынцэса»:

Не ведаю, у чым прычына слёз,
Якія боскі нарадзіў адчай, —
Народжаныя ў сэрцы, льюць з вачэй,
Калі гляджу на зжоўклыя лугі
І думаю пра дні, што ўжо сышлі.

Яны святлей за сонечны прамень
На ветразі, што любых нам вярнуў,
Журботней за прамень, што асвяціў
Сяброў, якія тонуць з караблём;
Святло й журбота — дні, што ўжо сышлі.

Журбота й цуд — як летняю зарой
У час канання чуеш птушак спеў
І бачыш перад смерцю, як акно
У яркі ператворыцца квадрат;
Цуд і журбота — дні, што ўжо сышлі.

Цяпло, што мёртвым вуснам аддаем,
І слодыч — бы ў фантазіях сваіх
Цалуем тых, хто не належыць нам,
І першага кахання глыбіня...
Смерць у жыцці — вось дні, што ўжо сышлі.

Я паспрабаваў пазнаёміць вас, няхай сабе вельмі павярхоўна і недасканала, з маёй канцэпцыяй паэтычнага прын-

цыпу. Я ўзяў сабе за мэту паказаць, што хаця сам па сабе гэты прынцып наўпрост выяўляе чалавечае імкненне да незямной прыгажосці, праяўляецца ён заўсёды ў нейкім узнёслым узрушэнні душы, цалкам незалежным ад жарсці, якая ёсць ап'яненнем сэрца, і ісціны, якая ёсць задавальненнем розуму. Бо жарсць, на жаль, схільная прыніжаць, а не ўзвышаць душу. Любоў жа, наадварот, — сапраўдная любоў, боскі Эрас, Венера Уранійская ў адрозненне ад Венеры Дыянейскай*, несумненна, ёсць самай чыстай і самай правільнай паэтычнай тэмай. Што да ісціны, то, безумоўна, калі мы, спрабуючы яе дасягнуць, здабываем яшчэ і незаўважаную да гэтага гармонію, мы адразу перажываем і сапраўднае паэтычнае пачуццё; але гэтае пачуццё варта прыпісаць выключна гармоніі — і ні ў якай ступені ісціне, што паслужыла ўсяго толькі выяўленню гэтае гармоніі.

Аднак мы здолеем хутчэй атрымаць дакладнае ўяўленне пра тое, чым ёсць сапраўдная паэзія, проста пералічыўшы некаторыя з самых простых яе элементаў, якія нараджаюць паэтычнае пачуццё ў душы самога паэта. Ён пазнае амброзію, якая ўскормлівае яго душу, у яркіх свяцілах, што ззяюць у нябёсах, у бутонах кветак, у зарасніках нізкага кустоўя, у хвалістых нівах, у прыхіленых высокіх усходніх дрэвах, у шызых горных далячынях, у караванах аблокаў, у зіхценні ледзь бачных ручаёў, у бляску срэбных рэк, у спакойных самотных азёрах, у зорах, што люструюцца ў глыбокіх калодзежах. Ён чуе яе ў птушыным спеве, у гуках Эолавай арфы, у шэпце начнога ветрыку, бурклівым голасе лесу, у жальбах прыбою, у свежым дыханні гаёў, у водары фіялкі, у салодкім паху гіяцынту, у тых духмяных павевах, што так шмат яму гавораць і якія прыносіць яму вечаровая пара з далёкіх і невядомых нікому выспаў, што ўзвышаюцца за цьмянымі акіянамі, бясконцымі і нязведанымі. Ён здабывае яе з усіх высакародных думак, усіх высокіх пабуджэнняў, усіх святых парыванняў, усіх рыцарскіх, шчырых і самаахвярных дзеяў. Ён адчувае яе ў харастве жанчыны, у яе грацыёзнай хадзе, у ззянні яе вачэй, у музыцы яе голасу, у яе ціхім смеху, у яе ўздыхах, у гарманічным шоргаце яе строяў. Ён глыбока адчувае яе ў чароўнай пяшчоце,

у яе палкім захапленні, у яе ласкавай міламжальнасці, у яе ціхмяным і цнотным цярпенні — але больш за ўсё, о, больш за ўсё ён пазнае яе, укленчвае перад ёй, багоміць яе, увасобленую ў вернасці, чысціні, сіле і ў напраўду боскай веліччы яе кахання.

Дазвольце мне пры канцы прачытаць яшчэ адзін кароткі верш, які вельмі адрозніваецца ад усяго астатняга, згаданага вышэй. Ён напісаны Мазэрвелам* і мае назву «Песня вершніка». Мы з усімі нашымі сучаснымі і цалкам рэалістычнымі ўяўленнямі пра бессэнсоўнасць і бязбожнасць вайны наўрад ці здольныя ў поўнай меры спачуваць выяўленым у ім пачуццям і, адпаведна, ацаніць усе выключныя яго вартасці. Дзеля гэтага нам трэба ў сваім уяўленні атаясаміць сябе з душой старога вершніка-воя.

Дзе ваша зброя? Сёдлы дзе?
Па конях, малайцы!
Нас слава з гонарам вядзе,
Загубы пасланцы.

Мы не заплачам, не ўздыхнем,
Узяўшы ў рукі меч,
І на каханых не зірнем,
Калі паскачам прэч.

Хай баязліўцы б'юць адбой —
Ім шал вайны чужы.
Мы пойдзем як героі ў бой,
Загінем як мужы.

*Пераклала Ганна Янкута*

# Каментар

## Апавяданні

### Марэла

*Прэсбург* — старая назва сталіцы Славакіі Братыславы. У Прэсбургу знаходзілася шмат навучальных установаў, у тым ліку найстарэйшы ўніверсітэт на тэрыторыі Славакіі — Істрапалітанскі ўніверсітэт, заснаваны ў 1465 годзе.

*Як Гіном стаў Геенай* — назва біблейскага пекла — Геена — паходзіць ад назвы даліны Энома (па-габрэйску Ге-гіном), ці даліны сыноў Эномавых, адной з дзвюх далінаў побач з Ерусалімам.

*Перасяленне душы* — маецца на ўвазе містычнае вучэнне піфагарэйцаў, паводле якога душа перасяляецца ў цела чалавека ці жывёлы і перажывае шэраг такіх перасяленняў, пакуль не заслужыць права вярнуцца на нябёсы.

*Вучэнне Шэлінга пра тоеснасць* — Фрыдрых Вільгельм Шэлінг (1775–1854), нямецкі філосаф, аснову поглядаў якога складала вучэнне пра тоеснасць, паводле якога суб'ект і аб'ект, паняцце і сузіранне, канечнае і бясконцае, ідэальнае і рэальнае супадаюць у сваім духоўным пачатку.

*Джон Лок* (1632–1704) — ангельскі філосаф; згаданая думка адсылае да працы Лока «Досвед пра чалавечы розум» (1690).

*Пестум* — горад у Італіі, які ў старажытнасці быў знакаміты ружамі, што квітнелі ў яго ваколіцах. Пра ружы Пестума, якія двойчы квітнеюць, згадваў Вергілій у «Георгіках».

*Тэосец* — маецца на ўвазе старажытнагрэцкі паэт Анакрэонт (570/559–485/478 да н. э.), які нарадзіўся ў горадзе Тэасе ў Іёніі (Малая Азія). У сваіх вершах Анакрэонт апяваў віно і каханне.

### Падзенне Дому Ашэраў

*П'ер Жан Беранжэ* (1780–1857) — французскі паэт і складальнік песняў, вядомы найперш сваімі сатырычнымі творамі. Цытата для эпіграфа ўзятая з верша «Адмова» (*Le Refus*).

*Апошні вальс фон Вэбера* — тут маецца на ўвазе папулярная ў тыя часы фартэп'янная п'еса «Бліскучыя танцы» (1824) нямецкага кампазітара Карла Готліба Рэйзінгера, вядомая пад назвай «Апошні вальс Вэбера». Такая блытаніна з назвай адбылася таму, што ноты гэтага твора былі знойдзеныя ў паперах Вэбера пасля яго смерці.

*Генры Фюзелі* (Ёган Генрых Фюслі, 1741–1825) — швейцарскі і ангельскі мастак, графік, гісторык і тэарэтык мастацтва. У многіх карцінах Фюзелі заўважная цікавасць мастака да змрочных фантастычных сюжэтаў, пазычаных з літаратуры, міфалогіі і фальклору. Ілюстраваў Шэкспіра, Мілтана, Блэйка.

*Рычард Ўотсан* (1737–1816) — ангельскі хімік, аўтар пяцітомнай працы «Нарысы па хіміі» (1781–1787). Ён жа быў біскупам Ландафам.

*Томас Персіваль* (1740–1804) — ангельскі доктар, знакаміты сваёй «Медыцынскай этыкай» (1803).

*Ладзара Спаланцані* (1729–1799) — італьянскі натураліст і фізік. Як і Томас Персіваль, цікавіўся пытаннем адчувальнасці раслінаў і прысвяціў яго разгляду «Дысертацыю пра прыроду жывёлаў і раслінаў» (1780).

*Жан Батыст Луі Грэсэ* (1709–1777) — французскі паэт-сатырык і драматург. За камічную паэму «Вэр-Вэр» (1734), у якой расказваецца пра прыгоды папугая, выхаванага ў жаночым манастыры, Грэсэ быў сасланы начальствам езуіцкага ордэна (да якога ён належаў) у гарадок Лафлеш. Праз некаторы час Грэсэ выйшаў з ордэна і нават стаў сябрам Французскай акадэміі. Вершаванае пасланне «Манастыр» (1735) апявае жыццё паэта.

*Нікало Мак'явэлі* (1469–1527) — італьянскі пісьменнік, гісторык і палітычны дзеяч. У навеле «Архід'ябал Бельфагор» (1515, надр. 1549) расказваецца пра д'ябла, які ў выглядзе чалавека наведвае Фларэнцыю.

*Эмануэль Сведэнборг* (1688–1772) — шведскі навуковец і тэасоф; яго містычны трактат «Нябёсы і пекла» выйшаў у 1758 годзе.

*Людвіг Хольберг* (1684–1754) — дацкі пісьменнік; у напісаным па-лацінску сатырычным рамане «Падземнае падарожжа Нікаласа Кліма» (1741) расказваецца пра падарожжа героя па выдуманых краінах і высмейваюцца састарэлыя звычаі і забабоны.

*Роберт Флад* (1574–1637) — ангельскі доктар, астролаг, містык, аўтар шэрагу містычных і філасофскіх трактатаў. Апроч усяго іншага, цікавіўся алхіміяй, Кабалой і хірамантыяй.

*Жан д'Эндажынэ* (XVI ст.) — французскі хірамант.

*Марэн Кюро Дэляшамбр* (1594–1675) — французскі доктар, хірамант.

*Людвіг Ёган Цік* (1773–1853) — нямецкі паэт, празаік, драматург; яго казачны раман «Старая кніга, альбо Падарожжа ў блакітную далеч» выйшаў у 1835 годзе.

*Тамаза Кампанэла* (1568–1639) — італьянскі навуковец і пісьменнік; сацыяльная ўтопія «Горад Сонца» была напісаная ў 1062 годзе ў вязні.

*Эймерык дэ Жырон* (каля 1320–1399) — гішпанскі інквізітар.

*Пампоній Мэла* (I ст.) — рымскі географ, аўтар працы *De situ orbis*, у якой ён дзеліць свет на пяць геаграфічных зонаў. У працы апісваецца шэраг напаўказачных плямёнаў. *Эгіпаны*, паводле Пампонія Мэлы, падобныя да сатыраў. У старажытнагрэцкай міфалогіі Эгіпан — сын Зеўса альбо Пана (часта атаясамліваўся з апошнім), які дапамог Зеўсу ў барацьбе з Тыфонам.

*Сачыненнем сэра Ланселота Кенінга «Небяспечнае спатканне»* — мяркуецца, што Ланселот Кенінг прыдуманы Эдгарам По, а ўрыўкі з цытаванай кнігі напісаныя ім самім. *Этэльрэд* — кароль Этэльрэд I кіраваў Ўэсэксам у IX ст., кароль Этэльрэд II Безразважны кіраваў Англіяй у канцы X — пачатку XI ст.

## Авальны партрэт

Існуе яшчэ адзін пераклад гэтага апавядання, зроблены Ганнай Янкута. Знайсці яго можна на сайце часопіса «ПрайдзіСвет».

*Эн Рэдкліф* (1764–1823) — ангельская пісьменніца, адна з першых аўтараў гатычных раманаў, сярод якіх самыя вядомыя — «Італьянец» (1797), «Удальфскія таямніцы» (1794). Дзеянне многіх гатычных раманаў (у тым ліку названых) адбываецца за мяжой, часта — у Італіі.

*Томас Салі* (1783–1872) — амерыканскі мастак, ангелец з паходжання, аўтар жаночых партрэтаў.

## Лігея

*Джозэф Глэнвіл* (1636–1680) — ангельскі пісьменнік, святар і філосаф, адзін з найбольш значных натурфілосафаў другой паловы XVII ст.

*Аштафет* — багіня фінікійскага горада Сідон (ІІ тысячагоддзе да н. э).

*Дочкі Дэласа* — Айнатрофы, дочкі Анія з Дэласу, якім Апалон падараваў здольнасць ствараць з зямлі масла, злакі і віно.

*Бэкан, лорд Веруламскі* — Фрэнсіс Бэкан (1561–1626) у 1618 годзе атрымаў тытул лорда Веруламскага. Словы ўзятыя з яго эсэ «Пра прыгажосць». У тэксце Бэкана не «вытанчаная прыгажосць», а «дасканалая».

*Клеамен* — гэтае імя пазначанае на статуі Венеры Медыцэйскай.

*Нурджахад* — маецца на ўвазе «ўсходні» раман «Гісторыя Нурджахаду» (1767) ангельскай пісьменніцы Фрэнсіс Шэрыдан (1724–1766), маці Рычарда Брынслі Шэрыдана.

*Дэмакрытаў калодзеж* — Дэмакрыту (каля 460–370 да н. э.), старажытнагрэцкаму філосафу, прыпісваюць выслоўе «ісціна жыве на дне калодзежа».

*Двайнымі зорамі Леды...* — маюцца на ўвазе дзве яркія зоркі ў сузор'і Блізнятаў, што носяць імёны Кастора і Палукса. У грэцкай міфалогіі Кастор і Палідэўк — браты-блізняты, сыны Леды і Зеўса.

*Побач з буйной зоркай у сузор'і Ліры...* — маецца на ўвазе зорка Вега ў сузор'і Ліры. Двайная зорка гэтага сузор'я мае назву эпсілан-Ліра.

*Сатурнавы свінец* — у алхіміі і ў даўнейшай хіміі свінец называўся сатурнам.

*Азраіл* — у мусульманскай міфалогіі анёл смерці.

*Чарвяк там трыюмфуе...* — У першую публікацыю апавядання (1838) верш «Чарвяк-пераможца» не ўваходзіў; ён быў апублікаваны асобна ў 1843 годзе. Упершыню быў уключаны По ў апавяданне ў публікацыі 1845 г.

*Луксор* — горад у Егіпце на правым беразе Ніла на месцы старажытных Фіваў, дзе знаходзяцца руіны знакамітага храма бога Амона.

## Маска Чырвонае Смерці

*«Эрнані»* — рамантычная драма Віктора Гюго (1802–1885).

## Вільям Вільсан

*У. Чэмберлен* (1619–1689) — ангельскі паэт, пра жыццё якога амаль нічога не вядома. «Фараніда» (1859) — яго паэма ў пяці тамах.

*Геліягабал*, альбо *Элагабал* (204–222) — рымскі імператар з дынастыі Севераў, які ўвёў у Рыме культ сірыйскага бога сонца Эль-Габала, знакаміты сваёй жорсткасцю і дэспатызмам.

*Праходзячы цёмнай далінаю...* — Пар.: «Калі я пайду далінай смяротнага ценю, не ўбаюся ліха, бо Ты са мною; Тваё жазло і твой посах — яны супакойваюць мяне» (Псалтыр, 22:4; Біблія цытуецца ў перакладзе Васіля Сёмухі).

*«Прыўкрасны час, жалезнае стагоддзе!»* — цытата ўзятая з верша Вальтэра (1694–1778) «Свецкі чалавек» (1736).

*19 студзеня 1813 года* — 19 студзеня нарадзіўся сам По. У розных рэдакцыях «Вільяма Вільсана» год нараджэння героя змяняўся — По называў і 1811 год, і год свайго нараджэння — 1809.

*Пераірадзіў Ірада* — Шэкспір. «Гамлет». Дзея III, сцэна 2.

*Ірад Атык* (каля 101 — каля 177) — грэцкі аратар, які нарадзіўся ў вельмі багатай сям'і: яго дзед быў у свой час самым багатым чалавекам у Грэцыі. Таксама, паводле легенды, ён знайшоў у сваім доме схаваны скарб.

## Праўда пра тое, што здарылася з містэрам Вальдэмарам

*Месмерызм* — ад імя Фрыдрыха-Антона Месмера (1734–1815), аўстрыйскага лекара, які атрымаў шырокую вядомасць сваімі доследамі лекавання хваробаў з дапамогай «жывёльнага магнетызму», у аснове якога ляжала гіпнатычнае ўздзеянне.

*«Валенштайн»* — драматургічная трылогія Фрыдрыха Шылера: «Лагер Валенштайна» (1798), «Пікаламіні» (1799) і «Смерць Валенштайна» (1799).

*Джон Рэндалф* (1773–1833) — амерыканскі палітык. Карыкатурысты часоў По малявалі яго з доўгімі павучынымі нагамі.

## Элеанора

*Раймунд Луллій* (1235–1315) — гішпанскі паэт, філосаф і місіянер.

*Нубійскі географ* — у сваёй паэме ў прозе «Эўрыка» Эдгар По нубійскім географам называе Пталямея Гефестыёна, хутчэй за ўсё маючы на ўвазе Клаўдыя Пталямея (87–165) — старажытнагрэцкага астранома, матэматыка, тэарэтыка музыкі і географа.

*Мора цемры* — лац. *Mare Tenebrarum*; так еўрапейцы называлі Атлантычны акіян. Мора цемры пачыналася за мысам Бажадор, які доўгі час у Еўропе лічылі скрайнім пунктам свету. Пачынаючы ад яго дзьмулі такія вятры і цяклі такія цячэнні, што пераход за Бажадор лічыўся немагчымым. Упершыню Бажадор перасягнуў партугальскі мараплавец Жыл Эанэш у 1434 годзе.

*Геспер* — вечаровая зорка, паводле старажытнагрэцкага міфу — сын альбо брат Атланта і бацька Гесперыдаў.

*Шыразскі паэт* — маецца на ўвазе Саадзі (1184–1291), персідскі паэт, які нарадзіўся ў Шыразе, горадзе на поўдні сучаснага Ірана.

*Элізіюм*, ці *Элізій* (Елісейскія палі) — у грэцкай міфалогіі месца, дзе жывуць пасля смерці праведнікі.

## Д'ябал пярэчання

*Фрэнолаг* — паслядоўнік фрэналогіі, папулярнай ў XIX ст. псеўданавукі пра сувязь псіхікі чалавека і будовы яго чэрапа. Заснавальнікам фрэналогіі з'яўляецца аўстрыйскі доктар і анатом Франц Ёзаф Галь (1758–1828).

*Ёган Каспар Шпурцгайм* (1776–1832) — нямецкі фрэнолаг, сябра Ф. Ё. Галя, якому ён дапамагаў пісаць працу «Анатомія і фізіялогія нервовай сістэмы».

## Калодзеж і ківач

*Якабінскі клуб* — палітычны клуб часоў Вялікай французскай рэвалюцыі, названы так паводле месцы сустрэчы яго сябраў — залі былой бібліятэкі манахаў-якабінцаў (дамініканаў).

*Антуан Ласаль* (1775–1809) — французскі генерал, які ўдзельнічаў у заваяванні ў 1808 годзе Напалеонам Гішпаніі. Апроч усяго іншага, знакаміты фразай, звернутай да жонкі: «Маё сэрца — табе, мая кроў — імператару, а маё жыццё — гонару».

## Цішыня

*Алкман* (VII ст. на н. э.) — старажытнагрэцкі паэт-лірык. Працытаваны ў эпіграфе ўрывак пасля пераасэнсоўвалі ў сваіх вершах Ё. В. Гётэ («Другая начная песня вандроўніка», на беларускую мову яе перакладалі А. Лойка і С. Ліхадзіеўскі) і М. Ю. Лермантаў.

*Заір* — старая назва ракі Конга.

*Бегемот* — маецца на ўвазе міфічная біблейская істота (гл. Кнігу Ёва, 40, 10–19).

*Дадона* — старажытнагрэцкі горад у Эпіры, у якім знаходзіўся аракул Зеўса, чые адказы расшыфроўваліся па шолаху лістоты дуба.

## Берэніка

*Ібн-Заят* Абу Джафар Махамед ібн Абд аль-Малек ібн Абан (памёр каля 830 г.) — арабскі паэт і палітычны дзеяч (візір пры халіфе аль-Мутасіме Абасідзе); звесткі пра яго падаюцца ў энцыклапедыі Бартэльмі д'Эрбло Маленвіля «Усходняя бібліятэка» (*Bibliothèque Orientale,* 1697), дзе сярод іншага паведамляецца, што Ібн-Заят быў адным з самых адукаваных людзей свайго часу, і даецца кароткі пераказ элегіі, урывак з лацінскага перакладу якой прыводзіць Э. По і ў якой аўтар расказвае пра сваё каханне да рабыні. На параду сяброў наведаць магілу каханай, каб атрымаць палёгку, лірычны герой адказвае: «Ці ёсць у яе іншая магіла, апроч майго сэрца?» (паводле французскага перакладу арабскага тэксту).

*Арнгейм* — маляўнічы нідэрландскі горад.

*Цэлій Секунд Курыён* (1503–1569) — італьянскі гуманіст.

*Аўрэлій Аўгустын* (354–430) — хрысціянскі філосаф, пісьменнік і багаслоў, адзін з Айцоў Царквы. Твор «Пра горад Божы» быў напісаны каля 426 г.

*Квінт Септымій Фларэнс Тэртуліян* (каля 155 — каля 230) — раннехрысціянскі багаслоў. Цытата ўзятая з твора «Пра цела Хрыстова», частка V, раздзел 4.

*Клаўдый Пталямей* (87–165) — гл. каментар да апавядання «Элеанора».

*Сіманід Кеоскі* (каля 556–468 да н. э.) — адзін з самых значных старажытнагрэцкіх паэтаў-лірыкаў.

*Мары Сале* (1707–1756) — французская балерына.

## Падзенне ў Мальстрэм

*Мальстрэм* — вір у Нарвежскім моры ля паўночна-заходняга ўзбярэжжа Нарвегіі.

*Дэмакрытаў калодзеж* — гл. каментар да апавядання «Лігея».

*Джозэф Глэнвіл* — гл. каментар да апавядання «Лігея».

*Лафатэн,* альбо Лафатэнскія выспы — архіпелаг у Нарвежскім моры ля паўночна-заходняга ўзбярэжжа Нарвегіі.

*Нубійскі географ* — гл. каментар да апавядання «Элеанора».

*Mare Tenebrarum* — гл. каментар да апавядання «Элеанора».

*Трысель* — касы чатырохвугольны ветразь, мае форму няправільнай трапецыі. *Зарыфлены* — прыспушчаны.

*Ёнас Рамус* (1649–1718) — нарвежскі гісторык. Менавіта яго апісанне Мальстрэма Эдгар По выкарыстаў для свайго апавядання.

*Нарвежская міля* — 11 295 метраў.

*Флегетон* — у старажытнагрэцкай міфалогіі вогненная рака, што атачае падземны свет.

*Лінейны карабель* — клас трохмачтавых драўляных ваенных караблёў. Мелі поўнае водазмяшчэнне (ад 500 да 5500 тонаў), ад 30 да 150 гарматаў і экіпаж колькасцю ад 300 да 800 чалавек. Будаваліся з XVII стагоддзя да пачатку 1800-х гадоў для вядзення марскіх баёў.

*Атанасіюс Кірхер* (1602–1680) — нямецкі езуіт, навуковец, адзін з самых вучоных людзей свайго часу.

*Батнічны заліў* — заліў у паўночнай частцы Балтыйскага мора.

*Планшыр* — гарызантальны драўляны ці стальны брус па абводзе корпуса карабля для надання трываласці, а таксама для замацавання такелажу.

*Рым* — металічнае колца на судне для замацавання снасцяў.

## Залаты жук

*Артур Мэрфі* (1727–1805) — ірландскі пісьменнік, журналіст, актор і драматург; паводле А. Нікалюкіна, прыведзеныя ў эпіграфе словы адсутнічаюць у камедыі «Усе памыляюцца» (1761) — мяркуецца, што яны запісаныя Эдгарам По па памяці на аснове ўбачанага ім спектакля. Паводле легендаў, ўратавацць ад смерці пасля ўкусу тарантула мог толькі адмысловы танец — тарантэла.

*Форт Моўлтры* — у гэтым форце Эдгар По правёў больш за год падчас свае службы ў войску ЗША.

*Ян Свамердам* (1637–1680) — нідэрландскі натураліст, які вывучаў анатомію чалавека і жывёлаў, асабліва насякомых.

*Цафра* — блакітны пігмент, што выкарыстоўваецца для малявання на шкле ці парцаляне.

*Уільям Кід* (каля 1650–1701) — ангельскі пірат, якога судзілі за злачынствы і павесілі, аднак вакол імені якога доўга не сціхалі спрэчкі, напраўду ён быў піратам ці ўсё ж меў каперскі патэнт і не нападаў на саюзнікаў. Падчас арышту пры ім не было амаль ніякіх грошай, што і нарадзіла легенду пра «скарб капітана Кіда».

*Галконда* — старажытная індыйская крэпасць непадалёк ад Хайдэбарада, у ваколіцах якой здабывалі дыяменты.

*Гішпанскі мацярык* — так называлі тэрыторыі Паўднёвай Амерыкі і прылеглыя моры, якія былі захопленыя гішпанцамі.

## Забойствы на вуліцы Морг

*Томас Браўн* (1605–1682) — ангельскі доктар і пісьменнік. Эпіграф узяты з трактата «Пахаванне ў урнах» (1658), частка V, прысвечанага старажытным норфалкскім магільным урнам.

*Эдман Хойл* (1672–1762) — ангелец, аўтар шматлікіх кніг, прысвечаных гульням.

*Фрэнолаг* — гл. каментар да апавядання «Д'ябал пярэчання».

*Сэн-Жэрменскае прадмесце* — арыстакратычны раён Парыжу на паўднёвым беразе Сены.

*Пале-Раяль* — палац з садам у Парыжы, пабудаваны ў 1629–1634 гадах для кардынала Рышэльё.

*Тэатр «Вар'етэ»* — парыжскі тэатр вадэвіля, заснаваны ў 1807 годзе.

*Праспер Жаліё Крэбіён* (1674–1762), французскі драматург, аўтар п'есы «Ксеркс» (1714), знакамітай гучным правалам.

*Томас Лоў Нікалс* (1815–1901) — амерыканскі доктар і грамадскі дзеяч.

*Альфонс дэ Ламарцін* (1790–1869) — французскі паэт-рамантык, гісторык і палітычны дзеяч. Гл. таксама каментар да эсэ «Паэтычны прынцып».

*«Страціла былое гучанне першая літара»* — цытата ўзятая з паэмы Авідыя «Фасты».

*Журдэн* — герой камедыі Мальера (1622–1673) «Мешчанін у дваранстве».

*Франсуа Эжэн Відок* (1775–1857) — французскі злачынца, які пасля зрабіўся прыватным дэтэктывам.

*Праўда — не заўсёды на дне глыбокага калодзежа* — выслоўе пра тое, што праўда знаходзіцца на дне калодзежа, прыпісваецца Дэмакрыту.

*Жорж Кюўе* (1769–1832) — французскі натураліст, які займаўся класіфікацыяй жывёльнага свету.

*Неўшатэль* — горад на поўначы Францыі.

*Лаверна* — старажытнарымская багіня прыбытку, апякунка злодзеяў.

*«Адмаўляць тое, што ёсць, і разважаць пра тое, чаго не існуе»* — выказванне з рамана Ж. Ж. Русо «Юлія, або Новая Элаіза».

## Сфінкс

*У той час, калі ў Нью-Ёрку лютавала халера...* — маецца на ўвазе эпідэмія пачатку 1830-х гадоў.

## Чалавек натоўпу

*Жан Лабруер* (1645–1696) — французскі пісьменнік-мараліст. Цытата ўзятая з яго працы «Характары, альбо Норавы нашага стагоддзя» (1688).

*Горгій* (каля 428–375) — старажытнагрэцкі філосаф і рытар.

*Эўпатрыды* — найстаражытнейшая атычная арыстакратыя; паводле традыцыі, заснавальнікам гэтага класа лічыўся Тэсей.

*Лукіян з Самасаты* (каля 120–180) — старажытнагрэцкі пісьменнік-сатырык. У дыялогах пад назвай «Выявы» (11) Палістрат, сярод іншага, кажа наступнае: «І такія вось жанчыны падобнымі мне падаюцца да егіпецкіх храмаў: і ў іх бо сам храм прыгожы і велічны, камянямі каштоўнымі ўпрыгожаны, золатам і роспісам расквечаны, але ўнутры, калі будзеш імкнуцца ўбачыць самое боства, паўстане малпа, ібіс, казёл ці кот».

*Квінт Септымій Флорэнс Тэртуліян* — гл. каментар да апавядання «Берэніка».

*Морыс Рэц* (1779–1857) — нямецкі мастак, аўтар ілюстрацыяў да гётэўскага «Фаўста».

*«Садок душы»* — кніга «Садок душы з дадаткам некалькіх маленькіх прамоваў» належыць страсбургскаму друкару Ёгану Грунінгеру (1450–1530). Паводле А. Нікалюкіна, По, хутчэй за ўсё, ведаў яе з другіх рук, бо яна не змяшчае нічога «гнюснага».

## Некалькі выпадкаў з жыцця знакамітасці

*Джозэф Хол* (1574–1656) — ангельскі біскуп, пісьменнік-мараліст і сатырык. Цытата ўзятая з кнігі «Сатыры» (1597).

*«Лісты Юніюса»* — ананімныя сатырычныя лісты, што друкаваліся ў лонданскім часопісе *Public Advertiser* у 1769–1772 гадах і ў якіх утрымлівалася крытыка ўраду.

*Жалезная Маска* — загадкавы вязень часоў французскага караля Людовіка XIV, які ніколі не здымаў з твару маску і памёр у Бастыліі ў 1703 годзе. Паводле адной з версіяў, гэта быў брат караля Людовіка XIV.

*Томас Бартолін* (1616–1680) — дацкі доктар, матэматык і багаслоў.

*«Квартальны»* — тут і ніжэй абыгрываюцца назвы найбуйнейшых брытанскіх і амерыканскіх часопісаў.

*Парфірый Фінікійскі* (233 — каля 304), — старажытнагрэцкі філосаф-неаплатонік.

*Ямвліх* (каля 280–330) — сірыйскі філосаф-неаплатонік, які каментаваў працы Платона ў эзатэрычным духу.

*Плотын* (204–270) — старажытнагрэцкі філосаф, заснавальнік неаплатанізму.

*Прокл Дыядох* (412–485) — старажытнагрэцкі філосаф-неаплатонік, кіраўнік Платонаўскай Акадэміі, пры якім неаплатанізм дасягнуў свайго апошняга ўзлёту.

*Гіерокл* (V ст.) — александрыйскі неаплатонік, знакаміты каментарамі да выслоўяў Піфагора.

*Максім Тырскі* (II ст.) — старажытнагрэцкі філосаф-неаплатонік.

*Сірыян Александрыйскі* (канец IV — пачатак V ст.) — старажытнагрэцкі філосаф, прадстаўнік Афінскай школы неаплатанізму, каментатар Платона і Арыстоцеля.

*Ан Рабэр Жак Цюрго* (1727–1781) — французскі палітычны дзеяч і эканаміст.

*Рычард Прайс* (1723–1791) — ангельскі філосаф-мараліст і эканаміст.

*Джозэф Прыстлі* (1733–1804) — ангельскі натураліст і філосаф-матэрыяліст.

*Жан Антуан Кандарсэ* (1743–1794) — французскі асветнік, дзеяч французскай буржуазнай рэвалюцыі.

*Анна Луіза Жэрмена дэ Сталь* (1766–1817) — французская пісьменніца.

*Гамеамерыя* — тэрмін філасофіі Анаксагора, складаны, бясконца дзялімы, але пры гэтым найменшы элемент нейкай матэрыяльнай якасці.

*Яўсевій Кесарыйскі* (каля 263–340) — адзін з бацькаў царкоўнай гісторыі.

*Арый* (256–336) — александрыйскі гісторык царквы, заснавальнік адной з ранніх ерасяў — арыянства.

*Нікейскі сабор* — царкоўны сабор, скліканы рымскім імператарам Канстанцінам у 325 годзе дзеля барацьбы з ерасямі. На гэтым саборы было асуджанае арыянства і выпрацаваны «сімвал веры».

*П'юзеізм* — вучэнне ангельскага тэолага Эдварда Буверы П'юзі (1800–1882), вядомае як Оксфардскі рух, ці Каталіцкае адраджэнне ў ангельскай царкве.

*Гамузія і гамуёзія* — два погляды на Ісуса Хрыста. Паводле першага, Хрыстос тоесны з Богам-бацькам, паводле другога — толькі падобны да яго.

*Джыявані Чымбаўэ* (каля 1240–1302) — італьянскі мастак і стваральнік фларэнтыйскіх мазаік.

*Арпіна* — італьянскі мастак Джузэпэ Чэзары (каля 1568–1640), празваны кавалерам д'Арпіна.

*Вiторэ Карпача* (каля 1465–1522) — італьянскі мастак Ранняга Адраджэння, прадстаўнік венецыянскай школы.

*Агастына* — магчыма, маецца на ўвазе Агастына дзі Джавані (XIV ст.), італьянскі скульптар перыяду позняй готыкі.

*Мікеланджэла да Караваджа* (1571–1610) — італьянскі мастак, рэфарматар еўрапейскага жывапісу XVII ст., адзін з найбуйнейшых майстроў барока.

*Франчэска Альбані* (1578–1660) — італьянскі мастак балонскай школы.

*Ян Стэйн* (1626–1679) — нідэрландскі мастак, які лічыцца самым дасціпным майстрам нідэрландскага жанравага жывапісу.

*Бендыда* — фракійская багіня-паляўнічая, якая часам атаясамлівалася з Артэмідай.

*Бубастыда* — егіпецкая багіня, дачка Ісіды і Асірыса, выяўлялася з кашэчай галавой, на якой ляжала поўня, раздзеленая змяёй вертыкальна папалам.

*Эсхіл* (525–456 гг. да н. э.) — старажытнагрэцкі драматург; антычныя навукоўцы налічвалі ў яго спадчыне 90 драматычных твораў, з якіх да нас дайшло сем.

*Ісэй* з Халкіды, ці Ісэй Афінскі (каля 420–350 гг. да н. э.) — старажытнагрэцкі аратар, адзін з дзесяці кананічных афінскіх аратараў. Да нас дайшлі 12 яго прамоваў, вядомыя назвы яшчэ 42.

*Лісій* (каля 445–380 гг. да н. э.) — афінскі аратар, якому прыпісваецца 425 прамоваў, з якіх дайшлі 34, прычым, верагодна, не ўсе аўтэнтычныя.

*Тэафраст* (каля 370–288/285 гг. да н. э.) — старажытнагрэцкі філосаф, аўтар больш чым 200 працаў па прыродазнаўстве.

*Апалоній Пергамскі* (262–190 гг. да н. э.) — разам з Эўклідам і Архімедам — адзін з трох найбольш значных старажытнагрэцкіх матэматыкаў. Яго галоўная праца ў васьмі частках прысвечаная канічным сячэнням, восьмая частка гэтай працы да нас не дайшла.

*Піндар* (522 — каля 422 гг. да н. э.) — адзін з самых значных старажытнагрэцкіх лірычных паэтаў. З яго шматлікіх твораў да нас дайшло толькі 45 одаў і каля 300 урыўкаў markрознага зместу.

*Гамэр Малодшы*, альбо Візантыйскі (III ст.) — старажытнагрэцкі паэт, які ўваходзіў у Александрыйскую плеяду.

*Элмак* — лонданскі арыстакратычны клуб, які існаваў з 1764 года.

## Акуляры

*«Хронікі»* — маюцца на ўвазе чатыры кнігі «Хронік» Жана Фруасара (каля 1337–1410), французскага паэта і гісторыка XIV стагоддзя.

*Луцый Апулей* (II ст.) — рымскі пісьменнік і філосаф. Аднак прыведзеная цытата ўзятая з «Сатырыкону» Петронія (I ст.).

*Яе не ведаць — значыць быць нікім* — Перафразаваная цытата са «Страчанага Раю» Джона Мілтана, дзе Сатана кажа: *«Not to know me, argues yourself unknown»* (IV, 830; «Мяне не ведаць — значыць быць нікім»).

*Антарэс* — альфа ў сузор'і Скарпіёна, адна з найярчэйшых зорак у начным небе.

*Нінон дэ Ланкло* (1615(23?)–1705) — французская куртызанка, пісьменніца, гаспадыня літаратурнага салону, якая да самай смерці ў глыбокай старасці славілася нечуванай прыгажосцю. Пра яе хадзіла шмат свецкіх анекдотаў. Напрыклад, апавядалася, што яе сын, аддадзены чужым людзям на выхаванне, сустрэў яе аднойчы ў парку Цюільры, калі ёй было 56 гадоў, і да бяспамяцтва закахаўся. Дазнаўшыся, што дама даводзіцца яму маці, юнак павесіўся.

*«Атэла»* — опера італьянскага кампазітара Джаакіна Расіні (1792–1868), пастаўленая ў Неапалі ў 1816 г.

*«Капулецi»* — маецца на ўвазе опера «Капулецi і Мантэкі» італьянскага кампазітара Вінчэнца Беліні (1801–1835), пастаўленая ў Венецыі ў 1830 г.

*Сан-Карла* — оперны тэатр у Неапалі на тысячу месцаў, адзін з самых вялікіх у Еўропе ў XIX ст.

*«Самнамбула»* — опера В. Беліні, пастаўленая ў Мілане ў 1831 г.

*Марыя-Феліцыя Малібран* (1808–1836) — французская спявачка (кантральта), аўтарка шэрагу вакальных твораў.

## Анёл Надзвычайнасцяў

*Рычард Гловер* (1712–1785) — ангельскі паэт, знакаміты баладай «Дух адмірала Хозьера». Эпічная паэма «Леанід» выйшла ў 1737 годзе.

*Уільям Уілкі* (1721–1772) — шатландскі пісьменнік; паэма «Эпіганіяда», заснаваная на чацвертай кнізе «Іліяды» Гамера, выйшла ў 1757 годзе.

*Альфонс дэ Ламарцін* — гл. каментар да апавядання «Забойствы на вуліцы Морг».

*Джоэл Барлаў* (1754–1812) — амерыканскі паэт, дыпламат і палітык; «Калумбіяда» — самы знакаміты яго твор, надрукаваны ў 1807 годзе.

*Генры Тэадор Такерман* (1813–1871) — амерыканскі пісьменнік і журналіст; маецца на ўвазе яго кніга «Ізабэль, альбо Сіцылія» (1839).

*Руфус Уілмат Грысвалд* (1815–1857) — амерыканскі пісьменнік, выдавец і крытык; маецца на ўвазе яго кніга «Дзівоты амерыканскай літаратуры» (1844).

*«Той чатырохстаронкавы талмуд, // Які не крытыкуе і паэт»* — цытата з паэмы «Задача» ангельскага паэта Уільяма Каўпера (1731–1809).

*«Жыль Блаз»* — маецца на ўвазе махлярскі раман «Гісторыя Жыля Блаза з Сантыльяны» французскага пісьменніка Алена Рэнэ Лесажа (1668–1747).

*«Усюдыіснасць Бога»* — магчыма, маецца на ўвазе трактат нямецкага філосафа і матэматыка Готфрыда Вільгельма Ляйбніца (1646–1716) «Тэадыцэя», дзе распрацоўваецца ідэя ўсёмагутнасці і ўсюдыіснасці Бога.

## Сістэма доктара Смола і прафесара Пер'е

*Сэнт-Мену* — жыхары Сэнт-Мену славяцца тым, што гатуюць выдатную свініну. У кнізе *The short fiction of Edgar Allan Poe* (1990) Сьюзан Левін піша: «Жыхары Сэнт-Мену маглі падаць ялавічыну замест замоўленае свініны. Як будзе бачна пазней, апавядальнік не атрымаў ні таго, ні другога» (с. 619).

*Сыны Энакавы* — племя волатаў у Палестыне (гл. Лікі, XIII, 34).

*«Страшнае, злое, жахліва агіднае, змроку стварэнне»* — цытата з Вергілія, «Энеіда», III, 658. Згадайма «чудище обло, озорно, огромно, стозевно и лаяй» В. Традзьякоўскага («Тэлемахіда»; тут прыведзеная цытата ў рэдакцыі А. Радзішчава).

*Генры Брум* (1778–1868) — ангельскі палітык і журналіст.

*Фаларыд* (VI ст.) — кіраўнік горада Агрыгента (Сіцылія), які жорстка катаваў сваіх падданых. Паводле легенды, асуджанага садзілі ўсярэдзіну меднага быка, пад якім разводзілі вогнішча. Стогны асуджанага нагадвалі рыканне быка. У 554 годзе народ паўстаў, і Фаларыд быў закатаваны ў тым самым быку.

*«Янкі Дудл»* — папулярная народная амерыканская песенька часоў вайны за незалежнасць (1775–1783).

## Размова з муміяй

*Іліфія* (грэцк. Εἰλείθυια) — магчыма, По мае на ўвазе горад, дзе знаходзіўся храм Іліфіі, багіні, што дапамагала падчас родаў. Пра яго размяшчэнне згадвае Страбон: «Пасля Фіваў ідзе горад Германфіда, дзе шануюць Апалона і Зеўса. Тут таксама ўтрымліваюць быка. Затым ідзе Горад Кракадзілаў, жыхары якога шануюць гэтую жывёліну. Далей ідуць Афрадытопаль і Латопаль, які шануе Афрадыту і лата [паводле Страбона, «нейкую нільскую рыбу»]; потым — горад і храм Іліфіі; на супрацьлеглым беразе — Горад Каршуноў, дзе шануюць каршуноў; потым ідзе Апаланопаль, які таксама вядзе барацьбу з кракадзіламі» (Геаграфія. XVII, I, 47).

*Глідан* — сярод выдуманых персанажаў По называе рэальную асобу — вядомага ангельскага егіптолага Джорджа Робінса Глідана (1809–1857).

*Як містэр Барнс у пантаміме...* — Джон Барнс (1761–1841) — ангельскі комік, з 1816 г. жыў у ЗША і граў у Парк-тэатры ў Нью-Ёрку.

*Фрэналогія, Галь, Шпурцгайм* — гл. каментары да апавядання «Д'ябал пярэчання».

*Месмер* — гл. каментар да апавядання «Праўда пра тое, што здарылася з містэрам Вальдэмарам».

*Дыядор Сіцылійскі* (каля 80–29 гг. да н. э.) — старажытнагрэцкі гісторык, аўтар «Гістарычнай бібліятэкі», дзе выкладаецца сусветная гісторыя ад старажытных часоў да 60 г. да н. э.

*Боўлінг-Грын* — парк у цэнтры Нью-Ёрка.

*Капітолій у Вашынгтоне* — на Капіталійскім узгорку ў Вашынгтоне размяшчаецца будынак Кангрэса ЗША.

*Азнак* — назва, прыдуманая По.

*Карнак* — паселішча ў Егіпце блізу Фіваў, дзе знаходзяцца руіны храма Амона, які пачаў будавацца ў XX ст. да н. э.

*Вялікі Ааазіс* — найбуйнейшы егіпецкі аазіс, які знаходзіцца ў Лівійскай пустыні. Старажытныя калодзежы гэтага аазіса дасягаюць глыбіні 120 метраў.

*«Даел»* — часопіс амерыканскіх трансцэндэнталістаў, які выходзіў з ліпеня 1840 да красавіка 1844 г.

*...сучасны паравы рухавік заснаваны на вынаходніцтве Герона, апісаным Саламонам дэ Ко.* — Герон з Александрыі — грэцкі навуковец і інжынер. У сваёй працы «Пнеўматыка» (каля 130 г. да н. э.) апісаў уладкаванне паравой турбіны. У 1615 г. французскі інжынер Саламон дэ Ко (1576–1626) прапанаваў канструкцыю ўдасканаленага паравога рухавіка.

*Джозэф Брандрэт* (1746–1815) — ангельскі доктар.

# Вершы

## Тамерлан

Паэма напісаная, верагодна, падчас навучання Э. По ў Вірджынскім універсітэце. Упершыню надрукаваная ў 1827 г., у першым варыянце яна налічвала 406 радкоў. У 1829 г., падчас выдання другога зборніка, аўтар скараціў яе да 243 радкоў.

*Тамерлан* (1336–1405, поўнае імя Цімур ібн Тарагай Барлас) — заваёўнік, палкаводзец, эмір, заснавальнік вялікай дзяржавы ў Сярэдняй Азіі са сталіцай у Самаркандзе.

*Таглай* — «Горы Белур Таглай, адгор'е Эмаўса ў паўднёвай частцы незалежнай Татарыі, знакамітыя сваёй надзвычайнай дзікасцю і прыгажосцю далінаў» (*заўвага Эдгара По*, 1827).

*На Самарканд цяпер зірні!..* — «Думаю, Тамерлан зрабіў Самарканд сваёй рэзідэнцыяй пасля Ангорскай бітвы. На пэўны час горад зрабіўся цэнтрам адукацыі і мастацтваў» (*заўвага Эдгара По*, 1827). *Самарканд* — адзін з найстаражытнейшых гарадоў свету, заснаваны прыкладна ў 742 г. да н. э. *Ангорская бітва* — бітва паміж асманскім султанам Баязідам I і Тамерланам, якая адбылася ў 1402 г. і ў якой перамаглі войскі Тамерлана, што прывяло да часовага распаду Асманскай імперыі.

*Цімур* — «Тамерлана таксама называлі Цімур Бек» (*заўвага Эдгара По*, 1827).

## Сон

Верш увайшоў у «зборнік «"Тамерлан" і іншыя вершы»

## Шчаслівы дзень

Верш увайшоў у зборнік «"Тамерлан" і іншыя вершы».

## Духі мёртвых

У першай публікацыі ў 1827 годзе верш меў назву «Мёртвыя наведнікі». Вытрыманы ў духу «могілкавай паэзіі» Юнга і Грэя.

## Песня

Верш увайшоў у зборнік «"Тамерлан" і іншыя вершы». Прысвечаны Сары Эльміры Ройстэр (1811–1888), з якой Э. По былі заручаны да ад'езду ў Вірджынскі ўніверсітэт. Напісаны з нагоды яе шлюбу з Аляксандрам Шэлтанам.

## Да***

Пад назвай «Самотны» верш быў надрукаваны ў 1828 годзе. Пасля ўвайшоў у зборнік «"Аль-Арааф", "Тамерлан" і дробныя вершы» (1829). У першапачатковым варыянце меў пяць строфаў, якія пасля былі скарочаныя да дзвюх. Адрасат прысвячэння не высветлены.

## Самотны

Верш напісаны ў 1829 годзе ў альбом Люсі Холмс; надрукаваны быў толькі пасля смерці Эдгара По, у 1875 годзе.

## Раманс

Упершыню верш з'явіўся ў зборніку 1829 года пад назвай «Уводзіны» і меў досыць значны аб'ём. Пасля аўтар скараціў яго і пад назвай «Раманс» змясціў у зборніку 1831 года.

## Санет да навукі

Упершыню верш быў надрукаваны ў 1829 годзе без назвы як уступ да паэмы «Аль-Арааф».

## Да ***

Альбомны верш, які ўпершыню быў надрукаваны ў зборніку 1829 года. Адрасатам яго прынята лічыць Элізабэт Херынг, стрыечную сястру аўтара.

## Калізей

Разам з апавяданнем «Рукапіс, знойдзены ў бутэльцы» гэты верш быў напісаны для конкурсу, абвешчанага часопісам *Baltimore Saturday Visitor* у чэрвені 1833 года. Журы, якое ўзначальваў раманіст Дж. П. Кенэдзі, прызнала найлепшымі і верш, і апавяданне,

аднак прэмію (50 даляраў) Э. По атрымаў толькі за апавяданне, бо ўручыць абедзве прэміі аднаму аўтару журы не палічыла магчымым.

*Халдэі* — народ, што жыў у вобласці вусцяў рэк Тыгр і Еўфрат на паўночна-заходнім беразе Персідскага заліву. Лічыліся першымі астраномамі.

*Мемнан* — міфічны герой, сын Эас і Тытона, цар эфіопаў. Удзельнічаў у Траянскай вайне, быў забіты Ахілам. Імем Мемнана называлі статую егіпецкага фараона Аменхатэпа III, якая на ўзыходзе сонца выдавала гук, што нагадваў чалавечы голас; лічылася, што гэта Мемнан вітае сваю маці Эас.

## Серэнада

Верш не ўвайшоў ні ў адзін прыжыццёвы зборнік Э. По. Упершыню ён быў надрукаваны ў часопісе *Baltimore Saturday Visitor* 20 красавіка 1833 года, пасля быў надоўга забыты і знойдзены толькі ў 1917 годзе прафесарам Дж. К. Фрэнчам.

*Элізій* — гл. каментар да апавядання «Элеанора».

*Плеяды* — надзвычай яркая зорная сукупнасць у сузор'і Цяльца, названая ў гонар дачок тытана Атланта і акіяніды Плеёны: Алкіёна, Келена, Мая, Меропа, Астэропа, Тайгета і Электра.

*Эндыміён* — у грэцкай міфалогіі юнак-пастух, знакаміты сваёй прыгажосцю, каханы багіні поўні Селены.

*Адэліна* — умоўнае імя, якое мае значэнне «высакародная».

## Гімн

Упершыню верш з умоўнай назвай «Каталіцкі гімн» быў надрукаваны ў тэксце апавядання «Марэла» ў 1835 годзе (хаця напісаны быў раней, у 1833 годзе), пасля быў выключаны з апавядання і друкаваўся як асобны верш, з якога аўтар выкінуў першае чатырохрадкоўе.

## Да Ф(рэнсіс) С(арджэнт) О(сгуд)

Быў напісаны ў 1833 годзе і спачатку меў назву «Да Элізабэт». У розных, крыху змененых варыянтах прысвячаўся аўтарам розным

жанчынам: Э. Р. Херынг, Э. Уайт, М. Э. Херынг, Ф. С. Осгуд, М. Ніл. Перакладзены паводле выдання «"Крумкач" і іншыя вершы», дзе верш прысвечаны паэтцы Ф. С. Осгуд.

## Да Зантэ

Санет быў напісаны ў 1836 годзе, упершыню надрукаваны ў 1837 годзе ў часопісе *Southern Literary Messenger* і ўключаны ў зборнік 1845 года.

*Зантэ* — італьянская назва вострава з групы Іянічных астравоў, вядомага ў грэкаў як Закінф. Эдгар По, як і Франсуа-Рэнэ Шатабрыян, лічыў, што назва вострава паходзіць ад грэцкай назвы кветкі гіяцынт.

*«Залаты востраў! Кветка Леванта!»* — верагодна, гэты радок адсылае да падарожных нататак Шатабрыяна 1811 года.

## Цішыня

Санет з кодай (пятнаццатым радком) быў надрукаваны ў 1840 годзе ў часопісе *Saturday Courier* і ўключаны ў зборнік 1845 года.

## Юлалі

Упершыню надрукаваны ў нью-ёркскім часопісе *American Revue* у 1845 годзе. Імя *Eulalie* (Юлалі) многія даследчыкі лічаць варыянтам імені *Ulalume* (Улялюм), такім чынам яднаючы два вершы ў адну гісторыю.

*Астарта* — грэцкае гучанне імені Іштар, багіні ўраджайнасці і пачуццёвага кахання, таксама часам атаясамлівалася з поўняй.

## Лінор

Верш узнік як перапрацоўка ранняга верша «Пэан» (1831). Апошні варыянт «Лінор» датуецца 1849 годам.

## Крумкач

Самы вядомы верш Э. По ўпершыню быў надрукаваны 29 студзеня 1845 году ў газеце *Evening Mirror* і адразу ж займеў неверагод-

ны поспех. Падрабязна гэты верш разглядаецца аўтарам у артыкуле «Філасофія кампазіцыі».

*Галаадскія горы* — Галаад (альбо Гілеад), гістарычная вобласць у Старажытным Ізраілі на ўсходнім беразе ракі Іярдан.

## Да Ф***

Першы варыянт верша напісаны ў 1835 годзе, у тым жа годзе надрукаваны ў часопісе *Southern Literary Messenger* пад назвай «Да Мэры» (магчыма, верш адрасаваны Мэры Ўіндэры, сяброўцы Э. Ройстэр). У 1845 годзе верш быў пераадрасаваны Ф. С. Осгуд.

## Улялюм

Упершыню верш быў надрукаваны ў снежні 1847 года ў ньюёркскім часопісе *American Revue*, але шліфаваўся аўтарам да 1849 году. Верш часта друкуецца і перакладаецца паводле версіі, дзе адсутнічае апошняя страфа.

*Абэр, Ўір, Яанэк* — у дадзеным вершы По стварае сваю ўласную жахлівую міфалогію і геаграфію іншага свету — лес Ўір з прывідамі і вупырамі, вулканічная гара Яанэк і горнае возера Абэр. Некаторыя даследчыкі звязваюць назву Абэр з імем французскага кампазітара Даніэля Франсуа Абэра (1782–1871), чый балет «Возера феяў» карыстаўся папулярнасцю ў часы Эдгара По, а назву Ўір — з імем амерыканскага мастака Роберта Ўолтэра Ўіра (1803–1889), аўтара шматлікіх замалёвак даліны ракі Гудзон.

*Ноч начэй* — лічыцца, што тут маецца на ўвазе ноч Хэлаўіна.

*Астарта* — гл. каментар да верша «Юлалі». Даследчыкі лічаць, што Астарта, як і імёны Юлалі-Улялюм, нітуе два вершы. Гэта дае ім падставы гаварыць, што верш «Юлалі» расказвае перадгісторыю таго, што адбываецца ў вершы «Улялюм». Паводле непацверджаных сведчанняў сучаснікаў Э. По, сам паэт вымаўляў назву верша як «Юлялюм».

## Званы

Упершыню верш надрукаваны 17 кастрычніка 1849 года ў часопісе *New York Daily Tribune*.

## Эльдарада

Балада была надрукаваная ў красавіку 1849 года ў бостанскім часопісе *Flag of Our Union* і з'яўляецца водгукам на «залатую ліхаманку», якая пачалася ў Амерыцы пасля адкрыцця залатых радовішчаў у Каліфорніі.

## Эль — да радасці

У арыгінале верш мае назву «Радкі ў гонар элю». Існуе легенда, што Эдгар По напісаў яго ў карчме правінцыйнага гарадка Лоўэл, куды прыязджаў у 1848 годзе, каб прачытаць лекцыю «Паэты і паэзія Амерыкі». Паводле легенды, верш можна было пабачыць на сцяне карчмы да 1920 года.

## Анабэль Лі

Верш упершыню надрукаваны ў газеце *New York Daily Tribune* 9 кастрычніка 1849 года, у дзень пахавання паэта.

## Для Эні

Упершыню верш надрукаваны ў красавіку 1849 года ў бостанскім часопісе *Flag of Our Union*. Прысвечаны Эні Рычманд, блізкаму сябру паэта ў апошнія гады яго жыцця.

## Сон у сне

У канчатковым выглядзе верш быў упершыню надрукаваны пасля смерці паэта. Часткова напісаны ў ранні перыяд творчасці.

# Эсэістыка

## Філасофія кампазіцыі

*«Барнэбі Радж»* — гістарычны раман Чарлза Дыкенса, напісаны ў 1841–1842 гг.

*Уільям Годвін* (1756–1836) — ангельскі пісьменнік, палітычны філосаф і раманіст, аўтар раманаў «Прыгоды Калеба Уільямса» (1794), «Сэнт-Леон» (1799) і «Флітвуд» (1805). Бацька Мэры Шэлі.

*Трансцэндэнталізм* — амерыканскі філасофска-літаратурны рух 1830-х — 1860-х гадоў, на які паўплываў трансцэндэнтальны ідэалізм І. Канта і ідэі Ф. Шэлінга. Тэрытарыяльна трансцэндэнталізм быў звязаны з Конкардам, дзе жылі самыя выбітныя яго прадстаўнікі — Ралф Уолда Эмэрсан і Генры Дэвід Тора, а таксама Н. Готарн, М. Фулер, У. Э. Чанінг і бацька будучай пісьменніцы Луізы Мэй Олкат Б. Олкат.

## Паэтычны прынцып

*«Калумбіяда»* — значная паводле аб'ёму эпічная паэма Джоэла Барлаў (1754–1812), амерыканскага паэта і палітыка, выдадзеная ў 1807 годзе. Паэма была не вельмі добра прынятая сучаснікамі і ў далейшым часта высмейвалася.

*Альфонс дэ Ламарцін* — гл. каментар да апавядання «Забойствы на вуліцы Морг». Найбольш значнай часткай спадчыны Ламарціна лічацца першыя зборнікі вершаў паэта.

*Роберт Полак* (1798–1827) — шатландскі паэт, знакаміты сваёй паэмай «Плынь часу» ў 10 кнігах.

*П'ер Жан Беранжэ* (1780–1857) — гл. каментар да апавядання «Падзенне Дому Ашэраў».

*«Серэнада»* — верш, які цытуецца Эдгарам По, — «Індыйская мелодыя» ангельскага паэта Персі Бішы Шэлі (1792–1822).

*Натаніэл Паркер Уіліс* (1806–1867) — амерыканскі празаік, паэт і рэдактар, які супрацоўнічаў з многімі значнымі творцамі, у тым ліку Эдгарам По і Генры Лангфэла.

*Амарыліс* — традыцыйнае імя пастушкі ў антычнай паэзіі; яе вобраз сустракаецца ў творах Феакрыта, Вергілія, Авідыя, Лонга.

*Джавані Вінцэнца Гравіна* (1664–1718) — італьянскі пісьменнік і юрыст.

*Томас Мур* (1779–1852) — ірландскі паэт-рамантык, аўтар шэрагу песняў і баладаў. Самы знакаміты зборнік вершаў Мура — «Ірландскія мелодыі» (1821).

*Генры Ўодсварт Лангфэла* (1807–1882) — амерыканскі паэт, самым значным творам якога лічыцца «Спеў пра Гаявату» (1855). Эдгар По называў Лангфэла найлепшым амерыканскім паэтам.

*Уільям Кален Браянт* (1794–1878) — амерыканскі паэт, журналіст і рэдактар. Водгукі на вершы Браянта былі самыя розныя — ад пахвалы, як у Эдгара По, да суворай крытыкі.

*Эдвард Коўт Пінкні* (1802–1828) — амерыканскі паэт, юрыст, выкладчык, які памёр ва ўзросце 26 гадоў. Даследчыкі часта параўноўваюць яго творы з творамі паэтаў-кавалераў і адзначаюць уплыў на яго ангельскай паэзіі ў цэлым.

*Траяна Бакаліні* (1556–1613) — італьянскі пісьменнік, вядомы сваім сатырычным выяўленнем палітычнага і літаратурнага жыцця; «Весткі з Парнаса» (1612) напісаныя менавіта ў такім сатырычным духу.

*Сэмюэл Тэйлар Колрыдж* (1772–1834) — ангельскі паэт-рамантык, крытык і філосаф, прадстаўнік Азёрнай школы паэзіі. Ідэі Колрыджа, які ў сваёй «Літаратурнай біяграфіі» (1817) разводзіў паняткі «ўяўленне» і «фантазія» (згодна з яго меркаваннем, уяўленне бязмежнае і нічым не скаванае, тым часам як фантазія мае ўстойлівую форму), значна паўплывалі на Эдгара По.

*Томас Гуд* (1799–1845) — ангельскі паэт; многія яго творы мелі гумарыстычны характар.

*Сярод дробных вершаў лорда Байрана...* — верш, які цытуецца Эдгарам По, называецца «Стансы да Аўгусты» (1816). Беларускі пераклад верша, зроблены Юркам Гаўруком, друкаваўся ў зборніках твораў і перакладаў Гаўрука, а таксама ў зборніку беларускіх перакладаў з Байрана «Лірыка» (1989).

*Алфрэд Тэнісан* (1809–1892) — ангельскі паэт, які атрымаў званне паэта-лаўрэата і быў надзвычай папулярным. Паэма «Прынцэса» выйшла ў 1847 годзе.

*Венера Уранійская ў адрозненне ад Венеры Дыянейскай...* — такім чынам Эдгар По размяжоўвае любоў духоўную (нябесную, уранійскую, ад імя Урана — старажытнагрэцкага бога, які ўвасабляў неба) і пачуццёвую (дыянейскую, ад імя Дыёны — тытаніды, багіні дажджу ў старажытнагрэцкай міфалогіі, паводле аднаго з міфаў — маці Афрадыты).

*Уільям Мазэрвел* (1797–1835) — шатландскі паэт і журналіст.

# Змест

*Нарынэ Шахназаран*. Эдгар По . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

## Апавяданні

Марэла. *Пераклад Марыны Дзергачовай* . . . . . . . . . . . . . . . . . . .16
Падзенне Дому Ашэраў. *Пераклад Кацярыны Мацiеўскай* . . . . . . .22
Авальны партрэт. *Пераклад Сяргея Шупы* . . . . . . . . . . . . . . . . . .41
Лігея. *Пераклад Марыны Дзергачовай* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .45
Маска Чырвонае Смерці. *Пераклад Сяргея Шупы* . . . . . . . . . . . .61
Вільям Вільсан. *Пераклад Віталя Рыжкова* . . . . . . . . . . . . . . . .68
Праўда пра тое, што здарылася з містэрам Вальдэмарам.
*Пераклад Кацярыны Мацiеўскай і Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . .89
Элеанора. *Пераклад Веранікі Сідарэнка* . . . . . . . . . . . . . . . . . .100
Сэрца выкрывае. *Пераклад Юрася Бушлякова* . . . . . . . . . . . . . .107
Д'ябал пярэчання. *Пераклад Наталлі Клабанавай* . . . . . . . . . .113
Чорны кот. *Пераклад Юрася Бушлякова* . . . . . . . . . . . . . . . . . .120
Калодзеж іківач. *Пераклад Юлі Цімафеевай*. . . . . . . . . . . . . . .130
Цішыня. *Пераклад Алены Пятровіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .148
Берэніка. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .152
Падзенне ў Мальстрэм. *Пераклад Юліі Шадзько* . . . . . . . . . . . .162
Залаты жук. *Пераклад Юлі Цімафеевай* . . . . . . . . . . . . . . . . . .181
Забойствы на вуліцы Морг. *Пераклад Уладзіміра Шчаснага* . . . .218
Сфінкс. *Пераклад Наталлі Клабанавай* . . . . . . . . . . . . . . . . . .256
Чалавек натоўпу. *Пераклад Сяргея Шупы* . . . . . . . . . . . . . . . . .261
Некалькі выпадкаў з жыцця знакамітасці.
*Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .271
Акуляры. *Пераклад Марыі Мартысевіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . .277
Анёл Надзвычайнасцяў. *Пераклад Кацярыны Дубоўскай*. . . . . . .301
Сістэма доктара Смола і прафесара Пер'е.
*Пераклад Кацярыны Мацiеўскай*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .310
Размова з муміяй. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . .329

## Вершы

Тамерлан. *Паэма. Пераклад Лявона Баршчэўскага*. . . . . . . . . . .347
Сон. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .355
Шчаслівы дзень. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . .356

Духі мёртвых. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . .357
Песня. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .358
Да***. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .359
Самотны. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .360
Раманс. *Пераклад Максіма Шчура* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .361
Санет да навукі. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . .362
Да ***. *Пераклад Ганны Янкута*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .363
Калізей. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .364
Серэнада. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .366
Гімн. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .367
Гімн. *Пераклад Аляксея Арцёмава* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .368
Да Ф(рэнсіс) С(арджэнт) О(сгуд). *Пераклад Ганны Янкута* . . . . .369
Да Зантэ. *Пераклад Ганны Янкута*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .370
Цішыня. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .371
Юлалі. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .372
Лінор. *Пераклад Ганны Янкута*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .373
Крумкач. *Пераклад Алега Мінкіна*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 374
Крумкач. *Пераклад Андрэя Хадановіча*. . . . . . . . . . . . . . . . . . .378
Да Ф***. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .382
Улялюм. *Пераклад Алега Мінкіна* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .383
Улялюм. *Пераклад Кацярыны Маціеўскай*. . . . . . . . . . . . . . . . .387
Званы. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .391
Эльдарада. *Пераклад Андрэя Хадановіча* . . . . . . . . . . . . . . . . .395
Эльдарада. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .396
Эль — да радасці. *Пераклад Ганны Янкута*. . . . . . . . . . . . . . . .397
Анабэль Лі. *Пераклад Алега Мінкіна* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .398
Для Эні. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .400
Сон у сне. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .404

## Эсэістыка

Філасофія кампазіцыі. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . .405
Паэтычны прынцып. *Пераклад Ганны Янкута* . . . . . . . . . . . . . .418

КАМЕНТАР . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .444

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў
«Кнігарня пісьменніка»

Бібліятэка часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum»

**По** Эдгар

**Маска Чырвонае Смерці**

Выбраныя навелы, вершы, эсэ

Адказны за выпуск *Генадзь Вінярскі*
Укладальнік *Андрэй Хадановіч*
Рэдактары *Кацярына Мацiеўская, Ганна Янкута*
Камп'ютарны дызайн, вёрстка *Юліі Андрэевай*
Дызайн вокладкі *Вольгі Караблёвай,*
*Віталя Рыжкова, Юлі Цімафеевай*
Карэктар *Кацярына Мацiеўская*

Падпісана да друку 6.06.2011. Фармат 84х108 1/32.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 27,3. Улік.-выд. арк. 19,1.
Наклад 500 асоб. Замова

ПУП «Кнігазбор».
Ліцэнзія № 02330/0003924 ад 08.04.11.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск.
Тэл./факс (017) 207-62-33,
тэл. (029) 772-19-14, 682-83-86.
E-mail: bkniha@tut.by

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў ААТ «Аргбуд».
Ліцэнзія № 02330/0494197 ад 03.04.09.
Вул. Берасцянская, 16, 220034, Мінск.

# Edgar Poe



L'Amérique a perdu un romancier, un critique, un philosophe qui n'était guère fait pour elle.

— *Charles Baudelaire*

Mr. Poe wrote with fastidious difficulty, and in a style too much above the popular level to be well paid.

— *N.P.Willis*

Έντγκαρ Πόε ἐμὲ προβαλλέ.

— *Πλάτων*

Fundem-se o delírio e a clareza da fixação desse delírio.

— *Fernando Pessoa*

Гении, как Эдгар По, выше обвинения или оправдания. Можно так же пытаться объяснить красный свет планеты Марс.

— *Константин Бальмонт*

Utwory Poego to – szaleńcze uprawdopodobnienie zaledwie pochwytnych wizji, w których gorączkowa równoległość snów i ocknień przetapia atrybuty rzeczywistości w tęczę marzeń.

— *Bolesław Leśmian*

ISBN 978-985-7007-03-5

9 789857 007035